МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР

ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ імя ЯНКІ КУПАЛЫ

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

ЗБОР ТВОРАЎ У ЧАТЫРОХ ТАМАХ

Рэдакцыйная калегія:
С. А. АНДРАЮК,
Р. М. БАЛАКІНА,
В. А. КАВАЛЕНКА,
В. М. КАСЯНКОЎ,
М. І. МУШЫНСКІ,
К. Р. ХРОМЧАНКА

Рэдактар тома
М. І. МУШЫНСКІ

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

ТОМ ПЕРШЫ

○ АПАВЯДАННІ

Прадмова, пасляслоўе
М. І. МУШЫНСКАГА

Укладанне,
тэксталагічны каментарый
Т. Р. СТРОЕВАЙ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1989

ББК 84Бел7
З-35

Первый том Собрания сочинений видного белорусского писателя, одного из основоположников белорусской советской литературы Михася Зарецкого (1901—1941) составят рассказы разных лет.

З $\frac{4702120201-154}{M\,302(03)-89}$ 92—89

ISBN 5-340-00297 (т. 1)
ISBN 5-340-00296-9

© Укладанне, прадмова, каментарыі, афармленне. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989

АД РЭДАКЦЫІ

Збор твораў Міхася Зарэцкага ў чатырох тамах — першае навукова-каменціраванае выданне мастацкай, публіцыстычнай і літаратурна-крытычнай спадчыны выдатнага беларускага пісьменніка.

Выхад дадзенага Збору твораў — сведчанне вялікіх змен у жыцці нашага грамадства і заслужаная даніна павагі да таленавітага мастака, у творчасці якога будучыя пакаленні адкрыюць для сябе своеасаблівы мастацкі свет.

У аснову размяшчэння твораў па тамах пакладзены жанрава-храналагічны прынцып:

першы том — апавяданні;

другі том — аповесць «Голы звер» і раман «Сцежкі-дарожкі»;

трэці том — раман «Вязьмо» і драматычная аповесць «Сымон Карызна»;

чацвёрты том — п'есы, публіцыстычныя і крытычныя артыкулы, незавершаныя творы і Кароткі летапіс жыцця і творчасці пісьменніка.

У дадзенае выданне апрача твораў, якія ўваходзілі ў прыжыццёвыя зборнікі і асобныя кнігі, уключаны і творы, што змяшчаліся толькі ў перыядычным друку.

Асноўным тэкстам для большасці твораў з'яўляецца іх апошняе прыжыццёвае выданне, для некаторых — часопісныя і газетныя публікацыі. Архіў пісьменніка не захаваўся. Таму тэксты твораў звераны толькі з прыжыццёвымі публікацыямі. Навуковая зверка дала магчымасць выправіць шэраг недакладнасцей, друкарскіх памылак і ўзнавіць аўтарскі тэкст.

Да кожнага тома даецца пасляслоўе, а таксама тэкстalагічны каментарый, у якім прыводзяцца звесткі аб крыніцах асноўнага тэксту і датах прыжыццёвых публікацый, узпаўляюцца грамадска-палітычныя і літаратурна-творчыя ўмовы, у якіх ствараўся твор, ацэньваюцца яго ідэйна-мастацкія вартасці і вызначаецца месца ў творчасці пісьменніка і ў беларускай літаратуры.

Збор твораў Міхася Зарэцкага падрыхтаваны супрацоўнікамі ордэна Дружбы народаў Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР.

Выказваем глыбокую падзяку дачцэ і сыну пісьменніка Радаміры Міхайлаўне Балакінай і Вячаславу Міхайлавічу Касянкову, а таксама брату пісьменніка Мікалаю Яўхімавічу Касянкову за дапамогу ў падрыхтоўцы выдання.

СУМЛЕННЫ І МУЖНЫ ТАЛЕНТ

Міхась Зарэцкі (Міхась Яўхімавіч Касяпкоў) — адзін з найболей таленавітых прадстаўнікоў тої пісьменніцкай плеяды, якая прыйшла ў беларускую літаратуру па хвалі імклівага рэвалюцыйнага абнаўлення жыцця. Зачынальнік рамантычнага кірунку ў беларускай савецкай прозе, пісьменнік-паватар, ён стварыў шэраг значных твораў, сярод якіх апавяданні і аповесці, раманы і п'есы, кінасцэнарыі і мастацкія нарысы, крытычныя і публіцыстычныя артыкулы. Гэтымі творамі М. Зарэцкі ўзбагаціў беларускае прыгожае пісьменства новымі ідэямі, вобразамі, прыкметна папырыў жанрава-стылёвыя, выяўленчыя магчымасці літаратуры. Значным укладам у беларускі «вялікі эпас» былі яго раманы «Сцежкі-дарожкі» і «Вязьмо». Паспяхова спрабаваў свае сілы М. Зарэцкі і ў галіне мастацкага перакладу. Усё гэта красамоўна сведчыць аб шырыні творчага дыяпазону пісьменніка, аб разнастайнасці яго мастакоўскіх інтарэсаў і захапленняў.

М. Зарэцкі быў прыкметнай фігурай і ў грамадскім, культурным жыцці рэспублікі, актыўным удзельнікам літаратурнага руху 20-х — першай палавіны 30-х гадоў, адным з кіраўнікоў літаратурнага аб'яднання «Маладняк», а затым — «Полымя».

М. Зарэцкі належыць да ліку мастакоў з яскрава выяўленым нацыянальным абліччам. Ён багата зрабіў для развіцця беларускай нацыянальнай культуры, паслядоўна змагаўся за яе народна-самабытную аснову. У гэтым вялікая і як след неацэненая яшчэ заслуга пісьменніка.

М. Зарэцкі пражыў дужа кароткае, але ў творчых адносінах багатае, змястоўнае жыццё, якое трагічна абарвалася ў змрочныя гады сталінскай дыктатуры, у перыяд масавых рэпрэсій, што абрынуліся на савецкі народ, працоўную інтэлігенцыю, прадстаўнікоў навукі, культуры, літаратуры. У выніку гэтых супрацьзаконных акцый былі фізічна знішчаны сотні тысяч ні ў чым не вінаватых людзей, лёс якіх падзяліў і М. Зарэцкі. Ён быў арыштаваны па ілжывым даносе ў лістападзе 1936 года і беспадстаўна абвінавачаны ў кіраўніцтве контррэвалюцыйнай арганізацыяй, якой не існавала, у антысавецкай, нацыяналістычнай дзейнасці. Малодшы брат пісьменніка — Мікалай Касянкоў, які ў той час рабіў настаўнікам на Мазыршчыне і таксама быў рэпрэсіраваны ў 1937 годзе і асуджаны па 10 гадоў адбыцця пакарання ў папраўча-працоўных лагерах,— успамінае: «Адноўчы адзін са следчых зачытаў мне ўрывак з матэрыялаў мінскага следства. Там гаварылася, што спачатку контррэвалюцыйную пісьменніцкую арганізацыю ўзначальваў Янка Купала, а пасля паездкі за мяжу трох беларускіх пісьменнікаў (Ц. Гартнага, М. Чарота і М. Зарэцкага. — *М. М.)* кіраўніцтва арганізацыяй перайшло да Міхася

Зарэцкага... Брата прыгаварылі да расстрэлу. Пасля сям'і паведамілі, што праз дванаццаць дзён расстрэл быў заменены яму 10 гадамі зняволення. Загінуў Міхась у 1941 годзе» [1].

Рэпрэсіі не абмінулі і астатніх членаў сям'і Зарэцкага: жонка пісьменніка Марыя Іванаўна спачатку была асуджана на сем гадоў знаходжання ў папраўча-працоўных лагерах і на пяць гадоў паражэння ў правах, рэабілітавана ў 1941 годзе, а ў 1945 зноў асуджана на дзесяць гадоў.

Малалетнія дзеці — Слава і Рада — засталіся адны. «Праз паўгода,— прыгадвае М. Касянкоў,— бабка аддала дзяцей у Мінскі дзіцячы прыёмнік, а адтуль яны былі накіраваны ў дзіцячы дом «Боркі» Калінінскай вобласці».

Толькі ў 1956 годзе вынайдзены злачынцамі са сталінскаяжоўскага рэпрэсіўнага апарата абсурдны па свайму сэнсу ярлык «вораг народа» быў назаўжды змыты са светлага імя Міхася Зарэцкага. Беларуская грамадскасць яшчэ і сёння ў вялікім і неаплатным даўгу перад памяццю гэтага выдатнага пісьменніка, грамадзяніна, патрыёта, абаяльнага і высакароднага чалавека, хоць пасля вяртання яго твораў народу прайшло ўжо звыш трыццаці гадоў. За гэты час прыхільнікі арыгінальнага, самабытнага таленту аўтара раманаў «Сцежкі-дарожкі», «Вязьмо» маглі б і абавязаны былі куды болей зрабіць па захаванні і прапагандзе яго літаратурнай спадчыны і вывучэнні жыцця, грамадскай, культурнай дзейнасці. Літаратурныя творы М. Зарэцкага пасля яго грамадзянскай рэабілітацыі выходзілі не так і часта. У 1959 годзе быў перавыдадзены раман «Сцежкі-дарожкі», у 1962 — раман «Вязьмо». У 1975 годзе з'явілася даволі сціплая паводле свайго аб'ёму кніга выбраных апавяданняў. Вось бадай і ўсё, што атрымаў беларускі чытач за тры апошніх дзесяцігоддзі з даволі багатай, жаправа разнастайнай спадчыны пісьменніка. Шэраг апавяданняў, асабліва ранняга перыяду, аповесць «Голы звер», дакументальна-мастацкія нарысы, драматычныя творы, публіцыстычныя, крытычныя артыкулы заставаліся практычна па-за ўвагай грамадскасці. Гэта ж трэба сказаць і пра нясконченыя творы, пра эпісталярную спадчыну пісьменніка, пошукамі якой да гэтага часу, на жаль, ніхто не займаўся. Не прааналізаваны і зробленыя М. Зарэцкім пераклады многіх твораў на беларускую мову («Цэмент» Ф. Гладкова, 1930; «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў сусветную вайну» Я. Гашака, ч. 1, 1931).

Не лепшае становішча і з перакладамі твораў М. Зарэцкага. Рускамоўны чытач змог пазнаёміцца з раманам «Вязьмо» толькі ў 1965 годзе, гэта значыць, болей чым праз чвэрць стагоддзя пасля яго выхаду з друку (новы пераклад — у 1978 г.). Раман «Сцежкі-дарожкі» ў скарочаным выглядзе друкаваўся на старонках газеты «Рабочий» у 1927 годзе, а новы поўны пераклад выйшаў у 1971 годзе. «Малая проза» М. Зарэцкага перасягнула нацыянальныя межы толькі ў 1980 годзе, калі выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла ў перакладзе на рускую мову выбраныя апавяданні, цалкам паўтарыўшы змест памянёнай вышэй кнігі «Пачатак шчасця».

Праўда, першыя спробы перакласці апавяданні М. Зарэцкага

---

[1] Касянкоў М. О старшем брате (Воспоминания). Рукапіс захоўваецца ў архіве дачкі пісьменніка Радаміры Міхайлаўны Балакінай.

адносяцца яшчэ да 20-х гадоў («Паэма пра чорныя вочы», 1927; «Радасць», 1928; зб. «Ракавыя жаронцы», 1930). У даваенны час асобныя творы пісьменніка перакладаліся на ўкраінскую мову: у 1930 годзе былі выдадзены зборнік «42 дакументы» і раман «Сцежкі-дарожкі».

Як спробу хоць і запазненага сплачвання доўгу М. Зарэцкаму — мастаку і грамадзяніну — і трэба разглядаць дадзены Збор твораў, які дасць болей поўнае ўяўленне аб шматгранній спадчыне і напружаных ідэйна-мастацкіх пошуках пісьменніка. А таксама — аб тых шляхах, якімі ён ішоў у літаратуру. Шляхі гэтыя былі няпростымі. Сваім жыццём М. Зарэцкі сцвердзіў высокую годнасць пісьменніка-грамадзяніна, сэнс дзейнасці якога быў у беззапаветным служэнні маці-радзіме, у пастомнай барацьбе за духоўнае абнаўленне чалавека, у сцвярджэнні гуманістычных ідэалаў і прымнажэнні багаццяў родной культуры.

Нарадзіўся Міхась Зарэцкі 20 лістапада 1901 года ў сяле Высокі Гарадзец Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Талачынскі раён Віцебскай вобласці) у сям'і вясковага дзяка Яўхіма Апуфрыевіча і яго жонкі Пелагеі Лявонцьеўны. Міхась быў другім дзіцем пасля Івана, услед за ім нарадзіліся Мікалай і Ліза. Дзяцінства будучага пісьменніка прайшло ў вёсцы Зарэчча пад Шкловам, куды быў пераведзены на службе Яўхім Апуфрыевіч. Паэтычная назва паселішча, якое раскінулася на беразе Дняпра, прадвызначыла і выбар Міхасём Касяпковым свайго літаратурнага псеўданіма.

Вялікую ролю ў фарміраванні эстэтычных густаў будучага пісьменніка адыгралі яго бацькі. Псаломшчык Яўхім Апуфрыевіч любіў музыку і спевы, кіраваў царкоўным хорам, спрабаваў пісаць музычныя творы. «У сваёй працы,— успамінае Мікола Касянкоў,— бацька карыстаўся творамі Рахманінава, Бартнянскага і другіх кампазітараў, у якіх ёсць музыка на царкоўныя тэмы. Нямала прыходзілася яму папрацаваць, каб напісаць партытуры гэтых твораў для свайго хору, шмат затраціць часу на спеўку, але яго праца ўзнагароджвалася жаданымі выпікамі... Чалавек незалежных поглядаў, ён не заўсёды ладзіў з начальствам і таму іншы раз меў непрыемнасці па службе. Бацька не абмяжоўваўся рэгентскай працай. Ім пакладзены на музыку некалькі вершаў рускіх паэтаў (у тым ліку і Пушкіна), а таксама творы вуснай народнай творчасці. Быў ён чалавек назіральны, цікава расказваў пра перажытае. Любіў бацька спяваць. Яго любімыя песні «Среди долины ровныя», «Песня бобыля», «Жарко в небе солнце краспое».

Артыстычным талентам валодала і маці Міхася — Пелагея Лявонцьеўна. Яна таксама любіла спяваць, вызначалася працавітасцю і глыбокай душэўнасцю.

Відавочна, што агульная атмасфера, якая панавала ў бацькоўскай хаце, захапленне музыкай, цікавасць да спеваў станоўча ўплывалі на ўнутраны свет хлапчука, на развіццё яго мастацкіх густаў. «Здольнасці брата,— піша М. Касянкоў,— сталі выяўляцца з раняга дзяцінства... Ужо ў дзяцінстве ўмеў іграць на многіх музычных інструментах».

У дзесяцігадовым узросце хлапчука аддалі ў Аршанскае духоўнае вучылішча, праз чатыры гады — у Магілёўскую духоўную семінарыю. А двума гадамі пазней, калі пачаліся рэвалюцыйныя падзеі, юнак кінуў вучобу. Спачатку ён быў перапісчыкам у паў-

вайсковаі часці. Пасля вяртання ў родную вёску давялося М. Зарэцкаму працаваць паркоўпым вартаўпіком: на гэты крок штурхала матэрыяльная нястача.

З 1919 года Зарэцкі настаўнічае ў пачатковай школе на Магілёўшчыне, узначальвае Шклоўскі валасны аддзел народнай асветы. У 1920 годзе ўдзельнічае ў 2-м Усерасійскім з'ездзе саюза работнікаў асветы, абіраецца кандыдатам у члены ЦК гэтага саюза.

Сур'ёзнай школай жыцця стала для М. Зарэцкага яго служба ў Чырвонай Арміі, дзе на пасадзе палітработніка ён знаходзіўся з 1920 па 1927 год. «Бясконцыя блукапні з месца на месца, безліч назіранняў і ўражанняў, блізкае знаёмства з дзесяткамі і сотнямі самых разпастайных чалавечых тыпаў — усё гэта ўзбагаціла мяне невычэрпным запасам матэрыялу, які я выкарыстаў пасля ў цэлым шэрагу сваіх апавяданняў» [1],— сведчыў М. Зарэцкі. Гэтыя прызнанні пацвярджаюцца зместам многіх твораў не толькі малой жанравай формы, але і п'ес, рамана, нарысаў і інш.

Літаратурная дзейнасць М. Зарэцкага пачалася ў 1921 г., хоць ён паводле ўласных прызнанняў ніколі не збіраўся быць пісьменнікам. «Справа пачалася з таго, што я адпойчы ўбачыў вельмі яркі і незвычайны сон, уражанне ад якога не пакідала мяне на працягу цэлага месяца. Мне захацелася занатаваць гэтае ўражанне, і я стаў пісаць. Пісаў я доўга і вельмі старанна, абдумваючы кожную фразу, кожнае слова, закрэсліваючы, перакрэсліваючы і г. д. Працэс пісання мяне дужа хваляваў і ў той жа час падтрымліваў свежасць уражання, якое штурхала мяне на гэту працу. Скончылася тым, што старанна перапісанае апавяданне я паслаў у рэдакцыю «Савецкая Беларусь», аднак без усякай сур'ёзнай надзеі на яго надрукаванне» [2].

У даследчых працах, прысвечаных жыццю і творчасці М. Зарэцкага, сцвярджаецца, што яго літаратурным дэбютам было апавяданне «У Саўках», змешчанае на старонках «Савецкай Беларусі» 29 снежня 1922 года. Але, мусіць, дэбют трэба аднесці на болей ранні час, паколькі ў гэтай жа газеце 6 студзеня надрукаваны матэрыял пад назвай «Ці ж так?», 3 лютага — твор «Спатканне», 13 кастрычніка — твор «Сёння» («Малюнкі жыцця»), 22 лістапада — апавяданне «Цішка Бабыль» і толькі 29 снежня — «У Саўках».

Працэс фарміравання творчай індывідуальнасці маладога пісьменніка, калі меркаваць па яго выступленнях у перыядычным друку, адбываўся вельмі інтэнсіўна. Так, на працягу 1923 года толькі ў «Савецкай Беларусі» былі змешчаны апавяданні «Чаплюк» (Малюнкі з вайсковага жыцця), «Спакуса», «Мар'я», «Як гэта часам трапляецца» (Маленькае здарэнне), «Ноччу», «З пашых дзён», «Белы здзек» (З жыцця Заходняй Беларусі), «Ворагі». А неўзабаве адзін за другім пачалі выходзіць зборнікі апавяданняў — «У віры жыцця» (1925), «Пела вясна» (1925), «Пад сонцам» (1926), «42 дакументы» і «Двое Жвіроўскіх» (1926). Паступова пашыраўся і жанравы дыяпазон творчых пошукаў М. Зарэцкага. У тым жа 1926 годзе ён піша аповесць «Голы звер».

Аспоўная тэма апавяданняў М. Зарэцкага — перамены, якія

---

[1] Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мн., 1963. С. 216.

[2] Тамсама.

адбываюцца ў жыцці народа пад дабратворным уздзеяннем ідэй рэвалюцыі, упартае супраціўленне сіл старога свету, фарміраванне сацыяльна актыўнага чалавека, пялёгкія пошукі шляхоў у будучыню. Пісьменнік уважліва прыглядаўся да рэвалюцыйнай явы, да прыкмет новага, яго радавала духоўнае абнаўленне чалавека, які пачынаў усведамляць сябе гаспадаром жыцця. Творы М. Зарэцкага ўліваліся ў шырокую плынь беларускай літаратуры, якая стваралася прадстаўнікамі старэйшага пакалення і маладымі, уносячы ў яе сваю тэматычную і стылёвую адметнасць, эмацыянальна-ўзвышаную і разам з тым рэалістычна-праўдзівую танальнасць. Лірыка зліваласа тут з эпічнымі сродкамі адлюстравання жыцця, рамантычныя формы — з традыцыйна-рэалістычнымі.

Знаёмства з раннімі апавяданнямі — «Цішка Бабыль», «Як гэта часам трапляецца», «Ноччу», «З пашых дзён» і інш.— не пацвярджае меркавання даследчыкаў, што М. Зарэцкі пачынаў свой пісьменніцкі шлях як рамантык. У сапраўднасці ж творы рамантычнага светаадчування мірна суседнічалі з рэалістычнымі, хоць гэта быў яшчэ рэалізм, у якім значнае месца займалі бытавыя элементы, адсутнічала глыбокая мастацкая тыпізацыя, аналітыка.

Адначасова з паспяховай распрацоўкай пластоў і з'яў рэчаіснасці, якія асвойваліся іншымі пісьменнікамі 20-х гадоў, М. Зарэцкі ўпэўнена выходзіў на маладаследаваную ў тагачаснай літаратуры тэму — тэму трагічнага лёсу «былых», «учарашніх», лёсу людзей, якія спрабавалі, але не здолелі стаць паўнапраўнымі грамадзянамі новага жыцця (апавяданні «Ворагі», «Кветка пажоўклая» і інш.). Творы, звернутыя да гэтай вельмі складанай, вострай тэматыкі, на жаль, і ў наш час ацэньваюцца неглыбока, павярхоўна, адпабакова. Многія з іх патрабуюць свайго перагляду, новага прачытання, болей уважлівага аналізу. Зрэшты, гэта датычыць не толькі апавяданняў, але і раманаў «Сцежкі-дарожкі», «Вязьмо», дакументальна-мастацкіх нарысаў, апублікаваных раздзелаў рамана «Крывічы».

Так, калі мець на ўвазе апавяданні, у якіх закранута тэма лёсу «ўчарашніх», «былых», дык неабходна паказаць тое якасна новае, што адрознівала іх ад твораў многіх пісьменнікаў 20-х гадоў. Гаворка ідзе аб гуманістычным пафасе, аб пачуццях міласэрнасці да «былых», да пераможаных ворагаў, пачуццях дабрыні, спагады, якімі прасякнуты апавяданні М. Зарэцкага. Ідэя абароны агульначалавечых каштоўнасцей, ідэя самацэннасці чалавечай асобы, якую сцвярджаў сваімі творамі пісьменнік, не заўважалася даследчыкамі ў працэсе канкрэтнага аналізу, а гэта вяло да збеднення ўяўлення аб усёй яго творчасці. Адпаведна мы не аддавалі належнага мастакоўскай мужнасці М. Зарэцкага, шырыні яго поглядаў на жыццё, глыбокаму разуменню ім прызначэння літаратуры.

Вымагаюць прынцыповага перагляду і рапейшыя ацэнкі апавяданняў «Ой, ляцелі гусі...», «Паэма пра чорныя вочы» і інш. Спробы новага прачытання гэтых твораў зроблены ў пасляслоўі. Падкрэслена, што, напрыклад, у першым з іх нельга бачыць прапаведзь індывідуалізму, паэтызацыю маральна разбэшчанага героя. Сэнс і пафас апавядання — іншыя. Глыбока гуманістычная ідэя абароны чалавечай годнасці не ляжыць на паверхні, яна раскрываецца тонка, непазбежна, усёй сукупнасцю выяўленчых сродкаў, эмацыянальным настроем, логікай аўтарскай думкі. Апавяданне патрабуе ўважлівага падыходу, здоль-

пасці настройвацца на хвалю аўтарскага ўспрымання жыцця, разумець складанасць унутранага свету асобы.

Многія апавяданні М. Зарэцкага, як, напрыклад, «Ворагі», «Боль», «На маладое», «Кветка пажоўклая», паводле ахопу з'яў рэчаіснасці блізкія да аповесці. Творы гэтыя сведчылі, што Зарэцкаму-мастаку ўжо было цесна ў асвоеных ім жанравых рамках «малой прозы». Аповесць «Голы звер» паглядна пацвердзіла заканамернасць звароту пісьменніка да буйных жанравых форм. Непераадоленае ўздзеянне сацыялагізатарскай крытыкі 30-х гадоў перашкаджала аб'ектыўнай ацэнцы аповесці. Пісьменніка напракалі адсутнасцю ў творы станоўчага вобраза, які б супрацьстаяў адмоўнаму герою Яроцкаму, посьбіту эгаістычнай, мяшчанскай філасофіі прыстасавальніцтва, абывацельскай маралі. Зусім відавочна, што падобныя патрабаванні выспявалі ў нетрах вульгарызатарскай, нарматыўнай крытыкі, якая ў сваіх уяўленнях ішла не ад жывога вопыту мастацтва, а ад застыглых догм, прымітыўных установак. Не трэба здзіўляцца, што аўтар аповесці быў залічаны аж да «выказнікаў ідэалогіі варожага класа» [1].

У апошні час адносіны да аповесці прыкметна змяніліся. Яна ацэньваецца ўжо больш аб'ектыўна, незададзена. Даследчыкі справядліва падкрэсліваюць грамадскую актуальнасць узнятых М. Зарэцкім праблем, выразнасць пазіцыі, з якой пісьменнік выкрывае Яроцкага, прадстаўніка буржуазнага індывідуалізму. Паўсядзённымі паводзінамі герой аповесці спрабаваў сцвердзіць сваё права на ўсёдазволенасць, права ігнараваць маральныя нормы грамадскага жыцця.

Разам з тым нельга не бачыць і адпабаковасць у падыходзе некаторых літаратуразнаўцаў да твора, іх неглыбокае разуменне зместу. У супрацьлегласць дагматыкам, якія ўгледзелі ў аповесці прапаганду шкодных ідэй, сучасныя аўтары кідаюцца ў іншую крайнасць — яны спрашчаюць змест твора, гаворачы аб тым, што Яроцкі — гэта, маўляў, прывід мінулага ў сучасным, што пераможанне яго непазбежнае, ён асуджаны самім жыццём, чужы прыродзе сацыялізма і г. д. Такімі вось бадзёрымі ацэнкамі аж зіхацяць старонкі, на якіх разглядаецца аповесць. Але трэба прызнаць, што ацэнкі гэтыя зусім не адпавядаюць пафасу твора, яго ўнутранай скіраванасці. М. Зарэцкі якраз і не імкнуўся да таннага аптымізму, не сцвярджаў ідэю чужародпасці Яроцкіх умовам сацыялістычнага грамадства. Змест твора не дае падстаў рабіць вывад, нібыта герой — часовая з'ява, звязаная галоўным чынам з перыядам нэпа і актывізацыяй буржуазных элементаў. Навошта ж прыпісваць аўтару, глыбокаму аналітыку, недаравальную для мастака вузкасць поглядаў па мэты літаратуры як чыста агітацыйныя, утылітарна-прапагандысцкія? М. Зарэцкі падкрэсліваў думку аб жывучасці Яроцкіх, іх выключнай здольнасці прыстасоўвацца да любых грамадскіх умоў, выжываць у самых неспрыяльных абставінах. І ў гэтым — вялікая заслуга аўтара. Трывожнае прадбачанне М. Зарэцкага, выказанае ім у канцы 20-х гадоў, пацвердзілася шматгадовым вопытам развіцця савецкага грамадства, уключаючы не толькі перыяд сталінскага беззаконня, але і брэжнеўскага застою, калі Яроцкія станавіліся ге-

---

[1] Галавач П., Звопак А. Супраць буржуазнае рэакцыі ў мастацкай літаратуры.— Маладняк. 1929. № 11—12. С. 168.

роямі часу, гаспадарамі жыцця. А гэта яшчэ адно сведчанне неабходнасці па-новаму прачытаць творы М. Зарэцкага, бо яны вытрымалі праверку часу.

Сказанае цалкам датычыць і рамана «Сцежкі-дарожкі», які друкаваўся па старонках часопіса «Полымя» за 1927 год, № 1—7, а затым выйшаў асобным выданнем у 1928 годзе, і дакументальна-мастацкіх нарысаў «Падарожжа на новую зямлю» (1929), «Лісты ад знаёмага» (1931), дзе змешчаны і нарыс «Вясна 1930 года». Гісторыка-літаратурная ацэнка гэтых твораў сёння ўспрымаецца як павярхоўная, шмат у чым састарэлая, спрошчаная, пяпоўная. Многае ў творах засталося незаўважаным, абмінутым даследчыкамі, а гэта перашкаджае ўспрымаць іх змест ва ўсёй глыбіні.

Раман «Сцежкі-дарожкі» быў значным крокам пісьменніка па шляху мастацкага спасцiжэння складанай, шматгранпай тэмы рэвалюцыі, тэмы грамадзянскай вайны, цяжкіх пошукаў інтэлігенцыяй дарог у рэвалюцыю. Даследчыкамі справядліва адзначаны многія станоўчыя бакі рамана, яго бясспрэчныя ідэйна-мастацкія вартасці — перш за ўсё праблемнасць, шырыня ахопу рэчаіснасці, уменне пісьменніка дакладна перадаваць грамадска-палітычную атмасферу эпохі, праўдзіва паказваць чалавека ў яго шматлікіх сувязях з грамадскім жыццём, з жыццём народа, майстэрства псіхалагічнага аналізу і г. д. «Актуальная праблематыка і новы герой, пафас сцвярджэння народнай перамогі, праўдзівасць як аснова мастацкага адлюстравання, рэвалюцыйная рамантычная накіраванасць твора — усё гэта ставіла «Сцежкі-дарожкі» ў лік лепшых твораў беларускай літаратуры 20-х гадоў, а М. Зарэцкага — у рады пачынальнікаў літаратуры сацыялістычнага рэалізму» [1],— слушна зазначае адзін з сучасных даследчыкаў рамана.

Аднак гэтыя і падобныя да іх фармуліроўкі, справядлівыя самі па сабе, часта не атрымліваюць глыбокага, змястоўнага папаўнення, не пацвярджаюцца аналізам вобразнай сістэмы твора. У прыватнасці, недастаткова падкрэслена прынцыповае непрымanne М. Зарэцкім павярхоўнай гераізацыі станоўчых герояў рамана, тэндэнцыі паказваць рабочы клас у ружовым святле. Вобраз рэвалюцыі малюецца пісьменнікам не ва ўзвышана-патэтычнай танальнасці, а ў рэалістычных фарбах. Вось як пададзены ў рамане лютаўскія падзеі 1917 года: «Рэвалюцыя ўціскалася ў горад замаруджана, туга. Багамольнае, манархічна настроенае гарадское мяшчанства чытала газеты, пускала розныя, часам страшэнна недарэчныя, плёткі, вохкаючы, жалячыся на дарагоўлю харчоў, чакала ўсё нечага, што немінуча прыйдзе і знішчыць тую няпэўнасць, якая трывожна лупае ў паветры, верне зноў над ногі знаёмы, абыклы грунт, пахіснуты лютаўскім наўстанем».

Патрабуе больш заглыбленага разгляду і сюжэтная лінія ўзаемаадносін галоўнага героя рамана Васіля Лясніцкага і рабочага Андрэя, якія па-рознаму разумеюць ролю і месца інтэлігенцыі ў рэвалюцыйнай барацьбе. Андрэй бачыў сваю задачу ў тым, каб распальваць класавую нянавісць працоўных супраць

---

[1] Майсеенка А. Творчасць Міхася Зарэцкага. Мн., 1978. С. 50—53.

прыгпятальшікаў. Лясніцкі таксама добра разумеў вытокі варожасці працоўпага люду да сваіх спрадвечных крыўдзіцеляў, шчыра спачуваў абяздоленаму народу, але яго палохала тая празмерпая жорсткасць, шматлікія ахвяры, разбурэнні, якімі суправаджалася барацьба. Яго палохаў апархічны бупт, які нёс з сабой негатыўныя тэндэпцыі для будучага развіцця грамадства. І Ляспіцкі лічыў сваім абавязкам не распальваць, а стрымліваць абуджаныя інстынкты руйнавання і бязлітаснай помсты, бо «чуў у хваляваннях патоўпу цяжкую пагрозу, бачыў у распалепых ліхаманкава-бліскучых вачах чорпую здань гвалтавання, пажараў, жудаснай дзікай апархіі».

Гаворачы аб вялікай ролі рабочага Андрэя ў фарміраванні светапогляду Лясніцкага, даследчыкі яўна перабольшвалі гэты ўплыў, паколькі Андрэй з яго заклікамі распальваць пажар пянавісці, разбураць усе законы і нормы жыцця не разумеў сцвярджальнай сутнасці рэвалюцыі, не прымаў гуманістычнага пафасу, ідэі неабходнасці абароны чалавека. Гэты момант прынцыпова важпы для разумення ідэйпа-філасофскай канцэпцыі раманіста, недастаткова выразна падкрэсліваецца ў гісторыка-літаратурных працах, што зніжае агульнае ўяўленне адносна мастацкіх вартасцей рамана і яго наватарскай сутнасці.

Вузкай, спрошчапай, аднабаковай трэба прызнаць і ацэнку вобраза рэвалюцыянера-народніка Матруніна, які звычайна разглядаецца як вобраз адмоўны. Аднак у рамане ён пазбаўлены вузкай аднапланавасці. Матрунін заклікаў моладзь самаахвярна служыць народу, несці ў гушчу працоўных святло навукі, культуры, выхоўваць грамадзянскія пачуцці, стваральныя пачаткі жыцця. Стары народнік аказаў на Ляснідкага значны ўплыў пры выбары ім маральнай пазіцыі, хоць уласпая палітычная пазіцыя Матруніна, яго адносіны да сацыялістычнай рэвалюцыі, да бальшавікоў аказаліся супярэчлівымі, непаслядоўнымі. Недаацэнены вобраз Нікадзіма Славіна. Многія яго выказванні без належных падстаў характарызуюцца ў іранічным плане. Аднабаковай, спрошчапай трэба прызнаць і характарыстыку вобраза паненкі Раісы і ўзаемаадносіны з ёю Ляснідкага. У рамане ўвогуле шмат мясцін, якія зусім выпалі з поля зроку даследчыкаў або разглядаюцца павярхоўна (адносіны Ляснідкага да народных легенд і паданняў і г. д.).

Канец 20-х — пачатак 30-х гадоў пазначаны драматычным паваротам у жыцці і творчай біяграфіі Зарэцкага. З аднаго боку, працягваецца яго плённая творчая праца і грамадска-культурная дзейнасць: надрукаваны раман «Сцежкі-дарожкі», завершана працяглая (канец жніўня — сярэдзіна кастрычніка 1927 г.) паездка ў складзе групы беларускіх пісьменнікаў у Чэхаславакію, Германію, Францыю, Латвію, дзе мелі месца цікавыя сустрэчы з многімі майстрамі літаратуры і дзеячамі культуры Захаду, па-ранейшаму выходзяць повыя кнігі — зборнік апавяданняў «На чыгунцы» (1928), паспяхова асвойваюцца новыя, яшчэ нязвыклыя для празаіка жанравыя формы, у прыватнасці, драматычныя: у часопісе «Полымя» (1928, № 6) М. Зарэцкі выдрукоўвае сваю першую п'есу «Віхор на балоце», у часопісе «Маладняк» (1928, № 12 і 1929, № 1) — драму «Белыя ружы».

Як бачым, творчая дзейнасць пісьменніка разгортваецца актыўна, дынамічна, па ўзыходпай лініі. Але ў жыцці часта здараецца так, што поспехі, дасягненні, удачы азмрочваюцца нечаа-

канымі падзеямі. Вось і над галавой М. Зарэцкага пачалі збірацца цёмныя хмары, прагучалі зусім не веснавыя грымоты. А прычынаю згушчэння небяспечнай атмасферы паслужылі новыя творы, у якіх пісьменнік не патрапіў у тон новым палітычным устаноўкам, выкліканым пачаткам калектывізацыі і разгортваннем барацьбы супраць т. зв. пацдэмаўшчыны. Такімі творамі з'явіліся нарыс «Падарожжа на повую зямлю», змешчаны ў «Савецкай Беларусі» ў кастрычніку 1928 года, і раман «Крывічы», друкаванне якога ў «Полымі» (1929, № 4) было нечакана перапынена і які, за выключэннем апублікаванай часткі, па ўсім відаць, беззваротна страчаны для нацыянальнай літаратуры. А твор гэты абяцаў быць значнай падзеяй літаратурнага жыцця рэспублікі. Самабытны талент празаіка раскрываўся тут новымі гранямі. Глыбокая цікавасць пісьменніка да праблемы нацыянальна-самабытных асноў народнага жыцця надала яму новы моцны імпульс, раскрыла яго багатыя патэнцыяльныя магчымасці. Міхась Зарэцкі відавочна вырастаў у буйнейшага нацыянальнага эпічнага мастака. Зусім заканамерна, абумоўлена унутранай логікай станаўлення светапогляду, аказалася і яго цікавасць да гістарычнага мінулага беларускага народа. Газета «Звязда» ад 22 снежня 1928 года паведамляла аб маючай быць публікацыі ў часопісе «Полымя» за першую палову 1929 года гістарычнай драмы М. Зарэцкага «Рагнеда». Аднак лёс і гэтага твора таксама аказаўся нешчаслівым — намеры пісьменніка надрукаваць драму засталіся нерэалізаванымі, няздзейсненымі, і тэкст яе не знойдзены.

Нарыс «Падарожжа на новую зямлю» і пачатковыя раздзелы «Крывічоў» не толькі пасля іх надрукавання, але і на доўгія гады сталі аб'ектам грубай, разноснай крытыкі, а іх аўтар — аб'ектам беспадстаўных палітычных абвінавачванняў. У нарысе М. Зарэцкага былі выказаны прыхільныя адносіны да мерапрыемстваў, якія ў канцы 20-х гадоў праводзіў беларускі наркамат земляробства на чале з З. Прышчэпавым, а ў раздзелах рамана закрануты пытанні нацыянальна-культурнага будаўніцтва, былі выведзены героі, якія ў разуменні нацыянальных праблем стаялі на розных пазіцыях, прытрымліваліся розных поглядаў. Гэтых фактаў аказалася зусім дастаткова, каб залічыць М. Зарэцкага да ідэолагаў нацдэмаўшчыны, абвясціць яго выразнікам антыпралетарскіх, антысавецкіх поглядаў. «Вораг у доме» — так называўся артыкул С. Будзінскага («Полымя», 1929, № 11—12). І гэта назва вельмі дакладна перадае сэнс і характар палітычных абвінавачванняў у адрас М. Зарэцкага.

Настойлівыя просьбы пісьменніка не выносіць канчатковага прысуду, а пачакаць завяршэння публікацыі рамана, у фінале якога і будуць расстаўлены ўсе ідэйна-сэнсавыя акцэнты, засталіся марнымі. Не ўдалося яму абвергнуць і фальсіфікатарскія выдумкі адносна зместу і накіраванасці нарыса «Падарожжа на новую зямлю». На сходзе партыйных ячэек Беларускага дзяржаўнага выдавецтва «Падарожжа...» і творы апошніх гадоў былі залічаны да «антыпартыйных і антысавецкіх», а сам пісьменнік быў выключаны з бальшавіцкай партыі. Зусім відавочна, што такое пакаранне было ў вышэйшай ступені несправядлівым, гэтакімі ж абсурднымі былі і абвінавачванні яго твораў у іх антысавецкай скіраванасці.

У вачах «нястрыманых рупліўцаў» ускладняў «віну» пісьменніка — «лазутчыка класавага ворага» (Рабочий, 8 снежня. 1929) —

і яго актыўны ўдзел у т. зв. тэатральнай дыскусіі і ў абмеркаванні праблем развіцця беларускага кіно. Сваімі выступленнямі на старонках «Савецкай Беларусі» ў 1928 годзе — артыкулы «Два экзамены: Да пытання аб тэатральнай крытыцы» (18 студзеня) і «Чым пагражае нам Белдзяржкіно: Да крытыкі тэматычнага плана» (2, 3 лістапада) — М. Зарэцкі рашуча падтрымліваў думку аб неабходнасці ўважлівых адносін да нацыянальнай культуры. З прынцыповых пазіцый крытыкаваў пісьменнік тэатральных дзеячаў і чыпоўпікаў ад мастацтва, якія ігнаравалі даўно наспелыя праблемы развіцця беларускага тэатра, кіно, пагардліва ставіліся да нацыянальнага рэпертуару, замяняючы яго пераклад-ными касавымі п'есамі. Такая тэатральная палітыка, калі перавага аддавалася папулярным, але маламастацкім творам, была небяспечнай для беларускай культуры, перашкаджала ўзбагачэнню яе ўласных нацыянальных традыцый. Пра гэта з усёй выразнасцю сказаў М. Зарэцкі, выявіўшы грамадзянскую смеласць, належную шырыню поглядаў на суадносіны нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў літаратуры, мастацтве: «Што мы павінны браць у суседніх і блізкіх ад нас па агульнай накіраванасці культур: расійскай, украінскай, і інш.? Адказ можа быць адзін: самае лепшае, самае каштоўнае, чаго яны дасягнулі. Мы павінны браць шэдэўры, якія могуць быць прыкладам у будаўніцтве нашай уласнай культуры. А ў нас робіцца зусім інакш. Мы часта падбіраем усё, што валяецца ў іх на задворках, ад чаго яны самі адмаўляюцца, мы падбіраем замест шэдэўраў бруднае пустое пазадзе» (Сав. Беларусь, 2 лістап., 1928).

І гэтыя выказванні ўдзельніка дыскусіі былі расцэнены беспрынцыпнай крытыкай як праявы нацыяналізму, як варожыя выпады супраць рускай культуры. Фактычна на старонках перыядычнага друку фальшывымі абаронцамі ідэйнай чысціні шэрагаў беларускай літаратуры была развязана ганебная кампанія здзеку, шальмавання аднаго з найбольш таленавітых пісьменнікаў. М. Зарэцкі апынуўся ў цяжкім, бязвыхадным становішчы. Фактычна ён быў пазбаўлены магчымасці адказаць нядобрасумленным апанентам, давесці грамадскасці поўную беспадстаўнасць іх абвінавачванняў, абвергнуць фальсіфікатарскія прыёмы тагачаснай крытыкі.

І ўсё ж нельга не захапляцца грамадзянскай мужнасцю М. Зарэцкага, сілай яго духу. Якую трэба мець веру ў гуманістычныя ідэалы рэвалюцыі, каб насуперак публічным абразам, паклёпніцкім выдумкам, небяспечным абвінавачванням у нацыяналізме ўсё ж выстаяць і працягваць актыўную творчую дзейнасць!

Вядома, пісьменнік вымушаны быў, улічваючы рэальную сітуацыю, рабіць пэўныя ўступкі тагачасным патрабаванням. Пра гэта сведчаць, напрыклад, яго апавяданні «Хвіліна» і «Пра дзеда Альпіна», змешчаныя на старонках часопіса «Чырвопая Беларусь» адпаведна ў нумарах 15 і 18 за 1930 год.

Вось змест апавядання «Пра дзеда Альпіна». Старшыня сельскага Савета зачытвае пастанову аб экспрапрыяцыі кулака Альпіна, пібыта віпаватага ў «злачынным продажу жывёлы», у «сістэматычнай агітацыі супраць калгаснага будаўніцтва». За «ашуканскі разлік з парабкамі» давядзецца дзеду яшчэ і вялікі штраф заплаціць — аж у 300 рублёў. Калі ж «ліхія печаканыя госці» пакінулі хату, Альпін перахаваў скрутак з грашыма, адпак пяцігадовы ўнук высачыў схованку і, палічыўшы залатыя кружэ-

лачкі за дзіцячыя цацкі, панёс іх на вуліцу. Ашалелы ад роспачы дзед спрабаваў задушыць свайго ўнука, але злачынства было прадухілена пільным старшынёй, які не паверыў дзеду, западозрыў яго ў хітрасці, машэнстве і таму нечакана зноў вярнуўся на падворак Альпіна.

Перад намі, як бачым, тыповы прыклад т. зв. сацыяльнага заказу на тэму выкрыцця шкоднай дзейнасці кулацтва ва ўмовах абвастрэння класавай барацьбы. Тое, што тут мела месца вымушаная ўступка пісьменніка ідэалагічным патрабаванням часу, а не свядомая ўстаноўка мастака на распальванне пачуццяў нянавісці да заможнай часткі сяляцтва,— бясспрэчна. Пацвярджэннем сказанаму служыць змест усёй папярэдняй творчасці пісьменніка. Ды і ў гэтым апавяданні ёсць момапты, скіраваныя на нейтралізацыю яго шібыта антыкулацкага, выкрывальнага пафасу. Так, абвастрэнне сітуацыі ў значнай ступені абумоўлена выпадкам, звычайнай цікаўнасцю маленькага хлапчука, якога нельга западозрыць у зламысных намерах, у свядомым жаданні падвесці дзеда, выкрыць яго хцівасць. «Нечаканыя ліхія госці», якія паведалі хату Альпіна,— гэта таксама не агаворка. Невыпадкова і тое, што віна заможнага селяніна ў творы не даказана, яна толькі дэкларуецца гасцямі, а дзед вымушаны рабіць тое, што яму загадаюць.

Можна прывесці і яшчэ шэраг сведчанняў таго, што М. Зарэцкі ў пачатку 30-х гадоў пад уплывам неспрыяльных грамадска-палітычных абставін насуперак уласным ідэйным перакананням вымушаны быў ісці па пэўныя кампрамісы. Ёсць яны і ў парысах «Лісты ад знаёмага» і «Вясна 1930 года» (адпаведна «Полымя», 1930, № 4 і № 5—6). Таксама ў часопісе «Полымя» (1931, № 2) пісьменнік друкуе пад назвай «Рубеж» урывак з маючага быць рамана «Смерць Андрэя Беразоўскага», дзе павінна была выпраўлена пібыта ўласцівая «Крывічам» ідэалагічная невыразнасць і супярэчлівасць аўтарскай пазіцыі, абвергнуты няслушныя меркаванні герояў ранейшага твора.

Што датычыць парысаў, дык тут таксама ёсць мясціны, дзе М. Зарэцкі вымушана падтрымлівае агульную лінію мерапрыемстваў па суцэльнай прымусовай калектывізацыі, што аб'ектыўна ўспрымаецца як адступленне пісьменніка ад ранейшай гуманістычнай пазіцыі, ад прынцыпаў рэалістычнага адлюстравання сацыяльнай рэчаіснасці. Але разам з тым у парысах нямала старонак, якія сведчаць аб нязменнасці ідэйных поглядаў і маральных перакананняў М. Зарэцкага, аб імкненні і надалей дзейсна абараняць інтарэсы народа, працоўнага сялянства. Але нават і ў замаскаванай форме рабіць гэта станавілася ўсё цяжэй і цяжэй: не драмала пільнае вока крытыкаў, пастаўленых сачыць за так званымі ідэалагічна пясталымі, палітычна непадзейнымі пісьменнікамі, у ліку якіх знаходзіўся, вядома, і М. Зарэцкі.

Вось гэты непадробны драматызм сітуацыі, у якой знаходзіўся на пачатку 30-х гадоў М. Зарэцкі, і яго без перабольшання гераічныя намаганні захаваць годнасць сумленнага пісьменніка наглядна раскрывае раман «Вязьмо» (Полымя рэвалюцыі, 1932, № 1—4; 1933, № 1, 2—3). Гэты твор заслужана высока ацэнены крытыкай. «Вязьмо» — «першы ў беларускай літаратуры празаічны твор на матэрыяле сучаснасці, у якім глыбіня і шырыня ахопу рэчаіснасці, сапраўдная праблемнасць шчасліва спалучыліся з

сюжэтна-кампазіцыйнай завершанасцю, змястоўнасцю характару і майстэрствам іх выяўлення»[1],— пісаў С. Гусак.

Высокай думкі пра «Вязьмо» прытрымліваецца і А. Майсеенка, аўтар кнігі «Творчасць Міхася Зарэцкага», амаль палова якой прысвечана разгляду гэтага твора.

Тым не менш, як і ў выпадку з раманам «Сцежкі-дарожкі» і некаторымі іншымі творамі, ранейшыя ацэнкі патрабуюць істотнага перагляду, а сам твор — новага, сучаснага прачытання пад кутом гледжання новых гістарычных ведаў аб працэсе калектывізацыі ў краіне. Аспоўную вартасць рамана даследчыкі бачылі ў мастацкай выразнасці, з якой пісьменнік выкрываў скрыўленні партыйнай лініі ў правядзенні суцэльнай калектывізацыі і пры гэтым узвышаў свой голас у абарону ахвяр «страшнага калектывізатара» Пацяроба. Ахвярамі ж яго былі не толькі сераднякі, якія ўстрымліваліся ад таго, каб добраахвотна прымаць новыя формы гаспадарання, але і беднякі. Яны таксама трапілі ў лік гаспадароў, прызначаных для высялення за межы раёна.

Але праўдзівым узнаўленнем рэальных абставін калектывізацыі, майстэрствам абмалёўкі характару канкрэтных герояў, раскрыццём іх псіхалогіі не вычэрпваецца ідэйна-мастацкая вартасць «Вязьма». Дзякуючы атмасферы галоснасці і ўсталяванню прынцыпаў дэмакратызму ў грамадскім жыцці сёння мы маем магчымасць адкрыта, не баючыся палітычных абвінавачванняў, сказаць, што раман М. Зарэцкага «Вязьмо» — гэта адзін з нямногіх твораў у беларускай, а можа, і ўсёй савецкай, літаратуры пачатку 30-х гадоў, дзе ў сюжэтна-вобразнай форме праведзена *ідэя немэтазгоднасці суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі.*

Як канкрэтна выяўляецца ў рамане гэта крамольная на той час ідэя? Сівалапаўская моладзь арганізуе *колькасна нешматлікі калгас на строга добраахвотнай аснове.* У кантэксце тых спрэчак, якія вядуць героі «Вязьма», такі калгас якраз і ўспрымаўся як найболей мэтазгодная форма вырашэння праблем тагачаснай перабудовы вёскі. Зусім лагічна, што галоўны герой рамана Сымон Карызна, які падтрымлівае лінію Пацяроба на суцэльную калектывізацыю, ідэю добраахвотнага калгаса адкінуў *як нібыта шкодную і злачынную* «ва ўмовах абвастрэння класавае барацьбы і напружанай працы па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі». Але злачыннай яна ўяўлялася толькі тым, хто паслухмяна праводзіў у жыццё авантурную і ў гаспадарча-эканамічных адносінах згубную палітыку сталінскай мадэлі калектывізацыі. Невыпадкова і тое, што Сымон Карызна, не здолеўшы лагічна абвергнуць сваіх апанентаў, у мэтах іх дыскрэдытацыі звяртаецца да заганных прыёмаў: прыхільнікі добраахвотнага калгаса былі абвінавачаны ім у тайнай фракцыйнай дзейнасці, што не мела нічога агульнага з сапраўднасцю.

Вядома, адкрыта асуджаць план суцэльнай калектывізацыі М. Зарэцкі ў той час не мог, а тым болей адкрыта супрацьпаставіць яму ідэю арганізацыі колькасна нешматлікіх добраахвотных калгасаў. Зусім відавочна, што твор з такой шэўнай палітычнай арыентацыяй ніхто не стаў бы друкаваць. Тым болей калі ён належаў неблаганадзейнаму пісьменніку, якога зусім нядаўна публічна выкрывалі як «лазутчыка класавага ворага», пра-

[1] Полымя, 1967, № 9. С. 230.

пагандыста буржуазпай ідэалогіі, выразніка антыпралетарскіх поглядаў. Вось чаму М. Зарэцкі вымушаны быў пэўным чынам маскіраваць сваю ідэю, згладжваць яе небяспечную вастрыню. Формы маскіроўкі былі розныя. Гэта і гучныя прамовы галоўнага героя (героя, а не аўтара!), скіраваныя супраць кулацкіх элементаў, як нібыта асноўпай сілы супрацьдзеяння калектывізацыі, і асуджэппе левых загібшчыкаў тыпу Пацяроба, і антымістычны фінал рамана.

І ўсё ж гэтыя і іншыя прыёмы маскіроўкі не могуць схаваць ад чытача галоўнага ў творы, а імеппа яго выразнай скіраванасці на абаропу інтарэсаў працоўнай вёскі, асуджэння гвалту над земляробам, якому прымусова навязвалі немэтазгодныя формы калектыўнага гаспадарання.

Характэрнай асаблівасцю «Вязьма» як рамана пра калектывізацыю з'яўляецца тое, што ў ім фактычна няма кулакоў, калі не лічыць Гвардыяна, далёкага ад таго штампаванага вобраза бязлітасных эксплуататараў, якімі былі запоўпены старонкі многіх твораў 30-х гадоў. У «Вязьме», вядома, мае месца раскулачванпе, але за межы раёна высяляюць не кулакоў, а «прызначаных для гэтае мэты сівецкіх гаспадароў». Такая фармуліроўка яскрава выяўляе гуманістычную пазіцыю пісьменніка, яго адносіны да трагічнага становішча вёскі, у якім яна аказалася падчас суцэльнай калектывізацыі.

Гуманізм Зарэцкага-мастака гэтак жа акрэслена выявіўся і ў дачыненні да іншых дзейных асоб рамана. Пісьменнік не здымае асабістай віны з Сымона Карызны, актыўнага саўдзельніка жорсткіх, бесчалавечных акцый Пацяроба. Віна гэта — відавочная, але разам з тым у творы раскрываюцца і прычыны, якія штурхнулі Карызну на шлях пацяробаўшчыны. Сваім раманам М. Зарэцкі выпес рашучы прысуд эпосе сталінізму, якая абесчалавечвала сумленных людзей, вытручвала з іх душ пачуцці даблавечвала сумленных людзей, вытручвала з іх душ пачуцці даблавечвала сумленных людзей, вытручвала з іх душ пачуцці дарыні і спагадлівасці. На жаль, вось пра гэтую ўласцівую «Вязьму» філасофскую, маральна-этычную глыбіню даследчыкі напярэдніх гадоў не маглі гаварыць адкрыта, на поўны голас.

Абумоўлепая аб'ектыўнымі прычынамі звужанасць падыходу адбілася на агульным успрыманні твора, на разглядзе яго вобразнай структуры. У прыватнасці, вобраз Сымона Карызны ў даследчых працах падаецца аднабакова. На першы план вылучаны кар'ерысцкія нахілы, прыстасавальніцтва героя. Станоўчыя ж якасці натуры, суб'ектыўная сумленнасць не прыкмячаюцца. Хіба ж нельга не ўлічваць таго, што Сымон Карызна садзейнічаў высяленню сялян на хутары з дазволу ўлады і цяпер перажывае, што ягоныя ўчынкі кваліфікуюцца як палітычна шкодныя. Але якая ж у гэтым асабістая віна Карызны перад пародам і партыяй?

Гэтак жа адпабакова, спрошчана разглядаецца і вобраз рабочага Зеленюка. Даследчыкі звычайна характарызуюць яго як антыпод Карызны. Адпак па-за іх увагай засталася абмежаванасць гэтага героя, які не мае самастойнага погляду на падзеі калектывізацыі. Ён усяго толькі паслухмяны выкапаўца чужой волі. Зелянюк вузка, павярхоўна глядзіць на сялянскае жыццё, бачыць там адно цемнату, палітычную адсталасць. А вось стваральных пачаткаў у побыце працоўпай вёскі прадстаўнік горада не заўважае.

Хоць вобраз сівецкага мудрагеля Ахрэма Пупціка па мянуш-

цы Галілсй у працах апошніх гадоў заняў больш прыкметнае месца, ён таксама ацэньваецца адпабакова, павярхоўпа. Так, напрыклад, дзівацтва Галілея — гэта не толькі сродак індывідуалізацыі яго характару, але і форма выяўлення аўтарскай ідэйна-філасофскай канцэпцыі, спроба засцярогі ад нападак вульгарызатарскай крытыкі. На жаль, вось такія момапты не знаходзяць свайго перакапальнага вытлумачэння ў даследчых працах. А многія сэпсава шматзначныя сітуацыі ўвогуле абмінаюцца пры разглядзе вобраза Галілея, як, напрыклад, сцэна, калі Ахрэм, схаваўшыся ад людзей, спявае песню, у якой былі словы:

Мёртвых цел ляжаць пракосы,
Кроўю краскі зацвілі.

Песня гучыць як прадчуванне трагічнай будучыні, што чакае працоўнае сялянства, якое Пацяроб гвалтам заганяе ў калгас.

Недастаткова глыбока раскрыта і роля Галілея як звязуючага звяна ў вобразнай сістэме рамана. Галілей дапамагае глыбей выявіць сапраўдныя аўтарскія адносіны да Карызны, Пацяроба, Зеленюка, Гвардыяна, Веры Засуліч і іншых герояў.

Як бачым, раман «Вязьмо» яшчэ чакае грунтоўнага прачытання, паглыбленага аналізу яго зместу і вобразна-выяўленчага багацця. Раман сведчыў аб сапраўдным росквіце самабытнага таленту пісьменніка, аб няспынным спасціжэнні мастаком глыбінь народнага жыцця.

Выхад рамана «Вязьмо» ў свет быў прыхільна сустрэты чытачом. На літаратурным конкурсе ў гонар 15-й гадавіны Кастрычніка раман М. Зарэцкага, як вядома, быў адзначаны ў ліку лепшых твораў. Праўда, артадаксальная крытыка 30-х гадоў у асобе Я. Бранштэйна, М. Клімковіча і адказных ідэалагічных работнікаў рэспублікі Ю. Жаброўскага, О. Канакоціна, Д. Коніка па традыцыі шукала і знаходзіла ў рамане ідэйныя хібы, а па сутнасці прыпісвала пісьменніку тое, чаго не было ў яго творы. Асаблівай спрытнасцю ў адвольнай інтэрпрэтацыі рамана вызначаўся Я. Бранштэйн («Апошні рэйд шукальнікаў хараства з сівецкага сельсавету».— Полымя рэвалюцыі, 1933, № 8—9; «Пра беларускую савецкую прозу».— Полымя рэвалюцыі, 1934. № 8). Паказальна, што ў справаздачным дакладзе Аргкамітэта ССП Беларусі першаму Усебеларускаму з'езду пісьменнікаў, з якім выступіў М. Клімковіч, раман «Вязьмо» не прыгадваецца нават у пераліку твораў, прысвечаных калектывізацыі. Адзінае, на што прамоўца палічыў патрэбным звярнуць увагу дэлегатаў і гасцей з'езда, дык гэта на ідэалагічныя памылкі, якія ў мінулым быццам бы дапускаў пісьменнік. «На нашу думку,— сцвярджаў М. Клімковіч,— т. Зарэцкі зараз зразумеў памылковасць сваіх пазіцый і хаця павольна, але з яўным жаданнем перабудоўваецца, мяняючы не толькі герояў, але і тэматыку сваёй творчасці».

«Мяняў» герояў і тэматыку М. Зарэцкі не дзеля таго, каб публічна засведчыць сваю перабудову. Сумленнаму пісьменніку не трэба было перабудоўвацца. Пошукі новых тэм і герояў дыктаваліся логікаі творчага развіцця. Але гэтыя пошукі былі ўскладнены тым, што М. Зарэцкі знаходзіўся пад пільным наглядам крытыкі, якая па-ранейшаму не давярала яму, насцярожана, падазрона ставілася да ўсяго, што ствараласа ім. Вось чаму з-пад пяра пісьменніка ў гэты час з'яўляюцца творы ў асноўным на

апрабаваную ўжо, меш вострую тэму. Гэта сярэдняга ўзроўню «калгасныя» апавяданні «Парася» (1931), «Пачатак шчасця», «Пётрык і Пятрусь» (1932), нарысы па вытворчую тэму «Другая сістэма», «Новы вобраз Беларусі» (1934) і інш.

На аснове сюжэта «Вязьма» М. Зарэцкі стварае драматычную аповесць «Сымон Карызпа» (1935). У часопісе «Полымя рэвалюцыі» друкуе п'есу «Ная» (1936). У гэты ж час ён піша кінасцэнарый «Пачатак шчасця» і — паводле аповесці А. С. Пушкіна — п'есу «Дуброўскі». Працуе над раманам на матэрыялах Касцюковіцкага шклозавода.

Актыўна выступае пісьменнік і ў перыядычным друку з крытычнымі матэрыяламі, пра што сведчаць яго артыкулы «За глыбокае раскрыццё рэчаіснасці» (1933), «Новыя тэмы вядуць наперад», «Стапем сапраўднымі інжынерамі душ», «Некаторыя творчыя пытанні» (усе — 1934), «На шляху да мастацка-творчае дужасці», «Пра раман «Дужасць» Б. Мікуліча», «Вобразы ў «Дужасці» Б. Мікуліча» (усе — 1935). Глыбокай праблемнасцю пазначаны і прамовы М. Зарэцкага на 1-м Усебеларускім пісьменніцкім з'ездзе, на III пленуме Праўлення ССП Беларусі, прысвечаным маладзёжнай літаратуры (садаклад па творчасці Б. Мікуліча, 1934); на сходах беларускіх пісьменнікаў па пытаннях барацьбы з фармалізмам і патуралізмам (1936); на творчай сустрэчы з калектывам БДТ-П у Віцебску, прысвечанай праблемам развіцця тагачаснай драматургіі (1936), і інш.

На жаль, багатым творчым планам і намерам Зарэцкага-празаіка, драматурга, публіцыста не суджана было здзейсніцца. Арышт спыніў усе яго творчыя пошукі, а неўзабаве пісьменніка не стала. Беларуская літаратура беззваротна страціла яшчэ адпаго талепавітага майстра слова, які б, несумненна, здолеў узбагаціць яе новымі выдатнымі творамі. Але і тое, што паспеў напісаць М. Зарэцкі, застанецца ў гісторыі беларускай літаратуры, а імя пісьменніка — у памяці ўдзячных пашчадкаў.

Сёння перад беларускімі літаратуразнаўцамі стаіць задача — сабрань спадчыну Міхася Зарэцкага, перагледзець існуючыя крытычныя ацэнкі яго апавяданняў і п'ес, раманаў і нарысаў, каб выдатная роля пісьменніка ў развіцці нацыянальнай літаратуры раскрылася поўна і ўсебакова. Новае прачытанне твораў М. Зарэцкага дасць магчымасць у іншым святле ўбачыць тое каштоўнае, што зроблена беларускімі майстрамі слова 20-х — пачатку 30-х гадоў: выпрацаваная імі традыцыя адлюстравання рэчаіснасці, узятай ва ўсёй яе складанасці і супярэчлівасці, сёння заслугоўвае актыўнага працягу і ўзбагачэння.

М. Зарэцкі належаў да тых мужных пісьменнікаў, хто сваёй творчасцю актыўна змагаўся супраць ідэалогіі сталінізму, не прымаў антыгуманных ідэалагічных установак 30-х гадоў, супрацьдзейнічаў іх практычнаму ўвасабленню. А гэта тэма — супраціўленне літаратуры рэжыму таталітарнай улады — яшчэ чакае свайго даследавання.

Міхась Мушынскі

АПАВЯДАННІ

ЦІШКА БАБЫЛЬ

I

Гэта быў шавец. Самы звычайны. Жыў у невялічкай вёсцы Пракудзіне. Больш стар'ё правіў, а зрэдку і новыя боты майстраваў. Толькі рэдка такое свята яму выпадала, бо, праўду кажучы, у вёсцы, апрача Рамана Грышчанка, не было дужа заможных.

Сядзіць Цішка ў маленькай — што гняздзечка — старэнькай хацінцы, дзяўбе сваім кляўцом, хістаецца над старадаўнай, папарэзанай, папраколанай, чорнай і бруднай скрыняй, закіданай усялякім начыннем, і пяе. Не пяе, а так бубніць пад нос, цягне цянюткім, сіплым галаском. Невыразліва, аднатонна. Пяе і стукае кляўцом.

У Цішкі нічога не было. Ён быў самы бедны ва ўсёй вёсцы, дый блізка ва ўсёй акрузе. Нават сям'ёй і то быў пакрыўджаны. Баба памёрла гады цераз два пасля вяселля, пакінуўшы малога хлопчыка. З ім і жыў цяпер Цішка. Дый той больш па людзях цёрся, рэдка калі ў дварэ быў.

Бабыль. Так і звалі ўсе Цішку. Гэта было яго прозвішча.

Цішка быў ціхі, рахманы чалавек. Нікога не чапаў, нікога не крыўдзіў. Ды яно хоць бы й захацеў каго пакрыўдзіць, дык, пэўна, не здолеў бы. Што ён мог зрабіць? Ці прыціснуць каго сваім багаццем? Ці сілу сваю над кім паспрабаваць? Бядота, слабейка — хоць бы самому як абараніцца!

Але, праўду сказаць, і яго ніхто дужа не важыўся крыўдзіць. Нават паважалі яго, як гэта ні дзіўна. Гэта ж ужо ўсюды такі звычай, што над бабылём і пасмяюцца, і пакпяць з яго, а часам і штурхнуць нават. А тут — не.

Любілі й над Цішкам пажартаваць мужчыны, сабраўшыся калі-небудзь увечары; асабліва як пачынаў ён разважаць аб сваім жыцці, аб падзеях сваіх, планах і г. д. або як пачынаў выкладаць свае погляды на сельскую гаспадарку, якой яму блізка піколі не прыходзілася займац-

ца і якую ён спадзяваўся калі-небудзь завесці і на добры лад паставіць. Смяяліся мужчыны, у канцы і сам Цішка смяяўся. Але пагарды не чувалася ў мужчынскім смеху.

І калі па Цішкаваму твару прабягаў цень сур'ёзнасці, а вадзяніста-блакітныя вочы ў задуменні ўпіраліся ў падлогу, смех сяброў адразу прымаў нейкі штучны, вымушаны характар і хутка зусім спыняўся.

Зірнуўшы ў твар Цішку, можна было адразу зразумець, што гэты чалавек, як той кажа, «сам сабе наўме». Пад альнянымі вусікамі заўсёды бегала ўсмешачка, якая быццам гаварыла ўсім, што Цішка нешта ведае. Толькі пакуль што нікому гаварыць не хоча. Калі-небудзь скажа — няхай толькі час прыйдзе, а цяпер — ні... чакаць трэба.

А ці ведаў што Цішка Бабыль? Хто яго знае... Мусіць, што ведаў, бо надта спакойны быў. Такі спакойны, якім у яго становішчы мог быць толькі чалавек, каторы штось пэўнае ведае, на штось пэўна спадзяецца. Як ужо дрэнна часамі жылося яму, якога толькі гора не прыйшлося яму паспытаць! Другі на яго месцы дык бы ў пятлю рад быў палезці, а ён хоць бы што. Сядзіць у сваёй — што рэшата — хацінцы ды ўхмыляецца, мармочучы сабе пад нос. Ляпае, калі ёсць што ляпаць, а калі няма чаго, дык выцягне з скрыні, што пад лаўкай стаіць, кніжку, сядзіць ля акна дый чытае. Пачытае, падумае, зноў пачытае, зноў падумае — і так аж да вечара. А ўвечары — к суседзям пагутарыць. І нават не ўспомніць, што цэлы дзень у роце нічога не было.

А пагутарыць Цішка ахвотнік быў. Дый здатны быў гутарку весці. Як збярэцца, бывала, дзе гурток мужчын, ды як трапіць у сярэдзіну к ім Цішка Бабыль, дык гэта ўжо вядома, што да поўначы прагукаюць. Чаго толькі не крануць яны ў сваёй гутарцы? І бога, і чорта, і вайну, і парадкі, і гаспадарку. Куды толькі не заблудзяць.

Цішка больш за ўсіх чаго ведаў. Нават у гаспадарцы. Здаецца, што ён можа знаць тут, калі, пэўна, ні разу ні за плуг, ні за касу, нізавошта не браўся. А як пачне гаварыць, дык выходзіць, што ён яшчэ больш, чымся хто другі, ведае. І калі араць трэба, і як зямлю ўгнаіць, і якія парашкі купляць можна — адным словам, чысценька ўсё. Як стане, бывала, гаварыць пра гэта, дык аж вочы бліскаць. А мужчыны тады смяяцца пачынаюць. Неяк дзіўна і смешна. Цішка зямлю кахае!

Цішку захапляла ўсё новае, незнаёмае, асабліва калі

было ахіпута яно таёмнасцю. Ён дужа любіў таёмнае. Але ў гэтым таёмным ён заўсёды мог адрозніць значнае і патрэбнае ад драбязы і глупства. Калі трапляў у вёску якінебудзь невядомы бадзяка без роду і племені, якіх ці мала шлындае на абшарах Беларусі, дык Цішка, як галодны на страву, накідаўся на яго. І з двух-трох слоў цяміў, якога гатунку чалавек перад ім, ці варта на яго ўвагу звяртаць, бліжэй знаёміцца з ім. І тады — або кідаў яго на абладу цікавых і неперабірлівых на павіпы баб, або цэлымі гадзінамі сядзеў з ім, слухаючы простыя, несамавітыя апавяданні.

З гэтых апавяданняў ён не столькі ўзнаваў, колькі дагадваўся аб тым, што нешта бурліць на свеце, нешта рыхтуецца. Ён не знаў, што гэта, не знаў, адкуль, але чуў, што гэта «нешта» будзе на карысць такім, як ён, бедакам, што яно мо і яго замілаванае жаданне здзейсніць — злучыць яго з кармілiцай-зямелькай. І ён верыў і чакаў.

II

Загрымелі грымоты рэвалюцыі. Пакаціліся ва ўсе канцы Расіі. І яшчэ не сціхлі яны, як ударыў пярун Кастрычніка. Запаліў усё старое, струхлелае, усё ахінуў чырвоным полымем. А ў гэтым полымі зарадзілася новае, маладое жыццё.

Магутны віхор даляцеў да самых глухіх куткоў, усюды здмуў парахню і пыл старога жыцця, і з-пад гэтае парахні і пылу паказалася зялёная рунь.

Зачаніў віхор і стаячае паветра глухога Пракудзіна. Патхнула свежым, новым...

. . . . . .

Спачатку мужыкі асалапелі. Ніяк не маглі зразумець таго, што прыйшло. Не тоўпілася неяк яно ў старых, адубелых галовах. Чулі, што нешта добрае, прыгожае прыйшло, але векавечнае гора павучыла іх быць асцярожнымі, і яны цяпер баяліся чагось, не верылі шчасцю. Часамі нават думалі, што ўсё гэта «хітрыя штучкі» нечыя, што не давядуць яны да дабра. Асабліва як пачыналі шаптаць ім на вуха цёмныя сілы, палохаць, пагражаць ім, дык тады проста рукі павісалі...

А хацелася рабіць што-небудзь... Дужа хацелася. Нейкі сверб чуваўся ў руках. Найшло такое паветра, што абу-

рала чалавека, напаўняла жаданнем працаваць, тварыць. Толькі — што рабіць? Куды ісці? — Невядома.

Стварылася такое становішча, што трэба было толькі з'явіцца чалавеку, які б узяўся весці асалапелых сяляп і якому б яны трохі верылі — і сяляне пайшлі б за ім куды-хоця... Пайшлі б, бо ў той час, калі вакол мора бушуе, калі несупынна грымяць грымоты, бліскаюць маланкі,— нельга стаяць на адным месцы, трэба куды ісці.

І сяляне пайшлі. Іх павёў чалавек... І гэты чалавек быў Цішка Бабыль.

А з Цішкам быццам зрабілася пешта. Як толькі прыйшлі весткі, што «пачалося» ўжо, ёп кіпуў сваю кануру, плюнуў на работу і пайшоў блэндаць па вёсцы. Дзе толькі яго не было... І ўсё гаварыў, угаварваў, клікаў, тлумачыў тое, што дзеецца на свеце. Нейкія словы новыя пусціў: рэвалюцыя, сацыялізм, камунізм...

III

Адкуль толькі бралася столькі жыцця, столькі моцы духоўнай у гэтага малепькага чалавечка! Самаго яго проста не пазнаць было: зусім змяніўся... Вочы бліпчаць, лава ўгару ўзнята, па твары гэткае шчасце, здаволенне... Зірнуць на яго, дык можна падумаць, што гэтаму чалавеку дужа пашанцавала ў жыцці.

Ды яно блізка так і было, бо, прынамсі, сам Цішка лічыў, што тыя падзеі, якія адбываюцца ў Расіі, звязаны з ім. Ён не меў аб іх дакладных вестак, бо ў Пракудзіна дахадзілі толькі няпэўныя чуткі, але чамусьці цвёрда пракананы быў, што гэтыя падзеі адбываюцца па шчасце такіх, як ён.

Мужыкі слухалі, слухалі, дый паверылі Цішку Бабылю... А як паверылі, дык ужо й пайшлі туды, куды клікаў ён іх.

І пачалі будаваць сваё жыццё...

Нязручнай была ім адразу гэтая новая работа. Як радзіліся яны, дык увесь свой век і пражылі не разважаючы, так, як было спакон веку заведзена. Ім і ў думкі ніколі не прыходзіла, каб самім па сваёй волі змяняць сваё жыццё, будаваць яго сваімі чорнымі, карузлымі мужыцкімі рукамі...

І нязграбна ў іх выходзіла сперш гэтая работа, а часамі ії смешна нават... Ведама — першы раз у жыцці ўзяліся. Але як бы там ні было, а патроху свайго дабіваліся.

Рамана-багацея заарыштавалі... А ўсё Цішка...

— Братцы! — кажа.— Дакуль будзем цярпець? Гэта ж злодзей, краваніўца! Ён жа абакраў нас! Яго багацце — гэта ж пот наш, кроў наша! Даволі!.. Даволі ўжо яму мучыць нас! Час прыйшоў!..

Абурыліся сяляне... Плоймай пайшлі... Раман, як убачыў, збялеў, спалохаўся. На Цішку пазірае скоса... А тоій не зважае: чыкрыжыць, дый годзе...

— Краваніўца! Эксплёататар! Годзе кроў нашу піць! Мінулася тваё панства!

Дый ці мала там што. Мужыкі падтрымалі. Вядома, накіпела на сэрцы. Кожны адчуваў на сабе цяжар яго лапы. Гэта ж трэба сказаць — усю вёску ў кулаку трымаў!..

Але Раман хоць і спалохаўся, а не здаваўся адразу. Пачаў лаяцца, пагражаць, мандата вымагаць. Вось яму тады і паказалі мандат: скруцілі ды пасадзілі ў халодную хату. Заарыштавалі багацея, а што з ім рабіць — і самі не ведалі. Стаялі сярод вуліцы ды радзіліся, а тоій аж захадзіўся ад злосці ў халодніцы...

Урэшце Цішка надумаўся. Запрог каня і паехаў, а к вечару прывёз з мястэчка нейкага чарнявага. Хто ён такі быў — ніхто не знаў, апрача Цішкі... Дый тоій, пэўна, сам добра не ведаў. Але адразу нешта прыхінула да яго сялян, і яны ўважна слухалі яго, хапалі на ляту кожнае слова... І верылі яму.

Чарнявы павучыў сялян, як і што рабіць. Абралі камітэт: Цішку і яшчэ двух. Гэты камітэт і ўзяў на сябе ўсю ўладу на вёсцы, пачаў свае мужыцкія парадкі навадзіць...

Рамана выпусцілі: наліха яго трымаць! Толькі не палягчэла яму ад гэтага. Седзячы, не бачыў бы, прынамсі, як маёмасць яго парадкуюць... Не лопаўся б ад злосці.

А шчупалі добра: знялі, што сваё, мужыцкае дабро бяруць. Там якая бабылка з голаду памірае парыхтуецца — Раманавыя засекі ратуюць. Там ваісковыя прыедуць — таварышы, дайце хлеба! — зноў Раманавыя засекі трашчаць. А там яшчэ што-якое... За ўсё Раман адказвае. А схаваць або звесці куды — ні. Сочаць. Заб'ём, казалі, калі толькі памкнешся хаваць...

Затое ж бядота ўся аж уваскросла. І не чакала яна ніколі гэткага палягчэння. Іншыя дык самі сабе не верылі. Ды куды ж там: усё ўверх нагамі перакулілася. Раней — людзьмі нават не лічыліся, а цяпер — глядзі-тку, што дзеецца.

IV

Вясной зямлю дзялілі... Адабралі ў Рамана вялікшую частку, сумежнае панскае трохі дасталі — якраз і хапіла ўсім... Нават Цішка Бабыль і той узяў сабе кавалак. Ён, праўда, іначай хацеў зрабіць; інакшая думка сядзела ў яго галаве, інакшыя вобразы малявала яго выабражэнне. Надта ўпадабалася яму думка аб камуне. Смелая думка! Але і ён смелы: не спалохаўся яе, як іншыя. А зразумеў ён яе проста, па-мужыцку...

Зямля ўсіхная — усё роўна не прысвоіш яе назаўсёды. А худобы гаспадарскае мала: у таго конь ёсць, дык плуга няма, у другога плуг ёсць — каня няма. Як ні круці, а ўсё прыйдзецца бегаць ды пазычаць, ды чакаць, пакуль гаспадар сам управіцца — час дарагі губіць. А там — шнуркі гэтыя, межы, няроўнасць: аднаму лепшы выпадзе, другому горшы — гэта ж не зраўнуеш... А куды лепей бы — супольным ладам. Адзін арэ, другі скародзіць, трэці сее, чацвёрты яшчэ што робіць. Менш жывёлы, начыння трэба, а поспех яшчэ вялікшы. Ніякіх табе шнуркоў, межаў — гані праз усё, дый годзе. А там — ці машыну купіць, ці пабудаваць што якое, мірам — дык гэта ўраз, не то, што па аднаму.

Толькі маўчаў пакуль што Цішка. Нікому з сялян не выкладаў сваіх думак, бо добра ведаў, што не зразумеюць пакуль што сяляне, не згадзяцца на гэта. Дужа хочацца кожнаму з іх мець свой асобны кавалачак. Вякамі ўзгадавалася ў іх гэтае жаданне... Пасля ўсё можна будзе, а цяпер — не...

Так і падзялілі зямлю. На які час — яшчэ й самі не ведалі. Чакалі, які загад ад урада выйдзе.

Цішка тож узбіўся трохі на гаспадарку. Працаваў — як толькі мог. Працаваў з жарам, з запалам. Толькі не ладзілася ў яго гаспадарчая справа. Не прыходзілася яму ніколі на зямлі працаваць, бо яшчэ, мусіць, дзяды яго адбіліся ад зямлі, за рамяство ўзяліся. А не прывыкшы змалку працаваць, ужо над старасць трудна прывыкаць...

І Цішка біўся як рыба аб лёд, клаў усе свае сілы, а ўсё не было ладу. Глядзіць ён на другіх мужчын і сам аж зайздросціць: гэтак спрытна і лёгка ў іх выходзіць! Цэлы дзень працуюць, і хоць бы што, а ён за гадзіну замучыцца так, што ледзь дыхае.

І злосць бярэ яго і дасада... Часамі ледзь не заплача... Гэтак хочацца яму над зямелькаі папрацаваць... Колькі

чакаў ён гэтага шчаслівага часу!.. Усё б аддаў, здаецца, каб толькі так, як іншыя, папрацаваць у ахвоту!..

Не можна...

. . . . . .

Лета біўся Цішка Бабыль, а з восені зноў засеў у сваю хацёнку, зноў заляпаў кляўцом...

Сядзіць, арудуе сваім начыннем і пяе цешкім сіплым галаском, мармочыць сабе пад нос. Не зразумець, што пяе ён, якую песню аднатонную цягне... Толькі, калі добра прыслухацца, можна часамі злавіць у яго пяянні знаёмыя словы вядомых рэвалюцыйных спеваў.

Як і раней, любіць Цішка кніжку або газетку пачытаць, любіць з сялянамі пагутарыць, разважыць іхныя жыццёвыя замінанні. У Пракудзіне ўжо ў звычай увайшло: калі ў каго непаразуменне якое, патрэба — зараз да Цішкі Бабыля. І ён усё растлумачыць, раду добрую дасць.

Ды не толькі словамі, а й дзелам Цішка заўсёды гатоў дапамагчы сваім братам-сялянам. Колькі часу ўжо прайшло ад рэвалюцыі, а ён і цяпер яшчэ стаіць на чале вясковае ўлады. Не шкадуе ён ні працы, ні часу — сумленна спаўняе свае абавязкі, цвёрда стаіць на варце сялянскіх інтарэсаў.

У сваім прыватным жыцці Цішка астаўся такім, як і быў. Ні аб чым не дбае... Хатка яго яшчэ больш пахілулася набок, яшчэ больш засвяціла дзіркамі. Есці, як і раней, не ўсягды бывае што... Але Цішка не зважае на гэта...

Часамі запытае яго хто-небудзь:

— Што гэта ты? Усе будуюцца, жыццё сваё паляпшаюць, а ты як жыў, так і жывеш у сваёй канурцы! Гэта ж не даўнейшае...

— Эт,— адкажа ён,— нашто мне? Многа мне трэба аднаму? Пакуль рукі ёсць, буду працаваць і за працу сваю хлеб есці, а там... найду месца... Сын, дык той таксама сабе хлеб знойдзе. На гаспадарку разжыванца — стар ужо я, не па маіх сілах... А так?.. Пражыву...

Але задумаецца пасля гэтых слоў Цішка... Мусіць, успомніць сваю замілаваную думку — земляробам стаць... І пасмутнее... Толькі непадоўга...

Трахане галавою Бабыль, усміхнецца вясёла і дадасць:

— У пралетарыя няма бацькаўшчыны...

У САЎКАХ

1

У Саўках чорная, густая, што дзёгаць, ноч распаўзлася на хмызняку. Заляпіла ўсе шчылінкі, усё ў адну цемру зліла. Равы патуліліся, схаваліся ў воўпе арэшніку. Нешта ў сабе затаілі — таемнае, страшнае і ждуць-падсцерагаюць, гатовыя праглынуць у сваё чорна-аксамітавае нутро. Маўчаць... Ды і ўсё навакол маўчыць у нейкім чакаючым напружанні. Быццам во-во нешта здарыцца — дзікае, страшэннае...

Далёка-далёка, на колькі вёрст цягнуцца бяздонныя прорвы-равы. Папарэзалі яны туды і сюды шырокае ўзгор'е. Быццам волат-асілак праехаў з сахой велізарнай і глыбокія раны парабіў у целе зямлі. Раны зараслі хмызняком-поўсцю, але такімі ж глыбокімі засталіся...

Страшна ноччу ў Саўках. Узгоркі, абрывы жывымі становяцца, сочаць вачыма чорнымі... Быццам з пагрозай гавораць: «Ану-тка, увайдзі!..» І мала хто адважыцца ў петры пайсці, як цяжка заляжа ў равы хмурная ноч...

Ціха ў Саўках... Але зыкі чуваць... Ціхія зыкі-шэпты. Саўкі шэпчуць скрыдламі птушак-пачніц, цікуючым хрустам сухіх ветак пад лапамі дзікіх звяроў...

. . . . . .

У самай глушы, там, куды вока людское не загляне ніколі, сумна-дрыготны бляск прашчупвае цёмныя веткі. Вогнішча... Людзі навакол... На тварах іх вогнішча грае дрыжачымі плямамі. Воддаль, афарбаваныя ў жоўта-чырвонае, галіны схілілі галоўкі і слухаюць... А за імі — цемра-жудасць...

Іх пяцёра... Адцятых ад усяго свету. Уцяклі, вырваліся з кіпучага мора жыцця. Ад іх адраклося жыццё,— і яны ад яго адракліся. У Саўках знайшлі сабе схову.

Дзеці зямлі. Ад свае вёскі таксама адарваліся. Перш была сувязь: хлопцы прыходзілі, нават дзяўчаты часамі заблуджвалі. Апавядалі, што дзеецца там. Есці насілі даволі. Саломы па будку, таго-сяго.

А потым усё слабеї ды слабеї сувязь трымалася. Нешта расло паміж тымі і гэтымі... Неїкая сцяна. Асабліва як маладыя пайшлі. Тыя сюды схаваццa не адважыліся, пайшлі ваяваць. І цяпер — як адвярнула ўсю вёску...

Ужо з тыдзень, як не было нікагутка. Два дні ўжо, як есці няма чаго. Пяклі грыбы, ягады збіралі, але ўсё ў жываце нешта ссе, нешта цягне...

Цяпер — хто ляжыць, хто сядзіць вакол вогнішча, і кожны думае сваю думку асобную. Маўчаць, а ў кожнага з вачэй глядзіць пытанне, рашуча наўстаўшае:

— Што далей?..

Грышка маўчанку парушыў...

— Ну што, хлопцы, прызаўпылі? Га?.. Дрэнна, кажаце? Што, Смоўж, нос павесіў?..

Смоўж, або Змітра Кандратаў, павярнуў ад свету ў цень свой твар. Не сказаў нічога.

— Во што, хлопцы! Трэба думаць. Ці тое, ці другое. Не здыхаць жа...

Сцёпка ўзняў галаву...

— Жраць хочацца. Здаецца, вала б з'еў... Вунь Смоўж, халера на яго, яўляцца ўжо надумаў... Га, Смоўж?..

Невядома, хто з іх падумаў аб гэтым: ці Сцёпка, ці Смоўж. Мусіць, у абодвух думка гэта лунала.

Смоўж і не зварухнуўся — быццам і не да яго казалася. А Грышка-завадатай пачуў хістанне сярод сяброў. Каб зніштожыць яго, гукнуў бадзёра-пагрозна:

— Я яго гэтак яўлюся, што не пазнае!

Аднак усе маўчалі. Грышка змяніў тон...

— Аб тым, што яўляцца, і гаварыць не варта. Нашто б тады і ўцякаць было! Не ўжо, як на мяне, дык калі зрабіў што — не вярні назад. Ды што там? Бачыш ты: не паелі дзень, гора якое... А там што, пірагамі б цябе кармілі? Чулі, якое жыццё там...

— Ды гэта глупства... Яўляцца, яўляцца... Хто гэта захоча яўляцца? Турмы не бачылі? Вось жраць няма чаго. З вёскі не пясуць, баяцца, мусіць.

— Не баяцца, а што ім за ахвота дармаедаў карміць? Пайшлі во маладыя, думаюць — і гэтыя могуць служыць, нечага лайдачыць.

— Ну, дык ідзі, чаго ты...

— Ды я не аб тое...

Грышка рашуча прамовіў:

— Во што, братцы! Бацькі карміць не хочуць — пра жывём і без іх. На работу станем!

— На якую?

— На якую?.. А на такую, на якой за раз можна зарабіць столькі, колькі на іншай за год не заробіш...

Зразумелі хлопцы... Быццам засаромеліся, пахілілі галовы. Адзін на аднаго не глядзелі...

— Што замаўчалі? Спалохаліся? Страшна?

Зноў маўчалі... Потым азваўся адзін:

— Чорт яго... Каб было з чым... Голымі рукамі...

— Чаго? Адна ёсць стрэльба... Сцёпка да сваіх дабярэцца, двухстволку возьме.

Грышка з чаканнем углядаўся ў твары хлапцоў.

Сцёпка ўдарыў Смаўжа па спіне.

— Як, Смоўж, га? Пойдзем на паляванне?

— Усё роўна...

Сказаў, а ў самога нутро халадзела. Бегчы адсюль, уцячы захацелася. Нялюбай, страшэннай здалася кампанія хлапцоў. Жудасць душу ахінула. Эх, і нашто ён прыйшоў сюды? Нашто паддаўся спакусе?

А хлопцы памалу разварушыліся. Іх захапілі новыя планы. Вочы жвава блішчэлі, як гаварылі, згаварваліся... Пасталі вакол вогнішча, асвятлёныя чырвоным дрыжачым бляскам. Як здані якія...

Доўга яны гаманілі, доўга парушалі глыбокую ціш, панаваўшую ў Саўках...

І згаварыліся...

2

Праз Саўкі прабягала дарога. Кулялася ў равы, узбягала на ўзгоркі... То тулялася па хмызняку, то вясёла, адкрыта ўсміхалася жоўтаю пакручастаю стужкаю.

Было адно месца, дзе дарога шпарка збягала па крутому скелзу. З аднога боку — гара, абросшая густым хмызняком, з другога — глыбокая прорва. Небяспечнае месца. Дарога вузенькая — толькі калёсам праехаць. Угару яшчэ нішто, а во ўніз — глядзі ды глядзі. Добра, калі конь стрымае, не пабяжыць, а то — беражыся! Троху-троху — і пакоціцся.

У гэтым месцы хлопцы заселі. Праслухалі, што з горада валасны будзе ехаць з грашыма. Рашылі перапяць тут...

Смоўж, што мышанёнак, прытуліўся ў кустах ля дарогі. Яго абавязак не трудны: як будзе спускацца, знецікі выскачыць, спудзіць капя, каб убок ірвануўся. Дарога ву-

зенькая — напэўна пакоціцца ўніз. А там ужо хлопцы чакаюць — капчаць.

Доўга ўжо ждуць. Сонца хіліцца пачало к захаду. Цені пацягнуліся даўгія, даўгія... На кусты, на траву пачала класціся пазалота...

А яго ўсё няма...

Смоўж ляжыць дагары па зямлі. Скрозь галіны алеш ніку глядзіць у далёкае неба блакітнае і думае шчырую думу. Яму ўспамінаецца ўсё, што перажыў ён у апошні час. Як яго бралі ў жаўнеры, як не хацелася яму разлучацца з роднай вёскай, з роднымі людзьмі, як ён аж плакаў, ад'язджаючы ў войска. А там — жыццё цяжкае, жорсткае... Колькі ён слёз напаліў, колькі ночак не спаў — усё думаў аб роднай краіне. З Сцёпкам сышоўся. Бывала, чуць вольная часінка — усё гаварылі, успаміналі... Тоїі пабегчы яго падбухторыў.

Ой, як хацелася ў двор! Смоўж і не думаў тады, ці добра, ці дрэнна ён робіць; не думаў аб тым, што можа быць у канцы. Толькі б у двор...

Вось і прыбеглі. Нядоўга ў дварьі жыць прыйшлося. Небяспечна было заставацца ў вёсцы. У Саўкі найшлі. З Грышкам злучыліся, яшчэ два хлопцы прысталі. Сперш ніштo было. Нічога не рабілі, гулялі, дурэлі, апавядалі адзін аднаму пра свае вандроўкі. Хлопцы прыходзілі з вёскі — яшчэ весялей было.

А потым іначай пайшло. Адзін аднаму падакучылі, жыць па-воўчаму ў лесе абрыдла. Дый без работы мутарна неяк. Так захацелася жыць, як усе, акупуцца ў жыццё з галавой.

З вёскі пайшлі маладыя. Некаму стала й прыходзіць. Зусім забылася па іх вёска. Голад пачаўся. І ўсё цяжэй на душы рабілася. Чуў Смоўж, што не вытрывае.

І вось... урэшце...

Не, не чакаў гэтага Смоўж. Не хацеў, баяўся. Натура яго не згаджалася з гэтым. Але штось прымушала згаджацца і рабіць. Хто яго ведае? Ці сябрукоў ён баяўся, ці слабасці сваёй саромеўся. Але вось ляжаў і чакаў, гатовы на страшэнпае дзела.

. . . . . .

Здалёк затарабаніла каламажка... Сэрца ў Смаўжа закалацілася моцна, балюча. Быццам яго хто ціснуў, трымаў, а яно вырывалася... Думкі змяшаліся, як віхор, закруціліся... Міганулі сябрукі — далёкімі, чужымі здаліся...

Двор праляцеў, і чагось асабліва выразна прадставілася сястрыца Гануля...

Бліжэй, усё бліжэй... Вось угары і конь паказаўся... За ім каламажка, у ёй пеўкі ў чорным... Ён!..

Ці злезе, ці не?.. Калі злезе — не трэба тады: усё роўна нічога не выйдзе... О, каб ды злез!..

Не... Толькі пакруціў лейцы на рукі... Едзе, спускаецца... Яшчэ хвілінка адна...

Міжвольна Смоўж зірнуў на каня. Конік напружыўся, трымае — як мага... У вачах гэткая шчырасць, старанпасць, апаска... Смоўж успомніў свайго Палавога... Шкада да болю стала канька... Ужо наязджае... Яшчэ колькі крокаў...

Смоўж кіпцямі ўпіўся ў глебу...

Вось ужо тут... ужо трэба... ужо час...

. . . . . .

Не... Не здолеў...

Конік, праехаўшы самую строму, смела пабег. Весела заляскатала каламажка... Усё далей і далей...

Смоўж схамянуўся... Што гэта? Як гэта так? Што цяпер будзе? Ці гэта добра, ці блага? Хлопцы... Яны што... Біць будуць, пэўна... Прагоняць...

Блізка пачуліся галасы. Смоўж, як непрытомны, кінуўся ў хмызняк, убіўся ў самы вялізны і густы куст і прытуліўся да зямлі, што зайчык. Усё яго цела траслося як у ліхаманцы. У галаве білася адна думка: каб скарэй, каб скарэй... І ўся істота яго ў гэты момант была працята адным жаданнем: каб скарэй пайшлі хлопцы!

А хлопцы гукалі, шукалі, лаяліся, пагражалі. Урэшце Грышка сказаў:

— Уцёк, трасца яго матары. Ну, добра; трапіць ён калі-небудзь нам у рукі... Пойдзем, хлопцы!

Чароўнай музыкай празычэлі ў вушах Смаўжа крокі пайшоўшых. Счакаўшы колькі хвілін, ён асцярожна вылез з куста і пачаў прабірацца па хмызняку. Шпарка, паспешна.

Дух занімала, сэрца зрывалася, а ў галаве, як кляўцом, біла:

— У горад... у войска... Няхай будзе, што будзе. Турма дык турма. Абы да людзей, абы жыць так, як людзі, а не туляцца, што воўк, па лясах...

А над Саўкамі ноч свае скрыдлы ўжо раскідала, усё ахінала ў таемную цемру...

У ВІРЫ ЖЫЦЦЯ

1

Ужо добра сцямнела, як Міхалка прыкандыбаў да Шлёмкі.

У нізенькай, шэрай і бруднай хацёнцы дрыгацеў змрок. Шлёмка ўжо лямпу запаліў, але яна была такая малькотненькая, што пры ўсёй шчырасці і стараннасці ў яе не хапала моцы перамагчы цемры, панаваўшай у хаце, і яна толькі асвятляла сваім пудліва-жвавым бляскам нізенькі столік з гарой шавецкага начыння і кудлатую галаву Шлёмкі.

— Добры вечар! — гукнуў Міхалка, пераставіўшы сваю дзераўяшку праз высокі парог.

— А... Добры вечар, добры вечар!.. Ну-ну, добра, што зайшоўся... Сядай!..

Міхалка вольна ўздыхнуў, выцягнуўшы абедзве нагі. Відаць было, што ён добра змучыўся, пакуль дайшоў.

— А што ж... Трэба, як той кажа, хлеб есці.

— Гэта так...

— Ну, што табе ў воласці сказалі?.. Даўно прыехаў?

— А во, толькі што каня завёў на выган... Што?.. Ды што ж яны скажуць — адна хеўра... Далі зноў запіску. У іх, відаць, умова такая: тыя пішуць, каб вочы адвесці, а гэтыя толькі смяюцца — знаюць, што ніхто не пакарае за неслухмянства... Але спалохаліся, як сказаў, што ў губернію паеду... Я, брат, там нарабіў гвалту... А мне што? Усё роўна рабіць няма чаго. А праезд дармовы. У губерні нічога не зробяць — у Маскву паеду, да самога Леніна дайду, а свайго даб'юся. Мне не тое ў галаве, што там пожні на які воз не далі — гэта глупства... Але час ужо іхнюю хеўру разагнаць.

— Не, але як да чаго дайшло? Заселі, закупілі воласць, робяць, што хочуць, ды яшчэ смяюцца з нашага брата.

— Якое, ужо і разгаварваць не хочуць. Учора Платоніха пайшла к сакратару, каб паперку даў у млын... Без фунтаў каб... І слухаць не стаў. Нічога, кажа, жыва будзеш, калі і фунты аддасі... А ў тоій не то што, дык у рот нечага

пакласці; дастала недзе пудзік... Ведаеш, Шлёмка, я часам аж трасуся ад злосці. Здаецца, на шматкі б разарваў...

— Злосцю нічога не паможаш. Тут, брат, палітыка трэба... Во што, Міхалка: як сабе хочаш, а гэтага здарэння з пожнямі ніяк нямożна прапусціць. Тут, брат, калі добра ўзяцца, можна — ведаеш што?..

— Каб толькі свае падтрымалі...

— Свае? Дык хто тут не рад будзе ад іх пазбавіцца?.. Ці ж гэта мы толькі з табой пакрыўджаны?.. Ды во цяпер... пожні гэтыя самыя... З бяднейшых жа нікому не далі, багацеі падзялілі.

— Ага, во яшчэ, Шлёмка... Узнаў я, колькі за арэнду плаціць належала... Якраз палавіну таго, колькі яны сабралі...

— Ага! Во! А ўсе бачылі, што жыта ўсё ў воласць павезлі... Дзе ж яно дзелася? Га? Хабар... Толькі што багацеі адмовяцца, скажуць, што менш ссыпалі...

— Дзядзька не збрэша... загрозяць хіба. Толькі й загразіць яго не дужа лёгка... Заўтра ўранні размяраць будуць. Споўзаю яшчэ раз, пагляджу, што яны запяюць.

— Ты, Міхалка, чуў, што Грышка зноў аб'явіўся тут у ваколіцах? Уцёк, кажуць, з астрога... Ужо ў Седлішчы, казалі, аднаго забітага знайшлі: з горада нейкі...

— Во, халера, а? Ізноў, значыцца, людзям спакою няма. І каторы раз!..

— Дарма ты, Міхалка, у воласці расхадзіўся. Лепей бы паціху, каб адразу, знецікі, а то ліха іх ведае... яны ж ні перад чым не спыняцца...

— Не баюся... Што будзе, то будзе... Калі ж не магу я неяк... Як закіпіць у сэрцы, як заклакоча, дык не толькі, што... а, здаецца, біцца б палез...

— Э, гэта, брат, кепска...

Шлёмка даўно ўжо пакінуў работу. Гутарка захапіла абодвух. Ахінутыя таемным, змрочным светам капцілкі, яны ў гэты час былі падобны да загаворшчыкаў. Бліскучымі вачмі ўпарта ўглядаліся адзін у твар другога, махалі рукамі, нахіляліся адзін да аднаго і ўсё гаварылі, спяшаючыся, перапыняючы... А калі раптам сціхалі, углыбіўшыся ў свае думкі, у цеснай хацёнцы павісала жудасная ціш. І тады колькі часінак у паветры панавала напружана-жалобная песня цвыркуна.

Яна лілася срэбным ручаїком з запечча, цудоўнымі струнамі звінела па хаце і быццам напаміпала аб чымся адвечным, непазбыўным.

— Ведаеш, Шлёмка... ты граматней за мяне... Ты напішы аб усім, заяву гэткую напішы. Падпішамся ўсе... Баяцца будуць, але я ўгавару. А я паеду... Паеду проста ў губерню, уяўлюся ў Чаку, ці куды там, ды ўсё і выкладу, што ў нас тут робіцца..

— Ладна... Толькі, каб гэта цішком, яны каб не знялі, а то загадзя прыгатуюцца... яшчэ падвядуць такую машынку, што і чыстымі застануцца... Ды і табе небяспечна...

— Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць... Ды мы дужа не будзем лапатаць. Толькі што тыя будуць ведаць, што падпісваць будуць... Але ўсё роўна: не схаваешся ад гэтых жулікаў...

— Ладна, глядзі!..

Сяброўкі доўга яшчэ сядзелі і гаманілі... Як выйшаў Міхалка ад Шлёмкі, на вуліцах ужо пуста было, а ў вокнах цёмна: усе спаць паляглі.

Ноч была цёмная. Патыхаў мяккі, кволы ветрык. Разам з гэтым ветрыкам на Міхалку патхнула чымся бадзёрым, узмыўным. Ён горда выпяў грудзі, уздыхнуў глыбока-глыбока і шпарка пакавыляў.

На душы было лёгка, вальготна, быццам нейкі цяжар звалiўся. Прыпяўшы пэўную пастанову, Міхалка супакоіўся... І толькі над уплывам думак-летуценняў, якія трапяталіся ў яго галаве, нецярплівасць нейкая брала... Хацелася, каб хутчэй-хутчэй споўпілася задуманае. І ён, сам таго не прыкмячаючы, ішоў усё шпарчэй і шпарчэй, шырока махаючы сваёй дзеравяшкай.

2

— Ч-ы-ў-ры... Ч-ы-ў-р-ы... ч-ы-ў-ры...

Смагла косы ўпіваюцца ў пожню... З смакам жруць ядраную, сакавітую траву... Аж сліпа цячэ... І то там, то сям на ўсім абшары пожань, пад бліскучай сталёвай губой варушыцца і кладзецца ў роўныя гурбы шаўковая трава... Быццам нейкія цудоўныя звяры — малыя і пражэрлівыя, апанавалі пожню і скубуць-злізваюць яе густую поўсць... А часамі ўздымаецца каторы, весела-здаволена бліснe на сонцы і запяе пабедна на ўсю ваколіцу.

— Лясь!.. лясь!.. лясь!.. лясь!..

Ядрана... Рана яшчэ... Толькі сонца пядаўна ўзыпло

і спрасонку зусім гультава свеціць... Пасля начнога сну яшчэ вочы сабе не прамыла... Нават не бачыць, што на кветках-красунях яшчэ смела-задзірліва ззяе раса... У адным месцы гурток сялян... Сядзяць, ляжаць на густой воўне-траве. Воддаль косы наўторкнуты ў зямлю... Пагрозна бліскаць на сонцы вышмурыжанымі языкамі...

Тут багацеі ўсе... І савет тут: старшыня — здаровы мужык з грубым драўляным тварам — толькі вочы хітра, пудліва бегаюць, і пісар — яшчэ маладзенькі, жвавы і пранырлівы, што лісічка... Гэты — у фрэнчыку, галіфэ, з партфелем — камісар, дый годзе...

Сяляне гутараць... крычаць, рагочуць. Настрой вясёлы, бадзёры — ведама, моц сваю чуюць... Смяюцца здаволена. Старшыня з пісарам — асяродак кампаніі... Старшыня спляча рэжа, а пісар, важна махаючы рукой, цягне, што песню пяе... І сам здаволена прыслухоўваецца да сваёй гаворкі... Нахапаўся недзе слоў розных, якіх і сам добра не разумее, і пэўны, што разумны дужа...

— Нэп... Цяпер, брат, нэп у Расеі... Думалі камуністы з пралятарскім елементам дзела мець, значыцца, усё па дземакраціі: камуны, таксама салхозы, культуры розныя, а выходзіць, собсцвенна, што пралятары на класавую точку стаў і... усё, значыцца... амінь. Ясцесцвенна, што трэба даць дарогу правільнаму элементу... сушнасці, самастаяцельны елямент, ён мае значэнне...

— Ну, і насабачыўся ты, а! — перапыніў адзін з сялян — белабрысы, чырвоны, з заўсёдашняй хітра-ліслівай усмешачкай на твары.— Во, цябе б у воласць, на месца Пронькіна... Вось бы адлемантараваў... хе-хе-хе-хе...

І селянін заліўся цянюткім дробненькім смяшком — быццам забрахаў малады шчанёнак...

Пісару гэта ўпадабалася, і ён з давольнай мінай нарыхтаваўся цягнуць далей сваю прамову, ужо нават пачаў:

— Ды не ў тым... Гэта што...

Але старшыня, якому, відаць, не па нутру прыйшлося, што хваляць яго памочніка, перапыніў, паказваючы, што і ён таксама троху ведае:

— Яно зразумела... Чалавек сталы, заможны, ён вагу мае, а не то што дрындушка якая...

— Ну, а як з хутарамі ў нас? — змяніў гутарку стары дзед.— Усё гаманілі, гаманілі, пісалі, а цяпер і не чуць нічога... Мусіць, прымерзла нашая справа...

— Якое табе прымерзла... Ці ж цяпер можа прымерз-

нуць, улетку... Гэта, бачыш, жарка мераць цяпер, дык да зімы чакаюць...

Мужыкі зарагаталі...

— Ды і як жа мераць цяпер?.. Зусім не выпадае... Траву можна папсаваць...

— З хутарамі вось як дзела абстаіць... Собсцвенна на хутары няма сушчаствуючага закону, значыцца, дзяйсцвіцельнага... Трэба неабхадзіма, каб усё вобчаства па свайму собсцвеннаму дабравольнаму жаланію і страмлінію прыняло катэгарычаскае пастанаўленне ў хадатальсцве аб раўнамерным раздзеле зямельнай собсцвеннасці...

— Гэта значыць, зямлю перадзяліць?

— Ясцесцвенна...

— Вунь як... Ну, гэта, брат, пачакай!..

— Яны б згадзіліся...

— Гэта значыць, працавалі, працавалі, а цяпер чорту лысаму, лайдаку спрадвечнаму... Не, дзякуй за гэта!

Белабрысы зрабіў выгляд, што хоча сказаць нешта дужа смешнае, і прапішчаў:

— Ты, кажаш, працаваў, а яны лайдачылі... А нашто ты пайміта дзержыш?.. Гэта, брат, нельга... Толькі сваімі рукамі можна працаваць, а гэта ўжо будзе... Таварыш пісар, як гэта завецца?

— Эксплаатацыя...

Некаторыя зарагаталі...

— А цяпер,— дадаў белабрысы,— ты павінен аддаць свайму батраку палавіну зямлі, палавіну жывёлы...

— І ўзараць яму на першы раз.

— Не, брат, хутчэй ён падавіцца, пакуль я яму дам хаця атопак.

— Бацюшка йдзе!

— А... час ужо...

— Дачакаліся ўрэшце...

— Дык як, значыць, яму дзесяціну адрэжам? — запытаў старшыня.

— Як жа, трэба... Каб гэта так, а то яго ж пожню і дзяліць будзем...

— Гэта ж не яго, а царкоўная...

— Ну, гэта ўсё роўна...

— Таварыш пісар, а як у паперцы сказана? Га?..— зноў залапатаў белабрысы.— Між бядней шых раздзяліць, а?

І зноў насыпаўся дробным, прыдушаным смехам...

Усе ўсталі... Падышоў поп, яшчэ малады, з рыжай бародкай...

— Здраствуйце!..

— Дзень добры, бацюшка!..

— Ну, што, таварышы, рабаваць нарыхтаваліся свайго бацюшку?..

— Ды не, бацюшка!.. Якое там рабаваць... Мы, можа б, і зусім не бралі ў вас, дык усё роўна возьмуць гэтыя — усякія там Цішкі ды Шлёмкі... Раз папера прыйшла, значыцца, каб царкоўныя пожні падзяліць між бядпейшымі сялянамі...

— Знаю, знаю... Усё іхняя работа... Карціць ім чужое дабро...

— Але, бацюшка, мы вас не пакрыўдзім... Мы ўжо так пастанавілі мірам, каб вам дзесяціну адрэзаць... З якога боку хочаце, з такога і выбірайце.

— Наш долг, собсцвенна, клапаціцца аб усіх грамданах, маючых нахаджэнне ў нашым раёне... Абсуджэнне наша — удаўлетварыць вас вазможнасцю... Дзесяціна вам будзе прадстаўлена ў заканамерную собсцвеннасць...

Пісар гэтыя словы сказаў так урачыста, такім важным тонам, што ўсе — і нават ён сам — раты паразявалі...

— Ну, што ж, дзякую і за гэта...

— А я так думаю, хлопцы,— гукнуў старшыня,— не паадсыхаюць у нас рукі, калі мы яшчэ па пракосу пройдзем бацюшку... Няўжо ж мы дазволім, каб наш бацюшка сам за касу ўзяўся!.. Нам жа сорам будзе...

— Эт!.. Аб гэтым і гаварыць не варта!..

— Адмерым, хлопцы, дый звалім зараз!..

— Вялікае спасіба... Няхай вам бог памагае!..

Мужыкі ўжо ўзяліся за косы, але ўбачылі Міхалку, які, калдыбаючы, кіраваўся на іх ад дарогі, і спыніліся ў чаканні, зацікаўленыя... Пачалі закурваць і перамаўляцца ўпаўголаса...

Міхалка, ні на каго не гледзячы, ні з кім не прывітаўшыся, падышоў да старшыні і моўчкі падаў яму паперыну... Старшыня важна пакруціў яе ў руках, шчыра прыгледзеўся, стараючыся нібы разабраць, што ў ёй напісана, і, пэўна, не разабраўшы нічога, аддаў пісару. Той прыдаў свайму птушынаму твару сур'ёзны выраз, які, вядома, і належыць прымаць «начальству» пры спаўненні служэбных абавязкаў, і стаў чытаць...

— Па вашаму дзелу рэзалюцыя не можа быць... Лугі

падзелены... ясцесцвенна, і прычытаюшчая за арэнду сума з уладзельцаў узыскана... Значыцца, рэзультату не прадвідзіцца...

Бледны твар Міхалкі дрыжэў ад моцнага абурэння. Ён глядзеў на пісара такім поглядам, які без слоў гаварыў, што яму вельмі трудна стрымацца, каб не кінуцца на гэтага шчанюка...

— Вы павінны спаўняць загады вышэйшай улады,— скрозь зубы прагаварыў ён дрыжачым голасам.

— Калі табе воласць абяцала, дык ідзі дый касі там у воласці,— адпаліў старшыня.

Сярод сялян пачуўся смех, а белабрысы недзе ззаду захлынуўся сваім брыдкім сабачым рогатам...

Міхалку рванула...

— Зладзеі!.. Крываліўцы!.. Бандыты!.. Падавіцца вам гэтаю пожняю!.. Жрэце!.. Піце нашу кроў, кулаччо праклятае!.. Няпраўда... Будзе вам канец, драпежнікам!.. Вы мяне папомніце!.. Я прыгатую вам месца!..

Цяпер хоць бы і хацеў стрымацца Міхалка — не здолеў бы!.. Прарвалася гадамі накіпеўшае мора злосці і нястрымана палілося бурлівай, бруднай патокай праклёнаў, пагроз і лаянкі.

Багацеі абурыліся... Залямантавалі на ўсе лады, абступілі Міхалку... Косы пагрозна забліпчэлі ў паветры. Справа станавілася сур'ёзнай. Ужо поп, закасаўшы полы, шпарка пашыбаваў прэч ад граху...

Але гвалт сялян быццам ацвярозіў Міхалку. Ён змоўк і смела глядзеў на раз'юшаных сялян. Тыя памалу адступілі. Міхалка павярнуўся і пайшоў на пожні. Услед яму неслася моцная лаянка, якую пакрываў прарэзлівы голас старшыні:

— Глядзі, крываногі, дабрыкаешся!..

Боль, абіда і злосць — моцная, агнявая злосць кіпела ў грудзях у Міхалкі... Горла сударгава сціскалася, а ў мазгу настойна, балюча білася думка:

— Хутчэй, хутчэй кончыць гэты здзек, гэтае зласлачынства!..

У той жа самы дзень, увечары, Міхалка падаўся ў горад...

3

Была бурлівая ноч. Стары Дняпро гоїдаўся ўзад і ўперад цёмнымі хвалямі і сярдзіта бурчэў, незадаволены тым, што хтось турбуе яго, здзекваецца над яго старасцю.

І ў хмурым здзіўленні слухаў, як дзесь угары, на высокіх абрыўных берагах, вые і тужыць збянтэжаны лазняк...

На самым беразе Дняпра, у капешцы, ляжаў Міхалка. Ён увесь закапаўся ў пахучае сена і ў зацішшы думаў-перадумваў свае думкі...

На дварэ шумела, гудзела, дождж жорсткі сцёбаў, а ў сене было гэтак цёпла, зацішна, прытульна... І чым больш разгульвалася вакол непагода, тым глыбей увахо-дзіў Міхалка ў самога сябе і ў пакоі прыводзіў да ладу свае думкі...

Учора вярнуўся ён з горада. Там справіў сваё дзела, узняў на ногі каго належыць. Цяпер быў пэўны, што хут-ка ўсё будзе ўскрыта і прыйдзе канец кулацкаму пана-ванню. Але вось, што гэта значыць, што, пакуль ён вяр-нуўся з горада, яму тут сена аддзялілі ды нават скошана-га ўжо... Ён перш і браць не хацеў, але Шлёмка параіў узяць, каб супакоіць на які час ворагаў. Узяў... нават пільнаваць пайшоў нанач...

— Дык чаго ж гэта іх узняло? Ахамянуліся? Спалоха-ліся? Небяспеку пачулі?..

Міхалка здаволена ўсміхнуўся...

— Баяцца... Пачакайце, не тое яшчэ будзе!..

Але як ні быў пэўны Міхалка ў сваёй перамозе, у яго ні на адну часінку не выходзіла з галавы апаска. Усё здавалася, што не здадуцца так багацеі, што яшчэ будзе змаганне, дый не абы-якое — змаганне на жыццё і смерць. І здавалася яму, што «тыя» не сядзяць у гэты час «зла-жыўшы рукі», а рыхтуюцца, пільна рыхтуюцца... Але што яны могуць зрабіць?..

Міхалку ўспаміналася перасцярога Шлёмкі, успомніў-ся Грышка-бандыт... Кажуць, вярнуўся, тут ужо круціц-ца. І нешта падобнае да страху заварушылася ўсярэ-дзіне... Заб'юць... ім чалавека забіць — што муху... Ці ма-ла здарэнняў было?

Але Міхалка хутка адагнаў палахлівыя думкі.

— Што мне баяцца? Чаго шкадаваць? Што мне чакаць ад жыцця? Згібла ўсё... Не чалавек ужо. Не будзе шчас-ця — усё роўна.

Шкада стала Міхалку самога сябе. Жаль аб мінулым, аб жыцці загубленым ускалыхнуў душу... І з нейкай ба-лючай уцехай ён углыбіўся ва ўспамінкі. Адзін за адным замігацелі малюнкі таго светлага, прыгожага, што калісь было і счэзла назаўсёды, счэзла раптам, нечакана...

Быў як усе. Жыў поўным жыццём.

Як яшчэ малы быў, бегаў, гарэзваў... Першым быў сярод сяброкоў... Як тады вольна жылося!.. Нічога не знаў, не дбаў ні аб чым, знаў толькі гульні свае, забавы дзіцячыя.

Потым узрос. Паспытаў трохі гора. Бацька памёр, з адной маткай застаўся. Цяжка прыйшлося. Пазнаў, як трудна працоўнаму люду хлеб дастаецца. Але ўцеха была кветка-дзяўчына. З ёй усё гора сваё разважаў. Шчыра любіў яе, так, як толькі можна любіць. І яна яго таксама. Бывала, дзень — праца, а ўночы — часіны кахання. І праца была ніпачым.

А потым — расстанне. У салдаты ўзялі. Там яшчэ горш прыйшлося. Але затое там шмат навучыўся чаму, пазнаў — адкуль зло на зямлі, хто вінават, што простаму народу так цяжка жывецца. З людзьмі пазнаёміўся — нейкімі дзіўнымі, новымі. Усё дабіваліся шчасця гаротнаму люду... За гэта і пакуту неслі, гора прымалі. Пасля ўжо і сам гэткім стаў, але нічога зрабіць не ўдалося. У бойку пагналі, нагу адарвала. Доўга ў шпіталі ляжаў, са смерцю змагаўся. Перамог, але не на радасць сабе, вярнуўся бязногі ў двор...

Каханка чакала... І вось — стрэліся... Слёз колькі было... Бачыць шчасце і знаць, што няма яго, што ўжо разбілася, згублена — ой, як гэта цяжка! Хутка зноў разлучыліся... замуж пайшла. Сам гэта ўладзіў, каб не мучыць яе і сябе...

І пацягнулася шэрае, нуднае жыццё... Нават і вольнасць прайшла неяк неўзаметку. Усё багацеі арудавалі, сілу ўзялі зноў, як раней, бядоце дыхнуць не давалі. І так аж да гэтага часу. А цяпер — невядома.

І ў Міхалкі зноў адна за адной паляцелі думкі аб справе. Думкі пазойлівыя, турботныя. Міхалка сабраў усе сілы і сілком перарваў іх... Зноў углыбіўся ў руковыя, лагодныя ўспаміны. І пад уплывам іх ён супакоіўся. Думкі ахінуліся мяккай, смутнай пялёнкай, зліліся ў няясныя абразы і пачалі памалу пераходзіць у ціхую дрэму.

Раптам ён абудзіўся... Ці гэта здалося яму? Быццам гаворка пачулася... Міхалка прыслухаўся... Яшчэ... Цяпер ужо скрозь шум ветру і дажджу выяўна пачуліся галасы... Хто гэта?.. Хіба за сенам хто падцікаецца? Вызірнуць ці пачакаць?.. Вось і асцярожныя крокі печыя...

— Тут ён, павінна...— пачуўся скрозь буру прыдушаны голас.

Міхалка пазнаў гэты голас... з дзяцінства ён знаёмы

яму... Калісь яны з Грышкам былі першымі сябрукамі, толькі як выраслі, пайшлі па асобных пуцінах.

Міхалка сцяміў, чаго прыйшоў Грышка, чаго яму трэба... Па целу пабеглі мурашкі... Дух заняло... Што рабіць? Уцякаць або чакаць, затаіўшыся — мо не прымецяць?

Мацае нехта па сену... Вось ужо блізка... Схапіў за нагу...

— Тут!..

Нешта цяжкае навалілася на Міхалку.

— Усё!..— мігнула ў Міхалкавых думках.

Але страх паддаў сілы... Ірвануўся, перакуліў некага, кінуўся ў мокрую, бяздонную цемру.

Бег, як мог, не зважаў, што баліць, як агнём пячэ, абрубак-нага... І знаў, што не ўцячэ, але ўсё-ткі бег...

Раз... Дзераваяшка некуды глыбока ўехала... Рынуўся долу Міхалка... Моцна, балюча рванула застраўшая дзераваяшка, аж застагнаў нема ад болю...

Насціглі... наваліліся... прыціснулі... Біць пачалі...

— Гвалт! — неяк коратка, глуха панеслася ў бурлівым паветры і ўраз абарвалася ветрам...

Больш не мог крычаць Міхалка: нейкай бруднай анучай рот заткнулі... Білі, лаяліся... К Дняпру пацягнулі, штурхаючы...

Міхалка нічога не помніў. Пачуў, што чапляюць на шыю нешта цяжкое... Сцяміў тады...

«Як сабаку! — мігнула ў думках,— за праўду...» Сволачы, крыкнуць хацеў так, каб пачуў увесь свет, а замест таго прастагнаў неяк нема...

Шалёная, дзікая злосць агарнула... Сабраў усе сілы астатнія — ірвануўся...

Дарэмна. Сціснулі дужыя рукі... Нехта ўдарыў па галаве так, што Міхалка прытомнасць згубіў.

Пясок, каменні дробныя пасыпаліся ў ваду... Забулькалі квола-жалобна, быццам заплакалі...

Плясь!!!

Пацалункам шчырым, магутным спаткаў Дняпро сваю ахвяру...

І сціхла ўсё на хвілінку... быццам жахнулася дзікай, страшэннай падзеі...

А потым усё зашумела, завыла... Лазняк зацягнуў хаўтурную песню...

4

На другі дзень толькі і было гамонак, што пра Міхалку. Дзе ён падзеўся?.. Усе гаварылі, і кожны па свой лад рабіў дагадкі. Адны не знаходзілі тут нічога надзвычайнага; казалі, што проста паїшоў куды па дзелу і неўзабаве вернецца, другія казалі — утапіўся ў Дняпры: адышоўся ў пацёмках ды няўмысля і бухнуў з высокага берага; трэція толькі ківалі галовамі ды мнагазначна цадзілі скрозь зубы:

— Тут нешта ёсць...

Але цяжкая праца хутка зацёрла цікавасць да гэтага здарэння.

Пагаварылі дзень-другі і перасталі... Забыліся, быццам і не было ніколі Міхалкі. Толькі бабы-плятухі з уласцівым ім мастацтвам усё тварылі да смеху цудоўныя байкі, ды пакрыўджаная бядота часамі, разважаючы свае нягоды, успамінала вернага сябра:

— Эх, няма нашага Міхалкі... Ён бы пастаяў за нас, не даў бы ў крыўду. Ён бы дастукаўся, раскрыў усе іхнія злачынствы...

А Шлёмка, як толькі пачуў, што з Міхалкам нешта здарылася, адразу сцяміў, што гэта значыць, і ад шчырага сэрца пашкадаваў сябрука.

— Сам загубіў сябе... Не пасцярогся... Ну, цяпер мой чарод, трэба канчаць пачатае дзела...

І ён паспешна стаў збірацца.

— Куды гэта ты? — запытала яго матка.

— Трэба, інтарэс ёсць...

І таемна-сур'ёзна дадаў:

— Калі хто спытае, скажы, што за таварам паехаў.

— Ой, мой сынок, ці не замысліў ты што? Глядзі, беражыся... Сам ведаеш, які час цяпер... Што толькі дзеецца — барані божа!..

— Не бойся, мама!.. Я — круткі, мяне голымі рукамі не возьмеш...

Назаўтрага ён ужо быў у павятовым горадзе. Там ён проста накіраваўся ў мясцовае аддзяленне дзяржаўнай палітычнай управы.

Прыйшоўшы ў канцылярыю, ён спытаўся ў супрацоўніка, дзе можна бачыць загадчыка.

— А вам навошта ён?

— У мяне сакрэтнае дзела...

Супрацоўнікі здзіўлена абглядалі яго несамавітую фігуру.

— Пачакайце, ён заняты.

Шлёмка сеў на лаўцы і стаў абдумваць, як і што гаварыць загадчыку. Праз хвілін пятнаццаць яго запрасілі ў кабінет.

За сталом, закіданым цэлым возам паперы, сядзеў малады чалавек з выразлівым энергічным тварам.

— У чым справа?

Шлёмка пачаў.

— А...

З першых слоў перапыніў яго загадчык:

— У нас ужо ёсць папера з губерні... Я надта рад, што вы да мяне трапілі. Вы мне ўсё дакладна абмалюйце, што ў вас дзеецца, і нам тады будзе ясна, як, з якога боку лепш узяцца за гэту справу. І дзіўная ж рэч. Зусім над бокам, а быццам краіна другая. Хваля рэвалюцыі не дакацілася да гэтага месца, не зварушыла стаячага балота. А шмат яшчэ ёсць гэткіх нечапаных балот!.. Ну, дык апавядайце!

І Шлёмка дакладна расказаў аб усім, што дзеялася ў іхнім сяле за апошнія гады і што цяпер дзеецца. Загадчык уважна слухаў, часамі запісваючы штось на паперку... Як Шлёмка скончыў, ён задаў яму колькі пытанняў, па якія Шлёмка з ахвотай адказаў.

— Ну, вось што... Цяпер мне ўсё ясна... Дзякую за вестку. Хутка мы паможам вам. Выбачайце, вось што яшчэ: вы не ведаеце, калі цяпер маюць быць у вас валасныя?

— У нядзелю пахату папоўскую дзяліць будуць — прыедуць.

— Ага... Ну, добра, добра. Цяпер вы едзьце ў двор і чакайце. Вядома, лепей, каб ніхто нічога не ведаў. Сваім таксама не кажыце.

— Я знаю. Я яшчэ і Міхалку гаварыў, каб асцярожна...

— А... Шкода хлапца, такіх нам паболей трэба. Шкода, шкода...

— Ну, бывайце здаровы!

— Бывайце!

З спакойным сэрцам Шлёмка вярнуўся ў двор. На яго адсутнасць ніхто ў сяле не звярнуў увагі. Не да гэтага было: ішла самая гарачая работа.

— Татка, татка!.. Ідуць!..

— Хто ідзе?..

— Дрозд прыехаў з воласці і яшчэ нейкі... Сюды ідуць!

— А...

І старшыня сельскага Савета борзда пасунуўся насустрэчу дарагім гасцям.

Па вуліцы зважна сігалі два чалавекі. Адзін з іх быў апрануты па-вайсковаму і на баку меў рэвальвер.

Валасных сустракалі і праводзілі цікавыя вочы сяльчан, якія па выпадку свята былі блізка ўсе на вуліцы. У адных вачах свяцілася толькі цікавасць, а з другіх яскрава глядзела несхаваная нянавісць...

— А, стары верабей! — загаманіў вайсковы, убачыўшы старшыню.— Ну, як маешся, чорт барадаты?

— А дзякую, нічога. Як вы? Ну, заходзьце, зрабіце ласку!..

— Зойдзем, зойдзем... Што, не чакаў?

— Як гэта не чакаў! Знаў, што сёння прыедзеце...

— Ну, гэта добра, што чакаў... Праўда, «Раманавіч»?

— Праўда, праўда,— з усмешкай адказаў «Раманавіч», ужо досыць стары, панурый мужчына.

У хаце ўжо гаспадыня завіхалася каля прыпечка.

— Ну, як, што? — запытаўся вайсковы, сядаючы на лаве.— Як тут у вас?

— Ды што? Як вам тут сказаць... Ганка! Ідзі на вуліцу! — крыкнуў ён раптам на дачку.

Тая ўжо знала: пабегла...

— Ды так у нас... вы ж, пэўна, ведаеце... чулі... Чорт яго ведае! Небяспечна. У губерні быў, невядома, што там натварыў. Сядзім вось цяпер, як на жары.

— Глупства. Слядоў не засталося пасля гэтага?

— Ну, нашы хлопцы не зблышуць.

— Дзе цяпер Грышка?

— Цяпер? У дварэ, пэўна. Ён у Сідара ў ёўні заквата-раваўся. Не, аб гэтым дык мы спакойны. Вось толькі страшна...

— Не бойся, стары, не прападзём. Зелля ж стане вочы заліць?

— Аб гэтым і гаварыць не трэба!

— З пахатаіі трэба пачакаць,— прамовіў «Рамапавіч».— Пакуль не ўляжацца ўсё...

— Калі ж араць хутка час будзе...

— Ну, пачакасце... Вось трэба зараз сабраць тут каго ды пагаманіць, парадзіцца...

— Яны хутка прыйдуць усе: бачылі ж, пэўна, як вы прыехалі...

І сапраўды, праз колькі часін пачалі збірацца мужчыны. Прыйшоў пісар, прыйшоў белабрысы, яшчэ чалавек пяць. У хаце загудзела гамонка... Спачатку паціху, потым усё смялей, а як селі за стол — вакол пляшкі самагону — зусім разышліся... Крык, смех, гвалт — усё злілося ў адзін нязладны гуд. У вокны пачалі зазіраць цікавыя галовы, але мужчыны не зважалі на гэта: каго тут баяцца!..

— Дык, значыцца, зямлю дзяліць? — ужо каторы раз пытаўся вайсковы.

І, як і кожны раз, яму адказваў цэлы хор п'янеючых галасоў:

— Дзяліць!..

— Вядома, дзяліць!

— Чаго там чакаць? Каб злыдні якой дасталося!..

Што яны нам... ці вам? А мы не пастаім...

— Ды гэта вядома... ад нас не будзеце ў крыўдзе.

— Вы нам, а мы вам!

— Глядзіце ж, братцы! Вы знайце тое, што мы, можна сказаць, галаву сваю падстаўляем. Вы павінны гэта разумець...

— Вядома! Што мы — дзеці малыя!

— Калі што — не выдаваць, разам адказваць!

— Ды няўжо ж! Калі што — апошняе аддадзім, а выручым.

Усё п'яней і п'яней рабіліся мужчынскія галовы, усё гучней і бязладней станавілася гутарка. Ужо трудна было разабраць, што гаворыць кожны асобна. Нават і самі гаваруны, пэўна, не разумелі таго, што гаварылі. Гаварылі блізка ўсе, а слухаць — ніхто не слухаў.

І ўвесь гэты кірмаш засцілала густая хмара табачнага дыму.

Пачалі цалавацца, абымацца. Цяпер толькі і можна было вылучыць з агульнага шуму моцнае цмоканне ды жорсткія словы брыдкай лаянкі.

. . . . . .

— Салдаты, салдаты ідуць! — уляцела ў хату некалькі хлапчукоў.

Мужчыны перш і ўвагі не звярнулі. Толькі як колькі

разоў пераказалі ім гэтае слова — «салдаты»,— пасціхалі, пераварваючы, мусіць, у сваіх п'яных мазгах гэтую нечаканую вестку... І ніяк не маглі ўцяміць: ці гэта добра, ці дрэнна, што салдаты ідуць? Урэшце, пэўна, пастанавілі, што добра, бо раптам ажывіліся.

— Салдаты! А! Салдаты! Вось добра! Давайце іх сюды, галубочкаў! Вып'ем!

Пісар узняўся і прапішчаў, як толькі дазвалялі яму сілы:

— Няхай жыве Чырвопая Армія! Ура!..

— Урра! Урра! Чырвоная Армія!

У хату ўвайшло чалавек з пяць чырвонаармейцаў.

— Іменем рэвалюцыі вы ўсе арыштаваны!..

— Ха-ха-ха-ха!.. Го-го-го-го-го!.. Малайцы!.. Ну і малайцы!.. Арыштаваны!.. Го-го-го-го!..

— Маўчаць!.. Жарты тут ні к чаму! Будзьце ласкавы, паны самагоншчыкі, зараз жа ісці за намі!..

— Ха-ха-ха! Хе-хе-хе!..

Але ўжо ў п'яным рогаце пачулася нейкае недавер'е, апаска. Толькі зусім звар'яцелы пісар ніколькі не губляў прысутнасці духу. Ён, як мага, тыркнуў пляшкай аб стол, аж усё на ім зазвінела, і загвалтаваў:

— Пляшка арыштавана! Хо-хо-хо-хо! Арыштавана! Госці, прашу! Чырвоная Армія! Урра!

І ён, як непрытомны, крычаў, махаў рукамі, абарачваўся на ўсе бакі да сваіх сяброў. Але тыя ўжо сцямілі — пудліва маўчалі. І лямант пісара неяк дзіка, прарэзліва, непадтрымана раскідаўся па хаце...

Старшы з чырвонаармейцаў падышоў бліжэй да яго.

— Даволі! Выхадзі!

— Як? Што? Куды?

Пісар недалужна-п'яным поглядам азірнуўся на баках. Мужыкі ўсе маўчалі, не гледзячы адзін на аднаго, пісар зусім асалапеў, цяжка плехануўся на лаву, вылупіў вочы і сядзеў, нічога не разумеючы.

— Ну, дакуль сядзець будзеце! Выхадзі на вуліцу! Хлопцы, бяры іх!

Мужыкі сядзелі. Вайсковы замармытаў неслухмяным ад самагону і страху языком:

— Так-то яно так... але... як жа гэта... без усяго... раптам... Ні табе мандату...

— Што? Мандату? — заўважыў яго старшы.— Як праспішся, тады я табе мандат пакажу. А ты хто такі?

Толькі цяпер ён прыкмеціў рэвальвер.

— А... Будзьце ласкавы зняць ваша аружжа!

Той моўчкі аддаў рэвальвер.

— Ну, доўга чакаць яшчэ вас прыйдзецца?

Мужыкі заварушыліся:

— Дык як жа ж... Апрануцца, на дарогу ўзяць. Так раптам.

— Ладна. Сідаропак, ідзі скажы там на сяле, каб прынеслі ім што трэба. Ды там разам яшчэ дзве падводы вазьмі.

. . . . . .

Усё сяло высыпала на вуліцу, як павезлі арыштаваных. У адным месцы чуўся смех, жарты, у другім спачуваючая гаворка. То там, то сям віднеліся заплаканыя твары, а некаторыя бабы галасілі, быццам хавалі ад'язджаючых.

Арыштаваныя моўчкі сядзелі на вазах, схіліўшы галовы. Думалі... Пэўна, успаміналі сваю чыннасць і загадвалі на тое, што іх чакае.

На краю сяла Шлёмка стаяў ля свае хацёнкі. На твары яго ззяла здавольненне. Як праязджалі міма, яго радасна-здаволены погляд на момант спаткаўся з панурым поглядам старшыні. Той здрыгануўся. У вачах злосць загарэлася. Мусіць, дагадаўся, чыіх рук гэта справа...

А Шлёмка святкаваў у душы. Ён бачыў рэвалюцыю, бачыў вызваленне. Ён бачыў, што і да іх сяла ўжо дакацілася хваля і магутным выплескам змыла адвечную крыўду.

Толькі адна хмурынка цямніла яго настрой: гэта памяць пра Міхалку. Не мог ён ніяк забыцца на свайго сябра. Як роднага брата, шкадаваў яго.

Але нейкі нутраны голас супакойваў Шлёмку, шаптаў яму:

— Гэтак павінна быць. Гэта неабходна. Рэвалюцыя ахвяр патрабуе...

ЧАПЛЮК

Дружна жыла наша камуна. І весела. Бывала, ці добра, ці дрэнна, ці ёсць чым пазатыкаць назойлівыя жываты, ці няма,— усё роўна смех, песні, жарты нязводна панавалі ў нашай хацёнцы.

Стаяла нас у аднаго селяніна роўна пяць чалавек. Цесна было. Вядома ўжо, якія раскошныя накоі ў нашага селяніна, ды к таму яшчэ незаможнага. І ў сэнсе «прадуктыўнасці» — таксама кепска... Паёк... А каб ад гаспадара што — не. Ды куды ж там: пакармі гэткую плойму раздругі, дык і сам без хлеба астанешся.

Але ў нас быў надта добры звычай: ніколі не траціць прысутнасці духу. І жыццёвыя нягоды толькі давалі нам багаты матар'ял да бесканцовых гутарак, жартаў. Як прыйдзе, бывала, ноч, паляжам упокат на падлозе — усю хату засцелем — і давай гарэзаваць. Ужо пеўні недзе ратунку пракрычаць, ужо гаспадар разоў дваццаць перавернецца, лежачы на печы і, пэўна, на ўсе чатыры бакі лаючы ў думках сваіх кватарантаў,— а мы ўсё сваё...

Адно, другое, трэцяе — тэмы мяняюцца, пралятаюць, як матылькі ўлетку... І ўсё смешнае, усё вострае, ёмкае, усё такое, што наскрозь працінае.

Весела было... І калі на дзела станавіліся, таксама не тужылі. Умелі з работы пацеху рабіць.

Быў у нас Чаплюк... З аблічча нічога цікавага: маленькі, хударлявы, непрыгожы, нос непамерна вялікі, губы тоўстыя... А дзіўны быў хлопец!

У нашай часці ён быў самым старым чырвонаармейцам. Ад самага фармавання часці ён як трапіў у яе, дык увесь час безадлучна і служыў у ёй. На яго памяці колькі камандзіраў, камісараў перабыло, склад чырвонаармейцаў зусім змяніўся, а ён нязменна аставаўся на сваім месцы.

Быў ён сакратаром ячэйкі. І трудна было адзначыць: ці добры ён сакратар, ці благі? Абавязкі свае спаўняў шчыра, нават залішне шчыра. Бывала, як прыйдзе час

справаздачы, як надыдзе дзела да ўсялякіх «формаў» ды «бланкаў» — бяда! Ад кампаніі адаб'ецца, забудзецца аба ўсім чыста па свеце і сядзіць. Строчыць. Колькі ён, бывала, паперы перапсуе, колькі чарніла паразлівае! А сам запэцкаецца ўвесь, ускалмачыцца — зірнуць страшна.

У гэткую пару звычайна ўся камуна наша неяк ціхэла. Спачатку, бывала, пасмяёмся троху над нашым «пісарам», пажартуем, а потым кінем яго, займёмся кожны ў адзіночку сваім дзелам — няхай працуе! Зналі, што йпачай не можа наш Чаплюк.

А цяжка-ткі давалася Чаплюку пісарская справа. Яно й не дзіва: бадай, толькі ў арміі ён і пісаць добра наўчыўся. Проста ад станка з завода пайшоў ён бараніць Саветы.

Ну, затое ж і аджывала наша камуна, як вялізным пакетам скідаўся з Чаплюка цяжар месяцовай адчотнасці! Тады Чаплюк — не пазнаць — мяняўся. Трудна было даць веры, што гэта той самы пісака, што толькі што з натугай выседжваў за сталом страшэнныя, вялізныя «формы».

Дый наогул Чаплюк неяк дужа ўмеў мяняцца. У яго было два абліччы: адно, калі можна так назваць,— «афіцыйнае», а другое — «сяброўскае». Першае з'яўлялася тады, калі Чаплюк быў заняты сур'ёзнай справай або як саромеўся. А саромеўся ён часта. Досыць было з'явіцца ў нашай камуне якому-небудзь новаму чалавеку, як Чаплюк, што смоўж, убіраўся ў сваю шкарлупу і выстаўляў напаказ толькі свае наіўна-сур'ёзныя вочы ды важна напружаны выраз цьмянага твару.

Затое, калі аставаўся ён сярод сваіх блізкіх сяброкоў (а гэткімі былі ўся вайсковая часць і блізка ўсе мясцовыя сяляне), ён ураз вылазіў з свае шкарлупы і разліваўся на ўсе бакі ўсёй сваёй істотай.

Чаго толькі ён не вытвараў! Чаго не выгадваў! Бывала, да таго давядзе, што духу не хапае смяяцца. Ён табе і тэатр, і балет, і опера, калі хочаш. А то проста скорчыць такую міну, што ўсе аж кладуцца. І мастак жа ён быў міны корчыць! Ды не проста, абы-як, а ўсё з закідам у чый-небудзь бок.

Больш за ўсё армейцы любілі, як ён «Антанту» паказваў. Заўсёды, бывала, так і крычаць:

— Антанту! Антанту!

А паказваў ён яе якраз так, як у чытальні на афішы яна была намалёвана, ды так удала — проста дзіва!

Здольны быў хлопец. Хто толькі не знаў яго, усе ў адзін голас казалі:

— Талент. На сцэну трэба, у студыю, вучыцца.

І ўсе вешчавалі яму слаўную будучыню.

А ён, калі чуў гэта, не карожыўся, як іншыя, не аднекваўся, а сур'ёзным, шчырым тонам гаварыў:

— Мне каб навучыцца. Каб апрацавалі мяне добра, адшліфавалі. Толькі — дзе там...

Колькі раз прабавалі зацягнуць Чаплюка на сваю армейскую сцэну, але з гэтага нічога не выходзіла. На рэпетыцыях яшчэ нішто, а як прыйдзе справа да спектакля — быццам нешта зробіцца з ім. Палохаўся, мусіць, ці што. Ужо за колькі гадзін да пачатку засмуціцца неяк, убярэцца ў сваю шкарлупу, і хоць ты што хочаш рабі — не разварушыш яго, не абудзіш у ім таго Чаплюка, які патрэбны. Гэтак і выйдзе на сцэну і пачне гаварыць нейкім глухім, замагільным голасам.

Так і не ўдалося прыцягнуць яго да сцэны. Прыйшлося махнуць на яго рукой, пакінуць у спакоі.

Любілі Чаплюка ўсе чыста: і армейцы і сяляне. Нават старыя і тыя ахвотна з ім час марнавалі, не гледзячы на тое, што і камуніст. І не злаваліся дужа, калі ён над імі часамі жарт які выкіне. Былі ў яго і асаблівыя прыхільнікі сярод сялян, з якімі ён вёў самую заўзятую дружбу. Цікава было бачыць, як калі-небудзь спатыкаўся ён з каторым ад гэтых сваіх сябрукоў. Яшчэ здалёк крычаць абодва ва ўсё горла:

— Чаплюк!

— Дзядзька Змітрок!

— Дзень добры!

— Добры дзень!

— Куды?

— Адкуль?

Сыдуцца — і пачалося. Толькі:

— Га-га-га-га! Го-го-го-го! — рагоча на ўсю вёску барадаты селянін...

А што свая братва — армейцы, дык тыя без Чаплюка жыць не маглі. Ён неяк умеў злучаць усіх — і простых армейцаў і камандзіраў у адну дружную, сяброўскую сям'ю. Чуць калі вольная часіна, збяруцца, бывала, усе ў чытальню, балалайка, гітара аднекуль з'явяцца — і пойдзе вясёласць! Іграюць, пяюць, а больш Чаплюка слухаюць. А той адчувае сябе на сваім месцы і «працуе» ад усяго сэрца. Канчалася ўсё гэта звычайна тым, што, зама-

рыўшыся ад смеху і спеваў, армейцы сядуць разам з свайімі камандзірамі ў гурток і пачнуць доўгую сяброўскую гутарку. І кожны тады адчувае сябе сябром адзінай, моцнай і дружнай пралетарскай сям'і.

Траплялiся ў армейскім жыцці гадзіны, калі цяжка прыходзілася хлопцам. І тады Чаплюк быў незамяніміы. У яго была нейкая дзіўная здольнасць ніколі не адчайвацца. Як бы дрэнна ні было яму, ён усягды быў вясёлы, бязрупатны, і сваёю бязрупатнасцю ён захапляў усіх.

Помню, нешта аднаго разу нашай часці прыйшлося пільна перабрацца з аднаго месца на другое. У тры дні трэ было зрабіць пераход блізка ў паўтараста вёрст. Надоўга застаўся ва ўсіх у памяці гэты пераход.

Была зіма. Жорсткая, сцюдзёная зіма. Завея і завея. Дарогі няма. Па калена вязнуць ногі ў сыпкім, глыбокім снезе. Куды ні зірнеш — белае мора, смутнае, бяскрайнае... Нідзе канца не відаць. Цяжка і нудна. Ног не чуваць, а ў галаве быццам туман нейкі — зыбкі, цягучы... Неяк міжвольна роспач бярэ, неахвота. Не хочацца йсці. Лёг бы, здаецца, у мяккі, пульхны снег і спачыў у салодкай нерухомасці.

Але зірнеш убок: воддаль у снезе калупаецца маленькі, недалужны. Рукамі махае, рупіцца, каб не астацца. Зірнеш на яго, а ён міну скорчыць табе насустрач ды пракрычыць што смяхотнае. І, змораны, зняможаны, не ўтрымаешся, каб не зарагатаць.

І не прыкмеціш, як сілы прыбавіцца. Смялей і адважней засігаеш у бела-туманную даль...

. . . . . .

Неяк улетку, якраз у самы разгар сенакосу, у тоі час, як армейцы дружна працавалі на сялянскіх пожнях, далучаючы да сялянскага поту кроплі свайго чырвонаармейскага, у часці атрымалі загад аб звальненні ў двор старых гадоў.

Заварушыліся, загаманілі армейцы. Адны радаваліся, як шалёныя, другія адкрыта зайздросцілі. Звальнялася адразу колькі гадоў; блізка што палавіна ўсяе часці рыхтавалася ехаць.

Адразу змяніўся настрой ва ўсіх. Усе інтарэсы сучаснага жыцця адышлі ўбок, і некаторы час блізка ўсе чырвонаармейцы жылі салодкімі, ап'яняючымі настроямі сваіх родных вёсак, сваіх родных краін. Заціхлі спевы, гульні; замярцвела вясёла-ёмкая праца ў палях. Замест гэтага

сям-там гурткамі па двое, па трое збяруцца, зюкаюць жвава, узрушана. Адны радуюцца, другія сумуюць.

А ў штабе пісалі дакументы...

Чаплюк таксама падлягаў дэмабілізацыі. Яго год яшчэ раней звольнены быў, а ён затрыманы як партыйны. А цяпер і яго чарод прыйшоў...

Чаплюк адразу, як пачуў новую вестку, узрадаваўся нейкай дзіцячай шалёнай радасцю. Ён пачаў скакаць, кідацца ка ўсім, лямантаваць так, як сілы хапала... Кінуў работу і пайшоў падымаць гвалт па вёсцы.

Толькі нядоўга цягнулася яго шалёнасць. Увечары таго самага дня я, увайшоўшы ў гаспадарскі сад, убачыў, як ён у глыбокай разваэе сядзеў пануры ў куточку на бервяне. Я падышоў да яго.

— Ну, што... едзеш, значыцца?..

— А што там!.. Дакуль служыць?.. Час у двор... Эх, знаеш, брат... цяпер я... Скрыдлы развязаны... вольная птушка!..

— Куды ж ты думаеш падацца: на Урал ці на Украіну?

— А ўсё роўна. Я яшчэ не надумаў. Ды мне што! На Урал паеду, там па завод з'яўлюся. Брат ты мой! Усе свае хлопцы. Эх, зажывём! А то на Украіну. Брат усё піша, каб прыязджаў. Зямлю буду араць на валах...

Адразу відаць было, што ўсё гэта Чаплюк гавора не ад сэрца, што ўся гэта яго бадзёрасць, рызыка падробленая, што ён проста не хоча выгляду даць, а на сэрцы ў яго зусім іншае. Я зразумеў гэта, і мне неяк шкода-шкода стала гэтага маленькага чалавечка.

У Чаплюка не было свайго двара. Ён быў, як кажуць, чалавек без роду і племені. Яшчэ змалку ён пазбыўся бацькоў і пайшоў вандраваць па свеце. У апошні час жыў дзесь на Урале, на заводзе працаваў; адтуль і ў войска паіпоў. Быў у яго брат: той недзе на Украіне на гаспадарку ўзбіўся, жыў ніпто, заможна. Да яго і меўся паехаць Чаплюк або на Урал, на знаёмы завод...

Я знаў, што не надта ўсміхалася Чаплюку будучыня, хоць ён і хваліўся. На Урале голад: пасунься туды, дык здохнеш, пакуль заробіш што-колечы. А к брату — таксама мала прыемнага... Мала што піша, а там запяе што другое... ды і на зямлі не прывык працаваць Чаплюк — цяжка...

І відаць было, што ён і сам цяпер не ведае, што рабіць; страшна яму зрывацца з пэўнага, бяспечнага месца і ехаць

у невядомую даль. Мусіць, надта цяжкім бярэмем ляжалі на яго душы ўспаміны аб мінулых бадзяннях.

А паказваў выгляд, быццам сапраўды давольны, што з войска звальняюць.

У наступныя дні Чаплюк трымаў сябе вельмі дзіўна. Калі дзе на людзях — смяецца, весяліцца, жартуе, а адзін застанецца — адразу засмуціцца, задумаецца, убярэцца ў сябе... Сядзіць, глядзіць у адну кропку. Колькі раз заставалі мы яго ў гэткім стане. Як падыдзеш, усхамянецца, быццам засароміцца, і пачне гаварыць-гаварыць усё адно, аб адпым: як ён рад, што паедзе. Неяк цяжка, балюча было яго слухаць, і мы кожны раз стараліся пакідаць яго ў адзіноце...

Чым бліжэй надыходзіў дзень ад'езду, тым дзіўней быў Чаплюк і тым цяжэй і неяк напружней станавілася ў нашай камуне. Мы ўсе разумелі, што дзеецца з нашым Чаплюком, усе наскрозь бачылі яго пачуцці, яго сумлеўкі. І, апрача таго, што нас усіх надта цяжарыла, маркоціла блізкасць разлукі з сваім лепшым сябруком, нам было непамерна цяжка глядзець на яго пакуту. Ясна было, што Чаплюк зусім не хоча, баіцца ехаць, а паедзе... Паедзе, можа, на гора, бядоту толькі затым, што яму пасля выказанай радасці неяк сорамна ўжо заставацца.

І мы ўсе думалі, радзіліся, як памагчы справе, як выручыць сябрука. І, урэшце, надумаліся...

На другі дзень камісар заявіў Чаплюку, што, згодна толькі што атрыманага распараджэння, усе сакратары ячэек на нявызначаны час затрымліваюцца ў войску і што яму, Чаплюку, таксама прыйдзецца астацца.

Невядома, ці дагадаўся Чаплюк, што гэта яму наўмысля гэткую штуку падладзілі, ці не. Пасля ўжо, як прайшло нямала часу і мы раскрылі яму свой сакрэт, ён запэўніваў, што і ў думках у яго не было нічога падобнага. Як там ні было, але наш Чаплюк, дзеля прыліку палаяўшы некага за тое, што яго «сілком трымаюць, копцяць тут у войску», астаўся служыць... І адразу супакоіўся...

Праз колькі дзён мы праводзілі ад'язджаючых таварышаў, і Чаплюк, як і раней, пацяшаў усіх сваімі вострымі жартамі, выкладаючы ад'язджаючым самыя недарэчныя пажаданні.

А тыя пазіралі на яго з ласкава-светлай усмешкай і гаварылі:

— Каго-каго, а Чаплюка мы будзем доўга помніць!..

СПАКУСА

Стораж Бяздзедаўскай святадухаўскай царквы, маленькі, увесь кудлаты, абшарпаны чалавечак, стаяў перад сваім бацюшкам у постаці чалавека, які развязвае нейкае надта важнае пытанне і так заклапочан, што проста й сказаць нельга...

Ён, праўда, прыйшоў толькі затым, каб узнаць — ці будзе заўтра адправа ці не, і ўвесь яго абавязак у гэтым выпадку складаўся з таго, каб дачакацца бацюшкавага адказу, пацерціся трохі ў бацюшкавай кухні і тады,— або з паважным відам пасунуцца да званіцы і, спаквaля ўзабраўшыся па небяспечных сходнях, баўкнуць разы са тры ў стары пабіты звон, або з такім жа паважным відам пашыбаваць у бліжэйшую вёску да свата Карнея. Але ў бацюшкі быў гэткі недалужны, пакорны і маркотны выгляд, што ён не мог больш нічога зрабіць, як толькі зморшчыць свой твар да таго, што ён стаў падобны на сушаную дулю, і гэтым паказаць, што ён не менш за бацюшку не ведае, што рабіць.

Па праўдзе сказаць, дык ён знаў, што трэба рабіць, і нават дзівіўся, чаму гэта бацюшка не дагадаецца, але... па тое бацюшка...

— Яно-то народу не надта многа будзе... Бачыце, бацюшка, праца самая... але ізноў падумаць, як жа ж і без абедні...

І стораж развёў рукамі.

Бацюшка, старэнькі і такі самы маленькі, як стораж, але «благаабразны», стаяў ля стала і ў задуме тарабаніў па сталу пальцамі. Вочы яго былі ўпяты ў раскалмачаны дашчэнту сторажаў лапаць, і ў іх відаць быў смутак. Што ён думаў у гэты час, якія думкі луналі ў яго сівенькай галаве,— невядома.

Стораж пастаяў трохі і гукнуў яшчэ раз, асцярожна дадаўшы ў свой голас трохі настойлівасці:

— Народу-то не будзе, але...

Бацюшка перавёў свае вочы з лапця на сторажаў твар — не менш раскалмачапы за лапаць — і нічога не сказаў. Ціхім крокам адышоўся к акну.

Стораж трохі паварушыўся, патаптаўся — балазе бацюшка задам стаў і не бачыць — і, кашлянуўшы, прагукаў ўжо з большай настойлівасцю:

— Народу-то, напэўна, не будзе!

На гэты раз ён нават не дадаў «але» і ўжо спадзяваўся, што канец будзе такі, якога ён і жадае... Але бацюшка раптам схамянуўся, абярнуўся да яго і сказаў голасам, у якім чувалася нейкая сумная рашучасць:

— Во што, Сідар: цэрква — гэта не тэатр, і мы не павінны спыняцца перад тым, што не будзе народу. Богу ўсё роўна — ці поўная цэрква ці не.

— Ды гэта так, вядома... Дык, значыць, назваліць?..

— Звані, звані, Сідар!

— Пайду названю...

Ён спаквалля павярнуўся і пасунуўся к дзвярам, але ля самых дзвярэй спыніўся і, сам не ведаючы навошта, спытаўся:

— І ютрання будзе?

— Ну, дык як жа... Што ты гэта, Сідар, пытаеш?

Сідару трохі сорамна стала, што не ў лад спытаўся, і ён шыбчэй выйшаў за дзверы.

Праз колькі часу сіпла закашляў звон і абудзіў вакалічныя палі. Людзі не пачулі гэтага звону, бо царква з папоўскай і дзякоўскай сялібамі стаяла наводшыбе, і да бліжэйшае вёскі было вярсты дзве, але папоўскія куры, якія вандравалі вакол царквы, знецікі распалохаліся, і іх павадыр, чырвоны бліскучы певень, загвалтаваў, перамагаючы звон:

— Куд-кудак-так-так-так-так!..

* * *

Назаўтра бацюшка дужа здзівіўся: чаму гэта так рана зазваніў Сідар? Ён не ведаў, што ў таго быў пэўны рахунак: калі поп паслухае і раней прыпрэцца, то можна будзе раней да свата пайсці, а калі не — усё роўна страта невялікая... У адзін звон ён можа хоць цэлы дзень званіць: гэта ж не тое, што ва ўсе. Нават весялей... Стаў гэта ля акна, вяроўку зачапіў за нагу дый дзівуйся наўкола. Можна нават і піпку засмаліць. А нага ўжо па звычаю сама торгае.

Бацюшка пільна сабраўся, апрануў гэткую старэнькую, як і сам, расу з шырачэннымі рукавамі і пайшоў у царкву. Ранні халадок прыемна асвяжыў яго, а сіплы голас звону напамянуў аб чымсьці старым, пязменным і цягучым, як бескапцовая шітка.

Раптам звон чагось спыніўся, але праз хвіліпку з падвойпаю сілай загвалтаваў сіпла-паспешна, быццам хто яго душыў.

— Гвалт-гвалт-гвалт-гвалт!..

І да яго далучыліся хорам другія — тонкія і прарэзлівыя:

— Ай-яй-яй-яй-яй!..

Бацюшка перахрысціўся. Ужо, дзякуй богу, трыццаць год, як яго спатыкае гэты ўрачысты трызвон.

Але сягоння трызвон быў асабліва гучны і злосны, бо Сідар біў як мага, радуючыся, што яго план — вымапіць раней папа — спраўдзіўся.

Царква была пустой. З халоднага змроку маркотна выглядалі перухомыя твары святых. Было ціха, як у магіле, і толькі на клірасе таемна шапацелі пад дзякавымі пальцамі лісты кніг. Бацюшка па трыццацігадоваму звычаю спыніўся ў парозе, адбіў тры шчырых паклоны і тады толькі пайшоў уперад. Крокі гулкімі водгукамі каціліся па царкве.

Бацюшка ўвайшоў у алтар. Вакол стаялі і ляжалі розныя «святыя» рэчы. За доўгі час службы бацюшка так прывык да іх, што яны здаваліся яму блізкімі, роднымі.

Прыйшоў Сідар і пачаў дзьмухаць у жар. Рабіў гэта ён так шчыра, што па ўсёй царкве панёсся моцны сап, і царква на момант стала падобна на кузню.

Бацюшка апрануў абшарпаную, страціўшую ад доўгага ўжывання свой сапраўдны колер, рызу. Дзяк па клірасе паважна й працяжліва адкашляўся.

Сідар ужо насыпаў жару ў кадзіла і, спяшаючыся, нёс яго к папу, на хаду ўсё яшчэ дзьмухаючы ў яго так, што з яго бухалі іскры, як з паравіка. На сваім напружаным твары ён выяўляў гэткую рупнасць і паспешнасць, быццам ад таго — ці падасць ён у пару папу кадзіла, ці не падасць — залежаў лёс усяго свету.

Поп зірнуў на яго карузлыя ад працы рукі і ўспомніў, што матушка ўчора казала, што трэба наладзіць драбінку ў кароўніку. Благаслаўляючы кадзіла, ён сказаў Сідару:

— Я тут, Сідар, кадзіла сам вазьму, як трэба будзе, а

ты йдзі к матушцы, яна табе пакажа там — драбінку наладзіць трэба.

Сідару гэта ўпадабалася, бо яго дужа цягнула з гэтае пустое самотнае царквы на светлае вольнае паветра. І ён, забыўшыся аб тым, што знаходзіцца ў царкве, голасна загаманіў тонам спраўнага майстры:

— А я, бацюшка, тое дрэўка вазьму, што на цвіптары валяецца. Яно ніпгто яшчэ...

— Тс! — перапыніў яго бацюшка, і ён, схамянуўшыся, спрытна пашыбаваў з царквы...

У царкве засталіся поп і дзяк адзін на адзін. Пачалася адправа.

Неяк дзіка зычэла ў бязлюднай царкве гэтая голасная малітва двух чалавек. Зусім не падобна было да набажэнства. Быццам проста сышліся два чалавекі і, ад нечага рабіць, пачалі перагуквацца адзін з адным. Поп нешта бурчэў сабе пад нос у алтары, а дзяк адно і тое самае «госпадзі, памілуй» выводзіў з такімі пералівамі і на столькі ладоў, што яно ў яго выходзіла то на манер «каробачкі», то на манер «Ах, зачем эта ночь», а часамі нават чувалася ў ім нешта падобнае да апошняе часткі «Інтэрнацыяпалу». Дзяку, відаць, надакучыла вечна адно й тое самае, і ён цяпер — балазе нікога няма — стараўся гэта «адно й тое самае» аздобіць, уліць у яго штось новае і весялейшае.

У вокны заглядала вясёлае сонца і, дзівуючыся, кідала то туды, то сюды свой цікаўны погляд. Пад гэтым поглядам твары святых на іконах быццам аджывалі і неяк плюшчыліся, моршчыліся, недавольныя, мусіць, тым, што робіцца тут каля іх у гэтым «святым» будынку.

І вось здарылася нешта дзіўнае, небывалае.

Дзяк чытаў «шастапсалміе». Чытаючы, ён таксама выводзіў на ўсякія лады, і яго голас то ўздымаўся на самыя высокія поткі, то раптам спускаўся ўніз і — што люгашка ў балоце — рыпеў слабай надтрэснутай актавай.

Поп, ад нечага рабіць, сеў у вялізпае старадаўпае крэсла, што стаяла ў алтары, і задумаўся... І тут — д'ябал павярпуўся каля яго, ці што,— але ў галаву к яму палезлі самыя непрыстойпыя думкі. Ён азірнуў зморапым поглядам алтар, спыніўся па кожпай рэчы і — не пазнаў усяго гэтага.

Трыццаць год праслужыў ён у гэтай царкве і за трыццаць год ні разу не задумаўся аб тым: што ўсё гэта, навошта гэта і г. д. Усё ён прымаў, як ёсць, да ўсяго адносіўся з заўсёдашняй, загадзя нарыхтовапай, набожпасцю,

як да святога. І вось цяпер раптам, ні з таго ні з сяго, усё змянілася... Быццам нешта адляцела ад святых рэчаў, быццам святы дух іх пакінуў, і яны здаліся яму проста звычайнымі, даўно знаёмымі рэчамі, гэткімі самымі, як і тая шафа, што трыццаць год стаіць на адным месцы ў яго кабінеце, як і той малюнак, што ўвесь аблупіўся, а ўсё яшчэ вісіць над яго ложкам.

Поп зірнуў на тоўстае, вялізнае евангелле і ўбачыў у ім толькі прыгожую вялікую кнігу, падобную на матушкін альбом. Зірнуў на крыж і ўбачыў у ім толькі па-мастацку аброблены кавалак срэбра, зірнуў на чашу і ўбачыў у ёй звычайную пасудзіну, толькі на высокай назе. Яму нават чагосьці прыйшло ў галаву, што з гэтай пасудзіны дужа няёмка было б піць гарбату.

Зірнуў поп на сваю вопратку, і таксама яму дзіўна стала. Навошта ён апрануў яе, гэтую старэнькую, ужо дзіравую шмотку?..

Поп асалапелым поглядам азіраўся вакол. Прыслухаўся і пачуў, як дзяк на царкве нешта чытае; чытае няшчыра, нядбала, быццам абы-як ухае з рота словы, і яны лятуць бязладна — хто куды... Прыслухаўся поп да гэтых слоў, і яны, даўно знаёмыя яму, тысячу разоў слуханыя, раптам здаліся дзікімі, незразумелымі.

— Госпадзі божа мой! што гэта за спакуса такая,— набожна прашаптаў поп і перахрысціўся.

Рука махінальна зрабіла знаёмы рух, а сам ён неяк збоку зірнуў на гэты рух, і таксама дзіўным, недарэчным ён яму здаўся...

Поп узняўся з крэсла і пайшоў к прастолу. У роках яго не было ўжо звычайнай набожнай паважнасці... Пайшоў проста, як у хаце хадзіў. Падышоў і стаў ля прастола... Абапёрся рукой, як заўсёды ў хаце рабіў, калі к сталу падыходзіў. Потым заўважыў гэта і зняў руку...

«Нельга!» — падумаў.

А думкі ўсё лезлі і лезлі:

«Навошта ўсё гэта? Для каго?.. Няўжо для бога?.. Няўжо яму трэба ўсё гэта, гэтыя розныя бліскучыя рэчы, гэтае бязглуздае чытанне там, на цэркве? Нашто яму гэта? А мо для людзей?..»

Поп думкамі пераляцеў туды, назад, за іканастас і ўявіў сабе гэтую царкву; пераляцеў далей, за сцены царквы, і ўбачыў сялян, шчыра працуючых на пожні.

«Для каго ж? Для каго? Навошта?..»

Дзяк кончыў. Сціхла ў царкве... Поп знаў, што яму трэба пачынаць эктэнію.

— Мірам...

Сказаў і сам злякаўся свайго голасу. Неяк дзіка празычэў ён у пустым скляпенні. Хацеў яшчэ гаварыць і не мог... Неяк саромеўся свайго голасу. Здаваўся ён яму чужым, старонніім. І смешным, недарэчным здалося папу гаварыць нейкія незразумелыя, нікому непатрэбныя словы.

А дзяк, каб дарма не траціць часу, не чакаў канца і зацягнуў сваё спрадвечнае:

— Госпадзі памілуй!..

Праняяў і, не чуючы чарговага «возгласу» бацюшкі, працягнуў яшчэ раз:

— П-а-а-мі-л-у-у-у-й...

І гэта канчатковае «уй» ён цягнуў доўга-доўга, бо ўсё чакаў, пакуль поп па звычаі не перапыніць яго.

А поп маўчаў... І дзяку прыйшлося кончыць. Пачакаў, кашлянуў раз-другі, а ўсё нячутна. Урэшце, зацікавіўшыся, ён прасунуў галаву ў алтар. У алтары папа не было. Тады дзяк зазірнуў у бакоўку, дзе звычайна вісіць кадзіла, стаіць у гарнушку жар і ў шафе вісіць царкоўнае «аблачэнне».

Поп сядзеў на зэдліку, схіліўшы галаву. Поплеч з ім роілам ляжалі толькі што здзетыя рызы. Як убачыў дзяка, узняў галаву і зірнуў нейкім пустым, зманым і смутным поглядам...

— Не будзем служыць, Гаўрылавіч!..

— Што, захварэлі, бацюшка, а?..

— Не, Гаўрылавіч, не захварэў... Спакуса найшла... Д'ябал заўладаў мной... Слухай, Гаўрылавіч, скажы ты: нашто гэта ўсё?.. Каму гэта патрэбна?.. Для каго гэта?..

— Што для каго, бацюшка?..

Дзяк нічога не разумеў і, вылупіўшы вочы, глядзеў на бацюшку.

— Ды вось, Гаўрылавіч, служым мы з табою... я чытаю, ты пяеш... ну, вось сягоння, напрыклад... А для каго гэта мы служым?.. Для бога? Для людзей?.. Ці думаў ты калі аб гэтым, Гаўрылавіч?..

Дзяк урэшце зразумеў. Зразумеў, праўда, па-свойму...

— Гэта праўда, бацюшка... Я таксама думаў... Яшчэ ўчора, як зазваніў Сідар, дык я й думаю: навошта служыць заўтра? Усё роўна ніхто не прыйдзе. Самая работа, сепакос... А для бога, дык, вядома, што яму за карысць з

пашае службы! Во, будзе прастольны, кірмаш, тады прыйдуць... І даход які-колечы будзе... Пойдзем, бацюшка!

І ён з здаволеннем зацягнуў, ідучы па царкве:

— Госпадзі, памі-і-лу-у-уй.

І «луй» спусціў так нізка, што з ахвотай цягнуў яго, пакуль і не выйшаў з царквы.

. . . . . .

На гэты раз Сідараў рахунак не ўдаўся. Ён размеркаваў так, каб ладзіць драбіну якраз да таго часу, калі ўжо трэба замыкаць царкву, аж выйшла іпачай... Ён не зрабіў яшчэ й палавіны, як убачыў, што ідзе поп. Гэта яго надта здзівіла, і ён, разявіўшы рот, праводзіў папа асалапелым поглядам, аж пакуль той не схаваўся ў дзвярах сваіх пакояў...

МАР'Я

1

Змрок ахінаў вёску... Выпаўзаў паволі з куткоў-закавулкаў і разліваўся наўкола сінява-шэрымі павадкамі. Глытаў усё ў сваё бяздоннае нутро: спачатку дрэвы, потым будынкі... І толькі адна вуліца не здавалася — усё бялела й бялела светлаю плямай-істужкай...

Пісар N-й роты Ляксандра Мішчанка сядзеў на прызбе і ў задуме слухаў, як звініць вячэрнімі зыкамі вёска... Зыкі зляталіся з розных бакоў размаітымі асобнымі адрыўкамі: дзесь зараве карова, авечка забляе; там хтось закрычыць, там зарагоча; сабака забрэша жвава-задзірліва, а тут — дзын! — жук праляціць ля самага вуха; шчыра-старанна гармонік недзе пішчыць нездалёк, моладзь рагоча, гвалтуе на йгрышчы...

Ляксандра любіць вячэрнія зыкі вёскі. Слухае ён іх без напружанасці, не стараючыся разбіраць, адкуль яны, што яны, а проста раскрывае ўсё нутро ім насустрэчу, і яны, зліўшыся ў адно цэлае, у адну зладную гармонію, ціха плывуць у душу і граюць сумна-дрыготна на струнах сэрца... Ляксандра прыслухоўваецца да гэтай чароўнай музыкі і плыве ціха-маркотнымі думкамі ў мінулае...

Дзіўная рэч гэта душа чалавека! Нездаволеная, ненасытная, зайздросная... Ці знойдзецца на свеце такі чалавек, які б ад шчырага сэрца калі сказаў:— Я шчаслівы, я жыву поўным жыццём, мне болей нічога не трэба. Не! Здрадлівыя мары заўсёды турбуюць, абураюць, узносяць на сваіх скрыдлах. А куды, да чаго — невядома!.. А пройдуць гады — і схамянецца чалавек. Зірне назад і ўбачыць тое, чаго калісь не прыкмячаў; убачыць прыгажосць, убачыць жыццё светлае, яскравае і з жалем прамовіць:

— Эх, было калісь. Не вернецца болей...

Ляксандра сядзеў перухома, узлёгшыся на бярвенні хаты, і, углыблёны ў сябе, варушыў, перабіраў мяккамарудным думкамі мінулае... І сам дзівіўся таму, якія яр-

кія, шматкалёрныя былі абразы гэтага мішулага, як многа было ў ім свежага, маладога. І дзе ўсё гэта дзелася? Чым бліжэй да цяперашняга часу, тым больш шэрым, будзённым выдае жыццё, пакуль не пераходзіць зусім у нейкае бясквetнае, нуднае мадзенне.

Як ён жыве цяпер? Хто яго ведае. Здаецца, і жыццё размаітае, багатае ўражаннямі: бесканцовыя вандроўкі, выдатныя здарэнні, а ўсё неяк згладжваецца гэта, робіцца нецікавым, нудным... Колькі перажыванняў, яркіх, абуражочых! За апошні час чаго не было толькі: доўга на фронце быў, бачыў смерць перад сабой не раз... Потым на адпачынак сюды прыехалі — гульні, забавы вясковыя, цікавыя праявы новага вясковага жыцця. І ўсё гэта неяк проста, звычайна; усё прымаеш, як нешта будзённае, неабходнае. Шукаеш хараства — і яго няма... А пройдуць гады — і мо ўсё гэта іншым светам азарыцца, можа, таксама будзеш калі перабіраць ва ўспамінках сучасныя падзеі і будзеш дзівіцца таму, як калісь было хораша, шчасна.

Ляпнула бакоўка. Ляксандра знаў, што выйшла Мар'я... Справілася па гаспадарцы, накінула кажушок або хустку і выйшла супачыць на прызбе.

Дзіўная баба... Загадка нейкая... Жыве за гарбуном, дзеці ўжо дарослыя. А, пэўна, не любіць... Хіба ж можна любіць гэткую недарэку! І чаго яна пайшла за яго? Прыгожая... Яшчэ цяпер можа ўпадабацца, а ўжо гадоў трыццаць. А калісь, пэўна, красуняй была, якіх мала. Ніколі не гавора пра сябе. Калі датыркнецца яе гаворка, раптам пасуніцца, змоўкне... у вачах смутак засвеціцца — ціхі, пакорны... І ні слова не скажа.

Мар'я падсела к Ляксандру.

— Чаго не ідзеш на ігрышча?.. Сядзіць, як верабейка. Стуліўся, згарбаціўся. Дзед...

Мар'я загаварыла ціхім, грубаватым і прыемным голасам. Здавалася, што ён выходзіў з самага нутра і затым быў гэткі шчыры, задушэўны...

Ляксандра адказаў, не абарачваючыся:

— Не люблю... Нецікава...

Замоўклі... Маўчалі і думалі. Раптам Ляксандру чамусь захацелася ўзнаць, аб чым думае Мар'я.

— Мар'я!

— Га!..

— Што думаеш?

— Надта цікавы. Што думаю, тое і думаю, табе што...

— Ягора чакаеш? Замаркоцілася?

— Ага. Ягора чакаю, замаркоцілася.

А сама топка-таемна ўсміхаецца, грае шэрымі вачмі з-пад хусткі...

Ляксандра пачаў упарта разглядаць яе твар. У змроку ён выдаваў нейкім асаблівым, незвычайным і прыгожым.

Адвярнулася...

— Чаго глядзіш? Асурочыш...

Зноў маўчанка. Ляксандра захапіўся думкамі аб Мар'і. Яго ранейшы сумна-лагодны настрой разляцеўся, што дым. Ён цяпер думаў напружна, упарта.

Што за баба! Першы раз ён бачыць такую. Сялянка, простая сялянка, а колькі жаноцтва, колькі жыцця нутранога, колькі павабнасці — нейкай ціхай, прыветнай і разам таемнай.

Ляксандру неяк цягнула да гэтай жанчыны. Яна здавалася яму загадкавай, глыбокай і багатай натурай, якія часам трапляюцца сярод простых людзей, але ў большасці марна гінуць, заціраюцца жыццём, не развінуўшыся, не даўшы прастору сваім духоўным сілам.

— Ляксандра! — раптам азвалася Мар'я.— Глянь, які месяц прыгожы сягоння.

Месяц толькі што ўзняўся над суседскай хатай і ярка, выразна бліснчэў на небе сваім круглым тварам...

— Бачыш, Ляксандра, вунь быццам чалавек ідзе сагнуўшыся, нясе нешта... Кажуць, гэта Каін Авеля нясе забітага.

— Гэта засень ад гор.

— Ад якіх гор?

— На месяцы горы ёсць. Месяц жа таксама, як і зямля... Там і горы і лагчыны ёсць.

— Ну кажы ты. А чаго ж ён бліскучы?

— Гэта ад сонца. Сонца свеціць на яго, дык ён яго свет і адбівае. Каб на месяц узлезці, дык стуль зямля б гэтаксама выдавала бліскучай кружэлькай...

— Іш ты...

— Ты, Мар'я, у бога верыш?

— А што?

— Ды проста так, пытаюся...

— Веру.

— А баішся яго?

— Бога? Дык бога кожны баіцца.

— А вось я не баюся.

— Дык ты ж чорту душу прадаў... бязбожнік...

— А чаму ён мяне не пакарае?

— Ат! Даволі чмурыць.

— Мар'я! Як ты была маладоїі, ці любіла ты гуляць?

— На тое й маладосць, каб гуляць. Цяпер во не нагуляеш.

— А хочацца?

— А, ну цябе к ліху! Выгадае. Вунь дзеці бягуць, зараз вячэраць будзем.

Па вуліцы, уздымаючы цэлую хмару пылу, беглі дзве дзяўчынкі, а за імі армеец. Усе штось жвава крычалі, рагаталі. Падбеглі, запыхаўшыся. Дзяўчаткі зараз прытулілісяда маткі, а армеец падсеў к Ляксандру. Гэта быў яго таварыш па кватэры — узводны Кірыла Градаў.

— Ух! Каб ты ведаў, братка. Ну і пацеха!

Дзяўчаты не далі яму кончыць — зарагаталі зычным прарэзлівым смехам, аж пакаціліся. Градаў за імі.

— Ціха вы, шалёныя! — сцішала Мар'я.— Чаго вас разабрала?

— Мамулька, ведаеш, дзядзька Змітрок... Ха-ха-ха... Оїі, не магу... Ха-ха-ха...

— Ану вас! Бацьку ці бачылі?

— Ідзе зараз: сходка ўжо кончылася.

— Дык што ў вас там такога смешнага? — запытаў Ляксандра.

— Ух! — урэшце супакоіўся Градаў.— Расказаць — нічога цікаўскага. Во, каб ты набачыў. Стары Змітрок з Рыпінай у скокі пусціўся. Смяхоцце! Узяў яе во гэтак ды...

Градаў паказаў... Дзяўчаты і ён сам зноў пакаціліся са смеху.

У гэты час падышоў гаспадар. Гэта быў маленькі, гарбаты і кудлаты чалавечак. Пад бялясым, таемным светам месяца ён выдаваў нейкім казачным страшыдлам.

— Ляксандра! Ну, скажы ты, які народ! — зацягнуў ён тонкім галаском.— Вот ім каб наваліцца на адпаго ўсім. Сідар, Пётра, Гарасім яшчэ ні разу не ездзілі нікуды і хоць бы што. То тое, то другое. А мне, дык кожную нядзелю. Вот табе й праўда, справядлівасць. Га? Ну, што ты на гэта скажаш?

— Паедзеш? Калі? — запытала Мар'я.

— Заўтра... у горад...

— Ат! Сам вінават... Маўчыш, дык і едуць на табе.

— Якое маўчыш!..

— Ну добра... Пойдзем ужо вячэраць, ды спаць трэба класціся...

Усе пайшлі ў хату. Ляксандра яшчэ на часінку затрымаўся. Ён устаў, пацягнуўся соладка і азірнуўся навакол...

Уся сонная вёска купалася ў зеленаватым малацэ месячнага свету. Усё стаяла нерухома, быццам высечанае з цудоўнага самацветнага каменю. Было зусім ціха, толькі знекуль здалёку даносіліся ледзь чутныя, знікаючыя гукі гармоніка...

Ляксандру зачаравала харастно ночы. Ён адчуваў, як нешта з сярэдзіны ўздымаецца — гэткае добрае, згоднае і разліваецца на ўсёй істоце дзіўным пачуццём.

— Ляксандра! Ідзі вячэраць! — пачуўся мілагучны задорны голас Мар'і.

Думкі Ляксандра зараз пераляцелі да Мар'і. У гэты момант яна здалася яму гэткай добрай, блізкай, роднай... Ды, пэўна, і ўсе людзі ў гэты час здаваліся яму гэткімі!

Ляксандра пайшоў у хату.

2

— Як ты сабе ні хочаш, а ў Мар'і ёсць многа цікавага. Яна неяк выдаецца ад усіх вясковых баб. Нешта ёсць у ёй гэткае... як табе казаць... ну, паэтычнае, ці што: хоць ты ї не любіш гэтага слова.

— Чаму? Паэзія, гэта, ведаеш, добрая рэч. Я сам калісь, як было мне гадоў дванаццаць, быў паэтам, ды яшчэ якім! Бывала гэта — ночы, уздохі, охі, у кожным бабскім стварэнні бачыш нешта таемнае, трагічнае, чыстае... ведаеш, такое чыстае...

— Ану цябе! Кінь жартаваць... У мяне сягоння сур'ёзны настрой, і затым я хачу сур'ёзна гутарыць.

— А... А як гаварыць трэба: паэзіяй ці можна прозаї?

— Як сабе хочаш.

Ляксандра з Кірылам ляжалі на высокім трысцене, укапаўшыся ў свежанакладзенае пахучае сена. Курылі, не зважаючы на небяспеку для гаспадарскага дабра, і гутарылі. Час ад часу ўспыхвалі цыгаркі і кідалі наўкола жаўтавата-чырвоны водблеск. З цемры выяўлялася нізкая страха, бэлька над самымі галовамі хлопцаў і дзівосныя карункі ўзварушанага сена.

Глыбокая ціш, адзінота наладжвалі на сентыментальны настрой. Хацелася гаварыць і гаварыць, выкладаць усе патаемныя думкі.

— Ну, вось слухай,— казаў Ляксандра,— пачнём з выгляду...

— Здобная баба...

— Не перапыняй! І свой цынізм пакуль што пакінь пры сабе. Зірні на твар. Яна не надта прыгожая, аб гэтым і гаварыць не будзем: нос троху кірпаты, шыракаваты рот. Адным словам — тыпічны твар сялянкі-беларускі. А якая рухавасць, якая выразлівасць! Нельга зірнуць, каб не спыніць на ёй свайго погляду. Ты не звяртаў увагі на яе вочы?

— Шэрыя.

— Ну, шэрыя. Але якое жыццё ў гэтых шэрых вачах!.. Як яна грае імі!.. Іншая гарадская дзяўчына магла б пазайздросціць.

— Во, гэта так... Затым я ніколі і не дзіўлюся, што ты да дзяўчат не ходзіш, а ўсё каля яе круцішся...

— Гэта нішто... Я знаю, што там ты за дваіх — за сябе й за мяне справішся.

— Іш ты, куды загнуў. Л праўда — Гануля нішто... а?

— Праўда, праўда. Вось слухай, што было аднаго разу...

— Было гэта раз у нядзелю... увечары... Ягор, здаецца, у горадзе быў ці так некуды сышоў. Ну, ты й дзяўчаты, вядома, на вёсцы. Я ў садзе быў. Цёпла было. Ціха...

— Салавей пеў...

— Не, салаўя не было. Салавеї вясной бывае. Ты, пэўна, гэтага не ведаеш. Салаўя не было, а так нейкая птушка, здаецца, цвіркала. Я сядзеў, ведаеш, там на лаўцы ля пчол. Сяджу, думаю... І так задумаўся, што не прыкмеціў, як нехта падкраўся ззаду і закрыў рукамі мне вочы. Я думаў — ты, ледзь ужо не вылаяўся як мае быць... Гляджу — Мар'я... Глядзіць неяк сумна-ласкава, усміхаецца... Я гэта як узяў яе за рукі... ад вачэй... так і трымаю... І неяк, ведаеш, шкода-шкода стала мне яе... Чаго, і сам не разумею. Неяк усё роўна як дзіцёнка якога пакрыўджанага. Захацелася прытуліць яе, прыгалубіць...

— Эге!..

— Ды кінь ты! Слухай. Яна раптам засаромелася, вырвала рукі, загаварыла аб нечым, не помню... Добра. Селі, гамонім. Доўга мы тады сядзелі. Я ўсё гаварыў аб адным, аб другім і ўсё вярнуў у пэўны бок... Усё, знаеш, аб жыцці, прыгоства, уцехах. Аб тым, як добра жыць, любіць...

— Ого!..

— Во, Кірыла, каб тады ты паслухаў мяне, дык бы ўсур'ёз сказаў, што паэт. Я сам сабе дзівіўся. Адкуль толькі словы браліся! Ну... Гляджу гэта — Мар'я ўсё смутнее,

смутнее. Ну, я, вядома, не думаў, каб гэта так далёка магло зайсці.

— Ну, а што?

— Слухала, слухала, а тады раптам як зараве. Не то што, а як дзіцёнак якраз... Колькі гора, адчаю было ў гэтым плачы! Ну... я не ведаю... мне здаецца, каб каменні пачулі гэты плач, дык бы разжалабіліся.

— Ну, а ты што?

— Ды што я... Я ўжо не мог трымаць. Схапіў яе к сабе, абняў, стаў гладзіць па галаве, як дзіцё, угаварваць. Гаварыў нешта... і сам не помню... Гаварыў, а сам чуць не плакаў. А яна прыціснулася ка мне, быццам туляючыся ад каго, ды ўсё плача, усё плача... што далей, то горай...

Ляксандра змоўк. Павісла напружаная ціш. Дзесь заспяваў певень.

— Ну, а далей што?

— Далей?.. Пацалаваў я яе. Пацалаваў... у лоб, здаецца... Быццам яе апякло. Як закалоціцца ўся, задрыжыць... Вырвалася... уцякла... Не ведаю, мусіць, у хату пабегла... Во... Пасля таго колькі дзён старанілася мяне, саромелася зірнуць у вочы.

— Так,— задуменна гукнуў Градаў,— не, што і гаварыць, жыццё незайздроснае. Чаго толькі яна пайшла за яго, за гэткае страшыдла?

— Чаго? Мусіць, трэба было, па свайёй ахвоце не пайшла б.

— А мо на багацце пагалілася?

— Не падобна да яе.

— Ну, але ж і нелюбоцце са ўсяго свету. А хліпала якое, усё плача, скавыча... Багацей першы на вёсцы, а ўсё мала. Ну, і не люблю ж я яго! У мяне заўсёды настрой на сто градусаў уздымаецца, як яго лішні раз у нарад назначаць або лішні пуд хлеба з яго выцягнуць. А Мар'ю любіць. Ды яшчэ як... проста моліцца на яе. Вядома, гонар... Сам дрэнь такая, а якую жонку мае.

— Што любіць то любіць. А раўнуе як... ух!.. Як ён на мяне злосны! Па вёсцы плёткі ўсялякія ходзяць... што я надта часта з Мар'яй бываю, дык ён аж кіпіць.

— Ну, а як ты думаеш, Ляксандра, як яна да яго?

— Прывыкла, пэўна, дванаццаць гадкоў — гэта, брат, не жартачкі. Ды к таму ж і забабоны ўсякія, бога баіцца. А ён знае гэта і грае на слабых струнках. Наўмысля абставіны гэткія робіць, як у манастыры ў якім. Ты ж бачыш: чуць вечар — лампадку засвеціць, сам на каленкі, яна на

каленкі, дзеці на каленкі... Цэлая адправа царкоўная... І яна гэта шчыра... моліцца, клепчыць... ведаеш, на чулую душу, ды яшчэ ўзгадаваную ў забабонах, усё гэта робіць уплыў...

— Так...

Хлопцы яшчэ доўга гаманілі, але гутарка іхняя памалу траціла сваю жвавасць, пакуль, урэшце, не спынілася зусім. Хлопцы паснулі.

Пракрычалі другія пеўні. Ноч павярнула на сход. Недалёк у садзе, мусіць, чуючы раніцу, заціўкала птушка...

3

Павячэраўшы, Ляксандра ўзяў стары дзядоўскі кажух і пайшоў у сад. Ужо колькі начэй як ён начуе там, пільнуе паспеўшыя яблыкі.

Ляксандра залез у будку, ухінуўся з галавой у кажух і парыхтаваўся заснуць. Але як ён ні стараўся, як ні плюшчыў вочы — заснуць не мог. Як назло, назойлівыя думкі лезлі чарадой у галаву і праціналі вострымі іголкамі лагодна-мяккую пялёнку дрэмы, якая во-во ўжо, здаецца, пачынала спавіваць розум. І Ляксандра зноў і зноў вяртаўся да яснай, цвярозай і нават асабліва напружанай свядомасці.

Урэшце яму надакучыла гэтак змагацца з бяссонніцай. Ён скінуў з сябе кажух, заклаў за галаву рукі і шырока расплюшчанымі вачмі ўпяўся ў чорную, непраглядную цемру.

«Свісь!» — пачулася аднекуль здалёк.

Ляксандра знаў, што Кірыла свішчыць з пуні. Сумна аднаму. А ў будцы спаць не хоча: вельмі падабаецца на сене... Ляксандра ўклаў у рот два пальцы і сцебануў у паветра тонкім, прарэзлівым свістам...

«Свісь!» — пачулася ўжо цішэй, заспакоена...

«Во, чалавек,— падумаў Ляксандра пра Кірылу,— такому і жыць толькі. Здаровы і целам і духам, вечна вясёлы, вечна здаволены; на ўсё глядзіць проста, цвяроза, спляча. Аніякіх сумлеўкаў, аніякіх «балючых пытанняў», якія часамі замучваюць іншых. Усё проста, ясна, зразумела».

Ляксандра параўняў сябе з Кірылам — і толькі ўздыхнуў. Поўная процілежнасць. Нешта мяккае, расхлюпанае, сентыментальнае.

І ў Ляксандры раптам з'явілася нейкая абрыда к само-

му сабе, к сваім вечна турбуючым думкам, к сваім вечна плакучым настроям. А разам з абрыдай і злосць узнялася, гэткая брыдкая, прыкра-зайздросная злосць ка ўсяму на свеце. Успомнілася Мар'я і таксама здалася нялюбай.

«Старая баба, а корчыць нешта. Хоча прывабіць, мужыка ёй мала».

Ад ранейшага пачуцця да яе ў Ляксандры ў гэту часінку і сляда не асталося.

Раптам пачуліся ціхія марудныя крокі...

— Ляксандра, ты спіш? — ціха, асцярожна спытала, быццам баялася, каб не абудзіць.

Мар'я... Абабрала час, нечага сказаць. Якраз пад лад.

— Не яшчэ...

— Сумна мне нешта... Ягор, пэўна, не прыедзе сёння...

— Хіба табе з ім весялей?

Голас Ляксандра зычэў груба і прыкра.

— Ягор, пэўна, у горадзе з папенкамі загуляў. Ёп, відаць, мепш табой цікавіцца, чымся ты ім.

Мар'я маўчала...

— Дый не дзіва; на яго ж ткі і паглядзець люба... Красавец... У яго, брат, кожная баба закахаецца. А як малады быў... за ім, пэўна, дзяўчаты плоймай бегалі... Кожная праглася выйсці замуж за гэткага малайца.

Ляксандра сам не знаў — што і навошта ён гаворыць. У грудзях нешта бушавала, хацелася як бальней уцяць. Чакаў, каб сказала што-колечы насупраць, каб адказала груба, злосна, таксама, як ён.

А Мар'я маўчала. Урэшце прагукала з пакорпаю скаргаю:

— Ляксандра, нашто ты так гаворыш?..

І столькі пакуты, журбы было ў голасе, што Ляксандру сорамна стала.

— Што я раблю? Навошта?

І сам сабе дзівіўся. Вылез з будкі, прайшоўся ўзад і ўперад у цемры. Мар'я сядзела нерухома ля будкі. Здавалася няясным, шэрым клубком.

Ляксандра не знаў, што рабіць: ці падсесці да яе, ці зноў залезці ў будку, ці... Немаведама што... Каб хоць знаць сапраўдны настрой яе! Каб твар убачыць! Цёмна, хоць вочы выкалі...

Ляксандру то здавалася, што Мар'я во-во заплача, як той раз, то здавалася, што смяецца яна ўцішку... Мо з усмешкай цікуе за ім...

Уздыхнула...

— Мар'я!..
— Ну...
— Дык ты кажаш — маркотна табе?
— Ай...

Голас дрыжыць... Цяжка ёй, беднай... Шукае спагады. А ён — толькі абразіў... А за што? Проста настрой дрэнны быў, а яна тут якраз прытрапілася...

— Мар'я!..
— Што?..
— Ты не злуеш на мяне?
— Ды не, Ляксандра, не.

Што тут рабіць?.. Супакоіць, уцешыць яе хочацца... Бедная... Любая...

Але як, з чым падысці? Са словам спагады? Не... гэта не тое. Што словы? На часінку, на дзве мо і заспакояць, загладзяць, а потым...

Любіць... Палюбіць гэтую простую, добрую, смутную, палюбіць пакрыўджаную жыццём... Палюбіць усёй істотай... Растапіць у гарачых прамяннях усю тугу яе, маркоту... Любіць... кахаць...

Ляксандра падышоў да Мар'і, сеў поплеч. Абняў адной рукой, другой узняў пахіленую галаву.

— Мар'ечка, любая, родная! Кіньма тужыць! Не трэба! Будзем жыць! Шчасце, каханне...

Яна баранілася і рвалася, калацілася, бы злоўленая птушка.

— Пусці, Ляксандра! Не руш! Не трэба, грэх гэта... грэх... Пусці! Ягор...

— Няма грэху, любая... Нічога няма... і бога няма... казкі ўсё, байкі... Не бойся, Мар'ечка!.. Нікому не аддам, ні богу, ні чарцям...

І Ляксандра ўсё мацней і мацней туліў яе да сябе, песціў, галубіў, цалаваў мокры ад слёз твар...

. . . . . .

— Нікому не гаварыла, Ляксандрачка, піводзін чалавек не ведае, пану на споведзі не казала. А табе скажу... усё скажу да дробачкі... Родненькі мой, залаценькі! Грэх у мяне ёсць... Цяжкі, страшэнны грэх. Божухна мой! Душыць ён мяне, сэрца сціскае. Усё жыццё, кожную часінку. Няма мне супакою, адхлыну. Ноччу страшна. Непта насоўваецца, хапае, душыць. Здані. Стаіць, як жывы, увачу мой родненькі, гаротны, плача, стогне, скардзіцца, заве, праклінае... Божачка мой міласэрны!

І Мар'я мацней тулілася к Ляксандру, быццам хавалася ад чаго, шукала абароны.

— Слухай, Ляксандра... Усё табе раскажу, усё на парадку...

Як была я дзяўчынай, любіла я хлопца аднаго, Андрэяпябожчыка. Дванаццаць год прайшло, а й цяпер як успомню, дык штось шавальнецца ў сэрцы. Шчыра любіла яго. Бывала, не пабачу дзень, дык і не жыву. Уночы за тры вярсты бегала на спатканне. Добры быў хлопец: дужы, прыгожы... І ён мяне любіў не менш за майго. Так мы з год любіліся. Ладзіліся пажаніцца, марылі аб жыцці, аб шчасці. Але не судзіў бог...

Нешта аднаго разу — якраз гэта на вясенняга Міколу было — гуляла я ў суседкі. Дзяўчаты, хлопцы былі. І Андрэй быў там... Прыбягае браценнік меншы.— Мар'я, гукае, хадзі хутчэй: сваты прыехалі!.. Як пачула я гэта, дык мяне — як нажом разанула. Нават і йсці не хацела, але бацькі пабаялася: дужа сярдзіты быў. Пайшла. Увайшла ў хату, сябе не чуючы, аж тут ён... Ягор... Як убачыла, дык і павалілася. Самлела. Вадой адлівалі. Пасля матка ўгаварвае, бацька пагражае, а я адно: — Не пайду, ды і ўсё. Так з тыдзень змагалася з імі. Але не хапіла сілы, бацька загразіў... Праклянy, кажа, калі не паслухаеш... Бедна жылі мы, сям'я вялікая, зямлі мала, даўгі... ледзь трымалася гаспадарка. Андрэй таксама быў бедны. А Ягор абяцаўся памагчы, даўгі дараваць. Мы ў яго ўсё пазычалі. Ну, добра, думаю, пайду, калі хочаш, толькі не на радасць табе. У першую ж ноч пасля таго, як згадзілася пайсці за Ягора, пабегла к Андрэю. Усё роўна... хоць месяц ды пажыву з любым... Ведаеш, Ляксандра, гай — там, за рэчкай? Ну, дык вось у тым гаі да самага вяселля мы з Андрэем ночкі караталі. Потым Андрэй ужо не жыў тут. Знік некуды і не вярнуўся. Насіліся чуткі, што недзе казакі забілі, проці цара бунтаваў. А тыдні праз тры пасля Пятра і вяселле згулялі... Толькі больш на хаўтуры было падобна.

Пажыла я месяцаў сем з Ягорам, а ў мяне і сын радзіўся...

Ой, Ляксандра, не магу я. Страшна мне. Стаіць ён перада мной, як жывенькі, вочкамі мігае, плача, усё ручкі свае ка мне цягне. Ляксандрачка, любы, ратуй мяне!..

Мар'я, трасучыся, шчыльней гарнулася да Ляксандры, а ён, перапоўнены жалем і пяшчотай, песціў, галубіў яе і ўсё супакойваў.

Навокал срэбна звінела напружаная ціша ночы і быццам з увагай прыслухоўвалася да гэтай страшэннай споведзі...

— Звялі мы яго. Жыцця не было. Піліў ён мяне, катаваў, без нажа рэзаў. Як каршун, упіваўся ў душу сваімі кіпцямі. Кожны дзяпёчак, кожную часінку ён дапякаў мяне. Богам страшыў, пеклам, пакутай. А я, дурная, не падумала аб тым, што ў сто раз цяжэйшы грэх загубіць душу чалавечую, чымся саграшыць з любым! Ачмурэла я неяк... баялася яго... І вось — як цяпер помню...

Перад гэтым мы цалюткую ноч маліліся. Цэлую ночку на каленках прастаялі перад абразамі. Не малітва гэта была для мяне, а нейкая страшэпная варажба. Страшна мне было. На дварэ шумела, гудзела, быццам злаваўся хтосьці. Лампадка цьмяна свяціла перад абразамі. Святыя пазіралі неяк сярдзіта, пагрозна. А збоку ён стаяў... чужы, страшны... Я баялася зірнуць на яго, палохалася кожнага яго руху. Ён мне здаваўся нейкім страшэнным чараўнікам. Стаім мы на каленках. І сілюся я маліцца, а не магу. Не йдуць на вум словы малітвы. Жудасна, страшна. Дзіцё заплача, а я падысці баюся, баюся зірнуць...

А пад ранне не стала сыночка майго, не стала дараженькага. Задушыла я матчынымі рукамі. Божухна мой міласэрны! Толькі пасля я зразумела, што зрабіла. Задавіцца хацела — не даў, не адходзіў ад мяне ні на крок. І ўсё прымушаў маліцца... Прасіць у бога яму царства нябеснага...

Вось з таго часу і дасюль не магу забыцца. Дзеці пайшлі — троху ўцешылася. А ўсё... Удзень нішто: праца, клапоты, уночы бяскопца, здаецца, трызніцца.

Мар'я замоўкла. Гаворка яе супакоіла, і яна ціха сядзела, схіліўшы сваю галаву па Ляксандравы грудзі.

А Ляксандра, абураны яе апавяданнем, аддаўся напружным, бурлівым думкам. Злосць і жудасць разам бушавалі ў яго грудзях. О, спрадвечная цемра людская! Да чаго могуць давесці чалавека дзікія, ачмураючыя душу і сэрца забабоны! Разбурана жыццё, зломан, зніштожан дух чалавека, патаптаны прыгожыя, пышныя кветкі! І калі ўжо прагляне сонца? Калі развее гэтую страшэнную, чорную цемру?..

Пачынала дпець...

4

Восень. Пара адцвітання. Колькі красы, колькі смутнага, ціхага хараства ў тваім чароўна-маўклівым задуменні! Хіба ж не хараство гэтая кволая, празрыстая пазалота, гэты апошні ўрачысты ўбор царыцы-прыроды? Хіба ж не могуць вабіць чалавека твае глыбока-тужлівыя шчырыя подыхі, твой безупынны, горкі плач — жоўты плач адцвітання? Хіба не могуць цягнуць да сябе твае шырока адкрытыя, вольныя абшары, твае ясныя, празрыста-дрыготныя далі, што абуджаюць чалавека нейкімі дзіўнымі парываннямі, акрыляюць, узнімаюць яго змарнелы дух і завуць некуды далёка-далёка, у чароўныя, нязведаныя краіны?

А гэтыя гарэзна-светлыя вясёлыя дзянькі, што часамі з'яўляюцца, як ласкавая ўсмешка на твары старога, і на часіну ажыўляюць тваё панура-сумнае аблічча. Хіба не варты яны тых шчодрых праменняў, якія жменямі раскідае нам маладуха вясна і якіх мы часамі нават не прыкмячаем затым, што іх многа?

І хто можа забараніць шчыра і моцна любіць цябе, жоўта-тужлівая, сумная восень!

Восень жыцця чалавека. Хіба не маеш і ты сваіх, толькі табе ўласцівых прываб? Хіба мала хараства ў гэтым адцвітанні душы, у гэтым сумна-пакорным развітанні з уцехамі, забавамі маладосці? Хіба не прыгожы гэтыя астатнія абуджэнні паволі засынаючага сэрца, гэтыя астатнія гулліва-радасныя выбухі заміраючага жыцця, гэтыя астатнія запозненыя асеннія кветкі?

І хто можа забараніць любіць цябе, чароўна-смутная восень чалавечага жыцця!..

. . . . . .

Ляксандра ўсёй душой аддаўся каханню. Гэта было дзіўнае, незвычайнае каханне. Цудоўна гарманіравала яно з сумна-ласкавымі павевамі восені.

Ляксандра любіў восень. Яна заўсёды навявала на яго нейкія чула-ўзнятыя настроі, напінала да дзіўнай напружнасці і пявучасці струны душы. Ён працінаўся бадзёрасцю, натхненнем, прагнасцю да жыцця, да моцных, ускалыхваючых усю істоту эмоцый...

Ён кахаў Мар'ю. Спачатку зусім звычайнае і простае пачуццё жалю да гэтае смутнае жанчыны потым сфармавалася ў сапраўднае глыбокае каханне. Яго вабілі кволадрыготныя сумныя настроі надыходзячай старасці. Яго за-

хаплялі гэтыя астатпія і затым асабліва яскравыя, палкія праявы жыцця, гэтыя астатнія выбухі згасаючага полымя. Яго цікавіла шчырая і ўпартая работа простага розуму, які з часоў маленства быў апавіты густым туманам забабонаў і цяпер раптам азарыўся нечаканым і асляпляючым святлом. І яму падабалася кідаць у гэты розум іскрачкі свету і потым сачыць, як з гэтых іскрачак выбухае полымя, як яно ахапляе ўсю істоту чалавека і абуджае яе вострымі, палкімі сумлеўкамі...

А Мар'я? Мар'я сама не знала, што з ёю робіцца... Ускалыхнулася даўно забытае, пахаванае, вярнулася маладосць. Заззяла жыццё даўно патрачаным бляскам, усміхнулася агнёва-прамяністай усмешкай. Парваліся ржавыя ланцугі-путы, і сэрца вольнаю птушкай пырхнула ў ружовае царства мар, кахання...

Так часамі ўжо ў познюю восень сонца шчыра прыгрэе засынаючую зямельку, і ажывіцца тая, блісне даўнейшым зззяннем-харaством, зноў апаўецца мінулымі вясёла-гуллівымі строямі...

. . . . . .

Была ўжо глыбокая восень, як рота пакідала вёску. Ужо агаліліся дрэвы, ужо галуза-мароз папрабаваў сваю сілу — скаваў чорную голую зямельку.

На колькі дзён сударгава ажывілася вёска, каб потым раптам зацішэць, замярцвець у сваім звычайным зімовым быцці. Усе армейцы спяшаліся: хто хутчэй і спраўней зладзіцца ў дарогу, хто як найпаўней расквітацца з вясковымі ўцехамі, схапіць усё, што яшчэ можна схапіць. Удзень то туды, то сюды бегалі, споўдаліся, як шалёныя, а ўвечары — астатнія вечарынкі, поўныя адчайнай вясёласці...

Градаў спраўляўся за траіх, калі не болей. Больш за ўсіх бегаў ёп каля вазоў, на якія накладалася армейскае дабро, больш за ўсіх крычаў і загадваў (яму было даручана кіраваць нагрузкай) і затое больш за ўсіх і шчырэй за ўсіх скакаў на вечарынках, ямчэй і, трэба сказаць, з найбольшым поспехам завіхаўся каля дзяўчат. Спраўляўся ён і абабраць часінку, каб паджартаваць над Ляксандрам, над яго западта маркотным настроем. Жартуючы, ёп супакойваў яго:

— Не бядуй, сябра, маладую знойдзем! Былі б мы, а бабы будуць!

Ляксандра на жарты не адказваў. Ён сапраўды дужа

маркоціўся. Ён яшчэ знаходзіўся пад першым свежым уплывам пачуцця. Не хацелася так скора рваць пачатага. І Ляксандра шукаў цяпер кожнай выгадпай часінкі, каб астацца адзін на адзін з Мар'яй, каб найболей набыць з ёй удваіх.

У апошні перад выездам дзень увечары ўсе разышліся. Толькі асталіся ў хаце Ляксандра з Мар'яй.

Святла не палілі. Селі, прытуліўшыся адзін к адпаму, у сваім аблюбаваным куточку ля печы, і ў змрочнай цішы спавалі сумныя думкі.

— Ведаеш што, Ляксандрачка... Здаецца мне, што я сама сябе хаваю. Было добра, шчасна так, аджыла я, уваскрэсла была, а цяпер зноў цемень, зноў гарота. Што я буду рабіць? Дзеці... але што яны! Пройдзе колькі гадкоў — разлятуцца, як птушаняткі з гняздзечка, пакінуць сваю матку адну на беспрасветнае мадзенне. Адну я маю надзею, не ведаю, ці спраўдзіцца яна... Ляксандрачка, даражэнькі... галубок мой... Баюся я й казаць табе пра нештачка. Баюся і неяк саромлюся.

Замоўкла, і доўга сядзелі моўчкі, быццам кожны прыслухоўваўся к думкам другога. Урэшце Ляксандра прамовіў:

— Ну, кажы, любая, кажы ўсё, што ты знаеш, не хавай ад мяпе нічагутка...

— Сорамна мне гэта казаць, проста язык не варушыцца...

І яна схавала на грудзях у Ляксандры свой твар...

— Ляксандра!.. Ці думаў ты калі-небудзь аб тым, што можа быць у канцы? Ну, ведаеш... жывуць людзі, кахаюцца, а потым...

— Што ты гаворыш!

— Ды я яшчэ не знаю, Ляксандрачка... Так проста здаецца... Хто яго ведае... Я хачу, каб гэта было. Гэта цяпер мая ядыная падзея...

— Ды не, Мар'я, гэта ж не жартачкі, гэта ж... Сапраўды, я не думаў аб гэтым. Дык няўжо гэта праўда? Няўжо... ды не, што ты гаворыш...

— Не знаю я, мой даражэнькі. Здаецца мне...

— Мар'ечка, мілая, дык як жа ж. Што ж мы рабіць будзем? Нельга ж так. Ведаеш што, родная. Хутка я звольпюся — у двор можна будзе ехаць. У дварэ ў мяпе гаспадарка, зямля.

— Кінь і гаварыць пра гэта. Хіба я дурная, ці што, каб пайсці на гэта. Не ўжо, Ляксандра, нам не жыць з та-

бой. Ты ж сам падумаі: куды я табе. Мне хутка ўжо ў дамавіну трэба класціся, а ты малады, жыццё перад табою.

— Ды гэта ж немагчыма! Каб ізноў, каб і з гэтым было тое самае...

— Тое самае? Не ўжо, таго не будзе. Я ўжо не тая, другая я... Ты, Ляксандра, адчыніў мне вочы. Дзякую табе за гэта. Век буду помніць цябе, мой даражэнькі, збавіцель мой. Не, ужо не паддамся я, не ачмурыць ён мяне болей... А ведаеш, Ляксандра, не мучыць мяне ўжо цяпер той грэх. Шкода толькі, дужа шкода. Шкода сыночка, жыцця свайго шкода загубленага. І злосць усё расце на яго, на Ягора. Знялюбеў ён мне, яшчэ больш знялюбеў. Не ведаю, ці здалею я жыць далей з ім. Хіба ўцеха будзе, прыйдзе мо той, каго я чакаю. Ляксандрачка, галубок мой, каб ты ведаў толькі, як любіць я яго буду! За дваіх: за таго й за гэтага. Ну, кінь думаць, Ляксандрачка. Не муч сябе дарма. Едзь спакойна... Успомніш калі — добра, а не ўспомніш... Я цябе да астатняга дня буду помніць.

Ляксандра няўважна слухаў яе гаворку. У галаве натоўпам мітусіліся думкі. Недзе глыбока-глыбока ўсярэдзіне нараджалася новае нязведанае пачуццё, новае каханне да кагосьці невядомага, але блізкага.

— Ну, чаго ж ты ўсё думаеш? Кінь, каточак! Ведаеш што... дзе твая скрынка? Я табе на дарогу палажу чаго-колечы. А то прыйдзе Ягор, дзяўчаткі прыбягуць. Заўтра золачкам, казалі, пойдзеце.

І Мар'я запаліла лямпу, дастала з-пад лаўкі скрыню і пачала кахаючымі рукамі парадчыць Ляксандравы рэчы. Ляксандру ўспомнілася, як калісь гэтаксама выпраўляла яго ў дарогу нябожчыца матка. Сумна стала — ледзь не заплакаў...

. . . . . .

Яшчэ цёмненька — па вуліцах вёскі заспоўдаліся армейцы. Запрагалі копі, ускладвалі апошнія рэчы. Насіліся з клункамі, з торбачкамі, шукаючы месца, куды б ускінуць сваё небагатае дабро. Узняўся шум, крык...

Дзіўнай здавалася ў гэткі ранні час абуджаная вёска. Змрок, які яшчэ плаваў па вуліцах, даваў панаваўшай сумятні нейкую таемную афарбоўку. Самыя простыя словы, воклікі здаваліся надзвычайнымі, важнымі і ўрачыстымі... Засвяціўся золак... На ўсходзе неба цьмяна заблішчала халодная чырвань. Пасвятлела, і, ахінутая першым бляскасталёвым позіркам дня, выявілася вёска — уся ў срэбным уборы шэрані.

— Стапавісь! — гулка, раскаціста папяслося ў марозным паветры.

Пачалі строіцца...

— Шагам марш!..

Зладнай калонай пасунуліся на вуліцы. З хат павысыпалі сяляне — у апошні раз зірнуць на «сваіх» чырвонаармейцаў, з якімі за колькі месяцаў супольнага жыцця паспелі зжыцца, што з раднёй..

Градаў, які вёў роту і надта быў здаволены гэтым, ішоў маладзец малайцом. Зграбны, прыгожы... Голас моцны, жалезны...

— Аць... два.... тры!..

Пэўна, не адна пара вачэй з патаемнай журбой і каханнем праводзіла яго выдатную фігуру!

— Запявай!..

Позна ўвечары стаяла ля варот...
Позна ўвечары стаяла ля варот...

— зычна, шырока паняслося ў абшары...

А за ротай ішоў з гуртком нестраявых Ляксандра. Ішоў панура, сагнуўшыся. Маленькі, хударлявы, недалужны. Упяўся вачмі ў зямлю і нічога не прыкмячае. Ідзе і думае якуюсь глыбокую думку. Як праходзілі міма Ягорава-га саду, зірнуў туды, але ўбачыў толькі нерухомыя дрэвы, пасыпаныя шэранню, ды скрывеўшую, ускалмачаную будку. Не прыкмеціў, што за парканам стаяла Мар'я...

Стаяла і глядзела на яго, праводзіла ўпартым, напружаным поглядам, быццам хацела як найміцней захаваць яго вобраз у сваёй душы. І ў гэтым яе поглядзе адбівалася непамерная, адчайная туга, туга чалавека, ад каторага адрываюць усё роднае, блізкае, дарагое.

Прайшлі... Выйшлі з вузкіх вясковых вуліц у шырокі абшар бяскрайнага поля. А Мар'я ўсё стаяла адна сярод апусцелага змярцвелага саду..

Здалёк даносілася ўсё далеючая, замiраючая песня:

...Не паспела сына пятага аддаць,
Як вярнуўся той стралковы полк назад...

Ці вернецца калі, ці не?..

ЯК ГЭТА ЧАСАМ ТРАПЛЯЕЦЦА

I

— Ух! — з палёгкай уздыхнуў Якуб, сеўшы ўжо позна ўвечары за стол вячэраць.

Аксіння, Якубава жонка, пачала поркацца ля печы, дастаючы вячэру. З розных куткоў хаты павылазілі ўжо паспеўшыя троху «прыкархнуць» дзеці і тож паселі, узлёгшыся на стол і соладка пазяхаючы, заплюшчыўшы вочы.

— Ну, і змардаваўся... А каб яго!.. Цялюсенькі дзянёчак во гэтак памыкаеш, дык проста сябе не чуеш... Самая прыпар... хапаешся, хапаешся, а ўсё нясправа... Яшчэ заўтра прыйдзецца на Сяннікаx клін дакашваць...

Жонка падала вячэру. Пачалося маўклівае сёрбанне...

— А кабылу куды — на пожню пусціў? — спытала Аксіння.

— Ага... На начлег ужо не павялі, усе на пожню пусцілі...

— Прымкнуў?..

— А бадай цябе!.. Я й забыўся зусім... Ну, ужо так гэтую ноч паходзіць — цэла будзе... Ісці дужа далёка... Ат, ды хто там на яе дужа папаталіцца! Нічыпар і то сваю заўсёды вераўчаным путам путае...

— Гэта то так... але ўсё ж старожа лепш, як варожа. Нічыпар, дык яму што. Калі і ўкрадуць, бяда невялікая: сягоння ўкралі, а заўтра купіў... А вось ты купі папрабуй, калі ў цябе — што ў старца, дый таго не будзе...

— Ды цэла будзе... Не пайду ўжо... Ногі не йдуць... замарыўся за дзень... І адпачыць некалі будзе... Ды што там такое!.. Якая цяпер поч?.. Хто ў гэткую ноч красці пойдзе?..

— Як сабе хочаш, Якуб, але смялей бы было... Мала што можа прытрапіцца... Цяпер вунь колькі паразвялося іх — гэтых злодзеяў... То там, то сям чуваць — дурэюць... Можа б, як сцягаўся?..

— Адкасніся ты!.. Ідзі сама, калі хочаш... Ліха яе не возьме, не боіся...

— Ды я б і сама схадзіла, дык не ўмею я замыкаць гэтае пута: замок неїкі дужа мудроны. Во Йванька, тої майстра на гэтыя штукі, дык куды яго пасылаць... Ён вунь есць, а сам ужо казлы дзярэ... Схадзі, Якуб, усё роўна ўжо разам адпачнеш тагды...

— Ану цябе!.. Чаго гэта цябе ўзрупіла так?.. Ідзі ды їдзі... Не пайду... Сказаў, значыцца — канец!

Гаспадар ужо узняў троху голас, і затым гаспадыня свої значна зшізіла...

— Як сабе хочаш... Гэта, вядома, тваё дзела... Апо толькі страшна мне нешта, ліха яго ведае... Быццам прадчуванне якое... Калі што, тагды ж мы прапалі зусім...

— Вось ты гавары больш, дык мо й прыгаворыш... Язык у цябе надта жосткі...

Як кончылі вячэраць і гаспадар ужо расперазаў дзягу, ладзячыся легчы, Аксіння яшчэ раз памкнулася ўгаманіць яго, але гаспадар гэтак гукнуў на яе, што яна ўраз сціхла і моўчакам паклалася спаць...

Хутка ўся хата напоўнілася дружным, шчырым сапам. Кожны соп на свой лад: адзін падсвісцваў цененька-ценька й гэтак жаласна, быццам недзе далёка ціўкала самотнае птушанё; другі дзьмухаў з натугай і злосна, як кавалёвы мех, а сам гаспадар хрышеў басам і з падхопам: пачынаў ціханька, асцярожна, быццам намацваючы, потым усё мацней і мацней і, калі ўжо яго сап пакрываў усе хатнія зыкі, раптам, падсярбнуўшы ў апошні раз, сціхаў, каб пасля кароценькага перапыну пачынаць спачатку.

II

Назаўтрага залачком Якуб, узяўшы патрэбнае начыне, пайшоў касіць, а за адным заходам звярнуў зірнуць на кабылу.

На пожні то там, то сям чувалася моцнае цмяканне. Раніцаї коні, як відаць, з асаблівай шчырасцю завінуліся каля травы і смагла, паспешна выгрызалі тое, што ўчора не зачапіла вострая каса. Часамі яны спынялі сваю працу, каб пырснуць здаволена, з смакам — і зноў пачыналі...

Яшчэ ранішні туман ахінаў пожню, і коні хаваліся ў ім так, што цмяканне іхняе было чуваць, а самых іх не відна было... І Якубу прыходзілася падыходзіць к самаму каню, каб пазнаць, ці яго гэта кабыла, ці не...

Ён ужо хацеў быў зусім кінуць шукаць, бо дзе ж знайсці ў гэткім тумане ды сярод гэткага стада... Але ўсё не-

шта роіліся ў галаве жончыны словы перасцярогі і брала неўкая невыразная апаска... Колькі разоў ні памыкаўся ён ісці, усё нешта цягнула яго назад — і ён ізноў шукаў...

Чым далей, тым усё больш і больш развяваўся туман, выяўляючы з-пад сябе пожню. Усё далей і далей можна было разглядзець ваколіцы... Урэшце ўзнялося чырвонае сонца і адразу насунулася ўгару па цьмянаму небасхілу... Хутка яно заблішчэла сваім звычайным зззяннем і няшчотна прыгрэла зямельку. Туман знік, і пачаўся дзень...

Якуб усё шукаў сваёй кабылы. Цяпер ужо — куды ні зірні — відаць было, аж дакуль дасягне вока. Якуб ужо бачыў усіх коней, якія пасвіліся на пожні, але як ён ні прыглядаўся, сваёй кабылы між іх не знаходзіў. Яго ахапіла ўжо сапраўдная трывога. А разам у грудзёх забушавала злосць на жонку...

— Прыгаварыла, каб ёй язык адсох! Во гэтыя бабы... Жыцця ад іх няма...

Аднак Якуб усё яшчэ не адчайваўся. Хаця ён і гаварыў сабе ў думках:

— Ну, вядома, укралі, што тут і глядзець яшчэ... Ах, каб цябе!.. Што ж цяпер? Прапала ўсё, хоць не жыві...

Але гаварыў ён гэта сабе больш дзеля таго, што спадзяваўся на адваротнае, бо ён знаў, што калі гаворыш адно, дык тагды напэўна выйдзе другое... А сам усё пільней і пільней углядаўся ўдалеч і ўсё чакаў, што во-во дзе пакажацца яго кабылка...

Ён прайшоў у адзін бок, дзе была яшчэ пяскошаная пожня, дайшоў аж да берага рэчкі, а кабылы ўсё няма... Вярнуўся назад, к коням, накіраваўся ў другі бок, але не пайшоў, бо... знайшоў пута...

Убачыўшы пута, Якуб падабраў яго толькі затым, што быў спраўным гаспадаром і знаў, што гэткая рэч у гаспадарцы заўсёды прыдасца. Але падабраўшы яго, ён адразу пераканаўся, што пута гэтае яго, уласнае, з яго ўласнае кабылы.

Пута было цалюткае... Кабыла магла толькі парваць яго, бо завязваў Якуб па-свойску, так, што іншы чалавек развязаць не зразу патраціць... Значыць...

— Укралі!!!

Якуб выпусціў з рук пута, і яно, гадзюкай шавяльнуўшыся, звалілася на зямлю... Пахіліў галаву. Ён чуў, што цяперака ўсё... пагібель, канец. Надзея недзе мігнула глыбока ўсярэдзіне, але зараз жа знікла... Няўжо цяпер не знайсці... Усё... канец... няма ратунку...

Якуб уявіў сабе будучае жыццё... Як будзе з голаду гінуць ён сам і яго сям'я... Усе яго дробныя дзетухны...

Але як успомніў ён жонку, яго настрой змяніўся. З адчаю ён перакінуўся на злосць, непамерную, лютую злосць...

— Прыгаварыла!.. Прыгаварыла!..

І, пасылаючы ёй у думках самыя жорсткія праклёны, ён шпарка пасягаў у двор. Што яму там трэба, зачым ён бяжыць туды, Якуб накуль што і сам не ведаў... Але быццам штось штурхала яго туды...

Аксіння тапіла печку. Яна дужа здзівілася, як убачыла мужыка, і ніяк не магла згадаць, чаго ён прыйшоў гэтак рана. Але як убачыла яго твар, пакрыўлены ад злосці... хто яе ведае: ці зразумела, ці проста спалохалася, але раптам загаварыла гэтак ласкава, быццам угаварваючы:

— Якуб! Ну, што ты, што... га?.. Кажы, Якубачка!..

Але Якуб нічога не сказаў. Не мог гаварыць ад злосці... Толькі як схапіў Аксінню і пачаў яе лупсаваць як і чым трапіла, тагды развязаўся язык, і палілося мора лаянкі, гвалту...

— Прыгаварыла... а! Прыгаварыла, каб цябе ў магілу прыгаварылі!.. Пусціла мяне па свету!..

А Аксіння не баранілася. Яна ўжо знала, што здарылася, і ёй цяпер было ўсё роўна — ці заб'ець яе Якуб, ці не... І яна толькі ціханька стагнала...

А Якуба яшчэ больш абурала яе маўчанка. У галаве ў яго памуцілася. Захліпваючыся, скрыгаючы зубамі, ён бязлітасна катаваў сваю жонку... Спаганяў на ёй сваю злосць...

. . . . . .

Праз тыдзень Аксінню хавалі...

ПОЧЧУ

I

Весела ў млыне...

— Тах-тах-тах-тах...— выразна лапеча латак...

— Ж-ж-ж-ж...— працавіта ўторацъ яму жорны...

Сцены дрыжацъ. У іх глухім ледзь чутным дрыжэнні чуецца змаганне з магутнай сілай...

Усе зыкі тонуць у няўпынным шуме вады на коле. Нейкай адвечнай, бесканцовай і даўно знаёмай песняй выдае гэты шум. І ўрачыстае жыццё і глыбокі спакой чуецца ў гэтай песні. Пад яе лад душа чалавека то абураецца бадзёрым рухам жыцця, то засцілаецца салодка-аксамітавай пялёнкай смутку і пачынае плаўка калыхацца ў зялёным моры ўспамінаў... І шум вады тагды смела ўваходзіць у нутро чалавека, пранікае ў самыя патаемныя куткі і зліваецца з песняй душы ў ядыную дзіўную гармонію. Потым ураз вылятае, спуджаны прачнуўшымся розумам, і зноў гудзіць здалёк, зноў завецъ да бурлівага жыцця.

. . . . . .

Ледзь дачакаўся Мікіта сваіго чароду. Ён ужо блізка што дзесяты раз прыязджае на млын пасля таго, як яшчэ тыдзень таму назад прывёз сюды тры апошніх мяшкі збожжа. І немаведама адкуль панабралася столькі завозу. Пакуль змелеш, дык папакутуеш так, што век будзеш помніць... Але, дзякуй богу, дачакаўся... Ужо з паўгадзіны, як Мікітава збожжа сыпецца з каша на жорны і адтуль белай, мяккай мукой злятае ўніз, якраз у рукі гаспадару... А той спрытна, з асобым гаспадарскім смакам заграбае яе ў чарпак і беражліва ўсыпае ў мех.

Ну й меле!.. Недарма даў прудніку паўфунта табакі... Яно можна б было і чвэрткай абысціся, але — пяхай сабе: апошняе мліва, дык шкадаваць не варта. Затое жа і пусціў дык у самы раз. Мука — што пух, аж люба заграбаць яе... Але й млын наладзіўся, дыій вады, мусіць, досыць: сыпець так, што ледзь справішся адграбаць.

Мікіту неяк аж шкода было, што шыбка мелецца... Хацелася, каб як даўжэй цягпулася мліва; здавалася, што ад гэтага прыбавіцца белай, пухавай мучыцы...

Трэба было толькі зірнуць у гэты час на Мікіту, на яго шчырую працу, на міну, з якой ён усыпаў у мех муку, каб адразу згадаць, што дзеецца ў яго сярэдзіпе.

А там было свята цэлае. У гэты час Мікіта забыўся аба ўсім чыста на свеце і ўвесь аддаўся пачуццю поўнага здаволення... Дый як жа ж! Сколькі працы трэба было яму палажыць, сколькі гора, трывог перажыць, каб убачыць перад сабой гэтую беленькую мучыцу, гэты пачатак і канец усяго ў жыцці селяніна!.. Дык і не дзіва, што ён глядзеў на яе, як на сваё роднае дзіцё, і з асаблівай уцехай песціў яе сваімі рукамі, загадзя разважаючы, як ён прывязець яе ў двор, паставіць у запеччы і будзе спакойна чакаць вясны.

Сёлета Мікіту пашанцавала. Урадзіла зусім добра, і хаця зямлі ў яго лічылася ўсяго дзесяцін са тры дый няўдоб'я парадкам, а ўсё ж як-ніяк, а коп 40 жыта нажаў, ды ярыны блізка каля гэтага... Праўда, прыйшлося троху адсыпаць у казну, але што ж зробіш: і гэта трэба... Ды ўсё роўна хапіла пуню паставіць, справіць тое-сёе, а цяпер змеле, то да новага й на спажытак хопіць...

Перад вачмі Мікіты паплылі прыгожыя, светлыя малюнкі будучага. Ён ужо, як наяву, бачыў сябе заможным гаспадаром, з добра наладжанай гаспадаркай, з поўным свірнам, з цэлым стадам жывёлы...

Марылася яму нешта й зусім салодкае, аб чым ёп неяк не то саромеўся, не то баяўся мысліць: гэта тое, што можа праз колькі месяцаў дасць яму яго маладая, ненаглядная Арынка...

Па Мікітаваму твару сама сабой пацягнулася даволь-пая ўсмешка...

— Памажы божа!..

Мікіта, здрыгануўшыся, абярпуўся... А бадай ты згарэў!.. Каго толькі не жадаў пабачыць Мікіта ў гэтую часінку, дык гэта Ягора Даўгога... А ёп, як здань якая, стаяў ужо ззаду і ўсміхаўся пейкай дурной і разам хітрай усмешкай. Ой, гэта яго ўсмешка!.. І брыдка і жудаспа ад яе робіцпа. Вочы сабачыя бегаюць па баках, што мышкі, быццам баяцца сустракацца з чужым поглядам. А вуспы неяк хваравіта скрыўлены і быццам гавораць з зларадствам:

— Усё знаю, мой міленькі, усё... Усе думкі твае бачу...

Сам даўгі, сутулаваты, галава маленькая... На галаве шапка зухавата закіпута на патыліцу, полы кароткага кажушка расхіпуты... Стаіць: рукі ў кішэні, ногі расставіўшы. Увесь выгляд даець уражанне чалавека, здольнага на ўсё...

Мікіта заўсёды баяўся Ягора і, як толькі мог, стараўся з ім не спатыкацца. Дыій не толькі Мікіта, а блізка што ўсе добрыя людзі не надта любілі з ім дзела мець. Пра яго хадзілі ўсялякія чуткі. Казалі, што ён не спыніцца нават перад тым, каб чалавека загубіць. А што ўкрасці ці ашукаць каго сярод белага дня, дык пра гэта й гаварыць не прыходзіцца... І ніякім парадкам не можна было аслабаніцца ад яго. Яго й забіралі ўжо колькі разоў, і судзілі, і ў вастрог садзілі,— усё роўна выкруціцца і праз месяц-другі вернецца ў двор. У жаўнеры былі ўзялі — і адтуль вырабіўся...

Прысутнасць Ягора нейкім цяжарам лягла на Мікіту. Увесь яго добры настрой ураз разляцеўся, змяніўшыся прыкрай нялоўкасцю.

Ягор падышоў, пашчупаў муку...

— Мякка... Адно жыта?..

— Адно... Тры мяшэчкі наскроб... думаю да повага абысціся...

Вусны міжвольна злажыліся ў нейкую дурную, ліслівую ўсмешку... аж самому брыдка стала...

— Падатак здаў?

— А толькі надоечы авёс адвёз... бульба яшчэ асталася...

— Бяруць?..

— Бярvць...

Ягор пачаў закурваць. Нялоўкасць павялічвалася. Толькі шум вады мякчыў яе троху, запаўняючы пустату...

— Кажуць, Мікіта, ты пачаў разжыватца патроху? А?..

— Якое там!.. Перабіваюся як-колечы...

— Пуня пудоў у дваццаць увайшла?..

— Блізка...

— Добры будынак... учора бачыў праязджаючы...

Мікіту як бы хто скрабануў за сэрца... Ужо... Ужо людзі пачалі заіздросціць... Пачалі ўжо лічыць ягонае дабро... І Ягор пават зацікавіўся. Ой гэта цікавасць да дабра не давядзець!..

Тым часам Ягор сказаў яшчэ колькі слоў, накруціўся каля Мікіты і, усміхаючыся сваёй звычайнай усмешкай, узняўся на другі паверх...

Мікіта зноў застаўся адзін. Адразу ён пачуў вялікае палягчэнне, як бы яго аслабанілі ад цяжкай носкі. Жэсты яго зноў атрымалі сваю даўнейшую спрытнасць і акругласць, а ў галаве зноў паволі заварушыліся думкі аб будучыні. Але думкі гэтыя не былі ўжо такімі згоднымі і вальготнымі, як раней. Ад сустрэчы з Ягорам засталося на душы нешта смутнае, прыкрае... Нейкая няясная трывога, страх невядома чаго... Гутарка з гэтым чалавекам кранула новыя струны ў душы. Мікіта сцяміў, што людзі пачынаюць з зайздрасцю пазіраць на яго жыццё, і думка аб гэтым псавала ўсё харастве малюнкаў будучага, дадавала к ім шмат чорнага колеру. Толькі створыць ён у сваім ваабражэнні лагодны абраз, як адкульсьці з глыбіні з болем высачыцца кропля гаркаты і разбавіць салодкасць прыгожых мар... А тут раптам пракоціцца й зусім выразная хваля трывогі, звязаная з таёмнай асобай Ягора, і дапаследку папсуець настрой, навек ахвоту адаб'ець мысліць...

II

Як адмалоў Мікіта, было за поўнач. Ён завязаў мяшкі, падвёў к дзвярам сваю кабылку і ўзняўся на гару, каб гукнуць каго памагчы мяшкі ўскласці.

Навярху было таксама, як унізу — прыцемна. Гарэла капцілка. Свет ад яе, хмурны і брудны, дрыжэў смутнымі плямамі на бліжэйшых рэчах, зліваючыся далей у густую цемру. Гэты дрыжачы свет, дрыжэнне самога млына і няўпыннае лапатанне латака — усё гэта злучалася ў адну згодную гармонію.

Каля жорнаў згуртавалася колькі мужчын. Пасярод стары пруднік з пішкай у зубах сядзеў на мяшку. Ён упёрся вачыма ў зямлю і зважна слухаў гаворку, зрэдку ківаючы кудлатай галавой. Апавядаў штось Ягор, а ўсе слухалі і час ад часу рагаталі ўгодлівым смехам...

Мікіта звярнуўся да мужчын:

— Браткі, адвярніцеся хто на часінку памагчы мяшкі ўскінуць!..

Адазваўся Ягор:

— Ужо едзеш? Ладна, пойдзем... Там і мой мяшок возьмеш... усё роўна міма ехаць...

Не ўпадабаўся Мікіту гэткі зварот дзела. Не хацелася яму дапамогі Ягоравай. Але нічога не зробіш: не адмаўляцца ж...

Сышлі ўніз, усклалі мяшкі на санкі. Мікіта перавязаў воз вяроўкай, сам сеў наверх і ўзяў лейцы...

Шчыра рванула застоіўшаяся кабылка, палазы зарыпелі і пасунуліся па гладкай зімовай дарозе... Ягор, хістаючыся на хаду ўзад і ўперад сваёй нязграбнай фігурай, пайшоў адзаду.

Пакуль ехалі местам, Мікіта нават і не прыкмячаў, што пагода змянілася. Праўда, снег сыпаўся з неба, і досыць часты, а часамі з-за вугла і вецер дзьмухаў сярдзіта, але самае пекла пачалося толькі тады, як праехалі рагатку і апынуліся ў белым, бяскрайнім полі. Тагды толькі Мікіта ўзняў каўнер у сваім кажушку і глыбей насунуў шапку, бо сівер, не шкадуючы, пачаў сцебацца проста ў твар цэлымі жменямі жорсткага, халоднага снегу.

Усё навокал заслалася снегавым туманам, і як ні стараўся Мікіта разглядзець дарогу, далей дугі нічога не бачыў: толькі балюча рэзала вочы злая завіруха... Напаследак ён папусціў лейцы, павярнуўся бокам да сустрэчнага ветру і сеў нерухома, злажыўшы рукі і сагнуўшыся ў крук. Кабылка, адгадваючы дарогу, паўзла ціхім марудным крокам... А адзаду Ягор, таксама сагнуўшыся і сашчапіўшы рукі, тапіўся ў снягу і то даганяў, то блізка што зусім хаваўся ў шэрай імгле...

У Мікіты цяпер было пачуццё, што ў малога дзіцяці, каторае, туляючыся да чаго-небудзь, заб'ецца галавой у падушку... Пачуццё асобнасці ад усяго надворнага, ад усяго, што дзеецца навокал, моцнае ўглыбенне ў самога сябе, нейкае здаволенне і прыемная свядомасць свайго існавання. Мікіта як перастаў кіраваць, як звінуўся ў камок і аддаў сябе на ўладу завірухі, дык адразу і пачуў, што холад, імгла і шум ветру, папаваўшыя вакол, неяк абхінулі яго і захавалі ад усяго-ўсяго, што ёсць на свеце. У душы стварылася становішча ледзь падобнае да сну, нават думкі абвалакліся лёгкай пялёнкай туману... Толькі, як успамінаў пра Ягора, вяртаўся да яву. Непрыемна было чуваць яго прысутнасць адзаду, а найгорш — нялоўка было, што не пазваў сесці, шкадуючы кабылку. Мо разлаваўся?.. Але ж і сапраўды цяжка! Чатыры мяшкі, сам, ды яшчэ бездарожжа такое...

Уехалі ў лес... Яшчэ вярсты дзве лесам, дый хутар Ягораў, а там недалёчка й Крыніцы, Мікітава вёска...

Лесам было зацішней і дарога лепшая. Кабыла прыбавіла шагу, турбуючыся да цёплага хлеву. Разам і Мікіту захацелася як барзджэй дабрацца дахаты... Азалеў увесь,

дый спалох нейкі апанаваў: Ягора страшна... Яшчэ як толькі выехалі, заварушылася апаска. Сталі ўспамінацца розныя апавяданні пра Ягоравы чыннасці, пра яго смеласць і рашымасць, пра тое, як ён блізка што сярод белага дня рабаваў і губіў людзей, пра тое, як ён з спрытнасцю д'ябла выкручваўся з самых крытычных становішч. І мозг прарэзвала вострая трывожная думка, што Ягор замысліў што-небудзь і дзеля гэтага толькі прылучыўся да яго...

Пакуль ехалі полем, гэтая думка разбаўлялася ў агульным пачуцці Мікіты, пакрывалася агульным уражаннем завірухі. Цяпер жа, разам з тым як ціпа і жудасць ледзь абудзілі яго і вярпулі да звычайнага душэўнага становішча, гэта думка раптам узмацнела да таго, што ўсяго Мікіту агарнула страхам. Страх гэты ўсё рос і пашыраўся і напаследак дасягнуў таго, што Мікіта не мог нават абярнуцца назад... Яму ўсё здавалася, што Ягор насцігае яго, што ён ужо нарыхтаваўся, каб ударыць. Па спіне прыкрай хваляй перабягаюць мурашкі, а неслухмяныя зубы пачыналі дробна тарабаніць. Душу ахапляла моцнае, пякучае жаданне хутчэй выбрацца з гэтага страшэннага лесу. А пагнаць кабылу не важыўся, баючыся, каб не выявіць перад Ягорам свайго страху...

А ў гэты час дзесь угары па густых макушках хвой бегаў шалёны вецер і, як п'яны мужык сваю жонку, бязлітасна тармашыў, тузаў і рваў пышныя галіны. Макушкі стагналі і ўздыхалі. Цяжкая пакута, глыбокая скарга чувалася ў іх голасе. І здавалася, што ўгары дзеецца штось таёмнае, вялікае і страшэннае, да чаго з ціхай урачыстай увагай прыслухоўваюцца задумённыя камлі дрэў...

Як выехалі з лесу, Ягор дагнаў Мікіту...

— Паганяй ты! — гукнуў над самым вухам...

Голас яго, знецікі спалохаўшы Мікіту, потым супакоіў яго.

Мікіта адразу чагось пачуў, што небяспека мінулася, і ён адказаў Ягору з павялічанай вясёласцю:

— Паспеем!.. Недалечка ўжо...

І, памаўчаўшы, дадаў, перамагаючы вецер:

— Ну, і пагодка, няхай бы яна згарэла!..

Хутка цёмнай плямай паказаўся направа ад дарогі Ягораў хутар. Мікіту неспакой узяў... Хутчэй бы ўжо скінуць гэты пяшчасны Ягораў мех, мінуць хутар... Там ужо з спакойным сэрцам спаквалю дабраўся б як і дахаты. От толькі б пазбыцца гэтай прыкрай, цяжкай прысутнасці за плячыма страшнога чалавека!..

Чым бліжэй пад'язджалі, тым нецярплівей шморгаў Мікіта лейцамі... Яшчэ колькі часінак — і ўсё будзе добра, усё страшное застанецца адзаду, быццам і не было яго...

Пад'ехалі... Ягор пайшоў адчыніць бакоўку, а Мікіта ўзяўся за мех... Павярнуў, прыладзіў і стаў чакаць Ягора. А той нешта забавіўся: пэўна, у хату зайшоўся. Мікіту ўраз прадставілася свая хата разам з жонкай Арынай, смачнай вячэрай і цёплай пасцеллю. Эх, хутчэй бы даехаць!.. Ад нецярпення аж нагамі затупаў...

Як ужо добра надакучыла Мікіту чакаць, бакоўка ляпнула, і паказалася фігура Ягора.

— Чаго марудзіў? — гукнуў Мікіта.

Ягор не адказаў... Мо за ветрам не пачуў...

— Мусіць, у хату заходзіў?..

Зноў не адказаў... Цяпер ужо напэўна пачуў: блізка... Сунецца моўчкі — роўна, паволі, як таёмная здань...

І тут раптам спалох, востры страшэнны спалох, не той прыкры і цягучы, што быў у лесе, а балючы, агнявы страх смерці — блізкай, немінучай, працяў Мікіту. Ён пачуў, што ў асобе Ягора на яго насоўваецца сама смерць — страшная, няшчадная. З кожным крокам Ягора быццам нейкая сіла прыціскала яго да зямлі, адбірала астатнія сілы. Хацеў крыкнуць — не здолеў: бы язык адняло... Дрыжучы, трымаўся за воз і чакаў...

А Ягор ішоў... Роўна, спакойна, як ідзець час... Падышоў і ўзняў руку...

Суха і каротка ляснуў пісталет... Вецер падхапіў зык і разам з смяротным гвалтам чалавека захінуў у шэры снегавы абрус і аднёс некуды далёка ў неба...

III

Не спалася ў гэтую ноч Арыне... Толькі звечара заснула трохі, а потым разбудзіла шалёная завіруха... Гудзіць каля вуглоў, стукае ў дзверы, нібы дабіваючыся ў хату, нецярпліва бразгае акопнымі шыбамі. Быццам нячыстая сіла акружыла хату і круціцца вакол, шукае шчэлак, каб пралезці ўсярэдзіну... І плача і стогне ад злосці...

Арына моцна ўкрылася, прытулілася к сцяне, бы малое дзіцё к матчыным грудзям, і моўчкі слухае... Слухае зыкі шалёнай завірухі. І здаецца, чуець яна нейчыя ўрачыстыя, набедныя спевы, нейчыя стогны і скаргі, нейкі д'ябальскі смех... Часамі выяўна заплача дзіцё пад акном, заплача і сціхне, згінуўшы ў пякельнай чарноце ночы...

Часамі чалавечы гомап вылучыцца з мора зыкаў, полаз заскрыпіць, конь засапець... І здасца Арыпе, што прыехаў яе Мікіта... Заб'ецца радасцю сэрца, адразу пачуецца бліасць любага. Адляціць страх, а разам з ім адсунуцца кудысь удаль зыкі нягоды, згубяць сваю жыццёвасць і яскравасць... Узварухнецца Арына, уздымецца на ложку і прыслухваецца к пачы, шукаючы яшчэ знаёмых, жаданых зыкаў, каб пайсці адчыніць свайму гаспадару...

Дарма!.. Толькі плача і смяецца ночная цемра... Абраз Мікіты адлятае кудысь далёка і смутнее, акружаны снегавой хмарай... А завіруха зноў падыходзіць, зноў завінаецца каля вуглоў, зноў ахапляе і напаўняе сэрца страхам і жудасцю. Арына кутаецца ў коўдру і прыціскаецца к сцяне ўсім сваім дрыжачым целам...

К ранню заснула Арына. Дый то не сон быў, а так нейкае забыццё. І ў сне Арына перажывала ўсё тое, што й наяву. Таксама гудзела нягода, толькі трымала яна нейкія выразныя формы, звінаючыся ў страшэнную здань, якая насоўвалася і пагражала... Спалох і жудасць прыкрай хваляй перабягалі па целу... А Мікіта кожную часінку пад'язджаў к двару. Пад'едзе — і зноў нейкай сілай аднясецца далёка назад... Зноў пад'едзе — і зноў аднясецца. І хочацца Арыне затрымаць яго, імкнецца яна да яго, а страшэнная здань стаіць на дарозе, расставіўшы рукі, і смяецца... Строіць страшэнную міну...

Як прачнулася Арына, па хаце ўжо расплыўся бледны свет рання. На дварэ сціхла. Пасля ночнага шуму гэтая ціш здавалася нават незвычайнай, вялікшай, чымся заўсёды. Быццам адпачывае ўсё — чыста ад шалёных ночных скокаў...

Дзянны свет адразу адагнаў ад Арыны ўсе ночныя мары і вярнуў яе да звычайнага гаспадарскага настрою. Апрануўшыся, яна зараз жа пачала затапліваць печку, спяшаючыся, каб барзджэй скончыць і пайсці на змену Мікіту.

Сягоння ізноў не змалоў... Божухпа-бацюхна! Што гэта за парадкі! Цэлы тыдзень бегае, як сабака. Чакае-чакае... Учора, ад'язджаючы, казаў, што ўжо канешпе змеле, аж вось як змалоў... Але хутчэй трэба спраўляцца: можа, яму й адвярнуцца пельга, каб паснедаць...

Арына вытапіла печку, дала скаціне і, апрануўшы старэнькі кажушок, пабегла па млын.

. . . . . .

Мікітаву кабылку знайшлі па той бок места... Хвёдар Куксянок ішоў з вакзала пасля дзяжурства і ўбачыў яе ў баку ад дарогі ў хмызняку. Паглядзеў спачатку навокал, ці не відна гаспадара, гукнуў разы са два, а потым сеў ды паехаў... Падумаў, што збегла з млыну, а як з Мікітам жыў добра, то ї рашыў адвесці яе яму...

На млыне не было ўжо нікога. Вада сышла, і сяляне разышліся па дварах.

— Ага!.. Пайшоў, значыцца, дамоў: думае — дадому ўцякла,— сказаў сам сабе Хвёдар і ўвайшоў у маленькую прудзікаву хатку, што стаяла поплеч з млыном...

Прудзік сядзеў на лаве й плёў лапаць. Каля печы бразгала качэргамі яго старая жонка. Апрача іх у хаце сядзеў яшчэ нейкі незнаёмы мужчына і пыхкаў піпкаї. У хаце было цёмна і дымна...

Хвёдар увайшоў, прывітаўся і стаў закурваць...

— Што гэта,— адазваўся да яго прудзік: — У паняздзелак змалоў, а сёння зноў прыехаў?.. Хаця б млыну пашкадаваў...

— Хіба толькі з млівам сюды заязджацца можна?.. А мо я ў госці к табе прыехаў...

— У госці... хм...

— Мікіта змалоў ці не?

— Які Мікіта?..

— Што ты, Мікіты нашага не знаеш? Міхальчонак...

— А... Змалоў... Яшчэ ўчора звечару... А што?

— Ды вось кабылу ягоную знайшоў на дарозе... Збегла, мусіць... Аж там за местам у хмызняку па снягу блуталася...

Прудзік узняў галаву...

— З возам?..

— Ды не, парожняя...

— Парожняя? Дык як жа ж гэта?

— А што?

— Хіба з двара ўцякла, бо адсюль ён з возам паехаў... Як змалоў, дык і забраўся адразу...

— Вось дык Мікіта!.. Пэўна, з Арынаї сваёї доўга вітаўся, што кабылу з двара пусціў...

І Хвёдар весела зарагатаў...

Закурыў яшчэ раз ды і ўзяўся за шапку...

— Э, пачакай,— нібы ўспомніўшы штось, затрымаў яго прудзік.— Ён жа ж, ведаеш, з гэтым забойцам паехаў, з Ягорам Даўгім... Каб не здарылася з ім чаго часам?..

Прудзік павёў па ўсіх сваім поглядам, у якім чытала-

ся: — Ага, гэтага вы не падумалі! — і спыніўся на незнаёмым мужчыне... Тоі пачуў патрэбнасць адказаць і гукнуў няшчырым тонам:

— Так... Ад гэтага ўсяго можна дачакацца...

— Ну, ладна... Адно з двух: або Ягор забіў, або... жонка пацалавала... Бывайце здаровы!..

І Хвёдар паішоў з хаты. А за ім прудніК:

— Хутчэй жа едзь, ды калі што — збіраї народ ды проста да яго... па свежаму следу...

— Добра, добра! — крыкнуў Хвёдар, ускочыў у санкі і паехаў.

Хаця ён і не паказваў віду, але сам надта ўстурбаваўся, бо добра знаў Мікіту і знаў, што ён не кіне каня абы-як. Пэўна, сапраўды здарылася што... І Хвёдар шыбчэй пагнаў кабылу... Толькі выехаў ён за места, як спаткаў Арыну, Мікітаву жонку.

. . . . . .

Арына адразу пазнала сваю кабылу і міжвольна прыбавіла шагу... Ахапіла радасць і жаданне хутчэйшаї сустрэчы... Але як прыкмеціла, што ўпоражні едзе Мікіта, крыху пасмутнела, а як убачыла, што гэта зусім не Мікіта, нават спынілася, задзіўленая і спалоханая... У прадчуванні чагось нядобрага сэрца закалацілася ў грудзёх, як злоўленая птушка...

Стрэліся...

— Мікіта ў дварэ? — яшчэ здалёку запытаўся Хвёдар.

— Не,— адказала Арына... А ў самоі аж дыхаць заняло...

— Ну дык сядай хутчэй, ды паедзем да вёскі: пешта благое здарылася...

Востры, агнявы жаль сціснуў Арыніны грудзі. Неяк разам міганула перад вачыма ўсё добрае, прыгожае, што было ў жыцці... Міганула і здалося навекі згубленым... Пуста стала ўсярэдзіне...

Села на санкі, нічога не разумеючы і, як малое дзіцё, слухаючы Хвёдара... Махінальна ўхапілася рукамі за розвалі, як ірванула пад Хвёдаравай пугай кабыла, і сядзела, бы непрытомная, упёршыся вачыма ў белую даль... Так і ехала да самаї вёскі і толькі, як убачыла жоўтыя вакеніцы свае хаткі — пачула, як пясмела, быццам пужаючыся, стала ўздымацца з самага дна душы ружовая хмурыначка надзеі...

Невыразная, неасазнаная, без аніякіх формаў — яна радзілася ў сэрцы, каб хаця трохі падтрымаць агопьчык

жыцця, каб хоць трохі працягпуць яго абарваную нітку...

І Арына ахамянулася... Свядомасць вярнулася да яе, а разам з ёй — маланкай асвяцілася ўсё, што толькі што здарылася, і яе сярпом разанула па сэрцу страшэннай праўдай... Загаласіла баба на ўсю вёску...

IV

Не лёгка ўдалося Хвёдару ўзварушыць сялян. Ён і прасіў, і маліў, і лаяўся, і пагражаў — нічога не памагала... Вядома, нікому не хацелася залазіць у гэтую гісторыю, бо чапацца з Ягорам было не надта прыемна. І кожны — ці тым, ці другім адгаварваўся, каб не йсці за панятога. Толькі як пільна ўзяўся вясковы староста ды яшчэ з маладых хто-колечы прылучыўся — згадзіліся мужыкі і цэлай грамадой пасунуліся к Ягораваму хутару, а хлапца Міхалку паслалі ў воласць... . . . . .

Ідучы гамапілі... Успаміналі ўсе благія чыннасці Ягоравы і ўсё болей і болей загараліся злосцю і рашымасцю раз назаўсёды кончыць з гэтым злодзеем. Што Мікіту спарадчыў Ягор — у гэтым аніхто не сумляваўся, але што спыняла ўсіх, дык гэта добра вядомая хітрасць Ягорава... Напэўна, ужо ён абрабіў усё дзела гладка і схаваў канцы ў ваду. Цяпер мо сядзіць спакойна ды смяецца ім насустрэчу... І ўсе дзівіліся яго смеласці, адчайнасці. Гэта ж трэба: сеў пры ўсіх і паехаў, а тагды... Не, хіба сам чорт толькі мог рашыцца на гэткую штуку!..

Так разважалі ідучы сяляне, і, разам з непамернай злосцю на забойцу, у іх раджалася апаска, што дарма толькі сходзяць, што пасмяецца толькі над імі Ягор. Сляду пакуль што няма ніякіх... Кабылу знайшлі дзесь аж за местам, а што з млыну ўмясцёх паехаў — дык гэтага яшчэ мала...

Ягора ў дварэ не было. Жонка яго, высокая худая кабеціна, сказала, што пайшоў на места. Калі вернецца — не ведае. Мужыкі пастаялі, пакурылі, перакінуліся парай слоў — і не ведалі, што рабіць... На іх задзіўлена пазіралі з пяколку Ягоравы дзеці — хлопчык з дзяўчынкай,— а на печы недавольна пешта мармытала старая матка. Сама гаспадыня, быццам і не прыкмячаючы нічога, сядзела на лаве і круціла верацяно.

Пастаяўшы яшчэ троху і пашаптаўшыся, мужыкі выйшлі на двор. З апушчанымі галовамі пачалі хадзіць па двару, вакол хаты. Абхадзілі — не знайшлі нічога... Пастаялі

на дварэ, параіліся, што рабіць... Не прыдумалі нічога і пайшлі за вороты к гасцінцу. Там да самай дарогі толькі й відна было тых слядоў, што самі яны парабілі. Усё было завеена, пахавана пад пялёнкай свежага снегу...

Стыдна і абідна рабілася... А злосць усё расла. І пайгорш было тое, што не на кім было спагнаць гэтую злосць. Як назло, і жонка Ягорава — хоць бы слаўцом кранула: маўчыць, нібы не бачыць нічога й не разумее...

Ужо ладзіліся вярнуцца ў двор сяляне, як Пятрок Маркаў, што пільней за ўсіх прыглядаўся да зямлі, закрычаў:

— Э! Хадзіце-тку хутчэй сюды!..

Усе акружылі Пётру. Там, дзе павінна была быць зваротка з гасцінцу на Ягораў двор, ветрам здула снег, з-пад каторага ўсё больш і больш паказвалася свежай чырвонай крыві...

Потым загаманілі сяляне... Гэта ўжо быў не той нясмелы гоман, што чуваўся за часінку перад тым. У гэтым магутным гомане чувалася помста, помста не толькі за Мікіту, а за ўсё, што перацярпелі ад гэтага паганага чалавека...

Цяпер гуртам ізноў пасыпалі ў хату... Падступілі к Ягоравай жонцы... Хвёдар перад усімі...

— Што з Мікітам зрабілі?..

— З Мікітам? З якім Мікітам?..

— А!.. Не ведаеш!.. Нечага нявінёнтка корчыць!.. Годзе ўжо вам кроў нашу піць!.. Гавары, дзе Мікіту дзелі?

— Дадушы, нічога не знаю... Каб мне так сонца не ўбачыць... Каб мае дзеткі так жывыя былі, як нічога не чула й не бачыла...

І пайшла клясціся... Яе тонкі скавытлівы голас як пугай праразаў густую грамаду мужчынскіх гукаў... Дзеці пачалі плакаць...

А мужыкі не адступалі... Павялі туды, дзе чырвоная кроў сведчыла аб страшэннай дзеі...

Збялела баба, здрыганулася, як убачыла кроў. Быццам нейкая сіла таўкала яе ад таго месца... Адвярнулася, глядзела ўбок і ўсё лапатала:

— Дадушы, нічога не ведаю... Можа, скаціна скалечылася ці што якое... Мала хто тут па гасцінцу ездзіць... Якое наша дзела...

І пайшла, і пайшла...

Мужыкі сперш наступалі на яе, крычалі, пагражалі, а потым убачылі, што не даб'ешся ад яе аніякага толку, толькі дарма час патраціш...

— Ды на якое ліха яна нам здалася! — сказаў Лявон.— Што нам за карысць — з бабай вазіцца. Усё роўна — дзела яспае... Трэба цяпер яшчэ каму ў воласць пабегчы, пазваць міліцыю... дый заарыштаваць яго тут на месцы...

Лявон лічыўся чалавекам разумным, і к яго голасу заўсёды прыслухваліся сяляне. Зараз жа ўсе пакінулі бабу і сталі радзіцца, што рабіць далей...

Пятрок не згаджаўся з Лявопам.

— Эт, міліцыя,— гаварыў ён.— Ведаем мы гэтую міліцыю! Так табе яна й кінецца... Мо ён раней за нас ужо пабыў там дый падмазаў, дзе трэба. Міліцыя... Як на мой розум — пачакаць яго тутака ды паказаць яму такую міліцыю, каб ён помніў!..

— Кінь плявузгаць! — перапыніў Лявон.— Гэткім парадкам ты пападзеш сам у такую кашу, што не надта скора вывернешся... А што міліцыя? Дык хіба мы не знойдзем на яе ўлады? Трэба толькі самім узяцца за гэта, дык тады — хочаш не хочаш, а будзеш рабіць так, як па закону паложана. Сляды пэўныя — чаго ж тут яшчэ...

Сяляне пачалі спрачацца. Але прылучыліся да Лявона і вымаглі таго, каб зараз жа паведаміць міліцыю і перадаць справу ў рукі ўлады; другія, больш гарачыя, праглі папрабаваць моц сваіх кулакоў, паквітацца з Ягорам сваім парадкам...

Немаведама чым бы кончылася спрэчка сялян, каб адно нечакапае здарэнне не падмацавала Лявонаву старану.

Якраз у самы разгар справы прыбег Хвёдараў брат Ігнатка і прынёс на першы погляд зусім глупасную рэч — старэнькую паркалёвую хусцінку. Знайшоў ён яе, як выявілася з яго апавядання, на Мікітавых санках у саломе... А бабы ў адзін голас сказалі, што не адзін раз яны бачылі яе ў Ягоравай жонкі. Хусціна была задзелана ў крыві...

— Гэта ён завязаў, пэўпа, каб кроў не цякла... слядоў каб не засталося... Што ж ён зрабіў з ім, злодзей?..

І мужыкі пачалі будаваць дагадкі аб тым, пто адбылося ў гэтую поч. Адпак цяпер ужо ўсе згадзіліся з прапановай Лявона, бо пэўныя былі, што цяпер ужо не выкруціцца Ягор, куды б ён ні кінуўся... Толькі пастапавілі пакінуць у Ягоравай хаце колькі чалавек, каб затрымалі Ягора, як прыйдзе, і не пускалі нікуды да прыезду міліцыі.

Народ разышоўся. Асталіся толькі тры мужчыны з Пятраком на чале.

Цераз якіх паўгадзіны прыйшоў і Ягор. Па слядах, што парабілі сяляне вакол хаты, ён, пэўне, адразу згадаў, у чым справа... Увайшоў у хату, прывітаўся і сеў на лаве...

Адразу нешта цяжкое павісла ў паветры. Хаця гаварылі аб самых звычайных рэчах, але галасы зычэлі неяк глуха, сур'ёзна і зважна. Чувалася, што пад звычайнымі словамі хаваюцца зусім не звычайныя думкі, што ў кожнай галаве ў гэты час ідзець свая асобная ўпартая работа, не маючая аніякага звязку з тэмамі гутаркі... Твары сялян былі сур'ёзныя, нават урачыстыя трохі; па твару Ягора поўзала яго звычайная ўсмешка...

Пасядзеўшы троху і пагаманіўшы, Ягор узняўся.

— Ну, вы сядзіце, грэйцеся, а мне трэба схадзіць у адно месца...

Пятрок загарадзіў дарогу...

— Не, пачакай...

Сказаў гэта спакойна і ціха, нават цішэй, чымся гаварыў дагэтуль... Але ў ціхім голасе чувалася моцнае абурэнне. Чувалася й тое, што Пятрок сумысля дадае троху драматызму ў свае дзеянні, што ён троху «грае ролю» і што яму гэта надта падабаецца...

— Пусці! — таксама ціха гукнуў Ягор...

— Не пушчу.

— Пусці, табе кажу! — загвалтаваў Ягор...

— Супакойся!.. Сядзь, пасядзі!..

— А гэтага не хочаш?..

У руцэ заблішчэў пісталет... Пятрок перш здрыгануўся, потым пастаяў троху, гледзячы проста ў твар Ягору, адышоўся і сеў на лаве...

— Ладна!.. Усё роўна — дарога табе адна!

— Пабачым! — сказаў Ягор і шчэз за дзвярмі...

Выбегшы з хаты, Ягор пашыбаваў у воласць, каб папярэдзіць небяспеку, але на паўдарозе спаткаўся з міліцыяй, якая яго й заарыштавала...

Уся акруга вольна ўздыхнула, як пранесліся чуткі аб тым, што забралі Ягора... Некаторыя, праўда, і каркалі, што хутка выкруціцца і вернецца на гора добрым людзям, але крынічане казалі, што зробяць усё, што толькі магчыма, а Ягора захаваюць туды, куды трэба...

А Мікіту цераз тыдзень знайшлі з прастрэленай галавой у раву, недалёка ад таго месца, дзе Хвёдар злавіў яго-ную кабылу...

З НАШЫХ ДЗЁН

I

Па выпадку святочнага дня ў краме Дзям'янкаўскага спажывецкага таварыства незвычайная рухавасць. Да крамы раз-пораз цадходзяць то купамі, то ў адзіночку сяляне: мужчыны, бабы, моладзь. Ідуць не з тым дзелавым заклапочаным відам, як звычайна ходзяць купцы ў краму. На тварах гультава-вясёлая святочная давольнасць, давольнасць адпачынку пасля тыднёвае цяжкае працы. Ідуць больш дзеля цікавасці. Ці давядзецца купіць што-якое ці не, а галоўнае — цікава падзіваванца, што новенькае прывязлі ў краму, чым узбагаціўся за апошні час «свой» кааператыў, а за адным ходам і апошнія навіны пачуць.

У самой краме народу, як той кажа, пальцам не пратыкнуць... А гоман стаіць, тлум страшэнны.

Тут «барадачы» косы разглядаюць... Круцяць іх ва ўсе бакі, важаць на руцэ, «звон» прабуюць. З рук у рукі перадаюць косы, праводзячы іх адпаведнымі ўвагамі, гэтак жа ёмкімі, як смяхотнымі...

— Так яна, здаецца, і нічога, а вот папрабуй кляпаць, дык і пасыпецца, што порах...

— Якая, во гэта пасыпецца?.. Столькі ты разумееш...

— Не, калі Змітра паклепець, дык напэўна адзін прут астанецца...

— Ну, а сам... Пасля тваіго кляпання тож хоць на йгрышчы іграй на касе: лапатуха на лапатусе...

Троху далей бабы ўважна і з відавочным здаволеннем разглядаюць паркалі. Разварачваюць свежыя «штукі», шчыра абшчупваюць, глядзяць на свет, прабуюць драць асцярожна з краю. Робяць усё гэта з такім паважным і ўрачыстым відам, быццам і сапраўды вялікія знаўцы...

— Летась я сваёй Зосьцы якраз во гэткага на сукенку набрала, дык што ж бы вы думалі: як памыла, дык ёп і аблез адразу... І такі стаў, што апрапуць брыдка...

— Ага, яно, відаць, адразу аблезе...

І бабы з тым жа паважным відам бяруцца за другую «штуку».

— Не аблезе, цёткі, не аблезе,— заспакойвае баб прыказчык Саўка, маленькі, спрытны, рухавы мужычок, які спраўляецца ўсім паказаць, з усімі пагутарыць і ў той самы час зрэдку абкінуць здаволеным поглядам краму, багата абстаўленую рознымі таварамі.

У краму ціснуцца ўсё новыя і новыя асобы, і робіцца ўсё цяснейі цясней. Выходзяць неахвотна... Нават як купяць і адыдуць ад прылаўка,— усё яшчэ стаяць купамі, гамоняць аб тым, аб другім, пачынаючы ад тавараў і канчаючы бадай не міжнароднай палітыкай... А як выйдуць з крамы, ізноў некаторы час сядзяць яшчэ на ганках і, плюскаючы на яркае паўднёвае сонца, разглядаюць адзін у аднаго справункі і толькі потым з тым самым вясёла-святочным відам разыходзяцца па пылкай, купаючайся ў шчодрых сонечных праменнях вуліцы...

II

А на другім канцы таго самага сяла Дзям'янкава стаяла другая крама тутэйшага багатыра Кубарскага. Высокі ганак, вялізныя вокны з жоўтымі выразанымі вакеніцамі, нават старая напалавіну аблупленая табліца з надпісам: «Бакалейная таргоўля Кубарскага», адным словам — усё на месцы: магазін, дый годзе... Аднаго толькі не ставала да поўнага ўражання — гэта купцоў. А іх сапраўды не відна было. Як быццам наўмысля згаварыліся сяляне не заходзіць у гэта «заведение». І «бакалейная таргоўля» выдавала чымсьці нежыццёвым, застыглым, целам без душы.

Затым не дзіўна, што гаспадар крамы, здаровы, дзябёлы мужык, сядзеў сярод сваіх тавараў у надта непрыемным настроі. Час ад часу ён абглядаў хмурным поглядам сцены сваёй крамы, абстаўлены шлоймай паліц з рознымі таварамі, і кожны раз сумна ўздыхаў.

Бывала, яго радавала багацце тавараў у краме, ствараля ў яго душы прыемнае пачуццё поўнасці, здаволення, а цяпер... Цяпер ён прагнымі вачмі шукаў новага пустога месца дзе-небудзь на паліцы — і не знаходзіў яго. На паліцах стаяла сёння цалком тое, што стаяла ўчора, таксама, як учора стаяла тое, што надоечы, і г. д.

Кубарскі прыслухоўваўся да крокаў на вуліцы, з надзеяй чакаючы, што во-во япы набліжэюць, раздадуцца

на яго ганках, і вясёла-гарэзна задзіліпкае павешаны на дзверы званок. Аднак крокі бліжэлі й далелі, зноў бліжэлі і зноў далелі, а ў краму ніхто не зазіраў.

У нецярплівасці Кубарскі раз-пораз падыходзіў к акну і цікуючым поглядам праводзіў сяляк, якія праходзілі па вуліцы. Злосць яго брала, калі ён бачыў у руках некаторых з іх, відаць, толькі што здабытыя справункі.

— Во, ліха на іх галаву, завялі яшчэ пейкую хваробу... Кааператыў. Усякую трасцу выдумаюць... без гэтага і ўсё добра было... не... трэба ім...

У яго ў душы закіпвала злосць, такая нянавісць да новае ўстановы, што, здаецца, калі б была магчымасць, ён разрушыў бы ў пух і прах кааператыў і яго ўтварыцеляў. Ён бачыў, што кааператыў падрывае яго гандаль, і чуў, калі так будзе цягнуцца, дык хутка застанецца адно — закрыць сваю крамку ці, іншымі словамі, разарыцца, пазбыцца зусім сродкаў к бяспечнаму жыццю.

Але Кубарскі не хацеў гэтак скора здавацца. І, седзячы ў сваёй бязлюднай крамцы, ён увесь час упарта, напружна думаў, бясконца будаваў планы, вышукваў сродкі, як бы пазбавіцца ад гэтай навалы.

У апошні час асабліва настойна лез у галаву адзін план, план трудны, але ўсё-ткі магчымы. Кубарскі з усіх бакоў яго абдумваў, меркаваў, стараўся зараз згадаць усе магчымасці, падлічыць усе сродкі.

Сёння гэты план асабліва часта занімаў яго думкі, не выходзіў ,ані на часінку з галавы і здаваўся гэткім простым і пэўным, што ў хуткасці Кубарскі сам сабе задзівіўся: чаго ён яшчэ марудзіць?..

І ён рашыў дзейнічаць...

III

Пад вечар, калі ўжо сонца, схіляючыся к захаду, пачало працягваць па зямлі даўжэнныя цені і ў ціхім, нібы застыглым ад спякоты паветры, задрыжэла перадвячорная жоўць,— усе сяляне паразышліся, і ў кааператыве астаўся адзін прыказчык Саўка. Ён выцягнуў з скрыні дзянную выручку і стаў карузлымі, але абвыклымі рукамі перабіраць пакомчаныя замасоленыя паперкі.

Сёння выручка ладная. Каб гэтак кожны дзень, кааператыў шпарка пайшоў бы ўгару.

Саўку падабалася, калі кааператыў добра працаваў. Ён тагды з нейкім асаблівым каханнем глядзеў на сваю

крамку і з асаблівым здаволеннем, з смакам арудаваў таварамі, якія знаходзіліся пад яго загадам. За час сваёй службы ён так зжыўся з ім, што лічыў яго чымсь сваім, родным, блізкім. Нягледзячы на тое, што пенсія яго была зусім невялічкая, нягледзячы на тое, што яго дамоўныя гаспадарчыя справы былі ні к чаму варты,— ён аддаваў кааператыву столькі часу, сколькі было трэба і нават не трэба.

Цяпер Саўка, падлічваючы выручку, быў таксама здаволены, як быў бы здаволены, каб пералічваў свае ўласныя грошы. І толькі адзін раз у яго міганула выпадковая думка:

— Эх, каб мне столькі грошай, каня можна б было купіць добрага!..

Але гэтая думка вылецела таксама шпарка, як і прыляцела, і замянілася думкамі аб тым, што трэба здабыць у краму, што мае добры ход і г. д. Аба ўсім гэтым сёння ўвечары прыйдзецца меркаваць з «упраўленнем». Саўка так углыбіўся ў свае рахункі, што нават не ўгледзеў, як у краму ўвайшоў Кубарскі.

— Добры дзень!..

— Добрага здароўечка! — азваўся Саўка і сказаў гэта такім тонам, у якім ясна чулася, што ён надта здзіўлены нечакапым прыходам.— Што гэта, ці не воўк пад гарой здох, што Нічыпар уздумаў наведацца ў наш магазін?..

— Якое там, мыла трэба ў вас узяць.

— Во нешта... Ці ў вас свайго мала?..

— Ёсць і сваё, але казалі, у вас добрае прывязлі...

«Ага! — падумаў Саўка.— Мусіць, нявыгадна сваё ўжываць: самому даражэй стоіць...»

Але зараз жа зрабіў звычайны дзелавы від і спытаўся:

— Колькі вам?

— Ды хунцікі са два адваж...

Узяўшы мыла, Кубарскі, аднак, не рупіўся ісці. Ён сеў на зэдлік і азірнуў цікавым поглядам краму...

— А вы разжыліся трохі... нічога сабе... На колькі ўсяго набярэцца?

— Міліярдаў на 35.

— О, грошы ладныя... Каб табе гэткія грошы, дык бы не служыў тут, я думаю...

Саўка не разумеў ясна, чаго хоча ад яго Кубарскі, але чуў, што ёсць нешта такое асаблівае, дзеля чаго той прыйшоў к яму.

— Колькі атрымліваеш пенсіі?

Гэта было дужа прыкрае пытанне. Саўка атрымліваў пенсію не надта вялікую, і некаторыя з кулакоў часта шкелілі над ім, кажучы, што ён ад свае службы толькі шкоду ў гаспадарцы мае. І Саўка пастыдаўся адказаць Кубарскаму...

— Ат, троху даюць...

— Так... Жыццё тваё незавіднае...

Ён памаўчаў. Саўка ўзяўся зноў за сваё дзела, але яно ў яго не ладзілася: ён напружна чакаў, што скажа далей Кубарскі. Змаўчаўшы, той пачаў зноў:

— Служачаму чалавеку дрэнна цяпер жывецца... Цяпер той толькі і жыве, хто гаспадарку добрую мае...

— Аб гэтым што й гаварыць! З гаспадаркай чалавек — ён сам сабе пан. Працуе сабе памаленьку, у яго й тое і другое, ні ў чым ён не нуждаецца... Што й казаць... Але дзе ж яе ўзяць, гэту гаспадарку?..

У Саўкі была адна замілаваная думка, якую ён кукобіў праз усё сваё гарапашнае жыццё, думка, якая заўсёды неадходна стаяла перад яго вачмі. Гэта думка была — мець добрую, спраўную гаспадарку. Аднак выканаць гэтую думку яму ніяк не выпадала. Раней зямлі не было, потым і зямлю сталі даваць, а ўсё роўна нічога не выходзіла... Зямлі адпае мала. Да зямлі трэба яшчэ ўсялякая худоба, а вось яе якраз і няма.

Кубарскі патрапіў падысці да Саўкі, патрапіў крануць патрэбныя струны. Саўка ажывіўся, разгаманіўся. Пачаў выкладаць свае погляды на сельскую гаспадарку, будаваць планы і г. д. Кубарскі толькі патураў яму ды чакаў моманту, калі можна будзе пачаць. Як Саўка кашчаткова захапіўся, ён мнагазначна прагукаў:

— А ўсё гэта табе можна мець.

Ад раптоўнасці Саўка асалапеў, падумаў, што жартуе, але Кубарскі глядзеў зусім сур'ёзна.

— Як гэта так?

— Як?.. А во так...

Кубарскі нагнуўся і сказаў паўшопатам:

— На сколькі, ты сказаў, у вас тут тавару?..

Саўка сцяміў і сціх. А Кубарскі гаварыў далей:

— Цяпер жа толькі так і можна, на гэтым свет увесь стаіць... Хто цяпер, скажы, жыве па сумленню, га?.. Дурань які, дык ён здыхае з голаду...

Кубарскі доўга гаварыў у гэтым кірунку. А Саўка ўсё маўчаў. Урэшце прагукаў нерашуча:

— Не, гэтак не выходзіць. Гэтак, брат, не варта... Абчэсцвеннае дабро...

— Ды гэта тваё дзела, як сабе хочаш... Вядома, каму можна, а каму ї не...

І, прыдаўшы сваїму твару выраз поўнаї няўважнасці, ён дадаў:

— А ўжо вечар на дварэ... Трэба мне ўжо, мусіць, пасунуцца... Бывай здаровы!..

Узняўся і нібыта што пайшоў к дзвярам...

— Стой, падажджы троху! — відавочна змагаючыся сам з сабой, затрымаў яго Саўка.

І Кубарскі застаўся...

Як ужо шэраї гадзінаї выходзіў ён з крамы, па яго шырокаму твару расплывалася здаволеная ўсмешка.

IV

Чорная ноч настаражылася... Быццам зацяла дух і чула прыслухоўваецца да чагосьці, чагось напружна чакае...

Сяло спіць смяротным сном, ахінутае цемраї і магільнаї цішой... Ані зыку... Ані руху... Быццам чорная бяздонная цемра прыціснула сяло магутнымі грудзямі і задушыла ў сваіх абнімках усе праявы жыцця...

Але... што гэта? Там, у канцы сяла, дзе густая цемень вуліцы ўліваецца ў гэткую ж цемень бязмежных палёў,— быццам шолах чуваць... Яшчэ і яшчэ... Што гэта? Хто важыцца турбаваць урачыста-лагодную цішу ночы?.. Хіба гэта забытая ў полі скаціна, спалохаўшыся ночнае цемры, прыйшла да будынкаў і шукае сабе ночнага прытулку?..

Чырк... Чырк...

Пудліва, нясмела выбухнуў агопьчык і зараз жа згас. За ім другі... Гэты ўжо затрымаўся, прадрыжэў некаторы час, і раптам — выбухнула полымя...

— Пажар!..— недзе самотна празычэў спалоханы голас.

— Пажар! — адгукнуўся нехта ўжо ў другім канцы месца.

А цераз колькі часін усё сяло ажывілася. Забегалі людзі, узняўся гвалт, тлум...

Гарэў кааператыў... Полымя разраслося ї кідала ў неба вялізныя агнявыя спапы. Вакол таго месца, дзе гарэў будынак, стварылася светла-чырвонае кола, абмяжованае сцяной мраку, і ў гэтым коле туды ї сюды споўдаліся ўзрушаныя людзі. Асвятлёпыя плямістым, дрыжачым

водблескам пажару, яны здаваліся нейкімі таёмнымі, незвычайнымі стварэннямі, якія сабраліся на дзікае, цудоўна-вясёлае свята. Іхныя абуранныя рухі, іхная бязладная бягня па асвятлёнаму кругу, гвалты, паблытаныя, бязглуздыя і затым дзіўна-незразумелыя,— усё гэта рабіла ўражанне дзіка-жвавых, гуллівых і таёмных скокаў.

— Вады давайце!..

— Нясіце багор!..

— Тапор сюды давай!..

— Ламайце!..

— Раскідаць, братцы, трэба, а то на сяло пойдзе!..

— Сюды, сюды!..

— Ану, жывей, братцы!..

Сяляне стараліся з усіх сіл. Кожны знаў, што тут гарыць і яго маленькая частка.

Дзесь на сяле застагнаў спозпены звон...

— Ключ у каго? — дагадаўся нехта.— Ключ дзе? Адамкпуць трэба, дабро ратаваць!..

— Ключ!.. Ключ!.. Ключ у каго?! — разам паляцела ва ўсе бакі...

— Ключ у Саўкі! — закрычаў нехта.

— А дзе ён?.. Саўка! Саўка!..

Але Саўкі нідзе не было, і, сколькі яго ні шукалі, найсці не ўдалося... Папрабавалі ламаць, але моцныя, надзейныя былі запоры і не паддаваліся.

А полымя не спала. Як наўмысля, борзда перакінулася яно на пярэдні бок і адагнала прэч кучку людзей, усё яшчэ, пягледзячы на вялікую спякоту, прабаваўшых якнебудзь саўладаць з дзвярмі.

Стала відавочным, што адратаваць нічога не ўдасца. Вось забурылася страха, а за ёй і столь. Хмара іскраў шуганула ў неба...

Сяляне стаялі вакол і толькі глядзелі, як гіне ў пражорлівым полымі іхнае дабро.

Але каб здалелі яны зірнуць усярэдзіну, туды, дзе ўжо пястрымана бушавала мора агню,— яны б убачылі, што ў гэтым агні гараць адны толькі голыя паліцы...

Крама была пустая...

V

«Бакалейная таргоўля Кубарскага» аджыла. Ізноў, як і раней, вясёла зазвінеў на дзвярах званок, ізноў загрукалі частыя крокі на высокіх гапках, ізноў чарадой пацягну-

ліся з крамы клункі з цукрам, соллю, бутэлькі з газаю, кавалкі рознакалёрнага паркалю.

Кубарскі праз цэлыя дні «працаваў» за прылаўкам, і на яго тлустым твары блішчэла давольнасць і патаёмная радасць.

Тручы ад здаволення рукі, ён думаў:

«Ага, даждаліся і мы свайго свята... Цяпер во няхай пагандлююць... Паглядзім, як скора яны ізноў разжывуцца...»

І ён быў пэўны ў сваёй моцы...

А з Саўкам тварылася нешта нядобрае. З часу пажару ён змяніўся — не пазнаць... Здзічэў, стаў стараніцца ад людзей, баяўся з імі сустракацца. Калі траплялася камунебудзь загаманіць з ім пра кааператыў, ён неяк стуляўся, утупляў вочы, замінаўся і стараўся хутчэй спыніць гутарку.

Асабліва ўпарта ён унікаў стрэчы з Кубарскім. Калі той, устурбованы гэткай яго чыннасцю, памыкаўся знайсці яго і пагутарыць з ім, ён кожны раз стараўся ўцячы. Аднаго разу, нават спаткаўшыся з Кубарскім, ён зараз жа без усялякіх размоў павярнуў назад, быццам яго палохаў адзін від гэтага чалавека.

Па ўсяму было відаць, што Саўка мучыцца ў душы, што ў ім ідзе ўпартая барацьба з самім сабой і што гэта барацьба ў канцы канцоў павінна скончыцца чым-небудзь сур'ёзным.

І гэта здарылася.

Прыблізна тыдні праз два пасля пажару Саўка раптам паехаў у горад. Там ён, нікуды не заходзячы, пашыбаваў проста ў міліцыю і заявіў, што ён хоча гаварыць з начальнікам па надта важнаму дзелу. Яго правялі ў кабінет.

— У чым справа? — запытаў начальнік міліцыі.

— А во што, таварыш,— пачаў Саўка, і па тону, якім ён пачаў, можна было ўцяміць, што ён сапраўды рыхтуецца сказаць нешта важнае.— Ці чулі вы, што нядаўна ў Дзям'янкаве кааператыў згарэў?

— Ага, ведаю...

— Ну дык вось я прыйшоў да вас заявіць, што гэта я падпаліў яго...

— Як гэта так? А хто вы такі?..

— Я прыказчык гэтага кааператыва...

— Так... Што ж вас прымусіла падпаліць краму?..

— А ліха яго ведае... Спакусіў мяне гэты Кубарскі... Пагаліўся я на дабро абчэсцвеннае...

— Хто гэты Кубарскі?

— А гэта ў нас крамнік такі ёсць, таксама таргуе... Яму ад нашага кааператыва шкода вялікая была, дык вось ён і замысліў пазбавіцца ад яго і падбіў мяне, а я па слабасці і паддаўся...

— Ага, разумею... Во што: раскажыце мне ўсё па парадку.

Саўка расказаў, як прыходзіў да яго ў краму Кубарскі, як спакушаў яго, падгаварваў, як потым упочы ёп, Саўка, абабраў краму і падпаліў яе,— расказаў усё чыста.

— Ну, во што, таварыш, —сказаў начальнік міліцыі, як Саўка кончыў.— Вы зрабілі злачынства, і злачынства, трэба сказаць, цяжкае, але ваша шчырае прызнанне, безумоўна, гаворыць у вашу карысць. Скажыце, ці ёсць у вас довады на тое, што Кубарскі меў якое-небудзь дачыненне да гэтае справы?

— Дык як жа ж... У яго і тавар увесь з кааператыва ляжыць. Ён сам мне параіў у яго скласці... дзеля смеласці...

— Ага... Во як... Гэта дужа добра...

Цераз месяц Саўка і Кубарскі стаялі перад народным судом...

АДКУПІЎСЯ

I

Угары жудасна, страшна гудзела. Гэта вецер шалеў, абязуміўшы. А Петрусю здавалася немаведама што. Быццам цёмнаму лесу толькі і цікава, што сачыць за ім, злачынцам.

І здавалася Петрусю, што дрэвы скупіліся сваімі верхавінамі ў адну злосную навалу і пагрозна гудуць яму зверху, страшаць, перасцерагаюць. Здаецца, нахіляюцца на яго чорнай, вялізнай грамадай... усё ніжэй і ніжэй. Во-во — яшчэ цюкне раз вострай сякерай — і навалiцца на яго — цяжкія, злосныя; заціснуць, задушаць...

Але Пятрусь з апошняй адчайнай патугай сціскаў моцна, як мага, сякеру і біў, нічога не памятаючы, нічога не бачачы, біў, як трапіла, спяшаўся, каб барзджэй дабрацца да сэрца — каб павалілася дрэва.

Тах! Тах! Тах!..

Сякера не трапляла туды, куды трэба: злосць брала Петруся. Біў яшчэ часцей, яшчэ мацней, яшчэ зласней. Потам абліўся ўвесь. А сэрца, як сякера, рассякала грудзі...

Тук! Тук! Тук!..

Во закрактала ўжо дрэва. Сперш ціха, паволі, як часам бусел на старой, карузлай бярозе, а потым мацней, гучней, з нейкай патугай, з боллю...

Ррах!..

І ціха... Пятрусь нават прысеў, спалоханы раптоўнай цішой. Мо так здалося яму, а мо ў сапраўды ўсё пацішэла ўраз? Толькі ў распаленай галаве кляўцы б'юць неяк напружана, станоўка... Пятрусь не рушыўся з месца. Прыслухоўваўся пільна...

Шолахі пацяклі з усіх бакоў. Быццам хто падцікаўся, насоўваўся з цемры, з ляснога гушчару... Во-во наспее... У Петруся каленкі закалаціліся. А як недзе хруснула галіна — ірвануўся з месца, што спуджаны конь, бегчы памкнуўся.

Не... Нічога няма. Пэўна, звярок які прашмыгнуў, а мо выпрасталася прыціснутая дрэвам галінка... Усё спа-

койна. Нават макаўкі ўгары гутараць неяк лагодна, пасяброўску... Не злуюцца ўжо. Ды завопіта злавацца? Ну, ці пайшоў бы ён на гэта, каб не такая патрэба? Чатыры, толькі ж чатыры бервяны не стае... А без хаты няможна. У лазні жыве... Сям'я вялізная, дзеткі малыя...

Пятрусь уздыхнуў, заспакоіўся трохі і стаў памалу церабіць сукі з паваленага дрэва.

Цюк... Цюк... Цюк...

Неяк квола, рахмана гутарыла сякера, неяк спакойна, лагодна шумацеў па верхавінах вецер...

Пятрусь зусім уціхамірыўся і разам з гэтым пачуў сябе такім маленькім, недалужным. Шкода стала самога сябе, аж сэрца сціснулася неяк балюча. Ну, што ён робіць такога дрэннага? Завошта туляецца, як звер які, баіцца кожнага шолаху, кожнага зыку? Што ён, злодзей які? Ён проста бедны, гаротны мужык... Спраўны, працавіты. Ці ж ён не купіў бы гэтых чатыры бярнушкі, каб было за што? Але што ж зрабіць? Солі няма за што купіць, а не то што... А ўсё цераз вайну гэту згубную. Зруйнавалі, хату спалілі... Ужо два гады ў лазні жыве. Ну, якое ж тут жыццё! Іншыя паадбудаваліся як-колечы, за бальшавікамі навазілі бярвенняў — тыя дазвалялі, бачылі ж людскую гароту. А цяпер?.. Во чатыры бярны не справіўся прывезці тады, дык цяпер і не зробіш нічога. Хадзіў і да пана... Ат, толькі паназдзекаваўся з цёмнага мужыка. Прыгразіў, што ї тыя адбярэ... Эх, жыццё, жыццё...

Пятрусь выпрастаўся, пастаяў трохі, уздыхнуў глыбока-глыбока і пасунуўся ў цемры да другога, яшчэ раней аблюбаванага дрэва. Спаквапя расчысціў вакол месца, стаў ямчэй, упёрся нагамі ў імшарнік, сціснуў моцна-моцна сякеру ў дужых, карузлых руках...

Зноў, як злоўленая птушка, закалацілася сэрца, зноў пагрозна загулі верхавіны... Э, няхай будзе, што будзе!.. Тах!.. Тах!.. Тах!..

Зноў паляцелі ў цёмны гушчар паспешныя, прыкра гучныя ўдары...

. . . . . .

Кабыла Петрусёва стаяла воддаль у хмызняку схаваная...

— І-гы-гы-гы! — заіржала радасна, як падышоў да яе гаспадар.

— Ну, кабылка, поїдзем ужо!..

Пяшчотна пагладзіў сваіго верпага сябрука, адвязаў

і павёў па дарогу. Дарога бялелася няяснай плямай, сціснутая з абодвух бакоў калматымі сцепамі лесу. Пятрусь распусціў цялежкі, намацаў з боку дарогі лычы прыцягнутых бярвенняў і адно за адным усклаў іх на калёсы. Перавязаў, паправіў шляю на кабыле і пасягаў па дарозе.

Даўно нямазаныя каткі неяк жаласна, прарэзліва рыпелі, і гэтае рыпенне скрабала Петруся за сэрца. Ён міжвольна стрымліваў ход, затойваў дух і спыняў за морду кабылу, якая ўсё парывалася ўперад. Але каткі ўсё роўна рыпелі. Сціхнуць, сціхнуць, а потым раптам як заенчаць цягуча, станоўка, быццам і век не спыніцца гэты енк, усё будзе, што тупой пілой, рэзаць паветра, усё будзе працінаць наскрозь нутро... Але зноў сціхнуць... А потым зноў праз хвілінку....

Во й зваротка ўжо. Як тут паехаць: ці проста — па шляху, ці кругом — па лесе, балоту, па нетрах? Сюды бліжэй і дарога лепшая, але затое кругом куды смялей... Па шляху ці мала на каго можна натрапіць!.. Ах, што будзе, то будзе!..

Зваротка асталася адзаду.

Праз паўгадзіны пачаў радзець лес. Хутка ўжо й поле, а там з паўвярсты яшчэ...

— Рып!.. рып!..— пяюць каткі. Кабыла шчыра бярэ, засаплася аж небарака.

Во ўжо й поле зараз. Зашарэў прасвет у сцяне лесу, а на ім — што гэта? — быццам постаці нейкія... Ды не, гэта проста здаецца. Мо пні якія? Але нейкая прыкрая млявасць пацякла па целе. Схапіў за морду кабылу, спыніў. Упяўся вачмі, напружыўся, нерухомы... Постаці завару-шыліся, пасунуліся насустрэчу...

— Людзі!.. Пагіб!..

— А мо свае? — мігнула надзея.

Сунуцца бліжэй і бліжэй.

— Хто тут? — сярдзіты пачуўся вокліч.

Пятрусь абамлеў. Што рабіць? Хіба ўцячы, пакуль не позна? Кінуць усё: бярвенні, кабылу... Не! Кабылу няможна...

— Хто тут?

— Я,— гукнуў ледзь чутна, дрыжачым голасам.

— А, злодзей, папаўся! Дык красці, значыцца, га? Ноччу ў лес у чужы?

— Паночкі, змілуйцеся!.. Чатыры бярнушкі адсек невялічкія... Хаты не маю... у лазні жыву...

— Хаты не маеш, дык красці? Ах ты, сабака паршывы!.. Параспусціліся, сволачы!.. Бальшавікоў помніце?.. Мы вам пакажам бальшавікоў!..

Дзве цёмныя фігуры накінуліся, як галодныя ваўкі, на сваю ахвяру.

Пятрусь махіпальна закрыўся рукой... Бізун ёмка свіснуў у паветры і, як піяўка, упіўся ў чалавечае цела...

— Не біце!.. Бярыце, судзіце, рабіце, што хочаце, толькі не біце!.. Ай-яй-яй-яй!.. Браточкі, змілуйцеся!.. Ой-ёй-ёй-ёй!.. Ратуйце!..

І доўга слухаў цёмны, пахмурны лес адчайныя, жаласныя стогны чалавека...

II

— Ха-ха-ха-ха!.. Во, гэта так!.. Ды, як я бачу, вы так разумееце натуру нашага хлопа, як я кітайскую мову... Ха-ха-ха!..

Як смяяўся стары пан Бажэлка, яго тлустае, адвіслае пуза траслося, як квашаніна. У мяккім старадаўным крэсле раскапусцілася папскае цела, як вялізны кавалак здобнага цеста; глыбока ўехала ў слухмяныя, пакрытыя чырвоным аксамітам, спрунжыны...

— Пачуццё, ха-ха-ха!.. Пачуццё ў хлопа... У гэтага быдла дурнога!.. Вы, пане Ржэчыцкі, разважаеце, што блазен. Ну, вы ж зірніце проста на нашага мужыка, на яго жыццё... Што яму трэба? Пад'есці... Толькі пад'есці — і больш нічога... Чаго? — гэта не важна. Абы бруха напхаць... Пачуццё, імкненне ў яго адно: гэта — есці. Ну, піць яшчэ, з бабай паляжаць... Да ўсяго іншага ён не здольны. Гэта, што вы тут размалёўваеце аб яго пачуццях, аб душы яго, аб парываннях,— усё гэта ні больш ні менш як дзіцячае трызненне...

— Я не згодзен з вамі, паночку,— неяк мякка, ліслі-ва, але досыць настойна гаварыў пан Ржэчыцкі.— Вы заб-бываецеся на тыя багатыя духоўныя скарбы, якія нават выяўляюцца часам у вуснай творчасці народнай, у яго спевах, казках і інш. Вядома, што псіхалогія селяніна значна розніцца ад псіхалогіі чалавека вышэйшага кола, але я ніколі не згаджуся з тым, што хлоп — гэта нешта сярэдняе паміж чалавекам і жывёлай, нават нешта бліжэйшае да апошняй, як разумееце вы, паночку... Ён — чалавек і мае ўсё, што наогул уласціва духоўнай прыродзе

чалавека. Ён жыве духоўна, у яго ёсць свой духоўны свет. Мы не бачым гэтага, не разумеем толькі затым, што ён маўчыць, што ён не любіць, як мы, інтэлігенты, выяўляць напаверх свае пачуцці, перажыванні... Але яны ёсць у яго, нявідныя, захаваныя глыбока ўнутры...

— Хэ-хе-хе-хе... Казкі гэта... Летуценні юнацкія... Калісь і я гаварыў так, пане Ржэчыцкі, але потым прыйшлося толькі пасмяяцца над самым сабой... Я знаю хлопа, знаю як свае пяць пальцаў, наскрозь бачу ўсю яго істоту... І мяне смех бярэ ад усіх гэтых высокіх слоў. Я знаю адно: хлоп павінен працаваць, на гэта ён радзіўся, гэта яго назначэнне... І знаю яшчэ,— пан пачаў гаварыць трохі злосна,— што гэтыя самыя гутаркі вашы, даходзячы часам да яго вушэй, псуюць яго. Ён пачынае немаведама што думаць аб сабе, распускацца... Што, мала клопату нарабілі нам гэтыя бальшавікі? Мала пад іх уплывам хлопы нам напаскудзілі?.. І цяпер яшчэ паскудзяць... Усё спадзяюцца, што прыйдуць тыя...

— Паночку, як сабе не хочаце, а мы самі троху вінаваты ў гэтым. Цяжкае жыццё прымушае...

— Жыццё? Ды няхай бы я з голаду падыхаў, не меў кавалка хлеба, усё роўна не адважыўся б красці... А яны?.. Вы ведаеце, што мне прыйшлося трайную варту паставіць у Заблонскім бары. Крадуць... Едуць, як у свой лес усё роўна... Ну, скажыце вы, хіба можна назваць чалавекам таго, хто не прызнае ніякіх чалавечых законаў, для якога памыкацца на святое права ўласнасці — звычайная рэч, га?.. Ну, як бы вы, пане, паглядзелі на мяне, каб я прыйшоў у ваш дом і звалок у вас што-якое, а?..

— Каб вы гэта зрабілі ў звычайным становішчы, я, вядома, асудзіў бы гэты ўчынак; але зусім іншая рэч, калі б вы зрабілі гэта, паміраючы з голаду... Не знаю... Наўрад бы я кінуў тады ў вас камень асуджэння...

— Іначай кажучы, вы не лічыце вінаватымі тых мужыкоў, што крадуць дрэвы з майго бору?

Ржэчыцкі трохі памаўчаў...

— Выбачайце, паночку, але ў нашым кампанстве, я мыслю, не павінна быць сакрэтаў... Так, я не лічу іх вінаватымі...

Пан Бажэлка вылупіў вочы. Ржэчыцкі паспяшыў дадаць:

— Але, вядома, каб вы запыталі мяне пра гэта дзе на людзях,— я адказаў бы іначай.

Пан Бажэлка нарыхтаваўся сказаць нешта, але адчыніліся дзверы і ў пакой увайшоў папскі аканом.

— Што трэба? — абярнуўся да яго пан.

— Паночку, сёння ў лесе яшчэ аднаго злавілі.

— Злавілі? Дзе ён?..

— Тутака, сюды прывялі.

— Вядзіце сюды!

Аканом паіішоў.

— Во! Чуеце? Ну, што ж, па-вашаму, гэта так і трэба, гэта нішто сабе?.. З голаду, з цяжкага жыцця, а значыца, зусім добрая справа... Не, паночку, мала яшчэ пражылі вы, калі хочаце ведаць!.. Не вольнасць патрэбна гэтаму быдлу, а пуга... ёмкая пуга... во што!.. Сціспуць іх так, каб аж пішчэлі,— тады будзе парадак!..

Пан раз'юшыўся да таго, што твар яго, тлусты, шырокі, пачырванеў як бурак. Ржэчыцкі хацеў нешта папярэчыць, але ў гэты час увайшоў аканом, выпхнуўшы перад сабой калматага, абшарпанага мужыка...

Пятрусь (гэта быў ён) меў такі выгляд, быццам яго перапіхнулі праз малатарку. Пашкуматаны, растрапаны ўвесь чыста, валасы, барада ўскалмачаны, на твары гузы з сінякамі... Стаяў і неяк тупа, бязглузда глядзеў перад сабой. Аканом падштурхваў яго, шэпчучы нешта на вуха, але ён не кратаўся з месца.

— Ну-ну! — загаварыў пан грубым пагардлівым тонам.— Забыўся на звычаі дзядоўскі, а?.. Бальшавікі адвучылі?.. Ну!..

І ён выцягнуў уперад сваю пухлую, брыдкую руку.

Пятрусь сперш паглядзеў, не разумеючы, сваімі шырока расплюшчанымі непрытомнымі вачмі, потым ураз ажывіўся, падбег да пана, пацалаваў яму ў руку і рынуўся на калені...

— Паночку, даражэнькі! Даруйце! Не буду больш ніколі... яй-богачку... не буду... Паночку, гора мяне прымусіла. У лазні жыву другі год...

З распалепых вачэй адна за адной закапалі буйныя слёзы. Твар сударгава скорчыўся, сабраўся неяк, яшчэ больш закудлаціўся. Мужык заплакаў, як дзіцёнак...

А пан глядзеў на яго з свайго мяккага крэсла, і на яго вусах дрыгацела дзікая, зларадная ўсмешка.

— Во,— звярнуўся ён да Ржэчыцкага,— падзівуйцеся!.. Во вам узор... Што, сапраўдны чалавек дапусціў бы сябе да гэтага? Зірніце, дзе тут ёсць чалавек? Пхе!.. Я ба-

чу тут толькі брыдкую, дурную жывёлу, якой хвост прышчамілі!..

— Значыцца, красці? — звярнуўся ён да Петруся.— А? Красці, сукін сын? У пана можна, а? Не грэх?..

— Даруйце, паночку! — галасіў збянтэжаны мужык.— Не губіце!.. Век бога буду маліць... Даруйце, папочку! Чатыры бярнушкі невялічкія...

— Ха-ха-ха!.. Чуеце, а? Які погляд на людскія законы! Чатыры — гэта можна, ха-ха-ха!.. Дык, значыцца, чатыры толькі?.. Толькі чатыры, ха-ха-ха!..

— Даруйце, паночку!..

— Ды ты чаго заходзішся? — змяніў пан голас.— Я ж з табой нічога не зраблю, не крану нават...

Пятрусь, не ўцяміўшы, з недаверлівай надзеяй зірнуў на пана.

— Ха-ха-ха! Толькі ў суд падам... Толькі ў суд... Ну, штраф заплаціш невялічкі, мо ў вастрозе троху пасядзіш... Гэта ж глупства... Чатыры бярнушкі толькі, ха-ха-ха!..

— Змілуйцеся, паночку!..

— Ха-ха-ха!.. Во, глядзіце, пан Ржэчыцкі! Гэта чалавек, па-вашаму? Варт ён гэтага слова? Што з быдлам, з ім можна зрабіць цяпер усё, што захочаш...

І, асветлены раптоўнай дзікай зацеяй, пан зноў абярнуўся да мужыка.

— Во што, хлоп! Я табе ўсё гэта дарую, калі пацалуеш мне ў ногі...

І ён, адваліўшыся ў крэсле, высунуў уперад брудныя боты, у якіх ён за гадзіну перад тым хадзіў па стадолах, аглядаючы сваіх стаеннікаў.

Пятрусь недалужна азірнуўся навокал, быццам шукаючы сабе абароны. У дзверы заглядалі цікавыя, усміхаючыяся твары панскіх прыслужнікаў...

Пятрусь асалапеў. Колькі часу пераводзіў свой погляд з панскіх ботаў на Ржэчыцкага і назад, быццам без слоў просячы ратунку ў гэтага старонняга чалавека. З яго ўзрушанага твару глядзела пакута... Потым раптам адважыўся, нахіліўся... І адну за адной пацалаваў панскія ногі...

— Ха-ха-ха! — рагатаў здаволены пан, гоўтаючыся ў крэсле.— Ну, цяпер можаш ісці куды хочаш... Адкупіўся... Ха-ха-ха!

III

— Адкупіўся, ха-ха-ха! — дружным рогатам ананавалі Петруся панскія прыслужнікі, як выйшаў ён ад пана.

— Ха-ха-ха!.. Танна, зусім танна адкупіўся... Ха-ха-ха!..

Пятрусь стаяў сярод іх у нейкай непрытомнасці і не знаў, што рабіць. Потым, нічога не кажучы, ціхім крокам пайшоў у дзверы.

— Адкупіўся... Адкупіўся! — няслося яму ўслед.

— Адкупіўся! — звінела ў яго ўвушшу.

На панскім двары стаяла яго галодная, перахлябіўшаяся кабылка... Радасна заіржала, як убачыла гаспадара.

— Адкупіўся, га-га-га! — здалося Петрусю ў іржанні кабылы.

Махінальна адвязаў кабылу, махінальна падвёў яе к варотам, адчыніў іх...

— Адкупіўся! — насмешліва зарыпелі яму цяжкія вароты.

Сеў на калёсы і паехаў, не разумеючы — куды, за чым...

Вакол смяяўся, гарэзваў прыгожы, светлы дзянёк. Прырода дыхала чароўнай вольнасцю, бязрупатнасцю, быццам няма ёй аніякага дзела да таго, што робіцца сярод гэтых нервовых, абураных жыццёвай ліхаманкай людзей, быццам яе ні крушыначкі не кратае гэта няўпынная, заўсёдашняя, лютая барацьба за кавалак хлеба, за лепшую долю ў жыцці...

Птушкі цвіркалі высока ўгары нейкую дзіўную, незямную песню, якая гаварыла аб нечым далёкім і светлым, як тое блакітнае неба... Гэткай самай песняй адгукваліся знізу, з шаўковай травы, галузы-скачкі...

А сонца... сонца шчодра, не шкадуючы, ліло па зямлю свае праменні, купала ў іх усё чыста, быццам хацела здаволіць усіх і ўсё... Наце, піце, купайцеся, глытайце пражэрлівымі глоткамі!.. Усім стане... Бярэце, колькі-хоця, толькі будзьце здаволены!.. І ўсё прымала з радаваннем яго шчодрыя падарункі, усё, як магло, дзякавала ветламу сопейку... Усё, толькі не людзі!..

Пятрусь сядзеў на возе, пахіліўшы кудлатую галаву. Думаў, напружваў свой розум, каб злавіць якую-колечы нітку, па якой можна б было дабрацца да галоўнага, уцяміць усё... Але не ўдавалася. Толькі назолліва біла ў вушы насмешліваe, пагардліваe:

— Адкупіўся, адкупіўся!..

Гэта слова, здавалася яму, ляцела з усіх бакоў, ляцела жоўтымі, агнявымі маланкамі і балюча ўшівалася ў самае сэрца.

Птушкі сухім жорсткім звонам кідалі яго з вышыні; з бакоў, з густой травы прарэзлівым верашчаннем сыпалі яго неўгамонныя скачкі; нават каткі, рыпаючы на хаду, цягнулі адно й адно:

— Адкупіўся, адкупіўся...

Уехаў у лес. У той самы лес, дзе злавілі. Спякота змянілася на прыемны халадок. Гэта асвяжыла Петруся, вярнула яму частку свядомасці. Успомніў усё, што было. Зашчаміла сэрца сорамам, палкім, агнявым. У вачах паўсталі сперш пагардлівы твар пана, потым ухмыляючыяся твары прыслужнікаў. Схавацца, схавацца ад самога сябе, стуліцца, увабрацца ў нутро, каб не быць, каб не знаць анічога, каб не пякло, не балела ў сэрцы!..

— Адкупіўся, адкупіўся...

І нашто ён зрабіў гэта!.. Лепш было б прападаць... Сорам, сорам!

— Хіба вярнуцца? — раптам узварухнуўся, але зараз жа з болем успомніў, што нічога не выйдзе з гэтага, што не вернеш ужо тае платы, якую заплаціў пану... Яшчэ больш зашчаміла нутро, быццам ірвалася на часткі.

Але ж затое дарма абышлося... І ў суд не падасць,— памкнуўся заспакоіць сябе Пятрусь, але з гэтага нічога не выйшла. Прадставілася будучае жыццё — смутнае, гарапашнае, а ў вушах зноў зазвінела:

— Адкупіўся, адкупіўся...

Усе будуць гаварыць яму гэта, усе будуць кпіць, здзекавацца. Усе, нават дзеці малыя...

Пачаў канчацца лес. Зарадзеў сасоннік. Во ўжо і тое месца, дзе злавілі, білі, катавалі... Хутка і двор. Жонка спаткае, спытаецца... дзесткі... Што адказаць? Адкупіўся?

Не, не паедзе ён у двор. Усё роўна не будзе жыцця... Як ён зірне ў вочы сваім дзецям? Як яны паглядзяць на яго?.. Не!..

Спыніў кабылу, злез і доўга стаяў, абапёршыся на калёсы. Стаяў і думаў. Сонца плямамі вандравала па яго фігуры, часамі заблуджваючы на твар і накладаючы на яго празрыста-дрыготную пазалоту. Твар быў перухомы, быццам адубеўшы; толькі зрэдку карожыўся, нібы ад моцнага болю.

Пятрусь стаяў і думаў. Стаяў аж да таго часу, пакуль

здалёк не пачулася ляскатанне калёс. Тады ўзварухнуўся, кінуўся ў бакі, асалапелы, спуджаны набліжэннем людзей. Потым борзда, паспешна, хапаючыся, стаў адвязваць ад кабылы лейцы...

Адвязаў і кінуўся ў лес. Быццам хто гнаўся за ім, наступаў. Дабег да тоўстае разложыстае хвоі, што стаяла, старая, вялізная, сярод стромкіх малодак і з старчаскай ветласцю працягвала далёка ў бакі свае карузлыя, пакрыўленыя рукі. Па гэтых дзябёлых руках ляснога вола-та спрытна ўзабраўся Пятрусь. Зачапіў за высокі сук лей-цы, завязаў пятлю на канцы і прасунуў у яе сваю кудла-тую галаву.

Вочы заблішчэлі дзікім, шалёным бляскам, як зірнуў уніз з вышыні, а вуспы скрывіла хваравітая ўсмешка...

Ужо зусім блізка затарабанілі калёсы... Нехта наяз-джаў... Пятрусь, як мага, адтаўхнуўся ад дрэва, кінуўся ўніз і павіс, дрыгаючы нагамі...

Пад'ехалі людзі, два мужчыны з Петрусёвай вёскі. Абмінулі Петрусёву кабылу і хацелі далей ехаць, але ка-была пайшла за імі ўслед. Тады яны прыстоілі, і адзін саскочыў, каб прывязаць яе: пэўна, гаспадар за чым-не-будзь у лес адышоў, а яе на дарозе пакінуў. І толькі стаў ёп глядзець па баках, за што б прывязаць яе, як убачыў Петруся.

Кінуліся барзджэй да яго, знялі з дрэва і паклалі на мох. Адзін нахіліўся, прыклаў к грудзям вуха...

— Усё...

— А яшчэ цёплы зусім,— прагукаў другі.

— З чаго б гэта?..

— Хто ж яго ведае... Ці мала што можа прытраціцца ў нашым жыцці...

А Пятрусь ляжаў нерухома і глядзеў у блакітнае неба шырока расплюшчанымі шкляпымі вачмі! У гэтых вачах не было ўжо ні радасці, ні смутку — адпа нямая, бяздонпая пустата...

Пятрусь адкупіўся ад усяго...

ВОРАГІ

1

— Пан Купрыянаў... Хто ж гэта такі? Нешта дужа знаёмае...

Гуторскі, старшыня N-й павятовай надзвычайнай камісіі, глядзеў на ляжаўшую перад ім паперу і як мага напружваў сваю памяць, стараючыся ўспомніць: дзе, калі ён чуў гэтае прозвішча?

— Былы памешчык Купрыянаў... Вядзе контррэвалюцыйную агітацыю. Ёсць чуткі, што мае сувязь з бандай Зарубы...

Гуторскі перачытваў раз за разам паперу. Купрыянаў... Купрыянаў... Ну недзе ж чуў ён гэтае слова! Во, так і круціцца каля галавы, а ніяк не схапіць...

Гуторскі аж узлаваўся. У нецярплівасці пацёр рукой лоб.

— А бадай цябе! Во дык аказія! Не, ужо, мусіць, не ўспомню!

Махнуў рукой і хацеў ужо супакоіцца, але раптам, быццам наўмысля, скаўзанулася ў галаве:

«Ніна Купрыянава...»

Успомніў. У душу патыхнула даўнім, ужо напалавіну забытым.

Ніна... Так... Ніна Купрыянава... Ледзь успомніў; а калісь у гэтым імені было многа блізкага, дарагога. Дарагога па-свойму, па-асабліваму. Гэта ж было тады, калі яму было шаснаццаць гадоў, калі ў душы дрыгацела вясновая свежасць, калі ўвесь кіпеў дзіўнымі шалёнымі парываннямі. Цяпер ішакш, цяпер — розум. А тады было сэрца — маладое, яшчэ дзіцячае зусім. А што лепей?

— Усяму свой час...

Гуторскі ўздыхнуў, злавіў сябе на гэтым і ўсміхнуўся.

— Во табе й маеш... Раскіселіўся...

Узяўся зноў за працу, але ў галаве ўсё мітусілася знаёмае імя. Яго цікавіла, што за сувязь між гэтымі асобамі. Якое дачыненне мая тая Ніна да гэтага ўпартага папа? Няўжо радня? Яна-то, здаецца, з папскага стану была...

І неяк дзіка, прыкра было дапасоўваць тое светлае, празрыстае да гэтага чорнага, бруднага.

— А цікава... Пасыльны! — гукнуў Гуторскі.— Паклічце сюды Загруцкага!

Праз колькі часінак у кабінет увайшоў малады хлопец, агент сакрэтнага аддзела.

— Слухай, Загруцкі, ты маеш якія весткі пра памешчыка Купрыянава?

— Ёсць трохі.

— Ну?

— Што ну? Жыве вёрст за паўсотні адсюль у сваім маёнтку. Маёнтак таксама Купрыянавым завецца. Мае ладную гаспадарку. Гэта з такіх, што ўмеюць прыстасавацца да варункаў жыцця. Пакінулі яму зямлі трохі, жывёлы. З палаца чамусьці не выселілі. Ён, вядома, усё гэта падладзіў так, нібы сваёй працай жыць рыхтуецца. Ну, а там, ведаеш, ужо яго справа: ці сам, ці найме. У нас жа ці мала такім парадкам жыве яшчэ паноў! Збоку так, неўзаметку, у халадку.

— Ну, гэта ладна, свайго часу даджэцца. А наконт контррэвалюцыі?

— Бурчыць там сабе пад нос.

— У мяне ёсць данос на яго, з кам'ячэйкі адзін піша.

— Усё магчыма. Гэта ж такі народ, што калі трохі замацуецца, дык і пачынае варушыцца, кіпцюркі свае паказваць...

— Так... А сям'я ў яго якая?

— А гэтага, брат, не скажу табе, бо не знаю.

— Ну, добра. Больш мне нічога не трэба ад цябе.

Загруцкі пайшоў.

«І ён нічога не знае. А цікава, дужа цікава».

Гуторскі зноў узяў у рукі паперку і задумаўся.

«Што з ім рабіць? Паслаць каго туды? Заарыштаваць? Час небяспечны... Заруба гэты... Калі сапраўды пан з ім у хаўрусе, дык цацкацца з ім не варта. Каго ж паслаць? Хіба самому паехаць?»

Ён часінку падумаў.

«Ну, вядома... Гэта найлепсій... За адным заходам і ў воласць заехацца, праведаць, чаго яму там патураюць. Пэўна, звязкі ёсць. Так... Няйначай трэба ехаць. І зараз жа, не марудзячы».

Гуторскі даводзіў сам сабе пільную неабходнасць гэтай паездкі, і неяк сапраўды так выходзіла, што іначай і

пельга абысціся... А перад вачмі лупаў няяспы вобраз дзяўчыны, быццам купаўся ў цьмяным тумане мінуўшчыны і вабіў да сябе сумна-прыветным, чароўным харaством.

2

— Тах-тах-тах-тах! — гвалтуе матацыкл, уздымаючы пыл клубамі-хмарамі. Імчыцца, што звер які цудоўны, рэжа напалам шырокае, роўнае палатно дарогі.

Мільгаюць дрэвы абапал шляху. Далей за імі неяк бокам пераварачваюцца пярэстыя кавалкі пожань, зялёныя, але ўжо пачынаючыя жоўкнуць шнуры дабра. Дзе-нідзе хмызняк пракудлаціцца, гаёк усміхнецца весела на ўзгорку. І ўсё гэта гіне адразу адно за адным. Машына імчыць, што птушка ляціць, працінаючы палкае, нібы застыглае ад спякоты паветра. Кузаў плаўка гойдаецца, зыбае, як у калысцы. Горача, млява.

Гуторскі размяк зусім. Усё цела неяк апусцілася, раскінулася, як нежывое, па кузаву матацыкла. У галаве нешта расплылося, распаўзлося, нейкая млявая змора. Зацягнула, спавіла розум роўнай, цяжкай гладдзю. Не ўзнімаюцца, не варушацца думкі. Толькі няясныя вобразы, не вобразы нават, а так нейкія квяцістыя балачынкі, празрыстыя і кволыя, прасуваюцца, перавальваюцца марудна хваляй. Не відаць ні твараў, ні рэчаў — нічога. І толькі адно сэрца распазнае ў гэтых вобразах-балачынках непазбыўна-знаёмае і адказвае на яго прыемным, салодка-абураючым пачуццём.

Нешта далёкае, няяснае... ружовае... Тады ўсё было ружовае, як часам неба на захадзе. Тады, праўда, не прыкмячаў гэтага. Ды яно і заўсёды так: адразу няма прыгожства, а з'яўляецца яно ўжо тады, як перакоцяцца магутныя хвалі гадоў.

А ўжо перакаціліся... Колькі гэта? Гадоў ужо дзесяць.

Тады ён вучыўся. Хлопцам-падросткам быў. А яна... Яна была беленькая, кволенькая дзяўчынка. Апёлачак такі. І тады ён любіў яе. Любіў па-дзіцячаму. Хацеў глядзець на яе без канца, маліцца ёй, цалаваць яе маленькія, быццам з воску злепленыя ручкі.

Не любіў так, як мужчына любіць кабету. У яго не было ніякай мэты, намеру. Былі летуценні, дзівосныя юнацкія летуценні. Ён будаваў з іх сабе асобны свет, сваё асобнае, патаемнае, чароўнае жыццё.

Мінула ўсё гэта. Мінула і пакрылася тоўстым пластом жыццёвага попелу...

Шафёр спыніў машыну, і яна запыхала на месцы, уздрыгваючы ад павалу нутраной энергіі і быццам парываючыся пабегчы.

— Таварыш Гуторскі! Можа, зойдземся ў хату вады папіцца? Ці хочаце?

Гуторскі толькі цяпер згледзеў, што ўехалі ў вёску.

— Добра, добра. Па праўдзе сказаць, смага такая, што, здаецца, вядро б выжлукціў.

Зайшліся ў хату. У хаце душна, як у пекле, і прыцемна, знадвор'я ўвайшоўшы. Старая бабулька поркаецца на палу.

— Бабулька, вады напіцца можна?

Азірнула з нейкай апаскай.

— Чаму няможна? Ці вады пашкадуем? У сенцах там вядро і кварта. А можа, квасу ўнесці? Халоднепькі...

— О-то-то! — узрадаваўся шафёр.— Квасу, квасу, бабулька! Эх! — крактануў ён, быццам загадзя адчуваючы смак халоднага квасу.

Гуторскі сеў на лаўку і азірнуў хату. Брудная, цесная. Відаць, незаможна жывуць... Яму чагосьці ўсплыло на думку пытанне: як бы ён сябе адчуваў, калі б прыйшлося яму жыць у гэткіх абставінах, у гэтым агідным брудзе, з якога свеціцца цяглая, няўпынная праца, што займае ўсё жыццё, абмяжоўвае сабой круг інтарэсаў, імкненняў?

Ён здрыгануўся міжвольна. Не! Ён бы не ўжыў. Дарма што радзіўся ў гэткай самай хацёнцы, у гэткай самай хацёнцы ўзрос.

«Што ж гэта? Няўжо я так далёка адышоўся ад сялянскага жыцця? Няўжо я настолькі абынтэлігенціўся, апанеў? А калі ўзяць духоўнае жыццё... Што тут у мяне высталася супольнага з гэтымі людзьмі? Мала, зусім мала, каб не сказаць — нічога. І як жа гэта? Я стаю ва ўладзе, з'яўляюся прадстаўніком гэтых самых цёмных сялян, я выяўляю іхнія інтарэсы і ў той самы час не маю нічагутка з імі супольнага... Цікава... Адно толькі, што я зычу ім лепшай долі, хачу іх вывесці на свет, адно толькі гэта звязвае. Але гэтага мала. Правадыр не павінен далёка адыходзіць ад таго, каго ён вядзе... Трэба вярнуцца, трэба мець сувязь з сялянамі. Не тую дзелавую, службовую, што прыходзіцца мець, а звычайную, жыццёвую...»

Гуторскі ўспомніў пра свайго бацьку, які жыве недзе

ў гэткаї самаї хацёпцы і ў якога ёш не быў ужо гадоў пяць.

«Трэба даведацца»,— падумаў.

Бабулька ўпесла квасу.

— Паедзем? — спытаўся шафёр, як напіліся.

— Не, пасядзім трохі. Ну, як жа жывём, бабулька?— памкнуўся завесці гутарку са старой.

— Як жывём? А так і жывём, як жывём...

Яна глядзела спадылба, непрыхільна, з відавочным недавер'ем.

— Ці далёка да Купрыянава?

— Недалёчка.

— Колькі вёрст?

— А хто іх... Ці я мерыла, ці што...

Гуторскі не знаў, што далей гаварыць.

— Пойдзем у засень, паляжым! — звярнуўся да шафёра, а сам думаў:

«Нават гутарыць развучыўся...»

Як паехалі далей, ужо сонца апусцілася нізка. Падыхнула вячэрнім халадком. Знікла даўнейшая млявасць, адчувалася лёгка, бадзёра.

Гуторскі пачаў свежаї галавоїй абдумваць справу з Купрыянавым, будаваць план сваёй з ім сустрэчы.

3

Сярод старасвецкага, запушчана здзічэўшага парку стаіць палац пана Купрыянава. Купы багатаї зелені стараюцца захаваць яго ад людскога вока, агортваюць яго старанна, але дзе ж схаваеш гэткую веліч? То там, то сям выглядаюць з натоўпу зялёна-скурыстых дрэў белыя кавалкі мураванаї сцяны. Выглядаюць і ветла ўсміхаюцца праходзячаму воддаль падарожнаму.

Са шляху к панскаму двару вядуць ліпавыя прысады. Люба тут улетку ў спякоту! Волаты ліпы стаяць па баках велізарнаї чарадоїй, не пускаюць на дарогу ані косачкі сонечнага свету. Цянёк, халадок...

— Едзь ціха! — гукнуў Гуторскі, як шафёр звярнуў у прысады, а сам міжвольна задзіваваўся па стогадовыя асілкі ліпы... Стаяць панура, нерухома, быццам неїкія цудоўныя, маўклівыя вартаўнікі.

Кончыліся прысады. Адкрыўся шырокі, роўны дзядзінец, акружаны напаўразбуранымі будынкамі. А за імі — зялёны гушчар.

На дзядзінцы ціха, бязлюдна. Ані чалавечка. Быццам пейкае смяротнае царства.

— А дзе ж дом? — агледзеў шафёр і спыніў машыну.

Дом некуды знік, бы праваліўся ў скрозьдонне. Сталі азірацца. Не відна нідзе.

— Ці не сюды? — паказаў Гуторскі на заваротку ў парк.

І сапраўды, праехаўшы колькі крокаў, угледзелі зноў белыя муры.

— Не схаваўся! — пажартаваў шафёр.

— Хіба ад нас схаваешся! — адказаў Гуторскі.

Пад'ехалі к дому. Гэта быў пекны будынак. Лёгкі, павеўны і крохкі, быццам дзівосная фарфоравая цацка. І дзіўным здавалася, як магла гэткая кволая рэч захаваць ца блізка зусім нечапанай у кіпучую гадзіну людскога абурэння!

Каля дома было таксама ціха, нежыццёва. Зусім не відаць было прысутнасці людзей. Потым выбегла адпекуль з-за дома дзяўчынка і ўтаропілася, убачыўшы незнаёмых.

— Купрыянаў у дварэ?

— Ага, пан у дварэ.

— Пан? — насмешліва перапытаў Гуторскі.

— Ага,— не зразумела дзяўчынка.— І пані таксама ў дварэ.

«Во табе,— падумаў Гуторскі.— Быццам у даўпсёшы час».

— Куды ўвайсці?

— А во, названіце ў парадную.

Гуторскі ўзняўся на ганак і таргануў за званок.

— Хто-то стрэне?

І аднекуль з глыбіні душы зноў узняўся белы, празрысты і кволы вобраз.

Пачуліся за дзвярмі лёгкія крокі. Ляпнуў завал, адчыніліся дзверы.

Гуторскі на момант аслупянеў. Перад ім стаяла дзяўчына...

Ён адразу пазнаў яе, тую самую Ніпу, якую знаў дзесяць гадоў таму назад. Не, не тую, бо хіба ж гэта яна? Сталая, спелая красуня, прыгожая, вабная... А тая была белая, трохі ружовая, як пралеска. Ды не, гэта толькі след ад тае, яе працяг. Тае ўжо няма і не будзе, знікла...

І Гуторскі з цікавасцю разглядаў стаяўшую перад ім кабету. Любаваўся яе дзіўным харастком, харастком дзявочага красавання...

— Што вам трэба? — спытала тая прыемным кантральта.

У яе тоне пачулася непрыветнасць і нават пагарда. Яна, відаць, здагадвалася, якога гатунку чалавек стаіць перад ёй.

І Гуторскі схамянуўся. Закіпела ў грудзях варожасць, пачуў перад сабой у абліччы гэтае прыгожае дзяўчыны класавага ворага.

— Мне трэба бачыць пана Купрыянава,— сказаў грубa, націскаючы на слова «пан».

— Прашу!

Павярнулася і пайшла ў пакоі. Гуторскі ўслед за ёй.

— Пачакайце тут, я скажу яму.

Гуторскі застаўся адзін.

— Не пазнала... Дый дзе ж пазнаць! Дзесяць гадоў праляцела...

Азірнуў пакой. Відаць, гасціная... Багатая мэбля, пярэстыя, лахматыя дываны, па каміне дзівосныя, дарагія статуэткі.

— Ого! Нішто сабе. Для іх, мусіць, і рэвалюцыі не было. Ну, лепш позна, чымся ніколі. Мы яшчэ тут наладзім рэвалюцыю...

Выйшаў пан. Маленькі, гладкі, угадаваны, як парсючок. Твар досыць прыемны, але хітры: вочы так і ўпіваюцца, быццам хочуць наскрозь працяць...

— Чым магу служыць?

Гаворыць ціхім, ліслівым голасам.

— Я старшыня чразвычайнай камісіі...

— Дужа прыемна. Сядайце!..

«Ну,— падумаў Гуторскі,— не веру, каб было табе дужа прыемна...»

Ён паказаў мандат.

— Каб не было непаразумепняў.

— Ды што вы! Я веру і так.

Але ўсё-такі прачытаў.

— Ну вось... Цяпер будзьце ласкавы адказаць мне на некалькі пытанняў...

— З ахвотай!

— Перш за ўсё: як, па якія сродкі вы жывіцё?

Па твары пана расплылася хваравіта-ліслівая ўсмешка.

— Ды як, таварыш... Зямлю адабралі, пакінулі, як па дэкрэту паложана... Жывёлу таксама... Вяду малепькую гаспадарку.

— Самі працуеце, значыцца?..

— Ну, як вам сказаць... прыходзіцца, вядома... хе-хе...
— Наймітаў дзяржыцё?
— Не, пастаянных не маю... Так, часам хто пасабляе...
— Так... Дом увесь займаеце?
— Увесь. Ды ён і не патрэбен нікому. Установу тут якую змясціць не выпадае, пасяліць таксама няма каго.

«Шэльма ладная! — падумаў Гуторскі.— Ды што з ім доўга гаманіць. Трэба проста ўзяцца».

— А во што, грамадзянін Купрыянаў, вы не ведаеце, дзе цяпер Заруба?

— Заруба? Бандыт? Хто яго ведае! Ходзяць чуткі, што тут каля блізу недзе вандруе. Пасля таго налёту на суседнюю воласць (вы ж, пэўна, ведаеце пра гэты налёт), дык пасля гэтага знік і дасюль не з'яўляецца.

— А больш вы нічога не ведаеце?
— Адкуль жа я магу ведаць!
— Так... вы, значыцца, з ім ніякага дзела не маеце?
— Божа барані... Што вы гэта?..
— Хм... Мне казалі, што вы з ім у блізкім звязку...

— Хе-хе... Вы ведаеце, таварыш, што па нашага брата дужа лёгка ўзвесці ўсякую плётку... І кожны гатоў даць веры, бо наша...

— Ладна. Я ўсё-такі павінен у вас зрабіць вобыск.
— Прашу, прашу!

Гуторскі быў пэўны, што вобыск кончыцца нічым. Яго разбірала злосць. Ён разумеў, што дарма паспяшыў паехаць, што зрабіў гэтым толькі памылку. А чаго паехаў?..

Ён цяпер знае чаго... Не справа цягнула, а нешта іншае... Паддаўся настрою, раскіс... Эх, дурань!

І ён злосна штурхаў рэчы, загадваў паказваць усе куткі, рыў усё і рабіў гэта блізка што не гледзячы: проста так, каб спагнаць злосць. Знаў, што нічога не знойдзе.

Пан віляў вакол, усміхаючыся ўгодлівай і разам хітрай, зларадаснай усмешкай. Аднекуль прыпёрлася і тоўстая пані. Тая вохала, стагнала над вухам, гатовая кожную часінку самлець.

А воддаль стаяла яна... Зграбная, прыгожая. Стаяла, горда ўзняўшы галаву, і глядзела пагардлівым, грэблівым поглядам, усміхаючыся патаемнай усмешкай.

Гуторскі раз-пораз кідаў на яе погляд і кожнага разу адчуваў нянавісць, варожасць і разам нейкую сімпатыю.

Яна падабалася яму як дзяўчына, вабіла сваёй дзіўнай жаночай пекнатой. Яму хацелася кінуцца да яе, схапіць у

абдымкі, цалаваць... Не так, як калісь... цалаваць палкімі пацалункамі...

Гэта быў голас сэрца. А розум гаварыў іншае. Розум бачыў перад сабой ворага, злоснага класавага ворага. Свядомага, бо гэта яскрава свяцілася праз выраз яе твару.

І ў грудзях расла нянавісць.

У маленькай пекнай скрыначцы ляжалі яе лісты. Гуторскі дрыгануўся, як убачыў паміж іх колькі сваіх, што пісаў колісь, дзесяць гадоў назад.

А пад паперай ляжаў маленькі бліскучы браўнінг.

Яна першая ўбачыла яго. Схапянулася, пачырванела, потым збялела. Відаць, сама была на яго забылася.

— Гэта падарунак,— сказала.

— Гэта, ведаеце,— залапатаў пан,— адзін малады чалавек... знаёмы... ну...

Ён зрабіў такую міну, якая павінна была гаварыць:

— Вядома, маладое дзела... любасць, забавы...

Гуторскі паклаў браўнінг у кішэню.

— Выбачайце, але я не маю права звяртаць увагі на гэта. Я павінен канфіскаваць.

Бацька штось ізноў затарабаніў, але дачка спыніла яго:

— Не трэба, тата! Няхай!

Ужо абшукаўшы ўсю кватэру, Гуторскі раптам натрапіў на маленькую паперку. Ляжала яна на падлозе каля стала ў кабінеце пана, пэўна, згубленая. Гуторскі падняў яе проста затым, што практыка навучыла яго не прапускаць міма вачэй ніводнае драбязы. Падняў так, каб ніхто гэтага не заўважыў, і прачытаў неўзаметку.

У паперцы было напісана:

«Трыццатага будзем браць вашу воласць. Збірацца ў вас а дванаццатай гадзіне».

Гуторскі скомчыў паперку і схаваў у кішэню. У гэты час пан якраз забавіўся гаворкай з паняй. Ніна некуды выйшла, і, такім чынам, ніхто не заўважыў яго знайды.

— Ну, пакуль што, бывайце! — развітаўся ён і паспяшыў на двор.

Яго праводзіў насмешліва давольны погляд Купрыянава, але ён не зважаў на гэта. Думкі яго паляцелі ў новым кірунку:

«Трыццатага... Калі ж гэта трыццатага?.. Паслязаўтра... Марудзіць нельга... Трэба спяшацца...»

— Гані ў горад! — кінуў ён шафёру.

Машына залопала, затропала і паляцела, што птушка. Убаку, паміж дрэў, мільгапула постаць Ніны. Гуторскаму

здалося, што і яна ўсміхаецца таемна-зларадаснай усмешкай.

— Ладна... Той смяецца, хто смяецца апошні... Скора ўбачымся.

Сонца ўжо зайшло. Па зямлі шэрым валакном распаўзаўся змрок. Стала ядрана, свежа.

Гуторскі падстаўляў твар, грудзі пад хвалю сустрэчнага ветру і цешыўся яго жорсткімі ласкамі. Унутры бушавала бадзёрасць, адвага. І раз-поразу ўсяго агортвала хваля нейкай дзіўнай, шалёнай радасці...

— Жыццё... барацьба... Як добра жыць! Як прыемна змагацца!

4

Назаўтра з самага рання Гуторскі запрасіў да сябе Матроса.

Той прыйсці не забавіўся. Ужо часін праз дзесяць пачуўся ў канцылярыі яго магутны голас.

Яго ўсе з тлумам віталі. Гэта быў любімец усіх: любілі яго і падуладныя, і начальства, і проста ўсе, хто толькі знаў. Непамерная фізічная дужасць і да яе надта добрая і простая натура, казачная смеласць, адважнасць — усе гэта рабіла з Матроса глыбока сімпатычную асобу.

Быў ён камандзірам асобнага атрада. Меў, як і кожны чалавек, сваю ўласную фамілію, але ўсе звалі яго Матросам — па яго ранейшай спецыяльнасці. І яму падабалася гэтае прозвішча...

— Ну што? — загудзеў ён, уваліўшыся ў кабінет.

— Дзела ёсць.

— Якое?

— Пачакаі! У двух словах не скажаш... Сядаі во...

Матрос сеў.

— Даваі цыгарку!

— На! — і прыгатуйся да надта важнага...

— Прыгатаваўся ўжо. Пачынай!

— Колькі ты можаш набраць надзейных людзей?

— На каго?

— На Зарубу.

— Многа трэба...

— Як многа?

— Дзесяць чалавек.

— Слухай, Матрос, ты не выспаўся сёння ці мо жартуеш.

— А што?

— Ды тое, што сам не ведаеш, што вярзеш. Я думаў тэлеграфаваць у N, каб роту прыслалі...

— Ладна! Як зловім, тады тэлеграфуеш... Цяпер пачакай... Але расказвай, як і што...

Гуторскі расказаў усё па парадку.

— Маёнтак Купрыянава я ведаю добра,— пачаў разважаць Матрос.

І хоць ён ні на дробачку не змяніў выразу свайго шырокага, буйнага твару, але відаць было, што ён закіпеў, загарэўся ваяўнічым запалам.

— Маёнтак я добра ведаю... Там лес ці то парк... вялікі, гушчарны... а за ім — Дняпро. У самы бераг упіраецца парк... З Дняпра прыйдзецца і падцікацца, бо на дарозе варту паставяць... Так... Лодкі трэба... Лепш за ўсё на лодках. Лодкі ў Тросне на перавозе возьмем... Ну, акружым... Калі варта будзе — знімем... мае хлопцы мастакі на гэта... Ну, а там пабачым... Яшчэ трэба абмеркаваць...

— Ну, дык як з людзьмі?

— Усяго атрада не буду браць. Выберу чалавек пятнаццаць...

— Глядзі, каб мала не было... Гэта ж не злодзеі які, банда цэлая...

— Гэта мая справа. Адказнасць бяру на сябе.

— Добра... Я сам таксама паеду.

— Яшчэ лепей. Толькі з умовай: мне не замінаць... Загадаў ніякіх, акрамя маіх... Там ты не начальнік, а падуладны...

— Аб гэтым не турбуйся. Я не маю ніякага намеру намыкацца на тваю вайсковую ўладу. Усе загады твае буду спаўняць пяўхільна.

— Ну, я пайшоў... Увечары зайду да цябе, пагамонім.

— Заходзь на кватэру!

— Добра...

Гуторскі застаўся адзін. Хацеў узяцца за бягучую работу, але не работалася. Гісторыя з Купрыянавым заўладала яго галавой. Аб чым бы ні пачынаў думаць, думкі міжвольна, неўзаметку перабягалі на гэту цікавую справу.

То яму прадстаўлялася заўтрашняе дзела. Прадстаўлялася выразна, яскрава, з усімі драбнотамі, бо ён ужо перажываў яго ў сваім уяўленні. А то ўспаміналася тое, што было ўчора. Тады ў вачах стапавіўся вобраз Ніны і зацямняў сабой усё іншае. Дрыгацеў дзіўнай вабпасцю, цягнуў да сябе, змушчаў яскравым, ззяючым харастаом.

І тады Гуторскі зрываўся з месца і доўга хадзіў па пакоі, злуючы па сябе за тое, што не можа стрымацца, не можа ў корані перацяць гэта непатрэбнае, шкоднае пачуццё.

5

Маўкліва насупіўся старавечны купрыянаўскі парк. Сцішыўся, прытаіўся, быццам хоча ўсё падслухаць, усё захаваць у сваіх старых грудзях, сабраць цэлую векавечную гісторыю жыцця. Сабраць і пахаваць, нікому не сказаць ні аб чым, занесці з сабой у небыццё... І ўсё чуе стары цёмны парк. Усё, усё чыста, кожны ледзь чутны шолах, кожны рух, кожны ўздых чалавечых грудзей, кожны ўдар чалавечага сэрца.

І дарма думаюць тыя людзі, што вунь паўзуць па магутных карэннях, што сцелюцца дзеразой па зямлі ў нагах волата лесу, дарма яны думаюць, што ніхто іх не ўгледзеў, ніхто не пачуў! Людзі не пачулі, а маўклівы лес усё чуе і ўсё знае, толькі нікому не скажа...

А людзі паўзуць... Ціхенька, нішчыкам. Ані зыку, ані шолаху. Нават дыханне зацялі.

Толькі во тут двое шэпчуцца. Шэпчуцца так, як часам трава пад павевам кволага ветрыку. Больш угадваюць думкі, чым чуюць адзін аднаго...

— Святла не відаць... Вакеніцы зачынены.

— Можа, спазніліся, птушкі ўжо вылецелі?

— Грышка б свіснуў... Колькі гадзін?

— Было адзінаццаць, мінут дзесяць ідзём.

— Во ўжо дом.

— Не бачу нічога.

Вакол распасціралася чорная, густая цемра. Трэба было мець кацінае вока, каб угледзець што-колечы ў гэтай цемры. Як падпаўзлі ўжо на колькі крокаў да дома, тады толькі Гуторскі агледзеў перад сабою бялясую пляму мураванай сцяны. Нідзе ні агеньчыку. Ціха... Быццам усё навымерла ў гэтым вялізным таямніым палацы...

— Цс! — сыкнуў Матрос.

Гуторскі спыніўся, зацяў дух, прыслухаўся...

Ціха ўсё, як у магіле.

— Ціў! — цвіркнула над самым вухам начная птушка.

Гуторскі і не ўцяміў адразу, што гэта Матрос.

З розных бакоў ціха, нячутна паспаўзаліся людзі. Сабраліся ў гурток, што чорныя тараканы.

— Чакайце тут!

І Матрос знік у цемры.

— Ціў! — пачулася праз часінку недзе ўжо з другога боку палаца.

— Ціў! — быццам у адказ працвірчэла недзе яшчэ далей.

І зноў усё сціхла.

Паплылі доўгія, цягучыя хвіліны чакання. Ад печага рабіць Гуторскі пачаў як мага, да болю напружваць зрок, стараючыся схапіць контуры палаца, але нічога не мог угледзець, апрача няяснай, расплыўчатай плямы.

Збоку нешта ледзь чутна зашумацела.

— Хлопцы! — пачуўся ціхі воклік Матроса, і зараз жа ён сам апынуўся сярод гуртка.

— Тут... Дзесяць штук... сам адзінаццаты. На дарозе адзін стаіць... З тым Грышка справіцца... Будзем чакаць ля ганкаў... Як выйдуць — накінемся. Я на Зарубу, рэшта — па двое на аднаго... Не даць схапіцца за аружжа, урукапашную... Страляць не трэба... усіх жыўцом... Ну, марш за мной!

Асцярожна абышлі дом. Ля ганкаў Матрос спыніў усіх.

— Рассыпайся вакол... у хмызняк, каб, калі часам святло з дзвярэй пакажацца, каб не ўгледзелі... Як свісну — пачынайце... Ну, марш!

Умомант, хто куды, рассыпаліся ў бакі. Гуторскі лёг, прытаіўся за кустом садовых кветак і аддаўся нейкаму прыемнаму, абураючаму пачуццю трывогі, напружанага чакання.

Поплеч нехта заварушыўся.

— Матрос! Ты?..

— Я... Ціху!..

Але Гуторскі не мог маўчаць. Ён падсунуўся бліжэй да Матроса.

— Ці здолеем, а?..

— Глупства... Народ плюгавы, толькі сам нішто, трохі дужы. Ну, але памерымся...

— Ды ты справішся...

— Пабачым...

— Што-то яны робяць цяпер?

— Вячэралі... Я запайпоў шчылінку ў вакепцы, глядзеў...

— І пап там?

— Там... частуе... І папі, і панепка... Прыгожая, каб яе пяруп!..

«І Ніна там,— падумаў Гуторскі.— Як-то яна да ўсяго гэтага?»

І, нібы ў адказ на яго думку, з палаца раптам паліліся кволыя, ледзь чутныя гукі музыкі. Яны праходзілі праз тоўстыя муравапыя сцены, прыглушаныя, няпоўныя, далёкія-далёкія... І гэта прыдавала ім асаблівую чароўную вабпасць.

Гуторскі сціхамірыўся, увесь абярнуўся ў слых. Кволыя гукі раяля пацяклі проста ў душу і крануулі там сваім лёгкім павевам нейкія патаемныя, дзіўна-напружаныя, чулыя струны. Залуналі вобразы-кветкі, апавітыя сумам-журбою, ускалыхнуўся нейкі невыразны жаль. І быццам з туману ўзнялася паволі белая празрыстая здань тае Ніны, што была дзесяць гадоў таму назад...

Няўжо гэта яна? Няўжо гэта тая, што калісь даравала яму светлыя, чароўныя часіны, цяпер грае, цешыць сваёй музыкай яго ворагаў? Няўжо і сама яна, тая мілая, любая Ніна, цяпер яго вораг?..

Музыка сціхла, знікла чароўпасць. Зноў агарпула трывога чакання...

— Матрос!

— Ну!

— Ужо блізка дванаццаці, зараз павішны выпраўляцца...

— Ага... Трэба быць начаку...

— Ты ж Зарубу пазпаеш?

— Я яго бачыў, як яшчэ бандытам не быў... афіцэрам служыў у войску... У цемры трудна пазнаць, але ён першы выйдзе, павінпа... Патраплю... Цс...

У доме пачуўся глухі рух. Пэўна, збіраюцца. Яшчэ колькі доўгіх, цягучых часінак... Во ўжо крокі загрукалі блізка, у сенцах... Ляпнуў завал, і ў расчыненыя дзверы разам з густой мужчынскай гамонкай хлынула паласа слабага свету, які выходзіў, пэўпа, з унутраных пакояў палаца. Цемра ўвабрала ў сябе гэты свет, разбавіла сваёй чарнатой і абярнула ў шэры, дрыжачы змрок, у якім можна было згледзець толькі туманныя, няясныя постаці выйшаўшых з дома людзей.

Гуторскі ўпяўся ў іх напружаным, прагным поглядам. Сэрца забілася ў грудзях моцна, няроўпа. Па целу пацякла нейкая нервовая млявасць. А рукі сударгава сціснуліся ў кулакі...

Колькі іх? Раз, два, тры, дзевяць чалавек... Чаму не дзесяць? Няўжо Матрос памыліўся?

Спускаюцца з ганкаў... Гутараць, рагочуць... Западта смелыя... Пачакайце!..

Спусціліся. Сталі, аглядаюцца.

Быццам не важацца пасунуцца ў цемень... А мо ждуць каго? Мо хто застаўся? Трэба б саждаць...

— Матрос!

Але якраз у гэты момант прарэзлівы свіст працяў паветра.

Гуторскі здрыгануўся. Думкі ў яго пяк дзіўна перабліталіся, паскакалі адна цераз адну пярэстаі, шпаркаі чахардоі, зацямрылі свядомасць... Непрытомны, кінуўся ён, што дзікі крывяжэрны звер, на гурток асалапелых бандытаў і ўпіўся сударгава напружанымі рукамі ў нейчае цела...

У гэты момант з грукам зачыніліся дзверы палаца і ўсё знікла ў цемры.

Завязалася ўпартая бойка. Бандыты не здаваліся. У адчайных нечалавечых патугах вырвацца, уцячы — яны валаклі за сабоі учапіўшыхся ў іх армейцаў. Злосныя праклёны, жорсткая лаянка агаласіла цёмны парк. Людзі, што шалёнае звяр'ё, качаліся па зямлі ў страшэнных абнімках.

Недзе нездалёк раздаўся стрэл. Гэта яшчэ болей перапалохала бандытаў. Яны рабілі апошнія з усіх сіл патугі, каб вырвацца... Але дарма! Што яны маглі зрабіць проці схапіўшаі іх падвойнаі сілы!.. Адзін за адным паляглі на зямлю з скручанымі рукамі і толькі, лежачы, усё яшчэ лаяліся, рычэлі скрозь зубы ад злосці...

А па колькі крокаў убок яшчэ чуліся гукі барацьбы — гэта Матрос боркаўся з Зарубам. Армеіцы кінуліся былі к яму на дапамогу, але дарма...

— Не руш! — пагрозна зарычэў ён.— Я сам!..

Усе адхінуліся і толькі па зыках сачылі за ходам барацьбы, гатовыя кожную хвілінку кінуцца на дапамогу.

Гуторскі трымаўся як найбліжэй... Ён ужо забыўся на Матросаў загад і трымаў у руцэ наган з намерам пусціць яго ў ход, як толькі з'явіцца патрэба і магчымасць.

А барацьба ўсё цягнулася. Цемра не дазваляла бачыць, на чыім баку перавага, і толькі па адрывістых ускрыках, па сапенню, па стогнах можна было дагадвацца, што бандыт пачынае паддавацца.

Хлопцы й на сваіх палоппых забыліся. Акружылі ўпоцемку барацьбітоў і розпымі воклікамі падбадрывалі Матроса:

— Так яго! Во-во-во! Ай добра! Ціспі, ціспі!..

Хоць і не ведалі добра, хто каго ў тую часіну ціснуў...

Але Матроса не трэба было падбадрываць. Ён увайшоў у азарт, разышоўся ваўсю. Яшчэ колькі хвілінак, і ён ужо набедна соп, лежачы на абяссіленым ворагу.

— Дайце чым звязаць сцерву!

Яму вобмацкам падалі дзягу.

— Ага... Во табе... Паляжы, галубок!.. Досыць табе ўжо арудваць... Фу! — узняўся ён з зямлі.— Ну як, хлопцы?..

— Ляжаць.

— Усе?

— Да аднаго.

— Хто страляў?

— Я...

— Ты, Грышка?

— Я.

— Навошта?

— Не мог саўладаць... здаравеппы... ледзь мяне не прыбраў...

— Прыстрэліў?

— Так точна.

— Хоць і кепска, але — маладзец!..

— Ну, во што, хлопцы! — загаварыў ён вясёла-ўрачыстым і разам жартаўлівым голасам.— Спраўна папрацавалі... Банду Зарубы можна лічыць знішчапай... Яшчэ адзін, можна сказаць, крок да... да... Ну, адным словам, няхай жыве Савецкая ўлада і Чырвопая Армія! Ура!..

— Урра! — рыкапулі, як адна, дваццаць глотак.

— Уа! — адказаў водгукам цёмны парк.

А Матрос разышоўся. Нібы і сапраўды мітынг замысліў наладзіць сярод ночы ў гэтым незвычайным месцы.

— Слова даецца нашаму паважанаму кіраўніку і таварышу Паўлу Мікалаевічу Гуторскаму...

Гуторскі ніяк не чакаў гэтага. Ён засмяяўся. Яму дзіўным здалося гаварыць тут у цемры, сярод гэтага маўкліва-га, панурага парку, над ляжачымі, скручанымі бандытамі...

А хлопцы запляскалі ў ладкі:

— Просім, просім!..

— Толькі не больш адпае мінуткі. Час дораг! — дадаў Матрос.

— Яшчэ меііі... Многа гаварыць не выпадае... Дзякую

вам, таварышы, шчыра дзякую як ад сябе, так і ад імя пашай Вялікаї Рэвалюцыі!..

— Ну, а цяпер памацаем у палацы... Грышка, ідзі грукаї, адчыняї, а вы, хлопцы, бярэце сваіх палонных...

Дзверы былі незаваленыя. У пакоях цёмна. Агні ўсе затушаны. Гуторскі з двума армейцамі, трымаючы ў руках нарыхтаванае аружжа, уваішлі ў дом, а рэшта засталіся на дварэ. То ж дзеля ўсякага выпадку прыгатавалі аружжа.

У першым пакоі Гуторскі знайшоў лямпу. Запаліў яе і пасунуўся далеї. Усюды было пуста, бязлюдна. У сталоўцы знаходзілася на стале неприбраная пасуда, пляшкі, паследкі вячэры.

«Дзе ж паны? Няўжо паўцякалі з спалоху?» — падумаў Гуторскі.

Урэшце яны знайшліся.

У самым дальнім пакоі, у спальні, цьмяна свяціла лампадка. На ложку ляжала пані і вохала, а над ёй схілілася Ніна. Воддаль сядзеў пан. Пры святле ўнесенаї лямпы Гуторскі разгледзеў яго твар. Ён выяўляў такі адчай, такую недалужнасць, такую пакорнасць, што Гуторскі міжвольна скрывіўся ад агіды: быццам пабітая скаціна...

— Вы арыштаваны! — сказаў ён няшчырым грэблівым голасам.

Пані яшчэ мацней застагнала. Ніна ўзялася яе суцімаць. Твар Ніны быў збялелы, але спакойны. Апавіты смуткам, ён выдаваў яшчэ прыгажэйшым.

І міжвольна, на паругу розуму, у сэрцы Гуторскага шавяльнуўся глыбокі, шчыры жаль да яе. Каб не даць волі гэтаму пачуццю, ён барзджэй выйшаў з пакоя, пакінуўшы ля пана аднаго армейца.

Выйшаў на ганак.

— Можна! Заходзьце! Усё спакойна...

Першы ўпёрся з сваім палонным Матрос.

— Ану-тка, паглядзім, які ён стаў... Даўно ўжо не бачыліся.

І раптам ён пасыпаўся плоїмаї самаї буйнаї, самаї злоснаї лаянкі.

— Што? Чаго? — кінуліся да яго ўвайшоўшыя армейцы.

— Не ён!.. Памыліўся!..

Тоїї, з кім з такім запалам змагаўся Матрос, быў зусім не Заруба.

І сярод рэшты бандытаў не было атамана... Тут толькі

схапянуліся, што ўсяго дзевяць злавілі, а павінна быць дзесяць.

Гуторскі ўспомніў, як ён хацеў быў затрымаць Матроса, і пашкадаваў, чаму не зрабіў гэта на хвілінку раней. Заруба, відаць, чагось забавіўся ў палацы і потым, пабачыўшы, што справа кепская, даў драла...

6

Гуторскі ніяк не мог забыцца на Ніну. Ні на часіну не схадзіла яна з думак. Ён злаваўся, кляў і сябе, і яе, і ўсё чыста на свеце — і ўсё роўна не мог пазбыцца пазойлівага ўспамінку.

Перад вачмі ўвесь час лунаў яе вобраз, смутны, прыгожы, такі, якою бачыў яе апошні раз. Турбаваў, не даваў спакою...

Ён чакаў яе. Знаў, што прыйдзе. Захоча бацькі даведацца, а без яго дазволу не пусцяць.

І яна прыйшла. Як толькі паляпала ў дзверы, ён дагадаўся, пачуў, што яна...

— Увайдзіце!

Увайшла. Уся ў чорным. Як ідзе ёй чорная сукенка, якімі мяккімі, кволымі складкамі аблягае яе прыгожую постаць!

А хараство!.. Здаецца, яшчэ больш папрыгажэла.

— Сядайце!..

— Дзякую... Я да вас па справе...

— Ведаю. Чым магу быць карысны?

— Мне трэба бачыцца з бацькам, а на гэта, мне сказалі, трэба мець ваш дазвол.

Яна гаварыла скора-скора, спяшаючыся. Відаць, ёй было прыкра заставацца вока на вока з Гуторскім.

— Вы калі хочаце пабачыцца?

— Я б хацела атрымаць пастаянны пропуск, бо мне прыйдзецца яму прыносіць сёе-тое... з харчоў, вопраткі...

Гуторскі трохі падумаў.

— Во што, я вам зраблю гэта ў тым выпадку, калі вы мне дасцё слова, шчырае слова, што не будзеце выкарыстоўваць гэтых спатканняў для якіх-колечы іншых мэт, апрача тых, пра якія вы казалі.

Яна ледзь-ледзь усміхнулася.

— Вы мяне лічыце контррэвалюцыянеркай?

— Як ні прыкра прызнавацца ў гэтым, але так... Лічу вас не надта надзейнай у гэтым сэнсе...

— Ну, гэта зразумела. Я даю вам гэтае слова.

— Добра. Пачакайце часінку...

Ён напісаў і аддаў ёй пропуск.

— Дзякую...

Яна ўзяла пропуск, але не выходзіла. Нервова комчыла паперку ў руках, быццам нешта хацела яшчэ сказаць, ды не важылася.

На момант павісла маўчанка, і ў гэтай маўчанцы пачулася нешта недаказанае. Быццам абодва думалі адно, або два хацелі сказаць гэта, але не мелі сілы пачаць.

Гуторскі знаў, што, калі не скажа яна, скажа ён, што, урэшце, не стрымаецца, але хацеў, каб яна пачала. Чакаў...

— Слухайце,— загаварыла яна, не гледзячы на яго і ўсё яшчэ цярэбячы ў руках паперку,— ці можна вам задаць пытанне адно... не службовае... нават інтымнае трохі?

У Гуторскага адлягпула ад сэрца. Ахапіла нейкая лёгкасць, гуллівасць, нейкае мяккае, прыемнае абурэнне. Ён прыблізна знаў, што скажа яна, і яго толькі дужа цікавіла, як яна скажа. Сам быў спакойны, бо пачала яна, і гэта станавіла яго ў пераважнае становішча.

— Прашу, прашу...

Ён усміхнуўся ласкава-таемна, быццам казаў гэтым:

— Кажы, мілая, але я й так ведаю, што ты хочаш сказаць...

А яе, відаць, кальнула гэта ўсмешка, кранула яе дзявочы гонар. Нават губу прыкусіла... Гуторскаму весела стала. Ён смяяўся ў душы і, углядаючыся ў яе твар упартым поглядам, чакаў, што скажа далей.

— Слухайце! — пачала яна зноў.

І зноў змоўкла. Ніяк не магла адважыцца сказаць.

Гуторскі ўсё глядзеў на яе, усміхаючыся. Урэшце, перамагаючы сябе, яна сказала:

— Скажыце... вы не той самы Гуторскі, каторы...

Далей не гаварыла... Адвярнулася, упікаючы стрэчы з яго поглядам.

— Той,— адказаў Гуторскі,— таксама, як вы тая Ніна, каторая...

І ён наўмысля не скончыў.

Хвілінку абодва маўчалі. Потым ён загаварыў:

— Во як трапляецца, Ніна Васільеўна! Было калісь так, а прайшло дзесяць гадоў! — і стала іначай. Так... Калісь мы не зналі, якая прорва нас дзеліць. Звяла доля нас

у кучу, мы й не папыталі адзін другога: хто ты такі? Нас гэта не цікавіла, бо мы былі дзеці і не зналі нічога... Не паспыталі яшчэ ад «дрэва жыцця»... А потым усё вызначылася. Мы пайшлі рознымі шляхамі. І вось спаткаліся. Спаткаліся як ворагі...

— Ворагі,— задумлена працягнула Ніна.— Так... Вы праўду кажаце. Цяпер мы ворагі... І не затым, што я контррэвалюцыянерка, ды не... Я знаю, што стары лад не вернецца, не можа вярнуцца, бо ён несправядлівы, злачынны. Я й не хачу яго... прынамсі, мой розум не хоча... Але ёсць нешта глыбачэйшае, падсвядомае, што ўкладзена прыродай. Гэта нешта спавівае мяне, кіруе маімі ўчынкамі... Я знаю, што гэта дрэнна, хачу пераадолець сябе, але... не змога... Так і прыйдзецца застацца ў варожым вам лагеры... пакуль ён ёсць... а там... З вамі пайсці не магу, не пускае «тое нешта»...

У часе яе гаворкі Гуторскі ўважна разглядаў яе твар, і яго здзівіла тая шчырасць, з якой яна гаварыла. Відаць, доўга яна думала аб гэтым, доўга змагалася сама з сабой, пакуль прыйшла к гэтаму выразнаму, цвёрдаму перакананню.

І Гуторскі міжвольна праніпаўся павагай да яе. Яму падабалася гэткая самасвядомасць, гэткі аналіз самой сябе. А разам з павагай расло пачуццё сімпатыі, якое ў гэты момант знішчала ўсякую варожасць, адсоўвала некуды на задні план класавыя інстынкты.

Яму было шкада гэтае ніклае кветкі, гэтага хваравітага адсклёпку старога ладу. Яму захацелася суцешыць яе, заспакоіць, але не было слоў. Хацелася проста падысці да яе, прытуліць, прыгалубіць.

І яна чула спагаду. Апавядала яму, як лепшаму прыяцелю, раскрывала душу, вылівала набалелае...

— Я доўга думала, мучылася, усё хацела вызначыць — што я, навошта я... Я думала раней, што можна яшчэ знайсці сабе месца, можна далучыцца да новага... Згарнуць з сябе ўсё старое: старыя прывычкі, старыя нахілы, старыя імкненні... Я прабавала працаваць... служыла... настаўніцай была... падманіць хацела сама сябе. Дарма! Замест здавальнення — нейкае невыразнае пачуццё пустаты, адчаю... А потым — махнула рукой... Усё роўна... няхай будзе, што будзе!.. Хворая я да новага жыцця... адпетая... паіская костка... ха-ха-ха!..

Яна засмяялася горкім і разам задорным, гарэзлівым смехам.

Гуторскі маўчаў. Ён думаў аб долі гэтае дзяўчыны.

Адпетая... Хворая... Пяўжо яна аджыла ўжо сваё? У самым красаванні жыцця... Поўная фізічных сіл... поўная красы, хараства... Ці ўзяла яна хоць сваё ад жыцця? Ці ўсміхнулася яно ёй сваёй чароўнай усмешкай?

— Ніна Васільеўна! Ці любілі вы каго?.. Праўдзівым, поўным каханнем?..

Яна раптам змянілася.

— Не... не скажу вам гэтага... Не магу... Пасля, можа, самі ўзнаеце... Не, не скажу...

Яна неяк увабралася ў сябе, затулілася, быццам баялася, каб не сказаць лішняга. Ад ранейшага шчырага, сяброўскага настрою не асталося і следу. Яна зноў абярнулася ў тую заўзятую паненку, якую Гуторскі спаткаў у купрыянаўскім палацы.

Гуторскі каяўся, злаваў на сябе за тое, што задаў ёй гэтае далікатнае пытанне. Ён спрабаваў зноў выклікаць яе на інтымнасць, але не ўдавалася. Яна на ўсё адказвала кароткімі сухімі заўвагамі. Потым успомніла пра бацьку — зарупілася йсці. Ужо выходзячы, спыталася, што яе бацьку чакае.

— Скажыце праўду, не тоячы... Самае горшае... што?..

Гуторскі зірнуў на яе.

«Ці сказаць праўду, ці не?.. Трэба сказаць... Яна вытрымае ўсё...»

— Самае горшае, вы кажаце? Баюся, каб не была гэта вышэйшая кара...

Ён, сам таго не прыкмячаючы, перайшоў па рэзкі, афіцыйны тон. Нават злосць у ім чувалася.

Яна збялела, зірпула недалужным, спалоханым поглядам.

— Расстрэл?!

Але ўраз схамянулася, насупілася, бліснула з-пад чорных густых броў поглядам загнанага ўпартага звярка.

— Дзякую! — прагаварыла грубаватым, узрушаным голасам.

І выйшла...

7

Заруба зноў аб'явіўся. З новай, яшчэ вялікшай, яшчэ больш адчайнай бандай ён рабіў нечуваныя, страшэнныя па сваёй лютасці гвалты. Ён не разбіраў, хто з'яўляецца ахвярай яго злачынства. У адполькавай мерцы цярпелі яго крывавыя здзекі і камуністы, і яўрэі, і сяляне. Быццам

мсціўся ён за страту сваіх сяброкоў, быццам хацеў захлынуцца ў крыві.

І купрыянаўская практыка навучыла яго асцярожнасці. Як д'ябал, выкручваўся ён з-пад рук улады. Ніхто ніколі не знаў, дзе ён знаходзіцца. Сягоння паявіцца ў адным месцы, а назаўтра ўжо ў другім канцы павета грыміць яго разбойства.

Спалох ахапіў жыхарства павета.

Сярод цёмных сялян пайшлі розныя недарэчныя чуткі. Апавядалі пра розныя цудоўныя праявы, пра тое, як Заруба можа з'яўляцца адразу ў колькіх месцах, пра тое, як ён можа сярод людзей, на ўсіхніх вачах раптам знікнуць, бы праваліцца скрозь зямлю і г. д. Пачыналі лічыць яго нейкім надзвычайным стварэннем і баяліся аднаго яго імя...

Чака ўзрушылася, узнялася на ногі. Па ўсіх кутках павета былі разасланы агенты, узяты над нагляд усе непадзейныя асобы. Матрос з сваім атрадам безупынку лётаў па вёсках, сам Гуторскі таксама рэдка калі стыкаўся ў горадзе... Але ўсё дарэмна. Заруба рабіў сваю крывавую справу і аставаўся беспакараным. Як страшэнная здань, з'яўляўся ён нечакана, раптам у якой-небудзь вёсцы, рабаваў яе, катаваў сялян і знікаў невядома куды. Ніхто не мог нават на яго след натрапіць.

Гуторскі не чуў сябе ад клапот. Бясконцыя нарады, пасяджэнні разы два на тыдзень, а то і часцей, выезды ў павет, розная бягучая работа,— усё гэта не давала яму і часінкі адхлыну.

У гэтай сумятні ён нават пазбыўся таго неспакойнага, турботнага пачуцця, якое гняло яго ў апошнія часы і якое было звязана з асобай Ніны Купрыянавай. Калі часам і ўспамінаў яе, дык яна выдавала чымсьці далёкім і малазначным. Гэта яго радавала, заспакойвала. Ён ужо пачынаў глядзець на ўсю гэтую гісторыю як на невялічкае, неглыбокае захапленне, якое так шпарка мінулася, як і пачалося.

Але неўзабаве яму прыйшлося пераканацца, што ён памыліўся.

Нешта аднаго разу трапілася яму праязджаць міма маёнтка Купрыянава. Ён яшчэ здалёк угледзеў густыя ліпавыя прысады, і сэрца яго закалацілася. Як наяве паўстала ўсё, што калісь тутака адбывалася, і ў вачах выразна, яскрава замітусіўся вобраз Ніны...

Ды такі любы, прыгожы, дарагі, быццам вобраз самага

блізкага чалавека... Убачыць яе, зараз жа, незабаўпа, убачыць — што б там ні было!..

І цяпер, наадварот, усё тое — работа, клопаты — здаваліся далёкімі, малазначнымі...

А тут — галоўнае... тут — усё!.. Тут тое, без чаго жыць нельга...

Тут — каханне...

Гуторскі сам злякаўся гэтага слова, як знецікі мільганула яно ў думках. Знедкуль з глыбі загаварыў ціхі, перасцерагаючы голас, але Гуторскі ўжо не слухаў яго.

— Ну што ж там! Любоў мае сваё асабістае права. Любоў не разбірае: ці вораг, ці прыяцель... япа бачыць толькі жанчыну, толькі яе жапочае харaство... І хіба не можа пралетарый любіць буржуйку? Хіба яму можа хто ці што забараніць гэта? Хіба на каханне можпа, як і на ўсё, глядзець выключпа з класавага погляду? Прэч забабоны!..

І Гуторскі звярнуў у прысады.

З таго канца прысад пасоўвалася насустрэч белая пляма. Сэрца падказала яму, што гэта яна... І не памылілася...

Але, як стрэўся, ледзь пазнаў — так змянілася яна. Схудзела, счарнела, вочы праваліліся глыбока-глыбока, глядзяць стуль неяк дзіўна-напружана, гараць ліхаманкавым аганьком і быццам шукаюць чагось.

Як убачыла Гуторскага, схамянулася, нібы ўзрадавалася. Усміхнулася хваравітай, але ветлай усмешкаї, пайшла шыбчэй яму насустрэчу.

Гуторскі злез з каня і падышоў да яе. Яго агарнуў глыбокі жаль...

— Што гэта з вамі, Ніпа Васільеўна? Вы хворая?

— Што, дужа змянілася? Я знаю... Не, гэта не ад хваробы...

Яна падала яму руку. Гуторскі ў першы раз пасля дзесяці год расстання паціснуў яе малепькую кволую ручку. І гэты поціск разбурыў дашчэнту тую сцяну, што стаяла між іх, замацаваў іх сяброўскую блізкасць.

Яны пайшлі па дарозе.

— Ну, дык усё-ткі што з вамі, а? Кажыце ўсё, не хавайце... як раней...

Ён глядзеў на яе з пяшчотаї, устурбаваны, чакаў яе адказу. А яна ўпялася сваім поглядам удалеч і маўчала, быццам не прыкмячала ні яго, ні ўсяго, што навокал, углыбілася ў свае патаемныя думкі...

— Павел Мікалаевіч! — раптам адазвалася япа, і па голасу відаць было, што яна хоча сказаць яму нешта важ-

нае, тое, што займае ўсю яе істоту.— Скажыце мне, да якіх меж павінна распасціраца кроўнае пачуццё?.. Ну, напрыклад, любоў бацькоў да дзяцей або наадварот? Скажыце, як вы на гэта гледзіцё?.. Не вы асабіста, а ўсе вы, ваша партыя?..

— Я не зусім разумею ваша пытанне... Мне здаецца, што наогул ніякае пачуццё не паддаецца мерцы. У аднаго яно мацней, у другога — слабей...

— Але як павінна быць?.. Ну... я не ведаю, як вам лепей сказаць... Вось падумаем так: вам прыйшлося б выбіраць з двух адно: або страціць бацьку, або адмовіцца ад вашае справы... Што б вы выбралі?

Гуторскі злёгку ўсміхнуўся.

— Вы, Ніна Васільеўна, дрэнны прыклад узялі. Я ўжо больш пяцёх год не бачыўся з бацькамі, і калі й было ва мне раней якое сыновае пачуццё, дык цяпер яго няма й званпя... Я б, вядома, не задумаўся...

Яна здзіўлена зірнула на яго.

— Так?

Трохі змаўчала і потым пачала з лёгкім абурэннем, нібы са злосцю:

— Ну, возьмем другі прыклад... Возьмем мяне. Неўзабаве вы расстраляеце майго бацьку...

— Гэта яшчэ невядома...

— Ды не... Не ўздумайце суцяшаць мяне, я не дзіцёнак. Так... І вось у мяне раптам з'явілася б магчымасць ратаваць яго. Але для гэтага я павінна была б аддаць тое, што для мяне самае дарагое, даражэй за ўсё, мо даражэй за жыццё... Што б вы зрабілі на маім месцы?

— Я? Выбраў бы, што даражэй...

— Што даражэй...

Яна трохі падумала.

— Не, не так... Гэта несправядліва, несумленна... Гэта занадта эгаістычна... Даражэй... Мала што даражэй, але ёсць яшчэ доўг, абавязак...

І яна зноў задумалася. А Гуторскі глядзеў на яе і нічога не разумеў. Дзеля чаго яна так захапілася гэтым пытаннем? Няўжо і сапраўды яна што мае на ўвазе да вызвалення бацькі? Але што? Самае дарагое... Мо даражэй за жыццё... Дзіўна...

— Ну, ладна! — раптам схамянулася Ніна.— Кіньма аб гэтым. Пагаворым аб чым-небудзь другім... Вы што, зноў прыехалі вобыск рабіць? А?.. Ці мо мяне ўжо масце заарыштаваць? Браўшінг жа ў мяне знайшлі!.. Ха-ха-ха!..

Гуторскаму стала трохі не па сабе. Ён не знаў, што адказаць, бо й сам не ведаў, чаго паехаў... Пацягнула пешта, дый годзе. І ён памкнуўся адказаць жартам:

— Той раз я прыязджаў як вораг, а цяпер ехаў мі-ма — дай, думаю, заедуся проста так, як падарожны. А што да вас, можаце не турбавацца: мы кабет заарыш-тоўваем толькі ў асаблівых выпадках, дый то самых злосных...

— А хіба я не злосная? Вы пэўны ў гэтым? А мо я зусім бандытка? Вы пра гэта не думалі? Ай думалі, што я на гэта не здольна?..

Яна глядзела проста яму ў твар задорна-гуллівым, гарэзлівым поглядам, поўная нейкай хваравітай, нервовай весялосці...

— Ну, зірніце на мяне: ці падобна я на бандытку? Ці такія бываюць бандыткі, а?..

Яна выпрасталася перад ім ва ўвесь рост, зграбная, дзіўна-прыгожая, з бліскучымі, ззяючымі спакусай вачмі.

Гуторскі загарэўся шалёнай страсцю, ад якой памуцілася ў галаве. Схапіць яе, сціснуць моцна-моцна, да болю, цалаваць... цалаваць без канца гэтыя гордыя, задорна-ўсмешлівыя вусны, гэтыя вочкі — бяздонныя, прамяністыя!

Ён акідаў яе ўсю палкім, агнёвым поглядам. Яшчэ момант, і кінуўся б да яе, агорнуты страсным каханнем...

Але яна схамянулася. Пэўна, прачытала ў яго вачах усё, чым кіпела яго путро, і спалохалася. Ураз папікла, адвярнулася, загаварыла шыбка-шыбка:

— Ай, гэта ж мы на шлях ужо выйшлі... Вы што, у горад едзеце?.. А можа, заедзеце да нас?... Клуб пагледзіцё... Мы ж ужо не жывём у палацы, клуб там адчынілі...

— Некалі, трэба спяшацца,— сказаў Гуторскі і сам здзівіўся сваймў голасу, бо ён быў нейкі грубы, дрыжачы.— Бывайце здаровы!..

Яна яго затрымала.

— Павел Мікалаевіч! У мяне просьба ёсць да вас... невялічкая... Ці можаце вы мне паведаміць, як вырашыцца лёс майго бацькі, так, каб я... паспела...

— Добра, а дзе вы будзеце, тут?

— Магчыма, што тут, а можа, у горадзе, у цёткі... Саветская, 18.

— Добра, я вам абяцаю гэта... Бывайце!

Ён ускочыў на капя і шыбка, не абарачваючыся, паехаў у бок горада.

Купрыянава прысудзілі к расстрэлу. У тоі самы дзень Гуторскі паведаміў Ніну.

Яна была ў горадзе і зараз жа прыйшла к яму. Прыйшла ўзрушаная, абураная. Не папытаўшы дазволу, убегла ў кабінет і загаварыла дрыжачым ад абурэння голасам:

— Ужо? Капчаткова?

— Так.

— Слухайце, Павел Мікалаевіч, вы можаце спыніць гэта, затрымаць хаця на які час?..

— А што?

— Павел Мікалаевіч! Я буду гаварыць з вамі адкрыта... Спадзяюся, што калі ў пас нічога не выйдзе, дык усё гэта астанецца толькі між нас... Вы мне можаце абяцаць гэта?

— Кажыце...

— У мяне ёсць прапанова, якая можа здаволіць і вас, і мяне... Вам жа мой бацька цяпер не страшны, вы добра ведаеце, таксама, як і я, як і ён сам, што з яго боку, нават калі б ён і вольны быў, нельга чакаць цяпер якой-колечы контррэвалюцыі... Бо ён занадта палахлівы для гэтага... Раз паспытаўшы горкага, ён не захоча яго... І вось... я вам дам выкуп за яго... Я дам у вашыя рукі чалавека, які для вас у тысячу разоў страшнейшы... Я вам дам Зарубу...

Гуторскі асалапеў ад нечаканасці. Яму адразу здалася дзікай, недарэчнай прапанова Ніны. Потым ён успомніў яе словы: аддаць тое, што даражэй за ўсё, мо даражэй за жыццё...

Быццам маланка працяла розум. Усё асвятлілася, усё стала зразумела...

Дык во тое дарагое, чым яна спадзявалася ратаваць бацьку! Во чаго яна мучылася, во што заімала ўсю яе істоту! Во чаго яна так змянілася!..

Значыцца, падумала, адважылася аддаць сваіго любага ў ахвяру, каб ратаваць бацьку.

Ніна з нецярплівасцю чакала адказу. Каб прыгледзеўся да яе Гуторскі, ён бы ўбачыў, як калацілася яна ўся, як высока ўздымаліся яе грудзі.

Але ён не глядзеў, ён баяўся на яе зірнуць, каб не выказаць сваіго настрою, бо ён адчуваў, як унутры ў яго расце прыкрае, агіднае, але моцнае пачуццё, якое завецца рэўнасцю...

Дык во хто яе выбранец!.. Во каму яна падаравала

сваё пачуццё, сваю ласку! Во хто ёй даражэй за ўсё па свеце!..

— Добра,— адказаў ён, не гледзячы на яе,— я пастараюся гэта ўладзіць. Адзін я не магу гэтага зрабіць, не важуся... Трэба парадзіцца... Але спадзяюся, што прапанова ваша будзе прынята... А вы пэўны ў тым, што гэта вам удасца? Хопіць у вас спрыту і... сілы волі?..

— Я адважылася... Зраблю...

— Вы дзе будзеце гэтымі часамі?

— Тут, у горадзе...

Ён больш нічога не гаварыў. Чакаў, каб пайшла, хацеў гэтага. Хацеў астацца адзін, прывесці да ладу свае думкі, пачуцці.

А яна марудзіла.

Ён узяўся за паперы, зрабіў від, што некалі... Яна асцярожна, нясмела спыталася:

— А што з ім будзе?

Быццам яшчэ спадзявалася на нешта...

— Самае горшае.

Яна пайшла.

Гуторскі, узрушаны, пачаў хадзіць узад і ўперад па пакоі. Кіпеў непамернай злосцю. І сумысля распальваў сябе, стараўся абярнуць сваю злосць на яе... Хацеў ненавідзець яе, хацеў вярнуць даўпейшую варожасць...

Але дарма. Таго ненавідзеў, як можа толькі ненавідзець закаханы мужчына шчаслівага пераспешніка... А яе — любіў. Кахаў моцным, палкім каханнем. Цяпер яшчэ больш, як даведаўся, што яна належыць другому...

Ён доўга хадзіў па пакоі, доўга думаў, змагаўся з сабоій. Да яго прыходзілі, ён адказваў па пытанні, даваў загады і не прыкмячаў гэтага. Рабіў неяк махінальна, не думаючы.

Потым успомніў, што трэба спяшацца; трэба ўзяцца за выкананне таго, што абяцаў Ніне і чаго цяпер у глыбі душы жадаў сам.

Ён таго часу склікаў патрэбных асоб і на патаемнай парадзе выклаў сутнасць справы. Ён упарта даводзіў, што неабходна прыняць прапанову, што гэтага патрабуе момант. Даводзячы другім, ён і сабе даводзіў, бо ў глыбі душы і сам не быў перакананы ў пільнаій неабходнасці гэтага, стараўся падманіць сябе, бо баяўся сазнацца, што нешта іншае, апрача інтарэсаў справы, кіруе ім у гэтую часіну.

Прапапова была прынята, і выкапаппе прысуду пад Купрыянавым затрымаша.

А на другі дзень Гуторскі запрасіў да сябе Ніну і Матроса.

Матрос прыйшоў, як ужо Ніна сядзела ў кабінеце. Ён увайшоў хмуры, папуры. Знаў ужо ўсё і быў недавольны. Як убачыў Ніну, яшчэ больш насупіўся, пастаражыўся. Моўчкі сеў воддаль на крэсла.

Гуторскаму таксама не па сабе было. Ён адчуваў нейкую нялоўкасць, пейкі цяжар. Прыкра было пачынаць гутарку.

Але пачала Ніна:

— Ну, давайце згаворымся!..

Гуторскі кінуў у бок Матроса пытлівы погляд.

— Ты возьмеш на сябе гэту справу?

— Я заўсёды свае абавязкі спаўняю.

Адказаў груба, недавольна.

— Назначце час і месца! — звярнуўся Гуторскі да Ніны.

Тая падумала.

— У пятніцу а дзесятай гадзіне ўвечары... У Купрыянава, у флігелі... Дзверы будуць адчынены...

— Усё роўна! — прабурчэў Матрос.

— Усё?

Ніна ўзпялася з крэсла. Гуторскі зірнуў на яе... Дзяржыць сябе проста, спакойна, быццам абгаварвае якую звычайную дробную справу. А там, унутры, пэўпа, мора бушуе!

— Здаецца, усё,— адказаў ёй.

— Мпе больш пе трэба?

— Блізка што...

— Бывайце!

— Усяго добрага!..

Як яна выйшла, Матрос з запалам накінуўся на Гуторскага:

— Слухай, даражэнькі, што гэта табе завадзіла? Няўжо пяможна б было абысціся без гэтае здрады? Не люблю я гэтага, не хачу... Хіба ў нас сілы не хапае самім славіць яго?

— Супакойся, галубок! У цябе проста гаворыць запал заўзятага ваякі... А трэба глядзець на рэчы іпшымі вачмі. Тыдзень чакання пагражае дзесяткамі ліпніх ахвяр. Трэба мець на ўвазе агульную справу, а не глядзець толькі з свайёй званіцы...

— Ды не магу я іпачаіі глядзець, патура пе дазваляе...

Гуторскаму ледзь удалося ўгаманіць яго. Дыі то ўсё бурчэў:

— Толькі на след узбіўся... Зарупіла... Яшчэ які тыдзень і злавіў бы. Не трэба б было і бабскае дапамогі.

— Адкуль гэта ў яе спрыт такі? — урэшце зацікавіўся ён.— Як яна яго заманіць? Што, яна з ім у хаўрусе?..

Ён і не ведаў, што кранае балючае для Гуторскага пытанпе...

— Кахаюцца,— адказаў тоі.

— А... Іш ты, знюхаліся... Знайшоў своі свайго... Але ж то, за бацьку аддаваць любага, хм... Прыгожая яна, ліха на яе... Кветка, а не пашенка...

Гуторскаму было прыкра слухаць яго развагі, і ён парупіўся змяніць гутарку:

— Ладна! Давай лепей памяркуемся, як спрытней гэта абляпаць.

— Давай памяркуемся!..

9

Гуторскі чакаў Матроса. У нецярплівасці хадзіў узад і ўперад па кватэры, не знаходзіў сабе месца.

У галаве думкі мітусіліся, вострыя, калючыя. Мітусіліся, блыталіся, круціліся шалёным карагодам. Аж балюча было ад іх галаве.

Усё цела ахінулася нейкай прыкрай зморай. Балела ўсё, быццам пасля цяжкай працы. У знямозе ён садзіўся, валіўся ў крэсла, але зараз жа мусіў узняцца пад уплывам нейкай сударгавай, хваравітаі энергіі. Не мог адпачыць, не давала нешта, і змораны, змардаваны ўсё хадзіў па пакоі.

— Нервы расхадзіліся. Што тут рабіць? Хіба легчы?..

Ён лёг на ложак, заплюшчыў вочы. Акупуўся ў прыемнае пачуццё спакою, нерухомасці. Думаў — засне...

Аж не... Штось пачало паволі ўздымацца з сярэдзіны, нейкая прыкрая хваля. Гоўтаецца, узмываецца ўсё вышэй, усё шырэй. І закупаліся ў ёй нейкія здані, нейкія страшыдлы. Растуць, крывяцца, выцягваюцца ў нейкія пакручастыя пасы, круцяцца, скачуць, рагочуць, ззяюць абрыдай. У галаве ад іх муціцца, атрутны туман расплываецца, хоча спавіць, затуліць, задушыць...

Страшна!..

Ён з патугай расплюшчыў вочы. Азірпуўся. Рэжа вочы яркі свет электрычнасці.

— Можа, ад свету? Пагасіць?..

Устаў, пакруціў кнопку. Стала цёмна.

Ён зірнуў у акно. Ноч чорная, такая, як тады... Хоць вока выкалі...

Лёг зноў. Зноў тое самае... А вочы расплюшчыў — замігацелі ў цемры дробненькія-дробненькія агеньчыкі-іскрачкі, быццам пакой напоўніўся гарачым прыскам.

— Не, нічога не выйдзе...

Зноў запаліў святло. Зірнуў на гадзіннік... Дванаццаць... Яшчэ гадзіны дзве або тры... Як марудна паўзе час!..

Сеў да стала, узяў нейкую кніжку.

— «Палітычная эканомія».

Адкінуў з агідай. Абрыдла, абрыдла ўсё!..

Што ж рабіць? Нават думаць — і то пяможна. Усё блытаецца.

Папрабаваў уявіць сабе Ніну, яе твар, яе постаць — не можа... Замест твару — пляма адна расплыўчастая, постаць карожыцца ў нейкіх страшэнных, агідных формах... Поплеч Матрос — тож адна пляма...

Выразней за ўсіх Заруба прадстаўляецца, хоць і не бачыў ніколі... Высокі, зграбны, прыгожы... На твары — адвага, рызыка. А вочы гарэць каханнем... да тае, да Ніны... да яго Ніны.

І ў сэрцы Гуторскага родзіцца зайздрасць. Зайздрасць і зларадпасць. Ён святкуе пабеду... Ці тое, не ён, а той, хто заўладаў ім зусім, абязволіў яго... Святкуе пачуццё...

— А раптам ды...

Ён неяк не думаў дагэтуль, што, можа, не ўдасца, не выйдзе нічога. А цяпер магчымасць гэтага паўстала перад ім ярка, выразна...

Матрос упёрся, удваіх паехаў. Больш нізашто не захацеў людзей браць. А ці мала што можа здарыцца?..

— А тады што?

Мсціць будзе, ёй будзе мсціць...

А мо яна перадумала, здрадзіла? Можа, не сабрала сілы аддаць свайго каханага?..

Гуторскага ахапіла трывога. У падвоіным абурэнні зноў засігаў па накоі.

А час ішоў ціха, марудна, быццам наўмысля хацеў мучыць, выцягваць жылы. І з кожнай часінай расла нецярплівасць.

Ужо а трэцяй гадзіне прарэзліва зазвінеў званок.

Гуторскі схапянуўся, закалаціласа сэрца. Паїшоў адчыніць.

Матрос... Уваліўся — змораны, пакомчаны, увесь у пылу. Рынуўся ў крэсла.

— Ну?..

Гуторскі застыгнуў у папружаным да болю чаканні.

— Прывёз... Здаў начальніку варты...

Гуторскі ўздыхнуў з палёгкай. Знікла папружанасць, замест яе слабасць, млявасць расплылася па целе. Аслабелы апусціўся на крэсла.

— Апавядай!

— Есці хачу...

— Самавар наладзіць?

— Ага...

Гуторскі выйшаў, узбудзіў гаспадыню. Як вярнуўся, Матрос сядзеў у тоїй самай постаці, нерухомы. Відаць, усе сілы патраціў. Гуторскі не турбаваў яго, чакаў, пакуль сам пачне.

— Бінт ёсць? — спытаўся тоїй.

— Ранены?

— Нажом пырнуў... Перавязаў, але, мусіць, дрэнна... Баліць...

Гуторскі дастаў у гаспадыні марлі.

Матрос быў ранены ў плячо. Рана досыць глыбокая, але не апасная. Гуторскі, як умеў, перавязаў яе.

Тым часам падалі самавар. Матрос — тоўсты, расхрыстаны — раскапусціўся за сталом.

— Давай усё, што ёсць... Калі дасі вала — і вала з'ем...

Сказаў гэта ён такім сур'ёзным, нават сярдзітым тонам, што Гуторскі не стрымаўся ад смеху. Паїшоў шукаць яды. А Матрос бурчэў яму ўслед:

— Смех... Каму смех, а каму галэхтар... Во так бы змардаваўся сам, дык не вала, а вярблюда б сажраў...

За гарбатаї Матрос павесялеў, разгаманіўся.

— Ну, паехаў я, значыцца. Не хацелася, ты ж сам ведаеш. Ніякаї ахвоты, проста спаўняю абавязак, дыї годзе... Непрыемны абавязак, трэба дадаць... Прыехалі туды, коні ля шляху ў хмызняку паставілі, самі кругам абышлі. Падышлі к палацу. Я ж, знаеш, і забыўся зусім на флігель па тоїї... І сяджу ля дому... чакаю... гляджу па гадзіннік, лічу часінкі. Даждаўся дзесяцёх — раз у дом... Пуста... Бадаї цябе расперазала! Пуста... Сцены павыламаны ў сяродку... Што за праява, думаю... Дзе ж гэта ўсё падзелася?

Добра, што хаця сцэна там ужо паладжана, на ёй толькі й сцяміў, што выселілі іх. Тады й пра флігель гэты ўспомніў, цямся ён зусім!.. Ну — у флігель. Дзверы расчынены... Адзін пакой, другі... Адчыняю дзверы ў трэці, аж яны там... сядзяць удваёчку, галубяцца... Гляджу — воддаль па стале пісталет. Я, не доўга думаючы,— скакель ды за яго... Ну, тут, знаеш, спалох такі, паніка...

Яна ўсхапілася, закалацілася ўся, кідаецца туды, сюды, месца не знаходзіць... Як жару хапіла... І ён ускочыў... Разлютаваўся, вочы гараць, ноздры раздуваюцца — звер зверам... Я на яго наган.— Ні з месца, крычу.— Але ён не з такіх, не спалохаўся.— Усё роўна памірацъ!.. Крыкнуў, схапіў са стала нож і — на мяне. Я не страляў... Вось ён і парпуў мяне... Ну, я, вядома, раззлаваўся... Кінуў наган на падлогу, ды за яго, урукапашную... Схапіў за руку, ціскануў трохі, ён і пож выпусціў... Ну, боркаліся трохі... Скомчыў я яго... Грышка тут падаспеў — скруцілі...

Матрос сціх, узяўся за гарбату.

У пакоі павісла згодная ціша. Толькі маўклівае сёрбанне Матроса ды ласкавы подсвіст самавара парушалі яе мяккую цягучасць.

Гуторскі аддаўся ціхай задуме. Ён уяўляў сабе, як наяве, усё тое, аб чым апавядаў Матрос. Ён бачыў яе — узрушаную, непрытомную, з паламанай душой, з разбітым сэрцам. Хацеў пачуць што пра яе, але баяўся спытацца.

— Ну, а далей што?

— Што далей? Павялі... Яна ўсё кідалася да яго... Любы, дарагі, сопейка маё! Гэта я здрадзіла, я прадала цябе... Аж шкада было глядзець на яе...

— А ён?

— Ён таксама рваўся да яе. Скрыгаў зубамі, лаяўся. Каб дапусцілі — згрыз бы...— Не дарую, кажа. На тым свеце спаткаемся — і то памстуюся!..

Матрос трохі памаўчаў.

— Шкадаваў я яе... Гэткі адчай, гэткая пакута! І ўсё за бацьку... Няварты ён гэтага... Дурная... Застрэлілі б — туды і дарога...

Гуторскі ўсміхнуўся.

— А ён больш варты?

— Ну, мала што...

Абодва заціхлі, углыблёпыя кожны ў свае думкі...

Купрыянава выпусцілі, а Зарубу цераз тыдзень судзілі палявым судом і расстралялі.

Ніна жыла ў горадзе, і Гуторскі з ёй часта бачыўся. Яна з ім сустракалася ахвотна. Траплялася, што яны падоўгу сядзелі ўдваіх дзе-небудзь у далёкім кутку гарадскога саду і гутарылі.

Яна заўсёды была сумная, маркотная, як восень. Звычайна сядзела нерухома, упяўшы ў адну кропку свой пануры заледзянелы погляд.

Ён гаварыў, многа гаварыў аб жыцці, аб месцы ў ім чалавека, аб яго патрэбах, павіннасцях... Гаварыў і глядзеў на яе, любаваўся яе сумным, паніклівым хараством.

А яна — невядома: ці слухала яго, ці не... Маўчала, быццам укалыханая гукамі яго голасу. Як сціхаў, тады нібы прачыналася, усхаплівалася, гаварыла колькі слоў, узбівала яго на гутарку. І тады зноў маўчала... Слухала ці мо думала сваю бесканцовую патаемную думку.

Гуторскі даражыў гэтымі часінамі. Ён заўсёды марыў аб іх, шукаў іх і, калі доўга не бачыў Ніны, тужыў, нудзіўся, не знаў, куды дзецца. Работа абрыдла яму. Рабіў сваё дзела нядбала, няўважна. Не было даўнейшага запалу, даўнейшай энергіі. Усе дзівіліся і не·зналі, што з ім за змена такая.

Знаў адзін Матрос. Таму толькі прызнаўся, адкрыў сваю душу.

Матрос, як выслухаў яго, паківаў задумонпа галавой.

— Кепска, што і казаць... Не тое кепска, што ты закахаўся, а тое, што насур'ёз... Каб гэта так злёгка, неглыбока... Ну, тады глупства... пагуляў дый кінуў... А то... усё роўна нічога ў вас не выйдзе. Не пара вы... А перарабіць яе ты не здолееш, позна ўжо... Канчаць табе трэба, во што... Бо... цягнуць так... мякчыць яно, слабіць чалавека...

Гуторскі нічога не адказаў на яго словы. Ён і сам знаў тое, што гаварыў Матрос. Даўно знаў, тысячу разоў перадумаў, перамучыў у сваёй душы. О, ён добра знаў гэта, знаў, што нічога не будзе. І ўсё-ткі цягнуў. Сіл не ставала...

Адпаго разу ён падумаў пагаварыць з ёй, сказаць ёй усё.

Гэта было ўжо ўвосень. У парку, дзе сядзелі яны, ужо жоўтым дажджом сыпаліся з дрэў лісты, дыванам засціла-

лі чорную згалелую зямлю. У паветры дрыгацеў сум адцвітання, сум надыходзячай смерці...

Гуторскі глядзеў на Ніну і бачыў у яе вачах адбітак гэтага суму, нібы частку яго, таго, што жоўтай маркотаі спавіў усю прыроду. Частку асеняга глыбокага суму.

Яна была падобна да восені ў сваім смутным, паніклівым харастве. Быццам і яна, як тая прырода, дажывае свае апошнія дні, чакае смерці.

Гуторскаму было шкада яе. Ён пачаў гаварыць неяк раптам, нечакана для самога сябе, пад уплывам ускалануўшага душу непамернага жалю, пяшчоты.

— Ніна Васільеўна! Ці ведаеце, што я люблю вас?

Яна ўсміхнулася, зірнула ветла-ласкава.

— Ведаю, Павел Мікалаевіч!..

— А што вы скажаце на гэта?

— Вы хочаце знаць, ці люблю я вас?.. Я скажу вам. Не, не люблю... Можа, і люблю, ды не так, не такою любоўю, як вы мяне... Я так, як тады... як дзесяць год назад... Вы для мяне друг... Мне з вамі добра, лёгка так... А любіць? Не, я ўжо не палюблю нікога...

Яна замаўчала, углыбілася ў думкі.

— Ніна Васільеўна! — зноў звярнуўся да яе Гуторскі.

— Ну?

— Ці будзеце вы маёй жонкай?

Яна схапянулася, у вачах бліснула цвёрдая рашымасць.

— Не, не... ніколі...

— Чаму?

— Нічога не выйдзе з гэтага. Толькі папсуём жыццё адзін адпаму, згубім сябе... Мы — ворагі... Гэта часовае ўсё... І ваша, і маё... А тое праявіцца, праявіцца ў жыцці... наша варожасць... Ладу не можа быць, мы — розныя людзі. У мяне адны нахілы, а ў вас — другія, у мяне адна ўрода, у вас — другая... Неразумна і думаць пра гэта... Я не магу перавярнуцца, стаць падобпаі да вас, таксама, як вы... ды што я, стаць такоі, як я, гэта ж значыць кончыць самагубствам!..

Яна ўсміхнулася.

— А потым... яшчэ...

Яна раптам стала сур'ёзпаі і быццам змагалася з сабой — сказаць ці не?..

— Яшчэ ёсць прычына... Я вам усё скажу як другу... Пасля гэтага вы назаўсёды пакінеце гэту сваю думку...

Яна спынілася. Гуторскі з трывогаї і пецярплівасцю чакаў, што скажа далей.

— Я звязана, Павел Мікалаевіч... звязана назаўсёды... з тым, каго вы забілі... Моцнымі путамі звязана... у мяне... будзе дзіцянё...

Гуторскаму як пяруном ударыла. Усяго ён чакаў, толькі не гэтага...

— Вы гэтага не чакалі? — гаварыла яна.— Але гэта так... Гэта праўда... Ну, во... спадзяюся, што ў нас з вамі не будзе больш ніколі гаворкі аб тым... Дый што вы, Павел Мікалаевіч! У вас жыццё папярадзе — поўнае, цэлае, незламанае. У вас ёсць чым і дзеля чаго жыць... для вас ёсць месца, пачэснае месца ў жыцці... А я... я ўжо нябожчыца... Жывая нябожчыца... Паспрабую яшчэ маткаї быць, можа, тут знайду сабе месца, можа, здаволюся хоць на часінку... А калі не... тады...

Гуторскі слухаў яе, абураны глыбокім жалем. Гэты жаль ахапіў яго ўсяго, зліў у сабе ўсе пачуцці... Каб ён мог, каб ён умеў ратаваць яе, пагадзіць яе з жорсткім жыццём! Гэтую любую, дарагую яму дзяўчыну!..

У той дзень яны доўга сядзелі, доўга гутарылі...

Разышліся добрымі прыяцелямі.

11

Гуторскі прыхінуўся плячмі к пераборцы, што дзеліць адно купэ ад другога, закінуў галаву і аддаўся ціхаї, салодкай нерухомасці. Мерна, аднастайна падрыгвае вагон. У такт гэтаму дрыжэнню самотна, жалобна дрынчыць у акне адбітае шкло.

У вагоне змрок. Усё шэрае, няяспае, расплыўчатае. Фігуры людзей — цёмныя плямы — нязграбна калышуцца, дзіўна, смешна трасуцца чорныя клубкі — галовы. Некаторыя гавораць, і, пакрытая глухім грукатам чыгункі, гутарка іх здаецца дзіўнаї, незразумелаї.

Гуторскага агортвае цягучая дрэма. Ён аддаецца ёй, заплюшчвае вочы. Але не засынае...

Мяккаї, згодпаї чарадоїі плывуць думкі, варушацца паціхеньку. Думкі-ўспаміны... Выглядае яна — смутная, прыгожая. Чуецца яе мілагучны шчыры голас...

— Бывайце здаровы... Не памінайце ліхам... Жывеце... па-свойму, па-новаму...

Шкада яе. Дужа шкада... Але нічога не парадзіш... Гэткі закон жыцця... бязлітасны закон... Усё старое вымя-

таецца, выкідаецца, як непатрэбнае смяццё. Расчышчаецца дарога новаму... Паўстае новае жыццё — здаровае, свежае, магутнае... Усміхаецца ядранай, прыгожай рунню... Прыйдзе час — і закрасуецца яно краскамі мнагацветнымі, апаўе зямельку дзіўным, казачным харaством!

Тады ўжо не будзе гэтых адсклёпкаў, гэтых пажоўклых лістоў старога, гнілога, забуранага навальніцай дрэва... Пацьмеюць, пагніюць, спарахнеюць, знікнуць, як дым над павевам свежага ветру...

Гуторскі давольны тым, што едзе — едзе ў новыя месцы, да новых людзей, да новых уражанняў... Яшчэ ў тую бяссонную, доўгую ноч, пасля тоі капчатковаі гутаркі з Нінаі, у яго склалася пастанова паехаць...

Усю ноч ён тады прадумаў. Раскалупваў сваё путро, рабіў пільны абгляд самога сябе. І тады ён зразумеў, што захварэў, што трэба лячыцца, пакуль не позна. Ён ясна вызначыў сваю хваробу, знаіпоў яе карані, яе прычыну.

Ён адарваўся ад народа, адышоў ад яго. Патраціў звязак з яго жыватворчай глебай. Яшчэ момант — і парвуцца астатнія карані, якія яшчэ засталіся, якія яшчэ хаця слаба, але прывязваюць да працоўнае глебы, надаюць яшчэ жыццёвыя сілы. Парвуцца яны — і тады...

Гуторскі аж жахнуўся, як падумаў быў пра гэта.

Тады — усё. Тады смерць... Тады — гэткая доля, як Ніны Купрыянавай,— доля пажоўклых, адарваных ад дрэва лістоў...

І ён схамянуўся, рашыў лячыцца, пакуль не позна, ад сваёй хваробы. Рашыў вярнуцца, зліцца з працоўным народам, набрацца сіл жыватворчых, замацаваць сваё права на новае жыццё.

І вось ён едзе — едзе ў Чырвоную Армію, у яе гушчыню, поўную невычэрпнага запасу жыццёвай энергіі. Там ён набярэцца сіл, узновіць парваную сувязь, зноў пусціць карані. Там ён зноў стане здаровы!

Чыгунка ляціць, нясе ўсё далей і далей... Злёгку падрыгвае цёмны вагон...

— Дзын! Дзын! Дзын! — жалобна звягае ў цемры пабітае шкло...

Гуторскага агортвае цягучая дрэма...

БАЦЬКАЎ СЫН

Увечары, як Сцёпка ўпарадкаваў скаціну і, зморапы дзённай працай, уваліўся ў сваю мізэрную хатку, маці сказала яму:

— Хоць бы ты, сынок, да таткі даведаўся, запёс яму што-колечы. Мо галадуе тамака ў лесе?

Гаварыла старая ціхім, прытоеным голасам, быццам баялася, каб хто не падслухаў. Сцёпка таксама ёй адказаў:

— Мамка! Змарыўся я, ног пад сабой не чую.

А ў думках мільгнула:

«Лес, петры... могільнік па дарозе... Страшна...»

Здрыгануўся міжвольна. А матка больш не настайвала. Уздыхнула цяжка, глыбока.

— Як сабе хочаш, сынок...

Колькі ціхай пакоры ў сумным матчыным голасе, колькі журбы невыводнай!.. Ах, нашто яна так, лепей бы сварылася, дык упяўся б, не пайшоў на наругу. А так — няма сілы, каб не пайсці. Хоць і страшна, хоць і жудасць хапае пры думцы адной...

І Сцёпка пайшоў. Адразу, нават не пачакаўшы вячэры, бо знаў, што, калі замарудзіць,— больш страху, жудасці набярэцца.

Сцёпка добра помніць тое месца. Там, дзе лес пераходзіць у багну, дзе пачынае пад нагамі слюпява цмякаць набраклы вільгаццю дол, там трэба шукаць маленькай вузенечкай сцежкі. Потым па ёй сярод куп'я, карчоў — валасатых страшыдлаў, паміж чорных лужын бяздонных, пакуль не адкрыецца ўзгорак, быццам нейкая выспа сярод багны-балота. Па ўзгорку направа, убок, да густога калматага хмызняку. Там спыніцца, ціханька свіснуць...

Сцёпку самае галоўнае — да лесу дабрацца. Там не так страшна, бо лес свой, лес не выдасць. У лесе кожнае дрэва знаёмае, кожная сцежачка. А вось пакуль да лесу... Вакол вёскі жандары польскія пікаюць, падсцерагаюць часам — крышка тады і бацьку й яму.

А страшней за ўсё — могілкі. Чаму так баіцца іх Сцёпка? Чаму такі жах нагаяюць яны сваімі старымі пакарожанымі бярэзінамі, сваімі крыжамі паніклымі? Не верыць Сцёпка ні ў чарцей, ні ў нябожчыкаў, ведае — глупства гэта адно, не ўстануць мерцвякі з могілак, не задушаць яго. А вось страшна нечага.

Бяжыць Сцёпка краем дарогі, прыгінаецца нізенька, вострымі вочкамі бяздонную цемру свідруе. Ззаду, здаецца, нехта паўзе, пасцігае. Вось хапае ўжо за полы доўгай сарочкі... Уцякаць?..

Не, гэта так, толькі здаецца. А пабегчы — тады прапаў, тады ўжо не адкараскаешся ад страху.

Наперадзе загараджвае дарогу цёмная пляма. Распаўзлася абапал дарогі, берагі свае ў цемры разбавіла, злілася з цемраі. Гэта — могілкі...

У Сцёпкі не сэрца ў грудзях, а жалезны клявец — гэтак стукае, б'ецца. Але йдзе, не спыняецца.

Чорная пляма разгарнулася ўшыркі, увабрала яго ў сваё путро. З бакоў заплавалі пяясныя цыбатыя цені крыжоў. Здаецца, пасуваюцца, набліжаюцца да дарогі.

А гэта што?.. Быццам нейкія крокі?.. Не, гэта ж сэрца так б'ецца. Глупства. Зараз канец, там поле, а далей і лес ужо.

Раптам паблізу хруснула нешта. Ірвануўся Сцёпка, у нагах нервовыя дрыжыкі... Але стрымаўся, заспакоіў сябе:

— Глупства. Мо птушка?

Наўмысля ход замарудзіў. Пайшоў, гледзячы проста перад сабой у кропку адну. Вось і канец. Лёгка ўздыхнуў, шпарчэй пасігаў па дарозе.

Лес раптам пасунуўся вялізнай хмураі грамадай. Як уваходзіў Сцёпка ў яго, пачуў сябе маленькім-маленькім, быццам казюлька якая. Але пасмялеў, бо хіба ж можа што стацца гэткаму маленькаму хлопчыку пад аховаі магутнага лесу-дзядулькі!

Ішоў па лесе вобмацкам. Натыкаўся на дрэвы і, міноючы, абымаў іх з нейкаі шчыраі дзіцячаі ласкаі.

Патаемную сцежку ўраз адшукаў, бо не злічыць нават, колькі разоў вымерыў ён сваімі маленькімі крокамі гэтую дзікую мясціну. Па сцежцы паціху паішоў, мацаў нагоі, каб не збіцца, бо троху ўбок — і капут, загрузнеш у багне. Доўга прыйшлося цягнуцца. Змора валіла з ног, да зямлі прыціскала. Але ішоў, не спыняўся.

Урэшце сцежка вільнула раптам убок, і Сцёпка пачуў над нагоі цвёрды, бяспечны грунт. Тут — наірава цяпер.

Пайшоў вольна, размашыста, нават галаву задраў угару. Цяпер ён не баіцца. Ані крушыначкі! Чаго ж яму баяцца, калі тут — колькі крокаў — і свае людзі: бацька, хлопцы вясковыя... А як бацька ўзрадуецца!

Вось і хмызняк. Сцёпка спыніўся. Перавёў дух, каб ямчэй было свіснуць, бо гэта ж самае цікавае. Вось толькі як: ці ў прыгоршчы, ці ў два пальцы? Лепш у прыгоршчы, мусіць, бо яно ў яго надта спрытна выходзіць, якраз як сава.

Сцёпка склаў рукі, прыладзіўся.

— Фіў...

Усміхнуўся здаволена. І сапраўды — якраз як сава... Зараз адкажуць. Тады можна пайсці.

Але нешта не чутна. Што ж гэта, няўжо не пачулі? Трэба другі раз...

Ізноў не чуваць. Паждаў часінку, яшчэ раз свіснуў.

Ізноў не чутна адказу. Няўжо ўсе паснулі? Не можа быць, варта павінна стаяць.

І раптам страх ахапіў Сцёпку. Зноў пачуў сябе адзінотным. Няўжо нікога няма? Няўжо пайшлі куды ў іншае месца? Што ж цяпер? Назад?..

Уявіў сабе Сцёпка дарогу: балота, могілкі...

— Не, не пайду. Трэ паглядзець, мо й сапраўды паснулі.

Сцёпка палез у кусты. Асцярожна рассуваў мяккае вецце, спыняўся, прыслухваўся.

Ціха, ані зыку, ані шолаху.

І чым далей, тым больш ахапляў Сцёпку жудасны страх. Шчыльней туліўся ён да зямлі, віўся па ёй, як вужака.

Раптам скрозь вецце агеньчык бліснуў. Смялей папоўз Сцёпка. Зноў агарнула радасць, здаволенасць. Праз колькі крокаў палянку ўбачыў наперадзе. Па ёй свет бегае цьмянымі дрыжыкамі, варушыць, карабаціць сонную траву. Гэта — ад вогнішча, што недалужна згасае сярод палянкі. І — што гэта? — вакол нікагутка. Пуста...

Сцёпка паціху высунуўся на палянку, пільна прыслухаўся. І раптам — быццам ударыла яго што, ашаламіла. Лёг на зямлю, прытаіўся, поўны вострага палкага жаху.

Ці не здалося гэта яму? Не, во яшчэ... яшчэ... Хрыпіць нехта. Ды так жа страшна, жудасна...

Задрыжэў Сцёпка ўвесь. Ляжаў нерухліва, не знаў, што рабіць. А там усё хрыпіць, усё хрыпіць...

Урэшце Сцёпка набраўся адвагі, узняўся паціху, пачаў уважна разглядаць палянку.

— Вунь ёп!..

На ўскраю паляны цьмяны выблеск згасаючага вогнішча вызначыў цёмную фігуру. Нехта ляжыць, стогне. І больш, мусіць, нікога няма, адзін ён.

Сцёпка троху счакаў і потым гукнуў палахліва:

— Дзядзечка!

І сам здзівіўся сваёму голасу: такі слабы, ледзь чутны. Другі раз паклікаў:

— Дзядзька!

У адказ зноў пачуўся цяжкі жудасны хрып. Тады ён бліжэй падышоў, пачаў разглядаць. У твар зазірнуў. І раптам кінуўся з дзікім прарэзлівым крыкам:

— Татачка!..

Бацька пазнаў сына. Напружыўся і загаварыў скрозь сударгавую хрыпоту:

— Сцёпка... сыночак... гэта ты... забілі мяне... знайшлі... выказаў нехта... Уцяклі каторыя... у Седлішча... так згаворана было... Ой, цяжка, баліць...

Зноў захрыпеў, застагнаў. На вуснах злавеснym булькатам чорная кроў.

Сцёпка горка, адчайна плакаў. У роспачы туліўся галавёнкай да бацькавых грудзей.

Бацька раптам заварушыўся.

— Ой... цяжка... гарыць... ой... ой...

Апошні ўздых — і выпрастаўся, змоўк. Сцёпка перш не зразумеў, потым усё стала ясна.

— Памёр... Няма таткі!..

І дзіцячая крыўда агарнула болем пякучым. Слёзы яшчэ мацней паліліся, змяшаліся з бацькавай крывёй.

З гадзіну сядзеў так ля бацькі, плакаў усё. Потым устаў, азірнуўся.

Вогнішча згасла ўжо. Цемра ўсё заліла, затапіла.

У Сцёпкі ў галаве біліся думкі. Новыя, напружныя.

— Хто гэта? За што? За што яго татку згубілі?

Успомніў польскіх жандараў, якія ўвесь час бацьку шукалі, якія не раз яго самога пыталі і білі. І дзіцячыя кулачкі моцна сціснуліся ад прыліву вострага гневу.

— Гэта яны... яны забілі татку...

І разам у дзіцячай галаве сталлю прарэзалася пастанова:

— Не пайду ў вёску, не хочу... У Седліпча, казаў, уцяклі... Пайду шукаць...

Адважна разгарпуў кусты і пасігаў у той бок, дзе, як ён знаў, было Седлішча...

. . . . . .

Матка чакала Сцёпку. Усе вочы праглядзела, вушы праслухала. Горам ахінулася матчына сэрца.

Няма сынка, не чуваць.

Няма і не будзе. Доўга не прыйдзе, дарма што так пільна яго матка чакае.

Не прыйдзе затым, што ён бацькаў сын і будзе рабіць бацькаву справу...

ГАНУЛЯ

Шэрая вёска. Цёмныя людзі. Цьмяная рэчка жыцця.

І да вольнасці, і пасля вольнасці тое самае. Праца сялянская — цяглая, ламучая, пот вёдрамі выганяе, як самагонку. А адпачынак — нуда. Цягнецца, што кісель. Тухлы.

У нядзелю, калі па места не падасіся, дык што ж: сядзіш, гамоніш-гамоніш, сядзіш, потым спаць забурышся. Нудпа...

Бабы языкі точаць. Дурныя, вядома. І працаваць любяць. Калі не рукамі, дык языком. Мяліцамі трэпяцца. А перабяруць — усіх чысцепька! А навыдумляюць — дзіву дасіся, лопнеш ад смеху.

А часамі бабы сплятуцца. Мужчыны далучацца, злосныя ад нуды. Тады бойка. Тады ў паветры замітусяцца: валасы, хусткі, спадніцы, бароды, вусы. Тады цікава і весела.

Дзеці... Во дзеці добра жывуць. Цвітуць, пузаны. Ім няма нуды. І працы няма. Балазе ім: за птушкамі, напрыклад, шарапацца дарогаму неяк сорамна, хоць і ў нядзелю, а ім што — пайшоў ды пайшоў. А ўцеха якая! Ізноў ўка табаку ў дзеда Лявона цягаць — дарогаму што, а малому — хлебам яго не кармі, толькі дай магчымасць жменьку стырыць. Адным словам — «хвацка».

Вось якая вёска Будынкі. Звычайпая? Вядома. Але гэта раней. А цяпер — ого, што цяпер...

Гануля... Бачылі, як красуецца стромкая маладая вішня; як яна ззяе, блішчыць веснавым харастом, як яна — свежая, сакавітая — смяецца сваім квяцістым уборам, радасць шчодрымі жменямі раскідае наўкола?

Зграбная, свежая. Стан пругкасцю мяккаі, дзявочакрамяпаі спакушае. Вабіць, абяцае ўцехі жаркія. Твар — чырванню рдзее. Любы, прыгожы, заўсёды з усмешкаі чароўнаі, гарэзліваі. Вочкі... Вочкі такія, што калі хочаш утапіцца ў таемным, яскравым бяздонні, дык зірні ў іх. Яны сваімі блакітнымі праменнямі схопяць твоі погляд і

нацягнуць магнэсам у жудасную і разам чароўную прорву.

Во якая Гануля. Але гэта таксама раней было. Потым былі цёмныя ночкі, палкія пацалункі, абнімкі, глыбокія, жаркія ўцехі. Потым пакута была.

А цяпер Гануля — дзеўка старая. Чырвань на твары пагусцела, у плямы сабралася, вочы туманам ахінуліся. Грудзі — тыя пульхныя, любыя, крамяныя булачкі — цяпер абвіслі. Брыдка.

І цяпер пры Гапулі дзіцёнак, хлопчык сінявокі.

Але добра. Што далей?

Восень была. На гародах, пажоўклых, счарнеўшых — бабы працавалі. Гануля ў цёткі Арыны за кавалак хлеба гародніну з чорнай зямлі калупала.

І вось тады прыехала тая, з горада. Худая, вочы гараць ліхаманкавым бляскам. Гаварыла грубаватым, глыбокім голасам. Пачала баб збіраць. Смеху было! Бабы адна адну пад бок штурхалі. Міргалі з усмешкай.

— А бач! На баб мода пайшла. Во табе. Цяпер мы ў сілу ўвойдзем, людзей сваіх пад уладу возьмем.

Смяяліся. І на сходцы таксама. Не маглі без смеху слухаць, як кабета з горада запэўняла, што баба з мужчынам роўная.

— Паненачка! А я ж касіць не ўмею. І мой таксама дужэйшы за мяне. Не я яго б'ю, а ён мяне лупцуе.

Тая тлумачыла, а бабы ізноў рагаталі, у бокі ўзяўшыся.

А Гануля не смялася. Яна развучылася смяяцца. Часам толькі вусны крывіла жаласна, пакутна. Смяяцца не магла, бо на вусны пячатка была накладзена. Моцная пячатка гора.

Яна слухала ўважна. І, як тая казала пра долю гаротную бабскую, у яе міпулае варушылася ў сэрцы. Паўставала, злучалася ў адзін малюнак чорны, слязьмі падступала да горла, вымагала нейкай надзеі, нейкай уцехі. Думку напружную, палкую раджала, думку аб будучыні.

Пасля сходкі, калі бабы гурмай, лапочучы, павалілі з хаты, яна пясмела падсунулася да гарадской.

— Папепка! А ці ёсць якое паляпшэппе?

Ціха спыталася, баючыся, каб хто не пачуў. Тая зірнула з цікавасцю.

— А што, цяжка жывецца?

— Ой, цяжка, галубачка. Нічога не маю, за кавалак

хлеба хаджу на падзёншчыну. А часамі — зусім няма чаго есці. Дзіцёнак малы.

— Удава?

— Не, не ўдава. Я... так сабе... дзеўка...

— А... Хату маеш?

— Не маю, родненькая. Была ў нас хатка старэнькая, дык, як матуля памёрла, яна брату дасталася. А ён прагнаў мяне пасля таго... Жыву цяпер, дзе прыйдзецца, куды пусцяць.

Гарадская доўга з Гануляй гаманіла. Тлумачыла ёй, малявала абразы пекныя, прыгожыя, захапляючыя. Шляхі адчыняла ў Ганулiным розуме — шырокія, гладкія, квяцістыя. Пасля кніжак дала пачытаць і паехала.

Гануля трохі пісьменная была. Кніжкі чытала поччу пры лучыне. Удзень хоць бы і быў час — нельга, засмяюць. І то трохі кпілі: грамацейкай празвалі.

І пачало ў Гапулі пешта расквітаць усярэдзіне. Сярод чорнай беспрасветнасці пачалі мігаць ружовыя праменні надзеі. Часамі смялася Ганулька. Невыразная радасць дух уздымала.

— А мо што і будзе? Хоць бы пад старасць дажыць...

Пад вясну яшчэ з горада тая прыехала. Бабы ізноў усміхаліся, жартавалі. А Гануля, як роднай, узрадавалася.

Цяпер гарадская проста падышла. І як пачала гаварыць аб жыццёвым, магчымым, бабы сур'ёзнасцю трохі працяліся. Слухалі з палахлівасцю, з нейкай апаскай, недаверлівасцю.

Гарадская яслі адчыніць захацела. Дзіўная... Чаго ёй прыспела? Што ёй за наўда: ну, жывуць бабы і жывуць, як спрадвеку жылі.

Нялюба бабам, што жыццё іх кратаюць, ды варушаць, ды пераглядаюць з усіх бакоў. Прывыклі ў запеччы...

І гвалтам узняліся:

— Як жа! Аддадзім мы сваіх дзяцей невядома каму. Каб згубілі!..

Гарадская — рады не дасць, што з бабамі рабіць. Але Гануля тады ўзялася. Як пачала гаварыць, дык голас дрыжэў: гэтак абурылася.

— Дурныя вы, бабы. Самі не ведаеце, чаго баіцёся. Кожнай жа дзеці ў абузу ўлетку. Дык тут жа просты рахунак. Заместа таго, каб кожнай дзяўчыну трымаць ля дзяцей,— знесці іх у адно месца ды даручыць адной бабе — няхай з імі возіцца.

Ой, як спрачаліся бабы. Не раўнуючы — быццам іх у

пятлю хто цягнуў. Але ўрэшце ўсё ж наддаліся. Перш адна да розуму прыйшла:

— Пастойце, бабкі! А можа, гэта і ўпраўды рахуба? Во Гануля... яна не пры месцы, вандруе з хаты ў хату... няхай забаўляе дзяцей.

Іншыя далучыліся. Толькі самыя ўпартыя на сваім стаялі.

— А хто ж гэта пусціць да сябе ў хату гэтае пекла? Каму гэта люба?

— Па чарзе можна. Тыдзень у адной хаце, другі — у другой.

Дагаварыліся. Гарадская, здаволепая, паехала. На развітанне моцна паціснула Ганулінну руку.

— Во вам пачатак і ёсць. Адно паляпшэнне ўжо бачым. Працуйце тут.

А Гануля святкавала ў душы. Радасцю дзіўнай гарэла.

Надышло лета. Жаркае, потнае. На гародах, у полі мурашкамі людзі запоўзалі. У напружанай спякоце смага павісла. Душнай зморай на людзей перакінулася. Запылі працоўныя плечы. Цяжка... Ганулі таксама — хоць разарвіся. У цеснай хацёнцы — пузатымі клёцкамі поўзаюць. Гвалтуюць на весь шырокі дзіцячы рот. Сапраўднае пекла. Свежы чалавек звар'яцее, калі зойдзе ў хату.

Але Ганулі нішто. Рушная, рухавая, яна ва ўсе бакі. Адпаго пакарміць, другога ўняць, трэцяга закалыхаць. Усюды спраўляецца.

Сама аж цвіце. Быццам тое даўнейшае вярнулася. Нават памаладзела, папрыгажэла.

Часам матка якая — распараная, зняможаная — прыйдзе адпачнуць. Пасядзіць момант — з ласкавай усмешкай паўзіраецца на муравейнік.

Пажартуе:

— Во табе, Гануля... І замужам не была, а дзяцеї — поўная хата, як тых парасят.

Тады Ганулі нешта ў сэрца кальне. Успомніцца старос: тыя сонечна-светлыя дзянькі, зорныя ночы. Возьме яна тады свайго Яначку, шчыльнеї прытуліць, галоўку сукрыстую гладзіць. Песціць сумпа-ласкавым поглядам.

Але пенадоўга гэта. Усміхнецца апошняїі, смутнаї усмешкаї і — зноў замітусілася па хаце.

У адну з душна-лянівых, саплівых пядзель Гануля баб вясковых сабрала. Бабскую сходку. Каля крайняе хаты, па мякаїі зялёненькаї траўцы, паселі ў гурток. Гануля — у сяродку.

І вось што сказала бабам Гануля:

— Ведаеце, бабачкі, што я надумалася. З дзяцьмі карагодзіцца — малая гэта для мяне праца. З гэтым і дзяўчына якая справіцца. А калі дзве, дык і казаць няма чаго. Пад маім наглядам яны абыдуцца з вашым насеннем. А я тым часам іншаіі бы працаіі займалася. Вам жа цяпер, цётачкі, вопраткі памыць няма часу. Вось бы я і мыла патроху. Усё вам дапамога, ад пільнаіі працы не адрывалiся б...

Бабы згадзіліся. Толькі падзякавалі Гапулі. Да дзяцеіі дзвюх дзяўчынак прыставілі, а Гануля вопраткі сяляпскія мыць пачала. А калі многа збіралася, цяжка было,— па чарзе пасабляць прыходзілі.

Усе паважаць сталі Ганулю. Нават мужчыны, што калісь кпілі з яе, грамацеікаіі жартуючы звалі, цяпер іначаіі да яе абарачваліся. Калі ўбачыць каторы, што кпіжку часам Гануля чытае, дык, замест смеху,— павага, сур'ёзпасць на твары з'явіцца. Падыдзе ды аб сур'ёзных «палітычных» рэчах пагаворыць.

Увосень у сельскі Савет Гапулю выбралі. Во было гутарак! А бабы! Усе насы ўзнялі на добрую пядзю. Козырам захадзілі.

— Во, цяпер наша паиства. Канечна, наша. Што яны, мужчыны, пхе!..

Мужчыны моўчкі ў вусы ўсміхаліся. А часам кідалі пяўважпа:

— Што ж. І бабы пе ўсе бабы. Часам і разумныя бываюць... Хоць і рэдка, трэба сказаць...

А то яшчэ:

— Што ж. Ёй вальней, часу хопіць. Гаспадаркі не мае, пе звязана нічым.

І Гануля пачала справамі заварочваць. Загад які — фурманкі альбо падатак які — зараз сходку ці па хатах пойдзе. Гаспадары моршчацца, плююць убок.

— А бадаіі цябе! Абабралі бабу на бяду сабе. Усюды яна круціць сваёй спадпіцаіі... У, я цябе, кудлатая...

А потым разам з Гануляіі смяюцца і загад выконваюць.

Лхвотна слухалі Ганулю, дарма што баба. Слухалі, бо знали, што яна ўсё добра разрахуе — што каму, пікога не пакрыўдзіць.

А ўзімку, як вальпеі стала селяніну, як паішлі зімовыя вечары — доўгія, нудна-цягучыя,— тады Гануля іншаіі працаіі заняласа.

У Лявона, у досыць раскошнаіі хаце, чытальню адчы-

нілі. Лявон ахвотна дазволіў. Вясёлы дзядзька! Любіць, калі ў хаце народ таўчэцца. У чытальні — газеты, кніжкі сякія-такія. Кожны вечар — народ. Гануля газеты чытае сялянам, тлумачыць усё чыста, што сама ведае, чула. І моладзь тут трэцца. Хлапчукі, дзяўчаты — яны, вядома, больш жартуюць, дурэюць, каханнем практыкуюцца. Але часам, як надакучыць гарэзваць, і яны лезуць за стол.

— Старшыніха, дай газетку!

— Старшыніха, дай кніжку цікавую...

А дзядзька Лявон важна зазначае скрозь піпку:

— Якая табе старшыніха... Камісар! Во як, дурань зялёны!..

А на «ражство» што было, як Рыгораў Мікола прыехаў!

Мікола ў горадзе вучыцца. Як прыехаў, сабраў хлопцаў, дзяўчат ды і кажа:

— Давайце спектакль паставім!

Ну, дык што ж... і паставілі. Ды яшчэ як! На ўсю акругу загрымела. У свірні, дзе спектакль ставілі, ад людскога натоўпу замалым сцены не праламаліся.

Гануля таксама іграла на сцэне. Што ж, што старая трохі... Абы дух малады! Яшчэ як ролю Альжбеты выкапала — проста любата!..

Дык во як было. А пад вясну змянілася.

Нешта раз Гануля паперку атрымала. Пісалася:

«Ганне Ахрэмчыкавай. N-скі павятовы аддзел па працы сярод кабет запрашае Вас да пастаяннае працы ў названым аддзеле. Аб згодзе паведаміце».

Гануля без канца чытала, перачытвала паперку. З усіх бакоў яе аглядала. І верыла і не верыла. А сэрца, быццам клявец па касе,— цюк-цюк-цюк!..

Дужа ўзрадавалася Гануля. Перад вачмі шырокія, раскошныя, прывабныя прасцягі развярнуліся.

Праца. Вялікая праца. Шмат работы, карыснай, цікавай. І ўсё дзеля сваёй пакрыўджанай гаротнай сястры.

Толькі шкада было Ганулі пакідаць сваю вёску. Родная вёска. Радзілася тут, узрасла, узгадавалася. Тут першае шчасце, дзявочае шчасце пазнала, тут і пакутвала.

Але гэта ж не ў дальны свет... Пэўна, не раз прыйдзецца сюды прыязджаць, даведвацца.

І Гануля, вядома, паехала.

. . . . . .

Дык во якой стала Гануля!..

АДНА ПАРТЫЯ Ў ШАШКІ

Гэта — з таго часу, як у маладой савецкай краіне полымем барацьба бушавала, як у смяротную бойку схапіліся былі паўстаўшыя работпікі з сваімі адвечнымі ворагамі — панамі. Тады кожны куток нашай краіны працяты быў востраї напружнасцю, якая часам прасякалася агнявымі бліскавіцамі бурных уздымаў.

У той час на кожным кроку хаваліся ў цемры падкалодныя гадзіны. Часам выпаўзалі яны на свет і атрутныя джгалы паказвалі. Мужыкі-сярмяжнікі зпіштажалі іх сваімі рукамі мазольнымі, карузлымі. І не было тады меры мужычай моцы жалезнай, не было меры і гневу народнаму, бурнаму.

У фальварку Струшні тры дні паслугачы панскія сядзелі замацаваўшыся. Акружаны былі кальцом непарушным — чырвонаармейскім атрадам на чале з Асначом — селянінам-героем. Не здаваліся, хоць і бачылі, пэўна, што не будзе ратунку. А мо чакалі адкуль дапамогі?

Аснач наўмысля не браў фальварка з бою: хацеў жыўцом захапіць непакорных бандытаў. Расстанавіў вакол панскага дома людзей сваіх, сам сядзеў у старажоўскай халупцы, што ад дома крокаў на сто ля дарогі стаяла. Пад вусамі густымі вялізнымі хаваў увесь час хітравата-давольную ўсмешку. Пэўна, сам сабе думаў:

«Няхай пасядзяць сабе троху, адпачнуць пасля працы. А канец — адзін...»

Ноччу панскі дом хаваўся ў старожкую цемру. Тады Аспач падыходзіў да дома і хадзіў вакол безупынку. Упаўголаса аклікаў чырвонаармейцаў, бадрыў іх жартам вясёлым. А сам усё хадзіў і ўсё слухаў пільна, уважна, ці не робіцца што там за сцяной, ці не гатуюцца да чаго непрыяцелі.

На трэцюю ноч, калі ён хадзіў так — бяссонны, настарожаны,— яго чулае вуха злавіла ледзь чутныя рухі ў пакоях. Умомант ад чалавека да чалавека перадалася чырвонаармейцам яго перасцярога. Шчыльней абступілі

дом, ля дзвярэй, ля акон пасталі з нарыхтаванымі стрэльбамі.

Застыгла ўсё, быццам самлела наўкола. Так ціха было, што як з саду над домам праляцела нейкая птушка начная, дык чуцен быў мерны ўзмах яе скрыдлаў.

Часінка, другая...

Раптам адчыніліся дзверы пацскага дома. Уздрыганула паветра ад стрэлу. Невядома, хто першы страляў: ці армейцы, што чакалі каля дзвярэй, ці мо бандыты, каб спалох узняць печакапа, палягчыць сабе магчымасць уцячы.

Потым ужо ў пакоях паішла страляніпа. Тлум, замятня... А праз колькі хвілін асвяціўся дом святлом няроўным, дрыжачым; з акон косы віхрыстыя заскакалі па кустах палісадніку.

Гэта Аснач рабіў вобыск па доме. Замест лямпы з паперы зрабіў нібы факелы і асвятляў імі пакоі.

Доўга не аставаліся ў доме. Аснач хутка сабраў сваіх хлопцаў.

— У вёску, усе... Пільна сачыць за бандытамі... Рукі скруціць... як мае быць... Марш!..

Пасунуліся няроўнай чарадой па цёмнай дарозе. У невялічкай вёсцы — вярсты тры ад фальварка,— спыніліся. Там мусілі начáваць.

Разышліся па хатах, а забраных бандытаў стоўпілі ў адзін з сялянскіх свірнаў. Да іх варту прыставілі. Толькі правадыра іхпага павёў з сабоі чамусьці Аснач. Двое чырвонаармейцаў яго вартавалі, трымалі нарыхтаваныя стрэльбы.

Увайшлі ў сялянскую хату. Аснач сеў адразу за стол, задумаўся, паклаўшы твар на далоні. Усе маўчалі. Толькі гаспадар з гаспадыняй нешта шапталі ўцішку. З цікаўствам паглядалі па гасцеі і больш за ўсё па таго, што стаяў паміж двух узброеных салдат.

Яго выгляд прыцягваў да сябе ўвагу. Вопратка нібы панская, але так абшарпалася, што зусім страціла своі калішні выгляд. Калматым шкумаццем недалужна звіслі парваныя полы сурдуту, а скрозь дзіркі па каленках свіцілася брудная бялізна.

Стаяў ён панура, нерухома, у дол апусціўшы сярдзіта прыжмураныя вочы. Твар быццам драўляны, быццам мёртвы. На ім застыгла, закамянела хваравітая напружпасць.

Аснач раптам узняў галаву. Акінуў хату ўраз павесялеўшым, светла-іскрастым паглядам.

— Гаспадыня! А як будзем з вячэраю, га?..

Замітусілася баба, забегала па закуцці.

— А бадаю яно цямілася. Гэта ж мне з галавы вон. Такі праўду кажуць, што сыты галодпаму не спагадае...

Неяк ураз змяніўся ўсіхны настрой. Быццам нейкі гулліва-радасны промень працяў тую напружную цяжкасць, што гпётам вісела ў хацёнцы. Закулдычылі дзеці, загаварылі армейцы. Гаспадар падсеў к Асначу, пачаў гаманіць з ім — сперш асцярожна, нясмела. Зазіраў у яго дабрадушныя вочы з цікаўствам, з павагаю, распытваў пра падзеі ў фальварку. Асиач апавядаў, і ўсе смяяліся довольна, радасна.

Толькі адзін палонны маўчаў. Быццам не чуў, не ўважаў, што наўкола, углыбіўшыся ў думкі свае асабістыя.

Падалі вячэру. Асиач разгарнуўся, расшпіліўся, вольна раскапусціўся за сталом, гатуючыся як мае быць узяцца за ежу. Па твары разлілася давольнасць — шырокая, млявая, якая заўсёды бывае ў тых, хто пасля цяжкае працы знаходзіць сабе адпачынак.

У гэты момант пагляд Асиача спаткаўся з паглядам бандыта. Толькі хвілінку глядзелі яны адзін у вочы другому, але гэтага досыць было, каб Асиач згадаў тое, што перажывае ў гэты момант збянтэжаны пан. Скрозь усю тую варожасць і злосць, якія свіціліся ў прыжмураных вачах, нястрымана прарывалася моцнае жаданне, і гэта жаданне, відаць, папавала цяпер над усім пачуццём, над усёй істотай гэтага чалавека.

— Есці! Есці! — быццам крычалі напружна-бліскучыя вочы бандыта.

І тады Асначу яшчэ весялей зрабілася. Не было ўжо злосці на недалужнага, бяссільнага ворага. Нават жаль нейкі з'явіўся. А панская ўпартасць, замкнёпасць здалася смешпай і недарэчнай. Ён праказаў вясёла з захаваным смяшком:

— Можа, пан не адмовіцца павячэраць?

Злосцю і пагардаю бліснулі папскія вочы. Адвярнуўся, не глядзеў пават у бок Асиача. Але Асиач ведаў, што голад пераможа ўпартасць.

— Хлопцы! Развяжыце пану рукі, няхай падмацуецца троху...

Развязалі. Пан не рушыўся з месца. Відаць, змагаўся з сабой. Але ўрэшце не вытрымаў. Утупіўшы вочы, падыпоў да стала. Больш не чакаў, каб прасілі, накінуўся на страву, як звер галодны. Мусіць, доўгі час нічога не еў.

Як скончылі вячэру, як у ціхаі сямейнаі прытульнасці зацягнуў сваю ветлую песню самавар ля парога, Аснач заўважыў на акне дошку ад шашак.

— А бач! Вось дык знаходка... А дзе шашкі? Дзядзька! — звярнуўся ён да гаспадара.

— А ліха іх ведае... Як быў сын у дварэ, гулялі часам хлопцы... А потым, мусіць, параскідаліся, бо гуляць няма каму, так вось бадзяюцца...

— Кепска, кепска. Але нішто, мы паробім...

Узяў кавалак хлеба і пачаў крышыць шматкамі маленькімі.

— Ну, сядай, хлопцы, згуляем...

Але з чырвонаармейцаў ніводзін не ўмеў гуляць.

Аснач зірнуў у бок пана. Той сядзеў за сталом, упяўшы пагляд некуды ў пусты працяг. Думаў усё. На твары цяпер спакой быў, ціхамірнасць.

— Ці згуляе, ці не?

Хочацца Асначу ў шашкі пагуляць, дужа хочацца. Шашкі — гэта ж яго ўцеха найпершая... Пэўна, гуляе пан, але ці згодзіцца? А цікава было б з ім...

Ён абярнуўся да пана, і той, быццам схапянуўшыся, зірнуў на яго чакаючым паглядам.

— Можа, згуляем партыю? — запытаўся Аснач.

— Давайце.

Узяў нейкую паперку з акна і пачаў таксама, як і Аснач, гатаваць шашкі.

Расстанавілі — Аснач хлеб свой пакрышаны, а пан кавалкі паперы.

Чамусьці раптам заціхлі ўсе ў хаце. Армейцы падсунуліся бліжэй, глядзелі з цікавай усмешкай.

Пачалася гульня. Напружаная, цягучая ціша агарнула хацінку. Настоіўшым, пазоллівым гнётам павісла пытанне:

— Хто каго?

Глядзела гэта пытанне з цікавых вачэй армейца, з маўкліва-ўпятага ў шашаніцу пагляду гаспадара. І нават гаспадыня, сноўдаючыся па хаце, часам падыходзіла да стала і зазірала на шашкі, хоць і не разумела ў іх нічагутка.

Аснач насупіўся. Упарта глядзеў на дошку, асцярожна, зважна пераставіў кавалачкі хлеба. І чым далей, тым больш і больш моршчыліся яго бровы, а вусы шавяліліся, як у таракана.

Дзіўная была гульня ў Аснача з панам. Абодва напружыліся, абодвух цалком захапіла адна вострая, палкая думка: каб не прайграць.

У Аснача над звонку нібы зусім спакойным выглядам хавалася моцнае абурэнне. Адно звіпсла, гудзела ў мазгах: ён павінеп абыграць, ён не павінен паддацца. Чаму — невядома, але так трэба, так павінна быць.

І нешта дзіўнае, незвычайнае рабілася з Асначом. Ніколі ён не гуляў з гэткім запалам. Быццам усёй істотаї увайшоў ён у шашкі, у гэтыя цьмяныя кавалачкі хлеба, усю моц сваю, волю ўклаў у іх. І здавалася, што гэта не шашкі ўжо, што не іх справа. Здавалася, што няма ўжо шашак, што счэзлі яны, распаўзліся, разгарнуліся ў нешта вялікае, шырокае, у нешта без форм, без пачатку й канца. І асталіся тут толькі яны ўдвух — адзін проці аднаго — з гэтым папам, што блішчыць варожа вачмі, што ўсміхаецца смешкай самападзейнай.

Абыграць яго, перамагчы! Бо йпачаї — немаведама што...

Гульня к канцу падыходзіла. Асталося па некалькі шашак у кожпага. Абодва не паддаваліся.

Напружнай чырванню пакрыўся акамянелы твар Аснача, вочы заблішчэлі агнём жорсткім, сталёвым. Упарта глядзеў на дошку. Уваччу ўжо не хлебныя крошкі, а нейкія вялізныя камлыгі каменныя. Здаецца, заваліў бы, раструшчыў імі гэтыя заядлыя белыя паперкі. А разам з ім і гэтага ўпартага, злоснага ворага.

У парозе гаротна, недалужна пішчэў самавар. Усе на яго забыліся, усе абступілі гульцоў, з зацятым дыханнем чакалі, чым скончыцца. Ува ўсіх на твары відаць было шчырае спачуванне Асначу, жаданне, каб выйграў ён, не паддаўся. І разам трывога, напружная, палкая.

— А што, калі ды прайграе?..

Гэтак і выйшла. Зрабіў Аснач ход дрэнны, няўдалы; і твар пана раптам зайграў давольнаї, радаснаї усмешкаї.

Аснач прайграў. Аснач паддаўся варожаму папу.

Раптам глыбокая цішыня стала жудаснаї, злавеснаї. Дзіўна данасаваў ёй завыўны, жалобны посвіст самавара.

Узпяўся Аснач. Упяў нагляд проста ў твар пану. У гэтым наглядзе нешта гарэла, бушавала шалёнае, лютае.

Пан таксама ўстаў. Смела глядзеў у твар Асначу, усміхаўся зларадасна.

І вось тады здарылася тое, чаго, пэўпа, ніхто не чакаў, што спалохам агпявым усіх агарнула.

Аснач выпуў з кішэні нагаи і навёў яго па пана. Стрэл быццам ускалануў, разадраў усю хату.

А пасля — ціха стала, як у магіле. Пап марудпа, паволі апусціўся на лаву.

Аснач стаяў перухома. Не ведаў ён сам, нашто забіў пана, за што. Дый не думаў пра гэта. Нешта падказала з нутра, што трэба так, што павінен забіць, што вораг гэты кроўны, упарты — узяў і забіў...

Усе моўчкі стаялі, спалоханыя. Усе ўзіраліся ў недалужна-папіклае панскае цела. І дзіўна, што ні ў каго не мігнула ў гэты жудасны момант думка асуджэння. Быццам усе згодны былі з Аспачом, быццам кожны разважаў сваім простым, нямудрым розумам:

— Яму трэ было гэтак зрабіць...

Дык вось якая была адна партыя ў шашкі. Гэта было тады, як у нашай краіне барацьба бушавала, як у смяротную бойку схапіліся былі паўстаўшыя работнікі з сваімі адвечнымі ворагамі — панамі.

Тады не было меры мужычай моцы жалезнай, не было меры й гневу народнаму, бурнаму...

БЕЛЬ

1

Ціха, лагодна патрусілася з неба. Потым завіхрылася маладым, жвавым карагодам. У дзівосных, адчайных скоках замітусілася, быццам хацела падражніцца, пашкуматаць трохі счарнеўшую старую зямлю.

І ўрэшце ўзляглася — цяжка, пухка, пластом ваты; захінула, сціснула ў мякка-ўпартых абпімках.

Бель... Першая бель — прывітанне доўгачаканай гасцюхі-зімы...

Весела, радасна спатыкаць першы снег!

Чаму?

Можа, таму, што смерць прыроды ярка адзначае, быццам падкрэслівае жыццё чалавека? Мо затым і настрой тады ахапляе чалавека такі, што — жыць, разгарнуцца, упіцца жыццём хочацца? Мо затым гэта смяротнае адзенне, гэты саван прыроды — бель абуджае душу чалавека, цягне яго некуды ў зачараваны прасцяг, туды, далёка па гэтым бяскрайнім белым дыване, на спатканне чамусь невядомаму, светламу?

Можа, і затым? Але ладна...

. . . . . .

Гэта пачалося яшчэ ўлетку, калі горад купаўся ў едкім пылу. Тады былі сопечна-светлыя, палкія дні, якія падскварвалі, як на патэльні, праціналі душнаю млявасцю, і вечары халадпаватыя, ціхія.

Данілу Чаборскаму дні былі — жорсткая праца ў заводзе, а вечары — або сходкі якія, або пудпая сумятня, дробныя жыццёвыя клапоты.

Ён любіў, калі сходкі. Збярэцца чалавек паўсотні камуністых, а часам завод увесь. Прамовы, спрэчкі...

І адчуваеш сябе тады часткай чагось вялікага, значнага. Расцеш неяк, уздымаешся, адчуваеш сябе не проста работнікам, а нечым вялікпым і патрэбным. Мо тым пасам, што спавівае рухавыя колы ў заводзе?

А ў двары інакш. Там жонка, дзеці, там розная драбяза жыццёвая. Абцугі. Сціскаюць япы, і робішся маленькім, нязначным. Стуляешся ў будзённую шалупу.

А дзе чалавек, там ці тут?

Даніла аб гэтым не думаў. Нашто? Не ўсё роўна, ці гэта так ці так... Жывеш — і добра.

Але вось што прытрапілася...

На завод паступіла дзяўчына. Даніла даўно не глядзеў на кабет — не цікавілі. А на гэту зірнуў. І штодня ўзіраўся — перш здалёк, потым бліжэй.

Ёй было гадоў дваццаць. Гаппай звалі. Прозвішча — Матузова. Пекнатой — так сабе, але вочы — шэрыя, буйныя вочы... Яны хапалі за сэрца. Былі гэткія глыбокія, прамяністыя.

Даніла і не ўгледзеў, як сышоўся з гэтай дзяўчынай. Першы раз загаварылі нешта ўвечары, ідучы ў двор.

Ён ішоў ззаду вясёлай гурмы дзяўчат-работніц. Дзяўчаты, ідучы, стракаталі, штурхаліся, гарэзвалі. І яна была сярод іх.

А потым звярнула ў тую вулку, куды і яму трэба было ісці.

Ён дагнаў яе.

— Вы куды ідзіцё?

— Дахаты.

— А дзе ваша хата?

— На Лепінскай.

— Во як? Значыцца — суседзі... Вы ў каго?

— А хто яго ведае! На рагу жоўценькі домік, там я каморку займаю.

— Вы адна жывіцё?

— Адна,— адказала, нібы здзівіўшыся гэткаму пытанню. Ускінула на Данілу дапытлівы погляд шэрых вачэй.

— Далёка да заводу,— буркнуў ён.

— Во гэта горш за ўсё. Я дык ніколі не хаджу па полудзень, не справішся. Вось і цяпер... Трэба паспех перакусіць і зноў бегчы за блізкі свет: сходка ж сёння партыйная.

— Вы камуністка! — здзівіўся ён.

— Ага. А хіба баба камуністкай не можа быць?

Яна ўсміхнулася. Вясёлая ў яе ўсмешка!..

— Мала,— адказаў Даніла.— У нас ёсць дзве, але і то з служачых.

— Гэта і дрэнна. Дурныя яшчэ бабы. Затым і здзекуецца ваш брат над імі. Верна?

Яна гучна зарагатала. Брызганула вясёлымі іскрачкамі з шэрых глыбокіх вачэй.

Даніла таксама ўсміхнуўся.

— Можа, й так... Але варта вашаму брату: неспакойны народ. Ведама — бабы...

— Ну, кажыце вы...

Пакуль дайшлі да двара, усё гаварылі.

А праз гадзіну Даніла сядзеў у работніцкім клубе і нецярпліва чакаў, ці скора прыйдзе Ганна.

Работнікі сядзелі гурткамі, упаўголаса гутарылі адзін з адным. За сталом «верхаводы» сядзелі. Разбіралі паперы, аб нечым паціху спрачаліся.

Даніла ўсё азіраўся. Ляпнуць дзверы — ён і зірк: ці не яна? Пакой напаўняўся новымі людзьмі, а Данілу здавалася, што ён пусцее.

Пачалася сходка. Даніла не слухаў, аб чым гаварылі. Думкі лёталі ва ўсе бакі, што косы пражэктару. Неяк ураз спыняліся ў абшары і траіліся. Быў непарадак у галаве, і ніяк не ўдавалася сабраць думкі да ладу.

Хацелася ўсё назад азірнуцца, ды стрымліваўся, быццам саромеўся сам сябе. Але ўрэшце не вытрымаў — і ўбачыў яе на краю лаўкі.

Шэрая суконка, шэрыя вочы...

Адразу настрой змяніўся. Весела стала. І сталі зразумелымі словы прамоўцы.

А як кончылася сходка, як запелі «Інтэрнацыянал»,— усё азіраўся Даніла, баяўся, каб не пайшла без яго.

Пайшлі разам. Ганна спяшалася.

— Заўтра ўставаць раненька-раненька, а сёння яшчэ многа зрабіць чаго трэба... Нават і пачытаць некалі. Кніжку цікавую ў бібліятэцы дастала — проста не адарвацца... А вы ці чытаеце што?

— Некалі...

— Ну, што там некалі... Столькі сама часу, колькі і ў мяне, калі не больш.

— У мяне сям'я...

— А!.. Ну, гэта іншая рэч.

Яна ўсё турбавалася, каб хутчэй дабрацца дадому. А яму хацелася памарудзіць. Ён любіў увечары праїсціся па горадзе, падзівавацца на яго кіпучае, бурлівае жыццё. Зірнеш усцяж на вуліцу — агні, свет, людзі, людзі бясконца... Увушшу зліваецца ў дзіўную гутарку-песню: грукат калёс, гвалты хлапцоў, гомап усяго гэтага людскога натоўпу...

Як праходзілі міма рэстарана, абодва міжвольна зірнулі ў шырокія вокны, поўныя яркага свету.

— Вунь яны... П'юць, ядуць... Ліха ім!.. Во, каму жывецца!

— Гіллё,— азвалася Ганна.— Мне брыдка глядзець на іх... І ні крушыначкі я ім не зайздрошчу.

— А ведаеце што, Гапуля, мне часамі дужа смешна бывае. Я люблю глядзець на спекулянтаў, сачыць за імі, як яны ходзяць, як гамоняць, які часамі важны-важны від робяць, быццам яны не абы-што... І вось часамі яны выдаюць мне нейкай жывёлай, непадобнай да ўсіх людзей. Мне пачынае здавацца, што іх паўмысля разводзяць, як, напрыклад, малпаў якіх або свіней... на паказ... для заводу... І ўзапраўды, яны дужа на свіней на завадскіх падобны...

Гануля смяялася...

2

Прыйшоўшы ў двор, Даніла доўга думаў пра Ганну. Прыемна было думаць. Як лёг у ложак, выпрастаў змораныя ногі і акунуўся ў салодкую перухомасць,— шэрыя вочкі зазірнулі аднекуль і працялі нутро ціхаю ласкай.

— Добрая дзяўчына. А разумная якая, відаць...

Снілася нешта. Не помніў што, як прачнуўся. Толькі на душы засталося лёгкае, ружовае абуджэнне.

На заводзе ўсё прыглядаўся, шукаў шэрую сукенку. І не пазнаў, як праходзіла воддаль. Не заўважыў...

Яна азвалася:

— Дзень добры! Як маецеся?

— А, я й не пазнаў вас... Дзякую. Як вы?

— У, я заўсёды добра. Мяне ніякае ліха не бярэць!..

Засмяялася і пайшла. А Даніла з асаблівай шчырасцю завінуўся каля свайго станка. Па вуснах блукала нейкая ўсмешка. Яго сусед па рабоце не ўтрымаўся:

— Што гэта, дзядзька Даніла, на дзяўчат заглядацца пачаў? Ой, скажу жонцы, дадушы скажу...

— Ды не. Гэта — суседка.

— Суседка, суседка... Знаем мы вас!

Хітра падмігнуў.

Данілу трохі сорамна стала.

— Ат... выдумаў...

Гудок у гэты дзень быў дужа позна для Данілы. Прачакаўся, небарака. А як загудзеў — зычна, прарэзліва — у Данілы сэрца забілася мацней.

Ніколі не выходзіў ён так раптоўна з завода. Бывала — пакурыць, пагутарыць... А то — ураз.

Выйшаў на вуліцу, спыніўся каля купы работнікаў, якія аб нечым гутарылі. А сам усё пазіраў на вароты — ці скора работніцы выйдуць. Няўважна слухаў, аб чым сябрукі гаманілі.

Вось і высыпалі пярэстай, сумятлівай гурмай. Вунь і яна. Расчырванелася ад жару, шчочкі рдзяцца, як мак. Уся пыхае сілай, здароўем.

Даніла пайшоў услед. На звароце зноў дагнаў, пайшоў разам. Любаваўся на яе. Асвятлёная ружовым водблескам заходзячага сонца, яна здавалася прыгожай, дужа прыгожай. Быццам уся складалася з маладосці, сілы, здароўя; быццам была жывая вясна. Зграбная, крамяная...

Яна заўважыла яго погляд. Усміхнулася гарэзліва, узняла на яго іскрыстыя шэрыя вочы.

— Чаго гледзіцё так?

Ён хацеў адказаць, але яна далей загаварыла:

— Горача дужа... Там, у заводзе. Ух... Проста як у пекле.

— Нічога. Вам, маладым, гэта не шкодзіць.

— У, стары які!.. Падумаеш!..

— Вядома, стары. Я ўжо аджыў сваё. Цяпер толькі так, працяг пейкі...

— Ну, кіньце вы!

— Што кідаць? Вас, маладых, тое цікавіць, другое... А мне што? У мяне ўжо адны клопаты, адны турботы... Гняздо цэлае. Ды ўсе есці просяць. А пакарміць не дужа лёгка. Вы ж ведаеце, колькі нам плоцяць.

— Ну, паехала! Нялюба слухаць. Калі сям'я ёсць, значыцца — усё... лажыся ды памірай... Глупства. Адно другому не замінае.

— А што ж рабіць?

— Што-хоця. Чытаць, вучыцца. Я дык дужа чытаць люблю.

— А часу дзе ўзяць, а?

— Знойдзецца.

Даніла задумаўся. Раней ён ніколі не думаў аб жыцці. Не думаў, бо пагадзіўся з ім — нічога не парадзіш. Ён і цяпер загаварыў проста так, каб пагутарыць. Але неўзаметку захапіўся ўсур'ёз гэтай думкай.

Ліха ведае... І праўда — дрэнь жыццё. Узваліў сабе ношку на плечы, цягнеш... І немаведама, калі дацягнеш

яе, калі адпачнеш. Дый, папэўна,— ніколі. Хіба, як здохнеш...

Калі ўжо падходзілі к двару, Даніілу дужа захацелася спытацца ў яе, але сорамна неяк было — ні з таго ні з сяго... Урэшце-ткі адважыўся.

— Вы, Ганна, замужам былі калі?

— Я? А што, гэта вам цікава?

— Ні то што... Калі не хочаце, не кажыце...

— Была.

— А цяпер?

— Цяпер не...

— А дзе ён?

— Хто, мужык? А хто яго ведае...

— Як гэта?

— Ды проста так...

— Вы што... развяліся?

— Як вам сказаць... Мы й не жаніліся так, як гэта зазвычай разумеюць. От, проста жылі, дый годзе...

— Ну?..

— Што ж тут такога? Жылі, пакуль не надакучыла, а потым разышліся. Ён, можа б, і жыў яшчэ са мной, але мне абрыдла...

— Пачакайце... Але ж чалавек прывыкае да чалавека, зжываецца. Пэўна, не лёгка й разлучыцца...

— Глупства! Прывыкнуць і адвыкнуць дваццаць разоў можна. А калі й пасумуеш часам... Яно, праўда, як разлучышся, дык і мілей чалавек робіцца і нібы зноў любіць яго пачынаеш. Але гэта самападман. Разлюбіў, значыцца — кончана.

— Мм... Гэта, па-мойму, таксама не рахуба... Сёння адзін, заўтра другі...

— Ха-ха-ха! Што так? Гэта, як трапіцца. А можа, спаткаеш такога, з якім век пражывеш і не надакучыць. Хто яго ведае? Гэта загадня не згадаеш... Паспытаць трэба, ха-ха-ха!

— Бывайце!

Япа пабегла ў сваю кватэру.

— Маладосць! — крыкнуў услед Даніла.

3

Праз тыдзень Даніла быў разам з Ганнай у клубе. Адчыніўся марксісцкі гурток. Было першае пасяджэнне.

Не пайшоў бы, напэўна, Даніла, бо зазвычай хадзіў

толькі туды, куды абавязкова было хадзіць. Але знаў, што Ганна там будзе, затым і прыйшоў.

Цікава было. Даніла наогул не пакаяўся, што пайшоў.

Лектар — з чужых, малады хлопец — прыгожа, складна апавядаў пра тое, як жылі калісь людзі. Тады, як не было яшчэ ні паноў, ні мужыкоў, як былі ўсе роўныя. Даніла міжвольна пералятаў сваім уяўленнем у тую пару, калі вандравалі яны — дзікія, безабаронныя — гурмамі па непраходных, старадаўных лясах, поўных нявідных ворагаў. Людзі — прабацькі сучаснага чалавека, гаспадара свету. Людзі — жывёлы...

І дзіўна рабілася. Не хацелася верыць...

А пасля лекцыі спрэчкі пайшлі. Гарачыя, заўзятыя. Непрыкметна і тэму пакінулі, перайшлі на сучаснасць.

Даніла не важыўся гаварыць, хоць і меў што якое ў думках. Як гаварыла Ганна, глядзеў на яе з захапленнем, лавіў кожнае слова.

А яна ўмела гаварыць. Гаварыла з пачуццём, абуджэннем. Натхненне ззяла з вачэй, і ўся была нейкая дзіўная, новая. Змянялася. Даніла нават не знаў, што яго больш захапляе — словы яе ці сама.

А як пачалася гутарка пра сям'ю, пра штодзённае жыццё камуністага, тады Ганна стала асяродкам. Адны накідаліся на яе з гарачым, шчырым імпэтам, другія абаранялі. А яна ўся гарэла задорным агнём.

— Трусы вы, во што! Здалелі зрабіць рэвалюцыю, свет перавярпуць, усё дыбарам паставіць, а жыццё сваё змяніць баіцёся. Жонак спалохаліся. Не, ужо, па-мойму, рушыць — дык рушыць! Усё... дашчэнту... Нічога старога! Новае будаваць трэба, а не чакаць, пакуль варункі зменяцца, ды абаранкі з неба насыпяцца, ды бабы вас вучыць возьмуцца... Як ні кажыце, як ні спрачайцеся, а мужчына ў сваім уласным сямейным быцці—сам кансерватар... Во!..

У Данілы кожнае слова адбівалася ў мазгах цэлай плоймаї гарачых думак, кожнае слова адчыняла розуму новыя, дасюль невядомыя пуцявіны... Было прыемна і страшна.

Як ішлі ў двор пасля пасяджэння, гаманілі аб тым самым. Не ўгледзелі, як дайшлі да Ганнінае кватэры.

— Можа, да мяне зайдзіцёся? —прапанавала Ганна.— Я вам пакажу кніжкі. Многа ў мяне цікавых ёсць. Калі хочаце, чытаць бярыце...

Даніла проста асалапеў.

— Як? Ноччу?..

— Ха-ха-ха! Во табе й маеш... Ну, дык што... Не ўсё роўна — ці ўдзень, ці ўноч? Можа, ваўкоў баіцёся, дык у нас у хаце няма іх.

Даніле жонка ўспомнілася. Ні то стыдна было, ні то страшна чагось. Не важыўся.

— Во... Ці ні я казала, што мужчына яшчэ больш прыхільны да розных забабопаў, чымся баба. Я, баба, не баюся запрашаць яго ў хату, а ён, мужчына, ісці баіцца... Эх, вы!..

Яна паляпала ў дзверы. Адчыніла старая гаспадыня з заспаным тварам. Даніла адхіліўся ўбок, каб не пазнала.

Увайшлі. Ганна запаліла невялічкую лямпу, якая цьмяна асвятліла пакой.

Пакойчык невялічкі. Ложак, спраўна засланы чырвонай коўдрай, стол, пара крэслаў. На стале кнігі. Побач люстэрка, яшчэ колькі дзявочых прылад.

— Ну во... яшчэ ніхто не ўкусіў вас? Трымайцеся, зараз укусіць...

Даніла ўсміхнуўся.

—Кіньце ўжо смяяцца. Я ж думаў, можа, вам гэта няловка...

— А, дзякую... Ну, сядайце ў мяне.

Даніла адчуваў сябе не падта добра. Чужая кватэра, вока на вока з дзяўчынай... Жонка не выходзіла з галавы, і ўсё турбавала думка: ці пазнала яго гаспадыня?.. Тады толькі пачуў сябе больш-менш вольна, як запэўніў сам сябе, што па дзелу прыйшоў — кніжку ўзяць.

Сядзелі доўга, больш, як гадзіну. Пераглядалі кніжкі, гутарылі. Гадзіна хутка праляцела.

Тады ўжо Даніле і йсці не хацелася. Прыемна было сядзець тут, у прытульным пакойчыку, поплеч з гэтай дзяўчынай. Шэрыя вочкі... Здаецца, глядзеў бы ў іх без канца — у прамяністыя, бяздонна глыбокія...

Выйшаў Даніла, як у чадзе. Чорная поч ахаладзіла твар, але не ахаладзіла думак. Ішоў у цемры, як зачараваны. Не ўгледзеў, як к двару падышоў. Махінальна паляпаў у дзверы, а сам у задуменні глядзеў у густую цемень-заслону.

Ноч была цёмпая-цёмпая...

У сенцах пачуліся крокі, Даніла схамянуўся, узяўся за клямку. Чагось асабліва ўважна прыслухаўся, што чуваць з-за дзвярэй. Нудным, агідным здалося заспанае са-

пеше і буркатня жонкі. Увайшоў у хату, як у чужую, непрытульную...

Жонка варочалася, сапела па ложку. Бурчэла...

— Дзе гэта шлындаў дасюль?

— Сходка была,— адказаў Данііла.

4

З таго часу ўсё дыбарам пайшло. У Данілы нешта ламалася ўнутры, нешта ўздымалася — вялізнае, моцнае, важкае. Быццам ляжаў недзе глыбока-глыбока тоўсты пласт — закарэў, зляжаўся, засох. І вось нехта крышыць, ламае яго. З кавалкаў будуе новы будынак — высокі, смелы, як барыкада.

Хмарай уздымаецца ныл, парахня. Часамі душыць — галава баліць....

Цяжка Данілу. Чуе, як крышыцца нутро. Баліць. Але трывае і рад. Адзін бы не вытрываў: Ганна... Яна заўладала нутром. І не страшна. Няхай...

Чуў Данііла жыццё. Кожная жылка яго адбівала. Пранікала яно ў самую глыб, кратала ўсё, варушыла. Часамі балюча было — ну, дык што: без горкага й салодкае не будзе салодкім.

Рос Данііла. Нутром рос, уздымаўся духам. Бачыў вакол усё болей прыгожых, таемных абшараў. І пазнаў, што магутны чалавек. Магутны і вольны...

З Ганнай сышоўся. Доўга баяўся сказаць сам сабе, прызнацца; баяўся і думаць. Толькі, як восень ужо маханула сваім брудным, набракшым вільгаццю скрыдлам, як праляцелі ўжо, згінулі душна квяцістыя, светлыя дні,— толькі тады адважыўся сказаць сам сабе:

— Ганну люблю.

Ямы часта сядзелі ўдваіх у яе прытульным куточку. Вечары — цягучыя, доўгія — праляталі неўзаметку і былі гэткія ціхія, ласкавыя. Што яны рабілі?

Усяк было: то чыталі, то гутарылі, спрачаліся. Заўсёды разам, поплеч сядзелі адзін з адным. Заўсёды ён адчуваў, як нейкія нявідныя ніткі злучалі яго з Гапуляй. Яны дрыгацелі мякка, квола, прыемна казыталі нервы. Яна здавалася блізкай-блізкай, адчувалася ўсёй істотай, пераараблялася ў частку самога сябе.

А шэрыя вочкі зззялі роўным агнём: заўсёды роўна, адналькава несцілі, грэлі...

Быў вечар. Яны сядзелі, апавітыя дзіўнай прытульнасцю. Разам лёталі смелымі думкамі, марылі, загадвалі.

Дасюль Даніла піколі не думаў аб чымсьці агульным, вялікім, што заходзіць за межы ўласнага жыцця, рукой махаў на ўсякую «палітыку». Цяпер іпачай. Цяпер разам, рука ў руку, яны луналі ў шырокіх, невядомых, але чароўных абшарах; разам загараліся маладымі парываннямі, жаданнем пазнаць усё чыста. Пазнаць — і зрабіць нешта важнае, пільнае...

Лямпа безуважна асвятляла роўным бляскам іх абуджаныя твары. Ён стукаў кулаком па стале.

— Гэта праўда... Жыццё само паказвае. Кіруе... Людзі што дробныя часткі магутнай, вялізнай машыны... закон, непарушны закон жыцця... Пазнаць гэты закон — значыць — стаць з нічога ўсім... І цікава гэта штука: маленькі шрубчык раптам пазнае ўвесь складаны механізм машыны. Што ж тады?..

— А тады ён пачынае рабіць. Заўважыў дзе на сабе ці каля сябе ржу якую — прэч! Бачыць, што якая часціна машыны сапсулася, замінае толькі — прэч яе...

— Ха-ха-ха!.. А тады дабярэцца й да ўсяе машыны, пераробіць яе на свой капыл... Добра... А ведаеце, Ганна, мы ж пазналі гэты закон...

— Ну? Ці ткі пазналі?.. Даўно? Мы дык гэта ўжо больш паўсотні гадоў як ведаем. А вы трохі спазніліся, здаецца, Даніла Кірылавіч...

Даніла пацёр мокры лоб.

— Вы жартаваць любіце, Ганна. Яно й праўда, што я цяпер толькі гэта пазнаў... І, ведаеце, жыццё стала цікава. Ахвота бярэ жыць. Працуеш — і то з ахвотаю...

— Гэта, ведаеце, што з вамі стала? Не? Я вам скажу... Вы на камуністага трохі падобны сталі... Ну, але ладна... Даклад у вас гатовы? Не? Вось і працаўнік. Відаць, што ахвоты ў вас да працы уй-юй-юй колькі!..

— Я зараз вазьмуся. Трэба кніжку во гэту прачытаць.

— А я не буду вам замінаць, пайду гарбату наладжу...

Яна выйшла на кухню. Даніла раскрыў кніжку, прачытаў колькі радкоў і не зразумеў нічога. Куды там! Каб гэта з ёй разам, тады ўсё зразумела. Тады ўсе думкі ў дварьі. А то — адна там, другая там, ліха ведае што такое...

А Ганна ўсё роўна тут, пікуды не выходзіць. Зірнеш у кнігу, дык між радкоў — шэрыя вочкі... Дражняць, смяюцца...

Даніла ўпяўся вачмі ў святло, задумаўся. Не ўгледзеў,

як падышла Ганна. Моўчкі абхапіла рукой яго кудлатую галаву, паварушыла.

— Працаўнік!..

Ён узяў яе руку, адхіліў убок. Потым...

Ён ніколі не думаў, што зробіць гэта... Прыхіліў яе да сябе і моцна, горача сціснуў у сваіх абнімках. Пачуў пад рукамі жаркае, крамянае дзявочае цела. Сэрца забілася, у галаве кляўцы затукалі. Хваля — гарачая, бурлівая ўзнялася, усяго заліла. Яшчэ мацней сціснуў, шукаў вуснамі твару...

Яна вырвалася, адскочыла.

— Як вы смееце! Ноччу... дзяўчыну... Нахал! Вон пайшлі! Вон!..

Нават нагой тупнула...

У Данілы ўсярэдзіне пуста стала. Да болю пуста. Быццам усё павысыпалася. Стаяў воддаль, вінавата ўтуліўшыся, зрэдку кідаў з-пад лоба палахлівы погляд. Бачыў адны шэрыя бліскучыя вочы. А ў іх... гнеў?.. Не, нешта іншае. Зорачкамі зіхацяць гарэзлівыя іскрачкі... Вуспы дрыжаць, быццам ад стрымленага смеху...

— Што ж гэта?!

А Ганна пакацілася на ложку ў нейкім адчайным, гуллівым смеху.

Даніла зусім асалапеў. Як ні напружваў свой розум, нічога не мог зразумець.

А Ганна смяялася.

— Чаго вы? — спытаўся.

— Ой! Ой! Каб вы знялі, які ў вас выгляд быў... ха-ха-ха!..

Зноў пакацілася. Зірнула на яго — яшчэ горш...

— Ды кіньце вы, Даніла... Хіба хочаце, каб я памёрла ад смеху... Досыць стаяць аслупяцеўшы. Сядзьце лепей!..

Даніла сеў.

— Ну і дзівак вы. Ці як гэтак можна? Няўжо вы ў сапраўды падумалі, што я так раззлавалася... Мо думалі, што спалохалася? Ды не, я мужчын не баюся, я ж не інстытутка...

— Але я ўсё-такі нічога не разумею.

— Тут і разумець няма чаго. Гэта нават не было для мяне неспадзявана. Я ж даўно знаю, што падабаюся вам... Нават больш таго: знаю тое, чаго вы не ведаеце. Я знаю, што і вы мне падабаецеся... Што, не верыце? Не? Хочаце, я пераканаю вас... Хочаце?

Яна раптам падбегла да яго, ускочыла к яму на калі, абняла горача, моцна і стала цалаваць...

— Во! Во! Цяпер верыш? верыш?..

Даніла нясмела абнімаў яе гарачы стан...

5

Жыдкая гразь слюнява лізала ногі. Цвякала.

Было цёмна, як у магіле. Толькі здалёк, з канца вуліцы, ліхтар скрозь туман падміргваў. Плюскаў чагосьці мокрым вокам. Мо плакаў?..

Каля дома свайго Даніла ў лужыну ўпёрся. Не заўважыў. Ля дзвярэй спыніўся. Узняў руку паляпаць, але заместа таго абапёрся на дзверы і ўтаропіўся ў цемру. Туды, назад...

Яшчэ гарэў твар, яшчэ нешта салодкае пералівалася ўсярэдзіне. П'яніла, ружовым тлумам галаву спавівала. Глядзеў у тупую, мокрую цемень і бачыў... яе бачыў, ласкі яе адчуваў.

Стаяў, пакуль не працяла наскрозь мокрая золь. Тады здрыгануўся і з давольнай усмешкай абярнуўся к дзвярам.

Заспаная жонка. Бруд. Нейкі пах непрыемны на кухні. Цяжэрная ціша, маўчанка...

Даніла паморшчыўся. Утуліўся сам у сябе, быццам адмежаваўся ад усяго, што навокал. Вошчупкам насунуўся ў свой куток.

Доўга не спаў. Не мог заснуць, не давала Гануля. Чуць заплюшчыць вочы — іскрысты туман віхаецца, звонам няўпынным звоніць. Рассуваецца і паказвае Ганну. Яна таксама віхаецца. То нахіляецца блізка-блізка, вусны чуваць, то далёка адносіцца, здалёк мігаціць. Круціцца... І соладка і дрэнна. Нудзіць нешта... А вочы расплюшчыў — цемра адна.

Раз-поразу жонка цяжка на ложку варочалася. Стагнала, нешта бурчэла. Не разабраць... Не спіць, пэўна.

Тады Даніла настаражкваўся, адганяў ад сябе вобраз Гануліі, напружна, нецярпліва чакаў, пакуль сціхамірыцца жонка. Потым ізноў аддаваўся ва ўладу гарачых, захапляючых думак, мар.

Зноў бачыў Гапулю, чуў яе блізкасць...

Пад раніе заснуў, але раптам праспуўся, бо дзень зашарэў; час на работу ісці. Потым успомніў — нядзеля! — усміхпуўся здаволена і зноў заснуў.

Абудзіў грукат на кухні: жонка качэргамі арудвала.

Уявіў сабе яе — худую, высокую, чорную. Яшчэ не старая гадамі, а ўжо састарылася. Жыццё наклала пячатку. Непрыгожая...

Данілу не хацелася ўставаць. Не хацелася сустракацца з Арынай. Знаў, што пойдуць упінкі, сварка. Абрыдла.

Ляжаў, не варушыўся. З спальні выбегла Манька, дачушка. Белешькая, маленькая. Даніла заплюшчыў вочы, прыкінуўся, што спіць. Яна спынілася ля яго і ціха, нясмела гукнула:

— Татка!

Даніла не вытрымаў. Схапіў на рукі дзяўчынку, пасадзіў к сабе на ложак. Яна сядзела, утупіўшы вочы. У руцэ абаранак трымала.

— Хто табе даў? — спытаўся бацька.

— Мамка,— ледзь чутна прашаптала і потым дадала троху весялей:

— А ў Сцёпкі няма... Ён свой з'еў... Во...

У Данілы сціснулася сэрца. Шкада стала дзяўчынкі. Чаго — і сам не разумеў. Потым успомніў тое, што было ўчора; успомніў, што даўно ўжо ад дзяцей, ад сям'і адарваўся, і сорамна зрабілася. Сорамна да болю.

А Манька ажывілася, лапатала.

— А ў мяне лялька ёсць... Прыгожая... Во...

— Ну? Дзе ж яна?

— Там.

— Апу-тку прынясі, пакажы...

Яна саскочыла, пабегла ў спальню і зараз вярнулася з самадзелкавай лялькай. За ёй паказалася калматая галавёнка Сцёпкі.

— А ў мяне конь ёсць!..

— Давай яго сюды.

Праз момант абодва сядзелі ў яго на ложку і напераборай лапаталі...

— Сцёпка! Манька! — пачулася з кухні.— Мыцца хадзіце! Зараз спедаць будзем.

Ускочылі, пабеглі смеючыся.

Даніла стаў апранацца. Апрануўшыся, доўга не важыўся выйсці па кухню. Адтуль чувалася звычайнае сямейнае жыццё: дзеці пішчэлі, матка сціпала іх. Гэта пужала яго: адвык ад сям'і. Лішнім зрабіўся, а сям'я — для яго. Дзеці... Яны любыя, бедныя дзеткі. Кветачкі дробненькія...

Як выйшаў у кухню, не глядзеў на Арыну. Толькі, як сеў на лаўку, пасмела перавёў погляд з дзяцей на яе.

Яна маўчала, сціснуўшы вусны. Худая якая! Яшчэ больш пахудзела. Кругі пад вачмі — сіняя, страшныя. Але не шкада было — проста цікава...

Дзеці за стол пазалезлі, штурхаючыся. Яна гаршушак паставіла з бульбай. Накінуліся, што галодныя ваўчаняты. Сцёпка праз туга напхнуты рот пракулдаячыў:

— Татка, чаму снедаць не йдзеш?

Арына нервова галавой дзергапула.

— Татку не трэба снедаць. Ён добра ўчора павячэраў. У яго ёсць дзе паласавацца. Знайшоў сабе месца...

Пачалося... Даніла выйшаў у пакой. Спяшаючыся, стаў апранацца. Хутчэй, каб не чуць...

А з кухні няслося — Арыну прарвала:

— Злодзей ты! Згубіцель наш! Дакуль гэта я пакутваць буду... Дакуль мае дзеткі мучыцца будуць... Дзетухны мае родныя! Ясачкі мае! Няма ў вас бацькі... Злодзей гэта, злодзей... Адрокся ён ад вас, мае любыя. Знайшоў сабе шлюху... Ходзіць, каб яго нутро так хадзіла!

Даніла не мог трымаць: сэрца на часткі рвалася. Рукі трасліся, як апранаўся. Угрунь кінуўся з хаты.

Як праходзіў праз кухню, зірнуў на дзяцей. Бедныя... Твары застыглі ў недаўменні, адчаі. У Сцёпкі так і застаўся поўна напхнуты рот. Кінуў есці. З'есць тады хіба, як пасоліць слязьмі. А яны капаюць ужо, коцяцца буйнымі кроплямі...

Уваччу ў Данілы засталіся дзеці. Не мог пазбыцца. Ішоў і бачыў перад сабой толькі іх, гаротных, пакрыўджаных. У горле пешта клубком звівалася, душыла. Грудзі балелі ад мукі.

Што ж рабіць? Вярнуцца? Пагадзіцца з Арынай, з жыццём шэрым, будзённым?

Не, не змога! Жыць хочацца, жыць!.. Разумець, адчуваць жыццё. Будаваць яго, тварыць... А тут... Пахаваць сябе... Не!..

Уявіў сабе ранейшае: клапоты, турботы... Адны ўсягды... Хлеба, дроў, адзежы... І ўсё жыццё ў гэтым. Жыццё ўсё... Ланцугі!..

Ішоў Даніла і не знаў сам — куды. Безуважна сігаў па гразі, не ўважаў, што наўкола. Мо затым не ўважаў, што наўкола ўсё было таксама невясёлае, змрочнае, брудпае. Плакаў горад, плакала ўсё. Плакала неяк слізка, агідна, як той старац, што сядзіць на рагу вуліцы. Не плач, а слюмачанне нейкае...

Не ўгледзеў Даніла, як к заводу прыйшоў. Пахадзіў трохі вакол і ў клуб накіраваўся.

Там было ціха, пуста. У чытальні таксама нікога, адна бібліятэкарша. Пульхная, свежа-гнілая. Мухамор... Не любіць Даніла.

Не прывітаўся. Сеў за стол, газету ўзяў. Але не чыталася, не да таго было. Усё думаў. І слухаў, як душа баліць, ламаецца.

Прыйшоў Змітровіч, сакратар ячэйкі. Убачыў Даніла — усміхнуўся. Знае ўсё пра Даніла. Але нішто, не прыкра. Бо добры сябрук, хоць часам пасмяецца трохі, пашкеліць...

Падышоў, лэпнуў Даніла па плячах.

— Ну як, Даніла?

— Дрэнна.

— Што, жонка сварыцца?

— Ат!..

— Знаю, брат, знаю. Ці толькі ў цябе? Цяпер, брат, усё так... Крызіс быту, як кажуць. Ты што, разводзіцца думаеш?

Даніла здрыгануўся, з спалохам утаропіўся ў Змітровіча. Як ён проста!..

— Не думаў аб гэтым.

— Ага... Гэта самае лепшае. Гэта ўсё развяжа. Што ж цягнуць... Калі вы адзін аднаго не разумееце, калі у вас нічога няма супольнага...

Даніла ў вачах дзеці паўсталі: гаротныя тварыкі, буйныя слёзы, дзіцячае гора ў вачах блакітных.

— Дзеці! — вымавіў з сумам.

— А... Гэта горш... У дзіцячы дом аддаць, мы паклапочам.

— Не дасць яна, нізашто не дасць. Голадам паморыць, а не аддасць. Я знаю яе.

— Ну, мала што... І сілком можна ўзяць, цераз суд.

— А як, хіба суд прысудзіць можа?

— Вядома.

Гутарка перайшла на драбноты, на спосабы, як можна ўладзіць усё гэта. Даніла й не прыкмеціў, як думка аб разводзе ўсур'ёз захапіла яго. Гэта выйшла неяк раптам, нечакана. І цяпер Даніла выпытваў у Змітровіча пра ўсе парадкі, законы, усё абмяркоўваў, быццам справа гэта даўно вырашана і засталося толькі здзейсніць яе. Ясней стала і лягчэй.

У гутарцы Змітровіч неяк сыпаўся:

— А Матузова як жыве?

І ўсміхнуўся. За ім Даніла. Уявіў сабе Ганну— свежую, маладую, моцную. Цяплом нутро сагрэлася. Пачуў сябе дужэйшым, пачуў падвоеную сілу. Успомніў, што ўчора было.

— Ганна разумная,— адказаў.

— Толькі?.. Глядзі, брат Даніла, каб не выйшаў шык у цябе... Мо толькі з-за дзеўкі і гармідар узняў?

— Нічога я не ведаю...

— Што, сэрца на старасці зажадала кахання, а?..

Данілу ўжо весела, добра было. З ахвотай на жарты Змітровіча адказваў жартамі...

6

Ганна вясёлая была дзяўчына. Любіла і з хлопцамі часам пакарагодзіцца. А яны за ёй — на перапехі...

Часам моладзь вечарынкі наладжвала. Трэба ж адпачыць, забавіцца: маладосць свайго патрабуе. Даніла, вячыць, не хадзіў на іх: куды ямму, старому... І раней — нідома, што, а цяпер — мука. Хочацца заўсёды быць з Ганнай. Без яе — пуда, жыццё не люба.

Вось і сягоння... Сядзіць у чытальні, бо ў двор пайсці — сварка, упінкі вечныя. А Ганна на вечарынцы ў прыяцелькі.

Сумна Даніле. Чагось не стае. Няма яе — значыць, пуста. Нічога няма. Ходзяць вакол, сядзяць, чытаюць, часам гутаркай кратаюць, а пуста ўсё роўна. У кніжцы, у газеце — таксама пуста. Ёсць нейкія словы, але сухія, застыглыя. Парахпя... Словы таксама пустыя.

Цягне ў Данілы пешта з сэрца, цэдзіць нуду шэрую, цягучую — талакно гнілое. Думкі — таксама шэрыя. Невясёлыя. Родзяць абразы беспрасветныя, цяжар на душу накладаюць.

А тут яшчэ гэты Аўсеенка. Павярнуўся толькі, а след накінуў — нейкую трывогу ўзняў невыразную.

Падышоў адзаду, хіхікнуў, паказаў твар свой агідны, хітры.

— Добры вечар, Чаборскі! Хе-хе... чытаеш? Лій думаеш? Аб чым? Хе-хе... Аб міжнароднай палітыцы?..

У, брыда! Так і лезе ў душу. Калупае жорсткімі пальцамі.

— А Матузова дзе? Хе-хе-хе...

— А я адкуль ведаю.

— Не ведаеш?.. У Рабавай вечарынка сягоння. Можа, там?

— Можа, і там. Схадзі, паглядзі...

— Хе-хе-хе... Можа, каму больш цікава паглядзець, хе-хе!..

Падмігнуў, засмяяўся брэхам шчанячым, знік. Даніла яму ўслед шчырую лаянку ў думках паслаў.

А сам занепакоіўся. Чаго? — невядома. Да нуды турбота нейкая няясная далучылася. Разам апанавала, захапіла, прымусіла зрушыцца з месца. Куды — усё роўна. Абы не сядзець. Цяжка.

Выйшаў па вуліцу. Здзівіўся, што суха. Мо раней не прыкмеціў, а мо цяпер толькі сціснуў мароз, высушыў раптам восенныя слёзы.

Лёгка на дварэ. Грудзі п'юць набгом свежае, халоднае паветра. Многа яго, поўна ўсюды! Угару куды раздалося — да самых зорак! Вунь яны зіхацяць — чысцюткія, вострыя. Міргаюць, смяюцца...

А ўсцяж па вуліцы — таксама зоркі. Знікаюць далёка-далёка. Прыгожа. Добра так.

Ідзеш — тук! тук! ту!.. Гулка, смела раздаюцца крокі. Аж на другі бок вуліцы пералятаюць. І наўмысля цвярдзей пагамі ступаеш. Няхай далей, яшчэ далей ляцяць зыкі, няхай будзяць вячэрні спакой!..

На галоўнай вуліцы — тлум, гоман. Гуляюць пярэстай, гаварлівай грамадой. Вокны ззяюць раскошай, багаццем. І людзі таксама.

Нэп. Весяляцца, рагочуць, ловяць жыццё... Ладна. Жывіце, святкуйце... Лавіце хвіліны — яны вашыя... Толькі хвіліны, бо час наш, бо мы ўладары жыцця — наша яно...

Успомнілася Данілу даўнейшая гутарка з Гаппай.

— Свінні. Завадскія свінні...

Даніла ўзняў галаву. Ішоў проста, нікому не даваў дарогі. Адчуваў нейкую гордасць, давольпасць.

— Глядзіце на нас! Гэта мы — пралетары. Захочам — і не будзе вашага бляску, раскошы...

А як дайшоў да канца вуліцы, спыніўся і не знаў, куды йсці. Доўга стаяў, пакуль падумаў, адважыўся. Пайшоў туды, дзе жыла Рабава.

Чаго там? Хіба ён не малады? Хіба яму нельга гуляць?..

Ішоў усё нябчэй і нябчэй. Каб не спазніцца, каб не прыйсці, як шапкі разбіраць будуць. Тады сорамна будзе...

Як падыходзіў ужо, парачку ўбачыў, гуляла па вуліцы. Міжвольна ход замарудзіў. Можа, Ганна?..

І нейкая незразумелая трывога скрабанула за сэрца.

Спаткаўся. Не... Хлопец знаёмы з дзяўчынай. Хлопец прыгледзеўся да яго, пазнаў.

— А, Даніла! Адкуль, куды?.. На вечарынку ідзі к Рабаваї! Там усе нашы.

— У Рабаваї? — перапытаў Даніла.

— Во тут, за рогам. Агонь там убачыш...

Данілу захацелася ўгрунь пабегчы.

— Значыцца, нішто... Нават запрашаюць...

А Ганна ўвачыу, як жывая...

У невялічкім пакоі, што селядцоў у бочцы, людзей напабіта было. У кутку хлопец на гармоні рыпаў. Усё — моладзь. Свае.

Ганну Даніла адразу ўбачыў... На ложку сядзела. А поплеч Змітровіч. З захапленнем гаварылі аб нечым. Як убачыла Данілу, быццам здрыганулася, на твары цень нездаволення прамігнуў. А мо так здалося Данілу?

Азвалася першая:

— А... Даніла. Адкуль гэта ты? Як сюды трапіў?

Змітровіч глядзеў з нейкай гультаяватай усмешкай. Прыкрай яна здавалася Данілу. І да Ганны нейкая варожасць з'явілася. Ледзь прыкметная. Не адказаў ёй, звярнуўся да ўсіх:

— Добры вечар, кампанія! Старых прымаеце?

— Прымаем! Сядай!..

А адзін з кутка важна адазваўся:

— Старых з маладым сэрцам — ахвотна...

Даніла падсеў к гуртку хлапцоў. Гаманіў з імі і разам сачыў за Ганнай. Яна таксама кідала на яго погляды. Усміхалася. І ўсё з Змітровічам гаманіла.

Данілу не па сабе было. Не знаў, што рабіць. Адчуваў сябе не на сваім месцы. І дужа ўзрадаваўся, як хлопцы папрасілі на гармоні сыграць.

Іграў Даніла па-мастацку. Калісь на заводзе першым гарманістам быў. Гармонь у яго руках жывой рабілася, пела галасамі чароўнымі, захапляючымі. То плакала, галасіла — сэрца жалем сціскала,— а то ўраз рассыпалася радаснымі, гуллівымі акордамі, узбуджала маладыя, бурлівыя настроі.

Цяпер Даніла зайграў нешта сумнае-сумнае. Плакала гармонь, жалобу адвечную ў зыкі ўкладала.

Усе паціхлі, слухалі. Ганна таксама сціхла. Глядзела

па Данілу. Сур'ёзна, глыбока глядзела. У шэрых вачах бяздонне адкрылася, сумам спавітае.

Даніла зірнуў на яе. Стрэўся поглядам. Злёгку ўсміхнуўся. Яна быццам схапянулася, галавой трахнула...

— Годзе, Даніла! Каму нахаванне граеш?..

— Таму, што не верыцца.

Ён сышыўся.

— А цяпер — таму, што жыве і жыць будзе!.. Міхась, выхадзі!..

Трахануў валасамі, адкінуўся назад, шырокім, смелым махам гармонь ірвануў.

Брызганула, зайскрылася бурна-гуллівае. Зайграла ўсмешкамі па тварах, аганькамі ў вачах. Міхась — спрытны хлопец — выскачыў, у бокі ўзяўся, застыгнуў у маладзецкай постаці...

— Э-э-э-х!

І ў скокі пусціўся...

Потым агульныя скокі пайшлі. Даніла іграў, ні на часінку не пакідаў гармоні. Ганна не скакала. Лдзін хлопец выцягнуў быў яе, крутануў колькі разоў пад агульны рогат дый пусціў — не хоча.

Вечарынка позна кончылася, гадзіне а чацвёртай. Даніла падышоў да Ганны.

— Дахаты разам пойдзем?

— Ну, вядома. Чаго пытаешся? З кім жа я пайду?

І яна загадкава ўсміхнулася. Даніла не зразумеў гэтае ўсмешкі.

Дарогай маўчаў. Змора адчувалася. Л ўсярэдзіне ссала пешта, нейкае новае пачуццё раджалася. Якое — не знаў Даніла. Невыразнае. Але звязанае з Ганнай.

Ганна азвала яго:

— Што маўчыш, мой дзядулька? Злуеш, можа?

— На каго?

— Можа, на мяне?

— Ды не, за што я буду злаваць. Так, пешта дрэнна... Змора неїкая... Цяжка. Падумаеш — страшна робіцца. Слабы я, Ганна. Мо стары ўжо, затым... Каб што яснае, выразнае, а то — цемра. Невядома, што далеї...

— Глупства. Што далеї? Усё, што належа... Будзем жыць, працаваць... Чаго ж табе яшчэ?

— Жонку кіну, сям'ю... Л ці ведаеш ты, Ганна, што ўрасла яна ўжо ў мяне... сям'я... Часткаї мяне зрабілася. Л тады што ж: пуста... Чым запоўніць?

— Ну, аб гэтым і думаць не варта. Запоўніць? Лбы

посуд быў, а чаго паліць — стане... Ды што ты нешта? То бадзёры быў, смелы, жыць хацеў, а то... нядобра гэта.

Даніла маўчаў трохі.

— Ты, Ганна, дужэйшая за мяне. Ты маладая. І ты падтрымліваеш мяне...

— Куды там!..

— А знаеш, Ганна, чаго я баюся?

— Ну?

— Я баюся, што западта люблю цябе...

— Ат, кіпь ты... Люблю, люблю... Трэба прасцей па рэчы глядзець. Ну, здружыліся, зразумелі адзін адпаго... Ну, можа, упадабалася табе трохі... як жанчына... Хочаш мяне... Навошта выдумваць яшчэ нешта надзвычайнае, вялізнае, страшное... Час ужо знаць, што такое любоў...

— Ды я не спрачаюся. Ну, няхай так, няхай любоў — гэта тое, што ты гаворыш... Дык хіба не можа быць яно моцным, вялізным, такім, што — страшна...

— Ат!..

Колькі часу маўчалі. Загаманіла зноў Ганна:

— Гэта праўда, нядужы ты. Мала ў цябе гэтага задору жыццёвага, упартасці... Не стары ты... надарваўся...

— Надарваўся... Ну, вядома, надарваўся... Але ж хочацца быць дужым, смелым, упартым...

Памаўчаў трохі.

— Слухай, Ганна! Ты паможаш мне, ты не пакінеш мяне?..

Нейкая трывога чувалася ў голасе. З напружанасцю чакаў адказу.

— Адкуль жа я ведаю,— ціха сказала Ганна.

7

Ляцелі дзянькі. Яны заўсёды ляцяць, мільгаюць у вечнасці, як матылі. Ніколі не спыняюцца. Мо б каму й хацелася іх спыніць, затрымаць, але дарма!

Вось Даніле часам таксама дужа хацелася спыніць бягучы час, каб застыгнуў ён на адным моманце, каб тое, што перажываў ён у той момант, век не знікала...

А часамі інакш. Часамі нудна было, і жыццё маруднным здавалася. Тады — каб шпарчэй, каб не прыкмячаць, як цягнецца час, каб не адчуваць яго пуднага поступу... Або — праваліцца ў скрозьдонне...

Усяк было...

Ужо, растрасаючы мокрую жоўць, пракавыляў кастрычнік. Лістапад скуў ледзянымі ланцугамі аголеную зямлю. Ужо марозная празрыстасцю працялося паветра. Але снегу яшчэ не было — рана.

Адсвяткавалі вялікае свята — гадавіну Кастрычніка. Хораша было. У Данілы ўвесь дзень быў узняты настрой. Як ішоў у дэманстрацыі, пяяў на ўсё горла. І ў вачах быў агонь. Сталёвы... Адчуваў сябе часткай магутнага, моцнага і сам быў смелы, магутны.

Чырвань усюды ззяла пабедна, урачыста. Чырвань гарэла крывавым агнём. І агнём разлівалася наўкола. Запальвала, уздымала, абуджала.

Даніла ішоў поплеч з Ганнай і рад быў, што яна маленькай, нязначнай цяпер здавалася. Цяпер Даніла быў сам моцны, дужы. І думаў са здавальненнем:

— Дык не, не з-за Ганны ўсё гэта — яна таксама — дробязь. А цягне мяне, уздымае з жыццёвае багны во гэта — чырвонае. Агульнае, вялікае і магутнае. Яно ўсім дае моцы, усіх адраджае.

І з натхненнем глядзеў уперад, скрозь людзей, скрозь будынкі і бачыў, як у сне, нешта таемна-прыгожае. Такое, што ні да чаго не падобна, што ў зорных праменнях...

А ўвечары быў спектакль у клубе. Ганна на сцэне іграла, Даніла сядзеў сярод людзей адзінотны, пакінуты. Прынамсі настрой быў такі ў яго.

Чагосьці нялоўка было. Асабліва як вуха лавіла гуркі пра Ганну. Усе казалі, што добра іграе яна. Хвалілі. Даніла тады тупіўся, нават чырванеў.

Дзіўна гэта... Яму чагось быццам стыдна было за Ганну. А мо не падабалася, што ўсіхная яна сёння, што ад яго далёкая? Хто яго ведае... Толькі дрэнна было яму. І без следу згінуў святочны настрой.

На сцэне таксама Змітровіч іграў, Ганнінага каханка. Як заставаліся яны разам на сцэне, як кахаліся, мілаваліся, тады ў Данілы едкім шчолкам аблівалася путро. Здавалася, што усе на яго глядзяць, хоць, пэўна, ніхто і не думаў. Здавалася таксама, што западта шчырасці ў Ганны з Змітровічам, што не ўграюць яны, а ўзапраўды кахаюцца.

Злосць ахапляла, рэўнасць дурная чарвяком атрутным шавялілася.

Нялюба ёй тое было, што на сцэне Ганна надта прыгожая была. Такая, што ўсе захапляліся, усе любаваліся ёй.

Як кончыўся спектакль, Даніла за сцэну пайшоў, туды, дзе артысты малююцца.

У невялічкай каморцы тлум стаяў страшэнны. Артысты разгрыміроўваліся. Жартавалі, смяяліся.

Даніла не ўвайшоў у каморку. Спыніўся перад напаўадчыненымі дзвярмі і з цікавасцю азірнуў пакой.

Ля стала мітусіліся хлопцы, дзяўчаты, з гвалтам хапалі адзін у аднаго баначкі, люстэркі, шмотачкі. Сумятня страшэнная...

А воддаль у кутку Ганна стаяла з Змітровічам. Ён хустачкай твар выціраў ёй. Жартуючы, цёр там, дзе не трэба. Яна быццам злавалася, кідала на яго прытворна-сярдзіты погляд. Але Даніла ўбачыў нешта іншае ў бліскучых шэрых вачах, тых, што часамі чароўным святлом сагравалі яго, песцілі, заманьвалі ў сваё прамяністае бяздонне...

Даніла стаяў скамянелы. Сударгава схапіўся за прыталку. Агіднае, нават для яго самога, пачуццё расло ўсярэдзіне. Чуў, як крывяцца вуспы ў хваравітую ўсмешку, як агідпая злосць абурае. Чакаў, што далей...

А Змітровіч усё жартаваў з Ганнай. Узяў пушачку з пудрай і стаў яе пудрыць. Яна заплюшчыла вочы і ўсміхнулася пейкай дзіцячай, чароўнай усмешкай. Потым ён выцер пудру, адхіліўся, нібы разглядаючы, любуючыся яе тварам, і потым... шчыра, горача пацалаваў яе ў вусны.

Яна схапяпулася і з вясёлым, гарэзлівым смехам пагпалася за ім.

Колькі хвілінак тузаліся па пакоі. Потым — змораныя, вясёлыя, маладыя — паваліліся на канапу і ўглыбіліся ў жвавую гутарку.

Што з Данілам рабілася — і сам ён не ведаў. Непрыстойпа тросся ў ліхаманкавым абурэнні.

Туды кінуцца... Да іх... Разарваць на шкумаццё гэтага маладога, нялюбага...

Не, смех будзе. Сорамна... Пабегчы... згінуць... схавацца... Не бачыць, не ведаць нічога!..

І ён пабег, што звар'яцелы. Увушшу пякельныя званы перазвоньвалі, рэзалі нутро...

— Як яна... З ім... Жартуюць... цалуюцца... Здрадніца!..

З клуба ўгрунь выбег...

А на дварэ — празрыста-сталёвая ноч. Маладзік малако разліў. Сцюдзёнае. Яно прыемна галаву ахаладжае.

У Данілы прасвятляецца, знікае туман. Злосная на-

пружнасць змяняецца зморай. Але змора нервовая: ліхаманка трасе, хоць і не надта сцюдзёна.

Зноў Даніла маленькі, недалужны. Плакаць хочацца. Хочацца выплакаць усё, крывавымі слязьмі...

Ён не злосны ўжо на Ганулю. Ён кахае яе, яна — дарагая яму... Ён, здаецца, маліўся б ёй, каб толькі яго не кінула. Ён слабы, надарваны...

Дык ці ж ён вінаваты? З дзяцінства працуе, цяжка, да знямогі працуе. З дзяцінства яго рукі вунь у якіх мазалях. Карузлыя... Ён выклаў сілы, ён выпетраў увесь. Ён стары ўжо, хоць трыццаць пяць гадоў толькі мае... Дык што ж яму рабіць?..

Страшная гэта Ганна. Страшная затым, што незразумелая, дзіўная... І разам простая. Яна ўсё проста, праўдзіва робіць, так, як належыць... І калі з Змітровічам — таксама праўдзіва... А ён, Даніла, няздольны, ён заблытаны ў сетцы. І век заблытаны быў — не вырвацца. Урос у старое...

Ішоў Даніла проста туды, к Ганнінай кватэры. Не мог больш нікуды ісці, бо куды ж пойдзе? Дахаты? Не! Куды хоця, толькі не дахаты. Асабліва сягоння. Сягоння ён яе павінен бачыць... Вось сядзе на ганку і будзе чакаць. Будзе сядзець, пакуль не прыйдзе яна.

Так і зрабіў. Прытуліўся ў куточак, захінуўся шчыльней, бо сцюдзёна, і сціхамірыўся, аддаўшыся думкам на волю.

І паплылі яны — няясныя, халодныя. Абудзілі пачуццё глыбокай адзіноты, адарванасці ад усяго.

Вось навакол... Горад. Людзі жывуць. Спяць каторыя, каторыя гуляюць. Вунь нават песня недзе тонкім срэбрам ліецца...

А ён асобна... Ён адзін... У яго няма таго, што ва ўсіх. Ён воддаль стаіць, адзінотны...

Гэтак думаў Даніла, аж пакуль за рогам галасы не пачуліся...

— Ганна! — усхапіўся Даніла і зараз жа ўцяміў, што з ім ідзе... з Змітровічам...

Настаражыўся, што заяц... Шкада, не відаць. Пэўна, пад ручку, а мо абняўшыся...

Спыніліся. Гутараць. Што — не разабраць. Зараз развітаюцца. Ці пацалуюцца на развітанне?..

Даніла з болем, з напружаннем чакаў пацалунку. Ён жадаў яго, ён быў патрэбны яму, каб падагрэць пачуццё рэўнасці...

Хто яго ведае... Можа, далёка? Толькі не пачуў Данііла.

З-за рога дома Ганна з'явілася. Знецікі, відаць, спалохалася, застыгла на месцы.

— Хто гэта?

— Я.

Вольна ўздыхнула.

— Ух... Нядобры, напалохаў... Хоць бы азваўся, а то сядзіць моўчакам. Ці даўно прыйшоў?

— Не.

— Хата зачынена, не ведаеш?

— Не ведаю.

Пачала ляпаць у дзверы. Даніла маўчаў. Праз колькі часін адчынілі.

— Пойдзем у хату! — звярнулася да Данілы.

Ён нічога не сказаў. Пасунуўся ўслед. Хацелася нешта сказаць, балючае, ад самага сэрца, але не было сілы.

У хаце сеў на ложку, утупіўся.

Яна запаліла лямпу і падсела к яму. Узняла рукой галаву, зазірнула ў вочы.

— Што прызаўныў, мой дзядулька?

У шэрых вачах Данііла ўбачыў шчырую ласку.

Горка стала. Захацелася пажаліцца, як дзіцяці пакрыўджанаму. І ёй — нікому болей... Ёй, гэткай прыгожай, добрай, ласкавай... Ён раптам схапіў яе руку і стаў цалаваць. Яна вырвала, занепакоілася.

— Што ты гэта, Даніла, звар'яцеў, ці што?.. Я ж не поп, што ты мяне ў рукі цалуеш...

Даніла зірнуў на яе жаркім, пакутным поглядам.

— Гануля! Я дужа люблю цябе... Я... сам не ведаю... Ты — усё... Ты жыццё маё...

Яго твар пакрывіўся. У голасе слёзы чуваліся. Мужчынскія — дзіўныя і мнагазначныя.

Гануля моўчкі абняла яго, з пяшчотай прытуліла да сваіх грудзей.

Ён плакаў, як дзіцёнак. А яна гладзіла яго калматую галаву, супакоівала.

— Ну чаго ты, Даніла... Кінь... Што з табой зрабілася? Раскажы лепей...

Як супакоіўся, ён устаў, пахадзіў па хаце.

— Знаеш, Гануля... Я табе без смеху скажу, сур'ёзна... Я не перажыву, калі ты кінеш мяне... Я не здужаю перажыць гэтага...

— Адкуль ты ўзяў, што я цябе кінуць збіраюся?..

— Гануля, я бачыў сёння. Я ля дзвярэй стаў. Ты з Змітровічам...

— А, во што... ха-ха-ха!..

Яна весела, гучна рагатала.

— Дык во ты чаго? Ну, гэта ж глупства, Даніла. Пажартавалі трохі... Праўда, ён мне трохі падабаецца... Хлопец нішто — спрытны...

— Я знаю...

— А кінь ты, Даніла. Мала што... На кожную драбязу ўвагу звяртаць... Ну, хадзі лепей, сядзем поплеч, пагамонім аб чым-небудзь другім.

Даніла сеў, абняў яе, з каханнем глядзеў у шэрыя іскрыстыя вочы.

— Гануля, сонейка маё... Ты аджывіла мяне, але, мусіць, ты й загубіш...

— Зноў ты сваё, кінь!..

— Ды не, Ганначка... Я ведаю, я чую. Ну ты ж, скажы па праўдзе, ад шчырага сэрца... Змітровіч табе падабаецца?.. Так?

— Ну, ладна...

— Магчыма, што ты яго палюбіш... Толькі па праўдзе скажы: магчыма ж гэта?

— Ну, няхай сабе магчыма... Ну дык што?..

— Ты кінеш мяне.

— Як гэта кіну? Мы астанемся прыяцелямі, будзем памагаць адзін аднаму, адзін аднаго падтрымліваць...

— Не тое гэта...

— Ай, які ты, Даніла! Ну, ці ж можна быць нюняй гэткай? Трэба бадрыцца, вышэй галаву трымаць. Няўжо ж так аслабеў, што не можаш смела, бадзёра зірнуць на жыццё?.. Сорамна. Табе ж не прывыкаць. Ты — работнік, радзіўся ў працы, у працы ўзрос... Слухай, Даніла, ведаеш што?.. Кінем мы пра гэта... Во што... Абяцай мне, што не паддасіся, што заўсёды будзеш смела, бадзёра глядзець на ўсё, што не будзеш урывацца ў што-небудзь адно, у адзін куточак, а будзеш шырэй глядзець: тут дрэнна, дык там добра; тут пуста, дык там поўна... Во так! Ну, дык абяцаеш мне гэта... Добра? Абяцаеш?.. Ну ты, мужчына!..

Яна палажыла яму на плечы свае рукі і ўпарта глядзела на яго вясёлым, задорным поглядам. Ён пачуў, як і яму робіцца весела. Усміхнуўся...

— Ладна. Я папрабую. Абяцаю табе, мая галубачка. Паваюем яшчэ...

8

Снег... Снег... Снег...

Разам пасыпаўся, як з вялізнага каша. Сняжынкі беленькія, кволенькія замітусіліся мітульгой у гулліва-вар'яцкіх скоках...

— Гэй, беражыся! Дарогу нам! Аблепім, спаўём, белю пабелім... Усё!

І пабялілі... Зямлю атулілі коўдраї мяккай, пухкай. А на будынкі, на дрэвы — бровы белыя панавесілі, дзядамі сівымі зрабілі...

Людзі хаджалыя твары хаваюць: не хочуць гарэзлівых пацалункаў спрытных сняжынак. Але ці ж ад іх схаваешся — гэткія пройды... Залезуць пад шапку, за каўнер, разліюцца вільгаццю, мыюць чалавека гвалтам... Во якія дасціпныя!..

Але людзі не злуюць. У кожнага твар вясёлкай грае. Куды ж там... Светла, прыгожа... Чысценька, як у свята. Весела!..

У гэты першы зімовы дзень Даніла ў сваёй хаце сядзеў.

Свята... Жонка сышла некуды, дзеці ў спальні дурэюць. А Даніла ля акна.

Акно на гароды. Пакуль воку відаць — белы прасцяг чыстым абрусам. На ім прыкрымі плямамі — праслы, дрэўкі. А ўдалеч там усё апавіта туманам. Гэта сняжынкі спляліся ў цэлую хмару, загараджваюць, хаваюць ад вачэй, жартаўніцы, што дзеецца там далёка.

Даніла якраз у тую шэра-бялясую заслону нерухомым поглядам упяўся. Не бачыць нічога, бо ўвесь у думках. А вочы так у прасцяг узіраюцца. Толькі бачаць адну бель — новую, свежую.

У гэтую бель душа просіцца, хоча зліцца з ёй, сама ў бель абярнуцца. Каб памыцца, пачысціцца, каб свежай стаць, маладой.

Даніле немаведама што ў галаву лезе...

...Каб пайсці туды, у туманную далеч... туды за заслону за снегавую... Ісці, ісці... Усё далей і далей. Каб аставалася ззаду ўсё гэта будзённае, пуднае, каб нешта новае, невядомае, непазнанае агарнула. Каб новае жыццё. Такое, як у казцы... Не, не ў казцы... Такое, як яны з Ганнаї малявалі. Такое, як Ганна, бо яна новая і непазнаная... Яна дзіўная, чароўная... І зараз увачыу ў Данілы паўстала яна — Ганулька. Тая, за якой пайшоў услед,

якая вабіць непераможнай, цудоўнай сілай. Ганулька любая, дарагая... Усё жыццё яго...

— А калі раптам... кіне...

Сэрца ў Данілы холадам сціснулася.

— Не, не можа гэтага быць. Не павінна... Не будзе... бо калі будзе, тады... немаведама... страшна...

Даніла ўстаў, трахануў галавой. Захадзіў нервовым крокам па хаце.

Ахапіла нецярплівасць, трывога.

Хутчэй трэба што якое рабіць. Во зараз жа, не марудзячы... Трэба схапіць, заўладаць шчасцем... і жыццём... А як?..

Ён азірнуўся наўкола, быццам шукаючы, з чаго пачынаць. І зараз жа агнём працяло:

«Тут... Во тут трэба рабіць што... Трэба канчаць. Дзеці... Эх, каб не яны! Тады б усё было ясна, зразумела. Тады б не цягнула назад, не прыціскала б да долу неїкая вага, да якой ланцугамі прыкуты».

Дзеці... Бедныя, гаротныя...

Даніла прыслухаўся. З спальні нёсся вясёлы рогат дзяцей. Яго пацягнула да іх, захацелася ўбачыць, прыгалубіць...

Увайшоў у спальню. Дзеці змоўклі, сціхамірыліся, быццам спалохаліся. Адвыклі.

Ён узяў меншую Маньку на рукі. Яна падалася, моўчкі прытулілася да яго.

— Дзетачка роднае... Гаротніца мая маленькая! — шаптаў Даніла, носячы дачку па хаце.

Хацелася нешта сказаць — добрае, ласкавае, але не было слоў. Толькі з пяшчотнай ласкай прыціскаў да сваіх грудзей: здавалася, што гэта не дачка, а частка яго грудзей, частка сэрца.

Потым сеў на крэсла, Сцёпку к сабе падазваў. Пасадзіў на калені. Сцёпка таксама да яго прытуліўся.

— Што, дзеткі, можа, казку вам збаяць?

— Збай, татачка! — у адзін голас прагукалі.

Ён пачаў:

— У далёкай-далёкай староцы, там, дзе ніколі зімы не бывае, дзе сонейка свеціць заўсёды, там жыў адзін волат. Цяжка яму жылося, бо не меў ён волі. Спакон веку ён быў прыкуты да каменя магутнымі, цяжкімі ланцугамі. Яны спавівалі ўсё яго цела і былі гэткія моцныя, што нават павярнуцца не давалі. Ён часта напружваўся, хацеў парваць ланцугі, але толькі глыбачэй уядаліся яны ў

цела. Ён стагнаў і плакаў... Якраз каля таго каменя, да якога быў ён прыкуты, выраслі дзве кветкі. Такія, што ўюцца каля якога-небудзь прадмета, нібы хмель наш. Толькі яны былі гэткія прыгожыя-прыгожыя. І вось яны абвіліся вакол таго волата. Яны прыбралі яго, аздобілі і давалі яму вялікую ўцеху сваім харастом. Ён палюбіў іх больш за ўсё на свеце, бо яны быццам палягчалі яго няволю... Але прыйшоў час, і ланцугі з'ела ржа. Волат зрабіў апошнюю патугу, і яны рассыпаліся. Вольна ўздыхнуў волат, радасна, смела зірнуў наўкола і шукаў толькі напрамку, куды б пайсці. Бо ён быў вольны і магутны. І вось тады ён убачыў, што тыя кветачкі, якія абвівалі яго, засталіся цэлыя, бо яны былі маладыя і гібкія. Ён папрабаваў іх заблытаць, але ўбачыў, што прыраслі яны да яго цела сваім голлейкам. Яму так шкада было гэтых кветачак, што ён доўга думаў, ці парваць іх, а самому пайсці ў вольны свет, ці застацца, каб не згубіць іх маладога жыцця. Бо ён дужа-дужа іх палюбіў...

Даніла змоўк. Углыбіўся ў думкі. Сцёпка азваў яго:

— Татка! А яму ж можна было выкапаць іх з карэнькамі і панесці з сабой туды, куды сам хацеў ісці...

Бацька зірнуў на сына кахаючым поглядам.

— Праўда, сынок... Ён так і зробіць...

— Як зробіць?

Але ў гэты момант ляпнулі дзверы — матка прыйшла. Даніла пакінуў дзяцей, сам выйшаў з спальні і зноў стаў хадзіць узад і ўперад. У яго ўжо склаўся замер канчаткова пагаварыць з Арынай.

Трэба кончыць, парваць гэтую блытаніну.

Арына ў кухні нешта парадчыла. Зараз увойдзе, пачнецца...

— Ну, няхай. Апошні раз.

Арына ўвайшла, спынілася, убачыўшы яго.

— Прыйшоў... каб па табе трасца хадзіла! Чаго табе трэба? Ты ж адрокся ад усяго, ты ж змяніў сваю сям'ю... Чаго ты прыходзіш сюды? Чаго ты мучыш мяне?

Даніла перапыніў яе:

— Слухай, Арына. Кінь лаяцца. Я хачу з табой сур'ёзна пагаварыць...

Яна ўраз змоўкла, спалохапая. Яна дагадалася, аб чым хоча ён гаварыць. Яна кожны дзень чакала гэтага, хоць аб гэтым баялася думаць, бо яшчэ не згубіла надзеі на добры канец. І вось яно падышло...

— Ну, гавары,— сказала дрыжачым голасам.

— Я, Арына, больш не магу зносіць гэткага жыцця. Я многа думаў аб гэтым і рашыў, што жыць з табой я не магу...

— Ну? — крыкнула яна з адчайным голасам.

— Я цвёрда надумаў развесціся...

Арына раптам загаласіла.

— Божухна-бацюхна! Да чаго дажылася... Ці дзеля гэтага ж я кахала яго, ці ж дзеля гэтага я замуж пайшла, каб цяпер сорам убачыць... Шлюха гэта, разлучніца праклятая! Абваражыла яна яго, ачмуціла...

— Арына, не чапай яе. Яна не вінавата... Не дзеля яе гэта. Проста жыццё гэта мне не ў змогу. Не здавальняе мяне...

Арына ўраз схапянулася.

— Дык жа не! Не будзе гэтага, не будзе!.. Ты думаў — так проста ад мяне адкараскаешся? Не!.. Я — няхай, дык жа дзеці ёсць... Што ж ты сабе гэта думаў: напладзіў, а цяпер — на, кармі, гадуй... Не, пачакай!..

— Дзяцей я к сабе вазьму.

— Што? Дзяцей? Ад роднае маткі? Каб я ды дзяцей сваіх аддала? На пагібель, на смерць? Ды няхай у мяне рукі, ногі паадсыхаюць, калі я кіну дзетак сваіх!.. Родныя мае, залацепькія! Хадзеце сюды, па бацьку зірнеце, як ён кідае сям'ю сваю, як ён вас, сваіх дзетак, зракаецца...

Сцёпка з Манькай ля дзвярэй. Плакалі — горка, адчайна...

Даніла нічога больш не сказаў. Узяў шапку і выйшаў з хаты...

Ён хацеў цяпер пайсці да каго параіцца, як пачаць справу аб разводзе. Але куды, к каму? Доўга перабіраў у думках сваіх сябрукоў.

«Змітровіч»,— раптам у галаве мігнула.

І пацягнула да яго. Захацелася ўбачыць, паглядзець на яго, прыгледзецца, палюбавацца на яго — маладога, прыгожага. Можа, з зайздрасцю? Ну дык што ж!..

Даніла пайшоў перш у клуб, але там не было Змітровіча. Пайшоў на кватэру — там заспеў.

Змітровіч сядзеў за сталом, нешта пісаў. Як убачыў Данілу, ветла ўсміхнуўся.

— Здароў, дзядзька! Як гэта затрапіў сюды?..

Як ні прыслухваўся Даніла, але не пачуў у голасе Змітровіча нічога такога, апроч прыяцельскай ветласці. Сам трымаўся напружута, афіцыяльна.

— Па справе прыйшоў.

— Ну, ладна... Справа справай, але сядай перш... Як маешся?

— Нічога сабе...

— Як з жонкай? Ваюеш?

— Вось аб гэтым і прыйшоў да цябе. Сёння капчаткова гаварыў з ёй, надумаў ужо развесціся. Прыйшоў да цябе папытаць, як гэта зрабіць...

— Во! Даўно пара... Я ж казаў табе... А як яна, згодна?

— Не.

— А, дык гэта праз суд трэба. Напісаць заяву, шу й грошай ладнага заплаціць. Але гэта глупства... Калі не хопіць — выручым... Заяву ведаеш, як напісаць?.. Не?.. Сядай, пішы, я прадыктую...

Даніла стаў пісаць. Як скончыў, зараз жа йсці парыхтаваўся. Хоць і некуды было, хоць і не хацелася нікуды йсці, але ў Змітровіча таксама не хацеў заставацца.

Змітровіч затрымліваў.

— Пастой, куды ты... Пасядзі троху, зараз гарбату згатуем, нап'ёмся па-халасцяцку.

— Не, трэба яшчэ ў адно месца зайсціся. Некалі...

Ён развітаўся і наладзіўся выходзіць, але ў гэты момант адчыніліся дзверы і ў пакой убегла Ганна.

— Андрэй! — яшчэ на парозе крыкнула яна свежым, вясёлым голасам, і гэта слова нажом разпула Даніпу.

«Андрэй... не Змітровіч»,— падумаў.

— А, Даніла,— заўважыла Ганна.— Здароў! А ты як сюды трапіў?.. Хлопцы! — звярнулася яна да абодвух.— На спектакль пойдзем! Чаго вы седзіцё тут, як тараканы ў запеччы?.. Пагода якая! Снегу ўжо — во пакуль... Мяккі, пульхны, як вата. Так і хочацца пакачацца... Ну, жывей! Даніла, чаго ўтупіўся? Марш!..

Даніла моўчкі глядзеў на яе, любаваўся. Было чагось сумна, маркотна.

Яны пайшлі разам. Як выйшлі з хаты, Ганна з вясёлым смехам адбегла, схапіла снегу ў жменю і шыбнула ў Змітровіча. Тоїй — у яе. І пачалі ў снежкі гуляць...

Даніла йшоў у задуме. Зайздрасць гадзюкаї у грудзёх шавалілася. Ён думаў:

«Жыццё маладых любіць».

Праз тыдзень быў суд. У гэты дзень Даніла не пайшоў на работу. Хадзіў усё па горадзе. Без усякае мэты, так сабе, бо не мог заставацца на месцы. Рупіла ўсё, турбавала тое, што будзе сёння.

Раз-поразу ў суд заходзіў, хоць і знаў, што толькі пад вечар яго справа разбірацца будзе.

Хадзіў Даніла па вуліцах горада, утупіўшыся, і ўсё думаў. Думаў, што вось сёння кончыцца адно, а заўтра — другое. Заўтра ён будзе зусім вольны. Зусім, зусім як птушка... Не, не як птушка, як вецер, во гэты, што шугае па заўголлю, што круціць віхрам... Ён вольны і малады.

А заўтра і Даніла будзе такім. Тады — куды хоця, тады ўсе дарогі адкрыты. Тады жыццё пачнецца.

Заўтра, заўтра... Толькі хутчэй бы вось гэта кончылася. Гэта прыкрае, нялюбае... Людзі будуць глядзець, слухаць. Будуць шаптаць адзін аднаму, будуць і ў вочы солю кідаць. Будуць смяяцца зларадасна. Эх, прыкра... Хутчэй бы мінулася гэта, кончылася пакута!

А тады — дзяцей у дзіцячы дом, пяхай там растуць, развіваюцца, да жыцця новага гатуюцца. Выцягнуць толькі іх з багны. А сам... Вольная праца, вольны адпачынак... І Ганна. Яна будзе з ім, яна не кіне. Толькі хутчэй, хутчэй! Каб не спазніцца, каб не праміпула, не згінула шчасце...

І Даніла, сам таго не прыкмячаючы, ішоў усё шыбчэй і шыбчэй, быццам і сапраўды спяшыў за шчасцем. Схамянецца, азірнецца наўкола, на апранутыя ў зімовую бель вуліцы, быццам сам сабе задзівіцца, куды ён рупіцца так,— а потым ізноў углыбіцца ў думкі, ізноў пад уплывам іх шпаркага лёту ўсё падбаўляе і падбаўляе ходу.

Як ужо ў паветры ледзь прыкметна разлілося рэдзенькае валакно змроку, Даніла ізноў падходзіў к будынку народнага суда.

У досыць раскошным пакоі было поўна людзей. Як увайшоў Даніла, усе пацэліліся ў яго цікавым поглядам. Зашапталіся.

Адразу ўцямміў Даніла, што сабраліся на яго паглядзець, яго цікавую справу паслухаць. Дасадна зрабілася і прыкра. Нахмурыўся, але смела, проста стаў усіх азіраць.

Шукаў вачмі Ганну — ці не прыйшла... Не, няма. Замест яе жошку ўбачыў. Сядзіць у кутку, акружаная су-

седкамі. І з ёй япы... дзеці. Прытуліліся палахліва да маткі.

— Нашто прывяла! Нашто душы псаваць дзіцячыя!..

І злосць на Арыну выбухнула ў Данілы.

Сеў у другім кутку на зэдлік, абапёрся аб сцяну, задумаўся. Прыемна ціхамірыла стрымленая адчамерная гутарка. Драмаць захацелася.

Але зараз усе ўзняліся. Выйшаў суд з бакоўкі. Суддзя стаў чытаць прыгавор па папярэдняй справе. Няўважна слухаў Данііла дакучліва-нудныя словы...

...Украў... Паказанні сведак... Па стацці...

Лягчэй стала, як кончыў. Паселі ўсе. І Данііла. Суддзя ўзяў з вялізнай кучы адзін спытак і абвясціў важным, але нудным, змораным голасам:

— Слухаецца справа грамадзяніна Данілы Кірылава Чаборскага па заяве яго аб развязанні браку з грамадзянкай...

Данілу скрозь зямлю праваліцца захацелася — гэтак было не па сабе. Усе паціхлі ў напружнай нерухомасці. Толькі моўчкі перабягалі вачмі з яго на Арыну і назад.

А потым вальней стала, як суддзя пачаў дапытваць, як пайшло звычайным ладам.

На запытанне суддзі, ці згодна на развод, Арына скрозь слёзы пачала жаліцца на свой лёс, на тое, што чакае яе, на гаротную долю дзяцей... Суддзя перапыніў яе:

— Аб гэтым потым...

І звярнуўся да Данілы:

— Якія вы маеце прэтэнзіі па агульную вашу маёмасць і чым можаце забяспечыць жыццё вашых дзяцей?

Данііла ўстаў.

— Таварыш суддзя! Я нічога не хачу і нічога не вымагаю. Мне нічога не трэба. Няхай ёй усё застаецца. Вось толькі дзеці... Дзяцей я хочу сабе ўзяць. Я прашу суд зрабіць гэта. Я маю на гэта пэўныя прычыны...

І ён пачаў гаварыць аб выхаванні дзяцей, аб тым, у якія абставіны трапяць яны, калі застануцца пры матцы, і г. д. Доўга і горача гаварыў. Арына колькі разоў памыкалася перапыніць яго, але суддзя яе сунімаў.

Як скончыў Данііла, суддзя запытаў Арыну, ці згодна яна аддаць дзяцей. Тая зноў палілася плоймай рэзкіх, слязлівых слоў, перамешаных з жорсткай кляцьбой. Пра яе згоду і гутаркі не магло быць. Ледзь уціхамірыў яе суддзя.

— У гэтай справе мы павінны прыслухацца да голасу

саміх дзяцей. Іхпая прыхільпасць вырашыць спрэчку. Дзеці, вы да каго хочаце пайсці: да таткі ці да мамкі?

Глыбокая ціша агарнула пакоі. Усе погляды абярнуліся туды, адкуль палахліва глядзелі сумныя вочкі. Даніла ўзняўся, падаўся да іх. Голасам, поўным шчырае ласкі, пяшчоты, паклікаў:

— Дзетачкі! Сцёпка, Манечка! Пойдзем ка мне!

Япы маўчалі, спалоханыя. Суддзя яшчэ раз запытаў:

— Ну, ды к каму ж вы хочаце: к мамцы ці к бацьку?

— К мамцы,— праказалі ледзь чутна і раптам абодва горка, жаласна заплакалі.

Нервовы гоман прабег па пакоі. Даніла да суддзі рваўся:

— Таварыш суддзя! Дазвольце сказаць...

— Пачакайце! — перапыніў той.— Мы чулі ўжо вашыя словы, і ўсё будзе прынята пад увагу.

Яшчэ колькі дробных запытанняў.

— Суд выходзіць на нараду...

Бурлівая гаворка напоўніла пакоі. Усе напераспехі дзяліліся ўражаннямі, выказвалі свае думкі, загадвалі па тое, які прыгавор будзе.

Даніла сеў на сваё месца, у куток. Нервова церабіў бараду, разважаў, што можа пастанавіць суд. Ён не думаў раней, што так аберпецца справа. Ён быў перакапаны, што дзеці з ім застануцца. А цяпер — усё перавярнулася. Толькі астатнія словы суддзі давалі надзею. Пэўна ж, і сапраўды суд прыме пад увагу яго словы, не дапусціць, каб дзеці загінулі ў багне беспрасветнага мадзення.

Доўга цягнулася парада. Нецярплівасць усіх ахапіла. Але вось адчыніліся дзверы. Усе ўсталі, замярцвелі ў напружным чаканні. Толькі чутна было сударгавае хліпанне дзяцей...

— Імем Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі,— аднатонна-ўрачыста зычэў голас суддзі.

Даніла з нецярплівасцю прапускаў міма вушэй усе непатрэбныя словы, напружна ждаў, калі пра дзяцей... І вось — дзеці, як выказаўшыя відавочную прыхільпасць да маткі, астаюцца пры грам. Арыне Чаборскай. На іх пракорм і выхаванне гр. Даніла Чаборскі павінен кожны месяц выдаваць па пятнаццаць рублёў...

І далей зноў непатрэбныя, пудныя словы. А тыя — важныя, прыкрыя — усё звіселі ўвушшу ў Данілы, перапляталіся з акраўкамі думак.

Усё... Усё парвалася. Нават тыя кветкі, што прыраслі да цела, да сэрца. З карэнём вырвалася старое...

І дужа балюча, цяжка было. Стаяў, аслупянелы, як і суд кончыўся, як і людзі пачалі разыходзіцца. Потым паціху, як лунацік, выйшаў з пакоя. Не бачыў, што ўсе дарогу яму ўступаюць, што ўсе глядзяць на яго — хто з гнеўнай усмешкай, хто з спачуваннем. Не чуў, як услед яму ляцелі не надта прыемныя словы...

Выйшаў Даніла і стаў ля парога. Куды ісці? Куды прыхіліцца?

На дварэ зіма спраўляла сваю першую буяную вечарынку. Вецер — злы, як шалёны сабака,— штурхаў, шкуматаў, абдаваў сцюдзёнымі хвалямі снегу. Па вуліцах — цемень, завея. Холадна, непрытульна.

І пацягнула Даніла туды, у цёплы, прытульны куточак, дзе жаркая ласка, дзе шэрыя вочкі... К Ганне пайшоў.

Пайшоў шпарка, паспешна, з нейкай асалодай акунуўшыся ўсім сваім тулавам у жорсткія парыванні сустрэчнага ветру. Жадалася чагось вострага, балючага. І прыемна было адчуваць, як вецер сцёбае па твары жменямі шурпатага снегу.

Яшчэ здалёк убачыў, згадаў ветлы агеньчык у Ганнінай кватэры. Стрымліваў сябе, каб не пабегчы ўгрунь, бо нешта ўсярэдзіне бушавала, штурхала наперад.

Вось і дом. Узбег па старых, расхістаных ганках, у цёмных, трухлявых сенцах намацаў знаёмыя дзверы.

У кухні абдало густой цеплю. Бліснула ў шчэлку святло з Ганнінага пакоя, і галасы пачуліся.

«Ёсць нехта»,— падумаў Даніла.

Паморшчыўся ад дасады і з нейкай невыразнай трывогай адчыніў дзверы.

«Змітровіч!» — маланкай жыгапула ў мазгах.

Сядзяць поплеч на ложку. Абодва з усмешкай глядзяць на яго. Твар у Ганны гарыць: вочы, апавітыя салодкай млявасцю, гараць глыбокім, страсным агнём. Сукрыстымі змейкамі звіслі на твар пакалмачапыя валасы.

Яшчэ нічога не зразумеў Даніла, а ўжо пачуў, што — канец, што ён тут непатрэбны. Стаяў у парозе і моўчкі з глыбокім жалем глядзеў на Ганулю. Быццам у астатні раз хацеў наглядзецца на яе, пацешыцца яе харастаом. Быццам разлучаўся з ёй назаўсёды...

Цяжка было, нутро балела. Быццам з сэрца выціснуў нехта ўсе сокі, кроў выцягваў з жылаў. Здавалася, што валішся ўвесь у бяздонную процьму, дзе жудасна-пуста, дзе ані косачкі свету, дзе страшна...

Змітровіч з Ганнай звярнуліся да яго, у адзін голас спыталіся:

— Ну, як?

— Кончана.

— А дзеці?

— У яе засталіся.

— Ну! раскажы, як было...

Але Данілу не хацелася расказваць. Здавалася, што й тут простая цікавасць, як там, у тых чужых, далёкіх людзей, што на судзе.

— Ат! — нецярпліва махнуў рукой і сеў на зэдлік — хмуры, пахілы.

Запанавала напружна-прыкрая ціша. Даніла чуў, што на яго глядзяць, як на хворага, баяцца варушыць яго нутро. Але чуў таксама, што і Змітровіч і Ганна гатовы зрабіць цяпер для яго ўсё, што ён захоча. Бо хвораму заўсёды дагаджаюць.

Ён хворы... Вядома — хворы. Гора — таксама хвароба. Калі нутро ўсё крышыцца, калі руйнуецца ўсё ўсярэдзіне — гэта цяжкая, апасная хвароба. А раз хворы — ён мае права на ўвагу. Ён можа папрасіць, патрабаваць, каб Змітровіч пайшоў, бо цяжка пры ім, бо хочацца з Ганнай застацца. З ёй напэўна лягчэй яму будзе. Мо яна яму зелля якога знойдзе — яна ж разумная, добрая... Любая яна, блізкая, дарагая...

І ён проста сказаў:

— Гануля, я хачу з табой адзін на адзін застацца...

Змітровіч адразу ўзняўся.

— Я пайду.

Яны перакінуліся з Ганнай мнагазначным поглядам. Ганна выйшла разам з ім — правесці яго. Даніла знаў, што яны там зговар вядуць, як з ім абысціся.

«Няхай сабе! Усё роўна...»

Ганна вярнулася, села з ім поплеч, але не кратала яго. Не знала, пэўна, з чаго пачаць, баялася, каб яшчэ горш не раскалупаць рану. Даніла чуў гэта. Каб не мучыць яе і сябе, пачаў першы:

— Значыць, Гануля, зроблена справа. Я цяпер вольны — разарваў путы...

Намаўчаў трохі.

— А ведаеш, Ганна, нярадасна нешта... Можа, што дзеці... Шкада іх... Гэткія любыя, мілыя...

— Гэта пакуль што, Даніла. А потым абыдзецца. Галоўнае — напоўніць жыццё, каб не было пустое... А то, вядома, цягнуць будзе да старога, маркотна будзе і цяжка.

— Чым жа напоўніць? Гэта ж — усё, я ж толькі гэтым і жыў... Дзетачкі... асабліва яны. Я гэтак люблю іх... Чым я здолею іх замяніць?..

Ён задумаўся.

— Ведаеш, Ганна...

Ён раптам узрушыўся, схапіў яе за руку.

— Я на цябе спадзяваўся, я верыў у цябе, я думаў — ты мне паможаш, ты падтрымаеш мяне, ты заменіш мне страчанае...

Яна мякка ўсміхнулася.

— Даніла! Дык гэта ж неразумна... Якая ж карысць, якая выгада? Ты адны путы хацеў змяніць на другія? Ты хацеў вырвацца з багны сям'і, каб у другую трапіць?

— Ды не, Гануля, не так... З табой іначай. Ты ж не такая, ты разумееш... Ты сама жывеш поўным жыццём, у цябе гэткія інтарэсы, як у мяне. Я не так думаў, як ты гаворыш. Я марыў аб прыгожым, шырокім жыцці...

Колькі хвілін абодва маўчалі. Потым ён пачаў нізкім, сціснутым голасам у відавочным абуджэнні:

— Дык, Ганна... Значыць, не будзе так? Ты не будзеш маёй... ну, не жонкай... прыяцелькай, сябрам, але зусім, каб усягды, каб жыць разам, разам працаваць...

— Мы будзем, як і раней, прыяцелямі. Будзем памагаць адзін аднаму...

— Не, не тое... не так... Ты разумееш мяне, Гануля, толькі не хочаш прызнацца... Ну, скажы проста, канчаткова: не будзе так, як я кажу?

— Не, не будзе.

— Чаму?

— Я сама люблю волю... Я знаю, што дрэнна так будзе...

— Ізноў ты не тое гаворыш. Ты не хочаш сказаць... Гануля, я ж сам бачу, я ж разумею. І чаму ты не хочаш мне шчыра сказаць усё як ёсць... Ты... Змітровіча любіш...

— Ну, няхай сабе й так... Я люблю яго... моцна люблю, бо ён прыгожы, разумны, ён... падабаецца мне...

Даніла моўчкі ўзняўся.

— Ладна. Я пайду, Гануля!

У яе вачах бліснула трывога.

— Куды ты, Даніла? Чаго табе на начы бадзяцца... Ты ў мяне пераначуй.

Ён заўважыў яе трывогу. Усміхнуўся.

— Ты не бойся, Гануля. Я ж помню твае словы: тут дрэнна, дык там добра; тут пуста, дык там поўна... Дабранач!..

Ён выйшаў на вуліцу. Цемень, вецер, завея. Відаць, на ўсю ноч зіма разгулялася.

У канцы вуліцы бялясай міргаючай плямай ліхтар свеціцца. Даніла проста на яго падаўся. Ён знаў, што гэты ліхтар якраз проці Янкеля. Знаў таксама, што ў Янкеля двор заезджы, што там можна пасядзець, пагрэцца...

Вось толькі спяць, можа? Не, яшчэ свецяцца вокны. Даніла паляпаў. Адчыніў Янкель, пазнаў яго і ветла запрасіў у хату. Там не было нікога, толькі на лаўцы спаў нейкі падарожны. Даніла сеў за стол, паклаў галаву на далоні. Слухаў, як ные, ссе штось усярэдзіне. Думаць не думаў, бо ў галаве было пуста, нібы павымецена ўсё. Толькі слухаў, як садніла сэрца...

Янкель падышоў да яго.

— Можа, перакусіш чаго, Даніла?

У голасе спагада чулася. Даніла рукой махнуў.

— Нічога не хачу.

Потым, нібы ўспомніўшы штось, схапіў за руку Янкеля.

— Слухай! Можа... выпіць ёсць што?..

Янкеляў твар у патаемную ўсмешку расплыўся.

— Пашукаем...

Даўно ўжо не піў Даніла. Не любіў піць. Але цяпер узрадаваўся, што можна выпіць. Мо палягчэе?..

Ён піў не закусваючы. Піў чарку за чаркай, але не лягчэла. Нешта ссала, цягнула. Нешта балюча тачыла сэрца.

Потым растала нешта ўсярэдзіне, разлілося, ахапіла агнём усе грудзі, к горлу падышло, перасела ў ім, аж дыхаць цяжка... Потым слёзы з вачэй пакаціліся. Многа слёз!.. І жаласна-жаласна стала.

Даніла плакаў, схіліўшы на стол галаву. А як узняў яе, пачуў, што круціцца. «П'яны»,— падумаў.

І яшчэ піў, каб зусім ап'янець, каб не помніць нічога. У галаве буйнымі хвалямі віхаўся зялёны туман. Унутры нешта ўздымалася, бурліла, штурхала, рушыла з месца. Хацелася пабегчы, паскакаць, дагнаць кагосьці...

Вылез з-за стала і, хістаючыся, пайшоў з хаты. Дзіўна, смешна стала, калі Янкель хацеў затрымаць. Ганна тож не пускала. Баяцца... А чаго — немаведама...

На вуліцы весела. Снег гэты, бель бяскрайняя... Круціцца ўсё, скача ў шалёным карагодзе... Вецер жартуе. З-за вугла выскачыць, шпургане ў твар ахапкам снегу і наўцёкі...

Ну ладна... жартуй, шпургай... Ты ж малады, вясёлы. Даніла тож малады. Ён тож жартаваць, гуляць хоча... Ён — разам з ветрам, разам з гэтай раз'юшанай беллю...

Даніла спыніўся ля Ганнінае хаты. Хістаючыся падышоў пад акно, абапёрся рукамі аб сцяну.

Агонь яшчэ ёсць. Не спіць. Во тут яна, блізка... Зусім блізка, у колькіх крокаў... Каб прапікнуць праз сцяну... Тады абняць яе, цалаваць... бо тут жа яна, во-во, зусім блізка... Яна ж дужа добрая, ласкавая такая, яна салодка ўмее галубіць... Хіба паляпаць у акно? Ці згадае — хто?.. Але не, не варта. Не трэба... Трэба пайсці, не кратаць яе... Няхай! Яны абодва маладыя... няхай...

Ён адштурхнуўся ад сцяны, пайшоў далей па вуліцы. Куды — не знаў. Ды ці не ўсё роўна? Трэба ж ісці куды-небудзь... Як выйшаў за горад, у цёмнае поле, спыніўся на момант, азірнуўся.

Цемра. Завіруха. Штурхае гуллівы вецер, рагоча, вочы снегам жорсткім, шурпатым запарушвае. Чаго яму трэба? Што ён ісці не дае?..

Гэты снег... Бель гэта... І ўсярэдзіне — тож бель, бо ружовае знікла. Нічога няма — адна бель...

Але ж трэба ісці... Цёмна, заслона перад вачыма — калючая, чорная. За заслону трэба — там светла... Далей трэба йсці...

Ногі вязнуць у снезе. Цяжка. А мо гэта не дарога? Дзе ж дарога? Чаму ён не па дарозе ідзе? Дарога ці не?.. Трэба пашчупаць, няйначай... Нагой не пазнаеш таго, што рукой. Толькі пагнуцца, і адразу ўбачыш: ці дарога ці не?..

Даніла нагнуўся і — забурыўся. Устаць не мог.

Дый навошта ўставаць? Добра так, мякка, прытульна. Галава так прыемна круціцца, у вачах квяцістыя, прыгожыя палосы віхаюцца... Мо гэта тыя пасы, што ў заводзе колы злучаюць?

А во й Ганулька. Нахілілася з радаснай усмешкай. Абпімае рукамі мяккімі, прытуляе да сябе, песціць, галубіць...

Якая яна любая!..

. . . . . .

Завіруха атуляе, укрывае Данілу пухаваю беллю. Вецер шалёны хаўтурную песню спявае...

НА МАЛАДОЕ

1

Калі ў сонечным моры празрыстымі хвалямі калышацца душпая смага, калі пярэсціцца, ззяе вакол пышнаквяцісты дыван бясконцавых палёў, калі стромкі бор, самлелы, зняможаны палкаї, напружнаї ласкаї шчодрага сопца, рассылае наўкола свої ап'яняючы пах, калі жаўранак топкім срэбным цурочкам улівае ў самае сэрца сваю няўпынную нераліўчатую песню,— тады на жаркаму маладому целу Марылькі разліваецца салодка-калючая млявасць.

Тады сэрца неяк дзіўна тупа і салодка садніць, а ў вачах Васілёк з'яўляецца. Гэткі назойлівы, прыліпчаты Васілёк. Нават не адзін Васілёк, а два васількі, бо вочы яго, яспыя, любыя — якраз васількі. Глядзяць яны ласкава, смела ў самую глыб, у нутро самае, і ад гэтага погляду нешта хваляй прабягае па целу, к сэрцу прылівае, уздымае высока крамяна-пухкія грудзі.

Васілёк... О, яна нікому не скажа пра Васількa. Аніколи... І яму самому не скажа. Яна ўцішку, у думках будзе песціць яго, галубіць, будзе здалёк усміхацца яму гарачай млявай усмешкай, будзе дражніць яго палкаї спакусаї жапочаї.

Толькі адна, уцішку. А як спаткае яго, яна толькі сухa, няўважна ўсміхнецца і адвернецца ад яго ўпартага погляду, ад гэтых смелых вачэй-васількоў...

А каму горш за ўсё не скажа Марылька пра сваїго Васількa, дык гэта сваїму мужыку — Ахрэму даўгалыгаму, чаплі нялюбаї. Ого, яму сказаць!..

Марылька не любіць Ахрэма. Яна тры гады за ім замужам і з гэтых трох год паўтара года ўжо не любіць яго.

Яшчэ і Васількa не было, яшчэ не ўглядалася Марылька ў яго блакітныя вочы, яшчэ зазірала яна часам з патаемным чаканнем у шэрыя слізкія вочы Ахрэма, а ўжо ў сэрцы, у целе маладым, жадаючым вострага, палкага, расла несвядома агіда. Прыкрымі сталі нязграбныя, неда-

лужныя ласкі мужыка, прыкрымі затым, што распальвалі яны нутро агнём, агортвалі дзіўным смаглым жаданнем, а не здавальнялі.

І балюча было, і сорамна чагось. І злосць расла на мужыка-недарэку... Злосць і агіда.

Гэтак было. А потым Марылька навучылася не прыкмячаць мужыка. Сціснуўшы зубы знасіла яго прыкрыя мужчынскія жарты, стрымлівала сваё жаночае пачуццё.

Так і цягнулася. Шэраі нудоі жыццё завалаклося, забалоціла брудам будзённічыны.

А тады Васілёк з'явіўся. Ён — малады хлопец, нядаўна зусім дзіцянём быў. І твар у яго як у дзіцяці: чысты, адкрыты, вясёлы. Вочы — крышталь блакітны...

Пачалося гэта зусім проста. Дый што пачалося? Нічога ж і не было такога... Аднаго разу зірнуў на яе Васілёк. Троху не так, як зазвычаі глядзяць людзі адзін на адnaго. Нешта было ў яго поглядзе ўпартае, смелае. І на вуснах усмешка блукала таемная, хітраватая.

Марылька тады таксама ўсміхнулася. А ўсмешка неяк міжвольна выйшла такая, як і ў Васілька. І нешта з'явілася тады паміж іх — блізкае, патаемнае, быццам бясслоўны зговар які.

З таго часу закрасаваў у Марылькі ў вачах малады Васілёк, заўладаў думкамі-марамі. І дзіўна неяк: з таго часу яны радзей сталі сустракацца, радзей гутарыць.

Страшна чагось было Марыльцы з ім сустракацца, а ад гутаркі з ім яна проста ўцякала. Бо дзіўныя словы ён ёй гаварыў, такія словы, што зусім іншае яны азначалі, чымся зазвычай. Слова якое простае, звычайнае, а за ім — чуе Марылька — іншая думка хаваецца. Негавораная, але яспая, знаёмая, без слоў зразумелая.

Неяк страшна рабілася Марыльцы. Палохала тое, што думка гэта супраць волі ўпарта і настойна асядала ў галаве і пязмога была яе адтуль выгнаць. Быццам пчаліны рой, буяла ў ёй няўпынна гудзела ў мазгах, мёдам атрутным залівала свядомасць і прымушала сэрца млець і сціскацца ад невыразных, пяясных жаданняў.

2

Цяжка Марыльцы жаць далёкую паласу за гушчарным сасоннікам. Глуха, але ўпарта, дакучліва ные сярэдзіна: пакланяйся ж так дзень у дзень у пояс спеламу залачонаму жыту. Але гэта дарма — не тое вытрымае дужае,

спрытпае цела маладзіцы, ніпачым яму цяжкая, цяглая праца!

Вось сумна-сумненька толькі. Суседкі аджаліся, адной выпала дажынаць сваю вузенькую палоску, а адной жаць у два разы цяжэй.

Серп аднастайна, нудна цямкае пад рукой, а жыта, педалужна звісаючы на моцнай руцэ, шамаціць ціха-ціха, быццам апавядае штось сумнае або жаліцца на сваю гаротную долю. І гэты шолах плаўка, намалу цягне за сабой няясныя думкі Марылькі, заводзіць іх далёка-далёка — невядома куды, пакуль не давядзе да Васілька.

А тады ўжо думкі рвуцца, блытаюцца, мітусяцца ў атрутным тумане. Тады Марылька кідае сноп недажаты і, соладка пацягваючыся, выстаўляецца ўся пад гуллівапалкія праменні паўдзённага сонца.

Па целу — цяплынь прыемная, млявая, а ў закрытых вачах — Васілёк сінявокі. Пад белай кашуляй двума пульхнымі ўзгоркамі грудзі ўздымаюцца, калышуцца ад моцнага тукання сэрца. Марылька глядзіць на іх і ўсміхаецца ўсмешкай гарэзлівай. Думае:

«Нашто яны мне?..»

Потым уздыхне і зноў жаць пачынае.

Ад сонца галава троху круціцца, быццам у чадзе. Смага, хочацца піць. Там, на ўзлессі, у прытульнай засені вада ў гарлачыку. Добра там — халадок, трава дыванам мякім... Адпачыць часіну, напіцца і падумаць. Звіць у цішку квяцісты вянок з прыгожых мараў, атуліць на хвілінку патаемнай ласкай свайго Васілька...

І пабегла Марылька к лесу, як дзяўчынка малая. Напілася вады халоднае і выпрасталася, нерухомая, на шаўковай траве.

На вуснах зайграла ўсмешка давольная, шчаслівая. У заплюшчаных вачах — ён, Васілёк, як жывы... Любы такі, прыгожы. Яе Васілёк — пязпапы і каханы...

Так ляжала Марылька, пакуль лёгкі шолах не пачуўся паблізу. Зірнула і ўбачыла над сабоій сінія вочы. Не зпала: ці думка гэта яе, ці ён, жывы Васілёк?

— Дзень добры, Марылька!..

Тады дазналася, што ён гэта — жывы, праўдзівы. Хацела спалохацца, але, замест гэтага, сказала з міжвольнаї усмешкаї:

— Адкуль ты?

І глядзела на яго ласкава, ветла.

Як сеў ля яе, не схапянулася, а таксама глядзела ў яго

блакітныя, цяпер чагось дужа бліскучыя вочы. Дзіўна было, нашто ён узяў яе гарачую руку, нашто ціснуў яе моцна, балюча. А як пачула на сваіх узрушаных грудзях пясмелыя, няпэўныя рухі грубой мужчынскай рукі, затрапяталася ў знаёмым пачуцці душнага нездавальнення.

Смешна стала і весела, дужа весела. Раптам схапіла сукрыстую галаву Васількa і моцна, шчыльна прытуліла к грудзям. Рагатала чагось шалёным, гуллівым смехам, з гарачым запалам аддавалася рашучым недазволеным ласкам мужчыны...

. . . . . .

У зялёным лісці распаўзлася празрыста-кволая жоўць. Сонца касой палахлівай з цікавасцю пад куст зазірнула, дзе Марылька з Васільком снавалі жывую казку кахання.

Марылька сядзела і трымала на каленях галаву Васількa. Гладзіла сукрысты мяккі лён валасоў і з пяшчотай у глыбокі блакіт любых вачэй заглядала. Бачыла ў іх даволыную гордасць уладання і шчырую ўдзячнасць за яе каханне, за дзявоцтва яе чыстае, непарушанае.

3

Змрок на вёсцы доўга ў жмуркі гуляе. Па заўголлю хавасцца, пікае начніцай вялізнай, крыластай. Стуль выпаўзае, сцелецца долам, хавае ў запазуху ўсё, што трапіць па дарозе.

Вёска туліцца, гарбаціцца старой бабулькай, бурчыць ціхамірна памалу знікаючым гоманам.

К сваёй новай хацёнцы ў завулку падыходзіць Марылька. Серп на плячы, у руцэ клумак з посудам.

Як ішла па вуліцы, нешта таўхала адзаду і галаву долу загінала. Быццам сорамна было альбо страшна чагосьці. А як у завулак звярнула,— усё разляцелася, вольна ўздыхнула Марылька. У хату ўвайшла, быццам і не было нічагутка...

У хаце цішыня комам цягучым, ліпучым згрудзілася, спакоем агортвае. Марылька села на лаўку і адразу пачула, як па ўсім целе папаўзла прыкрая змора.

Уваішоў Ахрэм. Праішоў раз па хаце, яе не заўважыўшы, потым, мусіць, убачыў — спытаўся:

— Марылька?

— Я. Што, не пазнаў?

— Дзе гэта ты была дасюль?

— На паласе... Няўжо ж з хлопцамі гуляла!

Сказала гэта Марылька неяк махінальна, а потым і сама схапянулася: сорамна стала...

— Ці блізкі свет? Гэта ж пакуль дацягнулася...

— Дажала?

— Дзе там... Гэта на пагляд, дык там крошка здасцца, а як папрабуеш жаць, дык і канца яму няма...

Сама сабе дзівілася Марылька, як спакойна яна гутарыць з Ахрэмам. Як ішла, думала — у вочы зірнуць пабаіцца. І чагось прыкра было, што ўсё так проста, звычайна. Гэта пасля таго, пасля тых хвілін, што ўзварухнулі, здаецца, усё нутро, перавярнулі ўсё дыбарам, адкрылі новыя, нязнаныя, страшныя свае́й незвычайнасцю прасцягі.

Абыклымі рукамі Марылька запаліла святло, дастала вячэру. Ахрэм, узлёгшыся, нерухома сядзеў за сталом. Быў у яго змораны, скалмачаны выгляд. Брыдка, агідна блішчэў доўгі асліглы нос, а ў рэдкіх — тарчаком — вусах застрала сухая сяніна. Мітусіцца яна ў вачах Марыльчыных прыкраї назоллівай плямаї, але сказаць — няма сілы. Трымае нешта Марыльку воддаль ад Ахрэма, пужае звычайная сямейная блізкасць. Хочацца бачыць чужога ў ім, хочацца, каб і ён не глядзеў на яе гэткімі спакойнымі, самадавольнымі вачмі, як на сваю непарушную ўласнасць.

Пасля вячэры Марылька доўга не клалася спаць. Здаваўся агіднай мярлогай супольны ложак. Яшчэ адчуваліся на целе ласкі таго, яшчэ з галавы не вывеяўся салодкі туман нядаўняга захаплення.

А мужык варочаўся неспакойна на ложку, чмыхаў нецярпліва носам.

— Ну, ты што ж не кладзешся, га? Гасі лямпу.

Яна адчувала, што не зможа сёння спаць разам з Ахрэмам, яе цягнула вон з хаты, куды хаця, абы не быць разам.

— Я, Ахрэм, пайду ў пуню на сена. Душна ў хаце.

— Яшчэ што выдумай. Кладзіся хутчэй: уставаць заўтра рана.

— У мяне галава баліць, напякла сягоння на сонцы, а тут душна, яшчэ горш забаліць.

Хацелася пабегчы, выскачыць з хаты і ўцячы далёка куды, як найдалей ад нялюбага мужа. Прыкраї дрыготаї абдавалася цела, як думка мігала, што прыйдзецца адчуваць блізка, поплеч чужога, нялюбелага. З агідным жа-

хам глядзела ў куток, дзе цьмяны дрыжачы свет карабаціў цыбатую постаць Ахрэма.

Знала, што не вытрымае, калі пакліча яшчэ, проста сарвецца з месца і пабяжыць вон з хаты, абураная страхам, злосцю і яшчэ нейкім невыразным і невымоўным пачуццём.

Але Ахрэм маўчаў. Марылька яшчэ троху сядзела, а потым паціху пасунулася к дзвярам. Чакала, што гукне яе, і баялася. Але ўжо ля самага парога дагнаў яе мерны, раскацісты подсвіст: зморапы муж заснуў, не дачакаўшыся жонкі.

На дварэ — мяккая цемра. Цёплы ветрык пяшчотна ласціць распалены твар. Двор ахутвае прытульным, з дзяцінства знаёмым пахам.

Нешта ўспамінаецца — дужа далёкае, роднае. Пакінутая тры гады назад бацькаўшчына ўстае ўвачму прыгожымі роднымі малюнкамі. Хочацца быць маленькай, несвядомаій у сумятні жыццёвай, чыстаій і бязвіннай.

Марылька ўздыхнула глыбока-глыбока. Асцярожна адчыніла бакоўку, выйшла на вуліцу. У камочак звінулася на прызбе і ўпялася задуменным поглядам у цемру.

Сэрца знібела. Нешта ўзляглося на яго цяжкім гнётам. Адчувала сябе адзінотнаій, пакінутаій, быццам усе забыліся на яе, быццам увесь свет ад яе адвярнуўся.

Жаласна стала Марыльцы. Чаму няма яго, Васількa, чаму не тут ён, каля яе? Чаму ён не прыйдзе падзяліць з ёй трывожна-цягучныя часіны?

Крыўда нейкая родзіцца ў сэрцы Марылькі. На яго, на блакітнавокага Васількa. Хочацца заплакаць — па-дзіцячаму, горка, жалобна, але так, каб ён бачыў, каб прытуліў яе да сваіх грудзей, каб суцяшаў пацалункамі жаркімі...

А мо ён прыйдзе? Мо пачуе яго сэрца нуду яе, сум невыводны?

Напружна ўглядаецца Марылька ў старожка-маўклівую цемень, шукае знаёмую постаць.

Не, няма нікагутка.

Няма Васількa.

4

Кожная справа мае свой пачатак і канец. Прыйшоў канец і кароткавечнаму шчасцю Марылькі. Здарылася гэта ўжо тады, як за плячмі асталося не мала чароўных прыгожых спаткашняў, поўных гарачаій уцехі.

Васілёк для Марылькі стаў ужо не той маранай і палахлівай, як калісьці, а палкай патрэбай, нявычарпанай крыніцай, здавальняючай неназбыўную смагу кахання.

Васілёк і жыццё... Зблыталася гэта ў адзін клубок, дзівосна звязаны, зраслося адно з адным жывым целам — не парваць.

Неяк раз Ахрэм на начлег рыхтаваўся. Яму Марылька прыгатавала вопратку і села на лаўцы, чакаючы з захаванай нецярплівасцю, калі ён паедзе.

Ахрэм нешта поркаўся на паліцы, марудзіў. Не знаў, пэўна, што Марыльку аж падмывае, што па ўсім яе целе перабягаюць ліхаманкавыя хвалі нецярплівасці, што ў вачах у яе стаіць ужо, мігціцца аблічча маладога палюбоўніка.

— Ну, чаго ты яшчэ марудзіш? — раптам азвала яна мужыка. І сама схапянулася. Дадала борздзенька:

— А то паедуць усе, будзеш адзін блытацца па полі...

Скрывіў Ахрэм вусны ва ўсмешку хваравітую, брыдкую.

— Што ты мяне з хаты хутчэй выжываеш... Знялюбеў табе, мусіць, не хочаш і бачыць?

Здрыганулася Марылька — не так ад слоў, як ад нечаканага тону Ахрэма. Ад яго ўпартага погляду адвярнулася, старалася гаварыць спакойна, няўважна:

— Не ў тым, а самому ж горш будзе, як ад людзей астанешся.

Гадала ў думках, што скажа Ахрэм. Да ўсяго гатавалася. Дыханне стрымлівала, ад гэтага яшчэ горш білася сэрца ў грудзях устрывожаных.

Ахрэм нічога не сказаў, моўчкі выйшаў. З сянец праказаў нездаволена:

— Цялушцы сена закінь, не забудзься!

Тады вольна ўздыхнула Марылька, успакоілася. Пачакала колькі часінак і выйшла на вуліцу. На момант убачыла Ахрэма, які выязджаў ужо з завулка на вясковую вуліцу.

На дварэ ўжо восень патыхала свежым ветрыкам. Здавалася, што прыляцеў ён аднекуль здалёку і прынёс з сабой квола-празрыстую маркоту восені. Марыльцы прыемна было апаласкацца гэтым ветрыкам; здавалася, што праніка ён у самае нутро і там ласкава казытае нешта добрае, такое сумнае.

Яна колькі хвілін стаяла перухома перад дзвярмі, по-

тым ураз схамяпулася, пабегла ў хату і пачала паспешна парадкаваць хатнія рэчы. А як скончыла, выйшла па двор, заняла сена цялушцы, як казаў Ахрэм, і потым праз бакоўку ў задняй сцяне двара выйшла ў невялічкі, цесны і лахматы садок. Згінаючыся пад цяжарна звісшымі галінамі дрэў, прайшла ў самы далёкі куток, дзе к трупехламу паркану шчыльна прытуліліся цыбатыя кусты сухога маліннік. Там стаяла, прыхінуўшыся да паркана, і, цікуючы, узіралася на карузлае, пакалупанае лайно гарода.

Агарнула салодка-радасная даволыасць, як убачыла знаёмую постаць. З хітраватай усмешкай прысела, схавалася за парканам і чакала. Скрозь шчэлкі ў паркане сачыла моўчакам, як падыходзіць развальнай пэўнай хадою, як прыглядаецца ўважна, шукае вачмі сваю Марыльку.

— Марылька! — пачуўся мілагучны насцярожаны голас.

Яна маўчала.

— Марылька!

Зноў не азвалася. Смешна стала, што стаў зусім ля яе, узлёгся плячом на паркан і пачаў у чаканні высвіставць нейкую песню.

Смешна да таго, што не вытрымала і раптам залілася вясёлым, гуллівым смехам.

Ён аж здрыгануўся ад нечаканасці.

— А бадай табе ліха не будзе! Гэта ж ты да смерці магла перапалохаць. Во ж табе, во-во, за гэткія штукі!

Ён схапіў цераз паркан яе галаву і цалаваў у гарачыя, слухмяныя вусны. Потым спрытна пераскочыў цераз паркан, абняў так, што дух заняло ў Марылькі і ад болю і ад тае цудоўнае радасці, што дзівоснай кветкаі закрасавала ў сэрцы.

Пад старой разложыстаі яблыняй была прытульная мясцінка. Там Васілёк з Марылькаі у чароўнаі ап'яняючаі злучнасці праводзілі начныя часіны.

Сёння Васілёк дужа вясёлы. Сёння ён асабліва горача, моцна песціць яе дрыжачае ў чароўнай знямозе, слухмянае цела.

Лятуць залатыя хвіліны. Як яны шпарка лятуць! Так шпарка, што не прыкмеціш, як і пеўні пяюць — адны, другія, трэція, як ночка ўжо рыхтуецца рассыпацца, распаўзціся ў шэры цікуючы золак. Хутка ўжо й расстанне надыдзе, апошні доўгі пацалунак.

Марылька шчыльна туліцца да Васілька, блукае смаглымі вуснамі па любаму твару.

— Васілёк! Ты ж любіш мяне, га? Дужа любіш? Ці гэтак, як я цябе?.. Ну, кажы, чаго ж ты маўчыш, недарэка мой любы!..

Васілёк пацалункам адказвае, абдымкам моцным, парывістым...

У гэту самую хвіліну здарылася тое, што заўсёды здараецца з смелымі злачынцамі-палюбоўнікамі. У шараватым змроку раптам вырасла, як страшэнная здань, нечаканая постаць. Голас пачуўся, поўны шалёнай, нястрыманай злосці:

— Марыля!

Анямелі абое. Па сплеценых руках быццам ток электрычны ўдарыў.

У Марылькі сэрца сціснулася, зайшлося ў агнявой, балючай трывозе. А як убачыла, што Ахрэм сагнуўся, хапаючы нейкую ўручыну, быццам кальнула нешта па ўсяму целу. Шпарка ўскочыла, загарадзіла дарогу Ахрэму.

— Ахрэм, не бі! — крыкнула не сваім голасам.

На сябе забылася, за Васілька агнявы страх ахапіў. Як хацеў кінуцца Ахрэм, схапіла яго за рукі, павісла ў сударгавай напружанасці. І прасіла адчайным, поўным жудаснай трывогі голасам:

— Васілёк! Ідзі, ідзі, хутчэй! Уцякай, а то заб'е!

Ахрэм вырываўся. Вусны — сінія, з пенай — выплёўвалі агідныя словы:

— Злодзей! Шчанёнак праклятый! У-у-у, паскуда!..

Васілёк стаяў перухома, і гэта яшчэ горш распальвала Ахрэма. Марылька ўсе сілы напружыла, трымаючы яго, і ўсё прасіла ўзрушаным голасам:

— Васілёк, ну што ты робіш... Ідзі, уцякай! Ці ж хочаш, каб забіў цябе...

Але, відаць, у Ахрэма канчаўся запас шалёнага гневу; ён ужо не рваўся да Васілька, а замест гэтага загвалтаваў ва ўсё горла:

— Пайшоў, каб я цябе і ў вочы не бачыў, сукін ты сын! Пайшоў воп з майго саду!..

Тады Васілёк паціху пайшоў к бакоўцы.

— Бывай здарова, Марылька! Да пабачэння! — сказаў, ідучы.

— Я цябе так пабачуся, што ї сваіх не пазнаеш, шчанёнак паршывы!

Асталіся ўдваіх. Яшчэ больш зашарэла ў паветры. Пачынаўся ўжо золак.

Марылька стаяла ўтупіўшы вочы. Было сорамна, ду-

жа сорамна. Але не за тое, што было, не за каханне — не! Сорамна было, што хавалася яна дасюль, што хавала, як злодзеї, шчасце сваё, нібы крадзенае. І яшчэ сорамна было, што вось гэты жорсткі нялюбы мужчына — яе законны мужык, што мае ён уладу над ёй, мае права гнаць ганебна таго, хто мо ў тысячу раз ёй бліжэй і мілей...

Во чаго было сорамна Марыльцы. І цяжка.

Ахрэм пастаяў троху моўчкі. Потым штурхануў яе, як непакорную скаціну, гукнуў здушаным голасам:

— У-у, шкура... Пайшла, кароў выганяй!

Крыўдна стала Марыльцы. Лепш забіў бы яе, чымся так, як скаціну якую. Схіліўшы галаву, выйшла з саду і тады толькі заплакала слязьмі пакутнымі, горкімі.

5

З таго дня пачалося Марыльчына гора. Біць яе мужык пачаў пасля таго, як нешта, вярнуўшыся з места, не заспеў яе ў дварэ і як яна, прыйшоўшы потым, проста, адкрыта сказала, што была ў Васілька. У Ахрэма тады вочы зрабіліся чырвоныя, страшныя і дзіўна, незвычайна бегалі, як у вар'ята, а на вуснах, як і той раз з Васільком, дрыгацела брудная пена.

Марылька не плакала, не крычала, толькі, як кінуў яе, сказала выразна і смела:

— Не люблю цябе, а люблю Васілька. І буду хадзіць да яго...

Ён перш памкнуўся быў зноў да яе, але стрымаўся, гукнуў сціснуўшы зубы:

— Пабачым!

З таго часу так і пайшло: мужык з двара, а Марылька шукае свайго Васілька, кахаецца з ім. Дазнаецца Ахрэм (а лацвей яму дазнацца, калі Марылька сама не патоіцца, скажа) і б'е яе, лае, здзекуецца над ёй, небаракай.

Церпіць Марылька. Дый чаму не цярпець, калі ёсць за што, калі гэтак добра з Васільком кахацца, калі Васілёк такі любы, харошы, так кахае яе, так умее суцешыць сваім шчырым каханнем.

Смешны гэты Васілёк — зусім блазнота. Як пажаліцца яму Марылька на Ахрэмавы здзекі, як пакажа сінякі на белым целе, дык ён сам не ведае, што робіць: і злуе, і плача разам з Марылькай, цалуе ў дзіўнай пяшчоце сінякі яе крывавыя.

Тым часам надышлі халады. Вёска ды і ўсё наўкола

забрудзела чорным, аголеным. Толькі ў лесе цешыць вока шуматлівая кволая жоўць. Але сцюдзёна там, няма тої прытульнасці даўнеїшай, тої мураўкі шаўковай, тых кусцікаў густых, што хавалі ўсё ад людскога вока цікаўскага.

Перастала хадзіць Марылька к Васільку на спаткаині. Цяпер толькі калі з'едзе Ахрэм куды на доўгі час, праведае пра гэта Васілёк і прыйдзе даведацца да свае любуткі.

Аднаго разу ў нядзелю якраз так і трапіла, што паехаў Ахрэм на места падатак здаваць. Марылька чакала Васілька. Чамусьці пэўна была, што прыйдзе.

І неўзабаве прыйшоў. Ды такі вясёлы, што — дзіва...

Як ускочыў раптам у хату, схапіў яе знецікі, закруціў гвалтам па хаце.

— Чаго ты гэта? Кінь, вар'ят,— адбівалася Марылька.— Чаго ўзрадаваўся так?..

Васілёк, запыхаўшыся, бухнуў на лаўку.

— Марылька!

— Ну?

— Ці ведаеш ты, што мы з табой абое дурні?..

— Як гэта?

— А зусім проста... Ты ж любіш мяне?

— Не.

— Я, Марылька, сур'ёзна...

— Дык чаго пытаешся!

— А я цябе люблю?

— Ого! Больш за ўсё на свеце...

— Не, троху не так. Ну, але добра — няхай сабе. Цяпер далеї... Ахрэма ты не любіш?

— Не.

— Ён цябе б'е?

— Б'е.

— Ён табе жыцця не дае?

— Ну?..

— Дык навошта ты з ім жывеш?

Марылька ї вочы вытрашчыла.

— Як гэта?

— А во што, любенькая... Я толькі цяпер уздумаў пра гэта. Чаго ж табе жыць з нялюбым, жыццё сваё губіць, зносіць набоі, ганьбу? Кінь мужыка, і будзем жыць з табой, як галубы, усягды ўдваіх, разам, усё жыццё... Добра?

Марылька галавоі пакачала.

— Не, Васілёк, не дазволю я, каб нада мноі людзі

смяяліся, каб усе пальцам у мяне тыкалі. Ого!.. Тады ж на вуліцу не выйдзеш, заклююць усе...

— Не тое ты гаворыш, Марылька, што трэба. Што нам людзі? Няхай брэшуць. Спачатку пабрэшуць, а потым і кінуць. Дый мы ж не абы-як, мы па закону. Цяпер жа не даўнейшае. Цяпер — не хочаш жыць, дык зараз табе і развод дадуць, і з другім пажэняць. Цяпер жа гэта — хм, глупства адно...

Марылька задумалася.

— Не, Васілёк, не трэба гэтага. Баюся я, не адважуся. Будзем лепш так. Ну, няхай ён б'е, няхай здзекуецца, абы ты не кінуў мяне, абы ты кахаў мяне так, як цяпер кахаеш.

Васілёк ласціўся к Марыльцы, угаворваў.

— Ну, Марылечка, ну, золатца маё, котачка... Чаму ты такая ўпартая? Гэта ж найлепшы спосаб, як жыццё сваё нам наладзіць, як шчаслівымі быць.

Марылька на сваім стаяла.

— Кінь, Васілёк! Лепш і не думай пра гэта. Не ўгаворыш. Буду ўсё зносіць, буду пакутваць, а гэткага сораму не вазьму на сваю галаву. Не, не.

Але хіба можа ўстаяць маладая жанчына проціў ласкавых настойных угавораў любага, проціў пацалункаў шчырых, гарачых? Здалася Марылька. Заплакала на грудзях у свайго Васілька і скрозь слёзы гаварыла, узрушаная:

— Добра... Ты дрэнны такі, ты мяне хочаш згубіць...

А калі ён хацеў што супярэчыць, сціскала яго сударгава і не давала гаварыць.

— Маўчы, маўчы! Я больш нічога не хочу слухаць. Ты нядобры — і ўсё.

Аднак праз якую часіну заспакоілася Марылька. Была сур'ёзная, задумёпая. Не цалавала, а галубіла свайго Васілька.

У бліскучых ад нядаўпых слёз вачах свяціўся напружаны смутак. Якраз у гэты момант пачулася з вуліцы ляскатанне калёс — прыехаў Ахрэм. Марылька нічога больш не сказала Васільку, толькі моўчкі пацалавала і праводзіла да дзвярэй.

Зірнула ў акно і ўбачыла, як па рагу завулка спаткаліся Ахрэм з Васільком. Села па лаўку і сядзела нерухома, чакаючы мужыка.

Ахрэм уляцеў у хату, як абвараны.

— Ізноў быў у цябе гэты шчанёнак?

— Быў.

— Калі ж гэта скончыцца? Калі ты пазбавіш мяне ад гэтага сораму?

— Хутка кончыцца,— сказала Марылька. Сказала так, што Ахрэм міжвольна змоўк, утаропіўшыся ў яе здзіўленым поглядам. А яна далей гаварыла тым самым спакойным, незвычайна цвёрдым голасам:

— Чаму ж ты не б'ешся? Бі, калі хочаш, апошні раз, бо больш не прыйдзецца...

Ахрэм маўчаў, бо не знаў, што мае на думцы Марылька, чакаў, што скажа далей.

— Я, Ахрэм, больш не буду жыць з табой.

— Як гэта не будзеш?

— А проста, бо не люблю цябе, не магу з табой жыць.

— Развядзешся, значыць? Дурная!..

— Хай сабе і дурная, але я гэта канчаткова падумала. І гэта так будзе...

Ахрэм змоўк і ў той вечар хоць бы слоўца выкінуў. А назаўтра зранку пачаў абыходзіцца з Марылькай так, як быццам нічога не было, як быццам забыўся на словы яе. І зусім асалапеў, як Марылька раптам сказала:

— Ну, Ахрэм, як мы, ці будзем судзіцца?

— За што?

— Ці, можа, так, ціхамірна расстанемся?..

У Ахрэма ў вачах засвяцілася палахлівая трывога.

— Гэта ты сапраўды, Марылька?

— Вядома, сапраўды.

— Як сабе хочаш...

Сеў на лаўцы, схіліўшы галаву. Твар непрыгожа скрывіла глыбокая крыўда. Жаласць шавяльнулася ў грудзях у Марылькі, дзіцёнкам пакрыўджаным здаўся Ахрэм. Але трымалася:

— Ну, дык жа як рабіць будзем?

— Ат! Як сабе хочаш,— ізноў папура азваўся Ахрэм.

Марыльцы не па сабе стала. Не ведала, што рабіць. Уявіла сабе будучае — цёмна там, невыразна. Куды падацца адразу? Да каго пайсці? Васілёк — той сам у бацькі на хлебе... Хіба ў двор? Так, гэта найлепей. Там татулька з матулькай, яны прымуць, не прагоняць родную дачку...

— Я заўтра ў двор паеду, Ахрэм. Ты мне каня дасі?

— Не ўжо, няхай ён цябе вязе, куды хоча.

Як пачула гэта Марылька, адразу быццам гара з плеч скінулася. Згінула жаласць, што ўжо зарадзілася ў мяккім сэрцы жаночым, замест яе закіпела варожасць.

Ахрэм не знаўся з бабай Гаўрыліхай з таго часу, як жаніўся на Марыльцы. Не то што ў злосці былі, а так неяк не ладзілася паміж іх сяброўства. Было гэта, мусіць, затым, што Ахрэм не ўзяў дачкі Гаўрыліхінай, а старая Гаўрыліха на гэта дужа спадзявалася. Вось з гэтага, пэўна, і пачалася іхняя нязгода. Цягнулася б яна мо і да самаї смерці Гаўрыліхінай, якая ўжо во-во павінна была стацца, каб не тая бяда, якая нечаканым гнётам узлягла-ся на Ахрэма. Яна ї штурхапула яго ў хацёнку Гаўрылі-хі — старую, крывую, падслепаватую, як і яе гаспадыня.

Увечары хацёнка Гаўрыліхі карчом карузлым пад дзвюма вялізнымі бярэзінамі хаваецца. Не свеціць акеп-цамі-шчэлкамі, бо Гаўрыліха ніколі святла не паліць.

Ахрэм ледзь намацаў ізепькія дзверы, што палахлі-ва адкінуліся назад, быццам хацелі ўцячы ў сярэдзіну хаты.

У хаце ціша. Каб не сударгавае сапенне недзе ў кут-ку, Ахрэм падумаў бы, што нікога няма ў дварэ.

— Хто там? — цяжка прарваўся скрозь сапенне рыпу-чы напружаны голас. Цяжка гаварыць Гаўрылісе — ды-хавіца апанавала старую.

— Добры вечар, бабулька! — пясмела гукнуў Ахрэм.

Старая не адказала адразу. Ахрэм слухаў, як сіпіць недзе ў цемры, і здавалася яму, што злуецца старая Гаў-рыліха.

— Ну, якім ветрам цябе занясло, га? — зарыпела ўрэшце.

— Прыйшоў да цябе на параду.

— Ай што здарылася?

— Затым і прыйшоў...

— Ага, як бяда, тады і да бабы Гаўрыліхі, а пакуль няма бяды, дык і не ўспомніць... Ну, кажы, што ў цябе?

Страшна рабілася ад гнеўнага голасу старої. Пачаў гаварыць ціхім дрыжачым голасам:

— З жонкаї у мяне ладу няма...

— Мм,— пешта прамычэла старая, але не сказала ні-чога.

Ахрэм далей гаварыў:

— Як жаніўся, ніштo было: жылі, як усе людзі жы-вуць. Ані сваркі не было, аніякае спрэчкі. Было зусім доб-ра. А потым ураз неяк, ліха ведае, з чаго б гэта,— не-ўзлюбіла мяне. Быццам урок хто, ці што. Так — ніштo

сабе: жывём, як раней, але ўжо відаць, што прыкра ёй, пялюба са мноїй... Ну, а далеї палюбоўнік з'явіўся...

— Ведаю. Усё ведаю. Нічога не схаваецца ад Гаўрыліхі... Усё чысценька ведаю. Кажы проста, што табе трэба ад мяне?

Ахрэм збіўся з панталыку, не ведаў, што казаць далей.

Усё ведае ведзьма старая. Пэўна, знае і тое, зачым ён прыйшоў, але выпытаць хоча... Добра, што цёмна — не так сорамна гаварыць.

— Бачыце, бабулька, зусім звар'яцела баба. Сказала, што больш жыць са мной не будзе, што развядзецца...

— Ха-ха-ха-ха! — нейкім страшэнным, нечалавечым свістам засмяялася Гаўрыліха і потым, запыхаўшыся, доўга парывіста дыхала, напаўняючы хату цяжкімі, густымі, быццам апухшымі зыкамі.

— Ну, што ж, не прыйшоўся, значыць, да густу, захацела лепшага... А шкода красуні, га?.. Салодкая ягадка, ды не па табе, ха-ха-ха!.. Перабірлівы ты, Ахрэм, занадта перабірлівы...

Ахрэм злаваўся. Хацелася кінуцца туды, у цёмны куток, парваць на шкумаццё гэтую старую брыдзь. Але прыходзілася трымацца. Замест таго — прыкінуўся рахманым, ласкавым.

— Дык вось, бабулька, прыйшоў да цябе параіцца. Ці няма якога спосабу, каб заспакоіць яе, каб яна свае вымудры кінула, каб хаця трошку мяне палюбіла?

— Ага! Затым і прыйшоў? Чаму ж няма, ёсць... Да ўсяго спосаб знойдзем. У каго другога, а ў Гаўрыліхі на ўсё зелля ёсць. Толькі...

— Вызвальце, бабулька, зрабіце ласку! Падзякую, чым толькі змагу...

— Ды гэта што — глупства... Я ўжо й сама не ведаю. Не варта б было табе памагаць, бо ганарлівы ты занадта, старое бабы чураешся... Ну, але добра... Пачакаї, зараз...

Чуваць было, як цяжка ўзнялася з месца Гаўрыліха, зашумацела, засіпела па закуццю. Ахрэму здалося, што ва ўсіх кутках разам шолах узняўся: у цемры не згадаць было, дзе нікае старая.

Страшна чагось стала. А калі набліжаўся шолах, агіда ахапляла. Брыдка было адчуваць блізкасць старое.

Праїшоў ладны час, пакуль адшукала Гаўрыліха ў цемры тое, што трэба. Урэшце яна падышла бліжэй да яго.

— Ну, дзе ты тут? Вось, бяры! Парашок... добрае зелле, ураз адвернe ад любага і да таго прыхіліць, хто дасць

яго. Кожны дзень па дробачцы давай: ці ў страве, ці з вадой — як хоця. Толькі абы яна не заўважыла. Праз які месяц усё скончыцца. Адверне назаўсёды, як лепей і не трэба. І цябе палюбіць — во як...

Ахрэм дрыжачай рукой намацаў пухлую мяккжэрыстую руку Гаўрыліхі. Схапіў закручапы ў паперку камочак, быццам баяўся, каб не перадумала часам Гаўрыліха, каб не ўзяла назад гэтае цудадзейнае зелле...

Гаўрыліха зноў палезла ў свой куток.

— Па дробачцы па маленькай кожны дзень. Калі выйдзе ўсё — зайдзіся, яшчэ дам.

Ахрэм затурбаваўся.

— Не ведаю, як і дзякаваць вас, бабулька. Заўтра прынясу вам чаго-колечы: мучыцы, сальца.

— Добра, добра.

— Ну, бывайце!

З разгону ледзь не трапіў галавой у прыталку — так шпарка пашыбаваў з хаты. Не чуў, як услед засіпела Гаўрыліха страшным зларадасным смехам.

А ў двор прыйшоўшы, ласціўся да Марылькі, цалаваў ёй у рукі і прасіў, каб яна не кідала яго, каб не губіла жыцця. Казаў:

— Усё дарую, забудуся па ўсё. Нават калі з Васільком, што ж, калі ты так кахаеш яго... Але не рабі сораму. Ты ж, пэўна, не падумала, як на гэта людзі паглядзяць. Яны ж праходу не дадуць ні табе, ні мне, соллю вочы закідаюць, славу пусцяць на ўсю акругу.

Марылька слухала моўчкі. Не выказвала, што робіцца ў яе ўсярэдзіне. А там агнём барацьба бушавала, надлам-вала тую моц, што дало ёй каханне.

Як ужо пеўні прарэзлівым гвалтам абвясцілі поўнач, страцілася ўся сіла ў Марылькі. Дала яна шчырую прысягу Ахрэму не кідаць яго, не парушаць сямейнага ладу.

За вёскай, там, дзе пажоўклы бор свяціўся новымі блакітнымі прагаламі, было астатняе спатканне Марылькі з Васільком. На вёсцы, выпадкова спаткаўшыся, шапатнула ямy, каб прыходзіў сюды, сказала, што пільна трэба пагутарыць.

Цяпер стаяла на ўзлессі, угарнуўшыся ў невялічкі кажушок, і чакала.

Жаль ціснуў сэрца, быццам сокі з яго, кроў выцэдж-

ваў. Ціспуў так цягуча, станоўка. Шкада было сябе, Васілька шкада — любага хлопчыка. Ён такі шчыры, сумленны. Добры такі. Цяжка крыўдзіць яго. Здаецца, усё б аддала за тое, каб не гаварыць з ім аб гэтым, каб спаткацца так, як раней, каб забыцца на ўсё, нічога не знаць.

Але не можа Марылька інакш. Не здольна яна хаваць што ад любага, усё скажа па праўдзе, адразу скажа. Няхай будзе, што будзе.

Як падыходзіў к лесу Васілёк, відаць было, што спяшаецца ён. Пэўна, трывога запала ў сэрца, здзівіла нечакана назначанае спатканне.

Убачыў яе, падышоў. Упяўся палахліва-ўстрывожаным поглядам.

— Ну, што, Марылька?

— Васілёк, не будзе нічога... Я перадумала, не буду развадзіцца з Ахрэмам.

— Як гэта так!..

— Не магу я, Васілёк, баюся. Сорамна... Дый усё роўна — не будзе нічога...

— Чаго не будзе?

— Не наладзім мы з табой, Васілёк, жыцця свайго. Ты яшчэ маладзенькі зусім, дзіцёнак... Дужа патрэбна табе нахабу браць на сябе! Потым каяцца будзеш, ды позна...

Васілёк глядзеў у дол пахмурым, троху загневаным поглядам.

— Не буду я каяцца. Не дзіцёнак я маленькі і ведаю, што раблю. І не тое ты гаворыш, Марылька, не затым ты не хочаш рабіць гэтага. Пэўна, другая прычына ёсць у цябе, ды не хочаш сказаць, хаваеш ад мяне.

— Ды не, Васілёк! Дадушы, нічагутка ад цябе не хаваю, шчырую праўду кажу. Я адно чую, што замест шчасця — пяшчасце, гароту мы сабе здабудзем. Так, Васілёк, ты ій сам добра падумай...

— Не любіш ты мяне, во што. Каб любіла, не гаварыла б гэтага. Пэўна, падакучыў, знялюбеў...

Вочы Марылькі раптам слязоій нечаканаі блісnулі.

— Сорамна табе, Васілёк, так гаварыць! Крыўдзіш мяне дарэмна. Сам ведаеш добра, ці люблю я цябе, ці не...

Васілька таксама шкрабанула за жывое.

— Ну, дык чаго ж ты, Марылька? Нашто ж ты мяне крыўдзіш? Думаеш, мне лёгка чуць гэта, думаеш, я — так сабе, жартую, думаеш, у мяне сэрца няма, камень замест яго ў грудзях...

Яго голас дрыжэў. Шчырае, маладое абурэнне чувалася ў ім. Марылька памкнулася да яго, моцна сціснула за рукі.

— Васілёк! Ты даруй мне, але я не магу ішачай. Я ведаю, што раблю, бо я больш за цябе пражыла на свеце, больш чаго набачылася: і шчасця, і гора людскога.

Часіну маўчалі. Ціха, жалобна шапацелі пажурыя дрэвы. Было сцюдзёна, непрытульна ў лесе.

Васілёк абапёрся аб дрэва, глядзеў у адну кропку на жоўцю пасыпаны дол, думаў. Вочы — халодныя, застыглыя, сталлю працятыя. Марылька да яго прытулілася, абняла пяшчотна, ласкава.

— Не, так ужо не будзе! Я не хочу. Не будзем мы з табой сустракацца. Можа, й ніколі не ўбачымся.

— Чаму так?

— А так...

— Ты скажы, Васілёк, што ты хочаш зрабіць?

— Ат! Свет вялікі, знайду сабе месца. Толькі не буду тут жыць больш, на вёсцы. Паеду ў горад, паступлю на завод. Рукі ёсць і — нішто сабе, не слабыя — здалею працаваць.

Васілёк цяпер узіраўся ўдалеч, у халодны бязмежны прасцяг, і свяцілася ў яго вачах адчайпая бадзёрасць, адвага, якая гаварыла, што чалавек гэты можа цяпер усё зрабіць, што захоча.

Міжвольна Марылька пейкаї павагаї працялася да Васілька, чувала ў ім моцнага, дужага мужчыну, які толькі цяпер нарадзіўся з хлапца-падуросты.

Яны больш нічога не гаварылі, стаялі моўчкі пейкі час, апанаваныя кожны сваімі асобнымі думкамі. Потым Васілёк раптам схапянуўся.

— Ну, бывай здарова, Марылька!

Сказаў голасам цвёрдым, спакойным. Па-сяброўску паціснуў руку і хацеў ужо ісці, але Марылька не выпусціла яго рукі. Сударгава прыціснула да грудзей, зазірнула ў халодныя вочы Васілька поглядам, поўным журбы і дакору.

— Васілёк!

Апошні пацалунак — сухі, мімалётны.

Пайшоў. Знаёмай любаї хадою.

Асталася адна.

Холад вакол. Холад на сэрцы.

Сумна-сумна!..

Васілёк знік. Хадзілі чуткі, што ў горадзе на завод паступіў, ніштo сабе жыве. Праз два тыдні і ліст прыслаў хлопцам вясковым. Пісаў, што весела ў горадзе: жыццё бушуе, праца кіпіць. Пісаў, што многа працуе, а ў вольны час кніжкі чытае, на сходкі ходзіць — розуму набіраецца.

Марылька, як прачула пра ліст Васількоў, заплакала ўцішку слязьмі ціхімі, горкімі. Крыўдна было, што Васілёк забыўся на яе, што жыве ён весела, не так, як яна, гаротная.

І стала думаць Марылька аб сваім жыцці. На ружовым, светлым фоне мінулага бруднымі плямамі агідна адзначаліся малюнкі сучаснага. Безуцешнае мадзенне, нялюбы мужык, пастаяннае знібенне нездаволенага журбуючага сэрца.

Знікла ўсякая цікавасць да жыцця, быццам праходзіць яно воддаль, не кратае яе.

Нават на здароўе сваё мала звяртала ўвагі Марылька. Той боль, што прыкрым клубком у апошні час з'явіўся ў грудзях, тая слабасць, што часам блытала, цяжарыла ногі, прымушала ў знямозе садзіцца на ложак,— усё гэта мала турбавала Марыльку. Вось толькі часам, як убачыць у люстэрцы свой паніклы, зжаўцелы твар, уздыхне цяжка, задумаецца.

З чаго б гэта? Вось з таго часу, як паехаў Васілёк, і пачалося. Сохне нешта Марылька, як галіна, сцятая з дрэва, слабее, усё болей і болей хворасць у сабе адчувае. Хворасць — ніштo, але вось шкада Марыльцы прыгаства свайго жаночага. Прыкра, што цела такое друзлае, брыдкае, што грудзі шмоткаі нялюбаі паніклі, што чырвань на твары змянілася жоўцю сінявай. З чаго б гэта?

Ніяк не згадае Марылька. Нічога не ведае маладзіца, нічога не прыкмячае. Не бачыць, як часам мужык узіраецца ў яе нецярплівым поглядам, быццам напружна чакае чагось ад яе.

Але праішоў час, і Марылька заспакоілася. Гэта было тады, як пачула яна ўсярэдзіне нейкае дзіўнае і прыемнае трапятанне, быццам узварухнулася нешта пад сэрцам. Тады Марыльчын твар закрасаваў усмешкай шчаслівай, і ў думках праяслося малапкаі:

«На маладое...»

Пасля гэтага яна ўжо не задумвалася аб сваёй хваробе. Усё стала зразумела. Дзіўна было, як яна дасюль не да-

зпалася. Гэта ж зусім звычайпая рэч, гэта ж заўсёды ў гэткім выпадку хварэюць.

«На маладое...»

Нават павесялела Марылька. Часцей Васілька ўспамінала і песціла думку, што будзе ў яе Васілёк — другі, але такі самы дарагі, любы. Таксама будзе кахаць яго Марылька. А мо яшчэ болей, бо ён будзе за двух: і за таго, што пасхаў, што недзе далёка.

Пасля пакрову захацелася Марыльцы да маткі старой з'ездзіць, даведацца. Так пацягнула, што проста жыцця не стала — усё рупіць. Ноччу не спіць, увачу родныя вобразы, матуля старэнькая ўспамінаецца, глядзіць чагось сумнымі, жаласпымі вачмі. І ў сне таксама хату родную бачыць...

Сказала Марылька мужыку пра тое, што хоча з'ездзіць да маткі, дык той рукамі замахаў: не хоча, дый годзе. Але Марыльку трудна было адгаварыць ад задуманага. Сказала Ахрэму, што калі не завязе, дык пяшком пойдзе, не паглядзіць на хваробу, на слабасць сваю. Тады згадзіўся Ахрэм. Паехалі.

Да вёскі, адкуль брадзена Марылька, было вёрст дваццаць. Ехалі лесам. Шумацеў лес пудлівым, жалобным шолахам, дрэвы голымі драцянымі галінамі шкрабалі неба.

Неба далёкае, халоднае і нейкае зеленаватае. Быццам не паветра, а лёд расплыўся ўгары празрыстай пялёнкай...

Добра адчувалася Марыльцы. Ядранае вясенняе паветра глыбока ўлівалася ў грудзі свежай, халоднай хваляй, пранікала, здаецца, у самую глыб, моцным парываннем жыццёвую сілу ўздымала.

Затрапяталася сэрца соладка, вольна. Твар зардзеўся даўно страчанай чырванню. Здалося Марыльцы жыццё зноў павабным, прыгожым, як калісьці, даўней. Не яе, Марыльчына жыццё, а жыццё наогул, тое, што ўсё абымае, злучае, усё напаўняе духам пепакойным, бурлівым, штурхае ўсё наперад, да лепшага, да прыгажэйшага. Мо гэта жыццё і ёй яшчэ дасць колькі сонечных, ясных дзянькоў? Мо ёй зусім і не варта яшчэ пакладацца на брудпацягучую, тухлую плынь марнага мадзення?

Нібы ў пацверджанне гэтых думак пачула Марылька знаёмае варухапне пад сэрцам. Усміхнулася ласкавай дзіцячай усмешкай, заплюшчыла вочы, утулілася, схавалася з тварам у вялізную дзядоўскую хутру.

Галава чагось закруцілася — пэўна, ад гэтага вострага, ап'яняючага паветра. Але пішто — гэта мінецца.

Ужо пайшлі знаёмыя, родныя мясціны. Ужо ўспамінкі пачалі вострымі, нечаканымі іголкамі працінаць узрушанае, насцярожанае сэрца.

Неяк так: глядзіць, напрыклад, на якую лагчыну, і — нібыта што. А потым ураз маланкай мігне які абразок з мінулага, звязаны з гэтай лагчынкай, і раптам кальне неяк у сэрцы. І ажыве лагчынка, зусім іншай зробіцца — не пазнаць. Кожны кусцік, кожнае дрэўка — усё сваё, знаёмае. Здаецца Марыльцы, што ўсё гэта жыве, радуецца, вітае яе...

А Ахрэм сядзеў моўчкі ўсю дарогу. Думаў аб нечым. Марыльцы ён чужы быў, далёкі, быццам не мужык гэта яе, а нейкі падарожны, да якога яна села над'ехаць.

У дварэ першая спаткала Марыльку старая матка. Заплакала, зарумзала старая, як убачыла дачку. І з радасці, і з таго, што так змянілася яе дачка, так дрэнна выглядае.

— Чаго ж гэта ты так схуднела, га? Ці не хварэла ты часам? І вестачкі не прыслала ніякай!..

Марылька не адказвала нічога: цяжка было гаварыць, нешта грудзі сціскала.

Гоман, тлум, сумятня... Заўсёды ўжо гэтак бывае, як з'явяцца нечаканыя госці. Гаварыў больш Ахрэм, а Марылька толькі моўчкі ўсміхалася ціхай усмешкай. З дарогі слабасць адчувалася. Хацелася легчы, адпачыць, але неяк нялоўка было.

Матка падышла да яе, ціха спыталася:

— Дык чаго ж ты, дачушка, гэтак знядужала? Што гэта табе прытрапілася?

Марылька зачырванела, шапарнула матцы на вуха:

— На маладое гэта, матулька,— цяжарная я...

— А... Дык дужа ж нешта табе гэта пашкодзіла... Пэўна, на хлопчыка... Так, так...

І заспакоілася старая, больш не пытала Марыльку.

Сышліся суседкі. Загудзелі ўвушшу аднамерна трас-кучай гутаркай. У галаве ў Марылькі званы няўпынна звінелі, зыбкі туман рассцілаўся.

Пілі гарбату. Ахрэм чамусь сам наліваў ёй — дзіўна... І гарбата нясмачная — пахне зеллем неякім.

Гутарка, тлум, духата... Не вытрымала Марылька. Устала, дацягнулася да ложка, лягла.

Невядома: ці заснула, ці мо самлела, знямоганая...

На другі дзень Марылька не ўстала з ложка. Усё цела быццам свінцом налілося, было не сваё, а чужое нейкае.

І ў галаве — таксама свінец, давіць на чэрап балюча, прыкра. Трудна варочаць цяжкім свінцом, каб выціснуць думку якую.

Але горш за ўсё — гэта грудзі. Нешта сядзіць там клубком, важкім, цвёрдым, бы камень які. Хочацца выхаркпуць гэты клубок, каб лёгка было ў грудзях хворых, ды нельга. Як кашлянеш, боль у грудзях — тупы нейкі, але моцны — дух зацінае.

У хаце затурбаваліся ўсе, засумяціліся. Матка кожную часінку падыходзіла, заглядала дапытліва ў вочы. Не гаварыла нічога, толькі глядзела. Марылька бачыла ў яе цьмяных слязлівых вачах адбітак свайго болю. Ахапляла шчырая ўдзячнасць, каханне да старое маткі.

Ахрэм таксама нічога не гаварыў, нават не падыходзіў. І за гэта дзякавала яму ў думках Марылька. Яна нават баялася, каб часам не падышоў да яе, не пачаў гутарыць. Яна і сама не ведала, чаму так прыкра бачыць яго, чаму цяжка адчуваць яго прысутнасць.

Чорнай, бруднай плямай здавалася Марыльцы фігура мужыка. Гэтая пляма гняла яе, непакоіла і міжвольна цягнула да сябе, як часам прыцягвае наш пагляд іншая пялюбая і прыкрая рэч. Здаецца, не глядзеў бы па яе, уцёк куды-небудзь, а тым часам глядзіш, адарвацца не можаш.

Глядзела Марылька на мужыка, проці волі ўпівалася вачмі ў яго непрыгожыя, рэзка, агідна скрыўленыя рысы. Яны свяціліся ў яго слізкіх вачах.

Часам чагось уздрыгваў раптам Ахрэм, быццам нейкая думка працінала яго, абдавала нервова-турбуючай хваляй.

Прыйшоў у двор браценнік Марылькі — Міхась-камсамолец. Быў недзе на вечары, там пачаваў і не ведаў яшчэ, што сястра прыехала.

Міхась — хлапец сакавіты, прыгожы, у Марыльку ўрадзіўся. Унёс у хату з сабоі маладую рухавасць. Да Марылькі звярнуўся.

— Эге! Што ж ты гэта, галубачка, хварэць уздумала? Нядобра гэта, не па-камсамольску. Так часам і памерці можна — куды ж гэта варта...

Марылька ветла ўсміхнулася. Міхась ёй напомніў яе Васілька. Той таксама гэткі рухавы, вясёлы.

— А за дохтарам паехаў хто? — пытаўся Міхась.— Не? Вот табе й маеш. Ці не з глузду вы ўсе паз'ехалі? Чаго ж чакаеце? Контррэвалюцыянеры вы гэткія! Татка! Пайшоў запрагай сваю шаўлюжку, я зараз паеду сам у горад.

Ахрэм раптам чагось страпянуўся.

— Ат! Выдумае — дохтара. Дохтар пасобіць, якраз. За блізкі свет ехаць, што гэта, жартачкі? Мы зараз у двор паедзем, там баба Гаўрыліха паглядзіць, не горш якога дохтара лечыць.

Міхась зірнуў на яго скосу, сказаў жартоўна-пагардлівым тонам:

— Цемра! Маўчы! Сам у бабы лячыся, калі да таго свету маеш сімпатыю.

А Ахрэм сапраўды ўзлаваўся.

— Ды ты ўжо дужа разумны. Порсткі які! Не ты хварэеш, дык няма чаго і гвалт уздымаць.

Міхась уважна зірнуў на яго.

— Але ж ты таксама, здаецца, здаровы. Марылька! Ехаць за дохтарам?

— Як сабе хочаш. Толькі ў двор не паеду я. Нізашто не паеду. Я тут папраўлюся... Або памру.

— Ну, вось бачыш? Татка, ідзі запрагай!

Як ужо Міхась наладзіўся ехаць, Марыльку раптам працяла нечаканая палкая думка. Непакоіна заварушылася на ложку, змагалася сама з сабой: ці сказаць Міхасю, ці лепш устрымацца, каб не выйшла чаго нядобрага.

Але, урэшце, не вытрымала, паклікала да сябе хлопца. Сказала яму ціха-ціха, каб ніхто не пачуў, асабліва Ахрэм:

— Міхаська! ці ведаеш ты Васіля, нашага хлопца?

— Гэта такі белы, валасы сукрыстыя?

— Во-во.

— Чаму не ведаю. Ну?

— Ён там, у горадзе, на заводзе недзе працуе. Калі будзе час, адшукай яго там.

— І што яму сказаць?

— Скажы... ну, скажы, што я хворая, што...

— Добра, разумею. Усё раскажу як належыць.

Ён падміргнуў хітравата.

— Так... іш ты — справа якая... Добра, абавязкова знайду. Скажу, што ляжыш ты, сумуеш, успамінаеш яго.

Марылька ўсміхнулася саромліва.

— Ну, добра, едзь ужо...

Міхась паехаў. Марылька праводзіла яго ў думках. Рахавала:

— Да гораду дваццаць вёрст; пэўна, будзе ехаць гадзіны са тры... Там будзе дзве або тры гадзіны... Назад тры. Якраз к вечару вернецца.

І потым увесь дзень Марылька жыла вострым чаканнем. Лічыла часіны і дзівілася, чаму так марудна яны паўзуць. Не дзень, а год цэлы...

Думкамі Марылька пераляцела ў горад, туды, дзе жыццё бушуе, дзе весела, прыгожа. Там іншыя людзі, там разумныя ўсе.

І яе Васілёк, пэўна, таксама разумны стаў, вучоны: усё ж кніжкі чытае.

Ці ўспомніць яе? Ці ўспомніць мінулае? Япа дык ні на хвілінку не забываецца на тое, што было калісь, што непазбыўнай красой жыццё ёй аздобіла. Яна толькі й жыве гэтымі ўспамінкамі... Ды яшчэ надзеяй, захаванай надзеяй, што будзе ў яе Васілёк. Другі — маленькі, любы...

К вечару Марыльцы пагоршала. Грудзі вострым агнём агарнуліся. Зусім цяжка стала дыхаць, быццам не хапала паветра. Здавалася, каб чаго сцюдзёнага, ледзянога ўліць у нутро, дык бы палягчэла, бо — агонь там, жывы агонь бушуе...

А свінец у галаве распусціўся, расплыўся, заліў свядомасць пялёнкай зыбкаі, атрутнаі.

Заснула Марылька ліхаманкавым сном, затрызніла ў гарачцы...

10

Марылька бачыла соп. Цяжкі, страшэнны. Як толькі заснула, пачула адразу, быццам нехта моцным цяжарам узлёгся на яе. Нехта вялізны, страшэнны. Клюшнямі балюча ўпіўся ў бакі, а грудзямі сваймі грудзі ёй душыць. Марылька ўяўна адчувае гэтыя страшэнныя грудзі. Жорсткія, жалезныя. У іх костка ўрасла — мулкая, вострая. Яе асабліва балюча адчувае Марылька. Здаецца, праламала яна ёй грудзі, уелася аж у нутро саменькае, муліць, ціскае, не дае ўвабраць у грудзі паветра.

Варочаецца, стогне Марылька, стараецца скінуць з сябе жудасную нахабу. Але не даецца.

Смяротны адчай, спалох агнявы ахапляе. Бачыць Марылька твар над сабой — жорсткі, страшэнны, агідна скрыўлены, працяты нечалавечай злосцю. Нешта знаёмае, блізкае, нехта свой...

Ахрэм!.. Гэта ж ён мучыць яе, ён задушыць яе хоча...

— Ахрэм! Пусці! За што ты?.. Людцы, ратуйце!..

Але ніхто не ратуе, няма навокал нікога... Не, нехта ёсць, стаіць воддаль няясным ценем. Хто гэта?.. Гэта ж Васілёк... ён, вядома, ён... Ён ратуе зараз, ён звольніць яе ад Ахрэма...

— Васілёк! Ну чаго ж ты стаіш? Ці ж ты забыўся на Марыльку на сваю? Ратуй яе, абарані!.. Бачыш, душыць ён, хоча забіць... Васілёк!..

Але дзе ж ён падзеўся?.. Няма Васілька. Плакаць хочацца Марыльцы, слёзы падступаюць да горла. Каму паскаліцца?

У каго шукаць абароны?..

Вось нехта, здаецца, падыходзіць. А, гэта Міхаська, браток.

— Міхась мой, родны!..

Міхась хоча схапіць Ахрэма, узнімае руку, але, замест Ахрэма, хапае яе проста за сэрца.

Ужо Ахрэма няма, толькі Міхаська ўсё нешта трымае за сэрца, ціскне яго, вырывае з грудзей. І крычыць чагось, як звар'яцелы:

— Дохтара прывёз! Дохтара прывёз! Марылька, Марылька! Прачніся!..

І прачнулася Марылька... З здзіўленнем азірнулася навокола.

У цьмяным жаўтаватым святле схінуліся над ёй неякія постаці. Міхась лапатаў весела:

— Ну, вось... Моцна ты спіш, Марылька, ледзь узбудзіў... Вось дохтар прыехаў, зараз абгледзіць цябе.

Марылька ўбачыла поплеч з Міхасём незнаёмага чалавека ў чорнай вопратцы. З цікавасцю зірнула на яго твар. Мяккія вусы, бародка, вочы сур'ёзныя, але ветлыя. Пачула шчырую даверлівасць да гэтага чужога чалавека.

А там далей нехта трэці. Таксама ў чорным. Нешта знаёмае ў адкрытым прыгожым твары...

Васілёк!.. Ён прыехаў, ён тут. Не кінуў, не забыўся на яе!..

Радасць агнём працяла. Адразу ўскочыць хацела, кінуцца да любага, але прыціскала нешта да ложка.

Потым Марыльцы добра так, прыемна зрабілася. Неяк асаблівай прытульнасцю ахінулася хата. Быццам пасля доўгай адлучкі трапіла яна ў кола сваіх родных, блізкіх.

— А дзе Ахрэм? — раптам усплыло на думку.

Азірнула хату. Матка пікае ўзад і ўперад, паспешна парадкуе хатнія рэчы. Бацька па лаўцы сядзіць, узіраецца на ўсё безуважным поглядам: стары ўжо, яму толькі каб сядзець у спакоі, каб не чапалі яго.

Ахрэма няма. Пэўна, некуды выйшаў. Як гэта добра, што яго няма! Няма й таго цяжару, што гнётам ускладае яго прысутнасць.

Тым часам доктар пачаў абслухваць яе, абстукваць. Яна трывала цярпліва, але ў думках чакала, каб хутчэй адышоўся, бо вочы міжвольна шукалі Васілька, яго чакала да сябе Марылька.

Доктар абслухаў, сказаў бадзёрым, вясёлым голасам:

— Нішто, маладзіца, паправіцеся. Арганізм дужы, малады — ён пераможа...

Доктар адышоўся, сеў да бацькі на лаўку, пачаў гутарыць з старым.

Тады падышоў Васілёк. Прывітаўся, сеў на край ложка. Яна сударгава прыціснула яго руку да сваіх хворых грудзей. Зазірнула ў твар яму палкім, ліхаманкавым поглядам.

— Ты прыехаў, Васілёк... Які ты добры...

Больш не магла гаварыць. Сціснулі горла нечаканыя слёзы. З усіх сіл трымалася, каб не заплакаць.

Васілёк пяшчотна гладзіў яе галаву, глядзеў ёй у вочы кахаючым, поўным нявыказнага жалю поглядам.

— Марылька, любая, што ж гэта ты... Як табе прытрапілася? Пэўна, не сцераглася, застудзілася...

— Я папраўлюся, Васілёк, хутка папраўлюся... Мне ўжо лягчэй. Я заўтра, пэўна, ужо ўстану... Як ты добра зрабіў, што прыехаў. Ой, як мне сумна было ўвесь час, як цяжка. Кожную хвілінку цябе ўспамінала. Мо з нуды і прылучылася мне гэтая хвароба?..

— Марылька! Навошта ты тады так зрабіла? Не было б гэтага...

— Маўчы, Васілёк, я і сама каялася... Слухай. Я хутка папраўлюся... Тады я кіну Ахрэма... Бо не змога мая ўжо... А мо ты цяпер не захочаш? Васілёк?..

Ён моцна сціснуў яе гарачую руку.

— Як табе не сорамна, Марылька!..

— Ну, добра... А ведаеш што? Я маю сказаць табе нешта дужа-дужа цікавае. Давай сваё вуха...

Васілёк нахіліўся да яе.

— Слухай, Васілёк, у мяне будзе нехта... сын будзе... твой, Васілёк...

Яна глядзела саромліва і разам здаволена, чакала, як ён адкажа на гэтую навіну. У вачах Васілька загарэлася новае пачуццё, новая пяшчота. Сказаў толькі:

— Марылька, сонейка маё яснае!..

А яна далей гаварыла:

— Гэта і хвароба ў мяне з гэтага. Так заўсёды бывае, кожная хварэе. Гэта ў мяне — на маладое. Ды дохтар не ведае, я не сказала яму. Я нікому не казала, толькі мамцы адной... А ты, Васілёк, будзеш любіць яго?

— Буду...

— Ну, вось і добра. Цяпер ты раскажы, як табе там жылося... Васілёк, ты мяне ў горад возьмеш з сабою, га?..

— Ну, дык як жа. Абавязкова вазьму. Будзем жыць з табой разам. Ты таксама на работу паступіш. У нас на заводзе жанчыны поруч з мужчынамі працуюць. І няма таго, каб — калі ты баба, дык ужо і не лезь туды, куды табе не належыць. Баба зусім роўная з мужчынам.

Васіль пачаў апавядаць пра рабочае жыццё, пра заводскія парадкі. Марылька ўважна прыслухоўвалася да яго спакойнага, ласкавага голасу. Чула ў ім новыя ноты, якія нібы адбівалі тое невядомае, свежае, што ўвабраў у сябе Васілёк за час расстання. Слухмянае ўяўленне малявала ёй вобразы таго жыцця, з якога прыйшоў цяпер да яе Васілёк. Жывога, цікавага і разумнага.

Стала Марыльцы добра так, лёгка. Быццам зляцеў той цяжарны гнёт, што душыў грудзі. Толькі муць у галаве яшчэ плавала, яшчэ блыталі неслухмяныя думкі.

Раптам у хату з'явіўся Ахрэм. Пахіліў галаву; твар задуменны, пануры. Васілёк, як убачыў яго, устаў, адышоўся.

З спалохам чакала Марылька, як спаткаюцца. Ды лаяцца будзе Ахрэм? Сэрца забілася, а ўзрушаны ўздох спаткаўся глыбока ў грудзях з балючым клубком...

Не, нішто. Толькі сярдзіта зірнуў Ахрэм у бок Васількa ды вусны скрывіў у недалужна-злосную ўсмешку.

Прыкрая маўчанка на момант атуліла хату...

11

Доктар згадзіўся астацца нанач. Дужа прасіў Васілёк, бо бачыў, што моцна хварэе Марылька, што смерць ужо навісла над ёй.

Ноччу Марылька страціла прытомнасць, трызніла страшэнна, жудасна. Часта памінала Ахрэма, Васілька, горад,

завод. Часам стагнала, крычала, быццам мучыў хто яе, а часам нібы заціхала, заспакойвалася. Тады ўсе прысутныя адчувалі ўзмах скрыдлаў смерці, з спалохам чакалі канца.

У адну з гэтых хвілін Васілёк адвёў убок доктара.

— Слухайце, скажыце, калі ласка... толькі праўду, шчырую праўду... ці ёсць якая надзея?

І чакаў з напружанасцю, што скажа доктар. Той паглядзеў на яго сваім мяккім, ласкавым поглядам.

— Хто яго ведае? Трудна згадаць, чым кончыцца... Але мала надзеі. Арганізм надламаны ўжо, цяжка змагацца яму з хваробай...

— А якая гэта хвароба?

Твар доктара стаў асабліва сур'ёзным. Ён упіўся поглядам у Васілька.

— У мяне ёсць падазрэнне, але, вядома, я не пэўны ў гэтым і калі скажу вам, дык толькі спадзяваючыся на вашую сумленнасць і сціпласць. Ёсць прыметы, што хворая атручана. Якой атрутай — невядома. Можна меркаваць, што ўжо доўгі час яна нейкай атрутай падрывала свой арганізм, а цяпер мы бачым астатні, заключны акт...

Васілёк аслупянеў ад нечаканасці. Потым мігнула ў думках:

— Ахрэм!..

Невыразная, няясная здагадка прымусіла здрыгануцца ад міжвольнага жаху, і разам пякучай гаркотай разліўся па нутру невымоўны жаль. Кінуўся да Марылькі, з адчаем, з бязмернай пяшчотай глядзеў на яе змучаны, збялелы твар.

Скрозь любыя, дарагія рысы свяцілася нешта незнаёмае, халоднае, страшнае...

— Няўжо гэта смерць? Няўжо няма ратунку? Няўжо не будзе яе, зусім не будзе?.. Што ж гэта такое?..

А поплеч доктар стаіць. Чаго ён чакае? Чаму ён не дасць зелля якога, каб вылечыць, каб выратаваць?..

— Дохтар! Зрабіце што-колечы, ратуйце... Няўжо вы не маеце спосабу?..

Доктар пакачаў галавой.

— Бываюць выпадкі, калі і навука нічога не можа зрабіць.

Тады сеў Васілёк на лаўку, закрыў твар рукамі і ціха, па-дзіцячаму заплакаў.

Ціха ў хаце было. Не спаў ніхто, але ўсе маўчалі або гаварылі шэптам, быццам сцерагліся, каб не парушыць

астатняга спакою хвораі. Трывожная ўрачыстасць распасцёрлася ў хаце.

Потым раптам замітусілася матка старая, да абраза чагось пабегла. Міхась ціха, але цвёрда сказаў:

— Не трэба!..

І матка скарылася, моўчкі хліпнула носам.

Яшчэ колькі хвілінак напружанаі, застыглаі маўчанкі і потым — быццам загачаная рэчка прарвалася, разлілася наўкола бесканцовай патокай. Гэта загаласіла, завыла на ўсю хату старая матка.

— А дачушка мая родная!

Зорачка ты мая ясная!

А навошта ж я цябе паіла-карміла?

А навошта ж я цябе гадавала?

Нашто ў людзі выпраўляла?..

Васілёк узняўся. Дзіка азіраўся наўкола, быццам не разумеў, што тут робіцца. Дзіўным здаваўся гэты працяжлівы гвалт старое, дзіўным і жудасным, бо шкуматаў ён, ірваў нутро сваімі надрыўнымі ўзвывамі.

Зірнуў Васілёк на Марыльку... Не пазнаў. Дзе падзеліся тыя любыя, прыгожыя рысы знаёмага твару? Замест іх — нешта бязлічнае, застыглае, вашчана-белае.

Тады яскрава зразумеў Васілёк, што няма ўжо Марылькі. Няма і не будзе ніколі...

Пуста стала ўнутры. Не плакаў. Толькі моцна сціснуў зубы, каб стрымаць душэўны боль.

Азірнуў моўчкі прысутных. Спыніўся поглядам на Ахрэме, які стаяў воддаль і слюнява сморгаў чырвоным носам. Ці плакаў, ці мо від рабіў толькі, што плача...

Васіль раптам падышоў да яго. Упяўся халодным сталёвым поглядам у спалоханы, раптам збялелы твар, сказаў-прасіпеў ад гневу здушаным голасам:

— Што ты зрабіў з ёй?

Ахрэм затросся, засумяціўся. Залепятаў узрушаным, спуджаным голасам:

— Што я зрабіў?.. Нічога не ведаю... Нават не знаю, з чаго гэта ў яе пачалося...

Васіль бліжэй наступіў на яго, сцебануў проста ў твар жорсткім шэптам:

— Гаварыў усё, зладзюга!..

Затросся яшчэ болей Ахрэм.

— Не ведаю. Дадушы, не ведаю. Можа, з гэтага зелля... Гаўрыліха мне давала...

— З якога зелля?..

І тады Ахрэм, захліпаючыся, збіваючыся, стаў апавядаць пра ўсё: як браў зелле ў Гаўрыліхі, даваў неўпрыметку Марыльцы, як ён тут ужо, у бацькоў, баючыся, каб не прапала дарэмна ранейшае, даў ёй апошнюю, мусіць, занадта вялікую частку гэтага зелля...

Усе змоўклі, слухаючы Ахрэмава каянне. Было дзіўнае, жудаснае яно над свежым целам Марылькі. Здавалася, што чуе нябожчыца гэта, што пільней за ўсіх прыслухоўваецца яна да страшэннага прызнання свайго мужыка. Кожны нібы адчуваў сябе вінаватым перад гэтай без пары загінуўшай, згубленай жанчынай.

Васіль сядзеў ля нябожчыцы, пахіліўшы галаву ў глыбокай задуме. Не злаваўся больш на Ахрэма. Што ж ён? — цёмны, мізэрны. У цемры радзіўся, жыў у цемры. Урос у спрадвечныя забабоны.

А Марылька... Бедная яна... Панікла без пары, як кветка ў дрэнным, атрутным паветры. Зацягнула небараку згубная прорва жыццёвае багны...

Сэрца знібее. Невыгодны жаль гняце, сціскае нутро абцугамі балючымі. Але плакаць не хочацца. Няма слёз. Слёзы ў таго, хто губляе ўсё, хто стаіць перад цёмнай пустыняй, не бачыць нічога наперадзе. Слёзы ў таго, хто разам з каханым прадметам губляе надзеі, губляе сэнс свайго жыцця.

Васілёк не з такіх. Васілёк моцна стаіць у жыцці, не зварухне яго няшчасце. Ён ведае, што наперадзе — не заблудзіць...

Успамінае Васілёк астатнія часіны жыцця Марыльчынага. Як яна хацела жыць! Як радавалася, што ён з'явіўся падтрымаць яе, пасобіць узняцца з гнілога балота... А тая палкая надзея, смаглае жаданне таго, хто звязаў бы іх, ды ўжо нават звязаў новымі пазведанымі путамі...

«На маладос...»

Бедная, любая! Ці ведала яна, што праўду казала гэтымі словамі? Ці ведала яна, што цяпер у муках, у болі нараджаецца новае жыццё — разумнае, вольнае? Многа цяжкіх, часам бязвінных ахвяр справаджае гэта нараджэнне. Але гэта — неабходная, няўхільная хвароба жыцця...

Бо гэта — на маладос...

КАМСАМОЛКА

Каб я быў мастаком, я б намаляваў вобраз камсамолкі. Я б уліў у яго ўсю магутна-бурлівую моц маладога жыцця, я б аздобіў яго хараством нябачаным, дзіўным.

Ён стаіць увачыу ў мяне, гэты дзівосны вобраз — сымболь нязведаных радасцей новага жыцця. Ён гарыць пекнатой неўмірушчай, ён маладосцю задорнай, гуллівай брызгае з блакіту іскрыстых вачэй.

Бачу ў ім водбліск агністага сонца, бачу ў ім волю раздольна-шырокую, мора імкненняў адважных, глыбокіх. Удалеч, ушыр, у адкрыты зарністы прасцяг, каб усё агарнуць сваім буйным запалам, каб усё ажывіць, акрапіць жыватворчым дажджом красавання!..

А часам —

Бурным уздымам, віхурнай гразою сталіцца люстра блакіту. Тады здаецца, што ў гнеўным шале, у грымотах чорных, сярод маланак бліскуча-вострых устае вялізнай грамадай бурнай жывы Кастрычнік.

Тады — адвага, сталёвы гарт.

Тады — усё перамагчы! Усё!

Вінтоўку ў рукі! На бой!..

Пакуль зноў не развеюцца хмары, пакуль не ўсміхнецца ласкавае сонца.

А тады —

Цвіце, красуе чырвань твару, з вачэй іскрыстых радасць льецца, расце, бушуе жарам сонца, блішчыць наўкола новым светам.

Тады ў спевах, у забавах, у гуллівым карагодзе памiж працы крапатлівай граюць вочы маладосцю, рунню свежай, срэбралістай. І звініць, зычыць няўпынна голас звонкі камсамольскі, голас тысяч, мільёнаў, дружным спевам, дзіўным хорам:

— Я — камсамолка! Мої бацька — Кастрычнік!..

Дык вось які б я хацеў стварыць вобраз камсамолкі — сымболь нязведаных радасцей новага жыцця. Эх, каб я быў мастаком!..

ДЗІЎНАЯ

1

Узімку гэта было. Пасля дзяпной сумятні Блонскі сядзеў у сваім кабінеце, атулены шэра-ваўняпымі згусткамі змроку. Вольна раскінуўся ў старасвецкім крэсле, погляд акунуў у аксамітную мякаць цёмнага кутка і з асалодай адчуваў ціхую перухомасць.

Лёгка, не турбуючы, варушыліся думкі, гарэзна спляталіся ў зыбучую чараду. Было прыемна, вальготна. Адпачывала цела, адпачывала змардаваная галава. Так сядзеў перухома, слухаў, як маятнік на сцяпе ўпарта таўхае марудныя хвіліны.

У сумежным пакоі глуха раздаліся крокі, вывелі Блонскага з адзервяпення. У кабінет, не папытаўшыся, увайшла жанчына. Ля парога спынілася, азірнула ўважна пакой. Угледзела Блонскага і падышла да яго рэзкім крокам.

— Вы старшыня выканкома? Добры вечар!..

На стол бесцырымонна партфель кінула, села насупраць. Блонскі не змяніў выгаднай позы.

— Я... Добры вечар!..

— Да вас прыехала, толькі што з чыгункі. Дзе прытуліцца?

Блонскаму не падабалася. Надакучылі гэткія. Міцусяцца, ламаюцца, быццам хочуць здзівіць.

— Чаго прыехалі?

— Камандзіравана на працу сярод жанчын... Ды што вы ў цемры? Свету няма?

— Ёсць. Там на сцяне выключацель.

Яна памацала, адкруціла. Балюча ўдарыў па вачах яркі свет электрычнасці, вымеў за акно мяккія цені змроку.

Блонскі зірнуў па жанчыну. Убачыў перш за ўсё вочы — яркія, вострыя, з шчырым вясёлым агеньчыкам. У іх — смелая, дапытлівая цікавасць. Упадабаліся. Міжвольна ўсміхнуўся, як спаткаліся поглядамі.

«Нішто»,— падумаў.

Яна азірнула пакоі.

— Вы заўсёды тут седзіцё?

— Не, часам не сяджу. Зараз пасяджэнне будзе, чакаю.

Глядзеў на яе з лёгкай усмешкай, чакаў, што далей.

— Я надта змарылася... Я працаваць люблю... ведаеце, так, з захапленнем, з запалам. Але я фізічна слабая і не магу вытрымаць. Дрэнна. Завідую вось гэткім, як вы...

Апошнія словы яна працягнула задуменна. Спыніла ўважны, сур'ёзны погляд на яго фігуры. Ён таксама зірнуў на свае дужыя члены. Быццам сам здзівіўся сіле сваёй дубовай, быццам засаромеўся за яе.

— Так. Я нішто сабе... так.

Яна раптам рассыпалася задорным іскрыстым смехам:

— Ха-ха-ха! Які вы смешны... вялікі які... Ха-ха!

І ўраз праглынула смех, затурбавалася.

— Добра. Як жа мне быць? Дзе пакуль што прытуліцца? Я да вас заўтра прыйду. Вы, здаецца, і сакратар укому? Я заўтра зраню, пагаворым аб усім. А цяпер... я сапраўды не ведаю, дзе прытуліцца. Парайце.

Блонскі расказаў, дзе гасцініца. Як выходзіла, чамусьці сказаў:

— Не зранку заўтра, а гадзіны ў чатыры зайдзіцеся. Тады вальней будзе пагутарыць.

— Добра! — кінула яна з дзвярэй.

Як выйшла, Блонскаму пуста стала ў пакоі. Запыла цягуча-едкая ціш старога каменнага дома, балюча напяла мазгі.

Нецярпліва чакаў, калі зноў пачуюцца крокі, на пасяджэнне пачнуць прыходзіць.

А ў галаве думкі тачыліся: старожкія, пудлівыя, як цішыня навокал пустога вялізнага дома. Думаў аб гэтай жанчыне. Хацеў уявіць яе ў сваіх думках, ды чамусьці не ўдавалася. Вобраз неяк плямiўся і развейваўся. Толькі вочы яскрава ўцяліся ў памяць. Здаровыя, яспыя, з шчырым агеньчыкам.

Назаўтрага Блонскаму міпуты здаваліся за гадзіны, а гадзіны за вечнасць. Чакаў чатырох. Не хацеў сам сабе ў гэтым прызнацца, не хацеў пагадзіцца з гэтым. Ахапляла дасада, злосць на самога сябе.

А як падышло да чатырох, зусім узбурыўся. Хадзіў з кутка ў куток, поўны прыкрай нецярплівасці. Часам спыняўся, аглядаў сам сябе, дзівaваўся:

«Што ж гэта такое? Нервы, ці што?.. Вось дык гісторыя».

Злаваў, абураўся і зноў хадзіў узад і ўперад.

Урэшце яна прыйшла. Паспешна прывіталася, села каля стала.

— Ну, давайце пагутарым, як тут у вас... З чаго пачынаць?..

Пачала гаварыць аб справе. Блонскі глядзеў на яе і дзівіўся яе сціслай сур'ёзнасці. Зусім не так, як учора. Ніводнага старонняга слова, быццам, апрача справы, нічога няма ва ўсім свеце. Нават агапькі ў вачах — сталёвыя нейкія, цвёрдыя.

Доўга гутарылі. Змрок разліў па пакоі безуважна-шэрую муць, згрудзіў у калматую масу прадметы. Электрычнасці не палілі, сядзелі ўпацёмку. І тады Блонскі неяк асабліва моцна, напружна стаў адчуваць гэту жанчыну. Затушаваная цьмяным валакном змроку, яна здавалася нейкай хваравіта-назойлівай плямай, якая ўпарта цягнула да сябе ўвагу. Ён пільна прыслухаўся да гуку яе голасу, напружна стараўся знайсці ў ім нешта, злавіць. Здавалася, што пад гэтым сухім, троху мітынговым тонам ёсць нешта схаванае, палахліва затоенае. Адчуваўся нейкі ледзь прыкметны фальш у гэтых цвёрдых, энергічных словах аб вызваленні жанчыны, аб змаганні з іржавымі путамі сям'і, аб рэвалюцыі быту і г. д. А часам Блонскі выяўна чуў у яе голасе мімалётныя ноткі няпэўнасці, нейкага сумнага неўразумення. Гэтыя ноткі чамусьці выклікалі сімпатыю да яе, спачуванне.

Блопскаму ўрэшце надакучыла гаварыць аб сур'ёзным. Ён раптам перапыніў яе:

— Слухайце... Я ж дасюль не ведаю вашага прозвішча... Зусім з думкі сышло.

Яна засмяялася.

— Бяда вялікая, падумаеш... прозвішча... Але ж і сапраўды, трэба як-небудзь зваць... Шумава — маё прозвішча... А ваша я ведаю, бо вы ж тут вядомы на ўвесь павет...

Нейкі час маўчалі. Цішыня раджала напружаную востру блізкасць. Гэта цяжарыла. Здавалася, што даўнодаўпо знаёмы і ўжо надакучылі адзін аднаму.

Блонскі ўстаў, запаліў электрычнасць. Зірнуў на яе. Яна сядзела ў задуменні. Аб нечым цяжкім думала, бо вочы атуліліся цьмянай, сталёвай глыбінёй. Потым яна нецярпліва трахапула галавой, узнялася. Усміхнулася — ні то зморанай, ні то сумнай усмешкай.

Блонскі агарнуў яе ўсю ўважным поглядам. Залюбаваўся міжвольна. Яна вельмі прыгожай здалася яму.

Шумава быццам заўважыла гэта. Задорна кінула яму насустрач адкрыты вясёлы погляд. У вачах аганькі заблішчэлі, зайскрыліся. Загаварылі жвава, паспешна.

— Заседзелася я... Гадзін дзевяць, пэўна, ужо ёсць... Трэба ісці ў свой палац... Ну, і ўдружылі вы мне, таварыш Блонскі! Высока-высока і брудна. Адзін толькі й быў вольны нумар. Сёння ўсю ноч ваявала з мышамі... Надта злосны вораг... Ну, я пайшла. Бывайце!

— Я таксама пайду. Пойдзем разам.

Дарогай яна лапатала аб розных драбніцах. Блонскі маўчаў, не хацелася гаварыць. Думкі цяжэрна, грузка перавальваліся, давілі мазгі.

На рагу вуліцы развіталіся.

2

З таго часу яны сустракаліся часта. Блонскі любіў глядзець, як працуе Шумава. Захапляў запал яе, упартасць у драбніцах, у будзённых, марудных справах, упартасць, якая пераходзіла ў азарт, ап'янение. Гэтая ўпартасць часам хваравітай здавалася, але заўсёды захапляла, зараджала, абуджала і ў Блонскага нейкі востры апетыт да работы.

Праз два тыдні Шумава склікала з'езд жанчын-дэлегатак. На з'ездзе Блонскі сядзеў у прэзідыуме. Глядзеў на белыя, чырвоныя, чорныя хусцінкі, на задуменныя, застыглыя ў глыбокай сур'ёзнасці твары. І адчуваў, як усе гэтыя твары — маладыя й старыя, прыгожыя й непрыгожыя — зліваюцца для яго ў адзін твар жанчыны-работніцы: змораны, сумны.

Шумава рабіла даклад. Яна была ўзрушана, гарэла жарам шчырасці, веры ў тое, аб чым гаворыць. Яе словы зычэлі той непасрэднай, простай праўдзівасцю, якая бывае звычайна ў тых, хто не толькі ведае справу, але адчувае яе, хто звязаны з ёю арганічна, кроўна. Яе слухалі так, як рэдка калі дакладчыкаў слухаюць. Уся зала дыхала напружанай, глухой цішынёй.

А як скопчыла, разгарэліся гарачыя, упартыя спрэчкі. Раскрыліся заледзянелыя ў горы грудзі жанчыны-работніцы, бурнымі навадкамі завіхрыліся, пырснулі крывавай ненай адвечнай пакуты.

Усё правільна Шумава выказала, толькі ў адным перабавіла, у нутро жаночае балюча ўрэзалася. Выступіла

супраць ядынай уцехі, шчасця жаночага: сказала, што не трэба матцы дзяцей сваіх гадаваць, што зло ў гэтым ней-кае ёсць. Прапанавала: адбіраць ад матак іхніх дзяцей і дамы выхавання наладжваць. Каб матка не знала сына свайго, а сын маткі, каб агульныя, усіхныя дзеці былі. Проці гэтага жанчыны-маткі агнём загарэліся. Казалі: жорстка гэта і крыўдна.

А Шумава на сваім стаяла, сваю думку з запалам адстойвала.

Потым, як пасля пасяджэння вярнуліся з Блонскім у двор, усё яшчэ гаварыла, узрушаная:

— Гэта злачынства... так, злачынства. Гэта псаванне дзяцей... І сабе пахаба... Слухайце, гэта ж ясна, як дзень. Нам трэба тварыць новых людзей, людзей калектыву, у якіх няма матак, бацькоў, у якіх бацькі — усё чалавецтва. Да гэтага трэба ісці. І гэта магчыма... у невялічкай мерцы, але і цяпер ужо магчыма... Ці ж няпраўда?..

Блонскі любаваўся яе захапленнем. Спрачацца не хацеў. Ды навошта? Лепей вось так слухаць і адчуваць моўчкі яе свежае сакавітае парыванне, чыстату яе думкі — простай і шчырай.

А яна далей гаварыла:

— Мы псуем іх. Мы з дзяцінства навальваем на іх лішнія прыхільнасці, прывычкі, якія шкодны, якія шмат для каго путамі будуць. Гэта ж несправядліва. За гэта яны клясці нас будуць.

Яна доўга яшчэ гаварыла, даводзіла, пакуль не заўважыла, што Блонскі маўчыць, адданы сваім думкам. Тады змоўкла.

Падышлі да таго месца, дзе трэба было развітацца, пайсці ў розныя бакі. Яна спынілася.

— Ну, бывайце!..

Але Блонскаму не хацелася ў двор. Ён паўмысля марудзіў. Часінку стаялі на рагу пад жорсткімі ўзмётамі сцюдзёнага ветру.

— А мо да мяне зойдземся? У мяне цёпла на новай кватэры.

Блонскі згадзіўся з ахвотай:

— Пойдзем.

Была завіруха. Вецер з шалёным выццём віўся па вуліцах. Падцікаўся з-за рога і ўраз налятаў, шкуматаў, сцёбаў па твары жменямі калючага снегу. Хацелася барзджэй перабегчы і схавацца ў цёмным прытульным пакоі.

Блонскі і Шумава ішлі шыбка-шыбка, часам застра-

ваючы да кален у сумётах, спатыкаючыся. Хісталіся, быццам п'яныя, штурхалі адзін аднаго. Горача стала і весела.

Шумава смяялася звонка, раскаціста. Смех дзіўна, ніякавата сплятаўся з злосна-трывожнымі ўзвывамі ветру. Здаваўся дзікім, недарэчным.

Спыніліся на рагу адной з акраінных вуліц. Шумава наляпала ў акно, узбегла, тупаючы, на скрыпучы, адубелы ад марозу ганак.

Адчыніла нейкая бабулька. Усміхнулася ветла. На кухні густа агарнула цяплынь. Загарэліся шчокі з марозу.

У пакоі Шумавай Блонскі здзеў паліто, з асалодай сеў на канапу.

— Добра ў вас. Проста, але прытульна. Падабаецца мне...

— Глупства. Гэта — што цёпла, дык прыемна з марозу...

Яна стала поплеч. Уздыхнула глыбока-глыбока, адкінулася на спінку канапы.

— Замарылася. Не магу многа працаваць. А калі-небудзь зусім надарвуся. Дужа баюся гэтага. Тады ж пуста стане, жыццё будзе бясцветнае, нуднае, як змрок.

Яна задумалася. Блонскі ўсміхнуўся.

— Але ж гэта няўхільна. Прыйдзе старасць калі-небудзь...

— Старасць? Я чамусьці не думаю аб ёй. Гэта далёка... Дый наогул — ну яго к ліху!.. Хопіць нас... Сіл шкадаваць не варта. Пакуль ёсць — будзем жыць, будзем браць жыццё, усё, цалкам. Галоўнае — шырэй, глыбей, як мага глыбей. Ці праўда?..

Яна раптам змянілася. Згінула змора, загарэліся вочы бадзёрасцю, палкай энергіяй. Нешта бурліває, смелае свяцілася ў іх. Цягнула магутнай магнэсавай сілай, як цягне да сябе бурнапеністае бяздонне глыбокае.

У Блонскага ў сэрцы нешта повае зарадзілася, нешта востpae, салодка-пякучае. Прыемна было глядзець у пераліўчаста-светлыя вочы, акунацца ў іх прамяністую чароўную глыбіню.

Гаварыць не хацелася: словы драўляныя, карузлыя нейкімі здаваліся. Былі ўсе агідныя, брыдкія.

А яна дражніла гарэзнай, задорнай усмешкай, казытала нервы абураючым поглядам. Нахілілася да яго, абдала жаркім дыханнем.

— Мы будзем жыць... Праўда? Мы ж маладыя, воль-

ныя... Жыццё наша... усё наша. Мы будзем працаваць і цешыцца жыццём... Акунацца глыбока ў яго, браць яго... усё, да дна... Праўда?..

Ён мармытаў нешта ў адказ. Адчуваў, як шумнай хваляй кроў к галаве прылівае, парыўчата б'е кляўцом у віскі. Уваччу спакусліва акругліліся мяккія абрысы жаночага цела, абяцалі палкую ўцеху. Салодкім туманам муць разлілася. Яшчэ момант — і схапіў яе, гарачую, слухмяную, сціснуў у моцных абдымках...

А пасля — сорамна чамусьці было і непрыемна. У галаве агідна скаўзанулася прыкрая думка:

«Як з прастытуткай...»

Адвярнуўся, не глядзеў на яе, баяўся глядзець. А калі скоса зірнуў, убачыў, што плача. У вачах рэзка мятнулася аголенае плячо, якое сударгава здрыганулася. Моцна застрала ў мазгах, прыкавала. Часінку толькі і бачыў, як дзівосна трасецца гэта назолліва белае плячо.

Потым раптам нешта растала ўсярэдзіне, разлілося цёплым, добрым такім. Шкада стала. Такой любай, дарагой здалася яна. Захацелася прыгалубіць, суцешыць. Падышоў да яе, сеў поплеч. Хацеў сказаць нешта, многа сказаць — ласкавага, прыветнага, але слоў такіх не было; не знаў ці забыўся на гэту часіну. Злёгку прыткнуўся к яе галаве, пагладзіў пяшчотна, як дзіцё.

— Нашто ты, слухай... Ну, кінь... не трэба...

Яна схапянулася, узняла галаву. Зірнулі на Блонскага распаленыя вочы з іскрыстымі расінкамі слёз, у самую душу праніклі. У іх — разам з глыбокай журбой ціхая дзіцячая радасць. Яна скрозь слёзы ўсміхнулася.

— Любы, ты не думай... мне добра... Ты не зважай... гэта глупства... Бывае часам ні з таго ні з сяго... Я такая... дзіўная, недарэчная... Ты не глядзі...

Яна сударгава прытулілася да яго, схавала галаву ў яго на грудзях... Ён чуў, што плача яшчэ, і не знаў, што рабіць. Раптам яна зноў ажывілася, загаварыла парыўчата, горача.

— Любы! Як добра так... як добра! Мы вольныя, нічым не звязаныя... Шчасця як многа — глыбокага, поўнага, нічым-нічым не абмежаванага! Ты адчуваеш, як гэта проста, натуральна... як гэта моцна!.. Ты згодзен, так? Ну, скажы, любы... добра так? Ты таксама шчаслівы?

Блонскі не разумеў яе хваравітага, бурнага захаплення. Глядзеў на яе з ласкавым неўразуменнем, моўчкі абдымаў яшчэ ахінутыя нервовай дрыготаю плечы.

Так сышліся яны. З таго часу ў Блонскага было шмат вечароў гарачай уцехі, шмат бяссонных начэй, шмат гадзін глыбокай развагі. Ён усёй істотай аддаўся каханню, упіваўся ім. І каханне яго асвяжыла, зрабіла маладым, уліло ў кроў моцнае бушаванне, аквяціла жыццё.

К Шумавай ён прывязаўся, прывык. Бачыў у ёй жанчыну і таварыша. Але не разумеў яе. Дзівілі яе раптоўныя ўзбурэнні, рэзкія пераходы ад незразумелай журбы да парыўчата-бурнага захаплення. Чулася ў гэтым загадка, і многа гадзін Блонскі ламаў галаву над яе развязанем.

Аднаго разу ён заспеў Шумаву ў глыбокай разважзе. Ён колькі дзён перад гэтым не бачыўся з ёй, і за гэты час яна страшэнна змянілася. Блонскі падумаў адразу, што хворая: схудзела, змарнела, вочы глыбока-глыбока схаваліся, хваравіта завастрыліся.

Як убачыла яго, усміхнулася нейкай пакутнай нервовай усмешкай.

— Я якраз аб табе думала. І аб сабе... Я паехаць надумала. Хутка, можа, заўтра...

— Зусім?

— Так, зусім.

— Чаму?

— Гэта трэба. Я растлумачу табе... Я моцна, глыбока к табе прывязалася... Ты ведаеш гэта. Больш, чымся трэба... І вось — я баюся... Сама сябе баюся... Ува мне можа абудзіцца жанчына... Не наогул жанчына, а такая... ну, слабая, адданая, бязвольная... Жанчына-раба, такая, якой не павінна быць, якая — знявага для чалавека... Я спалохалася гэтага і пастанавіла паехаць.

Блонскі маўчаў. А яна адвярнулася і гаварыла далей нейкім вінаватым прыдушаным голасам:

— А потым... Яшчэ ёсць прычына... Але гэтага не скажу, не магу... Ты даруй мне... Я не хачу, каб ты знаў... Я хацела б і сама не знаць гэтага, бо гэта маё слабае месца, ахілесава пята...

Блонскі няўцямна зірнуў на яе. Пастанова Шумавай не здзівіла яго. Чамусьці здавалася гэта простым, звычайным. Але што ж гэта яшчэ за прычына? Што за загадка?..

Хацеў спытацца, дабіцца адказу. Але стрымаўся. Сказаў проста, спакойна:

— Ну, што ж, едзь сабе...

Назаўтрага Шумава паехала.

3

Усміхнулася вясна гулліва, сонечна. Так усміхнулася, што сівавалосая бабулька-зямля зусім растала, захлібнулася з радасці. Недалужна заслязілася цурочкамі спрытнымі, кроплямі звонкімі слюнява хліпнула. Зашамкала вуспамі старчымі, голасам шопатным, ціхім.

А потым зарумзала. Ды так зарумзала, так загаласіла, што ўвесь горад шумам напоўніла, патокаі слёз заліла.

А як наплакалася даволі, салодка ўсміхнулася мокрымі, бляскам аблітымі вуліцамі, пачала выціраццa шаўковымі коскамі сонсйка.

І пачулася тады, што зямля не такая ўжо бабулька старая. Толькі гэткаі прыкінулася, а сапраўды — вунь яна: смяецца задорна, молада, звініць птушкамі шустрымі, пярэстаі, гаварлівай грамадоі людзеі разліваецца. Зусім маладуха!

У гэту пару Блонскі адчуваў бурлівае трапятанне ў грудзях. Вясна буятоўпа распаліла кроў неспакойнымі жаданнямі. Чакалася нешта — турботпа, пастойліва: нечага хацелася — яскравага, моцнага. Душа рвалася некуды, разгарнуцца хацела.

У гэту пару Блонскі Шумаву ўспомніў. Ды так ярка, выразна, быццам — во яна, перад вачмі. Варухнулася ў сэрцы знаёмае, салодкае, агарнула душным жаданнем. Засумаваў Блонскі. Не то што засумаваў, а адчуваў заўсёды назойліва-абураючую патрэбу, не мог пазбыцца яе. Тыдні два змагаўся з сабоі, а потым не вытрымаў — пабачыцца ўздумаў.

Знаў, што Шумава ў N. Скарыстаўшы вольны час, паехаў туды.

Вясна ўжо зусім разгарнулася. Пукалі почкі на дрэвах, у свежым арамаце нараджалася першая зеляніна.

Дарогаі, у цягніку, Блонскі не адрываўся ад акна. Смагла глядзеў, як парыцца ў сонцы тлустае поле, як лес кучаравіцца кволым, празрыстым лісцем.

А ў N прыехаў — акупуўся ў сумятлівы рух, у ліхаманку напружанага жыцця. Ішоў сярод гурмы шумліваі і адчуваў, як у грудзях расце непакоі нейкі, турбота. Паўставала пытанне:

— Нашто?

Хацелася вярпуцца, паехаць назад. Але ішоў, бо няздолела была пакіраваць сабоі.

Шумава спаткала радасна. Моцна, па-прыяцельску руку паціснула.

— На доўгі час прыехаў?

— Дні на два.

— Толькі?.. Ну, як жывеш, як там у вас? Што нашы робяць?

Блонскі безуважна адказваў. Упарта разглядаў яе, шукаў у ёй змены. Але яна была такая, як і тады, паўгода назад. Толькі загарэць ужо справілася. Стала ад гэтага прасцей і прыгажэй. Ён зазначыў з усмешкай:

— Ты на цыганку стала падобна.

— О, куды там!.. Я цяпер — маладзец... Моцная такая, здаровая...

— Працуеш, як і раней?

— Больш. Я ж люблю працаваць. А часам трэба яшчэ, каб забыцца, забавіцца. Вось тады... як ад вас паехала... тады цяжка было, многа путранай барацьбы...

— А цяпер?

— Цяпер добра. Вымелася ўсё. Час памагае... Вось толькі цябе я зусім не чакала. Мо гэта дрэнна, што ты прыехаў?..

Яны выйшлі на вуліцу, пайшлі па тлуста-бліскучай ад сонца панелі. Паветра абдавала тамлівай спякотай, было душна, млява. Твар у Шумавай разгарэўся, зардзеўся гарачай чырванню.

Блонскі глядзеў на яе, адчуваў яе свежасць, здароўе і захапляўся. Чамусьці не падабаліся, цяжэрнымі былі яе бадзёрыя, простыя словы. Хацелася нечага іншага, хацелася інтымнасці.

А яна з запалам апавядала аб жыцці сваім, рабоце, аб новых планах, задачах. Упарта ўнікала таго, што магло напамяпуць аб мінулым.

Яны прайшлі колькі шумлівых кварталаў і потым неўзаметку для саміх сябе збочылі ў бязлюдную ціхую вуліцу. Там яны стрэлі купку дзяцей, якія весела гулялі на панелі. Як падышлі да іх, Блонскі заўважыў, што раптам па твары Шумавай праслізнула первовая бледнасць. Вочы сумятліва забегалі па баках, працятыя непакоем. Яна загаварыла шыбка-шыбка, у відавочным замяшанні:

— Гэта дзіцячы дом наш, самым лепшым лічыцца. Гуляюць зараз... на сонейку...

Блонскі зірнуў на дзяцей. Свежыя, чысценькія. Жвава пераклікаюцца вясёлымі галасамі-званочкамі.

І з Шумавай тварылася нешта незразумелае. Яна па-

спешна прыбавіла ходу, быццам хацела хутчэй уцячы ад дзяцей. Потым раптам спынілася, вярнулася назад і парыўчата схапіла аднаго з хлопчыкаў — белянькага, з блакітнымі вочкамі-зорачкамі. Дзіцёнак трапятаўся, нецярпліва адмахваўся, як ад дакучнае мухі, з усіх сіл вырываўся. Злаваў, што яго адарвалі ад цікаваї гульні. А яна горача песціла яго, цалавала.

Блонскі глядзеў, нічога не разумеючы. Потым кінуўся ў вочы твар Шумавай: на ім адбітак глыбокаї агнёвай мукі, журбы. Маланкай бліснула думка:

«Дык вось дзе разгадка! Вось тое «слабае месца»!»

Як пайшлі далей, Шумава маўчала. Блонскі асцярожна спытаўся:

— Што гэта значыць?

Яна паглядзела дапытліва на яго.

— Ты дагадаўся. Ты знаеш ужо...

— Гэта твой дзіцёнак?

— Так. Толькі не кажы нічога, не трэба. Так павінна быць, я знаю.

Яна зноў замоўкла. У Блонскага гарэла, прасілася на язык пытанне. Ён не стрымаў.

— А ён ведае сваю матку?

— Не, не ведае. Забыўся ўжо, адвык. Ён не павінен знаць, яму не трэба гэта. Нашто? Ён павінен вырасці чалавекам вольным. Нашто звязваць яго лішнімі прывязанасцямі? Не патрэбна гэта, шкодна.

— Але ж табе як? Цяжка гэта, ты ж ламаеш сябе.

Яна нібы раззлавалася.

— Не, няпраўда, няцяжка мне! Часамі толькі. Гэта мінуты слабасці. Але кінем аб гэтым, не будзем гаварыць... я прашу цябе. Гэта расстройвае толькі, раскалупвае рану. І потым... ведаеш, Блонскі, едзь ты лепей. Мне цяжка з табой. Ты расслабляеш мяне. У мяне родзяцца нядобрыя пачуцці. Я не хачу быць жанчынаї, толькі жанчынаї. Я хачу быць чалавекам.

. . . . . .

На другі дзень Блонскі вярнуўся ў двор. Пад аднамернае калыханне вагона ў галаве бесканцовай чарадой перавальваліся думкі. То цяклі плаўна, спакойна, то раптам спляталіся ў грамоздны клубок, сціскалі мазгі цяжкім неўразуменнем.

Ён думаў:

«Што ж гэта, парэшце? Фанатызм, вар'яцтва? А мо

сапраўды так лепей? Мо гэта натуральна, мо так і павінна быць? Мо гэта адзіны правільны шлях?»

Яму ўспомніўся беленькі свежы тварык дзіцёнка, які з нецярплівасцю вырываўся з матчыных абдымкаў — незнаёмых, непатрэбных. І поплеч — другі твар, поўны вострай мукі, матчынай тугі.

Успомнілася і тое, што было даўней у першы вечар іхняга збліжэння. Успомніўся той дзівосны настрой яе, тыя незразумелыя слёзы.

«Дзіўная яна... Усё-такі дзіўная».

ПРА МАЙГО ПРЫЯЦЕЛЯ

Я не буду расказваць пра майго прыяцеля наогул, а раскажу толькі пра маю апошнюю сустрэчу з ім, якая, трэба сказаць, ускалыхпула ўсе мае пачуцці й прымусіла мяне на ладны час аддацца самым сур'ёзным і глыбокім думкам-разважанням.

У пякельна-гарачы ліпнёвы дзень я мерыў млявымі крокамі вузенькую, залітую сонцам, пылам і агідным пахам вулку невялічкага горада. Нутро маё абцягвалася слізка-цягучай цінай нудоты, а галаву поўніў нейкі тлумны туман. Хацелася пайсці куды-небудзь, ды не было куды, бо горад чужы, незнаёмы. Так і хадзіў без усякае мэты, пікаў па шэрых распараных вулках.

На ганках аднае ўстановы сядзела колькі хлапцоў, ваць — камсамольцаў. Нягледзячы на нясцерпную спякоту, яны гутарылі надта жвава і многа смяяліся. Я б мо не звярнуў на іх свае ацежалелае ад сонечнага ваду ўвагі, каб не злавіў сярод мешаніны іхнай гаворкі і смеху прозвішча свайго прыяцеля. А пачуўшы гэтае блізкае, так знаёмае мне слова, я ўжо не мог ісці далей. Я стаў і звярнуўся да хлапцоў:

— Выбачайце! Якога Харкавіцкага вы памінаеце? Яго не Міколам часам завуць?

Хлопцы ўраз сціхлі і пракалолі мяне цікавымі ўсмешкамі. Адзін азваўся:

— Якраз гэты самы.

— Ён хіба тут жыве?

— О, вядома, што тут!

Некаторыя пырснулі.

— А вы не ведаеце яго адраса?

Мне сказалі.

— А ці не ведаеце, калі можна яго ў хаце заспець?

Хлопцы грымануліе дружным хорам:

— О, калі хочаце... У любы час... У любы момант...

Я пырнуў у пыл і шпарка папёр у той бок, дзе, як паказалі, жыў Харкавіцкі. Нешта падмывала з путра такім

радасным-радасным, зацінала нават дыханне і выціскала з вока неслухмяную ўпартую слязіну. А ўвупіну пяўпына дрынчэла.

— Мікола... Мікола... Коля... Колька...

І стаяў увачыу Харкавіцкі, быццам жывы.

Я неўзабаве адшукаў паказаную мне кватэру. Увайшоў не пазваніўшы, бо званка не аказалася. З сянец у пакой дзверы былі расчынены. Я спыніўся і азірнуў.

Я адразу ўбачыў Міколу. Ён зусім мала змяніўся. Толькі па твары разлілося нешта рахманае, ціхае, пакорнае. Гэты новы выраз на мой погляд зусім не прыставаў да Міколы, якога я знаў з самага маленства, як заўзятага аторву й буяна.

З момант я глядзеў на Міколу, астаючыся сам незаўважаным. І я разгледзеў, што ён сядзіць на зэдліку і што нага яго падвешана па пачопку, а пачопка прычэплена да таго апарату, у якім звычайна гадуюць малых чалавекаў. Я не ўгледзеў і не пачуў гэтага малога чалавека, але ён быў тут напэўна, бо яго сяліба раўнамерна і плаўна баўталася разам з Міколавай нагой. Немаведама чаму, мне раптам шкода стала Міколу. І, мабыць, пад уплывам майго жаласлівага погляду ён узняў галаву і зірнуў на мяне.

У вачах у яго загарэлася такое жаркае, такое бурлівае полымя радасці, што я не ўтрываў і кінуўся да яго з поўным душэўнага імпэту гвалтам:

— Мікола!

Але ўраз я спыніўся. Я ўбачыў, як востры, агнёвы спалох скрывіў яго твар у страшную грымасу. Сам ён перагнуўся ў тры, а можа, й болей пагібелі і засіпеў, махаючы на мяне вялізным нажом:

— Сссссссс...

Я аслупянеў. Ён, відаць, заўважыў гэта, кінуў сіпець і падбадрыў мяне ласкавай усмешкай, прапусціўшы скрозь зубы прыдушаным шэптам:

— Ціху, дзяцёнка разбудзіш.

Тады я заўважыў яшчэ, што нож у яго толькі ў адной правай руцэ, а ў левай — бульбіна. А між ног невялічкі цабэрак з вадой. І зноў невядома чаго мне стала шкода прыяцеля. Я, нават не прывітаўшыся з ім, сеў поплеч на зэдліку і пахіліў галаву.

Часінку мы абодва маўчалі. Потым пачалі шантацца. Я першы шапнуў:

— Расказвай.

Ён глыбока ўздыхнуў і сказаў:

— Ты, пэўна, бачыш, што я ўжо жанаты.

Я таксама ўздыхпуў і адказаў:

— Бачу. І даўно ты замуж... тое... жаніўся?

— Больш года ўжо.

Мне неяк стала не па сабе. Я хацеў аб нечым яго папытаць, ды чамусьці не важыўся: нялоўка было. І ён, мусіць, адчуў моій настроій. Ён перабег раскіданым поглядам у бок ад мяне, шыбчэій пачаў лупіць бульбіну і загаварыў неяк вінавата, саромліва:

— Я служыў рапеї. Толькі з паўгода, як безработны. А жопка служыць... У фінаддзеле працуе. Я пакуль што па хатняй частцы; вось поркаюся з рознай бульбаї, капустаї, дзяцёпка даглядаю...

Ён змоўк. Тады я папытаў з вялікаї цікавасцю:

— Ну й як?

— А, нічагутка. Добра жывецца. Жопка цяпер ладныя грошы бярэ — сем чырвонцаў у месяц, хапае па ўсё. Вось толькі харчы ўсё даражэюць. Ты знаеш, пачом цяпер мяса? — па 30 капеек. Дый то не мяса, а немаведама што: адпы косці ды плёўкі. Укінеш у суп — ні мяса табе, ні навару. А мужыкі як дзяруць! Учора на рынку я парасёпка пагледзеў — маленькі такі, хунтаў 7—8. Хацеў купіць, бо мая, ведаеш, дужа любіць, калі гэта з пачынкай, з перчыкам, з цыбулькай. Дык што ж бы ты думаў? Не падступіся...

Я слухаў яго апавяданні, і мне неяк страшна рабілася. Я проста не пазнаваў свайго прыяцеля, таго жвавага, энергічпага, разумнага хлапца, якога я ведаў тры гады таму назад. Галаву маю балюча свідравалі назоллівыя думкі — яшчэ няясныя, неафармаваныя, але такія ж глыбокія, такія сур'ёзныя, што мне ажно цяжка ад іх станавілася. Да такіх думак не прызвычаіўся я.

Урэшце ўжо мне неўсуцерп стала слухаць Міколу. Я памкнуўся змяніць тэму гаворкі і перапыніў яго, тыркануўшы пальцам у калыску.

— Ну, а гэта?

У гэты момант пешта запішчэла і засіпела ў печы, і Мікола рынуў туды, пакінуўшы ля мяне нож, недалупленую бульбіну і цабэрак. Вярнуўшыся, ён зноў загаварыў:

— Пра сына пытаешся? О, ён маладзец, такі крэпенькі, здаровенькі хлопчык. Надовечы пешта з жывоцікам у яго кепска зрабілася. Я ўстурбаваўся ўжо, зараз папёс яго ў больніцу. Ну там агледзелі, кажуць — глупства, на зубкі. У яго ўжо во-во зубкі прарэжуцца...

Ізноў мне цяжка было яго слухаць. Ізноў мяпе апанавалі тыя глыбокія, сур'ёзныя думкі. І йзноў яны былі няясныя, неафармаваныя, бо я не прывык да гэткіх думак. Цяпер я ўжо зусім забыўся, што гэта за думкі былі, але добра помню, што яны датыкаліся жанчыны, яе прыроды, арганізма, яе месца ў сацыяльным ладзе нашага жыцця і г. д. Адным словам — сур'ёзныя думкі.

Мікола тым часам сціх і аб нечым глыбока задумаўся. Мне ў трэці раз стала да болю шкода яго. Мне захацелася пранікнуць у самае нутро яго, выведаць яго самыя патаемныя перажыванні. Я сабраў усю сваю прыяцельскую пяшчоту, паклаў сваю руку на яго плячо і сказаў вельмі чулым і вельмі ласкавым голасам, які, як мне здалося, нават дрыжэў ад навалы шчырага пачуцця.

— Слухай, прыяцель Мікола. Скажы ты мне шчыра й адкрыта, так, як мы даўней з табой гаварылі, як табе падабаецца тваё сучаснае жыццё?

Але ў гэты момант разам запішчэла і ў печы, і ў калысцы. Мікола замітусіўся па хаце, потым кінуўся к печы, крыкнуўшы мпе па дарозе:

— Калышы!

Я зачапіў сваю нагу за пачопку і пачаў баўтаць. Я баўтаў, дзяцёнак пішчэў, а Мікола ўлез да палавіны ў печку і нешта арудаваў там. Праз момант ён дастаў з печы сваю галаву, абярнуў яе да мяне і закрычаў як ашпараны:

— Вазьмі, братка, на рукі. Вазьмі хутчэй.

Я ніколі не меў ніякіх спраў з малымі людзьмі, і таму мне вельмі нязручна было трымаць на руках гэты маленькі мякенькі камочак. Але я ўсё-ткі трымаў, а камочак усё-ткі пішчэў. Мікола ж тарчэў з печы сваёй ніжэйшай палавінай. Цяпер мне ў чацвёрты раз стала вельмі-вельмі шкода Міколу. На маё шчасце ў гэты момант адчыніліся дзверы, і ў пакоі з'явілася Міколава жонка.

Я да жанчын певялікі прыхільнік. Але трэба прызнацца, што жопка Міколава мне ўпадабалася. Я люблю, калі жанчына здаровая, свежая, сакавітая. А Міколава жонка хоць і невялікая ростам, але так і пыхала гэтым здароўем і свежасцю! І вочы ў яе былі ясныя, бадзёрыя, смелыя, што мне даўпадобы таксама. Як увайшла, яна перш-наперш пяшчотна так, ласкава цмокнула ў запэцканы сажаю Міколаў лоб, сказаўшы:

— Добры дзень, мая гаспадынька!

Потым падышла да мяне, ахінула мяне сваім ветлым

ласкавым поглядам і, што мяне асабліва ўзрадавала, узяла з маіх рук пісклівы камочак.

Мы хутка з ёй разгаварыліся. Гаварылі больш пра палітыку, пра міжнароднае становішча нашай рэспублікі і г. д. Наогул, пра самыя глыбокія і сур'ёзныя рэчы. А Мікола тым часам канчаў свае гаспадарскія справы. Мне ў пяты раз стала шкода Міколу, і мяне зноў апанавалі назоллівым роем цяжкія думкі, ізноў я думаў аб жанчыне, аб яе гаротнай долі.

У часе абеду жонка сказала Міколе:

— Ну, Коля, хутка ўжо я дам табе волю. Сына гэтымі днямі ў яслі аддам, а палуднаваць будзем хадзіць у сталоўку. І трэба будзе як-небудзь знайсці табе працу.

Мікола не адказаў. Але вочы яго зайскрыліся радасцю. Я гэта добра заўважыў, і гэта дало мне адказ на тое запытанне, на якое Мікола не ўправіўся мне адказаць.

Калі я выйшаў ад свайго прыяцеля і зноў нырнуў у поўныя пылу і душнага сонца завулкі, мне было цяжка. Нешта падмывала з нутра такім сумным, маркотным, заціналa дыханне і выціскала з вока неслухмяную ўпартую слязіну.

А ўвушшу няўпынна звінела:

— Бедны Мікола... Бедны Коля...

У ВЕЛІКОДНУЮ ПОЧ

Гадзіннік на сцяне цікаў так ценька, квола, быццам пакорна жаліўся на нейкую крыўду: цяжкую, незаслужоную. Ад гадзінніка плыла па пакоі цягучая, як цеста, нуда і застыгала, звісала важкім напружаным гнётам.

Поп лёг на ложак, выпрастаўся з асалодай, бо цела цяжарыла тупая санлівая млявасць. Хацелася ляжаць нерухома, доўга ляжаць, без канца. Хацелася, каб думак не было, каб не калолі яны раз-пораз вострымі джгаламі мозг, каб не працінялі нутро непакоем трывожным.

Цягучым цестам цякла па пакоі нуда, асядала на сэрца грамоздкай камлыгай даўкага гнёту. Гадзіннік жаліўся на нейкую крыўду, усё цікаў так жаласна, квола.

Рыпнулі недзе, заенчылі дзверы. Поп пільна прыслухаўся.

Ці не стараста? Час ужо, здаецца... Не, ціха. Ціха да болю ў вушах. Цішыня нейкая жалезная, вострая. Уціскаецца ў вушы, у путро і пачынае звінець звонам шаломным.

— Чаму ж няма старасты? Сказаў яму, каб прыйшоў, як збярэцца парод. Няўжо яшчэ нікога няма? Няўжо не прыйшлі на ўсяночную?

Слухае поп, як доўгай, марудную хваляй плавае недзе ў цямноце гук адзіночнага звону. І здаецца, што плача ён, стогне. Здаецца, галосіць адчайным, тужлівым галасам, кліча кагось на ратунак.

А як растае, траціцца ў ночы змораны голас тужлівага звону, у якой смела ўлятаюць буяныя гукі аркестра. Дражняць, смяюцца задзірліва, напамінаюць аб маладым, шумлівым жыцці камсамольскага клуба.

Поп хоча злавацца, хоча ненавідзець лютай нянавісцю, пасылаць туды, да тых, праклёны страшэнныя. Але злосці няма. Бо няма моцы злаваць, млявасць звязала — цягучая, лінкая. Спавіла ўсяго — крануцца не хочацца, не хочацца думаць.

Поп заплюшчыў вочы, цалком аддаўся спакою.

Прыемна замуцілася ў галаве, лёгкім туманам ахінуліся думкі...

. . . . . .

Раптам нехта паляшаў у дзверы.

— Увайдзіце!

Увайшоў стараста, унёс з сабоі знаёмы пах ладану й воску. Поп не ўстаў, толькі твар абярнуў да яго.

— Ну што, Кірыла?

Стараста чамусь падышоў блізка-блізка. Прыгнуўся, нахіліў свой твар, працяты нейкай таемнай радасцю. І чамусьці маўчаў. Толькі ўсміхаўся хітрай, здаволенай усмешкай, дражніў таемным падміргваннем.

Папа нецярплівасць забрала.

— Ну, што? Гавары...

— Бацюшка... Усё добра... Народу — поўная цэрква... ніколі не было столькі многа... А яны... яны...

Поп зразумеў. Чуў, як нутро растае ў захапленні шалёным, як нешта хвалюецца ў ім, падступае да горла, так, што цяжка гаварыць, бо сціскаецца горла хітра-здаволеным смехам, такім, як у старасты.

— Ну... ну... што?

Стараста яшчэ бліжэй прыхіліўся, хітра міргае вокам прыплюшчаным.

— Яны... свой вечар... сыынілі... хе-хе... Няма аніякогачка... Хоць бы адзін чалавек...

Поп борзда ўзняўся і стаў апранацца. Больш не пытаўся нічога. Не хацеў нават, каб стараста далей гаварыў. Баяўся, каб не разбіўся, не знік гэты настрой, гэтая радасць, што падмывае запець, закрычаць ва ўсю глотку, заскакаць па пакоі.

— Хадзем, Кірыла. Будзем пачынаць усяночную...

Выйшлі на вуліцу, пайшлі.

Чорпая, мяккая поч атуліла святочным спакоем, лашчыць твар ледзь чутным павевам кволага ветрыку. З мяка-глыбокага неба прыветна плюскаюць зоркі, ласкава ўсміхаюцца. Добра так, радасна.

А звон разлівае наўкола сталёвую гулкую песню, шырыцца, гоіcae смела ў маўкліваі, уважліваі цемры.

Моцны, пабедны звон...

Каля царквы — святочны тлум. Вуліца коньмі застаўлена — не прайсці. На вазах дзе-нідзе плямяцца цёмныя постаці. Чуваць гутарка, часам узмывы маладога задорнага рогату.

А на цвінтары поўна людзей. Зважна прайшоў паміж густога натоўпу. Прыемна было, што ўсе расступіліся, што ўсе пазіралі з сур'ёзнай, пакорнай увагай.

І яшчэ больш ахапіла здаволенне. У думках пяслося, круцілася:

— Наша пабеда... Наша свята...

І зноў падмывала запець, закрычаць, каб выліць з душы шалёную радасць.

Увайшоў у алтар, папрануў святочныя рызы. На цэркве замятушыліся, забразгалі металічнымі пратэсамі, да крэснага ходу пачалі ладзіцца.

Поп счакаў яшчэ момант і адчыніў царскія вароты. Зірнуў на цэркву. Сотні рук замітусіліся суччам нязграбным, сотні галоў схіліліся ў шчырых паклонах.

Поп зірнуў на пярэдніх, каб знайсці знаёмыя твары сталых, паважных сялян.

Зірнуў і... асалапеў. Проста яму ў твар глядзелі вострыя, задорныя вочы маладых хлапцоў-камсамольцаў. У іх гарэла ўсмешка — яны ўпарта свідравалі наскрозь, пралязалі, здаецца, у самае нутро і поўпілі сэрца трывогай.

— Што ім тут трэба? Чаго пазбіраліся?

А трывога расла, пераходзіла ў востры спалох. Баяўся выйсці на цэркву, баяўся зірнуць на людзей. Чуў, што там расце замятуха, што чакаюць яго, чакаюць пачатку,— а выйсці не важыўся. Бо загарадзілі дарогу ўпартыя, насмешлівыя вочы, колюць так прыкра, балюча.

Ён азірнуўся вакол, быццам падмогі шукаючы.

Пуста. Нікога няма ў алтары. Усе там, чакаюць яго. А ён баіцца выйсці, баіцца гэтых вачэй.

— І што гэта са мной? Чаго мне так страшна? Што ж яны зробяць?..

А на цэркве ўжо гул разліваецца — нездаволены, злосны. Нехта крыкнуў:

— Час пачынаць! Дакуль будзем чакаць?..

І ад гэтага голасу папу яшчэ больш стала страшна. Схаваўся за царскія дзверы і пазіраў палахліва, што дзеецца ў цэркве. А там рабілася нешта страшэннае, дзіўнае. Мітусіўся народ, пераліваўся блытанымі хвалямі, буяніў злоснай гаворкай.

Раптам ускочыў адзін на амбон і пачаў гаварыць горача, гнеўна:

— Даволі ўжо ждаць! Годзе ўжо. Не хоча — не трэба... абыдземся і без яго... Хадзем усе ў клуб. Там музыка грае... А ён няхай тут адзін астаецца.

Народ адказаў дружным гудам:

— Хадзем!.. Ґодзе!.. Далоў яго!..

Потым ускочыў другі, закрычаў:

— Навошта ў клуб! Мы й тут можам. Мы тут сабе клуб наладзім... Верна, таварышы?..

— Правільна! Верна! Зараз жа... Тут...

І поп, трасучыся, глядзеў, як здымаюць іконы са сцен, як вешаюць партрэты нялюбыя, страшныя, як гадзюкамі распаўзаюцца па сценах чырвоныя лозунгі. І ўсё пакрывае ўзрушаны гоман, перамешаны з вясёлымі дружнымі спевамі.

Тросся поп і чакаў, чым кончыцца ўсё. А як убачыў, што да алтара пасуваюцца бурнай павалай, што бліжэй і бліжэй да яго пагроза страшэпная, кінуўся ўгрунь за прастол і паваліўся на калені перад іконай.

Маліцца хацеў, ды не мог. На думкі не йшлі словы малітвы. А нейкі голас крычаў прарэзліва, востра:

— Не верыш! Не верыш! Сам не верыш! Хлусіш!..

Тады сеў на падлогу, закрыў твар рукамі і стуліўся, што малое дзіцё.

— Няхай будзе, што будзе!..

І чуе поп, што прыйшлі ўжо ў алтар, што ўжо тупаюць блізка.

Да яго падышлі, штурхаюць у бок, крычаць на вуха на самае:

— Бацюшка! Бацюшка! Бацюпка!

. . . . . .

І поп прачнуўся. Убачыў над сабоі схілены твар старасты, які ціха, асцярожна гукаў яго:

— Бацюшка, бацюшка...

Поп сеў на лаўку, азірнуўся.

У вокны шэра-сталёвым вокам зазіраў ужо дзень, вымятаў з пакоя начныя змрокі. На сцяне зморана, млява цікаў гадзіннік.

Стараста адышоўся ўжо, стаяў ля дзвярэй. Чакаў, пэўпа, пакуль прачухаецца поп.

— Ну што, Кірыла?

— Ды што ж, бацюшка... Не прыйшоў у цэркву ніхто. І старыя й малыя — усе ў клуб. Яшчэ й цяпер гуляюць тамака.

Поп успомніў, што бачыў у сне. Выцер халодны пот па твары, матнуў напура рукоі:

— Ат... Няхай сабе...

ЯК НАСТУЛЬКА КАМСАМОЛКАЙ ЗРАБІЛАСЯ

1

У Тодаравай лазні была надзвычайна патаемная нарада вясковых камсамольцаў. Тут быў і браценнік Настулькі, Пётра-карузлік, і таксама Мікола Загацкі, які меў нешта да Настулькі, мабыць, прыхільнасць якую, ласку хлапецкую.

Каб хто збоку ўгледзеў нараду хлапцоў, напэўна, падумаў бы, што сабраліся сюды абгаварыць нейкую пільную, важную справу. І не памыліўся б, бо выраз твараў, рукі хлапцоў ясна гаварылі аб гэтым без слоў: усе — у гурток, адзін к аднаму, нахіляюцца, шэпчуць, рукамі махаюць. Каторы дык аж захліпаецца ад абуджэння, пырскае шчодра слінай у твары сяброў.

А вырашалася ў хлапцоў пытанне вельмі жыццёвае й пільнае, такое, з якім памарудзіць, дык — крышка, прапала ўсё чыста. Пытанне такое:

— Як ратаваць Настулю?

Мікола дакладваў:

— Гаварыў я з ёй сёння, ды нейкая яна неўгаворная. І баіцца ўсё... Пагутарыш з ёй, дык яна плакаць. Румзае, слёзы, як павадкі... А спытаешся: «Хочаш замуж пайсці?» — дык усхопіцца, аж закалоціцца ўся. «Не хочу, кажа, баюся... Куды мне, шаснаццаць год яшчэ не мінула»...— І замуж ісці баіцца і не йсці таксама баіцца. І плача ўсё, румзае... Я ўжо не ведаю, браткі, што тут рабіць...

Пётра-карузлік, браценнік Настулькі, ураз садаклад:

— А што было, хлопцы, як заручыны гулялі, каб вы толькі ведалі... Юрка напіўся, вусамі гэта сваймі — фырць, фырць, ды ўсё да Настулі. «Вы, кажа, да мяне з непрыемнасцю ўсё, а я дык вас дужа кахаю. Я, кажа, як жанюся, на руках вас буду насіць...» І ўсё да Настулі цалавацца лезе, сапраўды... А яна яму: «Паіпшоў ты к ліху, я, кажа, не люблю цябе, бо ты брыдкі і стары...» Дадушы ж, хлопцы, гэтак якраз і сказала. Бацька тут як ра-

зышоўся: «Воп, крычыць, з хаты маёй, паскудніца!» Біць нават хацсў.

— Ну, а яна што?

— Яна плакаць, вядома. Матка заступілася, а то б, напэўна, бацька задаў... Я, брат, наўцёкі, каб часам і мне што не перапала...

Мікола задумаўся.

— Дык што ж, браткі, рабіць, га? Трэба як-небудзь ды выручаць.

Хлопцы ўсе як адзін:

— Вядома, выручаць трэба... Што ж гэта за рахуба: гвалтам дзеўку выдаваць, ды яшчэ за брыдоту за гэткую!..

— За падлу старую!..

— За педарэку сусветную!..

— За качарэжку гнілую!..

— За морду спекуляцкую!..

— Ціху, хлопцы, маўчаць!

Гэта Ключонак Андрэй, самы дужэйшы й самы разумны з усіх камсамольцаў. Зазвычаі маўчыць усё, слухае, а калі й скажа, дык заўсёды да ладу.

Паціхлі ўсе, слухаюць.

— Калі гэта так, дык трэба прыняць рэпрэсіўныя меры. Нельга дазволіць, каб ні за што ні пра што дзеўку маладую губілі. Мы павінны яе ратаваць. Верна?..

— Вядома!.. Правільна!.. Так!..

А пехта азваўся:

— Не йначай — паламаць яму рэбры патрэбна, каб не круціўся там, дзе не просяць...

— Дурань! — выцадзіў скрозь зубы Андрэй.

І далей:

— Трэба абмеркаваць добра план, каб зрабіць усё гладка, чыста і каб не спазніцца. Хто мае якія прапазіцыі?..

Маўчалі ўсе, думалі, моршчылі лбы шчыра, стапоўка.

Першы Ахрэм схапянуўся.

— Во як, хлопцы, паслухайце!..

— Ну?

— Як будзе Юрка па вяселле ехаць, падсцерагчы яго дый паламаць калёсы...

— Дык ён у суседа пазычыць. Глупства. Ну, хто яшчэ што прыдумаў?

Хлопцы ўсё моршчылі лбы, паролі падлогу вачмі сур'ёзнымі, упартымі. Урэшце Андрэй прымусіў іх кінуць дарэмную працу.

— Во што, хлопцы, я вам скажу: языком трапаць вы ўсе мастакі, а прыдумаць што добрае — пораху мала... Слухайце.

І ён расказаў. Мусіць, дужа ўдалы план выдумаў, бо ўсе, як пачулі, аж затрасліся ад радаснага абуджэння, а Пётра-каруэлік на адной назе заскакаў:

— Аій-яй-яй... Вось дык добра!.. Вось дык гут... Аій-яй... Ах-ха-ха!..

— Толькі чур, хлопцы, апі слова...

І азірнуў усіх Андрэй сур'ёзным выразлівым поглядам.

— Ані гуку... Чулі?

2

Настулька — як кветка, у вясельным убранні. Тварык — белепькі, з чырванню свежаіі, вочкі — незабудкі блакітныя, ззяюць аганькамі прыветнымі, ціхімі.

І чамусьці ў іх сум, у гэтых вочках, а часам нават сляза набягае, засцілае чысты блакіт, расіцай бліскучай на незабудкі-кветкі кладзецца.

І ўздыхае Настулька. Ціха, прытоена, каб не дазналіся людзі, што дзеецца ў яе ўнутры, там недзе, глыбока-глыбока, дзе схавана ўсё, што пяможна людзям цікавым паказваць.

Там многа чаго назбіралася. Там больш благое, гаротнае, але ёсць і добрае пешта. Там часам лунае вобраз Міколкі-хлапца. Усплывае ён адпекуль з бяздоння, расце, вырастае ў аблічча жывое, мігціць увачму плямай яскравай, прыгожай. Тады на твары Настулькі ўжо не журба, не маркота, а быццам яснае сонейка. І блакітныя вочкі — смяюцца, граюць агеньчыкам вострым, гарэзным.

Але так нядоўга бывае, бо Настулька баіцца цепыць сябе вобразам любым. Баіцца, каб хто не праведаў, каб хто не згадаў. І хавае яго палахліва туды, у бяздонне, дзе схована ўсё, што пяможна людзям цікавым паказваць.

У Настулькі вяселле гуллівае, бурнае. Гармонь дык аж ірвецца, скуголіць, бы звар'яцелая. І самагону — хоць утаіся. Ад яго ў Юркі-маладога ўжо вочы маслам бязглуздым плывуць, а нос над вусамі задзёрыстымі рдзее слівінаї спелай.

Настулька таксама выпіла трошкі. І затым у яе ўсё перабыталася: не разабраць, ці дзяўчаты спяваюць, ці гар-

моць залівасцца, ці мужык шэпча на вуха брыдкія, незвычайныя словы...

І Настульцы цяпер усё роўна... Замуж дык замуж — няхай... Бо прапала ўсё, згінула.

Да Настулькі праціснуўся Пётра-брацешнік. Зашаптаў на вуха:

— Настулька! Цябе там чакаюць на вуліцы, просяць выйсці.

— Хто?

— Там убачыш.

Ажывілася Настулька. З галавы самагон зайцам выскачыў.

На бакі азіраецца турботпа...

Усе — п'яныя твары, бліпчаць самагонам тупа, здаволена. Мужык да суседа ўжо прыхіліўся, цалуецца.

— Ат! Глядзець на іх яшчэ...

Вылезла з-за стала, дый гайда за дзверы.

На вуліцы абступілі, абкружылі з усіх бакоў. Мікола перад усімі. Абняў, шэпча на вуха горача, шчыра:

— Настулька, мы прыйшлі за табой. Хадзем! Уцякай адсюль, няхай яны робяць тут што хоцяа...

— Куды? Што ты, Мікола?..

— Настулька, кінь ты гэтае глупства. Ці ж табе хочацца замуж выходзіць? Гэта ж не даўнейшае, што бацькі гвалтам дзяцей жанілі, цяпер усе вольныя... Ты падумала, як ты жыць будзеш з нялюбым, з псінай старой?

— Дык а як жа? Я ж ужо павянчалася...

Тады азваўся Андрэй, самы дужэйшы і самы разумны з хлапцоў:

— Эт, глупства — павянчалася... Поп павянчаў, а мы развянчаем. Нават вакол стала паводзім, калі захочаш, назад, у другі бок... Пойдзем!

— А татка... Ён жа заб'е...

— Ды куды там — заб'е... Яшчэ як дазволяць яму.

— Не, хлопцы, баюся я...

Тады Андрэй як след ужо ўзяўся.

— Хлопцы, даволі тут агітаваць! Гэта можна пасля. А цяпер,— Пётра, цягні лахамаціну якую напрапуцца...

— Бяры, хлопцы, пад ручкі!..

Схапілі, пацягнулі. Пётра збоку галасёнкам тонкім, пісклявым:

Нікаму так не ўдалося,
Як нашаму Юрку...

Настулька не ўпіпалася. Зрабілася раптам смешна і радасна. Думала толькі:

«Што ж гэта будзе? Куды яны валакуць?..»

А хлопцы Настульку ў школу даставілі. Увялі ў клас і пакінулі з Міколам. Сказалі:

— Агітуй тут, давадзі да свядомасці, а мы поїдзем набачыць, што дзеецца там...

Асталіся ўдваіх. Цёмна ў школе, гулка звініць пустата, лаўкі вучнёўскія грудзяцца грамоздкімі чорнымі плямамі. Ціха, як у лесе.

Страшна стала Настульцы. Трывала-трывала, а потым села на лаўку і слязьмі залілася, захліпала, што дзіцянё. А Мікола да яе дый давай угаварваць:

— Сорампа табе, Настулька. Шаснаццаць год хутка будзе, а як дзіцёпак... Гэта ж глупства. Ты вось паглядзі на нас, камсамольцаў... Мы не баімся нічога і робім так, як лічым патрэбным. У нас усё, брат, па розуму. Ніякіх забабон... І каб хто мяне ды замуж аддаў проці волі — ого, няхай папрабуе!.. Мы, камсамольцы, павінны рабіць усё так, як наш розум падказвае, і іншых павінны кіраваць на правільны шлях...

І пайшоў, і пайшоў... Настулька нават кінула плакаць. Толькі хліпала нервова раз-пораз.

— А ў вас... хп... дзяўчат няма... хп... у камсамоле...

— Як-то няма? А Тэкля, Марына, Ульяна... ужо заявы падалі.

— Ну?..

— Вядома. Хутка ўсю моладзь збяром...

Яшчэ гаварыў з паўгадзіны, і Настулька зусім заспакоілася. Толькі ўсё бурчэла, вусны надуўшы:

— А вы ў бога не верыце...

— У бога? Плюнь ты на бога, на чорта ён табе. Каб ізноў з Юркам звянчалі?..

— Гэта не бог вянчае, а поп...

— Ну, усё роўна...

У гэту хвіліну Пётра ўляцеў як ашпараны.

— Настулька! Татка з Юркам сварыцца. Юрка гвалтуе ўсё: «Дзе Настуля? Што ты, смяяцца ўздумаў пада мпоїі?» А татка яму: «А ты што не глядзеў за жопкаї свайі? Праваронїў, кажа, дык сам вінават»... Ох, смеху колькі... З хаты татка Юрку пагнаў... А табе, Настулька, не трэба йсці зараз у двор, бо біцца будзе татка. Тут заначуй... Ну, пабягу ж я...

Тады Мікола выйшаў і прынёс бярэма саломы.

— Кладзіся, Настулька, ды спі, заўтра ўсё добра наладзім.

Настулька схапіла яго за руку.

— Не, Мікола, я баюся адна. Ты не йдзі. Мы не будзем спаць, лепш раскажы мне яшчэ што...

— Эх, ты, штушка пужлівая!..

3

Назаўтрага ў хлапцоў зноў пільная нарада: што рабіць далей?

І Настулька сярод іх. Цярпліва чакае вырашэння долі свае. І яна ўжо спакойная — не плача больш, не баіцца. Пэўна ў тым, што ўсё кончыцца добра, бо хіба гэткія ўдалыя хлопцы не ратуюць яе?

І ў вочках блакітных не відаць ужо смутку, блішчаць яны радасцю, шчасцем. Часам, як хлопцы развесяляцца, разрагочуцца рогатам моцным, гуллівым, дык і Настулька ўсміхнецца, свае белыя зубкі пакажа. А то дык і зусім пасыпецца звонкім раскацістым смехам.

Доўга спрачаліся хлопцы, як рабіць ім далей, і, урэшце, падумалі: найсці ўсім гурмай да Настуліпага бацькі. Яе таксама ўзяць з сабой. Мо ён улашчыўся ўжо, не будзе сварыцца. А хоць часам і будзе сварыцца, дык мо біцца не будзе.

І пайшлі. Настулька сярод іх, вочкі спусціўшы, зачырванеўшы ад сораму прыкрага, ліпучага. Пётра-карузлік з падскокам наперадзе.

Сяляне з цікавасцю, з смехам пазіралі на іхні незвычайны паход.

Падышлі да хаты. Увайшлі: першы Андрэй, за ім Пётра, Мікола. Настулька адзаду сярод іншых хлапцоў.

Бацька ў хаце сядзеў. Андрэй зважна ногі расставіў і парыхтаваўся гаворку пачаць.

Але выйшла зусім не так, як чакалі. Бацька раптам сарваўся, схапіў качаргу ды на іх:

— Ах вы, сякія-такія!.. Сукіны сыны, падшывальцы!..

Хлопцы — шугель, ды на вуліцу, ды па вуліцы... І паміж іх Настулька, распусціўшы падолле.

Як прыбеглі, запыхаўшыся, назад у школу, дык чамусьці не глядзелі адзін на аднаго: мусіць, сорамна было ўсім. Потым рагатаць пачалі, а потым зноў Андрэй сур'ёзна пачаў гаварыць:

— Калі так, дык трэба йначай рабіць. Настулька па-

вінна жыць тут, пакуль бацька сам не прыйдзе і не запросіць. А не захоча — няхай сабе. Настулька ї сама пражыве, не малая. Знойдзем ёй працу, заробак які. А пакуль што, хлопцы,— марш за харчамі! На першыя дні трэба дастаць. Жыць будзе ў нашай чытальні, а каб часам чаго не прытрапілася, на чарзе будзем дзяжурыць. Ахрэм вывесіць спіс...

Настулька пакорліва слухала, што ёй гаварылі. У чытальні абсталявалася, прыладзілася да жыцця. Толькі папрасіла, каб прынеслі ёй якую работу, бо пудпа без дзела сядзець.

Увечары камсамольцы сваю агульную сходку зрабілі. Абгаварылі сякія-такія пытанні, потым газеты, кніжкі чыталі, камсамольскія песні спявалі. Сабралася колькі дзяўчат — смех, жарты... Настулька й забылася на бяду на сваю, весялілася разам з усімі, шчаслівая, давольная.

Было ўжо позна, як раптам адчыніліся дзверы і ў парозе з'явіўся бацька Настульчын. У Настулькі сэрца — ёк-ёк, а з твару чырвань, як ветрам, сагнала. Стаіць, вочкі ўтупіўшы, сукенку цярэбіць.

Бацька да яе:

— У двор пайшла, распусніца!

Але Настулька добра помніць, як хлопцы вучылі.

— Я, татка, пайду, калі абяцаеш, што біцца не будзеш...

— А няхай цябе ўжо пярун заб'е, мая дзетачка...

— І што замуж аддаваць гвалтам не будзеш...

— Не ўжо, няхай цябе чорт аддае, гэткую ўпарціну...

— І ў камсамол запішуся...

Бацька ўжо хацеў узлавацца, але хлопцы, дзяўчаты абступілі яго.

— Дзядзька, пакіньце ўжо, ну няхай, ці ж вам шкода... Яна ж у нас толькі навучыцца.

— Навучыцца... На печ брахаць ды па калоду тукаць. Досыць ужо навучылася...

А Пётра вакол яго на адпой назе.

— Татка! Татулька! Няхай Наста ў камсамол, мпе весялей будзе.

Тады яшчэ Апдрэй падышоў.

— Дзядзька, кінь ужо, сапраўды... Усё роўна нічога не зробіш...

І ўсе:

— Кінь, дзядзька... Згаджайся!..

Бацька рукой махапуў.

— А бадай вас пяруи... Зводу пяма на вас... Ну, хадзем, Наста! Чуеш?

— А абяцаеш, татка?

— Сказаў — хадзем... Ну?

— Калі абяцаеш, дык чаму ж, я пайду...

Як выйшлі, камсамольцы ўсе чысценька ў скокі пусціліся. А ад рогату вокны дрыжэлі.

Вось з таго часу Настулька і ў камсамол паступіла. А камсамолка выйшла якая!..

42 ДАКУМЕНТЫ

1

АНКЕТА

Прозвішча — Гроцкі.
Імя — Ігнат.
Імя па бацьку — Рыгораў.
Колькі год — 27.
Ці жанаты — жанаты.
Нацыянальнасць — беларус.
Сацыяльны стан — селянін.
З якога часу ў партыі — з ліпеня 1917 г.

2

ПРАТАКОЛ

пасяджэння N-га навятовага камітэта РКП(б)
ад 24 чэрвеня 1919 г.

Слухалі: IV. Даклад Чарняўскай ячэйкі РКП.
Дакладчык т. Грышчанок.

Становішча ў Чарняўскай воласці небяспечнае. Усё больш і больш пашыраецца антысавецкая агітацыя, якую вядуць тамтэйшыя контррэвалюцыйныя элементы на чале з сынам быўшага памешчыка Заслаўскім. Агітацыя мае частковы поспех. Настрой некаторых вёсак, асабліва з перавагаю кулацкага жыхарства, варожы да Савецкае ўлады. Гэты самы памешчык Заслаўскі арганізаваў атрад бандытаў, з якім туляецца па лясах і адтуль робіць налёты, нагаяючы непамерны спалох на жыхарства. Рабіліся спробы наладзіць у мяст. Чарняўцы пагром, але пакуль што без поспеху. Мясцовыя сав. установы працуюць над пастаяннай пагрозай нападу банды Заслаўскага, якая ўсё больш і больш павялічваецца. Трэба прыняць пільныя і энергічныя меры, каб наладзіць у Чарняўскай воласці рэвалюцыйны парадак.

Пастанавілі: Арганізаваць у Чарняўскай воласці рэўком. Старшынёй рэўкома паслаць т. Гроцкага. Прана-

наваць павятовай надзв. камісіі выслаць атрад на барацьбе з бандытызмам. Мясцовай ячэйцы павесці самую шырокую агітацыю сярод сялянства.

3

Горад N. Кацярыне Макараўне Гроцкай

Мая любая жонка!

Вось я й прыехаў. Ураз акупуўся ў гэта трывожнае напружанае паветра. Усё вакол нейкае дзіўнае, на ўсім ляжыць нібы нейкая пячатка небяспекі, няпэўнасці ў тым, што будзе заўтра. Імя Заслаўскага не сходзіць з вуснаў. Аб ім складаюць цэлыя байкі. Асабліва тэрарызавана яўрэйскае жыхарства мястэчка. Чакаюць пагрому. І спалох раджае нейкую панічную ўпэўпенасць, што ён будзе. Нашы хлопцы (супрацоўпікі) тож баяцца. Нялёгка дастаецца ўзняць іхны настрой.

А мне, Каця, дужа добра. Я пачуў сябе ў сваёй стыхіі, як кажуць. Я аджыў тутака. Прыемна памерацца сіламі. Весела! А часамі смешна бывае. Я табе перасылаю дзве запіскі, якія я атрымаў зараз жа пасля прыезду. Пасмейся разам са мной. Як бачыш, мой прыезд не астаўся незаўважаным. А як табе падабаецца гэтая запіска ад дзяўчыны? Праўда, вар'ятка нейкая?

Эх, Каця, як мне шкада, што цябе тут няма. Але пакуль што жыві там, бо тут небяспечна, а ты да гэтага яшчэ не прызвычаілася. Як троху пацішэе, тады прыедзеш. Пабачыш, што гэта за пекная мясцінка! Гэты глухі куточак па свайму харастау нагадвае той рай, аб якім ты чула ў дзяцінстве. Гушчарны лес, рэчка... Адным словам — усё, што трэба.

Ну, а як ты маешся там? Не сумуеш па мне? А мо ўжо знайшла сабе ўцеху? Глядзі, бо за вушы нарву, калі што... А цяпер пацалую многа-многа раз, во...

Ну, бывай пакуль што.

І. Гроцкі.

17 чэрв. 1919 г.

4

Старшыні рэўкома Гроцкаму.

Вітаю Вас з прыездам. Чуў пра Вас шмат чаго добрага. Вельмі прыемна мець справу з разумным чалавекам, а не з такімі дурнямі, як да гэтага часу. Але наперад ка-

жу, што ані чорта не выйдзе ў Вас. Адылі паспрабуйце, калі галавы, вядома, не шкода. Спадзяюся, што хутка сустрэнемся.

Заслаўскі.

5

тав. Гроцкаму.

Мне вельмі сорамна пісаць Вам, але я прывыкла заўсёды быць простай і шчырай. Вы мне ўпадабаліся з першага разу, як я Вас убачыла. Чаму — я не ведаю. Вы мне здаліся моцным, дужым мужчынам, героем. Я знаю, што Вы заняты важнай справай, што Вам няма часу глупствам займацца, але так хочацца мне пазнаёміцца з Вамі, што я сама першая прашу Вас аб гэтым. Мне здаецца, што сярод працы ў Вас знойдзецца калі вольная часінка, каб аддаць яе дзяўчыне, якая Вамі вельмі цікавіцца.

Ніна (Загорная, 17).

З падаўцом гэтай дайце адказ. Хоць пару слоў.

6

Загорная, 17. Ніне.

Пару слоў? Калі ласка — тры: кіньце глупствам займацца.

7

ЗАГАД № 1

Чарняўскага валаспога рэвалюцыйнага камітэта
ад 18 чэрвеня 1919 г. м. Чарняўка

З гэтага дня мяст. Чарняўка і воласць абвяшчаецца на ваенным становішчы. Хадзьба па мястэчку пасля 11 гадзіи вечара дазваляецца толькі асобам, якія маюць належныя пропускі. Ніякіх сходаў, вечарын і інш. наладжваць без спецыяльнага дазволу рэўкома не дазваляецца. Катэгарычна забараняецца распаўсюджванне ўсякіх неправераных чутак, якія нагаяюць спалох і дэмаралізуюць жыхарства. Распаўсюджванне такіх чутак будзе разглядацца як крымінальнае злачынства, і вінаватыя будуць аддавацца пад суд. Просьба да ўсіх грамадзян затрымліваць на месцы асоб, якія займаюцца гэтым, і накіроўваць іх у рэў-

ком. Кожны селяпін і рабочы павінен помніць, што толькі агульнымі, злучанымі патугамі мы здолеем зпішчыць злачынны бандытызм і наладзіць у воласці рэвалюцыйны парадак.

Старшыня рэўкома Гроцкі.

8

ЛІСТ

Таварышу Раўкому ад селяпіна вёскі Кудлатаўкі, Чарняўскай воласці Лявопа Пстрычкі ў собсцвенныя рукі очэп сакрэтпа таварыш Раўком я хачу табе паведаміць, што пан у нашай вёсцы местапрабаванне маець і часта наяжджаець у нашую вёску з сваімі бандытамі к багацею нашаму Даніпу і заўтрачка небяспрыменна надвячоркам прыедуць і Даніла самагону нагнаў будуць частавацца толькі таварыш Раўком каб ніхто не знаў што я табе напісаў бо я мужык бедны і мяне небяспрыменне заб'юць. Дык прыяжджайце заўтрача і забярыце гэтага пана і ўсю яго банду ў нашай вёсцы толькі таварыш раўком пікому не кажыце, што я напісаў вам аб гэтым...

9

ПРАТАКОЛ

экстраппага пасяджэння Чарняўскага рэўкома
ад 20 чэрвеня 1919 г.

Слухалі:

1. Т. Гроцкі. Зачытвае ліст ад селяніна в. Кудлатаўкі Лявона Пстрычкі і прапануе безадкладна выслаць у вёску Кудлатаўку ўзброены атрад. Т. Гроцкі зазначае, што гэта вельмі зручны выпадак, каб адразу і без вялікіх ахвяр распарадкавацца з бандай.

Т. Зянькевіч. Катэгарычна супраць такога плану. Нельга даваць веры нейкаму селяніну, якога ніхто не ведае. Можа, тут якая пастка?

Т. Грышчанок. Я добра ведаю Пстрычку. Гэта бядняк, які шчыра падтрымлівае Савецкую ўладу і якому, безумоўпа, можна давяраць.

Т. Зянькевіч. Усё роўпа ні ў якім выпадку не трэба пасылаць атрада. Лепш паслаць наведнікаў і распазнаць, як там і што, а таксама вызваць і дапрасіць гэтага Пстрычку.

Т. Гроцкі. Марудзіць пельга. Ліст пісаны, відаць, яшчэ ўчора, значыць бандыты будуць сёння ўначы. Ні разведаць, ні дапрасіць Пстрычку мы не справімся. Прапусціць жа гэты выпадак мы не маем права, бо кожная гадзіна бавення дасць нам новыя бязвінныя ахвяры. Мы нічым не рызыкуем, бо на чале атрада Мякуш, а гэта такі чалавек, які не збляша ні ў якім становішчы.

Т. Зянькевіч.....

П а с т а н а в і л і:

Зараз жа выслаць у в. Кудлатаўку атрад па барацьбе з бандытызмам.

10

(у блакноце Гроцкага)...

...Зянькевіч... Зянькевіч... Зянькевіч... не трэба... не трэба... азпаёміцца... не спяшацца... Дзіўны гэты Зянькевіч...

11

З А Г А Д № 57

На асобым атрадзе камандзіра Мякуша Саўкі
ад 20 чэрвеня 1919 г. м. Чарняўка

Праз дзве гадзіны выступаць на бандытаў. Пакуль што нішкні. Калі хто, так вашу так, пікне хоць слова, праганю ў каршэнь ка ўсім чарцям. Глядзі мне, хлопцы, каб не падгадзілі. Не першыня ж вам, чэрці лысыя.

Камандзір Мякуш Саўка.
Пісар Чаклюшкін.

12

Горад N. Кацярыне Макараўне Гроцкай.

Мая дарагая Кацечка!

Што ж ты гэта маўчыш? Яшчэ аніводнай пісулькі не напісала. Думаеш, лёгка гэта так жыць, не ведаючы, што там робіцца з любым пісклёнкам? Гэта ж часамі дык так балюча, крыўдна робіцца. Хочацца злавацца на цябе, дужа злавацца. Але хіба ж я магу злаваць, калі так моцна люблю.

Як не шанцуе нам, Каця! Толькі ажаніліся, толькі пачалі наша супольнае жыццё і ўраз прыйшлося расстацца. Нават не было часу, каб як мае быць пазнаць адзін аднаго — блізка, глыбока. Ты ведаеш, Каця, на мяне часам находзіць сумненне. Я так мала яшчэ знаю цябе. Мо ты зусім не такая, як я цябе ўяўляў і ўяўляю? Мо я памыліўся? Ты даруй мне, даражэнькая, але гэткія думкі часам лупаюць у маёй галаве. І як мне цяжка бывае тады, каб ты ведала. Цяжка і страшна чагосьці. Быццам баюся, каб усё тое, што я стварыў у сваім уяўленні, тыя мары аб таварыстве, дружбе, якія гадую я ў сэрцы, каб усё гэта раптам не разляцелася, не рассыпалася попелам брудным... Ну, добра. Гэта так сабе, Каця. Мабыць, ад таго, што я так моцна цябе пакахаў. Хутка ўбачымся, тады добра пагутарым.

Цяпер 11 гадзін вечара. Сяджу ў рэўкоме, чакаю вестак ад Мякуша. Ён паехаў з атрадам у адну вёску, дзе павінны быць бандыты. Ты, Каця, помніш гэтага мядзведзя Мякуша? Што гэта за любы хлапец! Колькі ў ім шчырасці, адданасці справе і колькі дзіцячай прастаты! А як яго армейцы любяць. Яны за ім гатовы пайсці хоць у пекла. Эх, каб такіх больш у нас хлопцаў было!..

А як марудна паўзуць хвіліны. Як цяжка так сядзець і чакаць. Здаецца б, птушкай паляцеў туды сам. Але хлопцы не пускаюць. І Мякуш не любіць, каб каля яго лішнія блыталіся.

Справы нашы наогул нішто. Жыхарства блізка ўсё на нашым баку. Я кожны дзень выязджаю ў якую-небудзь вёску — праводжу там мітынгі, гутаркі. І да мяне кожны дзень гурмай сяляне прыходзяць. Кажуць: «О, каб мы ведалі, што гэта за штука — Савецкая ўлада. А то нам вунь што казалі!..»

Відаць, спрытна агітавалі тут паны контррэвалюцыянеры...

Ну, бывай, мая красачка! Не забывайся: пішы. Многа многа пішы, аб усім чысценька. І рыхтуйся прыехаць да мяне. Я дык з шалёнай нецярплівасцю чакаю таго дня, калі ўбачу цябе і моцна-моцна пацалую...

Бывай яшчэ раз. Пішы.

20 чэрвеня 19 г.

Ігнась Г.

13

Гроцкаму

Сволачы, сцервы, халеры, паскуднікі!.. І ты разам з імі, мої любы! Прыехаў, называецца, выступіў на бандытаў. Хоць бы на смех з пачаткоўца. Не толькі бандытаў, а й следу іхняга апі звання. Пстрычка твой — сапраўдная пстрычка. Ну, але добра. Пабачым, што далей. Чакай мяне сёння к вечару. Пакуль што паабнюхаю тут. А кулака, у якога меўся быць Заслаўскі, забраў, прывязу табе — рабі, што хочаш. Чуе мой нос, што тут не ўсё чыста. Бывай!

Мякуш Саўка.

21.VI. 19 г.
в. Кудлатаўка.

14

Чарняўскаму рэўкому.

Пачатак не надта ўдалы. Але не зважайце па гэта. Не трацце надзеі сустрэцца са мной, бо я маю на ўвазе зрабіць усё ад мяне залежнае, каб наблізіць гэту сустрэчу.

Заслаўскі.

А Пстрычку я пстрыкнуў. Хай не лезе, куды не просяць.

15

ПРАТАКОЛ

следства па справе аб выкрыцці банды Заслаўскага і дапамозе яе контррэвалюцыйнай дзейнасці.

. . . . . .

Селяпін в. Кудлатаўкі, Чарняўскай вол., N-га павета Даніла Брудаў, 43 год, жанаты, беспартыйны, са слоў яго пад судом і следствам не быў,— паказаў па гэтай справе наступнае:

З Заслаўскім я пазнаёміўся месяцы паўтары таму назад. Я тады не знаў, хто ён і чым займаецца. Я толькі знаў, што ён сын памешчыка Заслаўскага і жыве ўтайку. Прыязджаў ён да мяне ў сярэднім раз на тыдзень. Кожны раз з ім было чалавек 8 таварышаў. Звычайна яны гулялі цэлую ноч, пілі самагонку, якую мне прыходзілася дастаўляць, бо яны вымагалі гэтага. Уночы прыходзілі дзеўкі з

мястэчка, відаць — гуляшчыя, і таксама з імі гулялі. Я хацеў колькі раз даказаць на іх, але баяўся, бо пагражалі забіць. У тоі вечар, калі прыязджаў атрад, Заслаўскі таксама быў, але нейкі незнаёмы хлопец прынёс запіску, прачытаўшы якую Заслаўскі раптам сабраўся і зпік, строга наказаўшы, каб я нікому не гаварыў аб тым, што ён быў. Больш на гэтаі справе паказаць нічога не маю.

. . . . . .

16

(На платах у мястэчку іі на вёсках)

Грамадзяне!

Два гады ўжо як вы зносіце нечуваны прыгнёт і зняважу. Два гады як вы не можаце вольна дыхнуць, як на вашым карку сядзяць вашыя лютыя ворагі — бальшавікі і жыды. Гэта новыя паны, якія прыйшлі ў нашу краіну, каб забраць наша дабро, каб зніпчыць нашу гаспадарку, каб зачыніць нашы праваслаўныя цэрквы, абярнуць іх у жыдоўскія школы.

Грамадзяне! Годзе цярпець гэты здзек! Годзе быць паслухмянай скацінай, з якой робіць усё, што хоча, немаведама хто! Усе, каму дорага наша айчызна, хто шануе веру сваю хрысціянскую, бярэце аружжа й прыходзьце папоўніць рады тых, хто выйшаў на змаганпе за волю й жыццё.

Усе да нас!

Усе за аружжа!

Камандзір вольнага атрада паўстанцаў
Заслаўскі.

17

(З газетнае хронікі)

БАНДЫТЫ ЗЛАЧЫНСТВУЮЦЬ

У раёне Чарняўскай воласці сабралася хэўра бандытаў, на чале якой стаіць вядомы контррэвалюцыянер, сын памешчыка гэтай мясцовасці — Заслаўскі.

Банда робіць напады на вёскі, зпіптажае ўсіх, хто мае якую-небудзь блізкасць да Савецкаі улады, не гаворачы ўжо пра камупістаў, руйнуе сяляпскую гаспадарку. У банду збіраюцца ўсе тутэйшыя рэакцыйныя элемснты, і яна ўсё больш і больш павялічваецца, паганяючы спалох на

жыхарства і пагражаючы нават мясцовым савецкім установам.

Да знішчэння банды прыняты пільныя меры, але да гэтага часу напасці на след Заслаўскага не ўдалося.

18

ПРАТАКОЛ

пасяджэння Чарняўскага Рэўкома
ад 25 чэрвеня 1919 г.

Слухалі:

т. Гроцкі. Становішча ў воласці робіцца ўсё больш і больш трывожнае. Банда расце. Урэшце мы не можам лічыць сябе забяспечанымі ад нападу на валасны цэнтр. Трэба прымаць пільныя і энергічныя меры. Пакуль што мы не можам спадзявацца на дапамогу з павета. У нас ёсць весткі, што сталая сяліба банды ў Кудлатаўскім лессе, што паміж вёскай Кудлатаўка і Сёмкава. Я прапаную вось што:

1. Правесці шырокую агітацыю сярод сялянства, каб знішчыць ахапіўшы ўсіх спалох і знайсці з боку сялянства актыўную дапамогу ў змаганні з бандытызмам. Для гэтага выслаць на вёску нашых лепшых партыйных і савецкіх працаўнікоў.

2. Зараз жа выслаць атрад Мякуша ў той раён, дзе на вестках знаходзіцца Заслаўскі.

3. Тэлеграфаваць у павет аб становішчы ў воласці і прасіць вайсковае дапамогі.

Т. Зянькевіч.....

Пастанавілі:

Прыняць прапазіцыю т. Гроцкага.

19

Старшыні рэўкома Гроцкаму.

«Не шукай мяне ў лесе шумлівым, над зялёнаю схавай разложыстых дрэў». Дый наогул — кінь ты, усё роўна не зловіш. Лепш пачакай, хутка ўбачымся...

Твой шчыры вораг Заслаўскі».

26.VI-19 г.

20

т. Гроцкаму.

Я зноў пішу Вам. Помніце тую запіску ад невядомае Ніны, якую вы атрымалі, як толькі прыехалі к нам? Я знаю, Вы пасмяяліся толькі. Ды зрабіць іначаї вы і не маглі. Пэўна, падумалі: «Во, распусніца нейкая, на шыю чапляецца з першага дня...» Так, вядома, распусніца, бо хіба ж іншы хто мог так зрабіць? Распусніца, так, я гэта адкрыта кажу Вам. Як кажуць — прастытутка. Ну, што ж, доля такая... Але цяпер я не маю намеру чапляцца на шыю Вам — не да таго цяпер Вам, дый мне таксама. Вы, пэўна, зноў будзеце смяяцца, калі я скажу, што хачу Вас бачыць і гаварыць пра сур'ёзныя грамадскія справы. Прастытутка і грамадскія справы... Дзіўна, сапраўды, і смешна? Але чаго не бывае на свеце! Калі Вы хочаце са мной убачыцца, Вы пераканаецеся, што й такі чалавек, як я, можа знадабіцца ў вашай справе. Я сама не ведаю, чаму мне захацелася гэта зрабіць. Можа, усё тое, што перажыла я, што сцярпела за сваё не вельмі прыгожае жыццё, можа, усё гэта раптам радзіла ўва мне злосць і нянавісць, якая штурхае мяне на гэта, якая прымушае ісці да вас, далучыцца ўсёй істотай да вашых імкненняў, да вашай работы? Можа, й так? Я сама не ведаю, што мной кіруе. Я раскажу Вам усё, як убачымся, я раскажу Вам пра ўсё жыццё маё, у якім Вы, пэўна, знойдзеце многа цікавага. І я спадзяюся, што Вы паможаце мне разабрацца ў маёй душэўнай блытаніне, вызначыць месца маё ў жыцці і паможаце мне зрабіць тое, што я надумала. Пакуль што — бывайце!

Ніна.

21

У N-скі павятовы камітэт РКП(б)

Абавязак старога сумленнага партыйца прымушае мяне апісаць вам сапраўднае становішча ў нашай Чарняўскай воласці. Становішча гэта вельмі і вельмі небяспечнае. Бандытызм усё расце, пагражае неўзабаве ахапіць усю валасць і перакінуцца за яе межы. Жыхарства траціць давер'е да Савецкай улады, бо бачыць, што яна нічога не можа зрабіць, каб знішчыць бандытызм. Прычыны ўсяго гэтага — няўдалае, няўмелае кіраўніцтва таварыша, які

стаіць на чале рэв. камітэта. Трэба прыняць пільныя меры, бо іншачай можна чакаць вялікай небяспекі для ўсяго павета.

Сябра рэўкома Зянькевіч.

27 чэрвеня 19 г.

22

ЛІСТ

Міламу майму мужу Саўку Ларывонаву Мякушу ад законнае супругі яго Арыны Аксентавай Мякушыхі.

У першых страках майго ліста спяшу паведаміць вас, дарагі мой муж Саўка Ларывонаў, што мы жывы і здаровы, чаго і вам жадаю. . . . . .

Яшчэ кланяецца сын ваш Рыгор Саўкаў Мякушаў, ён ужо хадзіць пачынае і гаворыць «тата» і «мама». А жонка твайго прадсядацеля круціцца і хлапцоў водзіць, а пра яго й не ўспомніць. І скажы яму, што яна б.... і круціцца, як апошняя шлюха.

. . . . . .

Астаюся ваша любімая супруга
Арына Мякушыха.

23

(у блакноце Гроцкага)

28 чэрв. 19 г. Першы раз у жыцці бяруся пісаць дзённік. Дзіка й неразумна. Але ж неяк так чалавек ужо ўроджан, што калі гора-бяда якая, калі цяжкім жыццё робіцца, дык хочацца, як той казаў, выліць каму-небудзь сваю душу, падзяліцца думкамі й перажываннямі. Рапсей ёй пісаў, выліваў усё, раскрываў душу. А цяпер? — Мякуш ёсць... Але ён не зразумее ўсё роўна. Не, ён надта просты для гэтага. Ён так, як жонка яго: «круціцца», «хлапцоў водзіць», «б....» — і ўсё, на гэтым канец, больш не можа быць гутаркі й думкі... А ў мяне не выходзіць так. Мне шкада, што разбіўся тої пекны будынак, які я пабудаваў з сваіх мар, што запэцкаўся ў гразь тої вобраз, які я стварыў у думцы сваёй, які я злучыў з яе асобай. Эх, Каця, Каця! Ці ведае яна, як цяжка мне разлучацца з тымі думкамі, марамі, якія я песціў, гадаваў у сабе з

першага дня знаёмства з ёй? Якая яна была любая, простая тады, якой блізкай, родпай здавалася! Думалася, што можна смела пайсці з ёй у жыццё, што шчырым, верным таварышам будзе, памочнікам... А мо трэба было сюды яе ўзяць, каб акунуцца разам у стыхію жыцця? Мо б гэта стыхія бурлівая зрадніла, звязала путамі таварыстваў?.. Але не, усё роўна. Так яшчэ лепей, што адразу выявілася. Лягчэй так усё-ткі...

Ну, годзе. Досыць папускаць лейцы, бо так дакацішца можна чортведама да чаго. Час не такі, каб раставаць у блакітна-ружовай чмуце розных «перажыванняў». Агульная справа прымушае забыцца на асабовае, растапіць гэта асабовае ў тым шырокім, агнёвым, што гарыць, бушуе магутным уздымам, што з грукатам, з гулам варочае камні цяжкія гісторыі, і нічога няма тут такога — зусім проста. Толькі больш працаваць, так працаваць, каб часу не было на розныя думкі. І тады на ўсё чыста забудзешся. А калі адгукнецца часам глыбока там недзе, у сэрцы ці яшчэ дзенебудзь, тады зубы сашчэрыў ды йзноў за работу.

Так. Здаецца, справы наладжваюцца ў нас. Жыхарства блізка што заспакоена. Сярод сялян моцнае абурэнне супраць бандытаў. Пры гэткіх абставінах можна ўраз справіцца з імі. Але сярод нашых ёсць здрада. Адкуль жа б ведаў Заслаўскі ўсё, што мы толькі надумаем рабіць? І што, калі спраўдзяцца мае падазрэнні? . . . . . .

. . . . . .

А гэта... Паплю сёння к ёй. Хай прыйдзе. Цікава. А мо паспрабаваць змяніць тое туманнае, зыбкае больш простым, рэальным? Мо пашукаць у гэтай дзяўчыне спосабу пазбыцца шчымлівых успамінаў аб той. Кажуць, што клін выганяецца клінам...

. . . . . .

Загорпая, 17. Ніпс.

Тое, што Вы напісалі мпе апошні раз, зацікавіла мяпе і як савецкага працаўніка і проста як чалавека. Ахвотна пабачуся з Вамі. Калі гэта Вас не кампраметуе, прыходзьце да мяне сёння ўвечары. Буду чакаць.

Гроцкі.

25

Горад N.
Кацярыне Макараўне Гроцкай.

Мяне перш дзівіла Ваша маўчанне. Цяпер мне ўсё яспа і зразумела. Я не скажу, што чакаў такога кашца, але думка аб магчымасці гэтага даўно ўжо жыла ўва мпе. Мяне часта забірала сумнеппе: ці не памыліўся я ў Вас, ці не стварыў я сам сабо пейкую мару, якую па пепаразуменні злучыў з Вашай асобаіі? Так яно й выйшла.

Я сам пе ведаю добра, нашто я пішу Вам. Пэўна, ліпшняе гэта. Але мне хочацца ўсё-ткі сказаць Вам колькі слоў, апошніх слоў. Эх! Каця, Каця! Як цяжка было мне, калі я ўзнаў і зразумеў, што памыліўся ў табе. Мне й цяпер яшчэ цяжка бывае часамі, калі старое ўспомніцца. А я знаходжу ўцеху сабе ў безадхлыннай рабоце. Ды яшчэ часамі ў іншым у нечым. Хочаш, скажу?..— У абнімках жанчыпы, якую завуць прастытуткай. Ты, пэўна, моршчышся? Дарма, бо часамі прастытуткі бываюць лепшыя за «сумленных» жапчын. Ды, урэшце, хто разбярэ, дзе канчаецца сумленная жанчына, а пачынаецца прастытутка?..

Ну, годзе. У мяпе ёсць просьба да Вас. Апошняя просьба. Не завіце підзе і ніколі сябе маёй жопкай, бо Вы ніколі ёй не былі і не будзеце.

Гроцкі.

1 ліпеня 19 г.

26

Гроцкаму

Нікаю, як сабака, высалапіўшы язык. Здаецца, патраніў на гарачы след. Мой атрад удвая пабольшаў. Далучыліся хлопцы сялянскія. Не раўнуючы, як на ваўкоў выйшлі з аблавай. Адным словам, прыяцель, усё добра. Так што скора зловім. А хітры, халера, як чорт...

Мякуш Саўка.

27

ТЭЛЕГРАМА

30-VI-19 партком

Становішча адчайнае кропка зніміце Гроцкага прымайце меры.

28

ТЭЛЕГРАМА

3.VII-19 Чарняўка рэўком Гроцкаму

Перадайце справы часова Зянькевічу прыязджайце незадаўна.

Сакратар парткома (подпіс).

29

(у блакноце Гроцкага)

3 ліпеня 19 г. Зноў пішу. Зноў хочацца падзяліцца хаця з паперай сваімі думкамі. Тэлеграма з парткома... Ці ехаць, ці не? Не, тут, мусіць, непаразумепне нейкае. У такі момант нельга пакідаць свайго месца. Я павінен быць тут, гэтага патрабуе справа. Няйначай тут нечыя злосныя хітрыкі, бо ў апошнім даносе я добра выклаў сапраўдны стан воласці, і парткому павінна быць ясна, што я не магу цяпер выехаць адсюль. Трэба скарыстаць сучасны настрой сялянства, узрушанага супраць злачынцаў, каб ураз расправіцца з бандытызмам. Раптоўны выезд, замена старшыні рэўкома ў такі напружаны момант, безумоўна, народзіць розныя чуткі і плёткі і шкодна адаб'ецца на справе.

. . . . . .

А дзіўна як складаецца жыццё! Ужо тыдзень, як я знаюся з Нінай. Ужо тыдзень, як я прыглядаюся да яе і знаходжу ў ёй усё больш і больш цікавага. Прастытутка... Я б не назваў яе так, мая мерка не гэткая. Што ж там, што жыццё, як кажуць, «распуспае». Але хіба ж можна назваць прастытуткай таго, у кім так многа здаровых жывых парыванняў, у каго душа поўніцца такімі цэльнымі, такімі шчырымі пачуццямі?

Жыццё над ёй падсмяялася, добра пакомчыла яе. Не жыццё, а лад, той злачынны стары. Яна адна з тых незда-

воленых, злосных, што поўны востpага магутнага пратэсту, што гатовы гэты пратэст абярнуць у гарачую ўпартую чыпнасць, у дзейнае парыванпе. Яна прыйшла цяпер да нас. Я пе верыў адразу, мне смешна было. Цяпер ужо ясна мне, што яна сапраўды прыйшла. Прыйшла, бо зразумела, што яна — наша, што пратэст яе — гэта наш агульны пратэст, які выліўся ў рэвалюцыю, што нездаволепне яе — гэта адвечнае агульнае нездаволепне ўсіх, каго ціснуў, ламаў стары лад.

Яна, відаць, кахае мяне. Смешна неяк — ні з таго ні з сяго... А я? — Мне з ёй лягчэй, я забываюся на тую. Я гавару з ёй, як з таварышам, і яна разумее мяне. З гэткай можна рука ў руку працаваць і змагацца. Гэткая не здрадзіць... Цікава толькі, чым кончыцца гэта.

30

ТЭЛЕГРАМА

4. VII. 19 партком.

Стан справы не дазваляе выехаць зараз кропка падрабязна данясе.

Гроцкі.

31

Камандзіру атрада тав. Мякушу.

З гэтай запіскай прыйдзе да цябе дзяўчына. Яна можа нам дапамагчы. Як — аб гэтым яна сама раскажа. Па-моймму, ёй можна даверыць. Як ты думаеш? Зірні на яе сваім сур'ёзным жорсткім поглядам, знаеш, такім, як ты часам глядзіш на бандытаў, і твоій інстынкт падкажа табе, хто яна й што. Прысылай справаўна даносы аб рабоце. Я ведаю, што ты не любіш гэтага «пэцканпя паперы», але, братка, так трэба. Бывай!

Старшыня рэўкома Гроцкі.

5 ліпеня 19 г.

32

Гроцкаму

Дзяўчыну тваю атрымаў у цэласці. Глядзеў на яе больш, чымся ты загадаў, але, апрача вялізных чарнюшных вачэй, нічога не ўбачыў. Прыгожая дзеўка, дабро, і, здаецца, свая. Мы з ёй адразу знюхаліся. Атрад пасылаю ў мястэчка на чале з Кузьмёнкам. Будзем працаваць з дзяўчынай. Ты не думаі там абы-што... Ды не, ані ў зуб, цэлаі астанецца. Як трэба будзе падмога, накажу. Аб усім, што ўзнаеш пра мяне, ані пісні, бо сам ведаеш, адным словам — бываі!

Мякуш Саўка.

33

ПРАТАКОЛ

пасяджэння N-га павятовага камітэта РКП (б)
ад 8 ліпеня 1919 г.

Слухалі:
П. Аб барацьбе з бандытызмам.

Дакладчык т..... З кожным днём мы атрымліваем з Чарняўскае воласці ўсё горшыя і горшыя весткі. Бандытызм расце, ахапляе ўсё большы раён і пагражае перакінуцца ў суседнія воласці. Сялянства спагадна адносіцца да бандытаў і варожа да ўлады. З афіцыйных данясаў старшыні рэўкома Гроцкага гэтага не відаць, усе яны працяты аптымістычным настроем, але сябра таго ж рэўкома т. Зянькевіч, стары надзейны партыец, і іншыя таварышы засыпаюць лістамі і тэлеграмамі аб крытычным становішчы ў воласці і ўсе ў адзін голас тлумачаць гэта няздольнасцю і няўмеласцю Гроцкага. На тэлеграму, якою Гроцкі быў выкліканы сюды, ён адказаў вось як (чытае тэлеграму Гроцкага). Нам трэба дакладна абгаварыць гэта пытанне, абмеркаваць усё і прыняць канчатковыя і самыя энергічныя меры, бо...

Пастанавілі:

1. У другі раз прапанаваць т. Гроцкаму пеадкладна здаць справы т. Зянькевічу і з'явіцца ў партком.
2. Паставіць на від таварышу Гроцкаму яго недысцыплінаванасць, якая выявілася ў невыкананні загаду парткома.
3. Выслаць у Чарняўскую волась дадатковую вайсковую сілу.

34

ТЭЛЕГРАМА

9.VII.19. Чарняўка рэўком.

Высылаецца вайсковая дапамога кропка Гроцкаму здаць справы Зянькевічу і неадкладна з'явіцца партком.

Сакратар парткома (подпіс).

35

Гроцкаму ва ўласныя рукі.

Прысылай атрад у вёску Сёмкава сягоння ўночы. Зрабі так, каб аб гэтым не знаў ніводзін чалавек. Асабліва сцеражыся Зянькевіча. Чаму — аб гэтым, пэўна, дазнаешся, як прачытаеш перасланую разам з гэтым запіску. Я выпадкова адабраў яе ў аднаго хлапца, які адмовіўся даваць якія б ні было тлумачэнні. Хлапца я здаў пакуль што ў Кудлатаўскі камбед, а запіску табе пераслаў. Прыгледзься да пісьма і параўнай яго з пісьмом некаторых нашых. Пакуль што — бывай. Чакаю людзей.

Мякуш Саўка.

9.VII. 19 г.

36

Сцеражыся дзяўчыны, Ніпай завусць, прастытутка. Яна апошні час з Гроцкім нешта вадзілася і потым, здаецца, яна пайшла ў атрад к Мякушу. Май гэта на ўвазе. З Гроцкім хутка развітаемся, справа йдзе добра.

37

Добры дзень, Гроцкі!

Пішу табе з саменькіх лап звера. Цікава, га? Я ў захапленні проста, таму, можа, й лёгка мне граць сваю ролю. Каб ты ўбачыў мяне, якая я добрая артыстка. Я не ведала, што маю такі талент. А што асабліва цікава, гэта тое, што гульня мая — гульня са смерцю. Так, жыццё маё, як кажуць, вісіць на валаску. Я бачу, што ён нібы трохі дагадваецца. Мо гэта й не так, але ўсё роўна: калі што, дык першая куля прызначана мне. І ведаеш, Гроцкі, я ані-ні не баюся. Я проста не пазнаю сябе. Мне так радасна, добра. У мяне ж цяпер так поўна, так многа чаго ў жыцці. Цяпер мне ўсё асветлена наперадзе.

Ты знаеш маё жыццё. Ты знаеш, што ў ім было трохі і нскпых старопак. Праўда, разбаўляліся, губляліся ў агульнай цямноце, але ж былі ўсё-ткі, як ні кажы. І вось я раўную цяпер самыя лепшыя часіны майго жыцця з цяперашнім. Выходзіць, што там і сотае часткі не было таго, што я цяпер адчуваю.

Адно кепска. Надта непрыемна бывае, калі прыходзіцца з ім... ну, ты сам ведаеш што... Але ї тут я найшла спосаб збавення. Я, заплюшчыўшы вочы, уяўляю цябе, нібы не з ім я, а з табой... Ты смяешся? Вядома, што смешна. Я ж пішу табе так адкрыта аб усім, аб усім чысцепька. Ты не злуї на маю балбатню, я ж так даўно не гаварыла ні з кім па-прыяцельску.

Цябе, можа, цікавіць, як ён да мяне? Мо, думаеш, ён закахаўся ў мяне? Ды не, тут прасцей. Кожнаму звяру самка патрэбна. Ну, а дзе ж яе знайсці? Як ты ведаеш, мы з ім раней сустракаліся і ён улічае мяне за звычайную прастытутку.

Ну, дык вось, мой любы таварыш (выбачай, што назвала так), у мяне больш шансаў на тое, што мяне заб'юць. І нейкае дурацкае прадчуванне шэпча мне, што так будзе напэўна. Мабыць, мы з табой не сустрэнемся больш. Мне хочацца табе шчыра-шчыра падзякаваць, бо, як ні кажы, праз цябе я знайшла сабе шлях. І яшчэ адна просьба табе. Калі мяне не будзе і калі ты ўспомніш часамі мяне, дык успамінай як жанчыну, якая цябе моцна-моцна кахала. Ты паверыш, цяпер я знаю, бо маніць мне няма ніякага сэнсу. Ну, выбачай, таварыш, за гэту мімавольную сентыментальнасць. Бывай!

38

ТЭЛЕГРАМА

9.VII.19. партком.

Заўтра выязджаю кропка. Здаю Грышчапку.

Гроцкі.

39

Сакрэтна.

Час. камандзіру атрада Кузьмёнку.

Загадваю зараз жа арыштаваць сябра рэўкома Зянькевіча і трымаць пад надзейнай вартаї да асобнага распа-

раджэння. Падрыхтаваць атрад да выступлення сягоння ўночы. Выхад атрада з мястэчка павінен прайсці непрыметна. Аб часе выступлення я дам загад асабіста. Я буду знаходзіцца з атрадам.

Старшыня рэўкома Гроцкі.

9.VII. 19 г.

40

У N-ю павятовую надзвычайную камісію.

Разам з гэтым перадаецца па Ваша распараджэнне правадыр шайкі бандытаў Заслаўскі і 15 яго таварышаў згодна прыкладзенага спіску, забраныя ўночы з 9 на 10 ліпеня ў в. Сёмкаве. Падрабязпасці забрання бандытаў у даносе камандзіра атрада т. Мякуша. Адначасна перадаецца быўшы сябра вал. рэўкома Зянькевіч, які выкрыты ў здрадзе і зносінах з бандытамі, што відаць з прыкладзенай пры гэтым запіскі, якая напісана, відавочна, яго рукой. У мясцовай ячэйцы атрыманы толькі што неафіцыйныя весткі, якія прымушаюць сумнявацца ў яго сапраўднай належнасці да РКП(б).

Час. старшыня Чарняўскага
рэўкома Грышчанок.

№ 179
10 ліпеня 1919 г.

41

(З газетнае хронікі)

ЛІКВІДАЦЫЯ БАНДЫ ЗАСЛАЎСКАГА

9 ліпеня г. г. у в. Сёмкаве, Чарняўскай воласці атрадам па змаганні з бандытызмам злоўлен правадыр шайкі бандытаў Заслаўскі і яго 15 таварышаў. Падрабязнасці забрання бандытаў вось якія:

За тры дні да гэтага ў банду прапікла абліччам пастытуткі адна мясцовая дзяўчына, якая сышлася з Заслаўскім і ўвайшла ў курс жыцця банды. Узнаўшы, што Заслаўскі рыхтуецца ўночы на 10 ліпеня наведацца ў в. Сёмкава, дзяўчына паведаміла аб гэтым у мясцовы рэўком. У тую самую ноч у в. Сёмкава быў выслан атрад, які абкружыў хату, дзе быў Заслаўскі, і пасля ўпартага адпору з боку бандытаў яны ўсе былі забраны, апрача трох, забітых на месцы. Сам Заслаўскі забраны жывым, але цяжка паранены. З боку атрада — пяць раненых і тры

забіты. Сярод забітых — старшыня мясцовага рэўкома т. Гроцкі. Таксама забіта ї тая дзяўчына, якая была з бандытамі і выдала іх.

Злоўленыя бандыты накіраваны ў надзвычайную камісію, якой цяпер вядзецца следства з мэтай выкрыцця рэшты ўдзельнікаў банды.

N-скі павятовы партыйны камітэт з жалем паведамляе аб геройскай смерці на фронце барацьбы з бандытызмам старшыні Чарняўскага рэвалюцыйнага камітэта Ігната Рыгоравіча Гроцкага.

ПЕЛА ВЯСНА

Шумам шырокім шугала ў абшары. Песню ліла непазбыўна-жывучую, смелую, гордую песню.

Пела вясна...

У шоламе гучным раз'юшаных навадак гімнам расла, расцвітала магутная свежая сіла.

Расла, расцвітала. Гарпула цудоўпым размахам пудліва-слухмянае сэрца, імкнула ў прасторы, віхурыла ўзлётам шалёным.

Парываннем дзівосным хмяліла душу, крамяніла волю сталёвым запалам.

Пела вясна...

Так смела і горда. Так радасна, шчыра.

Пералівала песню ў дражліва-гарэзлівы рогат. Смяялася звопка, задорна.

Над старым, струхнелым смялася.

Над тым, што гарбаціцца, корчыцца, кручыцца.

Над тым, што гнілой дзеразоі засцілае асліглую глебу.

Над тым, што баіцца зірнуць у агпісты прасцяг, што сопца баіцца гарачага, палкага.

Над тым, што пязграбна карожыцца ў брудзе бруспелым...

Ой, як вясна пасмяхалася! Як пагардліва сыпалі дробным смяшком галузы-цурочкі бліскучыя!

Аж захадзіліся, аж захліпаліся.

І, хітра міргаючы, у сопца кідалі вясёла-прыжмураны погляд мільёнаў іскрачак-вочак...

А сопца плыло, расплывалася ў мора — душнае, палкае мора.

І абымала ўсё чыста шчыраю цеплю.

І цалавала ўсё чыста салодка-пякучым праменнем.

Сопца плыло. А ў сопцы — у душпым распаленым моры — звінелі цурочкамі срэбпымі ядрана-звопкія песні птушпыныя.

Птушкамі пела вясна. Пела шоламам гучным раз'юшаных навадак, дробпым смяшком дуропых цурочкаў.

Радасна пела вясна.

НА ЧЫГУНЦЫ

1

17-га кастрычніка 1910 г. Яўмен Грак пакінуў вайсковы шпіталь з перахлябанай торбай за каркам і чыстай, звонкай — што арэх — дзеравяшкай на месцы левай нагі. Ён сеў у поезд на грамозднай непрытульнай станцыі, дзе ў шэрым гармідары цёрся брудны жгут чалавечых цел, дзе паветра набракшы было слізкім пахам людской цеснаты, дзе пахла хваробай і смерцю. Пасля таго вакзальнага змроку весела было дзівавацца ў расчыненыя дзверы цяплушкі на свежы прастор карагоду палёў і лясоў, на цёплыя далі з восеньскім сонцам — рахманым і мяккім.

У восеньскім сонцы, у далях веяла чыстым бязмежжам, шырокаю радасцю. Адтуль улівалася ў сэрца нешта даўнае-даўнае і такое празрыста пявучае, як пералівы жалейкі.

Поезд ішоў ціха, часамі зусім ледзьве сунуўся. Тады добра відаць было, як, распасцёршыся ў радаснай млосці, над рыжым іржэўнікам калыхаліся, плавалі ніткі сівой павучыны. І чамусьці ўсё ўспаміналася: дубцаваты ракітавы куст над люстраным Дняпром, жалуды сярод бурага лісця пад дубам-асілкам, вогнішча й сонца... Такое ж рахманае, мяккае сонца, як і цяпер. Як кожную восень.

А ў тон успамінку, як пералівы жалейкі, недзе глыбока-глыбока, мо па жывых струнах чулага сэрца церабіў ласкавы, тонкі напеў:

...Пад ракі-і-таю-ю зялё-о-о-най
Салдат ра-а-нены ляжа-аў...

Гэты напеў запаў у Яўменава сэрца з таго незабытага дня, калі везлі яго ў вайсковы шпіталь. Тады мітусілася ўсё ў агнёвым, жудасным сне, а на тым месцы, дзе ляжала нага, няўспынна і грозна трасла страшэнная, чорная груда і ціснула, мяла ўсяго, жвала тупым алавяным болем. І тады ў прахонах душнае цемры застрала чарнявая пляма — твар возніка-санітара: хвосцікам кручаным вусікі, чорныя вочы, жывыя, як мышкі... І гэта даўгая-даўгая,

бяскоцая песня, якая, здаецца, цягнулася колькі гадоў разам з лёскатам парнаї казённаї павозкі, разам з няўпынным шоламам-звонам увушшу:

...Пад ракі-і-таю-ю зялё-о-о-пай
Салдат ра-а-нены ляжа-аў...

Бадаї што, гэта ї помніў толькі Яўмен з таго страшэннага сну, ад якога прачнуўся праз тыдзень бязногі. Але гэты вобраз асеў так глыбока ї так моцна, што, мабыць, ніколі не страціць свае жывое яскравасці.

У цяплушцы, дзе ехаў Яўмен, было поўна чырвонаармейцаў. Паміж іх укомчылася колькі жанчын у падраных старых лахманах, жанчын, якія ад бруду і цяжкої зморы сталі зусім падобныя адна да адної — усе старыя і цьмяныя, як мочаны лёп.

Жанчыны ўсе лапаталі. Адна, што бліжэй да Яўмена, нешта пляла пра сваю гаспадарку, пра беднасць, пра нейкае гора. Гаворачы, яна раз за разам сморгала вуснамі, надбіраючы іх, нібы папраўляла хустку на барадзе. І гэты спакойны рух, разам з глыбока эпічным, як булькание вады, голасам, настойна будзіў пачуццё гаспадарскай сямейнасці, раджаў мімавольную павагу да наіўнае прастаты гэтае цьмянае бабы, што прыйшла ад чорнае, залітае потам зямлі, поўнаї нямога аўтарытэту, поўнаї цяжкої тлустаї сілы.

Яўмен пераклнуў сваю драўляную нагу цераз лаўку і сеў спіноў да дзвярэй, каб ямчэй было слухаць старую. Пасля светлых прастораў тупа ўшчаміла зрок брудная шэрасць вагона. Здалося, не ехаў ён тут, не сядзеў, а ўкінуўся раптам сюды адпекуль знадворку, з бязмежжа шырока, укінуўся і асеў, стуліўся нутром, сцягнуў у клубок думкі-мары, што ўжо разляцеліся былі ў белы свет, у яскравыя далі.

Ад кіслага паху ў вагоне, ад чалавецкае блізкасці стала на сэрцы цёпла і цесна, быццам быў не ў вагоне, а недзе дома на печы або ў цёмнаї еўпі, у душнаї пары нагрэтага жыта.

Слухаць пачаў ён зважна, салідна, па-гаспадарску, дзе-підзе ўстаўляў свае рэплікі і, набіраючы ў путро самадавольнае важнасці, чакаў толькі траппага мігу, каб расказаць што-небудзь сваё. Знаў, што ў яго больш, як у іпшых, ёсць аб чым расказаць, што на гэта ён мае цяпер асаблівае права, што навіпны ўсе слухаць яго з павагаї, бо ён інвалід, прайшоў усе фронты; бачыў смерць прад

сабой не раз і не два... І ад гэтае думкі раставала сэрца ў мяккай давольнасці, забывалася горкасць калецтва, пачынаў адчуваць сябе гаспадаром, які зрабіў сваю справу і адпачывае цяпер пасля працы.

А баба цягне сваё без канца. Чырвонаармейцы слухаюць моўчкі, з лёгкім сумам на твары, з маркотай. Ува ўсіх сталасць, сур'ёзнасць. Іначай няможна, бо ў словах старой, у нямудрым апавяданні яе, як у кроплі вады, адбіваецца важнасць уся, уся святасць мужыцкага землянога жыцця.

Не дачакаўшы канца апавядання, Яўмен адвярнуўся зноў да дзвярэй. Зноў калаўротам бязмежным, рознакалёрным радном закруціліся пожні, лясы — у золаце лісцяў, у золаце сонца. Тая давольнасць, што засачылася ў сэрцы, як слухаў старую, цяпер злілася з ціхай урачыстасцю восені і абярнулася ў жывую глыбокую радасць. Цяпер успомніў усё, што пражыў, што перацярпеў, і ўсё здалося так немінуча патрэбным, як кожная гаспадарская справа. Бо чуў ён цяпер, што ўвесь свет яму родны і блізкі, што ён гаспадар у гэтым свеце, у новым жыцці, за якое аддаў колькі гадоў маладосці, аддаў кавалак уласнага цела. І разам з тым пачуў Яўмен вальготнасць нейкую, лёгкі прастор душы, калі ўспомніў, што ён не ведае сам, куды едзе (няма куды ехаць), і не баіцца. Бо гаспадар жа ён, месца знойдзе сабе, дзе толькі хоча.

Пад гонкі, размашысты грукат каткоў паспрабаваў Яўмен уявіць сваю будучыню. І выйшла так, што ўваччу толькі няясныя плямы мігнулі — спляліся, скруціліся і раздаліся сухой пустатой. Стала тады непрыемна троху, што вось агульная ўпэўненасць ёсць, а каб што канкрэтнае, яснае, дык — адна пустата. Пачуў Яўмен, што чагось нестае, чагосьці няма ў яго. І перш за ўсё няма каго-небудзь блізкага, роднага. Блізкія ўсе, але трэба бліжэйшы за іншых, свой, асобны ад іншых, а такога няма. Няма нават каму расказаць пра свае планы, намеры, няма каму без спеху, ладам-парадкам выкласці ўсё, што насіў у душы, што назапасіў за колькі гадоў барацьбы.

А колькі было там усякае ўсячыны! Эх, каб гэта недзе знайсці спакойны прытулак, ды сесці ў ціхім, у цёплым, ды зірнуць каб навокал на знаёмае, блізкае, дый расказаць — спакваля так, памалу.

Каб гэта бачыць у нечых вачах іскрачкі шчырай цікавасці, каб роўны і чысты свет адданасці бачыць у гэтых вачах...

Задумаўся ціха Яўмеп, стаў слухаць нутром усім адзіноту сваю, слухаць знібеппе шчымлівае сэрца. Потым чамусьці цяжка стала сядзець на вачах у людзей, палез праз клумкі, мяшкі і скруціўся ў цесным прахоне над шырокім памостам.

2

Прачнуўся Яўмен ад выбуху бурнага рогату. Рогат паўтараўся праз такія прамежкі, якіх было досыць для лятучага спрытнага жарту. Яўмеп, зацікавіўшыся, выткнуў сваю галаву з-пад памоста.

Поезд стаяў. У прахон шырокіх дзвярэй відаць быў цьмяны свет надвячорку. Сонца было не відаць, але адчувалася, што яшчэ недзе лазіць яно па верхавінах дрэў і будынкаў, мажа іх рэзкай, вадзянай сваёй пазалотай.

За дзвярмі мітусіўся адчайны гармідар людскіх галасоў. Там гвалтавалі, енчылі, плакалі гурмы мяшочнікаў, просячы, дабіваючыся ў вагоны, кідаючыся ад адных расчыненых дзвярэй да другіх. Чырвонаармейцы, збіўшыся грудам каля дзвярэй, сустракалі іх сваім д'ябальскім рогатам. Была ім забава — дражніцца з абадраным, абшарпаным натоўпам, шырокай патокай наўплыўшым на поезд.

Яўмен вылез з-пад полу, праціснуўся бліжэй да дзвярэй. У гэты момант чырвонаармейцы расступіліся і ў вагон адна за адной уляцелі дзве торбы. За імі з такім жа самым імпэтам уляцела дзяўчына, падхопленая некалькімі парамі дужых мужчынскіх рук.

За дзяўчынкай усе ад дзвярэй адхлынулі. Усе абкружылі яе сярод вагона, смеючыся, жартуючы, бесцырымонна хапаючы за далікатныя месцы. Яна адбівалася і тож смяялася рэзкім, нейкім віскліным смехам, які быў мала падобны на смех, а больш на прарэзлівы ёкат чалавека ад нейкага вострага болю.

Яўмен зірнуў у твар гэтай дзяўчыпы. Твар быў страшны сваім дзікім нечалавечым выразам.

Гэта была ўсмешка... Так, мабыць, усмешка, бо вуспы сударгава расцягнуліся праз увесь твар, шырока адкрыўшы белыя бліскучыя зубы.

Гэта была безумоўна ўсмешка, бо ўвесь твар быў пабраўся ў зморшчкі, пабраўся нацягнута неяк, напружана, быццам застыглі гэтыя зморшчкі, быццам так назаўсёды яны застануцца.

А скрозь гэтую дзікую грымасу смеху прарываўся

страшэнны звярыны спалох. Здаецца, здушыла яна яго, сціснула гэты спалох унутры і трымае, хавае ва ўсмешцы, у рогаце, хавае ад гэтых людзей, каб не было яшчэ горш. Яна ўжо чакае, ужо ахвяравала сябе на нешта страшное, чаго нават не можа ўявіць, і смехам гэтым хоць трошку ўлашчыць некага хоча, хоць трошку сябе падбадрыць, заспакоіць.

Яшчэ заўважыў Яўмен вочы дзяўчыніны, шырока раскрытыя, чорныя. Бегалі яны па баках, шукалі печага, а мо некага, шукалі, мабыць, дапамогі, ратунку. І такі ў гэтых вачах быў боль, адзінота, такі быў горкі адчай, што ў Яўмена страсянулася сэрца ад жалю. Ён кінуўся ў кола хлапцоў і закрычаў не сваім, неїкім вузкім, зашчэмленым голасам:

— Што вы... забаўку знайшлі... Не бачыце — дзеўка крапулася з памяці... чэрці...

Яго словы пакрыў дубовы раскацісты смех. А з смеху ўзвіўся тонкім фальцэтам нечы насмешлівы голас:

— Абаронца бязногі!.. Аблакат!..

Яўмену сціснула сэрца, кроў галаву наліла гарачым свінцом. Не помніў ён сам, што было. Кідаўся па некага, нешта крычаў, некага біў... у жалезных абдымках некалькіх мужчын яшчэ біўся ўсё, трапятаўся. Потым заціх, абамлелы ад зморы.

І пацішэла тады чамусьці ў вагоне. Гаварылі ўпаўголаса ўсе, толькі адзін бурчаў сярдзіта — скрозь зубы — і моцна:

— Над інвалідам смяяцца... тожа знайшоўся разумнік... Знайшоў, над кім пачасаць язычок... От, як самому так адарве, дык узнаеш, што гэта значыць... Скалазуб...

Сімпатыя ўсіх была за Яўменам. Яму хацелася плакаць — цяжка было нават стрымацца.

Дзяўчыну больш не чапалі. Яна моўчкі сядзела на краічыку пола — глядзела роўна перад сабой, быццам не знала, ці добра гэта ўсё абышлося, ці мо трэба чакаць яшчэ чаго ад салдатаў.

Яўмен сеў у кутку і моўчкі ступіўся.

У вагоне сцямнела. Дасталі недзе свечку, ад яе распаўзліся, хістаючыся, цені вакол, сталі рэчы і людзі няясныя, цьмяныя. Калматы гэты, расхрыстаны свет ды дрыжэнне вагона пад адпамерпы, папура-пастойлівы, нібы адлятаючы некуды ляскат каткоў зліваліся ў нейкую фантастычную казку.

Яўмен упінаў зрок у дрыготны агонь і — перухомы, застыглы — аддаваўся чуламу спакою, убіраў у сябе ўсім целам, усёй істотай блытаніну дрыготных гукаў, заслоненых агульным фонам грукату поезда і далёкіх-далёкіх, як галасы з-за тоўстай нейкай сцяны.

І здавалася тады, што гэта не вагон, а змрочная, цесная хата — родная хата яго — і не чужыя людзі гэта гамоняць, а дзед стары казку гаворыць яму — пра ваўкоў, мядзведзяў, пра нячыстую сілу. Дзед такі спакойны-спакойны, як зіма, як лес узімку, калі дрэвы з бародамі сівымі, з белым валоссем стаяць ціхія, глыбакадумныя.

Дзед казку гаворыць — спакойны-спакойны,— а на дварэ завіруха мяце, і пішчыць, і енчыць, нагапая, дабіваецца ў хату, у вокны. І яшчэ кот курню пяе... так... крру... крру... крррру-у-у...

. . . . . .

— У-у-у-у...

Яўмен здрыгануўся. Над вагонам нёсся настойны гудок, поўны сцюдзёнай журбы, поўны крыўды на некага. Ляцеў гэты гудок, здаецца, з адчайнай шпаркасцю, ляцеў, каб нарвацца на пешта грубае, цвёрдае і разбіцца ў адчаі, рассыпацца.

Усё роўна, прапала ўсё чыста!..

І рассыпаўся, знік. Заёрзаў вагон па стрэлках. Абкружылі другія гудкі — задорныя, вёрткія,— гудкі манеўраных жорсткіх і спрытных паравікоў.

Поезд стаў на нейкай вялікай станцыі. У вагоне ўжо спалі ўсе чыста — на падлозе пераблыталіся торбы, мяшкі з чалавечымі фігурамі, пакручанымі, пакрыўленымі — у страшных ненатуральных паставах.

На тым самым месцы, на крайку памоста, сядзела дзяўчына. Яўмен пачаў узірацца ў яе застыглы твар, цьмяна асвечаны дрыготным святлом. Можа, таму, што ён быў густа ахутаны ценем, можа, таму, што змрок сціраў, згладжваў рысы яго, Яўмену здалося цяпер, што ён падобны на нечы твар — добра знаёмы яму і прыемны. Ён пачаў думаць і здумаў, што ў яго маткі быў такі твар, калі яна дасвета прала, а ён — малы яшчэ — прасынаўся на момант, поўны цёплай ласкі і радасці, кідаў на матку змораны сном погляд і зноў засынаў, спакойны, угрэты ціхай рытуальнасцю вярцёнпае песні.

Яўмена пацягнула рантам да гэтае чужое дзяўчыны, як да свае, захацелася нешта сказаць ёй, а можа, спытаць.

Ён пазяхнуў перш, паправіў сваю дзеравяшку і потым спытаўся:

— Позна гэта, ці што?

Яна здрыганулася і, не гледзячы на яго, праказала:

— Гадзін восем будзе, напэўна. А можа, няма яшчэ.

Яўмен троху змоўчаў, яшчэ пазяхнуў і прабурчэў:

— Такі цяпер дрэнны народ пайшоў... Звяры чыстыя... Трэба ж гэта — прывяжуцца, як смала...

Дзяўчына раптам ажывілася і загаварыла парыўчата, хапаючыся, быццам спяшалася некуды:

— Я б нізавошта не села, каб яшчэ хлеб быў... Я ўжо ведаю... Але хлеб увесь выйшаў, а там няма дзе купіць... Суткі не ела, дык і палезла з радасцю — абы паехаць...

Тады Яўмен спаквапя развязаў сваю торбу, дастаў чэрствы кавалак хлеба і разламаў яго на дзве палавіны.

— Наце, перакусіце...

Яна схамянулася, засаромілася.

— Ды не, што вы... Я так проста сказала... Я ў N дастану, куплю.

— Наце, пажаласта...

Як брала, не зводзіла з хлеба вачэй. А яны галодна бліпшчэлі — сухія, шырокія.

Яўмен стаў есці другую палавіну...

— Перабірайцеся-тка сюды, да мяне...

І яна слухмяна падняпася, узяла свае торбы, перасела бліжэй да яго.

У гэты час крануўся поезд. Зноў затрасло, зноў зліўся развалісты танец вагона з калматым расхрыстаным светам, зноў пацягнулася самадавольная песня каткоў.

Тады пачалася ў Яўмена з дзяўчынай доўгая шчырая гутарка.

Расказаў ён, як быў паранены, як ляжаў у шпіталі, як выпісаўся і паехаў проста ў свет, невядома куды, бо родны краі за мяжой, няма ні сям'і, ні кута, дзе прыхіліцца.

Дзяўчына слухала ўважліва, у вачах у яе відаць было спачуванне, і Яўмену ад гэтага было радасна, хацелася гаварыць яшчэ і яшчэ. І чым далей гаварыў, тым больш было шчырасці ў словах, тым больш адчуваў давер да гэтай чужой, незнаёмай дзяўчыны, быццам не тут во сустрэў ён яе, а знаў даўно, быццам была яна блізкай яму, сваёй... Сціхнуў толькі тады, як пачуў, што няёмка неяк усё аднаму гаварыць, што трэба ў яе распытаць.

Тады яна расказала, што едзе да радні на вёску, яшчэ

асталося вёрст трыста. Вязе троху солі, бо там няма — чыстае гора... Бацька ў яе памёр яшчэ да вайны, а ёсць толькі матка старая ды меншы браценнік. Яны асталіся ў горадзе — мабыць, памруць, бо няма чаго есці...

У гутарцы час праляцеў неўзаметку. Поезд каціўся й каціўся — роўна, паспешна — часам станавіўся, пязграбна ляскаючы буферамі, стаяў мінут дзесяць — пятнаццаць і зноў калупаўся памалу. Было супакойна ад таго, што так спраўна ідзе поезд, што не стаіць, як іншы раз, па колькі гадзін. А Яўмену супакойна было яшчэ й ад таго, што быў не адзін ён ужо, што быў з ім другі чалавек — чужы, але блізкі ўжо, якому можна ўсё гаварыць, які слухае й спачувае.

Калі ж заўважыў Яўмен, што дзяўчына дрыжыць ад прадсоннага холаду, ён сагнуўся й расчысціў над памостам месца сярод мяшкоў і рознага смецця.

— Ляж, трохі засні!..

— А вы?

— Я ўжо спаў, пасяджу...

Дзяўчына лягла, да мяшкоў прытулілася, быццам хацела сагрэцца ад іх. Здалася Яўмену яна маленькай зусім — чыстым дзіцёнкам. І зацяплілася ў сэрцы ў яго ціхая жаласць, пяшчота... Ад таго, што ляжала яна, а ёп сядзеў і нібы сцярог яе сон, пачуў ён, што ткі сапраўды ёсць паміж іх нешта блізкае, што яна ўжо свая яму, родная — гэта выпадковая падарожніца.

Дзяўчына ж не спала яшчэ. Яна раптам узнялася і праказала нейкім новым, цяжкім, быццам чужым голасам:

— Тут ёсць яшчэ месца, дзе легчы... Вам можна таксама...

І тады так проста зусім, патуральна адбылося тое, што ёсць найвялікшая тайнасць жыцця, найвялікшая радасць і боль...

Як пачаў цалаваць Яўмен дзяўчыну, яна не баранілася. Яна раптам заплакала ў яго на грудзёх. У плачы гэтым чуў Яўмен глыбокі давер да сябе, чуў, што й яго ліча не за чужога...

Засыпаючы потым у цеплыні шчыльна сціснутых цел, Яўмен па момант успомніў:

«Раніцой будуць смяяцца...»

Але не схапянуўся, не ўстаў.

«Хай сабе. Усё роўна...»

І заснуў моцна, спакойна...

3

За пераплётам рэек распласталася пожня, а за пожняй кудлаціўся жоўты лясок, чэзлы і рэдкі, тыповы лясок пры чыгуначнай станцыі. На ўзлессі раскінуўся стан пасажыраў, што чакалі чарговага поезда. Сярод жылаватых пакалечаных кустоў крушыніку дзе-шідзе цьмелі вогнішчы. Ад іх асцярожна ўзнімаўся сінявы дымок і прытоена віўся празрыстымі ўніткамі паміж убранага золатам вецця, быццам краўся, хацеў праслізнуць неўзаметку ўгару і там палунаць над макушкамі дрэў — на прасторы, на волі сцюдзёна-чыстага рання.

Па кустах там і сям, больш каля вогнішча, паўтыркаліся людзі — звіліся клубочкамі шэрымі, прытуліліся адзін к аднаму, каб хоць троху сагрэцца, хоць троху прагнаць перадранішні холад. Некаторыя гаманілі, апавядалі адзін аднаму бясконцыя свае апавяданні, якія могуць радзіцца толькі ў далёкай маруднай дарозе, калі ўжо страцілася вострасць чакання канца, калі ўжо ўсё роўна: ехаць ці так вось сядзець у кустах ля чужой незнаёмай станцыі, у чужой далёкай краіне...

Яўмен з свайго таварышкай перабраўся скрозь гэты стан падарожнікаў і ўглыбіўся ў рэдкі, хударлявы лясок, які, аднак, пацягнуўся і пацягнуўся бясконца, то адкрываючы на момант прасветы наперадзе, то зноў затуляючы іх.

Пад нагамі мякка ўгінаўся волкі дыван свежаасыпаных лісцяў. Ціхі шэпат насіўся наўкола — шэпат, поўны глыбокага нейкага жалю, поўны хаўтурнай урачыстасці. Ад гэтага шэпату, ад цішыні паважнай, старожкай адчуваў чалавек сябе ціха і чыста, адчуваў самотнасць глыбокую, быццам стаяў, вылучаны ад усіх і ўсяго, перад строгім пільным поглядам прыроды — адзін прад светам усім.

Яўмен ішоў, не азіраючыся, не гледзячы на сваю падарожніцу, быццам забыўся зусім на яе. Глядзеў проста перад сабой у пазалотку бліскучую дрэў і думаў аб тым, як гэта добра ўвосень быць у лесе, як прыемна дыхаць волкім паветрам, у якім цяпер асабліва моцна пахне зямлёй, пахне даўным і родным.

Нарэшце выйшлі яны на невялічкую палянку, роўна абкружаную залатымі карункамі дрэў і кустоў. У гэты момант слізнулі па лесе першыя густа-чырвопыя косы ўзышоўшага сонца. Яны пралезлі праз рэдкае вецце і дрыготна рассыпаліся па палянцы — выбралі месца сабе, каб

пакачацца па мяккаму дывану, каб памыцца спрасонку ў халоднай расе.

Яўмен спыніўся, паставіў на дол сваю ношку, зірнуў радасна на гульню рапняга сонейка, на харaство вакол незвычайнае і давольна ўсміхнуўся. Потым перавёў погляд на дзяўчыну, глядзеў на яе з глыбокай пяшчотай, з добрай, ветлай усмешкай на твары.

Дзяўчына ў адказ яму тож усміхнулася. Нешта між іх праляцела — лёгкае, светлае: можа, ружовая радасць сяброўства, можа, прамень кахання ўзаемнага. Не зводзячы светлых вачэй з твару дзяўчыны, паклаў Яўмен на плячо ёй руку і сказаў:

— Давай, жонка, сядзем ды адпачнём.

І ад нечаканасці сам заліўся радасным смехам, страсянуў смелым, гуллівым рогатам урачыстую ціш рапняга лесу.

Селі тут жа ўдваіх на зямлю, пад крушынавы куст, які акрапіў іх сцюдзёнымі пырскамі чыстай расы.

Яўмен глядзеў на дзяўчыну, на нечаканую жонку сваю. Яе абліло цяпер сонца цёплаю чырванню — вочы яе сталі глыбокімі, а ўсмешка таемнай і млявай. Яўмену прыемна стала, што яна — дзяўчына ніштo, што ў іншых жонкі ёсць куды горшыя. І за тое, што яна не благая, захацеў Яўмен нешта такое сказаць, каб і ёй прыемна было, каб было радасна. Але дзе ж гэта знойдзеш словы такія!..

Тады сарваў нейкую пажоўклую кветку і, жартуючы, кінуў у твар ёй. Яна засмяялася неяк проста, зусім падзіцячаму. Шчыра, весела засмяялася.

Пачалі тады цалавацца...

. . . . . .

Сонца лезла вышэй ды вышэй — паплыло ўжо над верхавінамі дрэў, усё абсушыла, абцёрла і ўсё прыгрэла сваёй дабрадушнай цеплю.

Яўмен спаў на палянцы, раскінуўшы рукі і ногі, адкрыўшы для сонца свої рыжы, даўно ўжо няголены твар. Над тварам круцілася асенняя муха, выбіраючы месца, дзе сесці. Калі садзілася ды кусала, Яўмен пачынаў корчыць міны, падміргваць. Муха злятала і зноў выбірала месца, дзе сесці. А потым муху прагнала дзяўчына, села каля Яўмена і пачала перабіраць грыбы, што набрала толькі што ў лесе. Перабіраючы, кідала ўсё поглядам па Яўменаў твар і ўсміхалася нечага хітравата-ласкавай усмешкай.

Як перабрала грыбы, дзяўчына яшчэ забаўлялася тро-

ху, казытаючы твар Яўмену былінкай, а потым ужо разбудзіла яго. Як будзіла, пільна сачыла за тварам, каб убачыць, што адаб'ецца на ім, калі ўбачыць яе спрасонку.

Яўмен убачыў яе і ўсміхнуўся з млявай давольнасцю.

— Ты ўжо не спіш?

— Я даўно прачнулася. Бачыш, грыбоў назбірала — будзем пячы.

— О, ты ўжо бярэшся за гаспадарку?

— А як жа... Уставаі цяпло раскладаць.

Яўмен устаў, пачаў збіраць сухое галлё. Збіраў мадрына, спаквапя. Знаў, што спяшацца няма куды, што дзень вялікі яшчэ, што наогул усё з сабоі у яго, што цікава, патрэбна яму. Часамі падымаючы якую галіну, ён раптам на паўдарозе спыняўся і застываў на колькі хвілін, быццам заўважыў што або працяўся нейкаі раптоўнаі думкаі. А думкі ў яго не было аніякаі, гэта ён прыслухоўваўся проста да таго, прыемнага, што грэлася ў сэрцы, да сакавітага, радаснага жыцця сваіго. А то дык кідаў у вакольныя дрэвы ўсё, што набраў, кідаў з нейкім імпэтам, з гулліваю сілаі. Тады дзяўчына спыняла яго, смеючыся:

— Што ты? Калі ж ты цяпло раскладзеш?

Нарэшце ён назбіраў, пачаў раскладаць. Яна памагала яму. Часамі дым лез ёі у вочы, і яна смешна так адкідалася ўбок, кулакамі тручы сабе твар. Яўмену гэта падабалася. Ён смяяўся мацпеі, чым трэба, і потым неўзаметку махаў рукоі так, каб зноў падаўся дым да яе.

...Калісьці ў дзяцінстве — было яму гадоў дзесяць тады — ён пасвіў коні з адноі дзяўчынкаі. Так неяк трапілася, што вялі яны ў адно месца і толькі ўдваіх. І тады ён дражніўся з дзяўчынкаі тоі, таксама ў вочы ганяючы дым. І яшчэ ён ёі назаляў адноі песняі пра качку (качкаі дражнілі яе). А з дзяўчынкаі тоі дужа дружыў і марыў, што калі вырасце, дык з ёі ажэніцца...

Гэта чамусьці ўспомніў цяпер Яўмен. А з гэтым разам хлынула цэлае мора даўпага, салодка-шчымлівага. І чамусьці зноў, як тады ў вагоне, ракітавы куст над люстраным Дняпром, і жалуды, і буры разложысты дуб... І зноў тоі ласкавы тонкі напеў:

...Пад ракі-і-таю-ю зялё-о-о-наі
Салдат ра-а-нены ляжа-аў...

Тады раптам уздумаў пра калецтва сваё. Апаў адразу настроі, нешта горкае на нутру разлілося — балюча ста-

ла і крыўдна. На дзяўчыну зірнуў з нейкай апаскай, з трывогай.

«Як я забыўся... Гэта ж калека я...»

Дзяўчына заўважыла яго смутак.

— Чаго прызаўныў?..

— Ат! Нічога...

Дзе ж ён скажа ёй!.. Хай сабе. Ён і адзін пражыве. Такі ўжо лёс яго, калекі бязногага... А яна зусім прыгожая, здаровая... О, яна можа знайсці сабе мужа... Такую возьме хто хоця...

Моўчкі клаў грыбы ў гарачы прысак, моўчкі варочаў іх. Сядзеў, пахіліўшы галаву, не думаў ні аб чым, бо думкі ўсё йшлі непрыемныя — наўмысля гнаў іх вон з галавы. А дзяўчына ўсё прыставала:

— Што з табой стала? Чаго ты раскіс?..

Тады адказаў з крыўдай у голасе, з недавольствам нейкім панурым, упартым:

— Што табе? Усё роўна не жыць нам з табой...

— Што ты нешта гаворыш такое?

— А вось і такое... Бязногі я — ты не бачыш, ці што.

Цяпер ужо дзяўчына вусны надула, праказала з крыўдай і з нейкай сярдзітай сур'ёзнасцю:

— Мне нічога не трэба...

Сядзелі пасля таго моўчкі мінут з дзесяць — не глядзелі адзін на аднаго. Пакуль не сказала дзяўчына, усё яшчэ скрозь надутыя вусны:

— Грыбы ўжо паспелі...

Ад гэтых простых слоў раптам разляцеўся смутак у абодвух. Яўмен размашыста ляпнуў яе па плячах.

— Эт, нічаво! Пражывём, жонка...

І абодва шчыра смяяліся...

4

Упацёмку лес нібы гусцейшы зрабіўся, бо на кожным кроку натыкаліся то на куст, то на дрэва, то на карчавіну якую. А часамі дык проста здавалася, што гэта наўмысля дрэвы становяцца ім на дарозе, каб затрымаць, каб не даць папасці на поезд.

Яўмен колькі разоў ледзь не валіўся, дзеравяшка ў лесе ўначы ды ў цёмную без месяца ноч — вельмі нязручная штука. Ён ўзяў у адну руку клумак, а другой трымаўся за руку дзяўчыны і кавыляў, як мага, як сілы хапала.

— Яшчэ, можа, справімся... Гудок ён даў ля семафору,

пакуль падышоў, ды стаяць будзе, пэўна, не менш, як дваццаць хвілін...

Цяжка Яўмену гаварыць ідучы. Але і маўчаць — цемра, бязлюддзе, чорная цішыня... жудасна троху... Як не гаворыш, здаецца, што нехта чужы гэта йдзе з табоій і руку трымаеш як не руку, а неїкую рэч — чужую, дзіўную. У цемры маўчанка заўсёды родзіць самоту, цемра заўсёды ўсё пераїначыць. Таму гаварыў Яўмен безупынку, часамі пытанні даваў, каб пачуць яе голас.

— Вось... Паедзем у N — там купім белай мукі... Муку добра везці туды, пад Маскву... А там мануфактуры... А да сваіх ты пакуль што не паедзеш, пасля хіба, як троху заробім... га? Як ты на гэта?

Яна згаджалася. Ёй — усё роўна... Абы каб разам. Удвух не загінуць підзе...

— Куды ж толькі поезд гэты стаіць?.. Можа, й на ветку... Казалі, адзін яшчэ павінен пайсці. Добра, каб так... а то кругам, вёрст трыста лішніх, калі не больш... Апошні поезд, казалі, пойдзе сягоння ці заўтра...

Праз дрэвы бліснулі агапькі. Радасна стала — лесу канец. Праз поле — крокаў сто — і на станцыі...

Яшчэ здалёку пачуўся рой галасоў — крык, гвалт, зрэдку — смех, дысанансам у агульнай гармоніі. І неяк далёка, далей за ўсіх гэтых гукаў — песня салдацкая. Пэўна, у вагоне ў зачыненым, таму так слаба й чуваць.

Яшчэ перабегчы праз рэйкі, што сетку запасных пуцей... Каб жа паспець...

Але што ж там... Гудка не было, ды цяпер парадак такі: і гудок дасць, а потым стаіць...

Вось стрэлачнік.

— Гэта куды стаіць поезд?

— На ветку...

— Чуеш, жонка? Шчасціць нам, з табоій, дадушы... На ветку поезд стаіць...

А вось і поезд. І толькі ўбачылі — адразу радасць прапала. З абодвух бакоў на колькі сажняў суцэльны натоўп. Ля дзвярэй цяплушак у цемры тузаюцца з лаяшкай, з крыкам, з прарэзлівым енкам... Калі праходзіць кандуктар, у свеце яго ліхтара на момант пакажуцца, як фантастычныя неїкія здані, фігуры людзеї. Карожацца, лезучы ў дзверы, адзін на адным стаповяцца, лезуць адзін цераз адпаго. Відаць сілуэты няяспыя і на крышах і на буферах — усюды, дзе толькі зпоїдзе нага кавалак станоўкага грунту.

Яўмен пачуў, як палахліва прыціснулася да яго дзяўчына. Быццам абароны шукала ад адпас толькі карціны такога страхоцця. Дый ён сам не лепш сябе адчуваў.

Але прайшло першае ўражанне, і з'явілася аднекуль надзея. Надзея радзіла адвагу, адвага расла, прымушала мазгі ліхаманкава працаваць, шукаць нейкага спосабу. Спосабу не было, але адвага не прападала. Япа набывала сілу адчаю, сілу, якая штурхпе на што хоця, якая ў маленькай магчымасці знойдзе заўсёды патрэбнае жыццё.

Паказаўся кандуктар — безуважны, спакойны. На хаду ліхтар у яго то пакажа твар свой сыта-бліскучы, то схавае ў цемру. Быццам дражніцца, спакойны і за сябе і за сваіго гаспадара. Быццам кажа ў тахт сваіму боўтанню:

— Вы дык турбуецеся, а мы дык не... Вы, можа, ї не паедзеце, а мы дык паедзем...

Яўмен убачыў кандуктара і да яго рвануўся:

— Таварыш кандуктар! Я не магу астаавацца. Я — інвалід, мне няма чаго есці тут.

— Там ззаду чырвонаармейцы... Прасіцеся ў іх...

Адказаў, быццам і не ў яго гэта пыталіся, быццам і не ён гэта адказаў... І пайшоў з ліхтаром сваім — безуважны, спакойны.

А Яўмену цяпер усё стала простым, звычайным зусім. Там у канцы поезда едуць армейцы — яны безумоўна возьмуць яго. І паедзе, і не будзе тут у глушы чакаць невядома чаго.

Як усё гэта добра выходзіць!..

Якраз у гэты момант прабляяў два разы станцыйны званок.

— Ну, угрунь!..

І, бегучы, спатыкаючыся, усё гаварыў на хаду, скрозь распалепае бегам дыханне:

— Ну... вось бачыш... і не астанемся... паедзем... бач... шанцуе нам... Дзе ж гэта?.. Тут... павінна ўжо тут...

Міналі адзін за адным чорныя, калматыя ад цемры вагоны, каля некаторых спыняліся, прабавалі цягнуць за ручкі дзвярэй.

Усе пазачыняты, усе пазабіты. Нават пломбу намацаў Яўмен на адным.

— Пэўна, з грузам... дзе ж гэта... можа... схлусіў кандуктар...

Раптам нага Яўменава правалілася ў нейкую ямку,

і ён з разгону рынуўся долу. Пачуў пад сабою зямлю і здагадаўся, што гэта копчылася платформа.

— Асцярожна... Прыступка тут, не зваліся...

А самому заплакаць хацелася. Ад болю і крыўды...

Праз момант пачуўся гоман і бліснула шырокая паласа свету.

Вагон з людзьмі. Дзверы адчынены насцяжа... Так... свае... чырвонаармейцы...

— Блям... Блям... Блям...

— Хутчэй, хутчэй... Братцы, вазьміце... Інвалід я... з фронту... Пусціце, браточкі...

З вагона дыхнула цёплым пахам казармы. Вясёлы смех, галасы... знаёмае, роднае...

— Братцы, пусціце... Кранецца...

Ніхто дужа не пярэчыў, і таму Яўмен, больш не просячы, укінуў адзін за адным свае і дзяўчыніны клункі... Потым схапіў на рукі дзяўчыну, схапіў, як дзіцё, і ўсадзіў у дзверы. З дружным смехам яе падхапілі армейцы, уцягнулі ў вагон.

Тады аднекуль здалёк — сперш ледзь чутны — прыляцеў перабор буфераў — агідны, скрыготлівы, жорсткі. Гэта крануўся поезд.

Яўмен трымаўся за ручку дзвярэй і йшоў разам з поездам, падскакваючы, з усіх сіл адпіхваючыся ад зямлі, каб ускочыць у вагон.

Праклятая дзеравяшка!

Нехта крыкнуў з вагона:

— Руку давай! Давай руку!..

Ён працягнуў вольную руку, але не ўспелі яе ўхапіць, як поезд раптам ірвануўся, і Яўмен, адарваўшыся, упаў на зямлю.

Пакуль ён узняўся, светлыя дзверы вагона былі ўжо больш як на сажань наперадзе. Нешта ёкнула ў сэрцы, слёзы падкаціліся к горлу, пачуў сябе няшчасным, пакрыўджаным. Але сціснуўшы зубы ад злосці і плачу, ад непамернай балючай патугі, пабег даганяць... Дагнаў. Некаторы час бег поруч з дзвярыма, прымяраўся, як бы схапіцца за што ды ўскочыць, але не ўдавалася. Ад крыўды і злосці, здаецца, нутро ўсё кіпела. І міжвольна вырваўся з горла пямы здушаны стогн — нават не стогн, а нейкі звярыны бяссільны ёкат...

А ў вагоне хто смяяўся, хто крычаў на ўсё горла:

— Паддай, паддай!.. Смялей... Ну-ну-ну... Яшчэ трошку...

Светлы квадрат дзвярэй падаўся наперад. Знаў Яўмен, што ўжо не дагоніць, не сядзе, а бег усё-ткі, быццам нешта цягнула, нешта прыкавала ланцугамі непарыўнымі і не адпускала ад гэтых светлых шырокіх дзвярэй...

Зірнуць жа туды, на яе... Вунь яна, нахілілася, нешта крычыць... Вунь яна, вунь...

І, як убачыў яе, зразумеў раптам, адчуў усёй істотай сваёй:

— Гэта ж астаўся... Назаўсёды... Апошні поезд... Як жа так?.. Што ж цяпер?..

І працяло малапкаї мазгі, што нешта трэба сказаць, нешта спытаць... Ля што— не было часу абдумаць. І невядома чаму, для чаго — закрычаў раптам збяптэжаным голасам:

— Як завуць?.. Скажы, як...

І не кончыў. Калепкамі ўдарыўся ў нешта цвёрдае, вострае і паляцеў на памост. Гэта было тое, добра знаёмае месца, гэта пачыналася станцыйпая платформа.

Як валіўся, здалося, што быццам пачулася скрозь ляскат поезда:

— Надзея!

А можа, гэта толькі здалося?

І тады заплакаў Яўмен, зарумзаў уголас, як малое дзіцё. Разам злучалася ўсё: і фізічпая боль, і крыўда, і жаль...

Сядзеў на брудным памосце платформы і плакаў...

Уваччу востра, выразна стаяў вобраз дзяўчыны, «жонкі» яго, з якой так лёгка прыйшлося сустрэцца і так балюча, горка расстацца...

А там яшчэ ляскаў, дражпіўся поезд. Здаецца, не ішоў, не каціўся, а танцаваў, рады, што кінуў тут чалавека, што лакпіў над калекаї бязногім.

— Такх-тах... та-та-тах... Тах-тах... та-та-тах...

І яшчэ нават падміргваў зялёным прыжмураным вокам.

ДВОЕ ЖВІРОЎСКІХ

1

Жвіроўскі-бацька і Жвіроўскі-сын.

У Жвіроўскага-бацькі пос высах ад рашняе старасці, і на твары, шызым ад куца падстрыжанай шэрсці, ён выдаецца навіслым карчом, пераплеценым сінімі жылкамі-пруццем. На самым канцы заўсёды трасецца бліскучая кропля.

У Жвіроўскага-сына нос не высах — завастрыўся ад ранняй дзіцячай гароты, ад думак цяжкіх, недзіцячых. На сінім змарнелым тварыку ён выдаецца недалужнаўзнятай птушынаю дзюбкай. І не кропля, а заўсёды падцёкі пад носам. І не трасуцца, а плывуць з настоінаі павольпасцю.

Жывуць Жвіроўскія на Завальным завулку ў тоі старэнькай хацёнцы, што слепа касурыцца вокам крывым з карузлага брудпага садзіку, што ўзляглася трухлявым тулавам на кастылі — падпоркі лабатыя.

У хацёнцы адзін цямнявы пакой, у пакоі — цямнявым і брудным — раскіданы роілам рэчы, грамоздзяць пакоіі непрытульным халодпым бязладдзем. На бруднаі, гадамі пямытаі падлозе стаіць і ляжыць такое пачыпне:

гарнушкі для стравы, апоркі, падтопа, чайнік, труба набітая ад грамафопа, споп спарахнелаі саломы, цэбар, конь паломапы (цацка), розпае смецце.

Чапяла, вілкі і качарга стаяць, дружпа стуліўшыся, у чорным кутку каля печы.

У гэтым пакоі праходзіць-паўзе жыццё двух Жвіроўскіх: Жвіроўскага-бацькі і Жвіроўскага-сына.

Калісьці даўней (і цяпер таксама, але ў думках толькі тумапна-цягучых Жвіроўскага-бацькі) было іпачаі, было так...

На сурдуце — бліскучыя гузікі, на шапцы — кукарда. У гузіках і кукардзе ідзеш па завулку з асаблівай паважпасцю, бо суседзі назіраюць з пашапай, бо ў сустрэчных твары палахліва сур'ёзяцца або растаюць ветлаі усмешкай. Так ідзеш, бывала, са службы. А дома прыстойнаі

і гладкай плынню цячэ сямейнае шчасце. Жонка — руплівая, слухмяная гаспадыня, ціхія, далікатныя дзеці, канапа мяккая. І грамафон пасля полудня, задорна-вісклівы ёкат — рамансы Вяльцаваї.

А мо і не было гэтага? Мо гэта старчыя сны толькі турбуюць путро малюнкамі некімі? Памяць у Жвіроўскага-бацькі ўжо высыхае, памяць дрэнна ўжо служыць. Сціраюцца межы-граніцы паміж успамінаў жывых і туманна-ружовых мар-летуценняў.

Ці было, ці не было... Ці бачыў, ці сніў...

Добра помніцца во што.

Стаў непарадак. Непарадак гэты звалі словам, якое палохала сваёй страшэннай навізной, сваёй жудаснай незразумеласцю. Слова — рэвалюцыя. Непарадак адабраў у Жвіроўскага жонку, канапу, Вяльцаву і бліскучыя гузікі. Асталася хацёнка трухлявая на Завальным завулку і асталася навекі ўнутры турботна едкая злосць.

А непарадак астоіўся ў новы парадак — у дзіўны, чужы. Асеў гэты новы парадак, разгарнуўся чужым сумятлівым жыццём, сціснуў Жвіроўскіх у хатцы старэнькай, у непритульным брудным пакоі.

Так і жывуць. Трудна сказаць, адкуль дастае стары Жвіроўскі сабе і сыну свайму на пражытак. Мабыць, яшчэ прадае, што дасюль не прададзена?

Раніцой, толькі золак засцеле цьмянаї сівізною воклны, Жвіроўскі-бацька пачынае бубнець, гутарыць з сынам. Ён добра ведае, што сын не слухае, што сын яшчэ соладка спіць, але ўсё роўна гаворыць — цягне цяжкім аднатонным голасам, вядзе бясконцую гутарку, навучае сына, як трэба жыць, як сцерагчыся нядобрых людзей, як ладзіць з начальствам, са старэйшымі.

О, Жвіроўскі прайшоў дасканала навуку жыцця! Ён цяпер ведае усё, і ён не дапусціць, каб сын яго трапіў на нядобрую сцежку, не дапусціць, каб ён спазнаўся са злымі людзьмі і паддаўся іх ашукапству. Ого, ім толькі гэтага і трэба, яны толькі і чакаюць, каб узбіўся які неразумны хлапец, каб ашукаць яго, адабраць апошні грош, сарочку з цела садраць. О, трэба ўмець, як з імі жыць, абыходзіцца. Стары Жвіроўскі век пражыў, ведае ўсё.

І гаворыць-гаворыць бясконца Жвіроўскі. І вусны яго, аброслыя куца падстрыжанаї шэрсцю, крыва шаволяцца, тонка падцягваюцца тасмнаї едкаї усмешкаї.

Гаворачы, ён падтапляе печку, чысціць бульбу, гатуе

сняданне. Потым будзіць сына. Каб разбудзіць, ён не аклікае яго, не кратае, а толькі мацнсії заводзіць гаворку. У сына тады пачынаюць блытацца, сплятацца ў адну недарэчную муць з'явы дзівоспыя сну з шэрымі зрыўкамі вобразаў-думак, роджаных бацькавай гутаркай. Але нарэшце бацька нешта пытаецца. Сын толькі чуе апошняе:

— Га?

І, расплюшчыўшы вочы, дапытліва глядзіць на бацьку шырокім нерухомым поглядам.

Бацька заводзіць сваю бясконцую гутарку. Сын млява пацягваецца і апранаецца.

Так пачынаецца дзень двух Жвіроўскіх.

Удзень сына няма — ён ходзіць у школу. Удзень Жвіроўскаму-бацьку няма з кім гутарыць, і ад гэтага цяжка стаўпляецца злосць унутры і не сядзіцца на месцы. Тады Жвіроўскі пачынае гаспадарыць. Ён здзявае сваю старую паддзёўку і садзіць на нос акуляры. Ён кожны дзень правіць паддзёўку і кожны дзень знаходзіць у ёй новыя дзіркі. Такі ўжо парадак.

І яшчэ ёсць работа ў Жвіроўскага. У фанернай скрыцы з-пад мыла складзена вопратка. Там, на саменькім дне, пад кучай рознага рыззя, ляжыць тужурка з бліскучымі гузікамі. Жвіроўскі часамі яе выцягвае і сядзіць над ёй гадзінамі цэлымі, шукае раней незаўважаных дзірачак, старанна іх зашывае, загладжвае. А то яшчэ возьме анучку і чысціць бліскучыя гузікі. Ад чыстага бляску іх у Жвіроўскага плавае мокрая ўсмешка на вуснах і масляцца вочы ўбогай давольнасцю.

Над тужуркай Жвіроўскі ўспамінае. Над тужуркай у тумане старых вачэй пасцілаюцца некыя ўзоры мінулага, і ў іх так прыемна, так соладка распускаецца жорсткі ком засохлай свядомасці.

І гладзіць тады Жвіроўскі тужурку, з пяшчотай гладзіць, з ласкай, быццам прад ім жывое стварэнне — роднае і блізкае.

І тады сціраюцца межы-граніцы паміж успамінаў жывых і туманна-ружовых мар-летуценняў.

І невядома тады:

Ці было, ці не было. Ці бачыў, ці сніў...

А трэцяй гадзіне (роўна а трэцяй) прыходзіць са школы сын. Палудноуюць моўчкі. Бацька жыдка віхлясты погляд упінае ў міску і адпамерна, размашыста чмякае.

А сын есць марудна, спыняецца. Яго скруглёны дзіцячымі марамі погляд — туды, за акно, палунаў, распусціўся ў бялясым прасцягу свежага дня.

Мо гэты прасцяг кліча яго да сябе, у сваё шырокае, вольнае ўлонне? А мо змарыўся проста хлапец, дык нязмога павесці вачмі, адарвацца ад светлае плямы акна...

Пасля полудня бацька крэкча, бурчыць і кладзецца на ложак. Сын прыбірае стол, раскладае кнігі і сшыткі і вучыць лекцыі. У пакоі тады плыве нудпан патокан ціша (бацька, як спіць, не храпе), і, як хвалькі гэтаі цішы, шалясцяць маўклівыя кніжкі ў руках Жвіроўскага-сына.

У час пасля полудня, калі так глуха звісае навокал ціша, калі асцярожны бацькаўскі посвіст сноуе мяккую пялёнку спакою, Жвіроўскі-сын аддаецца сваім дзіцячым думкам-развагам. Гэты час здаецца яму нечым празрыстым і вязкім, нейкаі шырокаі густоі паласоі, у якоі так павольна і мякка купаюцца вобразы-думкі, у якоі сам увесь расплываешся, пераліваешся ў плаўна-цягучыя мары.

Кніжкі спакоіна ляжаць на стале. Пальцы мякка цярэбяць старонкі. А вочы — застыглыя, ціхія — плывуць сваім бляскам празрыстым туды, за акно, дзе шырокі прасцяг, дзе халодна-глыбокія свежыя далі.

Аб чым можа думаць, аб чым можа марыць хлапец у дванаццаць гадоў? От, сцелюцца і сцелюцца смелыя вобразы, пішуцца фарбаі шырокаі малюнкі жыцця нязнанага, чароўнага сваёі глыбокаі нязбытнасцю.

Ён ужо вандраўнік, ужо бродзіць па дзікіх гушчарах адвечных лясоў, жыве сярод лютых звяроў, вядзе з імі бойку. Вось ужо з тыграм лютым сустрэўся. Ашчэрыўся страшны раз'юшаны звер, выгінаецца гібкім спружынавым целам, во-во гатоў кінуцца. Але ж у яго добрая спадзеіная стрэльба ў руках. Стрэл — і валіцца звер, недалужна рычыць, аблівае крывёі расліны зялёныя.

І ўздыхае вольна Жвіроўскі-сын, быццам сапраўды мінуў небяспеку і, зморшчыўшыся, выцірае пад носам назоіліві падцёкі.

Потым — ён правадыр, вядзе за сабоі мільёны паўстанцаў. Ён абуджан страшэннаі адвагаі, ён цвёрды, як камень, яго ўсе слухаюць, ён аддае мудрыя загады, іх выпаўняюць з маўкліваі павагаі. І вось — боі. Льецца кроў, грымяць гарматы, прылятаюць на коніх з даносамі,

ён сам на капі, на гарачым, буяным стаеніку. Вось націскаюць ворагі, сярод паўстанцаў спалох, сумятня. Ён кідасцца наперад, сам уразаецца ў гушчу ворага. Усе смялеюць, запаляюцца адвагаі, усе за ім, у апошнюю напружаную бойку.

І — перамога.

І зноў вольна ўздыхае Жвіроўскі-сын, зноў выцірае надцёкі.

І чуе, як суха кашляе бацька на ложку, як варочасцца, крэкча.

Вымятаюцца ўраз палахлівыя мары, пальцы нервова хапаюць за кніжку. На твары нуда расплываецца кіслая грымасаі.

Пачынаецца вечар.

Увечары будзе самае прыкрае. Будзе бацька лекцыі чытаць, будзе глядзець жорсткім чакаючым поглядам, папраўляць па кніжцы суха і рэзка. І будзе гаварыць яшчэ, назіраючы на сына з апаскаі затоенаі, што ў кніжцы пішацца так, а сапраўды вось так, што напісалі кніжку бальшавікі, што не трэба ім верыць, а гаварыць усюды трэба, што верыш... І будзе чакаць тады сын, калі ў бацькі твар затрасецца ад злосці на гэтых бальшавікоў і замітусяцца жыдкімі вострымі аганькамі цьмяныя вочы. Будзе чакаць, бо знае, што тады прычэпіцца бацька к яму і балюча будзе цягаць за вушы.

А кончыцца вечар доўгім дакучным малеянем. Будуць стаяць поплеч у змрочнай чырвані лампадкі двое Жвіроўскіх. І будзе сын, шаволячы вуснамі, назіраць скоса на бацьку, будзе думаць аб тым: чаму гэта бацька, як моліцца, дык падцягвае вусны і непрыемна так шчэрыцца, быццам усміхаецца нечага едка і прыкра.

І будзе чакаць, назяхаючы, сын, ці скора бацька кончыць маленне, каб легчы хутчэй і яшчэ хоць трошкі, хоць наўгадзінкі памарыць.

2

Бывае так, што адна і тая самая думка гадуецца доўга ў двух чалавек — уцішку, затоена — і баіцца, не важыцца кожны сказаць другому аб ёй, заціскае яе ў самы глыбокі куток істоты свае, бераже, як патаемную неіякую схову.

І бывае потым, што думка гэта раптам сама па сабе выслізгае напаверх і робіцца простай, звычаінаі. Бывае

тады адзін момант, што звязвае думка гэта двух чалавек блізкасцю шчыраї, сагравае цёплаї сяброўскаї лучнасцю.

Бывае гэты момант прыгожы і шчасны.

Так гадавалася думка адна ў двух Жвіроўскіх.

Маладое сэрца Жвіроўскага-сына на волю рвалася. Душыў шэры гнёт жыцця нуднага, жыцця тупога і вузкага, як сляпая нара. Нязбытныя мары — далёкія, як небасхіл, як ружовыя цені вячэрняй зары, цягнулі некуды, пенілі ў сэрцы дзіцячым шчымлівыя няясныя парывані.

Нязбытныя мары, далёкія... Яны толькі акраса, толькі ружовы свет, у які можна на час акунуцца, каб аквяціць хоць у думках, хоць на момант адзін шэрасць жыцця.

А хочацца часам бліжэйшага нечага. Хочацца, каб у жыцці было трохі пярэстасці, каб не драўляная гэтая аднастайнасць заўсёды, штодня. Хочацца смеху, песень хоць трошкі. Каб вырвацца на часінку з-пад бацькаваї волі — цяжкаї, жалезнаї,— быць такім, як іншыя дзеці, як большасць дзяцей.

У школе Жвіроўскі ад усіх староніцца, у школе няма ў яго блізкіх сяброў. Прыйдзе і заб'ецца ў куток свої, стуліцца, сціснецца, як птушанё адзінотнае, і пазірае нясмела, водзіць спалохана востранькім носам, дзюбкаї птушынаї.

У школе заўсёды поўна жывога дзіцячага тлуму. Сплятаецца ў бязладдзе дружнае звон галасоў — смелых і рэзкіх, працятых свежым задорам дзяцінства вольнага.

Гоман, піск, смех, песні. І ўсё — абрыўкамі ўзмыўнымі, усё — выбухі, узлёты напорнаї бурлівасці маладога жыцця.

Жвіроўскаму тлум гэты сэрца сціскае. Жвіроўскаму ён спакуса вечная — цяжкая невымоўная спакуса. Часамі ледзьве стрымаецца, каб не ўбіцца ў гурму дзяцей, каб не зліць свої ціхенькі слабенькі голас з гэтаї пярэстаї жывої сумятнёї. Хочацца ж і яму гэтага звону вясёлага. Хочацца ж і яму хоць трошачкі смеху, хоць трошачкі песень. І падмывае пешта ўнутры, і цяжка ўседзець на месцы — у куточку сваім. І тады сэрца даўка сціскаецца, а ў востра ўзнятым носе, у дзюбцы птушынаї пачынае шчыпаць пешта, выціскаць на вочы балючыя слёзы.

Тады скрозь зацятую злосць, скрозь шчымлівую боль унутры праразаюцца жорсткім рыпеннем сухія бацькавы словы:

— Трымайся сам па сабе, не зводзься ні з кім, кампанія да дабра не давядзе. Сыдзешся з імі, яны і падвядуць цябе, ашукаюць. Ім што, яны выкруцяцца, чыстымі выйдуць адусюль. А ты і ўліпнеш, як мухіна ў цеста. Не глядзі, што яны дружакі такія...

Разам з сухімі жорсткімі словамі выплывае злосны і едкі бацькаў твар, ашчэраны дзікай усмешкай-грымасай.

Страшна Жвіроўскаму, што бацька агідным здаецца, што злосць на яго мімаволі ўціскаецца ў сэрца. Гоніць тады, як мага гоніць вон з галавы спакусныя думкі, сілком прымушае сэрца радзіць пачуццё адданай пакорнасці. Шэпча настойна, упарта, каб заглушыць іншыя думкі, іншыя словы:

— Татачка... татачка... Даруй мне... Я буду слухаць... Я не буду крыўдзіць цябе...

І пецярпліва чакае, ахмелены тлумам, збяптэжаны роілам думак напружаных, каб хутчэй скончыліся заняткі, каб не было ўжо ні тлуму таго, ні звону дзіцячага, каб пабегчы, сціснуўшы сэрца, да бацькі і стуліцца ў порцы сваёй, забыцца на ўсё, толькі ўцішку, непрыметна для ўсіх пацяшаць сябе глыбока пязбытнымі марамі.

Думка тая прыйшла к Жвіроўскаму-сыну перш як далёкая палахлівая мара. Прыйшла ў той дзень, як было неўкае рэвалюцыйнае свята, як разам з бацькам хадзіў ён па вуліцы і з захапленнем углядаўся смаглымі вачыма ў чырвоныя сцягі, у бліскучыя трубы аркестраў, у стройныя рады людскога натоўпу, які піў нутром усім песні бадзёрыя — звонкія і шырокія, як бязмежны прастор.

Бацька бурчаў тады, але цішэй, як звычайна, і голас яго быў убогі, сіпучы — слабы ў злосці бяссільнай.

Сын тады бацьку не слухаў. Сын думаў сваё. Сын марыў аб нязбытным, аб немагчымым і разам такім простым, даступным, марыў аб чырвоным гальштуку.

О, каб знаў тады бацька сынавы думкі!

Вось з таго часу чырвоны гальштук закрасаваў увачу Жвіроўскага-сына, стаў яго таемнай мараі. Ужо ў час пасля полудня ён не брадзіў па дзікіх зараслях лесу адвечнага, не змагаўся са звярамі крывяжэрнымі, а з чырвоным гальштукам на шыі, з радасным боем у грудзях хадзіў у стройных радах піянераў, пад задорны ядраны гул барабанаў, пад бязмежна шырокія, вольныя спевы.

А з часам прыгледзеўся — і мара зрабілася думкаі, настойным намерам.

Толькі баяўся, пе важыўся сказаць аб ёй бацьку, хаваў яе ў самым глыбокім кутку істоты свае, бярог, як патаемную нейкую схову.

А ў Жвіроўскага-бацькі іначай было.

Жвіроўскі-бацька ўзгадаваў тую думку з болем, з шчымлівым турботным страхам.

Жвіроўскі-бацька думаў часамі аб долі сваіго сына, і яго старое счарсцвелае сэрца балюча знібела трывогаі. Трывога была чорная, поўная жудасці, бо цёмна было ўсё, губляліся думкі ў няясным, няведамым. Бо тое, што развівалася вакол, што абкружала новым, чужым,— толькі агульны тупы спалох нагаяла, сціскала колам варожым, у якім не бачыў стары Жвіроўскі выйсця, не знаходзіў месца сваіму слабенькаму сыну.

Знібела сэрца чорнай трывогаі, трывога пераходзіла ў страх. А страх звінаўся ў пэўную думку, і гэта жорсткая думка душыла путро сваёй цвёрдай, халоднай няўхільнасцю.

Загіне сын. Напэўна, загіне. Не хопіць сілы ў яго, каб знайсці сабе месца сярод сучаснага свету, у якім поўна бязбожных жулікаў, у якім на кожным кроку натрапіш на злоснікаў лютых.

Не знойдзе сын сабе месца, не... Загіне, напэўна...

А мо будзе іначай... Мо пойдзе сын на нядобры шлях, сам такім зробіцца, як усе тыя. Забудзецца і на бога і на бацьку, страціць сумленнасць.

О, гэта будзе самае горшае. Пры думцы аб гэтым у бацькі старога загараюцца вочы цьмяным злосным агнём і трасецца, віхляецца аброслы падстрыжанаі шэрсцю твар. А вусны падцягваюцца, крывяцца дзікаі усмешкаі-грымасаі.

Хаі лепш загіне, хаі лепш памрэ.

Калі гняце старога Жвіроўскага страх, калі шчыміць у сэрцы трывога за сына, ён пачынае маліцца.

Ён доўга стаіць тады на каленях, корчыцца, хліпае ў маленькім экстазе, плача без слёз. Слёз няма — старасць высушыла. Толькі сударгаі моршчыцца твар ды нейкі ком горла сціскае.

Просіць Жвіроўскі ў бога, каб навучыў, надавуміў, што з сынам рабіць.

Муляць калені худыя, ломіць сухая сярэдзіна, у ва-

чах пачынае дрыжаць цьмяны Езусаў твар. І мяшаецца шчыры малельны настрой з бяссільнаі старчаскаі злосцю. І плача ўжо, хліпае не ад гарачаі набожнаі чуласці, а ад гэтае злосці, едкаі, турботнаі.

А трывога не гіне. Трывога гняце, труціць сэрца. Быццам на сэрца капаюць нейкія кроплі гаручыя і ўпіваюцца, колюць, атрутную пену ўздымаюць.

Потым, сустрэўшыся з сынам, бацька Жвіроўскі доўга і ўпарта ўглядаецца, сочыць за ім насцярожаным вокам. Глядзіць, ці не ёсць у сыне змена якая, ці не прынёс з сабоі сын чаго новага адтуль, ад таго чужога, варожага. І некаторы час здаецца няшчырым, падроблены ціхі слухмяны погляд сына, здаецца, што ёсць ужо нешта ўнутры ў яго, толькі хавае ён, тоіцца.

Знаў, адчуваў сваім хваравітым інстынктам бацька Жвіроўскі, што калі-нікалі, а ўсё роўна ўбачыць ён у сыне сваім гэта страшнае, новае, чаго так баіцца ўбачыць. Знаў і дрыжаў і нецярпліва, настойна шукаў якога выйсця, шукаў спосабу ратаваць свайго сына.

Адразу спалохаўся быў Жвіроўскі-стары, як гэты спосаб мінуў у думках цепем пяясным. Хацеў адагнаць, знішчыць зародак дзікае думкі. Але мімаволі стаў расці, развівацца гэты зародак, і выросла думка — выразная, яспая.

З воўкам жыць — па-воўчаму выць.

Увесці самому сына ў іх хеўру. Увесці і павучыць, як «з воўкам жыць — па-воўчаму выць». Цяпер, пакуль жыў ён яшчэ, пакуль ёсць яшчэ сілы сякія-такія, ён здолее сына ўтрымаць у межах патрэбных, зможа прывучыць яго быць падвойным — у іх такім, як яны, а тут такім, якім хоча бацька бачыць яго, якім быў і астаўся сам бацька.

Няхаі сабе будзе там несумленным бязбожнікам — інчаі месца не знойдзе ў іхнім жыцці, інчаі загіне. А тут, уцішку, яны разам удвух будуць маліцца, будуць замальваць бога, каб прасціў ім абодвум гэты міжвольны грэх.

Выросла думка і захапіла істоту Жвіроўскага-бацькі. Спачатку страшэнная, дзікая — з часам стала простаі, звычайнаі, стала настойным намерам.

Толькі баяўся казаць аб ёй сыну. Баяўся, каб не падумаў тоі часам, што здаўся бацька стары, каб не зразумеў сын інчаі бацькаву думку.

І хаваў Жвіроўскі-бацька думку гэту ў самым глыбокім кутку істоты свае, бярог, як патаемную неўкую схову.

Быў у Жвіроўскіх адзін такі момант, калі ўзгадаваная кожным з іх думка раптам, сама па сабе, выслізнула наверх і для абодвух стала простай, звычайнай. І звязала гэтая думка двух чалавек блізкасцю шчырай, сагрэла цёплай сяброўскай лучнасцю.

Быў гэты момант прыгожы і шчасны.

Было гэта ўвечары. Жвіроўскі-сын згатаваў у аблезлым чайніку чай. У запэцканай мухамі пушцы з надпісам «какао Жорж-Борман» было два агрызкі цукру. Бацька і сын пілі чай з цукрам.

Ад чаю цяплынь расплывалася, сагравала такой мяккай прытульнасцю. Было ласкава на душы ў абодвух Жвіроўскіх, было цёпла на сэрцы. Бацька з сынам завялі ціхую гутарку. Сын апавядаў пра вучэнне, пра школу, пра настаўнікаў, бацька распытваў, цікавіўся. Бацька ўспамінаў даўнія-даўнія часы, калі ён вучыўся ў школе, калі і ён жыў такімі інтарэсамі.

У гутарцы сын памянуў піянераў. Між іншага неяк сказаў:

— Піянерам — тым добра. Яны ўсюды ходзяць, на сходках на розных бываюць, на гуртках. Яны больш чаго знаюць за іншых...

Бацька паволі паставіў на стол недапітае блюдца, выняў з рота недассаны кавалак цукру і спытаўся:

— А калі вышэй куды паступіць, ці лягчэй піянераў прымаюць?

— Вядома, лягчэй... А з піянераў у камсамольцы пераўядуць, дык камсамольцаў усюды першых прымаюць.

— А ў гуртках чаму навучаюць гэтых піянераў?

— Усяму. Ёсць спартыўны гурток. Гімнастыку робяць. Кажуць, мацней чалавек ад гэтага робіцца. Прыгожа так, калі начнуць выраблять розныя штукі.

Бацька задумаўся, змоўк. Сын таксама. Усплыло паміж імі нешта напятае, вострае і жывое, што вымагала выказу неўкага, што цяпер ужо, у гэты момант, не магло астацца затоеным.

Сын проста, нібы аб звычайнай якой дробнай справе, сказаў:

— Я б дужа хацеў паступіць у піянеры.

Ён не бачыў, што ў бацькі первова дрыжала ў гэту часінку шчака. Ён не глядзеў на бацьку, адвёў свой шырокі марудны погляд убок. Але чуў, што бацька не лаец-

ца, што не злуе нават. І яму было добра зусім, ён быў спакойны.

Тады бацька сказаў:

— Я ўжо троху думаў аб гэтым. Яно і праўда, не шкодзіла б.

І тож зусім проста выйшла ў яго, быццам гаварыў аб звычайнай якой дробнай справе.

У гэты момант, можа, больш, як калі, Жвіроўскі пачуў сваіго бацьку. Яго сэрца растапілася жаркай пяшчотай, хацелася ў гэты час прыгалубіць старога бацьку, пацалаваць у шызы, аброслы, падстрыжанай шэрсцю, зморшчаны твар.

Ён радасна бліскаў светлымі вачыма, заўзята шморгаў вострым носам, дзюбкай птушынай, і лапатаў жвава аб тым, як будзе добра яму, як будзе весела, калі ён паступіць у піянеры.

Бацька спыніў яго.

— Толькі во што, сынок. Паступаць ты паступай, але будзь асцярожны... Не паддавайся на іхнія штучкі. Глядзі, каб не ашукалі цябе.

І Жвіроўскі-бацька пачаў навучаць свайго сына, як трэба трымацца яму ў піянерах, як захаваць сумленнасць, пабожнасць сваю і г. д.

Жвіроўскі-бацька бурчаў, Жвіроўскі-сын не слухаў нічога. Яму ўсё роўна, ён згодзен на ўсё, будзе рабіць усё чыста, як бацька гаворыць.

У яго будзе чырвоны гальштук.

Ён будзе хадзіць у стройных радах пад дружныя песні, пад звонкі, задорны гул барабана.

Што яму больш яшчэ трэба?

3

Жвіроўскі-сын прыйшоў са школы ў чырвоным гальштуку. Першы дзень у чырвоным гальштуку... Як жа тут не задраць угару востры нос, як жа не чмыхнуць лішняга разу, не падсярбнуць задорна падцёкаў з-пад носа!

Жвіроўскаму-бацьку чырвоны гальштук на худзенькай сынавай шыі непрыемна вока ўкалоў. Ён паглядзеў скоса на гальштук, і яго зморшчаны твар раптам затросся. Скрывіўшы вусны нядобрай усмешкай, ён падышоў да сына і дрыжачымі пальцамі здзеў з сынавай шыі чырвоную стужку.

— Не трэба тут... Там насі сабе, колькі хочаш, а тут, у хаце маёй, я не дазволю.

Сын няўцямна зірнуў на бацьку. У вачах у яго бліснулі слёзы. Глядзеў на бацьку, не зводзіў вачэй, быццам чакаў яшчэ нечага. А ў вачах дрыжала слязьмі маўклівая горкая крыўда, і скрозь яе — тонкія іголачкі злосці.

Бацька схаваў гальштук у фанерную скрынку з-пад мыла, дзе было складзена розпае рыззё, дзе на самеиькім дне ляжала тужурка з бліскучымі гузікамі.

— Нічога, паспеш. Наносішся...

Сын не сказаў нічога. Моўчкі сеў за стол, моўчкі стаў палуднаваць. А як пасля полудня бацька заснуў, сын асцярожна падкраўся пад ложак і выняў са скрынкі чырвоную стужку. Ён сеў з ёй да акна, глядзеў на яе, любаваўся. І стала спакойна, не было ўжо крыўды, не было злосці.

— Хай сабе. Не ўсё роўна? Абы там, у школе, у горадзе...

У той вечар ён добра адказаў бацьку лекцыі і перад сном шчыра маліўся за сябе, за бацьку, за піянераў.

Назаўтра ўранні бацька аддаў сыну чырвоны гальштук, а сын, прыйшоўшы са школы, сам вярнуў яго бацьку назад.

Так і пайшло з таго часу.

Разгарнулася шумам зялёная вясна.

Была вясна цёплая, ясная. Ахінула яна прыроду ўрачыстасцю свежай, паслала па свеце дыван хараства маладога.

Разгарнулася вяспа Жвіроўскаму-сыну. Павесялела жыццё, аквяцілася. Далучыўся — чэзлы, слабенькі — да маладой ядранай рупі — і сам зарунеў, сам сокам свежым набраўся.

І не пазнаць стала хлапца. На твары — чырвань, на вострым носе, на дзюбцы птушынай, вяснушка ў капейку асела. Вочы — не вочы, а зайчыкі гарэзныя, спрытныя.

Ходзіць Жвіроўскі-сын на спорт, на гурткі, спявае песні вясёлыя, смяецца смехам звонка-рассыпчастым — сапраўдным поўным смехам дзяцінства.

А дома Жвіроўскі-сын так, як раней. Дома слізкі, віхлясты погляд Жвіроўскага-бацькі заўсёды блукае, сочыць за сынам. Прыглядаецца бацька да сына, быццам наскрозь яго працінае, путро ўсё хоча ўбачыць. Баіцца стары, каб не згубіць роднага сына, каб не дапусціць яго ў лапы злосных варожых людзей.

І адчувае стары, з страхам, з трывогай нямой адчувае, што робіцца нешта ў сыне, што не тоі ужо ён. І напружвае сілы свае, каб не выпусціць з рук, каб затрымаць, захаваць хлапца ў спрадвечных дзядоўскіх звычаях, у набожнай строгаі сумленнасці.

Жвіроўскі-сын прынёс новыя прыгожыя кніжкі. Кніжкі заўсёды ляжалі пярэстым, строінным грудком на акне. Ляжалі ціха, спакойна,— нібыта што. А Жвіроўскаму-бацьку яны здаваліся чымсьці жывым і калючым, як вожык. Бачыў ён у пярэстым строінным грудку нешта злоснае чужое, варожае, бачыў пагрозу едкую ў чырвані вясёла размаляваных вокладак, у страшнаі незразумеласці новых нечуваных слоў.

Лёг невялічкі ціхі грудок бярэмем цяжкім на свядомасць Жвіроўскага-бацькі, прыціснуў страхам тупым, нямою трывогаі. Лез невялічкі ціхі грудок востра назойлівай плямаі у вочы старыя, балюча калоў сваім маўчаннем затоеным. Турбаваў, жыцця не даваў Жвіроўскаму-бацьку.

І нешта раз, топячы печку, стары Жвіроўскі спаліў сыпавы кніжкі. З зларадпаі дзікаі усмешкаі на зморшчаным твары чакаў, калі верпецца сын.

Сын прыйшоў і спытаўся:

— Татка, дзе мае кніжкі?

Бацька жыдкім віхлястым поглядам поўзаў па цёмным кутку. Блукала на твары тая зларадна дзікая ўсмешка.

— Няма кніжак. Малы ты яшчэ, каб чытаць іх.

Выйшла так, што зірнуў пасля гэтага бацька на сына, і тая дрэнная, дзікая ўсмешка, зараднасць тая маўклівая,— з кніжак варожых, з успамінаў аб іх, аб расправе над імі, супраць волі самога Жвіроўскага-бацькі перанеслася на сына, на атарапелую постаць яго, на едка чырвоны гальштук на шыі.

У адказ вочы Жвіроўскага-сына завастрыліся тонкімі іголкамі злосці.

І быў у тую хвіліну бацька ворагам сыну, а сын ворагам бацьку.

Гэта быў пачатак. З таго часу так і паішло. З таго часу паміж двух Жвіроўскіх прайшла глухая шчыліна і расла з кожным днём і глыбела, разяўлялася чорным непераступным бяздоннем.

Бацька яшчэ пільнеі стаў прыглядацца да сына, са-

чыць за кожным крокам яго, выпытваць аб усіх драбнотах яго жыцця за парогам хаты.

Мукай нясцерпнай былі для Жвіроўскага-сына вечары, калі не было ніякіх сходаў, заняткаў, калі трэба было сядзець дома, у брудным пакоі, адзін на адзін з сухім, злосна насцярожаным бацькам. У гэтыя вечары садзіўся бацька за стол супраць сына і пачынаў жорсткі свой допыт.

Не было ўжо цяпер у старога Жвіроўскага руплівай бацькоўскай трывогі, не было і страху за сына, за яго долю. Пытаўся для таго, каб злавіць на чым-небудзь, каб знайсці прычэпку якую і потым пілаваць, упікаць, мучыць бясконца сваёй буркатнёй — звягаю злоснай. Хацелася цяпер, прагна хацелася выпытаць у сына што-небудзь такое, што б падагрэла злосць у старых нячулых грудзях, што б дало магчымасць едка ўскіпець старому счарсцвеламу сэрцу.

І калі мучыў ён сына, калі бачыў, як маўкліва і балюча набягаюць слёзы на крыўдай працятыя сынавы вочы, станавілася лягчэй сэрцу старому, была на душы дзікая нечалавечая давольнасць. Было гэта так мо затым, што паступова злучыўся ў цяжкім уяўленні вобраз сына з вобразам таго чужога, варожага, што сціснула колам глухім, што адабрала некалі жонку, канапу і бліскучыя гузікі.

А сын стуляўся, хаваўся ў маску глухой затоенасці, паказваў бацьку сваймў толькі маўкліва папятыя вочы, у якіх скрозь слёзы нямотнае крыўды прабіваліся часам вострыя тонкія іголачкі злосці.

Не было ўжо ў сынавым сэрцы адданай пакорнасці, ужо скрозь панавала ў ім ціснутым комам агіда — цяжкая, шчымлівая, шавялілася чорнай гадзюкай варожасць. Ужо ў часе вячэрняй малітвы Жвіроўскі-сын не маліўся за бацьку, не прасіў дараваць думак нядобрых пра бацьку. У дрыготна чырвонай цішы, стоячы па каленях перад змрочным папурым Езусам, Жвіроўскі-сын думаў аб тым, як, што зрабіць, каб пазбыцца адвечных бацькавых здзекаў. І карабатая, быццам мохам чорным аброслая постаць, што нязграбна кленчыла поплеч, здавалася чужой, незнаёмай, быццам нейкім дзіўным выпадкам сышліся, сустрэліся і некаторы час церпяць адзін аднаго.

Так не магло доўга цягнуцца.

Так было цяжка, нясносна абодвум. І чулі абодва, што прыйдзе нейкі канец. Не знялі — які, але і чакалі яго.

Бацька — з трывогаї тупої, а сын — з палахлівай надзеяй, з туманнаї радасцю.

Блішчала ў тої час сонцам і радасцю лета. У сонечнаї радасці пералівала сумятнёї квяцістаї маладое жыццё. Было ў ім поўна задору моцнага, свежага, поўна размаху шырокага. Захапляла гэта жыццё, цягнула ў сваё бурлівае ўлонне ўсё маладое, здаровае, усё, у чым кляцела крыніцаї рунёвы ядраны сок.

Жвіроўскі-бацька пачаў біць Жвіроўскага-сына. Ён біў не так, як звычайна б'е бацька непаслухмянага сына. Ён біў з асаблівай звярынай жорсткасцю, знаходзіў у гэтым сабе брудnae, дзікас здаволенне. Ён перастаў гаварыць, перастаў весці сваю бясконца цягучую буркатню. Ён маўчаў увесь час, у маўчанні збіраў злосць, каб выліць яе ў жорсткіх здзеках-набоях.

Сын пачаў не прыходзіць дахаты. Сыну хата стала турмой, стала катаргай. Сын аддаўся цалкам сумятні пярэстаї жывога жыцця. Прыходзіў дамоў толькі нанач. Прыходзіў з тупым адчаем, з затоенай глуха ў дзіцячым сэрцы варожасцю. Ішоў і знаў, што зараз бацька зашчэпіць дзверы, возьме хлудзіну якую і пачне біць. Біць будзе доўга, бо сын не хоча плакаць, а сціспе зубы ад болю і маўчыць. Будзе біць, пакуль усё-такі сын не заплача. А сын заплача не ад болю, боль ён можа стрымаць,— заплача ад злосці бяссільнаї, ад таго, што сілы няма, што не зробіш нічога. І яшчэ ад таго, што доўга ўжо, жудаспа доўга б'е раз'юшаны бацька.

І вось прыйшоў нарэшце канец. Канец быў такі.

Прыйшлі нешта раз да Жвіроўскага-бацькі і сказалі, што ён не мае права біць свайго сына. Жвіроўскі-бацька нічога не адказаў, толькі ўсміхнуўся таемна і злосна. Потым сядзеў на ложку і нешта шаптаў, часамі нервова ўздрыгваючы і крывячы ў дзікую ўсмешку-грымасу сваї шызы, аброслы куца падстрыжанаї шэрсцю, зморшчаны твар.

На полудзень прыйшоў сын. Прыйшоў, як зазвычаї, цёмны, насуплены. З-пад зведзеных броў палахліва блішчалі вострыя вочы, вочы загнанага звярка.

Бацька, як сына ўбачыў, адразу затросся, зашамаў бязгучна дрыжачымі вуснамі. Хацеў нешта сказаць, хацеў закрычаць, але замест гэтага вырваўся толькі дзікі зашчэмлены віск.

Ён кінуўся да сына, схапіў сваімі касцянымі пальцамі сына за вуха, вывеў моўчкі з хаты і з усёй сілы штурхнуў за вароты. Сам вярнуўся ў хату, зашчапіў дзверы і сеў зноў на ложку — чорны, страшны, як нейкая дзікая крывяжэрная птушка.

Сын адразу сцяміў, у чым тут справа.

Ён пастаяў часінку на месцы, зірнуў, вока прыжмурыўшы, на пякучае яснае сонца, падшмаргнуў разы са два носам і пайшоў на завулку, адважна махаючы левай рукой, задраўшы задорна ўгару востры нос — дзюбку птушыную.

Так разлучыліся двое Жвіроўскіх.

Жвіроўскі-бацька і Жвіроўскі-сын...

КВЕТКА ПАЖОЎКЛАЯ

1

Дзіўны гэты Арончык. Гэта ж ёп так назваў яе:

— Кветка пажоўклая...

Калі ж Булановіч хацеў распытаць што пра гэту жанчыну, Арончык махнуў нецярпліва:

— Эт, кінь ты. Не варта аб гэтым...

І не сказаў пічагутка.

А Булановіча яна зацікавіла. Яна, перш-наперш,— прыгожая жанчына, з павабнай, трошку сумнай і ціхай усмешкай. Невысокага росту, стан досыць зграбны, з мяккай акругласцю форм. На твары троху цьмяная бледнасць і зморшчыкі навокал вачэй — такія маленькія, празрыстыя. Як усміхаецца, дык зморшчыкі збіраюцца прамянчыкамі, ахіпаюць вочы ціхай, ласкавай прыветнасцю. Тады ў вачах знікае тая дзіўная палахлівая маркота, якая часам халадзіць іх, робіць пустымі, далёкімі. Тады ў іх — зеленаватыя агеньчыкі; вясёлыя, гарэзныя. І зірнуць тады ў іх, дык не стрываеш, каб не ўсміхнуцца самому. Бо зеленаватыя агеньчыкі — яны пранікаюць дужа глыбока, соладка казытаюць сэрца і поўняць яго нейкім гуллівым уздымам.

Булановіч даўно чуў пра яе, але пазнаёміўся толькі нядаўна.

Так было. Хадзілі разам з Арончыкам дзіцячыя дамы аглядаць. Зайшліся аж па саменькі краї горада, туды, дзе раскошнымі купамі сады разгарнуліся, дзе пачынаюцца дачы.

Дом № 30. На Чэрвеньскай вуліцы. Жоўценькі, свежы. Ззяе вясёлымі вокнамі, задорна ўсміхаецца зграбнымі высокімі ганкамі.

Як уваішлі яны ў дом, плоймаі абсыпалі дзеці, зазвінелі ўвушшу звонкім смехам — вясёлым, бязрупатным. Сярод іх выхавальніцы плаваюць зважна, напускаюць на твары салодкую ўсмешку. Яе не было, Булановіч адразу заўважыў.

Спыталіся:

— Дзе загадчыца дому?

Дзеці — хорам бязладным:

— У садзе... Цёця Марына ў садзе... Мы паклічам... зараз...

І пабеглі навыперадкі.

Праз хвіліну яна прыйшла. У простай сукепцы, у фартуху. Відаць, пешта ў садзе рабіла. З Арончыкам паcяброўску спаткалася:

— А!.. Арончык!.. Якім ветрам цябе прынясло?

Руку паціснула моцна, парыўчата. З Булановічам тож прывіталася. Зірнула з цікавасцю, сказала выразна:

— Гарнова.

І затрымала погляд на ім. Але на момант адзін. Зараз жа звярнулася да Арончыка:

— Ну, чаго прыйшлі? Рэвізію наводзіць?..

— Вядома, бо да вас, мусіць, ад самага стварэння свету ніхто не прыходзіў...

— О, не, якраз намыліўся. Такога дабра, як вы, заўсёды хапае. Надакучыла нават...

Булановіч усміхнуўся:

— А вы б гэткіх гасцей мятлой выганялі!

— Эканоміка не дазваляе: на мётлы нам мала грошай даюць... Ну, але што ўжо з вамі рабіць,— хадзем, глядзеце нашае царства.

Як аглядалі дом, Булановіч увесь час сачыў за Гарновай. Думаў сабе: «Няўжо гэта тая, пра якую калісь гаварылі так многа, якую ведаў блізка ўвесь горад?»

І дзівіўся. Здаецца, нічога асаблівага: прыемная жанчына, прыгожая, вабная. Столькі жаноцтва ў ёй, столькі ласкі — да дзяцей асабліва...

І гэта тая, перад імем якой часам дрыжэлі нашыя ворагі? Гэта яна?..

Як агледзелі ўсё, зайшліся ў пакойчык, што лічыўся канцылярыяй дома. Там сядзелі, гутарылі. У часе гаворкі Булановіч спытаўся:

— Скажэце, калі ласка, ці здавальняе вас гэтая справа?

І ўбачыў тады, як вочы ў Гарновай працяліся холадам, пустатой, як засвяцілася ў іх пепта такое, што падобна было да спалоху або да неўкаї палкаї, балючаї журбы. Загаварыла новым — ціхім і працяклівым голасам.

— Ці здавальняе, пытаецеся? Як вам сказаць... Усяк бывае. Бывае так, што й зусім здавальняе...

Яна змоўкла, задумалася. Булановічу прыкра стала. Каяўся, што аб гэтым пачаў. А Арончык бесцырымонна ляпнуў яе па плячы.

— Ну, ты ўжо й насупілася. Яшчэ раскіселішся часам.

Арончык, відаць, добра ведае Гарнову. Дый не дзіва. Булановіч тут новы зусім чалавек, а Арончык тут з самага свайго параджэння. І вядома яму ўсё чыста, што было ці што ёсць тут, у горадзе.

Гарнова, аднак, не звярнула ўвагі на Арончыкаў жарт. Праўда, усміхнулася, але ўсмешка была ўжо не тая.

Булановічу было не па сабе. Адчуваў сябе нібы вінаватым у тым, што настрой у яе сапсаваўся. Трэба было нешта сказаць, працягнуць гутарку. І ён пачаў гаварыць аб карыснасці працы па выхаванні дзяцей, аб новых кірунках у гэтай працы. Выйшла яшчэ горш, бо ў голасе яго неяк міжвольна праточвалася асцярожнае спачуванне, быццам хацеў угаварыць, улашчыць. Ад гэтага ў вачах у Гарновай засвяцілася дасада і злосць. Слухала, а потым адрэзала раптам:

— Кіньце навукі чытаць, сама ўсё ведаю добра...

Яшчэ часінку сядзелі, потым Арончык узняўся.

— Ну, паехалі. Бывай!

Як развітваліся, Булановіч стрэўся поглядам з Гарновай. Убачыў у вачах яе смутак і разам нейкае замяшанне. Нібы стыдалася яна за свой дзівачны настрой.

Як ішлі назад, Булановіч думаў пра Гарнову. Тачыла думкі вострая назойлівая цікавасць. Спытаўся ў Арончыка:

— Што яна за жанчына?

Вось тады і назваў Арончык яе:

— Кветка пажоўклая...

А чаму? Адкуль узяў гэта ён? — не разумеў Булановіч.

А Арончык больш не хацеў гаварыць. Сказаў толькі:

— Эт, кінь ты. Не варта аб гэтым...

2

З таго часу ў Булановіча з думак не сходзіла Гарнова. Часам сам сабе дзіваваўся: чаму гэтак моцна й глыбока запаў у душу яе вобраз? Ды так упарта, станоўка думкі гняце, мігціць заўсёды ўваччу плямай нязводнай — не пазбыцца ніяк.

— Мо закахаўся?

Смешна рабілася самому з гэтае думкі. Закахаўся... Ды не, гэта не тое, гэта бывае не так. Ён жа ведае добра, што значыць — кахаць: было калісь гэта. Тады — летуценні, парыванні, кроў агнём бушуе, бурліць непакоіна. А тут — не. Тут проста — цікавасць нейкая. Але цікавасць глыбокая, моцная, якая пераходзіць у назойлівую, дакучлівую патрэбнасць. Хочацца выведаць усё, разгадаць. Хочацца бліжэй падысці да яе, прыгледзецца, у самае нутро пранікнуць, каб пазнаць, што дзеецца там глыбока-глыбока, пад гэтым халодным, нібы палахлівым бляскам зеленаватых вачэй.

Булановіч яшчэ раз хацеў распытаць у Арончыка. Злавіў яго неяк па дарозе і затрымаў.

Арончык, як заўсёды, спяшаўся. Бег некуды на нараду ці пасяджэнне. Спыніўся, як Булановіч яго затрымаў, сказаў, дасадліва зморшчыўшы лоб:

— Ну, што табе? Справа якая? Некалі мне!..

Булановіч не знаў, як пачаць. Хацеў, каб як неўзаметку, а тут ён адразу пытаецца. Хацеў нават змоўчаць, але так моцна жадалася пачуць што-якое пра Гарнову.

Пачаў проста:

— Ведаеш, Арончык, мяне дужа зацікавіла тая загадчыца дому, ну... гэта... Гарнова... Скажы, што ты ведаеш пра яе?..

Арончык яшчэ больш зморшчыў лоб.

— Ды кінь ты, Булановіч! Што гэта табе закарцела? Ці не ўлюбіўся ты часам на старасці?..

— Ды не, проста цікава. Скажы, дзе яна працавала раней?

— Ну, слухай. Працавала ў надзвычайнай камісіі, займала важную пасаду, добра працавала, была вядома ўсім тутэйшым «контрам» як спрытная чэкістка з пільным вокам і сталёвай цвёрдасцю. Ну, а потым нешта змянілася, страціла свой запал, энергію. Цяпер — сам ведаеш: закапалася ў дзіцячым доме, гатуе нам моладзь на зме-ну... Ну, годзе?.. Бывай, бо мне, дадушы, няма часу...

І пабег. Пакінуў у Булановіча яшчэ большае незадавальненне. Аж раззлаваўся ён на Арончыка.

— Чорт нейкі... Бегае, пікае, ніколі сталага месца не мае. Нават пагутарыць часу няма.

А думкі, як і раней, гняло цяжкое дакучлівае пытанне, і ўвачу лунаў бледны твар з загадкава халоднымі, ноўнымі смутку вачмі.

Прал колькі дзён была агульнагарадская партыйная сходка. Булановіч прыйшоў у тэатр яшчэ тады, як жоўтыя рады крэслаў бяздушна блішчэлі сухой пустатой і толькі дзе-нідзе самотна чарнелі невялічкія купкі людзей, парушалі гулкую цішыню бубнявай гаворкай.

Булановіч сеў адзаду на самым праходзе, сачыў ніль-на за дзвярмі, якія што далей, то часцей і часцей расчыняліся, прапускаючы новых людзей.

Чакаў яе, Гарпову. З дасадай адводзіў вочы ад незнаёмых людзей, зноў і зноў упінаў іх у дзверы.

Прабег Арончык угрунь з партфелем пад пахай. На хаду прывітаўся з ім, нібы задзівіўся:

— Ты тут ужо?

— Тут,— адказаў Булановіч і рад быў, што Арончык пабег. Чамусьці прыкра было, не хацелася з ім цяпер гаварыць.

Зала ўсё напаўнялася, гудзела аднамерным бурлівым гоманам. У ім разбаўляліся, танулі ўсе паасобныя зыкі, блыталіся ў дзівосным бязладдзі. Толькі часам звонкі жаночы смех узлятаў рэзкім зыкам і вызначаўся сярод агульнага гуду.

Булановіч усё назіраў непакойна на дзверы. Ужо пачало мітусіцца балюча ў вачах, ужо — не людзі, а плямы аднастайныя, прыкрыя. Хацеў адвярнуцца, але раптам угледзеў Гарпову. Яна яго пазнала, заўважыла. Падышла да яго.

— Добры вечар! Ці пазналі мяне?

— Вядома, пазнаў. Добры вечар! Сядайце.

Яна села побач. Раптам чагось засмяялася, зірнула на Булановіча вясёлым іскрыстым поглядам. Бліскучыя вочы ўбраліся тонкай сеткай прыветных маршчынак, працялі гарэзным агеньчыкам.

Булановіч здзівіўся:

— Чаго вы?

— Успомніла, як вы былі ў нас. Помніце, вы мне гэтак сур'ёзна тлумачылі, быццам угаварвалі?..

— Ды не... Я проста выкладаў сваю думку. Я ж не ведаў, што вам не падабаецца, калі чалавек сур'ёзна гаворыць...

— А вы, мусіць, любіце сур'ёзна гаварыць? І заўсёды вы так?..

— Таксама, мусіць, як вы заўсёды жартуеце...

— Не, я часам тож сур'ёзна магу...

Булановіч хацеў нешта сказаць, але ў гэты момант

ўзнялася заслона і пачалася сходка. Нейкі час сядзелі моўчкі, слухалі ўважна, што гавораць. Булановіч заўважыў на сцэне Арончыка, паказаў Гарновай.

— Глядзіце, ён і там не ўседзіць спакойна, круціцца, як верацяно.

Яна ўсміхнулася, не адказала нічога. А праз хвілінку нахілілася да яго, спыталася ціха:

— Слухайце, ці любіце вы сходкі?

— Як гэта — ці люблю... Я нават не ведаю, як гэта можна сходкі любіць. Можна справу любіць, часткай якой і сходкі з'яўляюцца.

— Не, я дык люблю сходкі. Асабліва, калі вялікія, дзе многа людзей, дзе ў бурлівым уздыме выяўляецца агульная згода, дзе чалавек разбаўляецца ў масе, губляе сябе, забываецца на сваё асабістае і жыве, поўніцца гэтым агульным уздымам. Там неяк робішся смелым, адважным, пазбаўляешся ўсякіх сумненняў, усякай жудасці жыццёвай.

Яна троху змаўчала, падумала.

— Калісь было многа такіх пекных хвілінак. Цяпер не тое, цяпер неяк шэрае ўсё. Нудна часам...

Булановіч зірнуў на яе з цікавасцю. Але сказаў нібы зусім безуважна:

— Усяму свой час. Цяпер, вядома, мінуліся гэтыя, як вы кажаце, пекныя хвіліны. Затое працы цяпер не менш і нудзіцца часу няма.

Яна быццам не чула яго слоў. Угледзелася некуды ў прасцяг задуменным поглядам. Потым зноў загаварыла:

— А дрэнна аднаму, цяжка. Думкі розныя, пустата... Моцы няма, бо моц толькі ў грамадзе, калі так зліешся з усімі, калі гарыш захапленнем магутным. Эх, было калісь!..

Яна нават уздыхнула. І ўсё глядзела некуды ў пустату. А на твары смутак глыбокі свяціўся, адбіваўся ў вачах ціхім зеленаватым бяздоннем.

Булановіч глядзеў на яе і чуў, як аднекуль — з глыбі ўсплывае ў яго нейкае няяснае, непакойнае пачуццё, нейкая зыбучая хваля салодкага суму. Быццам перадаваўся яму настрой Гарновай, быццам той смутак, што халодным бяздоннем спавіў яе вочы, быццам ён і яго захапляў, блізіў да яе, навяваў глыбокую сімпатыю да гэтай жанчыны.

Булановіч зрабіў над сабой патугу і абярнуўся да сцэны. Гвалтам прымушаў сябе слухаць прамоўцу, ста-

раўся ўкласці ў мазгі кожнае слова, кожную думку, каб толькі развеяць гэты непатрэбны настрой.

І выходзіла так: словы запамішаліся, сказы ўкладаліся цалкам у галаву, біліся там, гудзелі гудам траскучым; а недзе ўглыбі ціхенька, але ўпарта вілася асобная думка — дакучлівая, настойная, свідравала нутро цурочкам ціхага суму.

Як злавіў сябе Булаповіч на думцы на гэтай, узлаваўся і на сябе, і на Гарнову. Рашыў:

— Калі так, дык пайду.

І хоць нешта цягнула астацца, нешта прыкоўвала да месца,— перамог сябе, узняўся.

— Ну, я пайду. У мяне ёсць надта пільная справа. Бывайце!..

Стараўся не глядзець ёй у твар, не бачыць яе смутных вачэй. Яна затрымала яго руку. Сказала шчырым прыяцельскім голасам:

— Слухайце, заходзьцеся вы калі-небудзь да нас. У нас, дадушы, няма ніводнага чалавека, з якім можна б было пагаварыць.

Ён усміхнуўся.

— Дзякую за камплімент.

— Не, сапраўды. Калі будзе час вольны, прыходзьце.

І калі ўжо завярнуўся ісці, дадала:

— Буду чакаць.

— Добра. Можа, калі і прыйду.

І выйшаў. Па вуліцы пасігаў шпарка, размашыста, бубнеў сабе пад нос:

— Ого! Іш ты, як яно. Так часам і сапраўды ў гісторыю ўлезеш. Так і вабіць, так і зацягвае, быццам якое бяздонне таемнае... Не, брат, пачакай, не паддамся. Не хлопчык маленькі... Во толькі сход прапусціў нізавошта...

Гэта так ён казаў, запэўніваў сам сябе ў гэтым, хацеў, каб так думаць. Але думкам хіба загадаеш? Хіба прымусіш сваё ўяўленне не маляваць таго смутнага твару, тых вачэй выразлівых, ахіпутых зеленаватаі пялёнкаі таемнага суму?..

3

— Дзядзька Булановіч! Вам цёця Марына запіску прыслала.

Булановіч няўцямна зірнуў на маленькую дзяўчынку. Адразу нават не ўспомніў, не зразумеў, у чым справа. Потым схапіўся:

— Гарнова.

Узяў невялічкі кавалак паперы, разгарнуў.

«Тав. Булановіч! Прашу вас прыйсці сёння ўвечары да мяне, маю сказаць нешта важнае. Гарнова».

— Нешта мае сказаць, просіць прыйсці... Што за штука?

І ён пачаў рабіць розныя здагадкі. Углыбіўся ў думкі і на дзяўчынку забыўся. Тая пра сябе напамяпула:

— Цёця Марына прасіла, каб адказ далі.

— А...

Адказ... Які ж адказ? Пайсці ці не?.. Але — чаго ж там... Баіцца ён хіба, ці што? Вядома, пайсці. Нават цікава, што скажа яна.

— Перадай, што — добра.

— Бываіпце!

У Булановіча думкі роілам завіхрыліся, зблыталіся ў зыбучы бязладны клубок. І толькі да болю яскрава, выразна стаяла ў галаве турбуючым гнётам:

«Што яна скажа?»

Цэлы дзень мардаваўся сярод плоймы напружаных думак, здагадак. А як горад ужо захінуўся ў душную вопратку летняга вечара, пайшоў да Гарновай.

Дзіўна бывае ўвечары на ўскраіне горада. Па завулках крыўлястых, вузенечкіх, па куточках прытульных змрок нікае неяк старожка, цікуючы. Хавае ў сябе над палой усё чыста, на абрысы прадметаў воўну накладае густую, робіць іх акруглымі, мяккімі. Абымае, сціскае будынкі чарнатой непраглядпай, цалуецца з вокнамі — бліскучымі засланкамі.

І ціха, бязлюдна ў завулках глухіх. Як ідзеш, толькі гукі ўласных крокаў раскідаюцца гулкай чаргой, прабіваюць пухкі застой ціпіыні. Ды часам насустрач перабоям блытаным прыляцяць з-за рога нечаканыя крокі пейкай кампаніі, і дружная гутарка, смех раптам абудзіць напружаны спакой. Выбухне ўраз з маўклівае цемры, празычыць над вухам і неўзабаве сціхне недзе адзаду. Здалёк яшчэ раз адгукнецца гулліва-прарэзлівым смехам.

Булаповіч ледзь адшукаў той дом, дзе калісь быў разам з Аропчыкам. А знайшоўшы, часінку стаяў, не важыўся ўваходзіць. Збіраў думкі да ладу, апошні раз мержыўся ўваходзіць. Збіраў думкі да ладу, апошні раз мержкаваў, як яму лепш абысціся з Гарновай. Потым узняўся на ганак, таргануў моцна званок.

Выйшла незнаёмая жанчына, мусіць, з выхавальніц тутэйшых. Яго, пэўна, пазнала, бо запрасіла адразу:

— Заходзьце!

І павяла некуды ў задні пакоі.

Перад дзвярмі Булановіч спыніўся, азірнуўся здзіўлена. З-за дзвярэй нясłася жвавая гутарка, смех. Відаць, сышлася нейкая вясёлая кампанія.

Але ўжо позна было разважаць. Увайшоў следам за жанчынай, што яго прывяла. Перш-наперш убачыў Гарнову. Сядзела на крэсле каля стала і глядзела на яго ўпартым гарэзлівым поглядам. На твары — весялосць, задорнасць гуллівая, з вачэй праменнем іскрыстым пырскае смех. А вакол яе — колькі дзяўчат, хлопцаў таксама.

Адзін асабліва яскрава адбіўся ўвачу ў Булановіча. Сядзеў ён воддаль, асобна. Яшчэ малады, але лысы,— лоб закаціўся на самае цемя. На папяляста-шэрым твары разліта сумная летуценнасць, журба ціхамірная. Здавалася — нейкае ціхае гора яго ахінула, прыціснула, налажыла на твар сваю цяжкую пячатку.

Як увайшоў Булановіч, усе на хвілінку сціхлі. Вітаючыся з ім, шчупалі прыкрымі цікавымі поглядамі. А потым зноў загаварылі, не зважалі больш на яго.

Булановіч сеў воддаль і не знаў, што рабіць. Расло ўнутры нездавальненне. Лаяў у думках сябе, што прыйшоў, і меркаваў, як бы хутчэй уцячы.

Гарнова падышла да яго, села поплеч.

— Я думала, вы не прыйдзеце... Я чакала вас дужа... сапраўды...

Булановіч зірнуў на яе з здзіўленнем.

— Я не разумею ўсё-такі, што можа ў вас быць такога, аб чым пільна трэба сказаць мне.

— Ёсць нештачка. Не надта пільнае, праўда... Але не, не... дужа пільнае, такое, з чым нельга чакаць, з чым я не магу, не ўмею чакаць.

Вочы яе загарэліся шчырым агнём. Булановіч адвярнуўся, не мог глядзець у гэтыя вочы. Цягнулі япы да сябе чароўным магнэсам, абуджалі ў грудзях бурлівае, палкае.

— Дык, я спадзяюся, вы скажаце зараз гэтае «нештачка»?

— Зараз? Не, гэта няможна... не, не скажу...

— Дзякую. Дык нашто ж я цягнуўся сюды вярсты дзве? Хіба на тое, каб пабачыць гэтую вашу кампанію?

Яна нібы засмуцілася. Праказала пакрыўджаным голасам:

— Няўжо вам так цяжка прыйсці да мяне? Дык не варта было сябе турбаваць, не пайшлі б, і годзе...

Булановіч падумаў і прызнаўся самому сабе, што схлусіў, што ўшоў ён сюды не толькі затым, каб пачуць «нешта». Проста цягнула, каб пабачыць яе, каб пагутарыць з ёй, пагутарыць. І соромна троху зрабілася. Праказаў, нібы ў замяшанні:

— Не, не ў тым... але многа работы, час дарагі...

— У, падумаеш — многа работы... Хлусіце вы, во што...

— Не, выбачайце, вы не маеце права мяне дакараць за гэта, бо не мелі яшчэ часу перакапацца ў тым, што я здольны гаварыць няпрауду.

— Ат, ведаю я вас усіх...

Маўчалі хвілінку. Яна ўтаропіла вочы ў падлогу, думала аб нечым, церабіла нервова сукенку. А Булановічу чамусьці весела стала, захацелася гаварыць. Аб глупстве якім, аб драбніцах, абы не маўчаць. Ён запытаў жартаўліва:

— А гэта ў вас, мусіць, вялікі сакрэт, трэба гаварыць пры зачыненых дзвярах?

— Вядома. Затым я вам сёння і не скажу нічога... Слухайце,— раптам пачала яна сур'ёзна і шчыра.— Вы выбачайце, але гэта выйшла зусім неспадзявана. Я сапраўды хацела пагутарыць з вамі. Мне хочацца многа чаго сказаць вам. Але сышліся вось гэтыя... прынясла іх нялёгкая... Во што, дайце мне абяцанне, шчырае, сяброўскае, што вы прыйдзеце да мяне калі-небудзь пасля. Самі, ведаеце, без запрашэння... Добра?

Булановіч троху падумаў.

— Добра, прыйду. Не думайце, што мне так ужо прыкра прыходзіць да вас...

— Ну, вось і добра. Тады я скажу вам «нештачка»... Абавязкова скажу.

Яна зірнула на яго ваблівым, хітраваным поглядам, які ў Булановіча ўзняў унутры прыемнае абуджэнне, прымусіў яшчэ раз сказаць:

— Добра, прыйду.

Потым гаварылі аб чым пападзя. Між іншага Булановіч спытаўся:

— Хто гэта тоі лысы, з вачмі гэткімі сумнымі?

— А гэта настаўнік адзін, Абшарскі. Кахае мяне...

— І не мае ўзаемнасці?

— Вядома. Але нішто, не дакучае, больш моўчкі глядзіць сумнымі вачмі ды ўздыхае. Я ўжо прывыкла...

Булановіч уважна паглядзеў на Абшарскага. Стрэўся

на момант з яго нерухомым поглядам і адвярнуўся міжвольна з пачуццём нейкай грэбліваі жаласці. Так адварочваюцца, калі стрэпуцца з ліхаманкава-напружаным поглядам хворага.

А Абшарскі быццам застыгнуў, упяўшы ў іх бок свае адзервяпелыя вочы. І ўвесь час, пакуль не пайшоў, Булановіч адчуваў на сабе гэты ўпарты, ліпучы погляд.

Прыкра было. Затым і не сядзеў доўга. Устаў, развітаўся з усімі. Гарнова яшчэ раз шапатнула:

— Дык прыходзьце калі. Мо ў пядзелю ўдзень... пойдзем гуляць куды-небудзь. За горад, далёка-далёка...

Абшарскі таксама ўзняўся.

— Нам па дарозе, здаецца. Пойдзем разам.

Булаповіч звярнуў увагу на яго голас. Якраз такі, якога ён і чакаў: ціхі, марудны, працяты нейкай цяжарнай зморай.

Адказаў:

— Калі ласка. Весялей будзе йсці.

Пайшлі. Ладны час абодва маўчалі. Потым пачаў гаварыць Абшарскі.

— Скажыце, калі ласка, вы даўно знаёмы з Гарновай?

— Не, усяго толькі з тыдзень ці два.

— Толькі? — быццам здзівіўся ён.

Троху змаўчаў.

— Ну, як яна ўпадабалася вам?

Булаповіч не чакаў гэтага запытання. Не знаў, што адказаць.

— Выбачайце, але я не разумею — як, з якога боку ці ўпадабалася...

— Наогул з усіх бакоў: як жанчына, як чалавек, ну... як працаўніца...

— Так сабе...

Булановіч наўмысля адказаў так безуважна. Чакаў, што будзе далей.

— Не, мусіць, вы мала яе знаеце. Яна надта добрая жанчына. Такая харошая, ласкавая, ветлая. Я скажу вам ад шчырага сэрца, што такую жанчыну трудна знайсці... Колькі ў ёй жыцця, колькі прыгожых, чароўных рухаў душы! Яна быццам саткана ўся з дзівосных перажыванняў, з квяцістых мар, з хараства незвычайнага.

І пайшоў, і пайшоў. Пацягнуў сваім ціхім, аднатоннапявучым голасам. Здаецца, не зважаў ён ні на Булановіча, ні на ўсё, што навокал яго. Углыбіўся ў сябе, сам сабе гаварыў.

А Булановіч думаў:

«Ткі не на жартачкі ён закахаўся ў яе. Бедны паэт! Ці ведае ён, што трухляцінай нясе ад яго паэтычных дыфірамбаў, што сам ён выдае нейкім трухлявым наследкам даўно прамінулых гадоў».

А Абшарскі ўсё гаварыў, усё выслаўляў сваю каханую. Урэшце ўжо надакучыла Булановічу. Расла дасада, злосць на яго. Быццам не мае аб чым гаварыць больш, як толькі аб ёй...

І дужа рад быў Булановіч, калі, урэшце, яго падарожнік спыніўся й сказаў:

— Ну, я налева.

— А я направа.

Развіталіся. Абшарскі знік у цемры неяк ціха, нячутна, быццам і не было яго тут, быццам не йшоў з ім Булановіч, а толькі думаў пра яго.

Булановіч пайшоў сваёй дарогай. Думаў, ідучы:

«Дзіўны чалавек. «Не от мира сего...»

І наогул было ўражанне ў Булановіча, што акунуўся ён у нейкі асобны, дзіўны свет, у якім ён чужы і яму ўсе чужыя.

А Гарнова здавалася восеньскай кветкай, якая жоўкне сярод сухога былля і яшчэ песціць погляд сваім астатнім сумным хараством.

4

За горадам бесканцовай стужкай выпрасталася чыгунка. Стужка жоўтая з паскамі чорнымі, з дзвюма жалезнымі цвёрдымі жыламі.

А прайсці з паўвярсты па чыгунцы ўдалеч,— там лес разгарнуўся абапал, на чыгунку ўспёрся, сціскае яе, хавае зайздросна ў сваім гушчарным нутры.

Стромкі, сухі бор. Блішчыць свежай жоўцю ствалоў, песціць погляд сваёй цёмнай прытульнай зелянінай. І звініць звонам напружна-ціхім, празрыстым.

У гэты бор пайшлі Булановіч з Гарновай. Ішлі па гладкім абрусе чыгункі, любаваліся шырокім, вольным прасцягам.

У Гарновай твар свяціўся радаснай свежасцю, вочы блішчэлі маладым захапленнем.

Булановічу яна падабаецца сёння. Сёння ў ёй многа хараства, многа дзівоснай павабнасці. Сёння Булановіч не зводзіць вачэй з яе твару, смагла ловіць тонкія рухі

яго і адчувае, як нутро соладка растапляецца, расплываецца ў прыгожым, яскравым пачуцці.

Як уваішлі ў лес, Гарпова спышілася.

— Вы не ведаеце, як люблю я чыгушку. Я бачу ў ёй нешта вялізнае, дужае. Мне часам здаецца, што гэта людзі пабудавалі сабе шлях да новага, невядомага жыцця. Забудзешся часам на тое, што станцыі ёсць, паўстанкі, раз'езды, што канец ёсць гэтай магутнай гадзюцы. І здасцца тады, што, каб пайшоў па ёй, пайшоў далёка-далёка, не спыняючыся, не азіраючыся, дык бы й прыйшоў у тое новае жыццё. А яшчэ могілкі я люблю... за іх спакой, цішыню... Бо часам дужа хочацца гэтага спакою... Але чыгунка бліжэй мне, больш захапляе... Ведаеце што, я намру на чыгункы...

Булановіч міжвольна здрыгануўся. Не словы здзівілі яго, а тон, якім былі яны сказаны. Так сур'ёзна, так пэўна яна іх сказала, і ў вачах у яе Булановіч угледзеў тую дзіўную, халодную пустату, якую бачыў у іх у часе першага знаёмства. Ён хацеў нешта сказаць, але Гарнова не дала. Раптам ажывілася, пацягнула яго на адхону.

— Пойдзем у лес, у самы лес... Далёка, глыбока, туды, дзе няма нікагутка, дзе толькі сасонкі адны... Ну, хутчэй, хутчэй...

І яны блізка што ўгрунь пасігалі па лесе.

Пад нагамі мякка паслаўся мохавы дываш. Як ступаеш, угінаецца пухка, падатна. Запахла смалой. Лес ахінуў цішынёй глыбокай, старожкай.

Булановіч затрымаўся.

— Дык куды ж мы, слухайце...

— Пойдзем, пойдзем... далей...

Ішлі яшчэ. Зайшлі ў самыя нетры. Урэшце выйшлі на невялічкі прагалак. Там Гарнова спынілася, зморана апусцілася на мохам засланы дол.

— Сядайце!

Булановіч паслухаўся.

— Я вам зараз скажу... тое, што абяцала... Толькі бліжэй вы... ну, бо гэта сакрэт...

І прашаптала на вуха: — Я пакахала вас... чуеце, ну?..

І выйшла так, што Булановіч зусім не здзівіўся, хоць і не чакаў гэтага, не думаў пра гэта. Ён узяў абедзвюма рукамі яе галаву, упіўся поглядам у бліскучыя вочы. Сказаў, выгаварваючы паасобку кожнае слова:

— Ты... мяне... любіш?.. А я цябе?..

Яна весела засмялася.

— Ну, вядома...

Яшчэ раз абдала гарачым поглядам і потым схавала свой твар у яго на грудзях. Шаптала:

— Ты дрэнны. Ты не думай, што ты добры... Не, цябе не варта любіць, бо ты мучыў мяне, не прыходзіў ка мне, нават як клікала я.

Ён узняў яе галаву, зазірнуў ласкава ў зеленаватыя вочы.

— Няпраўда. Я прыходзіў. І сёння прыйшоў...

— Так, праз цэлы тыдзень... Не, не, нядобры...

Ён не даў ёй больш гаварыць. Пацалункам вусны закрыў. Абняў яе горача, смела.

Яна раптам страпянулася, вырвалася.

— Не, пойдзем... Я не хочу, каб было так... не трэба... Лепш любіць, адчуваць заўсёды гэтае нявычарпанае, бурлівае пачуццё нездавальнення.

Ён хацеў затрымаць яе, але ўбачыў у іскрыстых вачах ціхую просьбу, смутны дакор. Пайшлі тады.

Ішлі моўчкі. Булановіч быў пад уплывам таго, што толькі што адбылося. Правяраў сябе, сваё пачуццё і бачыў, што не схлусіў ён там. Грудзі поўніла шчырая ласка, пяшчота. Гарнова была яму дарагая і блізкая.

Як выйшлі на палатно чыгункі, Гарнова зазірнула ў рэзліва ў твар яму, засмялася:

— Ну, чаго ты стаў гэткі маўклівы? Мо нездаволен? Дык бяры свае словы назад...

Ён тож усміхнуўся:

— Не варта. Лепш няхай будзе так, як было.

Яна з пяшчотай прытулілася да яго, зірнула вачмі, поўнымі шчырай удзячнасці.

Далей да самага дома гаварылі аб усім-усякім, жартавалі. Як падыходзілі к дзіцячаму дому, Булановіч убачыў на ганку фігуру Абшарскага. Ён упяў ім насустрач свой сумны перухомы погляд.

Булановічу неяк прыкра зрабілася. А Гарнова — нібыта што... Падышла да яго, па-сяброўску руку ціснанула.

— Вы ўсё сумуеце, мой рыцар няўцешны?..

Твар Абшарскага асвяціўся шчаслівай усмешкай, а ў бліснуўшых раптам вачах Булановіч прачытаў усё тое, аб чым калісь так дакучліва пеў яму гэты незадачлівы палюбоўнік.

І Булановіч падумаў:

«Ці ёсць у каханні маім хоць палавіна таго, што цвіце ў грудзях гэтага недалужнага чалавека!..»

З таго часу заўладала Булановічам пачуццё. Ён доўга думаў аб тым, як назваць яго, як растлумачыць. І кончыў тым, што прызнаўся сам сабе — гэта любоў. Мо трэба было б неяк іначай назваць яго, іншую даць яму назву, але слова такога няма.

І разважаў Булановіч:

— Якая бедная наша мова людская! Колькі розных разуменняў прыходзіцца пакрываць адным словам. Любоў... І пяшчотная ласка маткі да дзіцяці свайго, і адважная, шчырая адданасць барацьбіта сваёй справе, свайму калектыву, і гэтае агнёвае, бурнае, што кроў растапляе ў жылах, што грудзі віхурыць прагавітым жаданнем...

Усё — любоў...

І дзівіўся Булановіч, чаму гэткія зусім непадобныя пачуцці адным словам названы.

А сэрца тым часам рабіла сваё, сваё дыктавала. Яно поўніла нутро чароўным захапленнем; думкі, настрой — усё чыста пакрывала адбіткам непазбыўнае смагі.

І цягнула туды, да яе, да тых прыветных іскрыстых вачэй, у якіх гэтак дзіўна сплятаецца смутак з гуллівым агнём весялосці, у якіх часам адкрываецца такое прыгожае, чароўнае бяздонне. І цяжка цяпер Булановічу ўстрымацца, каб не пайсці туды, на край горада, дзе жоўценькі домік ветла ўсміхаецца высокімі ганкамі, вабіць ружовай прытульнасцю. Там, у маленькім пакойчыку, так шпарка, так радасна праходзяць хвіліны, так прыемна засцілаюць галаву салодкім ап'яненнем.

І часта ходзіць Булановіч туды, у гэты жоўценькі домік. Аддае яму ўсе свае вольныя гадзіны. А калі часам не ўдасца схадзіць, калі некалькі дзён не бачыць яе, тады нутро раз'ядае нуда і сэрца маркотаю садпіць.

Было пешта так. Не бачыўся цэлых тры дні. На чацвёрты моцы не стала,— пайшоў, хоць і работа была. Пайшоў ужо ўвечары, як горад замігціўся агнямі, як гарадскі тлум ахінуўся прыглушанай таемнасцю.

Гарпова ў дварьі была. Як убачыла Булановіча, кінулася да яго з бурнай радасцю.

— Як добра, што ты прыйшоў. Як я рада... Ведаеш, гэтыя дні што толькі са мною рабілася... Я думала — ужо капец, не стрываю. Гэткая пустата, гэткі адчай. Знялюбела ўсё чыста, усё назаляе, цяжарыць...

Яе голас звінеў певыводнай журбой, глыбока праніка ў

Булановічу ў сэрца. Ён з ласкай абняў яе, прытуліў да сябе, глядзеў з каханнем у твар.

— Дарма ты так, любая. Не трэба гэтага. Трэба перамагаць сябе, трэба пазбыцца гэтага разлому душэўнага... І чаму ты так мардуешся? Хіба цябе не можа жыццё захапіць... Хіба не бачыш ты, колькі ў ім новага бурлівага зместу, колькі творчай радаснай сумятні?.. Гэта ж — смех проста: адчай, пустата... Сорамна табе, во што...

А яна маўчала — ціхая, смутная. Мо зусім і не чула таго, што ён ёй казаў? Бо ў вачах свая асобная думка свяцілася — захаваная, таемная.

Ён тож перастаў гаварыць, моўчкі лашчыў яе, поўны глыбокай пяшчоты. Яму чамусьці здавалася, што далёка яна, незразумелая, цёмная. Загадка неразгаданая. І такая — яна яшчэ больш яму дарагая. Далёкая і разам блізкая, родная.

Толькі крыўдна, што не паказвае яна душы свае, што нібы хавае ад яго беражліва нутро сваё, тыя думкі балючыя, страшныя, што наганяюць адчай, пустату, што трупяць жыццё ёй нязводнай атрутай.

І ён ёй сказаў:

— Слухай, чаму ты такая няшчырая? Чаму ты не ўсё мне гаворыш?

Яна зірнула на яго, не разумеючы.

— Як, што не гавару? Я нічога ад цябе не хаваю. Я нікому больш не выказваю свайго настрою, сваіх турботных думак. Толькі табе ўсё адкрываю, бо ты такі дужы, цвёрды... І добры ты. Ты не смяешся над маёй слабасцю. Ты заўсёды хочаш зразумець, уцешыць. Я за гэта люблю цябе, за гэта ты мне дарагі.

Яна памаўчала троху, потым ізноў пачала:

— Ведаеш, любы, мне часам сорамна бывае. Я не магу сабе дараваць таго, што сышлася з табою... Я — эгаістка вялікая... Мо дзеля таго, каб дастаць сабе нейкую ўцеху, падтрымашне, я прынясу табе непрыемнасць, няшчасце. Я часам злую на сябе за тое, што пакахала цябе і з тваёго боку выклікала каханне...

Ён спыніў яе.

— Чаму ты гаворыш так?.. Быццам табе ўжо ўсё згінула, пагасла ў жыцці. Глупства гэта. Проста — часовы настрой. Мінецца ён, развеецца,— і ўсё будзе добра. І зноў сонейка заіграе ў гэтых любых вочках.

Яна сумна ўсміхнулася.

— Ды не, нашто падманваць сябе. Не будзе так. Я ўжо

асуджана. Я ўжо падышла да канца, да мяжы... Я многа жыла — поўным, бурлівым жыццём. Я растраціла моц сваю, той невялічкі запас, што быў у мяне. А цяпер — няма чым жыць...

Булановіч не разумеў пічагутка. То яму здавалася, што словы гэты адны — пустыя, сентыментальныя,— і тады прыкра было, нездаволенне раджалася, гасла добрае пачуццё. А часам праўдай жывой выдавала ўсё гэта, палохала страшэннай жудасцю, паліла вострую, непакойную трывогу. І тады бушавала ў грудзях пачуццё дзіўнай пяшчоты. Хацелася не адходзіць ад яе, быць з ёй кожную хвілінку, няўпынна глядзець на яе, любавацца.

Здавалася, што калі пойдзе ён ад яе, дык навек яе страціць. І згасне тады тое ружовае, светлае, што цяпер дрыгаціць гэткай чароўнай краскай у сэрцы.

Ужо позна было, а Булановіч яшчэ сядзеў у Гарновай. Не мог пайсці, не мог кінуць яе — сіл не ставала.

А яна таксама, калі збіраўся ісці, калі гаварыў пра гэта — сціскала яго сударгава, тулілася да яго палахліва.

— Не, не йдзі... Пачакай яшчэ... Не кідай адну... Страшна мне, цяжка адной...

У пакойчыку прытульным цурочкам цякла цішыня, навявала чароўную згоду. Здаецца, век бы сядзеў вось так удваіх і адчуваў, як сэрца з сэрцам вядзе бясслоўную ціхую гутарку.

Раптам Гарнова ўзнялася.

— Пачакай, Алесь, я пакажу табе нешта.

У шуфлядзе сярод пруду розных паперак знайшла яна маленькую пісульку і дала яму. Ён прачытаў:

«З гэтага часу будзь ты праклята. Няхай табе жыццё будзе горкаю доляй. Бацькава пракляцце спасцігне цябе на тваім ганебным шляху».

Булановіч зірнуў на яе дапытлівым поглядам. Яна, мусіць, зразумела яго нявыказанае запытанне і адказала:

— Гэта так... маленькая ілюстрацыя да жыцця да майго... Цікавая рэч, сапраўды? Такіх дакументаў я маю даволі...

Булановіч гарэў упартым жаданнем узнаць усё чыста, узнаць пра ўсе драбніцы яе жыцця. Здавалася, што абы ўзнаў ён, і зараз жа знойдзе тое, што дасць выхад з тупіка, у які яна трапіла, што знішчыць яе глыбокі адчай.

Но тады ўсё гэта здасца нікчэмным і смешным? Но разляціцца, як дым, гэты дзіўна сплецены, незразумелы клубок яе смутку?

Булаповіч узяў яе за руку, ахіпуў поглядам, поўпым шчырай, глыбокай пяшчоты.

— Марына, родная... Раскажы мне ўсё чыста пра жыццё пра сваё. Мне ўсё здаецца, што хаваешся ты, што не хочаш выказаць мне свае патаемныя думкі... Ведаеш, мне дужа крыўдна і цяжка робіцца, калі аб гэтым падумаю.

Яна ўсміхнулася ласкавай, добрай усмешкай.

— Ды не, Алесь. Я не хачу хавацца і не хаваюся. Я табе ўсё гавару, аб чым думаю. А расказваць пра жыццё — доўга гэта і непатрэбна... Але вось што... я раскажу табе. Раскажу тое, што дасць табе магчымасць многа чаго зразумець. Слухай.

Перш-наперш — гэта табе, пэўна, вядома — я дачка памешчыка з Віленшчыны. Ты не ведаў гэтага? Так, так... Самага сапраўднага пана з тысячамі дзесяцін зямлі. Рэвалюцыянеркай я рана зрабілася, як толькі навучылася глядзець на жыццё крытычна, разбірацца ў ім. Ну, вядома, эсэркай спачатку была. А жыла ў бацькі і часам карыстала яго асаблівую любасць да мяне на нашую справу. Бацька й не знаў, што тыя гасцінцы, якія дае дачцы, ідуць на змаганне з такімі, як ён. Ну, як там было — не цікава... Галоўнае пачынаецца ўжо пасля Кастрычніка. Я ўцякла з дому з адным чырвонаармейскім атрадам у той час, як савецкае войска адступала з нашай мясціны. Уцячы мяне прымусіла многа прычын. Былі й асабовыя чыста... каханне было. Але гэта глупства...

Вось з гэтага часу і пачалося маё жыццё. Я да вас далучылася, увабрала ў сябе тыя парыванні, той запал, што гарэў тады ў сэрцах паўстаўшых работнікаў. Я тады пачула тую магутную волю калектыву, аб якой я калісь табе гаварыла. Я злілася з ёй, у ёй растапілася, працялася наскрозь агульнай сталёвай думкай, агульным бурлівым пачуццем...

І як лёгка, добра было тады! Ведаеш, Алесь, я ўвесь час была тады быццам у нейкім чароўным хмелі, я не прыкмячала, як ляцеў звар'яцелы час. І як добра тады працавалася! Ніколі не чуваць было зморы. А працаваць многа даводзілася... Дзе, на якой справе я працавала — ты ведаеш... І вось нешта раз я атрымала ліст ад бацькоў. Тады ніштo яшчэ: лаяліся, вядома, заклікалі вярнуцца назад. Я адказала ім. Напісала вось так, слова ў слова: «Не лічыце мяне вашай дачкой...» Мне тады проста смешна было з усяго гэтага. Між упартае працы гэта была нібы забава

маленькая. А яшчэ троху пасля здарылася тое страшнае, што, мусіць, навекі адбілася на маім нутры...

Да мяне прыйшоў брат. Ён працаваў у адпой патаемнай контррэвалюцыйнай арганізацыі і ў той час быў прыціснуты да сцяны. Яшчэ колькі дзён — і ён павінен быў трапіць у нашыя рукі. Ён прыйшоў да мяне шукаць абароны, ён спадзяваўся, што я, як сястра, выратую яго. Ах, як прасіў ён мяне, каб я пасобіла яму ўцячы за мяжу, як ён кляўся, прысягаў, што не будзе больш весці сваю контррэвалюцыйную працу. Бедны, ён так спалохаўся небяспекі, што думаў толькі аб тым, каб выратаваць сабе жыццё. Мо каб хто чужы так прасіў, я б не ўстрывала, дала яму ратунак. Але гэта быў брат, а ў той час нікога я не лічыла такімі ворагамі, як сваю радню...

Яго расстралялі. Так. Я сама падпісала смяротны прыгавор... А ўсё-такі я многа тады змагалася сама з сабоій. Шавялілася троху кроўнае пачуццё. Мае рукі дрыжэлі як у ліхаманцы, калі я падпісвала гэтую страшную паперку... Хутка пра гэта дома прачулі. Тады вось і пераслаў мне бацька гэту пісульку. І, ведаеш, цяжка мне стала, як я прачытала яе. Быццам нешта навалілася на мяне, прыдушыла страшэнным, жудасным цяжарам. Праўда, я хутка пазбылася гэтага пачуцця, я затапіла яго ў моры напружанай, ліхаманкавай працы. Але след застаўся. Я пачала часам задумвацца, чагось сумаваць. І пачула, як ліпучай павучынай пачынае абвязваць мяне страшэнная змора. А разам раджалася пачуццё адзіноты, нездавальнення...

Апала навальніца бурлівая, жыццё пачало ўкладвацца ў сталыя рамкі. Пачалася другая работа — руплівая, нудная. Я лішняй пачула сябе, не магла прыстасавацца да гэтае новае працы. І заззяла чорным бяздоннем у душы пустата. Холад ахінуў. Сумна так стала.

Гарнова змоўкла, задумалася. Была такая ціхая, смутная. Потым схапянулася, раптам прыціснулася сударгава да Булановіча, задрыжэла ўся.

— Алесь, любы моій... Я табе ўсё... усё чыста скажу аб сабе... Мне ўночы часам дужа страшна бывае. Неўкі смяртэльны спалох надыходзіць... Крычаць тады хочацца, зваць каго, каб прыйшлі, каб быў хто са мной.

Зноў сціхла. Ціша ў пакоі стала старожкай, злавеснай. І раптам гэтую цішу працяў зазыўны прарэзлівы гудок цягніка. Ён быў поўны дзіўнага, смелага задору, у ім бурным воклікам зычэла магутная вешчая воля.

Гарнова ўсхапілася. Загаварыла быццам зачараваная, быццам у сне:

— Во... ён кліча мяне... Ён вабіць мяне сваім настойлівым крыкам. Ён знае, што прыйду да яго, што ў яго буду шукаць ратунку сабе... Алесь, ты не ведаеш, як я люблю чыгунку... Яна будзе магілай маёй...

Булановіч маўчаў, апанаваны цэлай бурай розных пачуццяў. Жаль ціснуў сэрца, ахінаў яго агнём балючай пяшчоты. І разам давіла мазгі нешта цяжкое, неразумелае, нешта такое, што поўніла нутро глухім непаразуменем...

А ноч усё цякла, усё пасувалася.

У вокнах ужо зашарэла...

6

Сягоння замардаваўся Булановіч. Цэлы дзень упартай, рунатлівай работы падарваў сілы. Як прыйшоў, урэшце, дамоў, паваліўся на ложак зняможаны. Па целе прыемнаю хваляй расцяклася цягучая млявасць, а ў галаве зыбучай пялёнкай захістаўся туман. Сон цяжэрна звесіў павекі.

Ужо ледзь не заснуў Булановіч, але раптам нехта ў дзверы паляпаў.

— Увайдзіце!

Памалу адчыніліся дзверы, і ўсунуўся сваёй даўгалыгай нязграбнай фігурай Абшарскі.

Яго Булановіч ніяк не чакаў і надта здзівіўся.

А Абшарскі прывітаўся, сеў ля стала і пачаў маўчаць. Булановіч тож нічога не гаварыў, сачыў за ім моўчкі. Чуў, што нездарма Абшарскі прыйшоў, што мае нешта сказаць. І дужа карцела пачуць гэта «нешта», але пядобра было запытацца. Чакаў, каб сам ён пачаў.

Урэшце Абшарскі пачаў сваім ціхім маркотным голасам:

— Т[аварыш] Булановіч, я прыйшоў да вас пагаварыць аб надта важнай справе...

— Калі ласка.

— Я ведаю, вас дужа здзівіць тое, аб чым я скажу вам, але... усё роўна... я павінен гэта зрабіць...

Ён ізноў памаўчаў, быццам падбіраючы словы.

— Во што, таварыш Булановіч, я хачу з вамі пагаварыць аб Гарновай...

— Калі ласка. Я слухаю.— А сам падумаў:

«Прэтэнзіі хіба хоча свае заявіць...»

Ахапіла цікавасць. З нецярплівасцю чакаў, што скажа далей Абшарскі.

— Т[аварыш] Булановіч... я не ведаю, як вам гэта лепей сказаць... Я хачу прасіць вас, каб вы... жаніліся на Гарновай...

Булановіча пібы варам абдалі. Усяго ён чакаў ад Абшарскага, толькі не гэтага. Глядзеў на яго, няўцямна вылупіўшы вочы.

Абшарскі неяк замятушыўся, заварочаўся на месцы.

— Вас гэта дужа здзівіла? Я знаў, што так будзе... Мне цяжка было гаварыць аб гэтым... Але вы паслухайце... Я вам скажу ўсё... Бачыце, я люблю яе, дужа люблю... Мо гэта якая асаблівая любоў, не такая, як зазвычай, не ведаю... І я не магу бачыць, калі яна мучыцца, калі пакутуе гэтак...

— Выбачайце, а чаму вы думаеце, што калі я з ёй ажанюся, дык яна не будзе мучыцца?

— Я знаю, я пэвен у гэтым. У яе гэта з адзіноты. Ёй трэба такі чалавек, які быў бы каля яе, які б яе падтрымаў, памог пазбыцца таго адчаю, які часам яе ахапляе...

Булановіч яго перапыніў:

— Выбачайце яшчэ раз... А чаму вы думаеце, што гэткім чалавекам павінен быць я? Чаму вы, напрыклад, самі не будзеце такім?

Абшарскі ціха ўздыхнуў.

— Я не магу... Яна не захоча, бо яна не любіць мяне. А вас яна любіць, я знаю, я бачу...

Колькі хвілін маўчалі абодва. Потым ізноў Абшарскі пачаў:

— Т[аварыш] Булановіч, вы павінны зрабіць гэта. Я вас дужа прашу... Ратуйце яе, не дайце ёй загінуць... Яна ж такая добрая, такая любая...

Голас дрыжэў у Абшарскага, а ў вачах бліснулі слёзы. Булановічу шкода было гэтага недалужнага чалавека. Хацелася ўцешыць яго, заспакоіць. І дзіўнай, незразумелай здавалася гэткая шчырая самаахвяра, гэткая знявага да самога сябе, гэткая адданасць другому. Ён сказаў яму ласкава:

— Слухайце, т[аварыш] Абшарскі, вы ўгадалі, што мяне дужа здзівяць вашыя словы. Вядома, што я пэвен у іх шчырасці. Я надта дзякую вам за вашую даверлівасць. Але сказаць вам што-небудзь я цяпер не магу. Я буду думаць аб гэтым...

Абшарскі яшчэ сядзеў колькі хвілін. Ужо выходзячы, сказаў Булановічу:

— Я ўчора ў яе рэвальвер знайшоў... Я адабраў яго...

Булановіч міжвольна здрыгануўся.

— А яна што?

— Яна смяялася... Кажа — гэта я так для забавы дастала, а страляцца не маю намеру...

Як пайшоў Абшарскі, Булановіч яшчэ доўга не спаў. Думкі павадкай біліся ў галаве, уваччу мітусіліся пярэстыя вобразы. Твар Гарновай не сходзіў з памяці, усё лунаў — смутны, прыгожы, будзіў у сэрцы шчырае пачуццё. І ўжо гатова была скласціся пастанова, ужо гаварыў сам сабе:

— Так, я павінен ратаваць яе, я павінен з ёй жыць, быць заўсёды пры ёй, я павінен памагчы ёй пазбыцца яе згубнага настрою, вярнуць яе да жыцця...

Малявaліся вобразы новага супольнага жыцця — вобразы некпыя, але поўныя нейкай атрутнай млявасці, таго, што мякчыць чалавека, што падцінае яго волю. І вось гэта палохала. Проці гэтага паўставала нешта ўсярэдзіне, перасцерагала. Нейкі голас шаптаў:

«Зацягне, завалачэ ў багну бязволля. Сам тады прападзеш...»

Так цэлую ноч змагаўся з сабой. Заснуў пад самае ранне з пастановай пайсці заўтра параіцца з Арончыкам. Ён добры хлапец, разумны. Не памыліцца, дасць добрую раду.

Прачнуўся Булановіч гадзіне а дзесятай. Наспех выпіў чаю і пабег шукаць Арончыка.

Знайсці Арончыка не так было лёгка. Гэта ж такі чалавек, што не можа пабыць на адным месцы. Ён проста кіпіць ад навалы бурлівай энергіі, ён у клопатах, у працы знаходзіць сабе асаблівую асалоду.

Булановіч злавіў яго недзе на пасяджэнні. Чакаў з паўгадзіны, пакуль кончыцца, потым пайшлі разам.

Вуліца млела ў паўдзённай спякоце. Сонца быццам прыхілілася да зямлі, прыціснула горад сваім густым душным зяпнем, усклала на ўсё адбітак санлівай перухомасці.

Было цяжка ў гэтым пякельным вары. Зморана спынялiся ногі, цела ўсё нібы распускалася, сцякала бяссільна ўніз. Хацелася сесці, адпачыць.

Булановіч з Арончыкам завярнулі ў гарадскі сад. Там

абабралі мясціну прытульную, селі па лавачку ў засені.

Арончык на гэты раз не спяшаўся. Ці мо нейкім дзівам час вольны меў, ці мо й яго гарачыня троху прабрала, троху зменшыла невычэрпны запас яго энергіі. Сядзеў спакойна, уважна слухаў, аб чым апавядаў Булановіч. А той расказаў усё па парадку. Прызнаўся Арончыку ў тым, што паміж ім і Гарновай было, расказаў і пра Абшарскага. Як скончыў расказваць, запытаў Арончыка:

— Скажы мне цяпер — шчыра, па-прыяцельску: што я павінен зрабіць? Толькі сур'ёзна скажы, не жартуй, не аднеквайся...

Арончык насупіў свае густыя, паўкругам бровы, надуўся, напружыўся. Відаць, моцна, стаіоўка думаў. А потым бровы высока ўзняў, пакрывіўся паважна й пачаў:

— Слухай, што я скажу табе, Булановіч. Зірні ты сам сабе ў нутро, падрахуй свае сілы і дай адказ самому сабе: ці здолееш ты яе ратаваць? Ці здолееш выцягпуць яе з гэтае процьмы? Калі так, дык жаніся. А калі не — лепш не пачынай, бо часам сам можаш трапіць у багну. Ты ж ведаеш, што гэта за штука — каханне. Гэта ж — слабасць... так, слабасць. Гэта такое зелле, якое многа дужых людзей паламала, звярнула іх з пэўпага шляху... Ты добра падумай аб гэтым.

І, памаўчаўшы, дадаў:

— А ёй бы трэба было памагчы. Яна многа чаго нам зрабіла і, можа б, яшчэ сякую-такую карысць прынесла. Трэба б было памагчы...

Булановіч шчыра пад'якаваў Арончыку. Больш не пытаўся, нават кінуў гаварыць пра гэта. А як разышліся, пачаў упарта абдумваць справу, пачаў правяраць сам сябе.

— Ці хопіць сілы? Ці здолею?..

Не мог адказаць, бо не было яспасці ў думках, бо ў галаве хваляваўся ружовы душны туман. І больш увагі прыцягвалі апошнія словы Арончыка:

— Трэба б было памагчы...

Яны мацней заселі ў мазгах, бо адпавядалі настрою, пачуццю. І хацелася на іх адных грунтавацца, толькі іх мець на ўвазе.

Трэба памагчы... Вядома, трэба... Ён павінен гэта зрабіць. Ён зробіць гэта...

Пастанова крэпла, расла, пераходзіла ў магутнае імкненне. А вобраз Гарновай смела ўставаў увачу, вабіў,

цягнуў да сябе, абураў грудзі нецярплівасцю прагнаї, жаданнем як найхутчэй зрабіць тое, што стала ўжо канчатковым, пэўным рашэннем.

7

Ціха, паволі асядае на горад цёплы ласкавы вечар. Ахінае ціхаї прытульнасцю, шэпча на вуха саплівым шолахам дрэў.

Аб чым шэпча?

Мо аб тым, як добра паласць агнём прамяністым кахання, як добра адчуваць непазбыўную душную смагу, жаданне нязведаных радасцей, палкіх уцех? Мо аб тым, як прыемна млець у чароўнай знямозе, у дзівоснай напружанасці ўстурбованых нерваў?

Мо аб тым так соладка шэпча ласкавы вечар? Мо аб тым пяюць ціхую песню таемныя дзіўныя шолахі?..

Булановіч з Гарновай знайшлі сабе ў садзе цудоўны прытулак. Добра тут — у самым глухім куточку, пад ветлай разложыстай яблыняй! Тут так ціха, што чуваць, як сэрца б'ецца ў грудзях. Тут — адны яны, адмежаваныя ад усенькага свету, цалкам адданыя свайму пачуццю.

Гарнова прытулілася шчыльна да каханка свайго, схавала галаву ў яго на грудзях. Сядзіць нерухліва, быццам прыслухваецца да ўцехі, да шчасця свайго, быццам баіцца, каб лішнім рухам, лішнім словам не спудзіць гэтага чароўнага, салодкага настрою.

А Булановіч неспакойны. Турбуе назойлівая, упартая думка, не дае спакою. Сёння ён павінен сказаць Гарновай аб тым... Сёння ён павінен прапанаваць ёй тое, на што рашыўся колькі дзён назад. Кожную хвіліну хоча пачаць ён, хоча выказаць усё. Але нешта спыняе. І стыгнуць на вуснах нявыказаныя словы.

— Што яна на гэта? Як адкажа?

Нібы страшна чагосьці, сіл не хапае сказаць.

Але, урэшце, адважыўся:

— Ведаеш, любая, я хачу нешта сказаць табе, слухаї...

Яна ўзняла галаву, упялася ў яго чакаючым поглядам.

— Марынка! Я надумаў нешта зрабіць. Я хочу змяніць нашы адносіны. Мы пакахалі адзін аднаго — шчыра, моцна... Мы адзін аднаго разумеем. Чаму нам не жыць разам, не стаць мужам і жонкаї?..

Чуў Булановіч, што неяк нязграбна, карузла выхо-

дзіць. Дасадліва моршчыўся, ждаў, каб хутчэй яна што сказала, каб развеялася гэтае прыкрае ўражанне.

А яна маўчала. Доўга маўчала. Мабыць, думала, як лепей яму адказаць. Потым пачала:

— Алесь! Ты выбач мяне, але я табе проста скажу: не хочу я гэтага... і не зраблю. Я не хочу псаваць сабе апошнюю ўцеху. Я ведаю, як гэта будзе: шэрасць, нуда, беспрасвецце. Усё тое прыгожае, што ёсць цяпер, што захапляе, хвалюе,— усё гэта знікне... Не, я не хочу так... не трэба... І ты, Алесь, не настойвай. Кінь гэту думку...

Булановіч не чакаў такога звароту. Гэтыя словы здзівілі яго. І разам яны падлілі ў агонь масла. Замест таго, каб згадзіцца, каб кінуць пра гэта, ён ахапіўся цяпер упартым жаданнем дабіцца свайго. Ён увесь гарэў пачуццём, ён у палкай пяшчоце галубіў яе, цалаваў рукі і настойна, упарта прасіў, каб згадзілася. А калі яна адмаўлялася, ён яшчэ больш захапляўся, яшчэ з вялікшай сілай настойваў.

І тады толькі схапянуўся, як заплакала Гарнова, затрапяталася ў моцным сударгавым рыданні. Тады змоўк, не ведаў, што рабіць. Не разумеў, чаму Гарнова заплакала.

А яна парыўчата гаварыла скрозь слёзы:

— Дрэнны ты, злы... Ты мучыш мяне, ты псуеш мне настрой, здзекуешся над пачуццём над маім. І толькі затым, што табе хочацца так... Усе вы такія... без сэрца, эгаісты...

І ўсё плакала бесперастання. Булановіч ледзь суцешыў, заспакоіў яе. Пагадзіліся на тым, што ён даў слова ніколі нават не гаварыць аб гэтым. Гарнова тады заспакоілася, зноў прытулілася да яго і толькі раз-пораз усхліпвала, быццам пакрыўджанае дзіцянё. А як расставаліся, Гарнова сказала яму з ласкавым дакорам:

— Алесь, любы мой... Ты ніколі не крыўдзі мяне... Ты ж ведай, што наша каханне — гэта астатняя ўцеха мая, гэта прыгожая акраса астатніх дзён...

Ён перапыніў яе:

— Што ты гаворыш усё — астатняя, астатняя... Марына, кінь ты настроіі гэты свой. Навошта гэта? Адно мучыш і сябе і мяне...

Яна не адказала нічога. Толькі глыбока-глыбока ўздыхнула.

Праз колькі дзён пасля гэтага Булановічу ўсё-такі прыйшлося яшчэ раз гаварыць на гэтую тэму.

Было так. Ён неяк позна ўвечары вяртаўся з чыгункі: ездзіў на вёску па служебовых справах. Проста з вакзала накіраваўся ён да Гарновай.

На галоўнай вуліцы яшчэ гарэлі агні, яшчэ сноўдаліся гаварлівай гурмай пачныя гулякі. А ў завулках, у куточках глухіх ужо ўсё сціхамірылася. І вокны не свяцілі ўжо тупа-бліскучымі засланкамі, не цалаваліся з цемраї чарнільнай. Схаваліся, зніклі, быццам і звання іх не было ў гэтых мізэрных хібарках, што палахліва адступалі з дарогі цьмянымі плямамі.

У дзіцячым доме, куды падышоў Булановіч, тож было цёмна. Але тое акенца, якое Булановічу добра знаёма, якое заўсёды спыняе на сябе яго погляд — гэта акенца яшчэ свяцілася прыветным агеньчыкам.

«Значыць, не спіць...»

Дзверы чамусьці адчынены. Мусіць, ёсць пехта чужы, бо звычайна іх запіраюць.

Булановіч прайшоў проста да пакоя Гарновай і, не папытаўшы дазволу, адчыніў дзверы. І ўбачыў ён: Гарнова на ложку сядзіць, а перад ёй на каленях Абшарскі.

Асалапеў Булановіч. Хацеў адразу назад павярнуцца, але Гарнова спыніла:

— Алесь, пачакай! Што ты спалохаўся?

Абшарскі памалу ўзняўся, сеў у кутку, вінавата ўтуліўшы лысую галаву. Булановіч не разумеў нічагутка. Глядзеў дапытліва ў вочы Гарновай, чакаў тлумачэння.

Яна засмяялася.

— Ну, ты чаго глядзіш так? Быццам цябе аглушылі... Ці мо цябе здзівіла гэтая сцэна, га? Я табе зараз скажу: мой паважаны рыцар сёння чэпіцца да мяне цэлы вечар. Усё просіць... і ведаеш, аб чым? Згадай... Аб тым, каб я за цябе замуж пайшла... Ты, пэўна, і не знаў, што маеш гэткага добрага свата...

Булановічу прыкра неяк стала. Дасада ўзнялася на Абшарскага. Што яму трэба? Чаго ён гэтак турбуецца? Чаго назаляе вечна? Лезе з сваімі паслугамі... І ведае ўсё, гэты пазначны, педалужны чалавек, усё прыкмячае, аб усім дазпаецца! Быццам цень пейкі, сочыць усюды, за ўсім...

Булановіч нічога не адказаў Гарновай, і на колькі хвілін запанавала цяжэрная маўчанка. Потым Абшарскі загаварыў. Гаварыў вінаватым голасам, быццам хацеў перапрасіць Булановіча, выпраўдацца перад ім.

— Я гаварыў аб тым, аб чым калісь вам казаў, т[аварыш] Булаповіч. Я зычу толькі дабра. Я хачу, каб Марына Паўлаўна была шчаслівая, каб яна не пакутвала...

Раптам Гарнова ўзлавалася:

— Якое вам дзела? Хто даў вам права аба мне клапаціцца? Я маю свядомасць і сама ведаю, што трэба рабіць...

Яе голас дрыжэў. У вачах гарэлі, пераліваліся агапькі гневу.

Абшарскі моўчкі ўзняўся.

— Марына Паўлаўна! Паверце мне, што я ніколі не хацеў вам зрабіць што благое. Усё, што мучыць вас, мучыць не менш і мяне... а мо яшчэ больш, бо я...

І не даказаў. Выйшаў шпарка з пакоя — высокі, сутулаваты, нязграбны. Пакінуў за сабою ўражанне нейкай напятасці, нялоўкасці.

У Булановіча цяпер не было ўжо ані крушыначкі злосці. Замест таго жаласць з'явілася да беднага Абшарскага. Ён сказаў Гарновай з дакорам:

— Нашто ты так з ім. Ён жа так любіць цябе. Яму ты даражэй за ўсё...

— Я знаю гэта, Алесь. Але ж часам не хапае цярплівасці. Назаляе гэта маўклівае каханне, нуду наганяе... А часам злосць возьме. Тады й пакрыўдзіш яго нізавошта... Але глупства. Пасля ўлашчыцца.

У той вечар не было паміж Булановічам і Гарновай звычайнай блізкасці, звычайнай ласкі. Гарнова была далёкая нейкая, чужая. Увабралася ў сябе, адгарадзілася ад яго халоднай, сухой пустатой сваіх глыбокіх вачэй. І сама ўся была халодная нейкая, ціхая. Булановічу здавалася, што вінаваты ў гэтым Абшарскі з яго недарэчным учынкам. Зноў востра тачылася ў сэрца прыкрая злосць. Разам з ёй унутры бязладнасць раджалася нейкая, раскіданасць. Не знаў, як падысці да Гарновай, як разагрэць яе ледзяны холад.

І даў тады сам сабе слова ніколі больш не гаварыць з ёй аб жаніцьбе, не кратаць больш гэтага пытання.

8

Прайшло два тыдні. Булановічу яны праляцелі бліскавіцай-маланкай. Увесь час быў нібы ў чадзе і не прыкмячаў, як чарадой адналернай мігаюць гадзіны. Аддаўся

цалком пачуццю, утапіў у ім усю істоту сваю, ачмуціў сядомасць ружовым туманам.

Часам схапянецца, зірне сам на сябе з здзіўленнем. Падумае:

«Што як гэта? Чым гэта кончыцца ўсё?»

І з жахам адчуе, як глыбей і глыбей уцягваецца ў атрутнае дрыгвянос бяздонне, як губляе моц сваю, волю. А спыніцца, вярнуцца — не змога.

Гарнова дзіўнаі стала ў апошні час. Рэдка цяпер весялосць маладая асвеціць яе сумныя вочы. Рэдка калі зазвініць яе задорны, гарэзлівы смех. Больш усё ціхая, смутная. Задумленне маўклівае не сходзіць з паніклівага твару.

І з Булановічам яна дзіўная нейкая. То халоднай няўважнасцю яго сустракае, быццам далёкі ён стаў ёй, чужы, быццам ужо знялюбеў. А то раптам закіпіць пачуццём бурным, парыўчатым, агорне яго нястрымана-гарачай ласкай.

Булановіч бачыць гэта і думае часта аб гэтым. Напружвае розум свой, хоча згадаць, зразумець, што робіцца з ёй. І не можа. Толькі трывогу няяспую ў сабе распальвае, прымушае сэрца балюча зпібець у нейкім невыразпым прадчуванні.

Была субота. У гэты дзень Булановічу заўсёды бывае многа работы. Толькі к самаму вечару зволіўся і адразу пайшоў да Гарновай. Заспеў яе ў дварэ. Сядзела ўпацёмку, не паліла святла. І як Булановіч прыйшоў, нейкі час у змроку сядзелі. Так больш ціхай, прытульнай чароўпасці, калі вакол змрок сиуе сваю шэрую павучынку, калі мякка загортвае абрысы прадметаў, сцірае рубы, усё робіць такім павеўным, расплыўчастым. Тады прыемна папінаюцца нервы і пачуцці асабліва глыбокімі робяцца.

Булановіч у змроку зусім не бачыць Гарновай. Толькі мяккімі контурамі рысуецца няясная пляма. Але блізкасць яе адчуваецца моцна, настоійліва. Будзіць, уздымае непакойпае пачуццё, казытае сэрца гарачай пяшчотай. Хочацца яшчэ большай блізкасці, хочацца зліцца зусім, патануць у глыбокім захапленні.

А Гарпова сёпня чамусьці ўнікае ласкі яго. Быццам баіцца яе, быццам палахліва стрымлівае сябе. І Булановіча ахапляе смаглае нездаволенне, турбуе нутро палкім жаданнем. Нездаволенне пераходзіць у неўкую крыўду, у гнеў. Здаецца — не любіць ужо, падакучыў ёй, знялюбеў.

Каб сілы хапіла — устаў бы й пайшоў. Нашто назаляць, набівацца дарэмна сваім пачуццём!

Але замест гэтага бярэ яе рукі, сціскае, гладзіць пяшчотна, абнімае нясмела любы, падатны стан.

— Марынка, галубка мая. Чаго ты такая маркотная? Чаму маўчыш усё, мяне старанішся? Мо ўжо не любіш, мо назаляю табе?

Яна адказвае нібы з нейкай дасадай, але ласкава:

— Ды не... Кінь ты, як табе не сорамна! Ну, проста настрой такі. Думаю я... Я, Алесь, многа думаю цяпер. Мо затым часам і мала ўвагі табе аддаю... Калі ж галава крышыцца з думак. Ведаеш, Алесь, я баюся, каб не звар'яцець. Часам ужо непрытомнасць нейкая находзіць. Тады страх агнявы калоціць усю. Усё тое ўваччу, што было калісь... праходзіць перад вачмі гэткай выразнай, страшэннай чарадой...

Яна часінку маўчала.

— Слухай, Алесь, ці дужа ты любіш мяне?

Замест адказу ён горача сціснуў яе кволую, мяккую руку.

— А што б ты аддаў за мяне? Што б ты мог ахвяраваць, каб было патрэбна для мяне?

— Не ведаю. Здаецца, што я не пашкадаваў бы для цябе нават жыцця...

Яна ўсміхнулася.

— Уга... Як многа!.. Але дарма ты гаворыш так. Гэта звычайна кажуць усе, як сядзяць з любай дзе-небудзь у ціхім прытульным пакоі... Ну, скажам, так: я б памірала і сказала табе, што хачу, каб і ты памёр разам са мной. Ну вось, скажы: ці згадзіўся б ты? Толькі шчыра адказвай. Ну?

Булановіч троху падумаў.

— Ведаеш, Марына, гэта б залежала ад моманту. Вось цяпер, мне здаецца, я б не спыніўся перад гэтым...

Яна не дала яму кончыць.

— Глупства ты кажаш. Ніколі б ты не зрабіў гэтага. І ніхто б у свеце так не зрабіў.

Булановіч падумаў і ў думках з гэтым згадзіўся. Чамусь раззлаваўся сам на сябе.

«Дайшоў да чаго... да чаго раскіселіўся. Не разумею ўжо, што гавару...»

Устаў і нервова засігаў па пакоі. Быў унутры нейкі разлад. Нейкі путраны голас узнімаўся, паўставаў проці тае ўлады, якую забрала над ім пачуццё, проці бязволля,

слабасці, пто ўсяго спавілі ліпучымі ланцугамі, што апля-лі, акруцілі павучыпнем атрутным.

Гарнова тож узнялася, запаліла святло. Булановіч зір-нуў на яе і здрыгануўся міжвольна. Убачыў твар, праця-ты адчайнаі, бязмернаі мукаі. Здалося Булановічу, што гэта страшэнная мука пратачылася ў кожную рыску яе твару, у кожную рыску ўклала яскравы адбітак душэўна-га болю.

Яна села за стол, застыгла ў ціхаі нерухомасці. Быц-цам сама прыслухоўвалася да болю сваіго, быццам адда-лася ва ўладу сваіго пачуцця.

А Булановіч гарэў непакоіпым агнём глыбокага жалю. Сэрца дрыготна сціскалася. Хацелася суцешыць, згладзіць з любага твару гэты страшэнны адбітак душэўнаі мукі. Але слоў не было, не знаў, што сказаць. І моўчкі стаяў, глядзеў на яе з спачуваннем, з глыбокім жалем.

Яна раптам устала. Загаварыла ціхім парыўчатым го-ласам:

— Не магу я тут быць... Цяжка чамусьці. Быццам гэ-тыя сцены душаць мяне, грудзі сціскаюць. Я пайду, Алесь... К прыяцельцы сваёй схаджу... Мо развеецца на-строй. А ты, Алесь, не йдзі нікуды. Мне хочацца, каб ты тут быў, каб я кожную хвілінку знала, дзе ты, уяўляла цябе. Ты тут будзь... Я хутка прыйду... Толькі прайдуся... А калі спазнюся, ты ўсё роўна чакай... Я хачу так, Алесь. Чакай, пакуль не прыйду.

Яна стала апранацца. Булановіча скрабанула нейкая невыразная трывога. Ён звярнуўся да Гарноваі:

— Марына! Ноч цяпер, куды ты адна? Лепеі я такса-ма пайду... Я правяду цябе, там пачакаю...

Яна нібы страпянулася.

— Не, не... не трэба... я адна... я зараз вярнуся... Ты пачакай тут, Алесь...

А як выходзіла, падышла да яго, узяла абедзвюма ру-камі яго галаву, зазірнула ў вочы гарачым кахаючым по-глядам:

— Любы ты мой! Апошняя ўцеха мая!..

І пацалавала даўгім-даўгім пацалункам...

Булановічу пацягнуліся нудныі чарадоі хвіліны ча-кання. Плылі яны так адпамерна, марудна. Так дзіўна за-калыхвалі, паганялі тупую, млявую нерухомасць. Думкі ў галаве быццам спыніліся, закамянелі. Толькі па ўсёй

істоце ціха, паволі перабягалі лёгкія хвалі невыразнага пачуцця, краталі кволым павевам нейкія балючыя, чулыя струны. Была нейкая невымоўная асалода ў гэтым дзіўным пачуцці. І прыемна было чакаць так, у ціхай маўклівай самоце, у мляваї нерухомасці.

Плылі, цягнуліся хвіліны марудныя, грамаздзіліся ў грузка-паўзучыя гадзіны.

Гарпова ўсё не прыходзіла. Булаповіча памалу пакідаў спакой, змяніўся вострай турботай. Цяпер хадзіў па пакоі, узрушаны, спыняўся раз-пораз і пільна прыслухоўваўся да начной цішыні, шукаў гуку знаёмых крокаў. Ахапляла нецярплівасць, дасада, калі вуха не лавіла ніякага зыку, калі звонам маўклівым пела ўвушшу глухая цішыня. І хадзіў, усё хадзіў па пакоі.

У акно зазірнула падслепаватым вокам шэрая раніца. Палахліва кранула сваёй празрыстай рукой бяздушны свет лямпы, і зрабіўся ён пейкі мутны і цьмяны. І чым далей, тым больш урываўся ў пакой свежы свет раніцы, гарэзліва варушыў па кутках паследкі начпога змроку, накладаў на ўсё адзпаку дзённай цвярозасці.

Булаповіча агарнула трывога. І расла, усё расла ў грудзях, білася ў сэрцы боем няроўным, балючым. А думкі цяпер празрыстай яснасцю працяліся, рэзалі галаву ліханкавай работаї. Без канца свідравала мазгі:

«Што з ёй? Куды яна пайшла? Чаму так забавілася? Чаму яго прымусіла чакаць?»

Не знаходзіў адказу і мучыўся ў палкаї трывозе. І быццам наўмысля, каб павялічыць тую трывогу, прыляцеў знадворку даўгі, гулкі гудок цягпіка. Быў ён свежы такі, сакавіты, быццам памыўся ў золкаї вільгаці раніцы. Зычэў молада, смела, нібы выхваляўся задорам сваім, нібы дражпіўся сваёй вясёласцю гуллівай.

Гэты гудок працяў Булановіча сударгаваї дрыготаї. Ён пачуў у ім злавеснасць нейкую, нейкае страшное напамінанне.

Жудаснаї хваляіі агарнула новая думка, абярнулася ў страшэнную здагадку.

Булаповіч схапіў шапку і паспешна выйшаў на двор.

9

Паветра ахінула ядранай золлю. Было яно шэра-сталёвае, цьмянае, бо золак толькі яшчэ пачынаўся.

Ціха было. Але ва ўсім адчувалася нейкая жывая на-

пружанасць. Быццам начны спакой праціна ўся памалу яшчэ стрыманай энергіяй і над навалам яе во-во ўжо гатоў быў рассыпацца ў сумятлівую дзяшную рухавасць. І застыгла ў шэра-сталёвым паветры маўкліва-трывожнае чаканне.

Булаповіч шпарка пасігаў па вілаватых завулках. Свежасць раніцы не заспакоіла, а яшчэ больш нервы завастрыла. Трывога жудаснай хваляй паласкала путро, халадзіла сэрца ледзяной пустатой, па ўсім целе пускала нервовую дрыготу. Увачу жывой плямаю стаяла Марына, такая, якою была ў апошнюю хвіліну. Твар свеціцца мукай пякельнай, вочы — бяздонне пустое, халоднае. І быццам чакае яго, быццам кліча, просіць спагады. А ўвушшу няўпынна словы зычаць яе:

«Любы ты мой! Апошняя ўцеха мая!..»

Чаму яна зноў так сказала — «апошняя ўцеха»? Няўжо яна што надумала?

І бурлівым пажарам расла ў грудзях упэўненасць у самым страшэпным. Штурхала яго, прымушала бегчы ўгрунь. Куды? Аб гэтым нават не думаў. Само сабой цягнула туды, дзе гадзюкамі ўюцца сталёвыя рэйкі, адкуль часам ляціць гэты зазыўны прарэзлівы вокліч.

Чыгунка спаткала яго мёртвай ціпынёй. І гэта здзівіла. Як бег, думаў чамусьці, што тут павінна быць рухавасць, жыццё, што тут няўпыннай чарадою павінны грымець жалезныя волаты, што тут няма ночы, няма спакою. Аж — маўкліва ляжаць чорныя мокрыя рэйкі, быццам пацягваюцца ў перадранішнім сне. У абодва бакі хаваюцца, точацца ў воўпу туману бялясага.

І ўспомніў тады Булаповіч, што заўсёды бывае так, што чыгунка тож мае сабе адпачынак. І сціхамірыўся троху. Але не знікла трывога. Бо ціпыня на чыгупцы здалася чамусьці таемнай, старожкай. Быццам здрадліва сочыць за ім, хціва хавае ад яго пешта пад палой туману паўзучага.

Стаяў троху, думаў:

«Што ж цяпер? Куды? Хіба туды, дзе лес, дзе хадзілі калісь?..»

І пайшоў, акупуўся ў волкі туман. Як к лесу падыходзіў, ужо дзень расплыўся поўпым светам. Сопца чырвонай мятлой махапула па макушках сасопак, уліло ў паветра пешта прыветнае, цёплае.

У лесе птупкі розпагалоссем пярэстым з ціпой застылай спрачаюцца. Льюцца іх песні цурочкамі пекымі, мі-

тусяцца, блытаюцца ў вецці, спуюць жыццё раніцы — сакавітае, радаснае.

А Булаповіч не чуе гэтых чароўных спеваў, не бачыць таго хараства, што навокал раскідаецца пекнымі малюнкамі. Ён упяўся вачмі ў бесканцовую стужку чыгункі і ідзе, углыблёны ў сябе. Ён не ведае, што можа быць там, за тумапам. Ён не ўяўляе нават, што можа ждаць яго там. Але здаецца чамусьці, што во-во, яшчэ колькі крокаў — і будзе нешта страшнае, жудаснае.

Булаповіч і не прыкмеціў, як зайшоў далёка ў лес, і толькі тады спыніўся, як насустрач вылецеў поезд. Прамчаўся, прагрымеў, ашаламіў сваім рухам магутным і знік за паваротам, вільнуўшы жалезным хвастом.

Тады Булановіч схамянуўся. Завярнуў назад і падаўся на станцыю. Думаў ідучы:

«Што ж гэта я як звар'яцелы? Калі й здарылася што, дык жа папэўна заўважылі... Туды трэба, на станцыю. Ды мо й нічога не было? Проста стварыў сабе дурацкі настрой...»

Ён стараўся заспакоіць сябе, пераканаць, што няма нічога трывожнага, што дарма ён узрушыўся толькі. Ён азіраўся і бачыў, што ўсё навокал такое звычайнае, простае. Сонца, як і заўсёды, залаціць пожню вясёлым праменнем. Птушкі цвіркаюць прыветна, бязрупатна. А вунь — і людзі насустрач. Мужчына з кабетай. Спяшаюцца некуды, захапіліся жвавай гаворкай. Як з ім параўняліся, зірнулі на яго абое з цікавасцю і, прамінуўшы, зноў пачалі сваю гутарку.

К вакзалу падышоў Булановіч зусім заспакоены. Прайшоўся разы са два па бязлюднаму перону, потым пайшоў у пакой дзяжурнага агепта. Як уваходзіў, зноў пачуў неспакой усярэдзіне, але стрымаў сябе, звярнуўся да агента звычайным спакойным голасам, быццам яго мала цікавіла тое, аб чым хацеў запытацца.

— Скажыце, калі ласка, у вас сёння ўночы нічога не здарылася на чыгупцы?

Агент зірнуў на яго вострым дапытлівым поглядам, і гэты погляд спалохаў Булаповіча.

— А вас чаму гэта цікавіць? — запытаўся агент.

— Я маю на гэта прычыны, аб якіх вам сказаць не магу.

— А хто вы такі?

Булановіч сказаў. Агент, мусіць, здаволіўся.

— Так, у пас было сёння здарэнне...

У Булановіча пахаладзела нутро.

— Якое здарэнне?..

І мімаволі голас яго задрыжэў.

— Сёння а трэцяй гадзіне ўночы цягніком зарэзала адну жанчыну.

Булановіч міжвольна абапёрся аб стол, бо слабасць — цягучая нейкая, ліпкая — паплыла па усім целе, падкасіла ногі. Быццам гнёт наваліўся цяжэрны, прыдушыў, прыціснуў, скомчыў пачуццё ў балючы, даўкі клубок. Але яшчэ шавалілася слабая надзея. А мо не яна? Ці мала ж выпадкаў бывае?..

— Слухайце, а яе не пазналі? Невядома, хто яна такая?..

Чакаў адказу як свайго смяротнага прыгавору. А агент адбіваў роўным спакойным голасам. І ўсё дапытліва ўглядаўся ў яго.

— Так, яе пазналі. Гэта — Гарнова, адна камуністка тутэйшая.

Тады быццам парвалася нешта ўнутры ў Булановіча. Быццам адкрылася страшэннае бяздонне і загінула ў ім усё тое, што поўніла жыццё, што давала ўцеху. Заныла ў грудзях пустата, холадам атуліла сэрца, выціснула слязу скупую, балючую.

Потым захацелася ўбачыць яе, зірнуць апошні раз. Здавалася, што тады палягчэе, што тады не будзе гэтай даўкай пустаты ў сэрцы.

— Дзе яна?

— Тут, у пакгаузе. Вартуюць яе, але вам можна будзе паглядзець.

Як ішлі, Булановіч рыхтаваў сябе да самага страшнага, бо добра ведаў, што можа зрабіць з чалавекам жалезны волат.

Вартаўнік прапусціў іх. Булановіч убачыў на падлозе нешта накрытае брызентам. З краю кроў сочыцца.

Гэта яна! Гэта тое, што пядаўна было чалавекам!

Агент адгарнуў брызент. Адзін толькі момант глядзеў Булановіч. Не мог глядзець, адвярнуўся. Не пазнаў ён Гарновай, бо гэта ўжо была не яна: жалезны волат зрабіў сваё дзела.

Моўчкі выйшаў Булановіч з пакгауза і ціха пасунуўся ў горад.

Вакол купалася ўсё ў палкім сонечным свеце. Усё зяя-

ла жыццём — вечна маладым, вечна прыгожым, усё пыхала маладосцю і сілаі.

Булановіч не ўважаў ні на што. Углыбіўся, утуліўся ў сябе, прыслухваўся к таму, што дзеецца там, унутры. Стараўся ўяўляць сабе Гарнову, будзіў у думках вобраз яе. І калі паўставала яна ўвачыу — прыгожая, смутная,— тады ахапляў пякучы жаль. Не верылася, што няма яе. Здавалася — яшчэ стрэпуцца яны, яшчэ будзе тое чароўнае, ружовае, што было дасюль, што аздабляла жыццё.

Сам таго не прыкмячаючы, Булановіч падышоў да дзіцячага дома. З сяродку яго вылучаўся вясёлы, бязрупатны гоман дзяцей. А на ганку сядзеў пануры Абшарскі. Ён спаткаў Булановіча сваім цяжкім, нерухомым поглядам. Булановіч дагадаўся адразу, што Абшарскі ўжо ведае. Ён падышоў да яго, моўчкі прывітаўся. Абшарскі комчыў у руках неїкую паперку. Потым даў яе Булановічу, і той прачытаў:

«Згубіла сваё месца ў жыцці. Дык навошта жыць?

М. Гарнова».

Гэта яна напісала. Гэта яе апошнія словы. Але адкуль узяў гэту запіску Абшарскі? Як яна магла трапіць яму?

І злосць узнялася на Абшарскага. Дурная, прыкрая злосць. Злаваў на Абшарскага за тое, што ён усё ведае, што ён таксама, а мо яшчэ больш, шкадуе яе, што ён таксама любіў яе. І сам адчуваў Булаповіч, што злосць гэта нядобрая, брыдкая, але не мог яе пераадолець.

А Абшарскі гаварыў яму з сумным дакорам:

— Вы не ратавалі яе, вы не здолелі... А якая яна была добрая!..

У вачах у яго Булаповіч убачыў слёзы. Не адказаў нічога. Адвярнуўся ї паїшоў. Ішоў усё шыбчэй і шыбчэй, быццам хацеў уцячы ад гэтага недарэчнага чалавека, ад гэтага дома, ад усяго таго, што перажыў тут, што асадкам гпілым асела на сэрцы.

Гарадскі тлум канчаткова яго ацвярозіў, вярнуў да звычайнаї жыццёваї свядомасці. І побач з глыбокім жалем зарадзілася ўпутры нібы здаволенпе неїкае.

А мо так лепей? Для яго лепеї, бо разарвала тыя лі-пучыя путы, павучыпне тое атрутнае, што хмелем спавівала волю яго, што цягнула ў прыгожую, але грузкую, дрыгвяпую багпу.

І лягчэй рабілася на сэрцы. Узнімалася бадзёрасць

смага да гэтага сумятлівага, пярэстага жыцця, поўнага здаровага, магутнага руху.

А тое, што было, адлятала некуды ўдалеч, здавалася даўно-даўно прамінулым, ахіналася туманам зыбучым.

Успомніліся словы Арончыка:

— Кветка пажоўклая...

Так. Кветка пажоўклая. І таму адляцела, адпала ад дрэва жыцця, зволіла месца здароваму, свежаму.

І нямала было такіх кветак, што прыцягнуліся к сонцу Кастрычніка, што закрасавалі ў ім цветам жывым, пышна-дзейным.

Але глыбока ўраслі карані ў атрутна-гнілую глебу, набраклую лёкам смяртэльным.

І не вытрымалі палкага сонца.

Пажоўклі...

РАДАСЦЬ

Чалавек — гэта вір. Глыбокі і цёмны, дна якога не ўбачыць. Не ўбачыць і наогул таго, што дзеецца там, чым жыве таемная глыб гэтага віру.

Мы бачым паверхню яго, пералівы дзівосныя хваль — то буйных, віхурна ўзнятых, то дробных і кволых, як пераборы празрыстага ветрыку па струнах ціхае арфы.

Мы бачым толькі паверхню, а ўглыб зазірнуць, пранікнуць туды, дзе таемным бяздоннем звінулася цемра... О, каб пранікнуць туды! Каб разгарнуць гэты вір і ўбачыць усё, усё чыста, да самага дна...

Або сетку закінуць, каб выняць на свет хаця частку таго, што жыве ў таемным бяздонні...

Мо б бліснулі светлым нябачаным яснын перлы?

А мо там — глей адзін, ціна, пясок?

Часам у пералівах хваль, што скібамі рэжуць паверхню цёмнага віру, мы бачым адбітак насуплепых хмар, душным цяжарам навіслых над намі. Тады мы кажам:

— Гэта — Сум.

А часам выблісне сонца, і хвалі зайграюць вясёлкай, разарвуць, рассыпяць сопечны бляск у мільёны агнёў-самацветаў, рассеюць наўкола шчодраю жменяй іскры гарачыя. Тады мы кажам:

— Гэта Радасць...

Сонца бывае рознае. То яно — палкае, шчырае — прыпікае да самай зямлі, сціскае яе ў сваіх моцных абнімках, цалуе смагла агнёвымі вуснамі. То атуляе нас, песціць ціхай ласкавай цеплю, сагравае нутро, навязвае спакой. А то дык зусім неяк дзіка, недарэчы выгляне збоку, з-за хмар — касавокае — і падражніць, накпіць над дурным чалавекам.

Рознае сонца бывае.

І Радасць бывае рознай...

1

Ён зрабіў цяжкае злачынства: ён забіў чалавека.

Нашто ён зрабіў гэта? Мо хацеў гэтым чаго дасягнуць? Мо знайсці хацеў радасць?

Хто яго ведае. Тады ён не думаў аб гэтым. Наогул не думаў. Ні аб чым. Не мог думаць.

У тоі вечар, як гэта было, горад заплаканы быў. Камяніцы слязьмі абмываліся — такія панурыя, чорныя. Яны быццам сабралі з цэлага свету шэрую муць і лілі яе ў мокры прагал зарумзанай вуліцы.

Наогул, было ўсё слюпявае, нуднае. У такія часіны звычайныя людзі сядзяць у прытульных кватэрах і цешацца ціхім спакоем. Дзе ж такі знойдзецца дурань, каб шлындаць, як ён, па макроцці і ўбіраць у сябе журботныя слёзы дажджапага вечара!

Таму й вуліцы сёння надзіва пустыя. Калі-нікалі прабяжыць прастытутка ды праплыве часам нехта пад парасонам, прахлюпае важна галёшамі. А то яшчэ дзверы піўнушкі расчыняцца, і півам насычаны гоман выпхне на вуліцу колькі фігур. Хістаюцца, палошчуць у дажджы сіплыя галасы.

Калі стрэнуцца гулякі вясёлыя, у яго ў думках мігне:

«Чаму я сёння не п'яны?»

Дзіўна зробіцца й шкода.

А калі — з парасонам, тады чамусьці ўспомняцца дзіркі ў штанах, у ботах пачуюцца мокрыя ногі і золь мацней цела худое пратне.

Самае ж горшае, калі — прастытутка... Наогул — жанчына. Тады ж сэрца — дык не стрываць. Яно неяк збярэцца ўсё, сціснецца, быццам выскачыць хоча, уцячы. І сам увесь стуліцца, скорчыцца. Здаецца б — знікнуць зусім, праваліцца куды або змыцца гэтым дажджом, што ўжо да касцей дабіраецца. Або...

Эх, каб яна... Узяць так, сціснуць, каб хруснулі і косці... Каб і ў яе, і ў самога дух зацяло, каб упіцца...

І мімаволі кручацца рукі, шукаюць абнімкаў, і мімаволі крывіцца твар у злосна-прагавітую ўсмешку.

Дождж. Золь. Сцюдзёна.

— У-у-у, сцерва!.. Дражніцца... Корчыць невядома каго... курва!..

Стаў на гашку нейкага дома. Знайшоў вачмі халодны ліхтар і распусціў зморапы погляд у яго кволым міганні. Не заўважыў адразу, як падышла збоку фігура. Як ска-

зала — хадзем! — тады схапяшуўся, зірнуў пад старую хусцінку.

Распухлы твар, размытая фарба. Брыдота...

Штурхнуў з усёй сілы.

— Пшла!

Тая зірнула — і злосна, і жаласна.

— Чаго штурхаешся!

І па звычаі матам прыбавіла. Зашмурыжыла па мокрай панелі. Знікла.

Дождж. Золь. Макроцце. Па ўсім целе прыкрыя дрыжыкі. А крапуцца не хочацца. Усё роўна няма куды йсці.

Мо дахаты?

Так, хата ёсць. Не хата — куток. Нават цёплы. Але людзі там, многа людзей,— такіх, што гнятуць сваёй прысутнасцю, што напінаюць у паветры нявідную сетку пільнай варожасці, якая коліць первы.

Так ужо заўсёды выходзіць. А хто вінават? Можа, і сам ён? А можа, людзі... Усе людзі, увесь свет... і яна...

— Сволач, змяя падкалодная!..

— Любая, харошая, родная...

Каб яе ўбачыць. На рукі ўзяць, цалаваць, мілаваць... Яе вочы... Вунь яны там, дзе ліхтар. Якія яспыя, смелыя. І злыя... Ён найчасцей бачыць злыя...

Каб цалаваць гэтыя вочы...

— Не, не... Сцерва, гадзюка!.. І думаць не варта...

Узбурэнне штурханула з месца. Ізноў пачаў шлёпаць па лужынах.

Дождж троху сціх. Цяпер толькі трубы ўцішку паліва-лі панель ды дзе-нідзе з шумам зрываўся струмень — невядома адкуль — і разбіваўся аб камень, будзячы ціш звонкім пляскам. Ён трапіў пад адзін гэткі струмень. Здрыгапуўся, паслаў некуды моцную лаянку. Пайшоў шыбчэй.

Ён чуў, што злосць усё больш і больш забірае нутро. Знаў, што цяпер ужо не гаспадар сам сабе, што цяпер злосць гэта ім заўладае. І павядзе туды, куды не трэба ісці, прымусіць рабіць дурное, недарэчнае.

А там ужо злосці не будзе. Там горшае будзе. Будзе так, што зробіцца мяккім, агіднym, расплывецца, распісціцца. Будуць сабачыя вочы... Ён заўсёды адчувае, выразна адчувае, калі ў яго вочы пачынаюць агідна масліцца, плюскаць недалужна і салавець. Якраз як у сабакі.

Гэта заўсёды бывае. Ён знае гэта і не парадзіць нічога. Бо зазвычаіў там забярэ яго пешта, заўладае путром усім, волю скасуе. Заўсёды так...

Ён сышоў з галоўнае вуліцы і пакружыў па завулках. Ішоў шпарка. Не глядзеў пад ногі, наўмысля ступаў проста, шырока, быццам надкрэсліць хацеў, што цяпер ён сабой не ўладае, што цяпер — усё роўна...

А як асталося ўжо блізка, ціха паішоў. Не таму, што заспакоіўся — не... Сэрца нешта дурэць пачало: то спыніцца, быццам замлее, то раптам сарвецца, заскача, затроіцца. Калісь нехта казаў — неўроз.

— Неўроз... нервы... неўрасцепія... неўрал... трасца ўсякая...

Падышоў да бакоўкі. Адразу, як пачуў, што завалена, замахнуў кулаком, каб паляпаць са злосцю, усмак. Але стрымаўся. Часінку падумаў. Потым схапіўся за плот і пераскочыў.

Пастаяў на месцы, пакуль не растаў увушшу глухі мокры гук. Азірнуў уважліва двор.

Нікога няма, ніхто не ўгледзеў.

Паціху падышоў да акна, зазірнуў.

З момант стаяў, скамянелы. Ногці балюча ўцяліся ў далоні — так моцна кулакі сціснуў. Нахіліўся ўперад, да самае шыбы тварам прынік. У горле даўка застраў прыдушаны крык. Ледзь-ледзь стрымаў яго. Прамычэў толькі, як звер.

Потым ад акна адарваўся, сеў на мокрую лаўку.

— Буду чакаць. Няпраўда, дачакаюся... іш ты... Добра, пастой...

І ўвесь час паўтараў у думках пагрозы. Так лягчэй было, гэта затупляла боль. Але часамі балюча-яскравым малюнкам прарывалася тое, што бачыў там, за акном. Тады на целе едкаю хваляй прабягала турбота. Трудна ўседзець было. Варушыўся, як на вугаллі.

Прайшло многа часу. Можа, сапраўды і не многа, але ж яму цяпер міпуты за гадзіны здаваліся. Ды за даўгія-даўгія гадзіны.

Урэшце пачуліся крокі ў сенцах. Ён схапіўся, прытоіўся. Падаўся наперад, застыгнуў, замлеў. Толькі пальцы нервова перабіраліся, як кіпці ў дзікага звера, гатовага кінуцца на ахвяру.

Расчыніліся дзверы, матнуўся пасмаі шырокаі спод свету, расплыўся ў макроцці.

Галасы. Гутарка. Развітанне, мусіць. Потым — высокая фігура на ганках. Да болю знаёмая і нялюбая. Падняваe пад нос:

— Трам-тара-рам-там... ці-та-там...

Кінуцца на яго, упіцца зубамі ў здаволены твар, разарваць гэта горла, каб не дражніла самаўпэўненай песенькай!

А той і стаяў яшчэ, як наўмысля. Прыслухоўваецца. Мо пачуў ворага?

Пайшоў. Не няе ўжо, а свішча.

— Фю-цю-цю... фю-цю-цю...

Брыдота... Свішча яшчэ, быццам надсміхваецца.

Ляпнула бакоўка. Крокі — на вуліцы ўжо, зусім заміраюць.

— Гэта ж я... прапусціў... пусціў...

І сам дзівіўся, чаму так выйшла. Абмяк. Але зараз успомніў яе і зноў загарэўся. Падышоў да дзвярэй, ірвануў за клямку. Пайшоў.

Яна ўжо клалася спаць, раздзявалася. Дурная, чаму ж дзверы не заваліла за палюбоўнікам!

Яна адразу спалохалася. Ён заўважыў гэта, ён умее сачыць за тварам яе. Але ж яна не такая, каб паказаць сваё замяшанне. Яна стрымала сябе і зусім безуважнай зрабілася. Быццам яе ані-ні не турбуе, што ён к ёй прыйшоў.

О, яна хітрая, яна — змяя! Нават не захінулася. Так і сядзела на ложку без кофтачкі, з голымі рукамі. О, гадзюка! Думала — размякне ёп, распусціцца так, як заўсёды... Э, не! Сёння ён не такі. Пачакай, галубка, пабачыш!..

Сеў на крэсла к сталу, затарабаніў пальцамі. Хацеў яшчэ й засвістаць, ды ўспомніў таго, брыдкім здалося.

— Ну, чаго ты прыйшоў?

Пытаецца. Быццам не ведае...

— Начаваць прыйшоў да цябе, во чаго...

— Што, начаваць? Ха-ха!.. У мяне не гасцініца...

— Хіба не ўсім можна?

— Мабыць, і можна каму, але не такому, як ты... Ну, марш, спаць хочацца...

І пачала далей раздзявацца.

О, нашто яна гэта рабіла! Нашто спадзявалася так на сябе!

Ён больш не стрываў. Ён кінуўся на яе, непрытомны. Шалёная страсць злілася з шалёнаю злосцю і затапіла ўсё чалавечае. Астаўся звер.

Ён прыпаў дрыжачымі вуснамі к вуснам яе і адначасна акасцянелымі пальцамі, як абцугамі, сціснуў адкрытую шыю.

Яна трапяталася, хацела вырвацца. Дзе там! Выпусціў тады, як апошні раз здрыганулася і абвяла ў яго на руках.

Адышоўся, сеў ля стала.

Змора... змора... Адна змора... Ні страху, ні жаласці. Безуважнасць глыбокая.

Так сядзеў наўгадзіны. Потым узняў погляд і азірнуў няўцямна пакой. Зірнуў наўмысля ў люстэрка і аслупянеў.

Кроў... на вуснах кроў... у яго. Адкуль яна?

— А-а-а...

Быццам успомніў, задрыжэў увесь чыста. Пачаў азірацца спалохана, як загнаны звер. Адна думка цяпер заняла ўсю істоту:

— Ці бачыў хто? Ці зловяць?..

У галаве памуцілася — цяпер ужо ад страху. Ад вострага, агнёвага страху. Крадучыся, азіраючыся, выйшаў з пакоя, з двара і нырнуў у мокрую цемру...

. . . . . .

А радасць? Дзе ж радасць? І ці можа радасць тут быць? Ці месца ёй тут, дзе чалавек згубіў усё чалавечае, абярнуўся ў дзікага звера?..

Радасць была. Пасля была. Яна ўжо тады зарадзілася, як ён, працяты шалёным страхам, забіўся ў слізкае рыштаванне, што прыхінулася да вялізнай старой камяніцы. Тады ўжо радасць загарэлася ў ім ледзь прыметнай маленечкай іскрачкай.

Яна дзіўна, нязграбна ўткнулася клінам у бурнае мора спалоху, што захлынуў быў путро. Яна спачатку ледзь кранула ціхім прыткненнем яго сэрца. На твар выдавіла ўсмешку. Не ўсмешку, а след яе — хваравіты, убогі.

— Хе-хе... А мо й не дазнаюцца?

І потым клін гэтай радасці ўсё глыбей і шырэй забіраўся ў путро, выціскаў памалу спалох.

Больш пачуццяў не было: толькі спалох збітай навалай ды ў яго светлы клік радасці.

Але ж самая радасць была як хавалі.

Ён пайшоў на пахаванне. Ён заблытаўся ў гурме народу і праводзіў на могілкі цела сваёй ахвяры. Ён глядзеў на людзей, і людзі на яго глядзелі. Гаварылі аб забойстве, здагадкі рабілі. З ім нават загаварвалі аб гэтым. Ён слухаў, усміхаўся ўпутры і думаў сабе:

— Хе-хе... Вось і не ўзналі... вось і не ўзнаеце. А забойца тут, з вамі гаворыць, хе-хе...

Ён усё больш і больш ажыўляўся, ахвотна гаварыў, сам першы заводзіў гаворку. Сэрца рвалася ад затоенай радасці, і хацелася гаварыць. Многа-многа, са ўсімі.

Жалобна ліліся гукі аркестра, узмывалі наўкола цягучыя хвалі журбы. Здавалася, само паветра васпняе растала ад гэтых жалобных гукаў і асядала на дол ціхім плачам. Жалкавала аб бязвінна загубленым жыцці маладым.

А ён не чуў гэтага. Яму гукі аркестра былі цудоўнай уторай радасці. Яны злучаліся з радасцю, абмываліся ў ёй і пералівалісь ў гулліва-пабедную музыку.

Ён аж корчыўся ўвесь, стуляўся, сціскаўся, каб не выказаць свайго пачуцця. Хацелася голас падаць. Не закрычаць, а піскнуць хацелася — топка-топка і дзіка... А потым — кульнуцца катком, пакаціцца па мокрым бруку.

А ў паветры жалобна ліліся гукі аркестра.

. . . . . .

Сонца бывае рознае. Часамі яно неяк дзіка, педарэчы выгляне збоку, з-за хмар — касавокае — і падражніць, пакпіць над дурным чалавекам.

Рознае сонца бывае...

І Радасць бывае розная...

2

Я сам сваймі вачмі бачыў той стол. Ён стаяў, неўзаметку прыткнуўшыся да вялізнае паліраванае шафы, у самым брудным кутку гарадскога рынку. Шафа стаяла паважна і салідна — такая шырокая, тоўстая, як гандлярка з суседняга рундука. Здавалася — во-во падшмаргне падолле, схопіць пад пахі акольныя рэчы і паплыве па кірмашовай гразі.

А стол гэты ціхенька, моўчакам прытуліўся пад бокам у шафы і палахліва пазіраў на купцоў, не чакаючы ад іх нічога добрага. І праўда, калі хто й заўважыць яго, дык толькі штурхне пагардліва — і пайшоў. Ён затрасецца на слабепькіх ножках, паенчыць і зноў прыхінецца да шафы.

Стол быў складаны: дошка на дзве палавіны. Цяпер адна з палавін недалужна звісла далоў. Быццам сароміўся стол сваіх ног і схаваў іх ад людскіх поглядаў.

Я колькі раз прайшоў каля гэтага стала і не прымеціў, каб хто ўсур'ёз ім зацікавіўся. Я думаў ужо:

— Навошта лам'ё гэта вынеслі? Хто яго купіць?

Але я памыліўся. Знайшліся купцы.

Я не гандляр і не маю гандлярскага спрыту. Але я адразу згадаў, што яны хочуць, усур'ёз хочуць купіць гэты

стол. Яны не сышліся нават, прайшлі міма — нібыта што... Але ж гэты позірк і потым гэты стрымлены крок, разважанне, нясмелыя рухі рукамі ў тоіі бок, дзе стол... О, пас з гандляром не паддурыш!

Яны былі ўдваіх: пажылая жанчына і хлапец гадоў дзесяці.

Уся худая фігура жанчыны, твар яе, рухі,— усё працята было тоіі застыглай смутнай сур'ёзнасцю, якую можа выснаваць толькі цяглае шматгадовае гора. Дый вопратка — досыць зірнуць толькі: рыжая паддзёўка — абшарпапая, з плямамі; спадніца, убога абвіслая; чаравікі... не чаравікі, а так неіікі дзіўны, недарэчны абутак,— мабыць, апоркі, ці што... З усяго выглядае гарота.

А хлапец? Што ж хлапец... У яго — цікавасць. У яго ії вочы — дык як не вырвуцца толькі: бегаюць, гараць.

Яны прайшлі разы са два яшчэ воддаль, потым пастаялі, адвярнуўшыся ўбок, і тады падышлі ўжо к сталу.

Жанчына павярнула яго, паківала, а хлапец дошку падняў, зазірнуў. Потым яны пачалі таргавацца.

О, як таргавалася гэта жанчына! Яна надбаўляла толькі па дзесяць капеек і гандляра прымушала на столькі ж збаўляць. Як яна ганіла стол! Колькі знаходзіла ў ім недахвату! Як спрачалася з гаспадаром, калі тоіі яго бараніў!

А хлапец усё нікаў каля стала і тож заганы шукаў. Калі знаходзіў, ён з пачуццём вялікай набеды паказваў на іх. І вочы яго гарэлі шчырым здаволенпем.

Урэшце яны старгаваліся і ўрачыста паняслі свой здабытак праз рынак. Чуваць было, як яны, ідучы, суцяшалі самі сябе, даводзілі адзін аднаму, што стол добры, што ён не вельмі ківаецца, што «тую ножку можна прыбіць», што наогул заган асаблівых няма — не горш за іншага новага.

Я прагледзеў усю гэту сцэну. Мне неяк не на сабе стала, я расчуліўся. І маё сэрца радзіла мне казку. Я раскажу яе зараз.

Але ці казка гэта? Мо гэта так і было? Мо гэта не казка, а праўда жыцця?..

. . . . . .

Гэта была сям'я рабочага. Сям'я такая... Гаспадар — чорнарабочы, чалавек з вечна зморапым тварам, на якім жыццё пасеяла столькі маршчынак, колькі перацягнуў ён тачак цяжкіх, набітых пяском. У якога жонка — жанчына, працятая тэй застыглаї смутнаї сур'ёзнасцю, якую ро-

дзіць шматгадовае гора. І дзеці: дзяўчынка — трынаццаць гадоў, хлапец — гадоў дзесяць і другі — гады тры.

Жыла сям'я гэта ў убогай кватэры на акраінным брудным завулку. Кватэра ў іх у два пакоі. У адным удоўж і ўпоперак ложкі — гэта спальня. А другі — зала, сталоўка і г. д. Тут і мэбля стаіць, гэта значыць: шафа, стол і чатыры крэслы.

Гэты другі пакой шмат гадоў быў галоўным цэнтрам сямейнага жыцця. І праз увесь гэты час у ім быў пусты адзін кут. Недарэчна, дзіка пусты. Пусты — бо не ставала мэблі, каб запоўніць яго.

Гэты кут сваёй пустатой халадзіў увесь пакой, быццам глытаў бяздонным зевам сваім прыветную цепль сямейнага шчасця. Ён не даваў звіцца ў сям'і радаснай, ціхай прытульнасці. Ён напамінаў, крычаў зларадасна аб бядоце, аб цяжкіх нягодах жыцця. Ён — страшэнна, жорстка пусты — уліваў пустату і ў жыццё гэтай сям'і.

Бывала так: збярэцца сям'я, адпачывае. Ціхамерная згода гатова ахутаць усіх сваім лёгкім крылом. Во-во ўжо, здаецца, прыйдзе і цёпла зайскрыцца ў пакоі радасць. Але зірне каторы ў пусты халодны куток і ўспомніць. І пяройдзе да ўсіх, і пратне ўсіх жорсткім павевам скразнік непрытульнасці, злосна выштурхне радасць з пакоя.

Во як бывала...

І вось, урэшце, у сям'ю беднага рабочага прыйшла радасць. Яна ўвайшла ў хату разам з сталом, што прыцягнулі з рынку матка і сын. Яна зусім відочна, прыметна ўвайшла, як нейкая жывая істота.

Яе першая стрэла дзяўчынка-дачка.

Дзяўчынка ў трынаццаць гадоў... Як можна апісаць яе радасць? Ці ёсць словы такія — жывыя, агнёвыя,— якімі б выказаць гэта? Ці мо апісаць выяўленне надворнае гэтае радасці? Мо расказаць, як скакала яна, як пляскала ў ладкі? Мо расказаць пра бляск яе вочак — чыстых, як у крыніцы вада?..

Не, лепей во што...

Яна пацалавала свайго мурзатага брата. Той пачаў быў яе супімаць, усцішаць. Бо ён жа сур'ёзны зусім, ён з мамкай сам купляў гэты стол, у яго й шапка аблезлая на самыя вочы важна насунута. А яна тады абхапіла яго і пацалавала.

Сястра пацалавала брата. Сястра — брата... Ну, годзе, здаецца?..

Дык вось як стрэла дзяўчынка радасць.

Гэта было ўжо шэраі гадзінаі. Неўзабаве прыйшоў гаспадар. Запалілі святло, пілі чаі. Пілі, вядома, за новым сталом, хоць і нязручна было. Гамапілі, смяяліся. Дзеці дурэлі. Словам, было так, як заўсёды бывае, калі ў госці прыходзіць радасць.

А потым прачнуўся малы. Заплакаў, засмчыў у спальні — так жаласна, квола. Ён хворы, ён заўсёды плача, як прачынаецца.

Дзяўчынка пабегла, прыцягнула яго.

— Ціху, дзетка... ціху, ну... Глянь, вунь стол... Паглядзі!..

У дзіцяці на твары застыгла плаксівая міна. Часінку моўчкі глядзеў, плюскаў ад свету вачмі. Потым ажывіўся, матнуў парыўчата ручкамі.

— Стол, стол... Тата, гэта стол... Вунь ён...

І худзенькі тварык яго, яшчэ мокры ад слёз, сагрэўся любаі чыстаі усмешкаі.

— Хацу на стол... сесці хацу...

І яго пасадзілі. Рассунулі шклянкі і сярод іх пасадзілі. Сёння ж можна, сёння тут радасць, а радасць — апека дзяцей. Ён сядзеў на стале — шчаслівы, здаволены,— ваяваў набедна рукамі і гвалтаваў бесперастанку:

— Стол, стол... гэта — стол...

Як скончылі чаі, не ўсталі з-за стала. Сядзелі ўсё, гаманілі, смяяліся. Была радасць, была прытульнасць і ціхае шчасце.

А пасля і зусім разышліся. Пачаў гаспадар. Ён выцер распараны твар, вальготна адкінуўся на спінку крэсла і зацягнуў грубым расшчэпленым голасам, рыпучым, як заржавелы блёк...

Дзеці ўраз падтрымалі яго. А тады і гаспадыня не ўцярпела: замылілася соладка і падвяла тоненькім-тоненькім галасочкам.

...У бары зязюля
Кукус,
Ніхто зязюлі
Не чус...

І было так цёпла, так светла...

. . . . . .

Бывае часамі, што сонца атуляе нас, песціць ціхаі лас каваі цеплю, сагравае нутро, навявае ціхі спакоі.

Бывае сонца такое...

І такая Радасць бывае...

3

Ён бег два дні. За гэты час ён раз толькі еў і спаў усяго тры гадзіны. Спаць лёг тады, як ногі зрабіліся драўлянымі і на павеках павіс непасільны цяжар. Не лёг, а наваліўся.

Ён бег дзень і ноч. Удзень ён смагла ўпіваўся стомленым вокам у бесканцовую стужку гасціпцу, быццам хацеў працяць сваім зіркам пустую маўкліва-спакойную даль.

А ноччу... Ноччу горш. Цёмная поч — яна што пялёнкай якой абаўе. Чорнай, ліпучай. На самыя вочы назоллі-ва ліпне гэта пялёнка. Здаецца — скінуць яе, адхінуць бы. Бо цяжка так, нудна блытацца ў цемры. Але — нязмога...

А змора якая! Баліць усё чыста. Баліць і нямее, захо-дзіцца ў нейкай мутарнаі млосці. Легчы б, рынуцца до-лу. Хоць тут, на брудны пясок. Рынуцца і заплакаць, га-лосна так зарыдаць, каб страсянуць гэта нямое, нячулае поле, каб працяць яго сваім невымоўным болем.

Але так не ўвесь час. Бывае, што зусім забываецца змо-ра, забываецца крыўда і ўсё. Ён ідзе тады, як лунацік, ні-чога не бачыць, нічога не чуе. Уваччу — ласкавай зданню любыя твары.

Дзіўна гэта: як калісьці разам жылі, дык не было, здаецца, гэткага пачуцця. Ну — брат, ну — сястра, свае, як кажуць. А каб так жалець — дзе там! А цяпер — паў-жыцця аддаў бы, каб толькі ўбачыць, каб знайсці іх там, у горадзе.

Разбушавалася гэта. Разгарэлася, расшугалася полы-мем — морам агнёвым, пайшло злосна-кіпучымі хвалямі. І расштурхала ўва ўсе бакі, развяло гвалтам па свеце да-лёкім. Хто куды...

Цяжка было. Ані вестачкі. Чужыя людзі, чужы краі. Кідаюць хвалі, як трэску, абдаюць сваёй пенай — шалёна-крывавай. І не відаць знаёмага берагу, і не чуваць прывет-нага голасу.

Так было з год. Але ж год усякі бывае. Іншы дык здаецца за цэлую вечнасць. І потым — як гэта выйшла не-спадзявана так, раптам... А якой радасцю агарнула гэта печаканая вестка!

Брат і сястра... Жывыя, здаровыя... сто вёрст усяго...

Эх, паляцець бы птушкай туды! Перапырхнуць бы праз гэты парог, што крывавай мяжой падзяліў свет на дзве палавіны!

Але яшчэ давілі паветра злосна-бурклівыя выбухі, яшчэ даляталі жорсткія водгукі смяротнае бойкі.

Гэта было непасільнай мукай. Часам нібы ашалелы, нібы звер, засаджаны ў клетку, бегаў, ірваўся, скрыгаў зубамі. А як, урэшце, над напорам чырвонага шквалу адкаціўся далёка смяротны парог, адразу схапіўся і рынуўся, поўны шчымлівай трывогі, туды, за сто вёрст.

Ён бег два дні. Ён забываўся на змору, прынамсі, стараўся забыцца. Яшчэ стараўся так, каб не думаць, каб не было нічога ў мазгах, каб адзін гэты стары гасцінец путром заўладаў, расплыўся па ім сваёй бесканцоваю жоўцю. Бо калі думкі, дык яны пачыналіся прыгожай радаснай маранй, але потым немінуча ўпіраліся ў калючую сцяну трывогі.

І тады садніла сэрца прадчуваннем пядобрым, і на целе цякла цягучая, млосная змора.

Тады хацелася рынуцца долу і заплакаць, зарыдаць на ўсё поле...

. . . . . .

У горадзе раніца бывае сур'ёзная, ціхая. Там не пачуеш пярэстага жвавага шчэбету птушак, там і галузы-скачкі не ашаломяць з квяцістае воўны-травы сваім сухім верашчанем, сваімі дуронымі дзікімі спевамі.

У горадзе — важна, спакойна. Камяніцы — нібы вяльможы заспаныя — такія сярдзітыя, хмурныя. Не любяць, калі адзінотны хаджалы не ў пару разаб'е іх спакой сваімі паспешнымі гулкімі крокамі.

І сонца ў горадзе зранку бывае нейкае несуразнае. Нікае па гары, гладзіць галовы сівыя старым камяніцам. Ліслівае, убогае нейкае...

Ой, гэты горад! Ён такі безуважны, нячулы. Наўды яму, што нейкі там абшарпаны хлапец шмурыжыць бясконцу панелі, шукае чагось усё ранне. Хай пашукае, хай пашмурыжыць. Мо й дарма? Мо й не знойдзе нічога? Няхай!..

Што там, што слёзы ў яго набягаюць ад зморы і дасады! Эт, слёзы! Горад бачыў не толькі слёзы. Ён бачыў і кроў. Ён мыўся ў гэтай свежай чырвонай крыві — чалавечай крыві.

А хлапец упарты, відаць. Ён абышоў увесь горад, ён перапытваў сотні людзей, а ўсё-такі знайшоў.

Маленькі, крывенькі домік. Уціснуўся ў цесны завулак, ціхамірна сагнуўся, прысеў. Шэры, падслепаваты дзядулька.

Хлапец пастаяў, паўзіраўся ў яго. Паляпаць не важыўся. Неяк страшна, аж сэрца заходзіцца.

Няўжо тут во, поплеч, свае, родныя? Няўжо зараз убачыць іх, няўжо зараз атуліць мяккім прыветам цёплая радасць?

Год жа. Цэлы год... больш году нават...

А калі ды няма? Калі ды зноў штурхапула, адкінула бура?

Рукі трасліся, як браўся за клямку. І калі ў адказ толькі запыла, сабраўшыся ў напружаны згустак, ціша, хацеў, каб даўжэй яна працягнулася, каб не пачуліся адразу крокі там, за дзвярмі.

Мо спяць яшчэ... Пакуль прачнуцца, устануць...

Толькі праз колькі хвілін паляпаў ізноў. Ізноў слухаў густую напружаную ціш. Потым зноў ляпаў, зноў слухаў. Доўга так, пакуль не працяў печаканасцю грубы воклік адзаду:

— Чаго ляпаеш! Бачыш — нікога няма...

— Як... што...

— Жылі тут, а потым забраліся... Не забраліся, а забралі...

— Хто?

— Вядома хто, белыя...

— Хто жыў тут?

— Людзі жылі.

— Якія?

— А хто табе трэба, га?

Як тут... слоў не знайсці, не падабраць...

— Брат тут з сястрой... ёп высокі такі... гадоў трыццаць...

— А, кватаранты... Былі. Тож забралі...

Ну... што яшчэ?.. Усё?..

Нейкі туман пусты ў галаве. Усё паўкола шэрае, нуднае. І змора... Непамерная, едкая змора. Ногі падламваюцца...

Сеў тут жа на парог. Абмяк, апусціўся.

Доўга сядзеў. Не помніў колькі. Узняўся тады, як заўважыў, што людзі праходзяць, што ўсе пазіраюць на яго з задзіўленнем, з падазронасцю. Устаў тады і падаўся да шумлівага цэнтру.

Цяпер — жывы муравейнік. Людзі, людзі... Мітусяцца, як пярэстыя рыбкі-маляўкі ў крыштальнай вадзе чыстае рэчкі. Спяшаюцца ўсе, усім часу няма.

А сонца падняпося ўжо, пасмялела. Яно ўжо не ту-

ляецца недзе па вільчыках, а абхапіла цалком камяніцы, паліць, падсмажвае. Аж млеюць вяльможы паважныя, задыхаюцца ў душнай спякоце.

Ён доўга хадзіў без усякае мэты па вуліцах. Потым прыхіліўся ў цяньку да будынку, углыбіўся ў сябе.

Зноў — туман, пустата. Зноў — едкая змора...

Раптам здалёку недзе пачулася музыка. Яна прылятала густымі квяцістымі абрыўкамі, і гэтыя абрыўкі адкладаліся ў сэрцы нечым чароўным такім і далёкім-далёкім, як сіняе неба. Яны пастойна гаварылі аб нечым, яны напаміналі нешта балюча-салодкае, даўнае.

Ён смагла лавіў гэтыя абрыўкі ўрачыстае музыкі. Ён хацеў запоўніць імі пустату, што шчымела унутры.

А музыка ўсё расла, усё набліжалася. Яна ўжо злілася ў пабедны ўрачысты гімн і плыла шырокімі, моцнымі хвалямі, адбівалася працяжлівым водгуллем у мураваных сценах будынкаў.

І была ў гэтым гімне ўрачыстым вялікая радасць. Такая радасць, што расцвітае дзівосна яскравым праменнем, што захапляе, хвалюе глыбока душу агнёвым бурлівым уздымам, што распаляе тысячы сэрцаў боем адным — віхурна-напружаным, што родзіць буры, родзіць пабеды. Такая радасць была.

А ён стаяў адзінотны, пакінуты і толькі ўбіраў у сябе, смагла ўбіраў гэтыя прыгожыя гукі. Яны растаплялі сэрца яго так, як вясновае сонца камлыгі шурпатага снегу. І яму хацелася ціха-ціха заплакаць...

Замятушыўся народ, засноўдаўся гурмай паспешнай. Потым усе ў адзін бок падаліся. У сонцы яркай крывёю зардзелі чырвоныя сцягі. Мпога сцягаў — цэлае мора.

І перамяшалася ўсё: магутныя гукі аркестра, і песні радаспа-звонкія, і гоман народу — бурлівы, густы. Перамяшалася ўсё і злілося ў адпо — у ўсёабдымную радасць.

Раптам нехта крапуў яго за руку.

— Таварыш! У маніфестацыю!..

Ён здзіўлена азірпуўся.

Якая гэта дзяўчына з такімі гарачымі вачмі? І што яна да яго?

— Ну, пойдзем, таварыш, хутчэй!..

Чаго столькі ласкі, прывету ў яе бліскучых вачах? Чаго яна гэткай добрай, блізкай здаецца? І чаго гэта ў горле так перасела, што не можпа й слова сказаць? А сказаць...

каб сказаць усё чыста... Або проста заплакаць у яе на грудзях...

— Таварыш, пойдзем... Я знаю, вам дрэнна... У мяне тож бацьку забілі...

Яна ўзяла яго за руку і пацягнула ў народ.

Чырвоныя, ярка-чырвоныя сцягі... Музыка, песні, гоман бязмежны... І сонца... Якое гарачае сонца!..

А тут, збоку, гэта дзяўчына. Яна тож пяе. У яе голас такі ўзняты і вочы блішчаць захапленнем... Чаго яна такая добрая? Як сястра, якую забралі, якой не заспеў тут, у горадзе.

Яна зноў узяла яго за руку.

— А вы ведаеце, якое свята сягоння?

Яму сорамна прызнацца, праўду сказаць. Але ёй можна...

— Не, не знаю.

— Мы святкуем сёння вызваленне ад белых... ад тых, што майго бацьку забілі, што хацелі ў ланцугі нас усіх закаваць. Іх прагналі далёка-далёка, яны не вернуцца больш...

Ага. Вось яно што... Бацьку забілі... Прагналі ўжо... Дык і ў яго ж... Трэба сказаць, ёй сказаць, гэтай дзяўчыне...

— Слухайце! У мяне брата й сястру забралі... З сабой навялі, а мо забілі...

Яна зірнула на яго з ласкавым спачуваннем.

— Многа забілі. Кроў лілі, руйнавалі. Але мы перамаглі і вольнымі засталіся. Таму святкуем і радуемся. І вы павінны радавацца разам з усімі... Вы вось зірніце наўкола, прыслухайцеся да ўсяго гэтага, і вы забудзецеся на тое... і радасць пачуеце...

Ён прыслухаўся да ўсяго, увабраў, быццам удыхнуў у сябе ўсю ўрачыстасць, усё захапленне народнае. І пачуў радасць. Яна неяк ураз захлынула яго, узняла на сваіх буранецістых хвалях, спаласнула нутро, вымела змрочныя цені журбы — і зайскрылася пералівамі чыстымі — светлая і гарачая, як паўдзённы блакіт глыбокага неба.

Яму хацелася пець, але ён не знаў слоў гэтых песень. Ён да дзяўчыны звярнуўся:

— Слухай, ты мне кажы словы песні, бо я іх не знаю. Я буду пець таксама...

І ён пеў. І голас у яго быў дзіўна ўзняты, а вочы блішчэлі захапленнем...

Гарачая чырвань. Пабедная музыка. Звонкія песні. Гоман народу — бурлівы, густы.

І над усім — агнёвае сонца.

І над усім — агнёвая радасць...

. . . . . .

Часамі сонца — палкае, шчырае — прыпікае да самаіі зямлі, сціскае яе ў сваіх моцных абпімках, смагла цалуе агнёвымі вуснамі.

Бывае такое магутнае сонца...

І бывае Радасць такая...

СМЕРЦЬ

1

За акном палахліва ўцякаюць назад ускудлычаным роем валокны бруднага дыму. Скрозь іх далёкім прыветам яшчэ раз мігнулі высокія вежы Масквы, нібы наўздагон яшчэ адну ўсмешку паслалі апошнюю. І потым ужо — зялёнаю роўняддзю пожні бязмежныя, ручнікі жоўта-бурыя збожжа. Дзе-нідзе воўпай сукрыстай хмызняк, дарожкі гарэзна-крутлявыя. Усё назад уцякае — з падскокам неяк, жартуючы. Усё на ляту нібы зазірае з цікаўствам у вокны вагона.

Раговіч стаіць ля акна. Узлёгся на стол, абапёрся сівой галавой на далоні і ўпяў нерухомы пагляд у той бок, дзе толькі што знікла Масква. Яшчэ ў старых грудзях бурліць захапленне, яшчэ слёзы цякуць раўчакамі па зрытым, зморшчаным твары.

Добрыя слёзы такія. Яны салодаччу цёплай палошчуць путро і быццам змываюць з твару старога сляды ліхалецця мінулага, сляды перажытай гароты. Добрыя, цёплыя слёзы...

Раговіч — стары барацьбіт. Ён злучыў быў жыццё сваё з рэвалюцыяй, жыў толькі ёй і аддаў ёй усё, што мог і што меў. Толькі жыццё адно нейкім дзіўным выпадкам астала-ся. Колькі раз — не злічыць цяпер — думаў ужо, што й гэта аддасць. І хацеў аддаць, не баяўся. Але выходзіла так, што смяротныя хвалі міналі яго — і жыццё аста-валася.

А цяпер жыццё гэта — толькі прыліка адна. Не жыц-цё, а цьменне маруднае. Нібы забытае вогнішча, што кі-нулі ў лесе начлежнікі.

Ужо два гады, як тое, чым жыў калісь, бушуе, бурліць недзе воддаль, не чапае яго. Ён аддыхае ў самоце, ён да-гарае ціхім, марудным агнём.

Цяпер ён не вытрымаў быў. Бо падышло да горла, гру-дзі сціснула, загарэлася полымем жаркім. Пацягнула ў тое агульнае жыццё — маладое й магутнае. Хоць паглядзець,

хоць падзівіцца. А тады ї памерці ўжо, навошта марудзіць яшчэ.

Сабраў усе сілы, паехаў у Маскву. Глядзеў, дзівавaўся, поўніўся радасцю, адчуваў глыбокае шчасце. І цяпер во тут, на вакзале... прыйшлі выпраўляць. Віталі, прасілі яшчэ прыязджаць, жадалі, каб жыў доўга-доўга. Усё — свае, старыя сябры, таварышы па жыцці, па змаганні. Яны яшчэ моцныя, яшчэ працуюць, змагаюцца. Жыццё будуюць, тое, аб якім марыў ён з малых дзён.

Кажуць — жыць доўга. Не, навошта, не трэба. Цяпер ён можа памерці. Ціха, спакойна, так, як памірае той, хто бачыць, што мэта жыцця яго здзейснена...

З аднамернай буркліваї гаворкай перабягаюць па рэйках спрытныя каткі вагона. Зюкаюць аб нечым лагодна. Мо напамінаюць мінуўшчыну слаўную?

Гэта мінуўшчына ў Раговіча ўжо зацягнулася зыбкаї пялёнкаї туману і ледзь-ледзь свіціцца скрозь гэту пялёнку. Толькі часамі, калі ўскалынецца нутро, калі і сэрца заб'ецца на момант так моцна, так свежа, як калісьці даўней, тады ў галаве быццам маланка бліскае і разрывае пялёнку забыцця. Тады кавалкамі вырываюцца з туману ўспамінкі і цешаць старое сэрца.

Вось і цяпер, як у Маскве быў. Там жыў мінулым, быццам перажываў нанова тое, на што ўжо забыўся быў, што ў нябыт адышло. І як выязджаў — тож успамінкі роем жывым мітусіліся, у прыгожую стужку звіваліся і поўнілі сэрца радасцю цёплаї.

Але поезд далеї і далеї усё нёс ад Масквы, і ападалі гарачыя хвалі ўздыму. Нутро зноў прастывала, зноў халадзела, і пялёнка — такая шчыльная, непраглядная — зацягвала, хавала ўсё чыста. Аставаўся спакоїї — пусты, халодны спакоїї, безуважнасць глыбокая.

Старасць. Сіл няма. Нязмога нават думаць, варушыць успаміпкі. Хаї яны там, за пялёнкаї. Нашто яны старому, слабому, каму мо тыдзень ці два засталося пражыць? Лепш хаї будзе гэты спакоїї, хаї гэта пустач, хаї не будзе нічога, схаваецца ўсё за пялёнку.

Раговіч адышоўся ад акна і сеў на канапу. Мяккая канапа — спальны вагон. Для старых касцеї гэта добра. Прыемна так апусціцца з вальготаї, сагнуцца, згарбаціцца і сядзець ціхенька, нерухліва. Ні аб чым не думаць, нічога не шкадаваць, нічога не чакаць. Так бы ї да смерці да самаї, каб ніхто не крануў, не патурбаваў. Спакоїї бязмежны, глыбокі.

У купэ пікога няма. Гэта добра, бо пустата спрыяе спакою: не зачэпіць ніхто лішнім словам, не парушыць цішу лішнім гукам. Толькі каткі мякка пагрукваюць, перабіраюць старанна ўпругія рэйкі. Лагодна зюкаюць нешта.

У купэ ўжо змрок павісае, плаўна калышацца разам з вагонам, ходзіць увачу, замятасцца доўгімі пасмамі. Ужо вочы старыя не бачаць нічога, апрача гэтага нуднага, адпастайнага віхання змроку.

— Можа, легчы заснуць?..

Падумаў пра гэта дый адразу забыўся — памяць не служыць ужо. Так і застаўся сядзець — сагнуўшыся ў крук, да калень бараду сівую звесіўшы, вочы шырока расплюшчаныя ўпяўшы ў валакно рухавага змроку. Твар скамянелы застыў у глухой нерухомасці і толькі паволі разпораз гоўтаўся ад мерных уздрыгаў вагона.

2

Расчыніліся дзверы. Увайшоў правадпік. Спаквапя, не спяшаючыся, запаліў на столі ліхтар, зацягнуў на акне занавеску.

Раговіч яго не заўважыў. Усё сядзеў у адной застыглай постаці, усё недалужна, млява ківаў сівой галавой.

Правадпік пастаяў з мінуту, паўзіраўся ў яго.

Потым ціха, з нейкай апаскай спытаўся:

— Вы, можа, хворы?

Раговіч здрыгануўся. Невядома чаму, словы правадпіка яго спалохалі, працялі вострым жахам. Здалося яму, што правадпік баіцца, каб ён не памёр — зараз, во тут, у даручаным яго прыгляду вагоне. І пачуў яшчэ ў тоне правадніка нешта чужое, халоднае, не сагрэтае ані кропляй спагады,— такое сухое, казённае. Быццам правадпіка зусім не цікавіць, як яму — ці дрэнна, ці добра, ці баліць што, ці не. Абы не памёр тут, у яго вагоне, абы давезці да месца, высадзіць вон. А там — якая справа яму? Хай сабе памірае, бо ўсё роўна нядоўга засталася жыць.

Крыўда гарнула. І злосць на гэтага здаровага з лупатым драўляным тварам чалавека. Чаго яму трэба? Хай жыве, калі здаровы такі, дужы, як вол. Чаго кратае старога, хворага?

Шкода стала сябе. Так, што слёзы набеглі. Загаварыў шапялявым, абрыўчатым і нейкім слязліва-ўзнятым голасам:

— Мне нічога не трэба... Калі ласка, накіньце мяне... Можаце йсці...

Правадпік пяўцямпа паціспуў плячмі і выйпаў.

Зноў ціха й пуста. Раговіч з патугай, крэкчучы, узняўся і зашчапіў дзверы. Зноў сеў на старое месца. Апусціўся, сагнуўся і заспакоіўся. Але недзе глыбока-глыбока нешта шчымела, нейкі прыкры балючы асадак астаўся.

З галавы правадпік не выходзіў. Усё крыўда была на яго, і ўсё луналі ўваччу яго дужыя плечы, яго чырвоны, наліты сакавітаю свежасцю твар, лупатыя, поўныя нейкаї самадавольнасці вочы. Хацелася забыцца на яго, выкінуць вон з галавы, ды нязмога была. Дзе там! Яшчэ нават цягнула, каб зноў убачыць яго, каб глядзець, упівацца вачмі ў яго дужую постаць і адчуваць гэту вострую, шчымлівую злосць на яго, на яго сілу, здароўе.

Гэты правадпік, здавалася, прыйшоў з нейкага чужога для Раговіча свету, які ад яго аддзяліўся, да якога ўжо ён нічога не мае. Прыйшоў, каб напамянуць аб тым, што чакае яго, што навісла над ім немінучай пагрозай. І прыход яго быццам пакінуў нешта тут, у купэ,— цяжкое, халоднае, прыкрае. Быццам падышло цяпер, блізкім, фізічна адчувальным зрабілася тое, што мінуту назад было яшчэ гэткім далёкім, нязначным. Быццам нешта прывёў з сабоїй правадпік і запытаў у яго, у Раговіча:

— Вы, грамадзянін, гатовы ўжо? Вам трэба *гэта*?

Правадпік выйшаў, а *гэта* тут з ім, асталася ценню халоднай.

І *гэта* — смерць.

Раговіч дасюль ні разу яшчэ не думаў стала аб смерці. Гаварыў ён, праўда, часамі:

— Стар я, памірацъ буду зараз.

Але гэтае «памірацъ» не мела для яго пэўнага сэнсу і пэўнае формы. Гэта было слова, якое ён чуў ад кожнага старога, якое сам пачаў гаварыць з таго часу, як завілася ў барадзе першая белая пасма. Гэта слова ўвайшло ў звычай, у абыкласць, ён ужываў яго так, як, напрыклад: «спацъ пайду», «будзем палуднаваць», «хочацца піць» і г. д. Думаць аб тым, як гэта прыйдзецца памірацъ, што гэта смерць, што яна прынясе з сабоїй і як яе трэба сустрэць,— аб гэтым думаць не выпадала.

І вось раптам яна падышла. Блізка зусім, так, што чуваць яе подых халодны. Падышла і быццам сказала зла-радасна:

— Вось і я. Мо пазнаёмімся?

І ў першы раз Раговічу страшнаї здалася смерць. І ў першы раз думкі аб смерці, аб блізкаї зусім, немінучаї,

апанавалі павалаю жудаснай. Ён памыкаўся іх выгнаць, не пускаць к сабе ў галаву, каб сціхамірыцца, каб аддацца зноў пустому халоднаму спакою.

Так было б лепей. Не думаць, не знаць — і памерці.

Але ўпіваюцца з болем вострыя, колкія думкі. Так неяк... Пуста, няма пічагутка, здаецца, ужо і добра. Але раптам асцярожна збоку заходзіць, заходзіць і становіцца перад вачмі перад самымі... Праваднік. Тоўсты, здаровы, чужы. І з ім — жудасны холад магільны, з ім — смерць, страх перад ёй. І думкі — напружныя, жорсткія.

Вочы самі сабой шырока расплюшчваюцца, поўныя жаху, нервова сморгаецца сівая галава, і пагбаныя старасцю рукі — сухія, драўляныя — пачынаюць трэсціся як у ліхаманцы. І гняце, давіць старыя мазгі непакойнае, упартае:

«Смерць... Што яна? Навошта яна? Як пагадзіцца з ёй, немінуючай?»

А ночка плыве так марудна, так ціха і аднамерна, нудна брукуюць няўтомныя гаварлівыя каткі.

Колькі разоў прыходзіў праваднік. Лясне зашчэпкай, расчыніць дзверы й зірне на яго з відочнай апаскай, з халоднай турботай. І, як правяралі білеты, таксама глядзелі ўсе на яго з падазронасцю нейкай. Але не гаварылі нічога.

Як выходзілі людзі з купэ, Раговіч думаў:

«Хоць бы даехаць, хоць бы тут не памерці, у вагоне...»

І тады ўжо здавалася, што толькі гэтага й страшна, страшна, каб не памерці ў дарозе. А як прыедзе да месца, тады і страх гэты мінецца, тады спакойна сустрэне смерць. Гэта супакойвала троху. Думкі аб смерці не былі ўжо гэткімі вострымі, колкімі, нібы адсуваліся некуды ўдалеч. А на іхнае месца раслі думкі аб дарозе, аб тым, каб даехаць хутчэй, каб наогул даехаць, не скончыць жыцця свайго тут.

Пад раніе напружная праца мазгоў змарыла зусім. Старое цела абвяла, галава недалужна на грудзі схілілася — і заснуў-задрамаў неглыбокім абрыўчатым сном, якім звычайна спяць старыя людзі.

3

Шаўлюжкі-копі беглі трушком. Карахвашка падбрыквала то адным, то другім катком на карэннях, і ў такт гэтаму то ў адзін, то ў другі бок перавальвалася шырокая спіна фурмана.

Лес уціснуў вузенькую дарогу ў свой цёмны гушчар, поўны глухога заціпіша. Старавечныя разложыстыя бярозы падпаўзлі да самай дарогі, прыселі ў мох і застыглі ў сваіх пакарожаных постацях — магутна-маўклівыя, хмурыя. Нямой цішынёй працяты быў лес, урачыстым глыбокім спакоем.

Спакой агарнуў і Раговіча. Тое, што ноччу было, павальніца тая душэўная, знікла цяпер, і на месца яе — яспасць, святло празрыстае, чыстае.

Смерці ўжо не баяўся. Не чуў яе блізка так, як уначы. Толькі адно ўсё думкі займала, стаяла ў мазгах пытаннем назойлівым:

Што ж гэта? Навошта ён жыў, нашто гараваў, змагаўся, калі вось цяпер — момант адзін — і не будзе нічога, і нішто не будзе цікавіць яго, нішто не кране. Не будзе яго — і нічога не будзе. Для яго, вядома, бо для іншых будзе, іншыя будуць жыць. Будуць так, як і ён калісь, завіхацца, кідацца, адно руйнаваць, будаваць другое, лепшае. А як пачуюць во так перад сабой гэта халоднае, страшнае, тады схапяпуцца і скажуць так, як і ён цяпер:

— Навошта ўсё гэта, калі такі бязглузды канец? Нашто жыццё? Нашто смерць?

Раговіч спакойны цяпер. Зусім спакойны. Бо ён спадзяецца, што ўсё-ткі знойдзе адказ на сумненні свае. Ён будзе думаць, разважаць. Ён стала разбярэцца ва ўсім. Абы яшчэ з тыдзень пражыць, не памерці.

Але чаму ж не пражыць яму й некалькі тыдняў яшчэ? Хто сказаў яму, хто запэўніў, што ён капечна во зараз памрэ? Ён прыедзе дамоў, там на адзіноце ўцішку абмяркуе ўсё чыста. Мо ў кнігах якіх знойдзе адказ, мо сам, сваёй галавой даб'ецца яго. А цяпер ён памалу адхінае цяжкую пялёнку, што схавала за сабоі мінуўшчыну, і ўважна разглядае гэту мінуўшчыну, правярае сябе. А калі ды там, у мінулым, знойдзецца нешта, што паможа адказ адшукаць на пытанне гэта турботнае!

...Вось ён хлапец-падлетак яшчэ. Даўно было гэта, і цяжка мазгам старым радзіць малюнкі пары тоі. Першы крок па шлях барацьбы, на шлях рэвалюцыі. На цяжкі шлях, поўны вострых калючак, што рапілі цела, поўны пастак таёмных, што во-во гатовы былі праглынуць, пахаваць...

Што штурханула яго на гэты шлях?

Гэта ён добра помніць. Гэта было зусім проста і пават недарэчна троху. Была дзяўчына — прыгожая такая, ра-

зумпая, добрая... Яна й цяпер яшчэ ёсць недзе ў яго — мабыць, на самепькім дне сэрца старога. Так, жыве яшчэ, бо часамі свецяцца вочы яе — глыбокія, чорныя, быццам усплываюць з бяздонных хваль забыцця. Ён кахаў яе моўчкі, уцішку. Ёй не казаў апі слова аб гэтым, чуў, што гэтым абразіць яе, адштурхне.

За ёй ён паїшоў. А яна завяла яго на гэты цяжкі, але прыгожы шлях. А потым, як дзяўчыну павесілі, помста асталася. Яна штурхала на змаганне. Дыіі зацікавіла самая праца, небяспека, рызыка. Гэта ўзбурала кроў маладую, прыемна было.

А пасля ўжо, як гады загасілі пыл захапления юнацкага, з'явілася ўпартасць, хацелася дасягнуць таго, на што аддаў столькі гадоў. Ды яшчэ бачыў на кожным кроку гаротных, няшчасных людзей, знаў, што можна палепшыць іхную горкую долю. Ды яшчэ ій сам не мог вытрымаць жыцця таго трухлага, хацеў дыхпуць вольным паветрам. І зноў змагаўся, зноў гатоў быў аддаць жыццё за справу, за рэвалюцыю.

І так да астатніх дней, пакуль ужо не прыціснула старасць бязлітасная, не прыгнула долу, не закавала ўсяго ў ланцугі слабасці друзлай.

Жыццё было багатае, поўнае. Добрае жыццё. Не паракае Раговіч на яго. Адно дрэнна, што ні разу не падумаў вось аб гэтым, не пашукаў адказу на запытанне, якое цяпер так непакоіць старое нутро.

Мо тады часу не было думаць пра гэта? Не, не ў тым. Проста — далёка гэта было і не цікавіла. А калі часам і прыходзілася, як кажуць, ставіць на карту жыццё, дык тады смерць выдавала нечым прыгожым такім, цікавым, радасным нават. У адвазе, у захапленні змаганнем траціласа думка аб смерці, аб сапраўднай смерці, якая во цяпер надыходзіць. І што ж... Жыў, турбаваўся, кідаўся ва ўсе бакі, шукаў лепшага для сябе і для другіх, а не падумаў аб тым, што вось прыйдзе часіна і не трэба будзе гэтага. Нічога не трэба, бо не будзе цябе, ураз, у момант адзін згінеш і сам і ўсё тое, што насіў у сабе, за што клаў жыццё, за што змагаўся.

Успамінаецца Масква, цяперашняя паездка туды. Там яшчэ раз перакапаўся, што тое, за што аддаў жыццё, дасягпута. Тут, на вёсцы, сумпепші з'яўляліся. Рознае думалася. Часам нават неспакой браў, страх неїкі, каб не пайшло ўсё па няправільны шлях. У Маскве пераканаўся, што добра ўсё, што моцна ўрасла, укаранілася тая работа,

справа тая, якая пры ім яшчэ зроблена была пачарпяк. Цяпер толькі выправіць начыста, абгладзіць шурпатасці, якія яшчэ засталіся.

Там, у Маскве, было радасна. Слёзы былі такія салодкія, цёплыя. Эх, каб так да смерці! Каб не радзілася гэтая думка, што ўсё цяпер непатрэбна, што ўсё ўжо — без яго, што ён ужо стаў перад невядомым і страшным, перад цёмнай глыбокай загадкай, якая гняце, спакоі адбірае, поўніць балючым неўразуменнем. Эх, каб не было гэтых думак!

Выехалі з лесу. Фурман сцебануў па шалюжках.

— Ннэээ, каб вас...

Таргануласа карахвашка, размашыста баўтанулася спіна фурмана. Пасхалі шыбчэй. Там, далёка-далёка, на ўскраі пярэстаі аўчынкі палёў бліснулі залатыя крыжы.

— Ці гэта ўжо Грудзіна? — запытаўся Раговіч.

Але ў мяккім ляскатанні калёс загубіўся яго шапляўвы старчаскі голас. Ён другі раз гукнуў:

— Гэта ўжо Грудзіна?

Фурман абярнуўся на паўзвароце.

— Га?

Раговіч сабраў усе сілы:

— Ці Грудзіна гэта?

— Вядома, што Грудзіна.

У голасе фурмана Раговіч пачуў тон пагардлівай паблажкі. Нібы гаварыў той з дзяцёнкам малым неразумным. Зноў, як і тады, у вагоне, крыўдна стала. І шкода стала сябе, так шкода, што слёзы набеглі.

4

Раговіч жыў у глухім невялічкім мястэчку, што прыгожа пераблыталася з пышнаі зеляніпаі абапал празрыстае чыстае рэчкі. Жыў у сям'і старога прыяцеля, дзе меў асобны маленькі пакойчык. Яму прапанавалі, прасілі астацца ў Маскве. І раней, і цяпер, як ездзіў туды. Але ён не згадзіўся. Тут вальней яму неяк, лягчэй. Гэтае мястэчка для яго анавіта дарагімі, далёкімі ўспамінкамі, тут ён правёў пекных дзён сваіго жыцця. Яго заўсёды вабіў гэты прытульны ціхі куточак. Тут ён рашыў і дажыць свае астатнія дні.

Прыехаўшы ў двор, Раговіч запёрся ў пакоі своі, аблажыўся паперамі, кніжкамі і пачаў працаваць.

Цяжка было. Дрэнна служылі ўжо вочы старыя, ад

чытання зараз туман пабягаў у іх, і цёмпа, зусім цёмпа рабілася. Кідаў тады, думаў, напружваў старыя мазгі неслухмяныя. Пакуль і ў галаве таксама туманам усё не зацягвалася, не гасла апошняя іскра свядомасці. Тады сядзеў нейкі час нерухома, без воднае думкі, чакаў, пакуль адлягне троху. І потым — зноў за работу. Турботная думка аб смерці гняла-непакоіла, прымушала спяшацца, працаваць не па сілах.

Каб толькі як-небудзь знайсці яму тое, што развяжа гэта цяжкае пытанне аб смерці! Каб адкрыць, адшукаць тое *нешта*, што б ураз асвятліла ўсё ясным сэнсам, што б пагадзіла смерць і жыццё, што б заспакоіла нутро ўстурбаванае, дало магчымасць спакойна памерці.

Яно ёсць — гэта *нешта*, яно павінна быць. Інакай — нашто ўсё гэта? Нашто жыццё? Нашто смерць?

Часамі здавалася яму, што ён во-во ўжо знойдзе тое, чаго так упарта шукае. Тады ад радаснага захаплення сціскала дыханне, тады сэрца старое білася боем няроўным, трывожным, і рукі старыя трасліся ў первовай дрыготе.

Але мазгі не вытрымлівалі, ірвалася слабая нітка разваги, ізноў — цёмна ўсё, дзіка, зноў непаразуменнем балюча гняце галаву:

— Нашто жыццё? Нашто смерць?

На другі дзень Раговіч ужо не мог працаваць — сіл не было. Старасць брала сваё. Быццам спавіла ў пялёнкі ліпучыя. Шчыльна, туга спавіла, так, што не крануцца. Зрання думаў Раговіч яшчэ, што гэта часова, што адпаче троху і зноў за працу возьмецца. А к вечару ясна стала, што — усё. Не ўправіцца ўжо адшукаць тае патаёмныя ніткі, якая можа злучыць, пагадзіць жыццё й смерць. Смерць — лютая, злосная — не дала сябе разгадаць. Падышла і паклала сваю ледзяную руку на старыя сілы яго, каб не памыкаўся больш распазнаць яе таёмнасць халодную, каб не падужаў у сабе страх перад ёй, каб не аддаўся ёй без болю, без опку. Вось ляжы і чакай свайго часу, пары свае.

Страшна зноў стала Раговічу. Зноў ахапіў востры спалох, адчай непамерны. Зноў пачуў сябе далёка ад усяго, што дзеецца там, за сцяной, дзе жыццё. Ён ад яго адарваўся ўжо, ён к смерці бліжэй. Яна во ўжо тут, у пакоі. Ужо падыхае магільным холадам, ледзяніць слабае сэрца прыткненнем рукі свае жудаспа-жорсткай.

А ён адзін тут, адлучаны ад усяго свету, адлучаны ад таго, за што жыў, на што траціў сілы свае. Нашто ён ка-

му,— ен непатрэбны цяпер. Таксама, як і яму непатрэбна нічога. Яшчэ момант — і заміж яго будзе нешта нежывое, агіднае. Труп будзе, смецце трухлявае. А закапаюць — не будзе й таго. Нічога не будзе...

Вось гэта страшна, гэта дух халодзіць, кідае цела ў халодны пот. Нічога не будзе... Усё было: жыў, адчуваў, думаў. Было «я» — свядомае, разумнае. І раптам — нічога. Страшнае, халоднае *нічога*. На тым месцы, дзе было гэта свядомае «я», дзе адчуваў, пазнаваў свет, што акружае цябе; ураз — пустата на тым месцы. Машына жыцця, як і раней, круціцца, рухае сваімі магутнымі коламі. І ніхто не ўгледзіць, ніхто не заўважыць, што няма ў гэтай машыне адпаго малога нязначнага шрубчыка.

А не хочацца, ой як не хочацца з жыццём разлучацца, абарачвацца ў бяздушны, мёртвы кавалак матэрыі.

Смерць... было калісь слова адно — звычайнае, простае. Не баяўся тады. А цяпер ад гэтага слова, як мігне яно ў думках, халадзее ўсё чыста і сэрца заходзіцца ў жудаснай млосці, быццам во-во гатова спыніцца, застыгнуць.

Але ж усе паміраюць? І паміраюць спакойна, ціха, не карожацца ў гэткіх страшэнных перадсмяротных муках. Пэўна ж маюць нешта, што робіць нястрашнай ім смерць, што кідае свет нейкі на гэты таёмны пераход у нябыт. Бог, можа? Не, гэта калісь было. Цяпер ужо гэта неглыбокае, другарадпае. Нават тым, хто яшчэ нібы верыць у яго, бог не з'яўляецца ўжо той усёабдымнай крыніцай, з якой можна чэрпаць духоўную моц, у якой можна знайсці апраўдапне ўсяго-ўсяго, што ёсць толькі ў свеце, нават смерці. Не, ёсць нешта іншае, што ўкладзена ў самую ўроду, у інстынкт чалавека і што дае яму моц прыняць смерць без страху, без болю.

Але гэта *нешта*? Як знайсці яго? Як пазпаць яго розумам чалавецкім?

Ноччу была навальніца. Сцёбала ў вокны малапкай востра-бліскучай, сярдзіта бурчэлі грымоты, злосна будынак траслі. У вокнах палахліва шыбы дрыжэлі, і тады здавалася, што пехта ўпарта, пастойна дабіваецца ў хату. А дождж ахінуў, пакрыў усё чыста сваім густым, напружаным шумам.

Раговіч за ўсю ноч і вокам не звёў. Ляжаў з шырока расплюшчанымі вачмі — перухомы, бледны, быццам працяты ўжо подыхам смерці. Але жыццё яшчэ цьмела ў стацяты ўжо подыхам смерці. Але жыццё яшчэ цьмела ў старым, расслабленым целе. Яшчэ гарэла яго маленькая кволая іскрачка. І гэта жыццё ўсёй сілай сваёй змагалася з

смерцю. Яно не згаджалася з тым, што трэба ўступіць месца смерці, яно пратэставала супроць гэтага.

І цьмянае, зыбкае святло начніка, гарэзліва перабягаючы па сівому застыгламу твару, выяўляла на ім маўклівую, але цяжкую, страшэнную муку.

5

Сягоння лягчэй троху Раговічу. Пасля навальніцы такое добрае надвор'е. Усё навакол чыстае, радаснае, як вымыты свежы тварык дзіцяці. Усё ззяе ў гарачых праменнях, усё бліскучыць урачыста жыццём маладым.

Сёння больш сілы ў Раговіча. Няма тае млосці цяжарнае ў целе, тае цягучае слабасці, што да ложка прыкоўвае, што родзіць страшную думку аб набліжэнні смерці.

Раговіча радуе гэта. У яго зноў надзея пясмелая бліскае. А мо яшчэ вернуцца сілы? А мо яшчэ хопіць іх, каб адшукаць той цудоўны бальзам, які дасць збавенне ад смяротнае мукі?

Ён сабраў сілы, выйшаў па вуліцу. Сеў на гапках, акунуўся з прыемнасцю ў цёплае сонца. Яно так пяшчотна лашчыць стары зморшчаны твар, такой салодкаю цеплю поўніць недалужпае цела. Агортвае ціхі спакой, вочы самі сабой закрываюцца, галава хіліцца на грудзі. Раговіч пачаў драмаць.

Раптам ён пачуў над сабой слабы голас:

— Дайце, што вашая ласка, старому, хвораму...

Раговіч вочы расплюшчыў. Убачыў проста перад сабой старца сівога. Стаяў ён, сагнуўшыся пад цяжарам сваіх старэцкіх торб, і ўпарта глядзеў на Раговіча, лыпаючы бясілясымі, быццам абцягнутымі сізаю плеўкай вачмі. Яго сівая барада спаўзала да самага пояса і надавала яму выгляд патрыярха.

Старац ізноў праказаў:

— Дайце што, калі ласка!

У голасе старца дый ва ўсім абліччы яго відаць быў глыбокі спакой. Гэта кіпулася ў вочы Раговічу. Спакой гэты здаўся яму тым, чаго ў яго не ставала, чаго ён гэтак упарта і з гэткай мукай шукаў. Захацелася пагаварыць з старцам, прапікнуць у нутро яго.

— Сядай, дзядулька, адпачні троху.

Старац сеў поплеч, здзеў свае торбы і вольна ўздыхнуў, выпрастаўшы сярэдзіну і выставіўшы к сонцу свае

слязлівыя вочы. Ён хутка разгаварыўся, стаў расказваць пра сваё жыццё.

Раговіч слухаў і чым далей, тым больш і больш абураўся, з нецярплівасцю чакаў, што далей. Ён знаходзіў у жыцці старца так многа блізкага, падобнага на тое, што сам перажыў. Здавалася, што вось раскажа ўсё старац, і зразумелым, ясным стане ўсё тое, што гняло дасюль, што пужала таёмнасцю.

А старац цягнуў сваім адпамерным, рыпучым, як старое расшчэплепае дрэва, голасам:

— Цяжка было. Зямля неўрадлівая, дый мала яе. Але працаваў, колькі сіл было, стараўся, каб пракарміць дзетак, каб выгадаваць, вывесці ў людзі, даць ім долю. Бывала, ужо сам педаясі, педап'еш, а дзетак накорміш. Ну, і, дзякуй богу, не прапалі. Сяк-так прабіліся. Дзеткі выпараслі, прыстроіў усіх. На зямлю троху ўзбіліся, хадзяйства паставілі...

«Вось і я так,— думаў Раговіч,— працаваў увесь век. Не для сябе, для дзетак. Так, для дзетак, бо ўсе, за каго змагаўся, гэта ж адна сям'я, адзін род. Жыў для дзетак, каб вывесці ў людзі іх, каб даць ім долю. І што ж, вывелі ў людзі, далі долю. А цяпер што? Цяпер смерць прыйшла, і ўсё гіне. Нашто яно ўсё, калі мяне не будзе, калі заміж мяне месца пустое астанецца».

Старац тым часам змоўк і сядзеў нерухома, упяўшы погляд некуды ў пусты прасцяг. Мо думаў што, успамінаў, мо проста грэўся на сонцы. І твар яго — цьмяны, зямлісты — выяўляў глыбокі, ціхі спакой. Раговіч глядзеў на яго й думаў:

«Чаго ён спакойны такі? Няўжо ён не ведае, што яго ўжо пільнуе страшная смерць, што ён асуджан ужо? Няўжо смерць яго не пужае?»

Хацеў спытацца ў старца самога — і неяк не важыўся. Гарэла надзея, што пачуе пешта вялікае, важнае, што асвятліць яму ўсё, і разам з тым баяўся, каб не адказаў старац чаго-небудзь дробнага, непатрэбнага. Мо пра бога што скажа? Гэта так неразумна, так дзіка. Гэта яго не здаволіць ні-ні.

Урэшце спытаўся ён:

— Дзед, а ці думаў ты аб смерці? Ці чакаеш яе?

Старац і не зварухнуўся.

— Смерць? Пешта не йдзе, не прыбірае косці старыя... Чакаю, няўжо ж не... Пара ўжо. Чаго ж канціць свет? Дзетак прыстроіў, даў ім парадак і хадзяйства наладзіў...

А што ж яшчэ больш? Цяпер і памерці можна спакойна. Эх, толькі нешта ўсё не прыходзіць, марудзіць смерць гэта...

— А чаму ты, дзед, з дзяцьмі не жывеш?

— Ат, не захацеў. Сам не захацеў. Нашто замінаць ім, глуміць лішнюю хлеба скарынку. Знаю, што жывуць добра, што праца мая не прапала — і спакоен, не трэба мне больш нічагутка. Абы смерці прыждацца... Ну, трэба пасунуцца.

Раговіч махінальна выняў манету і даў старцу. Не бачыў, як ён сабраўся, пайшоў, не бачыў цяпер нічога, што дзеецца вокал. Ліхаманкава запрацавалі старыя мазгі, завіхрыліся думкі калаўротам пярэстым.

...Дык вось яно ў чым!.. Вось што дае яму гэты спакой! Вось што з смерцю яго пагадзіла! «Дзетак прыстроіў, хадзяйства наладзіў... што ж яшчэ больш?» Ён не жыве ўжо... тут не жыве, у сваім старым, бяссільным целе. Ён жыве там, дзе «дзетак прыстроіў, хадзяйства наладзіў», дзе яго праца, дзе скутак жыцця яго, дзе працяг гэтага жыцця. І гэты працяг жыцця — ён не памрэ, ён астанецца. У ім будзе жыць гэты просты спакойны старац нават і пасля таго, як закапаюць яго старое, недалужнае цела...

— Дык во яно што! Во што дае гэты спакой!

І пачуў Раговіч тады, што знайшоў тое, чаго шукаў, што яшчэ момант — і будзе ў яго ў самога той вялікі спакой, тая згода са смерцю, прыняцце яе без страху, без болю.

...Так, гэта правільна. Справа ўся ў тым, каб не замыкацца ў сваё вузкае «я», каб трымаць сувязь з «дзеткамі», з «хадзяйствам», каб жыць не тут, дзе гніе старое, слабае цела, а там, дзе ўкладзена праца, дзе скутак жыцця ўсяго. Зліцца трэба, злучыцца істотай усёй з «дзеткамі», з «хадзяйствам», з тым, ва што ўклаў усяго сябе, свае сілы, розум, імкненні. Там трэба жыць — і жыццё тое вечнае.

— У мяне ж таксама дзеткі. Многа іх ёсць. Не ўсе яшчэ прыстроены, але я зрабіў усё, што толькі мог, каб «прыстроіць» іх, даць ім долю. І «хадзяйства» наладзілі... А цяпер — хай сабе смерць прыбірае цела старое. Яно непатрэбна, яно толькі замінае.

Лёгка стала Раговічу. На зморшчаным твары засвяцілася шчасная ўсмешка.

Аднаго б толькі хацеў ён цяпер. Яшчэ раз зірнуць перад смерцю на дзетак сваіх, на «хадзяйства». Зірнуць, каб

і целу старому лягчэй было, каб уцеха была на астатнія дні.

Ён раптам устаў. Пастаяў з момант, быццам разважаючы нешта, і потым паціху, ледзь пераступаючы нагамі слабымі, пакавыляў па вуліцы.

6

Ён узняўся, успоўз на высокія ганкі зялёнага чыстага домікa, у якім змяшчаўся дзіцячы дом. Ён быў тут раней, ён знаў гэты дом. І яго таксама тут зналі.

Першая стрэла яго адна кіраўніца — маладая, свежая дзяўчына. Яна зірнула на яго няўцямным поглядам.

— Дзядзька Раговіч!..

Відаць, здзівіў яе нечаканы прыход яго і таксама той незвычайны выраз, тое здаволенне, шчасце, якое вясёлкай грала на яго твары. Раговіч заўважыў яе задзіўленне.

— Старому захацелася дзетак убачыць, пагутарыць з імі... хе-хе... А даўно ўжо не быў тут у вас. Як жа вы маецеся?

— Нічога, дзядзька Раговіч, дзякую... Дык пойдзем у сад, там усе дзеці. Дайце я памагу вам...

— Нічога, нічога... кіпьце. Яшчэ троху трымаюць старыя косці...

Выйшлі ў сад. Там, сярод зеляніны, жывымі кветкамі мітусіліся дзеці. Як убачылі Раговіча, прысыпалі зараз. Смелыя такія, гаворкія. Падбеглі, апанавалі з усіх бакоў сваёй балбатнёй — званочкамі срэбнымі.

Раговіч сеў на лаўку, пасадзіў на калені двух маленькіх карузлікаў. Рэшта абчапілі, абкружылі ўсяго жывым пекным вянком.

Раговіч глядзеў на дзетак, слухаў іх говар вясёлы і адчуваў, як у сэрцы старым, ачарсцвелым родзіцца новае гарачае пачуццё, якога не знаў ён да гэтай пары. Гэтыя маленькія людзі з ясными вочкамі, у якіх так часта адбіваецца блакіт далёкага неба, якія так шчодра пырскаюць маладым сакавітым жыццём,— гэтыя маленькія людзі былі такімі дарагімі, такімі роднымі, блізкімі. Здавалася, яны ўсе — частка самога яго; здавалася, кожны з іх посіць у сабе кавалак яго ўласнага жыцця, яго асабовага «я». У парыўчатым захапленні ён цалаваў альняныя сукрыстыя галоўкі дзяцей і шапялявіў усё неслухмянымі вуснамі.

— Дзеткі, дзетачкі... дзеткі мае... дарагія, родныя...

Яго нутро было поўна глыбокага магутнага пачасця, такога шчасця, якое ахапляе ўсю істоту, якое вышэй за жыццё, якое мацней за смерць. У гэты момант яму хацелася сабраць усіх дзяцей са ўсяго свету, усіх абняць, цалаваць і сказаць ім:

— Жывіце, будуйце жыццё, будуйце «хадзяйства». Я тож буду жыць, буду жыць з вамі, у вас. Я не памру, бо я знайшоў тое, перад чым смерць — слабая, бяссільная цацка...

Потым ён гаварыў з дзяцьмі. Ён спытаўся ў іх:

— Дзеткі, ці помніце вы Ільіча?

— Дзядульку Ільіча? О, помнім, вядома, што помнім!..

І блакітныя вочкі запетрыліся задуменнай сур'ёзнасцю.

— А ці будзеце вы слухаць свайго дзядульку Ільіча? Ці будзеце рабіць так, як ён нас вучыў?

І ціхім подыхам ветрыку праляцела па вуснах дзіцячых:

— Будзем!

А карузлік малы, што сядзеў па каленях у Раговіча і махаў певялічкімі граблямі, ні з таго ні з сяго пракулдачыў, вусны надуўшы:

— Я булзуя, во, глаблямі ў пуза...

Паветра зазвінела частым празрыстым смехам.

Храбры карузлік засароміўся, вочкі ўтуліў. А Раговіч раптам заплакаў. Заплакаў, захліпаў, як дзіцянё. Слёзы павадкамі пацяклі па глыбокіх маршчынах, на жоўты пясок закапалі чыстымі, буйнымі кроплямі. І ўсё шаптаў скрозь нервовае хліпанне:

— Дзетачкі... дзеці...

А дзеткі ўзіраліся на яго шырока расплюшчанымі вачмі, поўнымі задзіўлення. Дзіўна было ім, чаго заплакаў раптам гэты вялікі сівы чалавек. А той карузлік, што сядзеў з граблямі, устаў у яго на калепях і нясмела, пазграбна пагладзіў змочаны слязьмі твар.

— Ціху, дзядулька, не плач!.. А то цёця цукелкі не дасць...

У гэты час выбліснула сонца. Яго схавалі былі сукрыстыя, мяккія хмаркі, мабыць, хацелі, вяртухі, напудрыць свае берагі залатою дармоваю пудраї, падчапурыцца. Але сонца іх растурхала, прабілася косамі спрытпымі, падгледзела, вока прыжмурыўшы, сад і кінулася туды гарачай патокай. Падзіваваццца хацела па з'явішча дзіўпае.

Плакаў стары сівы дзед. Смешна так, голасна. Румзаў, як дзяцёпак малы. А дзеці яго супімалі. Дзеці пяшчотна,

ласкава гладзілі яго валасы-кудзелю, закураную дымам гадоў. Былі ў іх вочы вялікія, ціхія, і калі сонца ў іх зазірнула, дык вільготнымі іскрамі бліснула, бо ў дзіцячых вачах, поўных няўцямнасці, тож былі слёзы.

Сонца ярчэй вочы вытарашчыла. Прыпала да зямлі, дзівавалася. Потым прачула, відаць, што непрыстойны тут яго гарэзлівы спрыт. Засаромілася, схавалася моўчкі за хмарку. А як зноў спадкрадня адным вокам зірнула, то ўбачыла:

Раговіч сядзеў ужо на траве, абкружаны жывым, пекным вянком. З гарачым натхненнем глядзеў некуды ўперад, у далеч бязмежную, сінюю. І гаварыў. Гаварыў без канца, рыпеў аднастайным старчаскім голасам.

Ён успамінаў. Разгортваў доўгую-доўгую стужку пражытага. Ён хацеў выкласці ўсё сваім дзеткам. Усё, усё чысценька. Каб не асталося нічога, каб не знесці з сабой у магілу чаго. Хацеў сваё «я», істоту сваю пераліць у гэта жыццё, якое не мае пачатку, канца, якое смерці не мае, не баіцца смерці.

Ён павінен астацца ў жыцці. Ён астанецца ў ім, не памрэ. Смерць — гэта ж слабая, бяссільная цацка.

Ішоў дахаты ўжо надвячоркам. Праводзілі дзеці шумліваю гурмай. Смяяліся весела. І сам ён смяяўся, жартаваў.

Заходзіла сонца. З густа аблітага чырванню неба спаўзала, хавалася за кругавідам.

Мо памірала?

Ды не. Дзе ж памірала, калі аставалася тут, на зямлі, сваёй цеплю жывой, сваім духам, што сілу жыццёвую творыць, што творыць жыццё. Дзе ж яно памірала?..

Вось так і чалавек...

ЛІПА

1

Чорная, дзіка пагбаная старасцю,— яна адпым сваім выглядам абуджала ў кожнага чалавека непрыемнае пачуццё. Яе тулава было цяжка схіліўшыся да зямлі, быццам застыла яна ў беспрасветна-панурай гатоўнасці рынуцца долу і з чорнай пакорай аддацца смерці. А сук адзін — караваты, грамоздны — тырчэў высока ўгару і выдаваў страшэнным пальцам, узнятым у нейкай злавеснай пагрозе.

Пад гэтай ліпай плакала некалі дзяўчына вясковая Ганна, на грудзях плакала ў хлопца свайго аблюбёнага, у нешчаслівага свайго жаніха. А йшоў Андрэй тады ў свет няведамы, уцякаў ад немінучае смерці. У глухую чорную ноч адбылося іхнае развітанне — гэтая ноч была ціхая ад грузна навіслай трывогі, была чужая зусім, непрытульная. Удзень перад тым з вёскі пайшлі чырвоныя. Хоць блізка быў вораг і па вёсцы ўжо вострым сіверам віўся спалох, але ўсё ж моладзь праводзіла іх аж да Шырокага Бору, і Андрэй зноў браў у Ганны тую пунсовую хустку, каб, уздзеўшы яе на шасток, несці наперадзе — з Ганнінай хусткі рабіў ён прыгожы яскравы сцяг. Гэтай хусткай выціраў ён уночы пад ліпай Ганніны гарачыя слёзы, а потым, адыходзячы, роўненька склаў яе і прашаптаў з балючай пяшчотнасцю:

— Хай гэта на памяць... Я буду, Ганулька, насіць яе пры сабе і цябе ўспамінаць... увесь час... да смерці.

Пад чорнай пакарожанай ліпай злавілі потым Андрэя, пераапранутага ў старца-калеку. Для прыгрозы сяляпам яго павесілі на крывавым суку, што ўзняты быў як страшэнны, жудасны палец. А здымаць або нават кратаць яго забаранілі строга — смерць чакала таго, хто б памкнуўся парушыць гэты загад. Чорнымі бяздонна пустымі начамі прыходзіла толькі старая матка паведаць сваёго гаротнага сына — падпаўзала, як злодзей, пад сагнутае тулава ліпы, сцеражліва ўставала з долу і ўзнімала ў цемру дрыжачыя рукі, каб знайсці мёртвыя сынавы ногі. Яна абпімала гэ-

тыя ногі, аплятала іх порсткімі пасмамі сівых валасоў і стаяла так у бязмернаі ціхасці гора, пакуль не ссыпалася з ліпы дробная песня вясёлаі птушкі — вястуніі блізкага золку. Тады пачынала плакаць старая — плакала яшчэ з паўгадзіны і адыходзіла роўнымі марудлымі крокамі, змораная і апусцелая. Каля гумён яе чакала Ганна. На змучаным твары старої тады аджывала трывожная ласка. Яна рупліва зашпільвала Гаппе кажушок, папраўляла на галаве ў яе хустку і, выціраючы шурпатаі рукої Ганніны слёзы, шаптала:

— Не йдзі, пявестачка... Не йдзі, сіротачка... Хаї ужо я, старая, дык мне чаго ўжо баяцца... А цябе не пушчу, мая дзетухна: загубяць цябе, закатуюць...

Агульнае гора звязала было гэтых жанчын глыбокаї пяшчотай, і Ганне зусім не дзіўна было, што цяпер, калі не стала яе жаніха, старая пачала яе звать пявесткаї.

2

Зусім патуральна, што пан скрыгаў зубамі ад злосці, калі бачыў, як на былых яго абшарах працавітым і дружным роем будуюць сяляне муры повага сваїго дабрабыту. З самага таго часу, як у зялёпаї лагчыне, што за вясковымі гумнамі, мізэрная рэчка Латаўка абярнулася ў непераступны рубеж і нахабна разбіла жыццё на два дзіўна-розныя светы, з самага таго часу і пайшло гэта нявіднае і няўлоўнае спаборніцтва.

Невядома, якім спосабам маглі пералятаць цераз рубеж розныя весткі і чуткі, але яны ўсё-ткі пераляталі і перано-сілі з адпаго боку дзіка-пагрозную, але бяссільную лаянку, а з другога — нечакана яскравыя ўзблісклі повага росквіту. Калі праз гады тры выскачыў з вёскі на былое панскае поле зграбны пасёлак, пан нават ліст пераслаў — пагражаў, што як зменіцца лад, дык спаліць дашчэнту пасёлак, а гаспадароў засудзіць за беззаконнае засяленне чужої зямлі. Сяляне тады наладзілі пану грозную дэманстрацыю: усцяж на мяжы пусцілі новенькі трактар (трактар туркатаў з валўніча-задорнаї пыхаї, быццам дражніўся) ды яшчэ пачапілі чырвоны сцяг — на, пан, дзівуйся, дрыжы ад злосці.

Але вось і некалькі год мінула, а ўсё неяк зашчэміць сэрца, калі зірнеш туды, за сялянскія гумны, дзе такая лагодная, простая Латаўка стала раптам грознаї мяжкої і адзічэла ў суровай сваёй незачэпнасці. За Латаўкаї усё тое самае: гарэзна набег удалеч узгорак — направа ўпёрся ў

пушчу-драмушчу, а палева адкрыўся раскошным полем; на самым бадаі што ўзлессі хмура затоіўся ў зеляніпе пацскі маёнтак — пераходжапа гэта ўсё, пераезджапа, шчодра паліта мужыцкім потам, а часам слязьмі. Усё — тое самае і ўсё — дзіка-чужое, непрыветпае.

Зусім блізка за рэчкаі Латаўкаі на скрыжаванні дарог стаіць, панура схіліўшыся да зямлі, старая чорпая ліпа. Сяляне пе любяць глядзець па гэтую ліпу — цяжкое пачуццё абуджае яна сваім карчаватым шкілетам, збярогшым у сабе жывы напамінак аб смерці. Але пайбольш гняце гэты злавесны помнік таго, каму ў самае сэрца ўвайшла страшэпная смерць партызапа. Кожны рапак, ідучы па гумно па трушапку, старая Арына з балючым сумам глядзіць на крывую постаць знаёмага дрэва, і яе аслабелае сэрца сціскаецца ад глыбокага жалю, перамяшанага з певыразным цяжкім прадчуваннем. Яна на скоры поспех робіць трушапку і, працятая незразумелай трывогай, спяшаецца ў хату, каб заспець яшчэ, каб пе пайшоў на службу ў Савет Міколка. Яна з хаплівай прагнасцю ўглядаецца ў прыгожы энергічны твар свайго меншага сына, быццам хоча ўбачыць на ім таемпыя адзнакі сыпаваї долі, і ў матчыным эгаізме шкадуе, што Міколка такі прыгожы, разумны, усюды прыметны. Такому, як ён, заўсёды першы гопар і першая кара. Не ўжыве ён, пакіне яе, сіраціну, як і той, старэйшы.

Адно толькі нарэшце давала спакоі Арыне — гэта ціхая, светлая думка аб тым, што Міколка кахае Ганну і скора ажэніцца з ёй. Здавалася, што ад гэтага неяк зменіцца ўсё, паспакайнее ў жыцці. А тое, што Ганна кахала Андрэя, яна не лічыла за перашкоду да іхнага шлюбу — гэта яшчэ больш прыхіляла яе да дзяўчыны.

— Які ж тут грэх! Яна, можа, і кахае Міколку затым, што помніць таго, што падобны ён на Андрэя...

Аднойчы прыйшоў на вёску чужы чалавек — назваўся перабежчыкам з Польшчы,— ён цэлы вечар апавядаў пра тое, што дзеецца там, за мяжой. Ён расказаў, што збіраецца там незлічопая сіла, каб пайсці па бальшавікоў, што хутка будзе вялікі бой і расправа. Арына чула гэта апавяданпе і пасля таго пе спала цалюткую поч. Увачу вырастала крывая чорпая ліпа, узпімала ўгару свой страшэпны палец і пагражала. Арына рабіла вялікія патугі, каб не ўявіць, як на гэтым заклятым суку вісіць яе Міколка, пейкая пепаслухмяпая частка істоты ўпарта падсоўвала гэты жудасны вобраз. Арыне пачынала здавацца, што ўся пе-

бяспека, увесь страх толькі ў ёй, у ліпе, у яе гэтым высока ўзнятым суку. Раніцой Арына, ідучы на гумно, доўга баялася зірнуць у той бок, дзе стаяла страшнае дрэва. Але нешта цягнула паглядзець па яго, перамагала гэты інстынктыўны і незразумелы страх. Яна спачатку скоса зірнула туды, потым шырока выпяла вочы, задрыжэла ўся чыста і павалілася на свае вераўчаныя рэзвіны. Ёй здалося, што на ліпе, на страшэнным тым высокім суку вісіць чалавек.

3

На вёсцы адразу ўсе зразумелі, што гэта пан загадаў павесіць на дрэва сабаку, што гэта яго чарговы жэст супраць вёскі. Пужае! І над гэтым усе дружна смяяліся. Але старую Арыну не заспакоіла гэта. Тое, што яна бачыла раніцой, застрала жудаснай зданню ў яе свядомасці і, злучыўшыся з начнымі кашмарамі, апанавала нязводнай трывогай і страхам. Яна не магла ўжо пайсці туды, на гумно, не магла зірнуць на чорны шкілет заклятае ліпы. Ёй здавалася, што гэта дрэва стала перад ёй і загарадзіла жыццё, не дае прасвету, не дае вольна, спакойна дыхнуць.

Гэты хваравіты настрой і штурхнуў старую Арыну на небяспечную і зусім недарэчную справу. Яна гукнула да сябе Ганну і, сцеражліва зачыніўшы дзверы, зашаптала ў ліхаманкавым хваляванні:

— Я ўжо, Ганначка, больш не стрываю так... Мне ўсё здаецца, што Міколка наш там вісіць нежывы... Не будзе дабра нам, галубачка, згубіць яна... Дзетухна, памажы ты мне, не пакінь, ты ж дачкой мне цяпер зрабілася... Я надумала ўжо, што рабіць... адной не змога... удзвюх трэба... Пойдзем, Ганначка, пойдзем...

У тую самую ноч гэтыя дзве жанчыны перайшлі дзяржаўную мяжу. Ім спрыяла надвор'е: павакол непраглядная сцяной стаяла густая чорная цемра. Толькі няўмесны шолах мог выдаць іх пагранічнай варце, але яны ішлі так ціха, што самі не чулі сваіх крокаў. Як і тады, калі хадзіла Арына да мёртвага сына, яны падпаўзлі пад сагнутае тулава ліпы і прытаіліся там, правяраючы вакольную цішыню. Да маёнтка адсюль было крокаў трыста — там не павінны былі нічога пачуць. Магла выкрыць іх пры сваім абходзе пагранічная варта. Але — хай будзе, што будзе!

Яны пачалі пілаваць. Хрыпучы гук першых махаў пілы нязграбна кульнуўся ў цемру. Яны спыніліся і паслу-

халі. Ціха ўсё, як і рапей. Пачалі зпоў. Піла, разагпаўшыся, паішла ямчэй і плаўпсй — яны пе спыняліся ўжо, а з адчаінай рашучасцю палягалі на працу. Трупехлае цела старой ліпы надзіва лёгка паддавалася ім, а праз колькі хвілін піла і зусім вольна паішла — усярэдзіне ліпы было шырокае дуплё. Потым выяўна пачулася, што зубы пілы вязка чапляюцца за нешта мяккае, зусім не падобнае да дрэва. Жапчыны разам спыпіліся. Старая шапнула з мімавольным страхам у голасе:

— Там пешта ёсць у дупле... Будзем пілаваць з бераго ў.

Ліпа пачала глуха крактаць — і здавалася, што не на смерць сваю яна наракае, а толькі на тое, што не даюць ёй, старой, спакоіпа заснуць. Паваліласа яна зусім нечакана і пеяк смешпа: спачатку боўтнулася, як п'яная, уваткнулася лбом у зямлю, потым зважна перакруцілася (сук тоі уніз пацягнуў) і саскочыла з пня — здалося, што перавярнулася дагары, каб выгадней было ляжаць. Некалькі хвілін жанчыны перухома сядзелі і прыслухоўваліся. Потым старая пачала аглядаць, што там было ў дупле. Яна доўга комчыла пешта, варочала, варушыла, а тады раптам пахіснулася, як тая падцятая ліпа, узляглася на пень і захліпала жаласна:

— Сыночак ты мой, даражэпькі... Гаротненькі мой...

У дупле была Андрэева вопратка. Ганна зразумела гэта, як толькі абмацала так добра знаёмы ёй узор вышыванаі сарочкі. Яны прытуліліся адна да адной — гэтыя дзве пакрыўджаныя жапчыпы — і аблівалі слязьмі вопратку загублепага колькі гадоў таму назад чалавека...

— Ён пераапрануўся тут у старца... а гэта схаваў... Родненькі мой, даражэнькі... Забяром гэта з сабою... Забяром, дзетухна...

Яны, спяшаючыся, сабралі раскідапую вопратку і цішком пасунуліся ад гэтага страшнага месца. Як падышлі ўжо блізка да самае рэчкі, Ганна раптам, быццам успомніўшы пешта, замятушылася, кіпулася да Арыны...

— Мамка, мамачка!.. Пакажыце сюды!

І, вырваўшы з рук у старой Андрэеву вопратку, пачала паспешна перабіраць яе ўсю, быццам нечага ў ёй там шукала. А тады зноў аддала назад, а сама кіпулася туды, дзе была ліпа.

— Чакайце мяне, мамачка, тут...

Працяклі тры даўгія-даўгія хвіліпы. Здалося старой, што сухі хруст пачуўся адтуль, куды пабегла Ганна, быц-

цам ламалася там пейкае дрэва. Яна пастаяла яшчэ колькі хвілін і хацела ўжо ісці туды, але ў гэты момант пачуўся наблізу стоены воклік дзяўчыны:

— Гэта вы, мамка? Пойдзем ужо...

У яе голасе чуваць было радаснае заспакаенне — гэта вярнула спакой і Арыне. Яны памалу пасунуліся далей. І цяпер ніхто не заўважыў іх у чорнай беспрасветнай цемры.

А назаўтра ўранні старая Арына паішла па гумно па трушапку. Яна дрыжала ад страху, калі падыходзіла да таго месца, адкуль відаць было заклятае дрэва. У яе была нейкая жудаспая ўпэўненасць, што чорпая ліпа стаіць, як і раней, што ўначы гэта быў толькі сон, ад якога не магло астацца ніякага следу. Яна ледзь ступала ціхімі няўпэўненымі крокамі і доўга не магла ўзняць ад зямлі палахлівага погляду. Калі ж нарэшце сабрала ўсе сілы і зірпула туды,— такая карціна адкрылася ёй:

На зямлі, як агідны труп нейкага страшэннага звера, ляжала ліпа. Чорны жылаваты сук (той закляты жудасны палец) педалужна ўпёрся ў зямлю і ўламіўся. Здавалася, што гэта ліпа, падаючы, памкнулася была абаперціся аб яго, але ёп не вытрымаў цяжару старога трухлявага цела.

А ў чорным пні зрэзанай ліпы тырчэла высокая палка, і ранішні вецер жвава церабіў на ёй яскравы пупсовы сцяг — Ганпіну хустку.

Дзіўны спакой сышоў тады па старую Арыну, і яна ціха, радасна засмяялася.

ПАЭМА ПРА ЧОРНЫЯ ВОЧЫ

Сем гадоў я шукаў цябе ў сумятлівым моры жыцця, каб скончыць недапетую песню нашае дзівосна яскравае дружбы.

Я не сумаваў па табе, я не ўздыхаў і не плакаў. Я толькі часамі бачыў цябе, калі ў маім уяўленні спакусліва разгортваліся шырокія палотны мінулага і сталёва свежая шыр (помніш нашы паходы?) дражніла сваёй непазбыўнаї рамантыкай. Я бачыў цябе зусім выяўна-тонкую, гнуткую постаць тваю ў вайсковым адзенні, антычны твої твар, твае вострыя чорныя вочы. І вось тады мне чамусьці здавалася, што я павінен знайсці цябе, што павінны мы скончыць перарвапую песню нашае дружбы.

І, нарэшце, я цябе знайшоў. Я выпадкова пачуў, што ты тут, і пайшоў да цябе, поўны смутнай трывогі і радасці.

У гэтым ружовым пакоі з мяккай канапай, з дыванамі на сценах мне чамусьці цяжка, няёмка. Я не ведаю, як з табой гаварыць, я адчуваю, што ты шкадуеш мяне, мне страшна за нашую песню, за нашую дружбу. Чаму не сустрэліся мы дзе-небудзь на вятрапых берагах сцюдзёнаї Дзвіны, чаму я не ў чаравіках дзіравых з абмоткамі, чаму ты не ў тоўстаї салдацкаї шынелі, якая сціпла хавае твае дзявоцкія формы, у якой ты мне — дарагі, любы таварыш!..

Я гляджу на твої твар і з трывогай бачу ў ім нешта новае, нешта цяжкое, гладкае. Твае вочы сталі вузкія ад пачуцця дабрабыту, усмешка твая вязне ў цягучай марудліваї млосці. Я хачу не глядзець і не магу адвесці вачэй... Мне шкода, шкода цябе — майго дарагога, любага таварыша, мне шкода мінулага нашага.

Пастой... Я напомню табе аб гэтым мінулым, я квяцістa-яскравымі вобразамі сатру з тваїго твару гэтую мляўвую гладзь, твае чорпыя вочы зноў загараццa вострым агнём, ты станеш такая, якая была ў тыя бурлівыя дні.

. . . . . .

Нашы нашомкі складуць шмат прыгожых легенд аб днях, у якія гарэла святая нянавісць і морам лілася кіпучая кроў. Аб іх будуць расказваць старыя дзяды блакітнавокім унукам, і ўнукі будуць загарацца запалам гэтых вялікіх дней.

Калісьці ты прыйшла да нас, поўная такога запалу. Я адразу тады зразумеў, што тваё сэрца кіпіць, што ты прагнеш барацьбы, хочаш аддацца ёй, хочаш загінуць. Ты адразу сказала мне, востра бліснуўшы вачмі:

— Таварыш камісар! Я вазьму вінтоўку і пайду ў роту.

Я пакінуў цябе пры штабе. Мне нялёгка далося ўгаварыць цябе, што і тут можна быць карысным, што небяспека тут не меншая, што і тут людзі патрэбны.

І вось пачало нешта расці паміж нас. Я назваў гэта дружбай, а што гэта было сапраўды — я не знаю. Ты памагала мне.

У цябе ў той час была сіла. Помніш твой жарт наконт «мокрай прытульнасці»?

О, гэта была цяжкая, страшэнная ноч. Калі я ўспамінаю аб ёй, я адчуваю фізічны холад, я здрыгаюся, быццам мяне абдаюць жорсткай, сцюдзёнай золлю. І ты, слабая дзяўчына, суцяшала мяне, выдумляючы нейкае глупства аб тым, што, седзячы пад халодным, ледзяным дажджом і не шаволячыся, можна адчуць асаблівую прыемнасць і цяплынь. Толькі, каб апі-ні не зварухнуцца, каб аддацца цалкам дажджу і старацца ўявіць, што дождж цёплы, што ён не халодзіць, а грэе. Ты назвала гэта — «стварыць мокрую прытульнасць». Я, помню, прабаваў гэтак рабіць, і сапраўды было цёпла, і весела было, і я потым хадзіў да чырвонаармейцаў дзяліцца з імі сваёй бадзёрасцю...

. . . . . .

Не, я цябе не кахаў. Я не бачыў цябе як жанчыну. Можа, гэта таму, што повен быў у той час другім, больш пільным і важным, таксама, як і ты, як і ўсе, хто з намі быў. Мне ўспамінаецца той вечар у маёнтку... Гэта выйшла неяк зусім пяўрымсля і нечакапа. Я не хацеў гэтага, не імкнуўся да гэтага. Мне потым было непрыемна. Я помню (аб гэтым смешна казаць, але — хаї сабе), калі я цябе неяк узяў за руку, дык адразу мне дзікім здалося, што рука такая малая і мяккая, што яна неяк квола, падатна

засталася ў маёй і чамусьці дрыжэла... І ўсё, што потым было, праїшло зусім несуразна і дзіка...

Не, я цябе не кахаў...

. . . . . .

Яшчэ вось што... Калі па лясах і палях пасцілаецца жоўтай празрыстасцю восень і глыбачэюць крыштальныя далі, калі сеецца ў полі журавінавы пах пажоўклай травы, я ўспамінаю нашы паходы. Я рассыплю прад тваімі вачмі абрыўкі тых некпых малюнкаў, ты пачуеш непазбыўнаznaёмае, вольнае...

Ахутаныя старожкім шолахам калоны...

Рэдкі — упаўголаса — гоман...

Глухі, уцісклівы тупат стрымленых коней...

Нехта мармыча ледзь чутна нейкую песню...

Нейчы спудзіўся конь, лапатнуў з усіх ног ад куста...

Нехта каманду прапеў упаўголаса: — Пад но-о-г-і...

І маўчыць цёмны санлівы лес, лезе з бакоў у самыя вочы абвіслай сваёй барадой — і сліна цячэ з барады, мажа твар прыкрым макроццем...

Пахне коньмі, пахне цішынёй насцярожанай, пахне шынелямі і людзьмі...

Нечым пахне — дружным, як хвалі, моцным, як сталь, і напорным, як бура...

Або так...

...Лёгкае восеньскае сонца...

Стары бярозавы шлях — дзіравая жоўтая стужка...

Мерны, бадзёры поступ пяхоты...

Пыл здаецца сталёвым налётам, здаецца, што ўсё ў сталі...

Песня...

Песні былі рдзяныя, як усход, звонкія, як восеньскі холад, імклівыя, як прастор...

Ты ішла разам з усімі. Ты пела так: закідала назад галаву, жмурылася, нібы глядзела на сонца, і крычала. Помніш, як цёпла смяяліся хлопцы, калі ты спявала?..

. . . . . .

Слухаї, я раскажу яшчэ апошняе. Я напомню табе наш апошні дзень. Мне таксама быў ён цяжкі. А табе была мука, я ведаю. Толькі не каюся я ні ў чым, не шкадую нічога...

Ты помніш, які гэта быў страшэнны, напружаны бой? Помніш, у якой сумятні быў наш штаб, якая была сумятня наўкола? Музыка гэтага бою жыве ва мне да гэтага часу! Яна зраслася ў адзін грымучы акорд, у якім пераблытаны ўздыхі гармат з траскатнёй кулямётаў і стрэльбаў, з адчайным рыпеннем абозаў, з недалужным стогнам параненых, з мітуслівым гвалтам асалапелых ад страху.

Наш полк біўся адважна. Але сіла была не на нашым боку. З кожнай мінутай у штаб прыляталі трывожныя весткі. Нам трудна было ўжо трымаць сувязь з часцямі, мы разагналі ўсіх веставых, і шмат з іх не вярнулася. Штаб паспешна рыхтаваўся адступаць.

Тады прыйшоў загад зняць полк з пазіцыі. З батальёнамі сувязі ўжо не было, пры штабе не было ніводнага ардынарца, не было каго паслаць з загадам.

Я не збіраўся цябе пасылаць, у мяне не было і думкі аб гэтым. Але ты стаяла паблізу, і я няўмысля зірнуў на цябе. Тады ўжо я не мог не паслаць...

Ты была незвычайная. Я добра помню, якая была ў той міг. Ты стаяла нерухома, падаўшыся троху наперад, твар твой быў белы як снег, і з яго зрываліся вострыя чорныя вочы — не вочы, а чорны агонь — жывы і пякучы.

Ты ўся была — парыванне і воля.

Ты ўся была — адно імкненне.

Я тады ўвесь загарэўся магутнай радасцю, я, можа, нават кахаў цябе ў тую хвіліну. Я ледзь стрымаўся тады, каб не кінуцца да цябе, каб не абняць цябе — любага маёго таварыша, героя. Гэта ж наўмысля я цябе так суха паклікаў тады, нават назваў па прозвішчу. Гэта ж наўмысля я не сказаў ані слова, апрача сухога лаканічнага загаду...

Я з захапленнем сачыў за табой, я не зводзіў вачэй, любаваўся, як ты адважна схапіла стрэльбу, спрытна ўскочыла на каня і паляцела птушкай па полю насустрэчу смерці.

Ты была прыгожая тады. Ты такой і засталася ў маім уяўленні, такою я бачыў цябе ўсе сем год, такую шукаў.

Потым я сустрэў цябе на дарозе, за вёскай. Мы ехалі насустрэчу пашым часцям, прабіваліся скрозь затоку павозак, конных і пешых людзей, скрозь гармідар адступлення. Цябе везлі на тэлефоннай двухколцы нашы армейцы. Убачыўшы мяне, яны спыніліся і дапытліва зірнулі, чакаючы загаду.

Ты глядзела на мяне ціхімі пагаслымі вачмі, у якіх скрозь маўклівыя слёзы свяціўся стрымлены боль. Я знаю, ты хацела астацца са мноїй, ты хацела тады ласкі блізкага, хацела добрага спагаднага слова. Я не ведаю, можа, я зрабіў вельмі жорстка, можа, іначаї трэба было. Але я не шкадую. Я рабіў па закону барацьбы. Помніш? Я сказаў толькі два словы:

— Адправіць у шпіталь...

Пакуль вы ад'ехалі, я яшчэ раз сустрэўся з табоїй вачмі. Мне здалося, што ты ўсміхнулася мне. Але гэта, пэўна, толькі здалося, бо я хацеў гэтага, я напружана чакаў гэтае ўсмешкі.

. . . . . .

Вось і ўсё. З таго часу сем год я шукаў цябе, каб скончыць недапетую песню нашае дзівоспа яскравае дружбы.

І вось я знайшоў. Вось сяджу прад табой, збянтэжаны гэтым ружовым пакоем з мяккай канапай, з дываномі па сценах, збянтэжаны печакана — новым выразам твайго антычнага твару.

Не, я цябе не знайшоў, я шукаю яшчэ. Я пільна азіраю тваю прыгожую, пышную постаць, выразна акрэсленую складкамі шоўку, я з балючым напружаннем углядаюся ў твар твой, я хачу працяць сваім гарачым поглядам гэтую млявую гладзь, гэты агідны ўзор дабрабыту. Я хачу ўбачыць цябе — майго дарагога, любага таварыша, героя.

Я шукаю цябе — чуеш? — і не знаходжу.

Я гляджу з болем і страхам на тваю прыгожую постаць, яна чужая, агідная.

Ты ўсміхаешся? Кінь гэту ўсмешку — у ёй плыве даволыіасць жывёлы. Не трэба смяяцца...

Твае вочы глухія, як пустата. Няма чорнага агню, ніякіх вострых вачэй майго героя...

Ага... Я разумею... Я цяпер зразумеў. Я шукаў не цябе... Не, ты мпе не трэба. У сумятні пярэстаї жыцця я шукаў сталёва свежаї шыры, я шукаў непазбыўнаї рамантыкі.

Я пайду ад цябе. Я цябе не знайшоў, не заспеў.

Я пайду ў сумятлівае мора жыцця. Сярод блытаніны драбніц, у віры гарачаї будзённічыны, у брудным пыле вугалля, цэменту і вапны, у шаломным грукаце дзён — я буду шукаць яе — свайго дарагога, любага таварыша.

Я знайду яе, я ўбачу магутны, чорны агонь яе прыгожых вачэй, яе запал абаўе мяне жыватворчаю сілай.

Я пайду. Я знайду яе, дармо ты смяешся...

Не смейся! Смех твой агідны мне, прыкры.

Не жмур сваіх чорных глухіх вачэй, каб не бачыў я ў іх пачуцця дабрабыту, каб не свяцілася ў іх давольнасць жывёлы...

Не смейся!

Я пайду шукаць...

Я знайду...

РАКАВЫЯ ЖАРОНЦЫ

Як я быў маладым дзіцянём, мне часта траплялася, гуляючы, запарашыць сабе вока. Тады я са слязьмі на вачах і з захаванай радасцю ў сэрцы бег да свае слаўнай бабулькі. Яна з ласкавай буркатнёй адчыняла старую вялізную скрыню і там, у прыскрынку (колькі хаваў гэты прыскрынак таемных, недасяжна-чароўных скарбаў!), там знаходзіла яна загорнутыя ў цэлы груд спарахнелаі паперы белыя маленечкія кружэлачкі. З руплівай уважнасцю слініла яна адну з гэтых кружэлачак і асцярожна пускала яе мне над павека. Я стаяў, урачыста аслупянелы, і ў трывожным здаволенні слухаў, як ходзіць па воку гэтая цудадзейная кружэлачка, як выганяе яна адтуль балючую парашыну.

Гэта дужа мне падабалася...

...У нашай невялічкай рачулцы было многа ракаў. Іх было так многа, што начамі бабы хадзілі з святлом і збіралі іх у траве каля ракі. Нам казалі, што ракі выпаўзаюць ноччу на бераг за жабамі. А ў гарачыя летнія дні мы лавілі ракаў проста рукамі. Мы бясконца тады пеляскаліся ў цёплай вадзе, поўзалі сярод цягучага, вужакаватага багавіння і былі бязмежна вясёлыя, шчасныя. Цяпер мне здаецца, што не было ні вады, ні багавіння, ні ракаў, а толькі сонца, адно толькі сонца — гарачае, блізкае, як смаглыя вусны палюбоўніцы.

Ракаў заўсёды варыла нам наша бабулька. Яна вучыла нас, як трэба іх есці, і строга паказвала, каб шукалі мы ў кожнага пад вачмі белых маленькіх кружэлачак. Мы шукалі дужа старанна (на сто ракаў траплялісяя ны, можа, ў двух або ў трох) і, калі знаходзілі, з радасцю аддавалі іх нашай бабульцы. Яны падобны былі на маленькія жорны, і звалі мы іх — «ракавыя жаронцы».

Гэта было дужа-дужа даўно...

Жыццё калаціла і рвала мяне, як восеньскі вецер сцятую з дрэва галіну. Мяне папарадзе чакала бруднае смет-

піпча — туды нёс ліхі азвярэлы вецер. Жыццёвы пыл запарашыў мпе вочы, і слёзная муць заслала мої зрок — гэта былі слёзы роспачы, злосці і нянавісці. Я стаў, як сляпы, мае вочы страцілі сваю блакітную яснасць, і я ніяк не мог прасвятліць іх, бо ў мяне не было ракавых жарошцаў.

Родная мая, дарагая бабулька!..

...Адылі потым я жыў пядрэнна. Праца мая была зусім лёгкая і давала многа прыбытку. Я працаваў дужа спрытна, бо я быў хітры і рабіў заўсёды адзін. Ого! Я ведаў ужо, што значыць — таварышы. Мне жыццё шапатнула аднойчы на вуха пра вечны непарушны закон, што чалавек — кожны чалавек — да канца будзе верны толькі самому сабе. Я нікому не казаў пра гэты закон, а сам заўсёды ім кіраваўся — і гэта давала мне перавагу перад усімі. Я добра працаваў, мне шанцавала — я быў упэўнены ўжо ў сваёй сіле і ў сваім шчасці. Таму я сам страшэнна здзівіўся, калі раптам прыйшоў мой нешчаслівы канец. Безумоўна, тут выйшла вялікая недарэчнасць. Ва ўсім вінаваты былі гэтыя маленькія ракавыя жаронцы...

...Той дамок стаяў у глухім кутку на ўскраіне горада. Я дужа люблю такія ціхія глухія дамочкі. У кожным з іх ёсць старая вялізная скрыня, і там, у прыскрынку, ляжыць некалькі штук залатых або срэбных пярсцёнкаў, некалькі крыжыкаў, часам паламаная бранзалетка, сапсаваны гадзіннік. У скрыні ж часамі трапляецца шаўковая плюбная сукня або старадаўны, але зусім яшчэ свежы сурдут.

А навакол дома — ціша і бязлюддзе.

Я выбраў час, калі ў хаце астаўся толькі малы дзіцёнак і з ім старая бабулька. Усё было добра. Бабулька мне адчыніла, і я ўвайшоў, нібы звычайны знаёмы або падарожнік. У пакоі мякка свяціла лампада, пахла свежавымытай падлогай і — здалося мне — трошачку ладанам. Была ў гэтым пакоі такая бязмежна глыбокая ціхасць, што мне заманулася сесці тут і адпачыць, забыўшыся на ўсе трывогі і клопаты. Але я ўспомніў, што трэба спяшацца.

Калі я растлумачыў старой пра мэту сваіго з'яўлення, яна насцярабавала крычаць, але я зараз жа яе супакоіў. Яна села на лаўку і ўсё паўтарала, як непрытомная:

— Божухна... божухна... божухна...

Тады раптам заплакаў дзіцёнак. Мяне заўсёды нервуе дзіцячы плач, але гэты крычаў асабліва дзіка і прарэзлі-

ва. Я ўскінуў на яго цяжкую падушку, і ён змоўк. Яны потым абвінавацілі мяне ў забойстве таго дзіцёнка. Дзівакі! Хіба я ведаў, што ён канечна памрэ?

Я запытаў у старой, дзе ляжаць грошы, і яна пачала клясціся, што грошай няма. Я паверыў. Я ведаў, што ў гэткіх дамах рэдка бываюць грошы. Я знайшоў ключы і адчыніў скрыню. Усе было як належыць. Было дзве досыць спраўныя суконкі, быў і сурдут. У куточку з асаблівай старанпасцю складзены і павят загорнуты ў паперку ляжаў новенькі дзіцячы гарнітурчык.

Потым я ў мімавольным, так добра знаёмым мне, узрушэнні падняў века прыскрынку. Тут чакала мяне расчараванне. З нервовай паспешнасцю перакідаў я маткі каляровых нітак, акрайкі розных матэрый, галоўкі сухога часнаку (некаму трэба ж было сюды іх заперці!) — і не знаходзіў нічога, што б мела хоць якую-небудзь каштоўнасць. Мяне гэта раздражняла. Я гатоў быў ужо спыніць бясплоднае шуканне і з большай энергіяй узяцца за асалапелую бабулю, але ў гэты момант спрытнае вока маё заўважыла ў куточку нейкі падазроны скрутак. З запалам заўзятага паляўнічага я ўхапіўся за гэты скрутак і пачаў яго разгортваць.

Зверху была нейкая шмотачка, потым папера, яшчэ папера, яшчэ. Я ўсё больш і больш хвалявaўся, нецярпліва рваў адну за адной парудзелыя ад часу паперкі і, парэшце, дабраўся да самага скарбу: у апошняй маленькай паперцы было загорнута некалькі пар ракавых жаронцаў...

Мяне ахапіла агнявая шалёная злосць. Я і да гэтага часу не магу ўсвядоміць, што сталася прычынай гэтага пачуцця. Яно неяк раптам захлынула мяне, скаланула ўсю маю істоту і папясло на сваіх пястрыманых хвалях. Быццам уся тая нянавісць, якая прайшла праз жыццё маё, раптам уваскрэсла і злілася ў адно бязмежна бурлівае полымя. Я быў злосны за ўсё: за тое сонца ў дзяцінстве, за цёплую рэчку, за багавіння... Я быў злосны за жыццёвае смецце і пыл, за жорсткі восеньскі вецер... І асабліва — за той вечны, непарушны закон, які мне адкрыла жыццё.

Я, мусіць, быў тады зусім непрытомны, бо я чамусьці высыпаў на падлогу тыя белепькія кружэлачкі і пачаў іх таптаць. Потым, азвярэлы, кінуўся на старую, каб задушыць яе. Потым... потым выйшла тая вялікая недарэчнасць...

Я ўбачыў худыя дрыжачыя рукі, якія яна працягвала мне насустрэчу. Я, пэўна, успомніў рукі мае бабулькі —

яны былі таксама худыя і дрыжачыя. Яна часта гладзіла імі мае раскудлычаныя сукрыстыя валасы. І вось — я спыніўся... Нешта балюча, востра так сціснула грудзі, заняло дыханне. Я ледзь набраў сілы, каб стаяць на нагах.

А потым... потым я плакаў, здаецца. Я апусціўся на дол і паклаў галаву ёй на калені. А яна дрыжэла ўся чыста і — збянтэжаная, перапалоханая — усё паўтарала:

— Грэх табе... грэх табе...

Тут забралі мяне і адсюль павялі ў турму. Ідучы, я неўзаметку падняў з падлогі пару ракавых жаронцаў, якія я не ўправіўся быў растаптаць.

Цяпер, калі часам у мяне запарашыцца вока, я кладу сабе пад павека белую маленькую кружэлачку. У мяне з вачэй тады цэлымі ручаямі льюцца слёзы, і я хаваюся ад сваіх таварышаў, бо яны чамусьці думаюць, што гэта я плачу. А я зусім не плачу: гэта слёзы цякуць ад таго, што запарошана вока.

МАКСІМАЛІСТ

Максімалістам назваў быў яго Вовачка Пенкін, як рабіў даклад на тэму «Аб этычных пормах і прадпасылках свядомае дысцыпліны ў атрадзе». Ніхто не ведаў тады, што гэтае слова ўсяго за дзень перад тым знайшоў Вовачка Пенкін у «Слоўніку палітычных тэрмінаў», а таму ўсе, як адзін, працяліся глыбокай павагай да незвычайнае Вовачкавае прамудрасці. З таго часу максімаліста ніхто і не зваў іначай, як толькі — Максімаліст. Праўда, гэтая назва, як і ўсе іншыя назвы, потым была скарочана (Макс), але ў скарочаным выглядзе яна яшчэ шырэй зазвычаілася сярод піянераў, і сапраўднае імя Максімаліста асталося выключна толькі ў спісках атрада.

Ён і сапраўды быў максімаліст, гэты неспакойны, дакучлівы піянер. У яго была непрыемная звычка — ва ўсе пытанні ўносіць нейкую раптоўную дзікую паспешнасць. Калі, скажам, стаяла пытанне аб выпуску насценгазеты, ён, замест таго, каб гаварыць пра мэты і задачы газеты, пра характар яе, кірунак і г. д., раптам пачынаў турбавацца аб тым, дзе дастаць паперы і фарбаў, хто будзе маляваць, хто будзе збіраць матэрыял — ён быў відавочна ўпэўнены ў тым, што — сказаць, гэта значыць — зрабіць, і гатоў быў рабіць зараз жа, тут, не выходзячы нават са сходу.

І яшчэ была ў Макса адна асаблівасць: у яго надта часта загараліся вочы. У дзяцей наогул вочы зяюць чыста і зырка — гэта свеціцца ў іх свежы агонь жыццёвага рання,— але ў Максавых — сініх, як неба, вачах агонь быў асабліва моцны і рэзкі. Калі ў Максаваї галаве паўставала якая-небудзь жывая вострая думка і ў сэрцы ўзмываліся хвалі новых, яшчэ невыразных імкненняў, тады сінь яго чыстых вачэй займалася магутным полымем, і тады здавалася, што ён увесь тут, у гэтым полымі, што ў бляску вачэй гарыць, цвіце агністым цветам уся яго неспакойна-бурлівая істота.

Такі быў дзіўны, недарэчны гэты Максімаліст. Ён загараўся залішне часта, ён залішне многа гарэў, гарэў больш, чымся належыць гарэць вытрымапаму піянеру. І патухаў ён толькі тады, калі іскры агню яго патыкаліся на шэрую муць бясцветпага погляду Вовачкі.

Вовачка самы старэйшы і самы разумпы ў атрадзе — ён самы важны ў атрадзе, ён зусім, як дарослы. Вовачка нават умее рабіць на сваім белазорым твары асаблівую нейкую спагадліва-насцярожапую ўсмешку, якраз такую, якую ён бачыў у аднаго з важных палітычных правадыроў. Гэтай усмешкай Вовачка і тушыць заўсёды Максаў агонь. Ад гэтай усмешкі (яе пераймаюць, яна расплываецца на ўсіх піянерскіх тварах, бо Вовачка — самы разумны і важны), ад гэтай усмешкі Макс стуляецца, як вожык, і хавае глыбока ў нутро свой непамерпа зыркі агонь.

Ад гэтай усмешкі ў Макса глуха зшібее сэрца.

* * *

Пытанне аб цыганятах стаяла ўжо некалькі раз на сходзе атрада. З таго часу, як побач з пярэста-шумлівым лагерам піянераў выраслі шэрымі цвілымі порхаўкамі брудныя шатры цыганоў, з таго часу, як у мяккай, шаўковай маўклівасці чэрвеньскіх вечароў пачуліся адтуль, з-за ракі, таемна-прыглушаныя адгалоскі дзіўнага табарнага бязладдзя (было многа шчымлівай рамантыкі ў вечаровых песнях, дзікіх выкрыках, у піску, у плачы, ва ўсёй гэтай напружанай сумятні),— з таго часу ўсю піянерскую ўвагу забралі на сябе няшчасныя цыганяты.

На апошнім сходзе лаялі Максімаліста. Небарака Макс, як і заўсёды, загарэўся ад цыганят занадта гарачым бурлівым полымем — ён са слязьмі на вачах дамагаўся, каб узяць іх, вырваць з бруду, гароты, пазбавіць ад здзекаў шалёпых бацькоў, ад голаду, холаду, залучыць у сваю грамаду, схаваць, калі трэба, і не аддаваць, не аддаваць пі за што. Дзівак! Ён думаў, што ўсё можна зрабіць адразу, ён быў упэўнены, што — сказаць, гэта значыць — зрабіць.

Вовачка Пепкін учыніў на твары сваю партрэтную ўсмешку, яна слізганулася на тварах усіх піянераў (Вовачка — самы разумны і самы важны), і Макс пачуў, як раптам абкружыла яго сцяна агульнага пагардлівага адпору. Але ён не здаваўся, ён не мог сёння здацца, бо ў яго памяці яскрава жыў учарашні вечар — з камарыным звонам, з трэлямі нявідных мядзведзькаў, з яварам каля

ракі, з тым пакрыўджаным цыганём — з маленькай чорнаї Аленкаї, з яго, Максавымі, гарачымі ўгаворамі. Ён многа чаго абяцаў ёй, ён думаў, што так і будзе, што гэта проста зусім, бо аб гэтым усе гаварылі і нават запісвалі ў пратакол. А цяпер выходзіла, што словы яго астануцца словамі, што трэба чакаць, што ўсё трэба рабіць паступова.

Што ён скажа сёння гэтаї маленькай слаўнаї Аленцы!

Максімаліста лаялі, з яго смяяліся. А ён упарта стаяў за сваё, ён ні за што не хацеў сёння тушыць сваёго непакойна-бурлівага полымя.

* * *

Пасля сходу спявалі «жураўля». Макс неўзаметку адлучыўся ад грамады, праслізпуў паміж заплямленых вячэрнім змрокам шатроў, перабег праз невялічкі, ужо зусім цёмны, барок і па крывоїї, вужакаватаї сцежцы падаўся ўніз, да рэчкі.

На завароце рэчкі яшчэ ляжаў перламутр пахаладзелага захаду.

Макс асцярожна, з апаскаї перайшоў цераз кладку. Пад кладкай зусім ціха, ледзь чутна, хлюпала рэчка, і здавалася, што ў гэтым мяккім ліслівым хлюпанні схавала яна нейкае ліхое падступства.

На тым баку рэчкі бераг заросшы быў лазняком і высокаї, вышэй за Максавай галавы, асакой. Макс убіўся ў гэтыя зараслі і пайшоў па іх, поўны трывожна ўзпятага пачуцця, быццам ішоў ён па дзікіх джунглях, дзе на кожным кроку можна наткнуцца па крыважэрнага звера, дзе ўсё насычана смяротнаї небяспекаї. Яму было прыемна адчуваць гэты востры незвычайны настрой.

Ён падышоў так да крывой карчакаватаї алешыны, што расла на ўзгорку, зусім недалёчка ад берага. Пад алешынаї зашавяліўся нейкі чорны камочак, і адтуль пачуўся слабенькі дзіцячы голас:

— Макса! Ты?

«Макса» — гэта выходзіла троху непрыгожа і смешна, але ён не злаваў на яе — яна ж таму гэтак звала яго, што іначай не ўмела, іначаї у яе не выходзіла. Ён сеў каля дзяўчынкі і моўчкі дастаў з кішэні кавалак булкі, які прыблюў яшчэ ад снядання. Аленка пачала гучна чмякаць і смешна так кулдыячыла скрозь шчытна напхнуты рот:

— Макса! Каб ты ведаў... Мы абышлі сягоння ўвесь

горад... Я ўсё скакала, скакала... Я маўчала, нічогачка не казала нікому, барані божа... Дзядзька думае, што я і заўтра пайду з ім... Хай сабе думае! А мяне заўтра і звання не будзе. Во, будзе клопату... Ці праўда, Макса?

Што Максу было гаварыць? Ён учора зусім не ведаў, што трэба ўсё наступенна, ён быў наіўна ўпэўнены ў тым, што — сказаць, гэта значыць — зрабіць.

— Макса! А дзядзька зноў сёння набраўся быў, як свіння... мы многа-многа сабралі грошай... Зноў біўся... Такі паскуднік... Во, памацай, які гуз ускочыў на галаве...

Яна сказала гэта і з крыўдай, і з гордасцю — яна ў дзіцячай сваёй прастаце ганарылася тым, што ў яе такі вялікі выдатны гуз. Макс дакрануўся рукой да таго месца, на якое яна паказала, і яму стала страшна. Жудасным, дзіка-жудасным — да болю, да пякучых слёз — здалося яму гэтае непамернае злучэнне маленькай Аленкавай галавы з такім жорсткім нечалавечым ударам. Макс затрымаў руку на Аленкавай галаве, але гладзіў не гуз, не страшнае гэтае месца, а дробныя пярсцёнкі сухіх, як дрот, валасоў на яе худзенькай патыліцы.

— Макса! Ці скора мы пойдзем туды, да вас? Трэба, мусіць, скарэй, бо як хопіцца дзядзька, як зловіць — то задасць тады мне!..

Макс маўчаў. Максу хацелася плакаць, але дзе ж ён заплача! У яго хопіць сілы стрымацца, няпраўда! Ды гэта ж зусім і не слёзы, гэта падыхнуў востры ветрык з ракі, дык разануў троху вочы.

— Макса! Чаго ты нешта маўчыш! Я не хочу так, мне страшна. Скажы, ці скора мы пойдзем?

Трэба нешта сказаць, трэба нешта зрабіць. Вовачка гэты... Які ён нядобры! Ён, мусіць, не бачыў ні разу гэтае любае гаротнае Аленкі.

Уся Максава істота напружваецца ў адчайных патугах — ён хоча знайсці ўсё-ткі нейкае выйсце, ён не можа забыцца на ўчорашні вечар. І вось заглухлы на момант агонь яго выбухае раптам з нечакана магутнай сілай, з такой сілай, што, каб магла яго бачыць Аленка, яна б, напэўна, перапалохалася да смерці. І цяпер ужо Максу ўсе дарогі сталі адкрытымі, віднымі, цяпер ён ужо не баяўся нічога.

Ён смела і цвёрда ўзяў за руку Аленку.

— Зараз пойдзем, Аленка! Ведаеш што... Мы пойдзем дужа далёка, па лесе будзем ісці... ты не баішся?..

Аленка з радасцю хваліцца:

— Я і па магільнік адпа хадзіла. Я не баюся нічога, ані-ні...

Ён бярэ яе за руку, і яны ідуць па беразе рэчкі, па дзікіх джунглях, асцярожна рассуваючы высокую, вышэй за Максаваї галавы, асаку. Цяпер Макс яшчэ больш, яшчэ свяжэй адчувае шчымліва-ўзнятае пачуццё небяспекі, цяпер жа над яго абаронай яшчэ і гэтае малое, недалужнае дзіця.

Максу цяпер зусім добра — у ім закіпае новая, вострая, як малапка, радасць.

Перайшлі назад цераз кладку. Прайшлі міма піянерскага лагера — ён прытаіўся збоку, у густых хмарах дрыготнага змроку, і быў чамусьці страшны цяпер для Макса — страшны і чужы. Узышлі на сцежку, якая вяла ад лагера да гасцінца, углыбіліся ў чорны маўклівы лес.

Макс на хвіліну спыніўся, прыслухаўся. Піянерскі лагер ужо глуха заснуў — у піянераў цвёрдая дружная дысцыпліна — а адтуль, з-за ракі, яшчэ ішлі няяспыя адгалоскі сумятлівага цыганскага бязладдзя. Макс мацней сціснуў Аленчыну руку — сухенькую трэсачку,— бліжэй прыцягнуў да сябе дзяўчынку.

— Аленка! Ты не бойся — я дарогу ведаю добра.

Яна слухмяна пайшла за ім. Нязграбна клыпаючы па слабенькіх ножках, яна ўсё-ткі спраўлялася, ідучы, лапатаць аб сваіх табарных справах.

— ...А цётка вучыла мяне скакаць качучу. Трэба высока-высока падымаць нагу, вышэй за галаву, каб было прыгожа. Але потым ногі дужа баляць. Гэта пакуль прывыкнеш... Цётка казала, што многа грошай будуць даваць... Хай цяпер скача сама, калі хоча...

Потым Аленка змоўкла — мабыць, замарылася, лапатаўшы. Макс таксама маўчаў. Ён нават не чуў зусім, аб чым гаварыла Аленка. У яго ў думках было сваё — турботнае і балючае. Яго радаснае захапленне, яго бурлівая ўзнятасць наткнуліся раптам на нешта халоднае, мулкае, што выросла адпекуль з падсвядомай глыбіні яго піянерскай істоты. Ён успомніў пра атрад, пра Вовачку Пенкіна, пра іхныя спрэчкі і пачуў сябе злачынцам.

Ён не каяўся, не, агонь яго не патух — агонь падагравала маленькая трэсачка-ручка, якая даверліва і падатна грэлася ў яго гарачай руцэ. Але цяжка было ад турботнай няўпэўненасці, ад няведання таго, ці вялікі зрабіў ён праступак, ці праступак гэта наогул, як будуць караць за гэта яго і ці будуць наогул караць.

У Максавай душы расло прыкрае, балючае мітусенне.

Лес агарнуў іх нільна насцярожанай цішынёй — здавалася, сочыць ён, цікуе за імі чорным поглядам незлічоных вачэй, страшных у сваёй таемнай нявіднасці. Чым далей ішлі, тым шчытней апляталі іх гэтыя чорныя погляды, калолі ледзянымі іголкамі жудасці, дабіраліся аж да самага трывожна прытоенага сэрца і ўзнімалі ўнутры цені несвядомага страху.

Аленка мацней ухапілася за Максаву руку.

— Макса! Ці баішся ты?

Макс адказвае паўмысна гучным бязрупатным голасам:

— Во... чаго ж мне баяцца? Зараз выйдзем на шлях...

На шлях яны, вядома, не выйшлі. Праз нейкі час Макс абмацаў перад сабой густы калючы куст і спыніўся. Аленка палахліва прыціснулася да яго рукі.

— Ну, пойдзем, Макса, чаго ты стаў?..

— Мы сышлі троху са сцежкі... Сюды трэба, налева.

Зноў нейкі куст. Звярнулі направа і ўпёрліся ў грубое караватае дрэва. Аленка зноў запытала дрыжачым голасам:

— Чаго ты, Макса? Пойдзем лепш... ну, пойдзем хутчэй...

Макс маўчаў. Макс ужо зразумеў, што заблудзіўся. Яго сэрца захлынулася хваляй пякучай горкасці, ён раптам пачуў сябе адзінотным, усімі пакінутым і глыбока-глыбока пакрыўджаным. Мімаволі ў яго вырваліся поўныя балючай роспачы словы:

— Аднаму ў лесе дрэнна... Адзін заўсёды заблудзішся.

І ён успомніў атрад, успомніў Вовачку Пенкіна.

Аленка сударгава ўхапілася за яго.

— Я баюся... Макса, мне страшна. У мяне ногі баляць, я замарылася.

Макс знайшоў у цемры яе галаву і з нязграбнай няшчотай пагладзіў яе.

— Ціху, Аленка, не бойся. Ноч цяпер зусім кароткая. Улетку ноч бывае куды карацей, чымся дзень. Ужо зараз будзе відна. Сядзем во тут, пад дрэвам, і будзем ціхенька сядзець. Ты прытуліся да мяне, дык будзе цяплей. Во так... Спі, Аленка, не бойся — я буду цябе пільнаваць. Ты спі...

— А ваўкоў тут няма?

— Ды не, ваўкоў няма. Ваўкі дзяцей малых не кра-

таюць, бо дзеці ім таксама нічога не робяць. Ваўкі зусім не страшныя, я бачыў адпаго ў звярынцы. Прыгожы такі, калматы.

Чорны лес сцеражліва прыціх і пільна сачыў за імі ліпучымі поглядамі сваіх незлічоных вачэй.

Алешка спала моцным сном зморанага дзіцяці.

* * *

Адказны таварыш, самы адказны таварыш у горадзе толькі што прыняў даклад самага адказнага сакратара і сядзеў адзін у строгім сваім кабінеце, пахмура схіліўшыся над вялізным грудам службовых папер. У кабінеце вісела магільная цішыня, і ў ёй назойліва і сумна звінела адзінотная мухіна.

Адказны таварыш быў сёння ў дрэнным настроі.

Ціхепька, быццам над лапай збродлівай кошкі, прачыніліся дзверы, і ў шчэлку востра бліснулі гарачыя вугалькі вачэй. Потым паказаўся нос, піянерскі гальштук і, нарэшце, увесь піянер — абдзёрты, растрапаны, з слядамі бяссоння і зморы на замурзапым твары. Ён уцягнуў за сабой нейкае маленькае чорпае здапнё, якое з радаспым захапленнем азіралася паўкола.

Адказны сярдзіта зірнуў на нечаканую праяву.

— Вас хто ўпусціў сюды?

Піянер зрабіў некалькі крокаў наперад.

— Мы самі прыйшлі. У нас надзвычайпа пільпая справа... Вось яна, Аленка (ён шырокім махам рукі паказаў на чорпае стварэпне), яна ўцякла ад цыганоў. Я хацеў, каб узялі яе ў атрад, дык маю прапазіцыю не прынялі... А яе б'юць там...

Адказны таварыш дасадліва перапыпіў яго:

— Ну, дык што вам трэба тут, га?

Піянер няўцямна развёў рукамі.

— Трэба ж нейк прыстроіць Алепку... Я павінеп зараз жа бегчы ў лагер.

І, памаўчаўшы, дадаў:

— Яна яшчэ сёпня нічога пе ела.

Адказны таварыш дапытліва зірнуў на яго.

— Ты хто такі?

— Я — Макс... Максімаліст.

— Максімаліст?

Па твары адказпага таварыша праслізнуў прамень цікавасці. Піянер растлумачыў:

— Гэта так завуць мяне ў атрадзе... А ў яе ні бацькі, ні маткі — яна жыве ў дзядзькоў. Япы прымушаюць яе скакаць і заўсёды б'юць... Во, глядзіце, таварыш...

Ён узяў у абедзве рукі Аленчыну галаву і, разам з Аленкай, падцягнуў яе да стала. Адказны таварыш міма-волі здрыгануўся і прашаптаў з ласкавым спачуваннем:

— Дзетачка...

Аленка зрабіла на твары гордую самадавольную міну.

Самы адказны таварыш у горадзе пазваніў, і ў кабінет увайшоў самы адказны сакратар. Адказны таварыш сказаў:

— Зрабіце зараз жа распараджэнне, каб прынялі гэту дзяўчынку ў дзіцячы дом нумар першы.

Потым дадаў:

— Накарміце яе.

Потым, падумаўшы, яшчэ дадаў:

— Выклічце аўтамабіль і дайце яго ў распараджэнне таварыша Максімаліста: ён паедзе на ім у піянерскі лагер.

* * *

Было дужа весела і прыемна. Макс даехаў на машыне да самага лагера, і ўсе гэта бачылі, і ўсе абкружылі яго, і ўсе напераспехі распытвалі, што з ім такое здарылася.

Вовачка Пенкін усміхнуўся, але ўсмешка не выйшла такая, як у правадыра,— выйшла ўсмешка простая і нават трошачку вінаватая.

* * *

Макс сабраў усе кнігі, якія толькі знайшліся ў лагеры. У яго было многа агню і многа ўпартасці — ён рашыў дамагчыся свайго, ён цвёрда верыў, што недзе ў кнігах павінна быць сказана, каб усе піянеры былі максімалістамі.

ШЭПТЫ ВОСЕНІ

Слухаю, седзячы ў лесе панурым, ціхія шэпты лістоў, пакідаючых роднае дрэва...

Сумна-ўрачыста, з маўкліваю скаргай на злую прыроду, ціха, паволі — бы нехаця — падаюць з неба і бліскучаю жоўцю зямлю засцілаюць...

У роспачы круцяцца, у бокі кідаюцца — мусіць, не хочуць, баяцца цалункаў халоднага долу.

Квола-празрыстыя, жоўта-васковыя — сумна лятуць і з маркотай вялікай кладуцца...

І шэпчуць...

Шэпчуць так ціха, ледзь чутна, цягуча, тужліва...

Што? Не згадаць!

Нешта адвечнае, цёмна глыбокае, нешта праўдзівае, смутна знаёмае шэпчуць...

Нешта мінулае і непазбыўна жывучае...

Нешта такое, што кратае ў сэрцы балючыя струны і грудзі агортвае жалем пякуча-салодкім...

Нешта такое...

А што? Не згадаць!

Не згадаць, аб чым шэпчуць лісты, як кладуцца на чорную, брудную глебу...

Шэпчуць так ціха, ледзь чутна, цягуча, тужліва...

Дрэвы панура стаяць... Жоўцяю плачуць... К сонцу працягваюць веткі свае нерухомыя — быццам ратунку ў сонейка просяць...

З ветак сцякаюць астатнія кроплі жаўцізны...

А сонца не чуе... Чужое, далёкае стала... Глядзіць і не бачыць... Неяк няўважна кідае наўкола свае нежыццёвыя косы... Быццам за лета змарылася, сілу згубіла... І дрэвы чарнеюць... Чарнеюць ад гора-пакуты...

Плачуць і слухаюць разам са мною ціхія шэпты слязінак-лісточкаў...

Шэпчуць лісты...

Шэпчуць так ціха, ледзь чутна, цягуча, тужліва...

ОЙ, ЛЯЦЕЛІ ГУСІ...

1

Адам Барковіч, сарамліва ўсміхаючыся, падышоў да паказапага яму ложка. У гэты момант галоўную ўвагу яго займаў кароткі белы халат, які накінула на плечы яму спрытная вастраносая санітарка. Гэты халат рабіў яго страшэнна пазграбным і смешным — прынамсі так здавалася яму самому. Наогул усё тут было неабыклае, дзіўнае: непрыемна рэзала погляд і не давала спыніцца воку яскравая бялосць усяго, што знаходзілася ў памяшканні; сухі і пудны пах медыкаментаў ствараў уражанне бяздушнай мёртвасці і пустаты; а да ўсяго гэтага — напружна-ўедлівыя погляды хворых, якія нібы драцянай сеткай перагароджвалі дарогу.

Стася ляжала тварам да сцяны. Барковіч сеў на табурэтку і асцярожна дакрануўся рукой да яе худога пляча. Хворая з маруднай патугай перавярнулася і паказала чужы незнаёмы твар — цьмяны і непрыгожы. Потым яна ціха ўсміхнулася, і па гэтай усмешцы Барковіч пазнаў сваю Стасю. Ён шчыра ўзрадаваўся і таксама ўсміхнуўся — радасна, светла, на ўсю шырыню свайго буйнога твару.

— Ты прыехаў?

Стася падала яму тонкую сінява-бледную руку. Ён патрымаў яе, як нейкую падзвычайна крохкую рэч, і асцярожна паклаў назад, на белую коўдру. Гэтае прыткненне пакінула непрыемны халодны след — з мімавольным жалем Барковіч успомніў даўнейшыя Стасіны рукі, якія дужа яму падабаліся, якія прыемна было гладзіць і цалаваць.

Стася глядзела на яго з ціхай пакорнай радасцю. Ён падумаў, што трэба аб нечым гаварыць, і ні з таго ні з сяго пачаў гаварыць пра восень.

— Ужо, Стася, мая пара падышла. Я цяпер цэлымі днямі шлындаю па нашых балотах і набіраюся восеньскай свежасці. Помніш — мы з табоій гаварылі... падае лісце,

радзеюць лясы, адкрываюцца далі... ідзеш куды вочы глядзяць... далей, далей, бяскоцца... Забудзешся на ўсё, адчуваеш сябе вольным, шчаслівым...

Ён на хвілінку змоўк і потым пахваліўся з простай дзіцінай шчырасцю:

— Надоечы я застрэліў двух зайчыкаў і лісіцу.

Ён весела зірнуў на Стасю і ўбачыў яе — смутную, халодную, з глуха запалымі вачмі, з выразам затоенай мукі на твары. Яна ўжо не глядзела на яго — яе хваравіта-застыглы погляд увайшоў некуды ўглыб і забраў з сабоій цёплыя аганькі радасці.

Барковіч зразумеў. Сцеражліва насупіўшы бровы, ён азірнуўся наўкола, злавіў некалькі поглядаў хворых і ў кожным ў ім убачыў адбітак таго, што свяцілася ў цьмяным Стасіным твары. А некаторыя проста і выразна глядзелі на яго з едкай зайздрасцю і непрыхільнасцю.

Барковіч зразумеў, успомніў, што хворага заўсёды мучыць чужое здароўе і сіла. Ён адчуў сябе вінаватым і змоўк.

Стася балюча ўсміхнулася: — Ну, гавары...

Потым дадала, быццам апраўдваючы сябе ці яго:

— Мне дрэнна зусім... Я, мусіць, памру.

Барковіч пачаў распытваць яе пра хваробу, пра лячэнне, пра дактароў. І чым больш гаварылі аб гэтым, тым ясней і прасцей рабіліся яго адчуванні — з'яўлялася звычайная цікавасць і заклапочанасць. Ён пільна аглядаў яе змарнелы твар, яе худыя рукі, дзівaваўся з тае страшэннае змены, што зрабіла ў ёй хвароба, выказваў у простых словах сваё спачуванне, нават не спачуванне, а шчырыя сяброўскія развагі. Калі ж яна з радасна-ўдзячнай усмешкай падала яму сваю руку, ён раптам адчуў, што гэта зусім лішняе, і спалохаўся, каб не давялося яе цалаваць. Ён зноў, як нейкую чужую крохкую рэч, патрымаў гэту руку і асцярожна паклаў на коўдру. У гэты момант у яго выpасла нечакана ясная думка аб тым, што ўсе гэтыя словы, якія ён толькі што гаварыў сваёй Стасі, ён мог бы сказаць кожнаму хвораму чалавеку.

Зноў стала паміж іх нудпае цяжкое маўчанне. Тады Стася, каб разарваць гэта маўчанне, пачала гаварыць пра Сяргея.

— Ён часта прыходзіць да мяне і сядзіць тут доўга-доўга, пакуль не выганіць доктар. Прыносіць мне новыя кніжкі і чытае па тры старонкі за раз: больш не даюць. Ён старасцца ўдаваць, што не ведае пра мой стан, што

ўсё добра... Але відаць... Часам не ўтрымаецца і заплача... Смешны такі...

Яна робіць патугу гарэзліва, як раней, усміхнуцца, але выходзіць толькі хваравітая грымаса. Барковічу зразумела: яна пачула яго настрой, яго холад і таму памянула Сяргея. Так рабіла яна даўней — і даўней дасягала свайго. Барковічу і цяпер зрабілася прыкра, але зусім з іншай прычыны: ён не любіў, не мог без агіды глядзець на праявы людскога бяссілля, і яго балюча ўразіла гэтая недалужная спроба какецтва.

Ён адказаў залішне проста і дзелавіта:

— Я яшчэ не бачыў Сяргея. Зараз пайду да яго.

Ён, мабыць, зрабіў нейкі мімавольны рух, бо яна раптам уся страпянулася і ўпілася ў яго прагнымі, поўнымі благання і страху вачмі...

— Праз гадзіну будзе абход. Да абходу ў нас можна сядзець...

Барковіч ласкава ўсміхнуўся. Ён не хацеў крыўдзіць яе і таму застаўся сядзець да абходу, застаўся лічыць цягучыя, нудныя, як у магіле, хвіліны. Адыходзячы, ён пацалаваў яе ў лоб, і яму чамусьці здалося, што ён пацалаваў нябожчыцу. Ён сам здзівіўся гэтаму адчуванню і, нібы для таго, каб пераканацца, што гэта ілюзія, апошні раз зірнуў на хворую.

Стася глядзела на яго поўнымі слёз вачмі. У гэтых пакутных вачах была трагічна перамяшаўшыся смяротная роспач з ціхай палахлівай надзеяй. Ён пацалаваў яшчэ ў яе сухую вашчаную руку і, спакойна азірнуўшыся, выйшаў з палаты.

Разам з тым, як скінуў Барковіч на рукі вастраносай санітарцы свой белы нязграбны халат, ён фізічна адчуў, як скінуўся з яго плеч цяжар гэтай сумнай сустрэчы. Выйшаўшы з бальніцы, ён глыбока, вольна ўздыхнуў і з усмешкай падумаў:

«Больш не пайду ў гэты белы астрог».

2

Быў ужо вечар. Скрозь чорную слоту размашыста, грузна сігаў Барковіч, шлёпаючы па лужынах сваімі грамоздкімі чабатамі. Пацёкі дажджу абмывалі яго шырока адкрыты твар, але, як ні стараліся, не маглі змыць з яго свежую бадзёрую ўсмешку. Ён любіў восень і любіў горад. Ён з горадам жыў як зайздросліві палюбоўнік са сваёй

нясуверпаї каханкаї. Калі паміж іх паўставаў чарговы канфлікт, калі чорцы цень здрады атручваў іхпую блізкасць, тады ён уцякаў з горада ў глухія петры Палесся, каб у раскошных абдымках прыроды затапіць сваю крыўду, каб здрадаї помсціцца за здраду. А потым вяртаўся зноў, як блудны сын, як былы гаспадар.

На Савецкаї сустракаліся людзі. Адны перабягалі мокрымі скукярэчапымі скакупцамі; іпшыя — пад парасонамі — плюхалі з важпаї павольпасцю, як старыя баравікі. Сярдзіта, раздражпёпа роў, уцякаючы ад дажджу, аўтобус, агідпа слюмачыліся асалавелыя вітрыпы, пе запрашаючы, а адганяючы пакупцоў. У светлых дзвярах кінатэатра заўзята штурхаліся безбілетпыя падшывальцы, а прастытуткі туляліся троху далеї, па парозе святла і мроку.

Барковіч прайшоў пекалькі кварталаў па Савецкай — здзівіў пе аднаго падарожніка сваёї высока ўзнятаї галавой з загадкава-ўсмешлівым тварам, сваім расхрыстаным адзеннем, сваёй размашыстаї безуважнаї хадою,— завярнуў у цёмную бакавую вуліцу, потым у завулак, яшчэ ў сляпы і брудны завулак і, парэшце, спыніўся перад асветленымі электрычпаї лямпачкаї дзвярмі невялічкага рабочага клуба.

Колькі хвілін Барковіч перухома стаяў перад дзвярмі, пібы разглядаючы іх, нібы прымерваючыся, як іх спрытпеї адчыніць.

Яму было смешпа і весела. Фактычпа, ён добра ведаў паперад, што зараз будзе, і добра ведаў, што ўсё гэта — педарэчпае, пепатрэбпае. Ён смяяўся сам над сабоїй, яго забаўляў гэты мімавольны дзікі капрыз.

Барковіч падняўся па хісткіх, убога асветленых сходпях, прайшоў праз певялічкую прытульную залу, праз калідор і трапіў у бібліятэку. Там стаяла важпая, сухая ціша. За сталамі ўрачыста застылі пахмурыя чытачы, ля драўлянага бар'ера таемна і жвава шушкалі піянеркі, а за бар'ерам, сярод кніжных паліц, поркаўся певялічкі бепенькі чалавечак.

Барковіч увайшоў за бар'ер, падышоў ззаду да чалавечка і моцпа, па-сяброўску сціспуў яго за плячо.

— Здароў, Сяргеї!

Чалавечак абярпуў сваю белую сукрыстую галаву, і вочы яго — маленькія, сіпія — загарэліся радаспым агапьком. Ён парыўчата схапіў Барковічаву руку і моцна яе страсянуў. Потым пачаў мітусіцца.

— Я зараз. Во, толькі хвіліначку. Пачакаї, я зараз...

Барковіч з ласкавай усмешкай сачыў за ім, пакуль ён парадкаваў свае кніжкі, пакуль угаворваў нейкага цыбатага хлопца пабыць за яго ў бібліятэцы, пакуль даводзіў нешта ўпартым настойлівым піяперкам. Потым яны выйшлі на вуліцу.

Сяргей пачаў паспешна, хапаючыся, нешта апавядаць, але Барковіч адразу яго перапыніў, быццам ён спецыяльна прыйшоў, каб гаварыць аб пэўнай справе.

— Во што, Сяргей. Я быў у Стасі. Я цяпер ішоў ад яе і зайшоўся па цябе.

Сяргей змоўк і старанна насупіў свае бялясыя бровы.

— Ты сёння прыехаў?

— Я прыехаў па тваёй тэлеграме.

— Як Стася?

Сяргей запытаўся ціха, няўпэўнена. Барковіч, у наругу яму, пачаў гаварыць з наўмысна-рэзкай адкрытасцю:

— Стася дужа змянілася. Я не думаў, што так далёка зайшла хвароба. Яна зусім страшная стала, я ледзьве пазнаў. Дужа непрыемна глядзець. На ёй ужо відаць адбітак смерці. І яна сама ведае, яна добра ўсвядоміла свой стан. Чакае канца...

Ён змоўк і насцеражыўся. Цемра схавала ад Сяргея яго таемную ўсмешку — столькі ж дабрадушную, колькі едкую. Гульня пачыналася.

Некалькі крокаў прайшлі моўчкі. Потым Сяргей загаварыў, перамагаючы хваляванне.

— Я хаджу кожны дзень да яе, кожны дзень бачу гэту трагедыю. Каб я меў хаваць праўду, каб пераканаць яе... а то ж яна бачыць... Часам з'яўляецца ўсё-ткі надзея... сама сабой з'яўляецца — жыццё паўстае супраць цяжкой неабходнасці... Яна тады жудасна светлая, летуценная. Успамінае, загадвае на будучыню. Тады з палкай дапытлівасцю глядзіць на ўсіх і чакае, моліць аб падтрымаці яе надзеі, аб заспакаенні.

Ён на момант суняўся, нібы для таго, каб праглынуць даўкі клубок свайго хваляванця, і скончыў няцвёрдым голасам:

— Мне цяжка бывае... Проста, ведаеш, не ў суцерп... У мяне дужа слабыя нервы...

Барковічу здалося, што Сяргей гатоў заплакаць. І, як звычайна, гэта выклікала ў ім не жаль, не спачуванне, а неякую незразумелую прыкрую злосць, жаданне мучыць, раструйваць. Ён гучна і зусім весела зарагатаў.

— Паміраць лягчэй, чымся быць прысутным пры смер-

ці. Праўда, Сяргей! Я ледзьве вытрымаў сёння дзве гадзіны. Гэта надзвычайна нудны абавязак...

Сяргей перш маўчаў, пібы спалоханы жорсткім смехам Барковіча, а потым ледзь чутна прашаптаў:

— Яна твая жонка.

Барковіч спакойна згадзіўся:

— Праўда, яна мая жонка.

Яны выйшлі на Савецкую вуліцу. Каля гастранамічнае крамы Сяргей зноў замітусіўся.

— Пачакай, я куплю чаго на вячэру... Віна куплю... Нам трэба многа з табой гаварыць. Да мяне пойдзем, добра?

Барковіч з цвёрдым смяшком адказаў:

— Пойдзем у сад.

— У сад?

Сяргей няўцямна ўзняў на таварыша свае наіўныя сінія вочы, але зараз жа схапянуўся і моўчкі падаўся ў той бок, дзе быў гарадскі сад.

3

Яны абодва аднакава не разумелі, што ім тут трэба, у гэтай глухой непрытульнай цямноце бязлюднага саду. Яны аднакава не разумелі і таго, які сэнс маюць усе гэтыя дзіўныя, поўныя вострага напружання, сустрэчы, якія маральна цяжараць іх і якіх яны ўсё-ткі шукаюць з прагнай настойнасцю.

Дождж не ўціхаў. Ён прытоена шамацеў, схаваўшыся ў вецці злітых цемраю дрэў, а па адкрытых дарожках ляскаў з падкрэсленай смеласцю, быццам дражніўся, палохаў жорсткімі ўдарамі сваіх сцюдзёных струменяў. Прыбітыя дажджом дарожкі цьмяпа свяціліся ў цемры чорна-сталёвым глянцам.

Было слізка, мокра. Ужо даўно ў абодвух паскрозь прамокла адзежа, абодвум было сцюдзёна. Барковіч, адчуваючы нейкі гуллівы задор, яшчэ вальней расхрыстаў сваю вопратку, яшчэ вышэй узняў свой бадзёры ўсмешлівы твар, а Сяргей стуліўся ў дрыжачы камочак і здаваўся зусім маленькім, ледзьве прыкметным.

Іншлі моўчкі. Балюча гняло гэтае востра напятае маўчанне (удвух заўсёды цяжка маўчаць), але не лягчэй было і знайсці пачатак гутаркі. Абодвум ясна было, што ў гэтых дзікіх абставінах, у гэтай чорнай самоце прыйдзецца гаварыць аб нечым важным і неадступна патрэбным.

Зусім неўзаметку яны сышлі з галоўнай алеі і пачалі блудзіць па вілаватых бакавых сцежках, часта натыкаючыся на мокрыя дрэвы, на кусты, на садовыя лаўкі. Раптам Барковіч спыніўся і ўзяў за плячо Сяргея.

— Стой! Чакай... Во тут, на гэтай лаўцы, мы першы раз цалаваліся са Стасяй. Яна была тады зусім маладая. Яна была дужа прыгожая. Праўда, Сяргей, га? Ты помніш? У яе былі надзвычайна жвавыя і хітрыя вочкі. Калі я браўся іх цалаваць, яны так смешна бегалі, быццам хацелі ўцячы, схавацца... Ха-ха!.. Ты заўважыў, якія сталі цяпер яе вочы? А вусны... Яе вусны тады былі зусім дзіцячыя — задорныя і смяшлівыя... Яна і цалавалася неяк па-дзіцячаму — выстаўляла трубачкай вусны, заплюшчвала вочы і чакала... Ха-ха!..

Ён коратка перарваў смех і змоўк. Гэтая нечаканая паўза была пасткай Сяргею — ён не мог вытрымаць яе напружанасці, ён павінен быў загаварыць. І ён азваўся голасам загнанага звярка:

— Я помню Стасю тады... Яна была прыгожая...

Зноў маўчанне. Яны селі на мокрую лаўку, і тады Сяргей раптам сказаў нейкім новым, глыбока прачулым голасам:

— Адам! Ты не любіш Стасю...

Барковіч, быццам і не чуўшы яго, гаварыў сваё:

— З маладосці ў яе было надзвычайна прыгожае цела. Такое цела бывае ў рэдкай жанчыны. Тут, на гэтай лаўцы, я першы раз пры святле месяца ўбачыў яе свежыя дзявочыя грудзі...

— Адам!

Сяргей больш не вытрымаў — ён, як непрытомны, уцупіўся кіпцямі ў руку Барковіча, сударгава драпаў яе і ні то паклаў, ні то дзіка пішчэў ад злосці. Барковіч спакойна і цвёрда зазначыў:

— Я дужэйшы за цябе — я магу цябе задушыць.

Тады Сяргей стуліўся ў камочак і сціх. Барковіч таксама маўчаў.

Ён прыслухваўся да сваіх адчуванняў і заўважаў, што ў яго ранейшы дабрадушна гуллівы настрой уліваецца хваля едкай прыкрасці і раздражнення. Яму захацелася ўстаць і пайсці ў чорную мокрую цемру, схавацца і ад Сяргея, і ад Стасі, і ад усіх, хто памкнецца так ці іначай увайсці ў яго жыццё. Ён ужо хацеў быў падняцца з лаўкі, але якраз у гэты момант загаварыў Сяргей. Яго голас быў жудасна слабы, разбіты.

— Адам! Я любіў Стасю больш, як ты. Ты не ўмееш любіць — ты шчаслівы... Ты вось цяпер не любіш яе, як яна хворая, ты вясёлы, а я люблю больш, як калі... Я не веру, што яна памрэ... Гэта ж... гэта ж зусім немагчыма... Як гэта... яе не будзе... Стасі... Не, не... Няпраўда! Гэта — няпраўда!..

Ён амаль што плакаў, ён ледзьве здолеў стрымаць сябе, каб гаварыць далей.

— Я люблю яе не так, як ты. Ты па-звярынаму... А мне нічога не трэба, маё шчасце ў тым, што я люблю... Слухай, Адам, я даўно хацеў сказаць табе... Ты, можа, думаў што-небудзь пра мяне... людзі многа казалі... Во што, Адам, я нічога не меў з твае́й жонкай... Ніколі... Ты верыш мне? Верыш?

Барковіч маўчаў. Сяргей нахіліўся бліжэй да яго і зашаптаў — слёзы не давалі яму гаварыць:

— Ведаеш, Адам, аб чым мы больш за ўсё гаварылі цяпер, калі я прыходзіў да яе, да хворай? Мы заўсёды ўспаміналі цябе, мы аб табе гаварылі! Я казаў ёй, што ты страшэнна заняты, што ты б, напэўна, прыехаў, каб меў магчымасць. Яна была тады спакайней. Адам, чуеш ты? — я ніколі і не падумаў нічога благога. Ці верыш ты?

Барковіч паволі, насмешліва працягнуў:

— Прызнанні над свежай магілай...

Тады Сяргей ускочыў і закрычаў істэрычным прарэзлівым голасам:

— Ты брэшаш! Ты не хочаш, каб яна памерла! Няпраўда! Ты любіш яе... ты любіш... любіш!..

Голас яго недалужна сарваўся, і ён зноў зашаптаў:

— Адам! Пойдзем заўтра да яе разам. Добра? Трэба так рабіць, каб ёй больш спакою было, больш радасці... Яна паздаравее.

Барковіч безуважна азваўся:

— Я зараз паеду.

Гэтыя словы, відаць, страшэнна ўразілі Сяргея. Ён первова падхапіўся, хацеў спачатку пярэчыць, потым стрымаўся, зноў звіўся ў дрыжачы клубочак і, парэшце, выгаварыў з наўмыснай едкасцю:

— Ты баішся застацца?

— Не хачу.

Барковіч раптам узяў звычайны дзелавы тон:

— Узатры, Сяргеі́, запалку — я паглядж у на гадзіннік.

Сяргей слухмяна дастаў з кішэні запалкі і пачаў цер-

ці адну за адной. Карабок быў волкі, дрыжэлі рукі, і ў яго нічога не выходзіла.

— Эх ты, няўмека!

Барковіч адабраў у яго запалкі і засвяціў.

— Засталася гадзіна да цягніка. Мне трэба ісці.

Сяргей сударгава схапіў яго за руку.

— Адам! Няўжо ты пакінеш яе? Няўжо табе не шкода? Яна ж твая жонка, ты ж кахаў яе, ты і цяпер кахаеш... ты павінен кахаць, ты не звер...

Барковіч моўчкі падняўся з лаўкі. Тады Сяргею раптам адкрылася цешта зусім новае, аб чым ён раней не думаў.

— Адам! Я разумею... Я ведаю... Ты кахаеш другую... У цябе ёсць жанчына... Гэта праўда? Адам, гэта праўда?

— А ты што, зайздросціш?

Барковіч іранічна засмяяўся. Потым узяў абедзвюма рукамі Сяргея за плечы, моцна сціснуў і праказаў сухім сталёвым голасам:

— Сяргей! Ці думаў ты калі-небудзь, што ў нас усё гэта можа лядобра скончыцца... га?

Сяргей вінавата замітусіўся.

— Як гэта скончыцца?.. Я не разумею... Я зычу табе дабра, Адам, я нічога не маю супраць цябе...

— Ну, добра, пойдзем.

Яны пашлёпалі па цёмных слізкіх дарожках. Пры выхадзе з саду промень святла, прыляцеўшы з вуліцы, на момант вырваў іх з цемры, і Барковіч убачыў скурчаную ўбогую постаць Сяргея, з пашура схіленай галавой, з бязмежна балючым сумам на твары. Ён ласкава ўсміхнуўся і ўзяў яго пад руку.

— Мы, Сяргей, скора з табой сустрэнемся. Ведаеш што? Прыязджай да мяне — у нас там надзвычайна добрае паляванне.

А сам у гэты момант падумаў:

«Нашто гэта ўсё? Нашто гэта новая непатрэбная сустрэча?»

Сяргей сумна адказаў:

— Я не паляўнічы... я не страляў ніколі.

— Ну, усё роўна — так прыязджай.

— Можа, прыеду.

Яны ўвайшлі ў змрочныя гарадскія вуліцы. Дождж ужо сціх, але горад плакаў яшчэ апошнімі скупымі слязьмі. На скрыжаванні вуліц Барковіч спыніўся.

— Мяне праводзіць не трэба. Ідзі дахаты.

— Ты не застанешся?

— Які ты смешны... Бывай!

Як ужо разышліся, Сяргей раптам спыніўся і крыкнуў:

— Адам! Калі што — я тэлеграфую табе...

— Прыязджай на паляванне!

І кожны пайшоў сваёй дарогай.

4

Поезд яшчэ досвіта прыйшоў на маленькую, забітую ў лясы і балоты палескую станцыю. На брудным станцыйным двары стаяла некалькі сялянскіх вазоў, і нехта з цемры лена азваўся: «Куды вам, таварыш?» — але Барковіч рашыў пайсці пеша. Ён заўсёды хадзіў пеша са станцыі, а сёння ж чакала яго яшчэ асаблівая асалода: ён будзе адзін у дзікай палескай глушы сустракаць таемна-прыгожае восеньскае світанне.

Ён ідзе па добра вядомай грэблі праз дзікі, поўны чароўнай маўклівасці лес. Перад раннем ноч стала яшчэ чарнейшая, а цішыня такая напятая, вострая, што выразна чуваць, як капаюць недзе ў нявідную лужынку дробныя кроплі — сляды нядаўняга дожджыку. Але ў гэтай згусцелай ночы абыклае вуха ловіць ужо прыметы бліззкага рання — ужо нават цвіркнула недзе руплівая птушачка, а над галавой праляцеў нехта вялікі і важкі, мабыць, сама варона. І раптам усю істоту ахапляе пачуццё свежасці, турботна-ўзнятага напружання сіл. Зрок востра ўпіваецца ў цемру, і здаецца, што там вылучаюцца ўжо няясныя абрысы дрэў. Гэта, мабыць, яшчэ толькі ілюзія.

Ні з таго ні з сяго перад вачмі вырастае вялізны разлапісты пень, за ім карабацяцца рэбры гнілога карча, а далей, сярод дрэў, цьмяна бліснула лужына. Барковіч глядзіць угару, і па твары яго распаўзаецца шырокая — з лапаць — усмешка,— там, паміж дзвюх сцен высокага лесу, лягла цьмяная сталёвая паласа: ужо прачнулася неба. Спалоханы змрок пачынае мітусіцца дрыготнымі хвалямі і паказваць прадметы ў розных фантастычных праявах: там воўк прытуліўся за дрэвам, там стаіць нейкая купка людзей, там шмыгапуў зайчык з-пад елкі, там разявіла ляпу нейкае зубатае страшыдла.

Барковіч становіцца сярод грэблі, пільна ўглядаецца ў гэтыя чароўныя жарты світання і раптам пачынае голасна рагатаць, так што па ўсім лесе разлягаецца звонкае рэха.

Якое свежае, якое магутнае адчуванне!

Восеньскі дзень млява, быццам нехаця, займае свой каротказечны пасад. Яшчэ доўга стаіць шэры расплыўчасты змрок, яшчэ доўга хаваецца ён у прытульных закуццях дзікага лесу. Але вось перарваўся лес, адкрылася шырокая балоцвеная паляна, і за ёй, на пасечаным рэдкімі дрэвамі небасхіле, ірдзее халодна ўрачыстае пышпае зарава.

Што можа быць прыгажэйшага за гэтага велічна глыбокага восеньскага ўсходу? Што можа вастрэй абуджаць путро чалавека адвечным імкненнем, прагнасцю да жыцця, што можа жывей заклікаць яго ў бязмежна чыстыя далі, што можа мацней прымушаць яго ў малельным экстазе кінуцца долу і абнімаць, цалаваць гэту святую зямлю, гэтыя любыя, слаўныя залатыя лісточкі?

Барковіч стаяў тут, пакуль не ўсплыло па неба сцюдзёна-барвяное сонца, пакуль не рассыпала ў лесе сваіх дарагіх бурштынавых кропель. Тады ціха, паволі, ніба зачараваны, пасунуўся далей, насустрэчу свежым ірдзяным праменням.

Падышоўшы да хутара, дзе быў яго выпадковы прытулак, Барковіч чамусьці прыстоіў, з хвіліну падумаў аб нечым і, крута завярнуўшыся ўбок, паіпоў абходам па дробным купкаватым хмызняку. Мінуўшы хутар, ён зноў узышоў на дарогу, сцеражліва азірнуўся назад і пасігаў далей паспешнымі энергічнымі крокамі.

Праз колькі хвілін наперадзе паказалася вёска. Чорныя карузлыя хаткі, яшчэ бяднейшыя, яшчэ бруднейшыя дворныя будынкі і высокія стромкія азяроды. На краю вёскі адзін большы за іншых з гонтавай страхой будынак — гэта вясковая школа. Барковіч рашыў адразу паіпсці туды, нават не пабыўшы ў дварэ. Такі быў настрой, што хацелася рабіць якраз тое, чаго не робяць звычайна.

У класе ішла лекцыя. Барковіч смела, як гаспадар, увайшоў у кватэру настаўніцы, пахадзіў троху па яе невялічкім пакоі, з цёплым задавальненнем азірнуўся навкола — як тут знаёма ўсё і як тут ціха, прытульна! — сеў на крэсла і стаў чакаць. Праз хвілін пяць прыляцеў выбух бязладнага шуму, за дзвярмі пачуўся звонкі, па-дзяцінаму раздражнены голас, дзверы расчыніліся — і ў пакоі увайшла настаўніца. Яна ўбачыла Барковіча і спынілася ў позе — ні то радая, ні то здзіваваная. Каб схаваць сваё раптоўнае ўзрушэнне, яна ўзяла жартліва-сярдзіты тон:

— Якое вы маеце права заходзіць без запытання ў чужую кватэру!

Барковіч, не ўстаючы, працягнуў сваю шырокую цяжкую руку — яна з камічнай сцеражлівасцю падышла і падала сваю, але зараз жа вырвала, быццам спалохаўшыся яго гарачага поціску. Барковіч дабрадушна смяяўся.

— Не злуйся, Тацяна, табе гэта зусім не да твару.

Яна пачала нешта перакладаць на стале, нечага выйшла з пакоя, вярнулася зноў, прапанавала есці яму і ўвесь час старанна хавала ад яго свой хісткі, няўпэўнены погляд. Ён з тонкай усмешкай сачыў за ёй, ён добра ведаў, што будзе так аж датуль, пакуль ён не раскажа пра горад, пра Стасю. Сама яна не запытае — о, не! — да гэтага яна не дойдзе, яна ніводным словам, ніводным рухам не пакажа, што гэта яе цікавіць!

Барковіч пачынае ліквідацыю гэтага неўразумення. Ён спакойна, дзелавіта заяўляе:

— Я толькі што з цягніка. Быў учора ў Стасі, у бальніцы. Ёй зусім дрэнна. Магчыма, што скора памрэ.

Яна як мага стараецца зрабіць хмуры нездаволены твар і, калі ёй гэта ўдаецца, з сярдзітым дакорам кажа яму:

— Як табе не сорамна — у такім стане кідаць яе... Што ты за чалавек!..

Барковіч моўчкі глядзіць на яе і думае:

«Якая бязлітаснасць у гэтых самак! Яна ж надзвычайна рада, што дзеля яе мужык кінуў сваю паміраючую жонку».

Ён падыходзіць да дзяўчыны і, каб без слоў паказаць, што яны добра адзін аднаго разумеюць, пяшчотна абнімае яе за плечы. Яна, хітруння, адпіхае яго.

— Ідзі ты... звер...

Барковіч адыходзіцца, зазірае ў акно, на нудны пакалупаны гарод, і раптам адчувае цяжкую змору. Вочы пачынаюць зліпацца, і ўсё цела цягне да долу нейкая магутная тупая сіла. Ён адварочваецца ад акна і з усёй сілы стараецца гаварыць вясёлым жартлівым голасам:

— Ведаеш, Тацяна, што я зраблю? Я буду ў цябе адпачываць... добра? Ты ідзі ў клас на заняткі, а я буду спаць. Я за ўсю ноч і вокам не звёў.

Яна ў першы раз падымае на яго свой погляд (вядома, сярдзіты яшчэ) і нездаволена адказвае:

— Есці трэба раней.

Барковіч бурна рагоча і зноў абнімае яе. Яна цяпер ужо не бароніцца. Не бароніцца нават і тады, калі ён моцна, з запалам яе цалуе.

На апошняй лекцыі ў школе ў той дзень быў вялікі гармідар. Узняў яго, як і зазвычай, Барковіч. У той час, як дзеці старанна грызлі алоўкі, развязваючы нейкую дужа няўдалую задачу, ён раптам увайшоў у клас — заспаны, усклычаны, з нязграбнай, яшчэ зусім санлівай усмешкай на твары. У той момант разляцеліся ўсе межы закону і парадку — дзеці, як непрытомныя, паўскакалі з месц і з радаснымі крыкам абкружылі Барковіча.

— Дзядзька Адам! Дзядзька Адам! Пойдзем у лес!..

— Аўтух зайца ўчора забіў... во які, далібог!..

— У Прыгорку ліса бачылі...

— А журавін колькі ў Чорным маху!..

— Дзядзька Адам! Дзядзька Адам!

Настаўніца няўцямна глядзела на нечаканы бунт сваіх выхаванцаў і ніяк не ведала, што ёй рабіць. Спрабавала злавацца, але нічога не выходзіла: з-пад злосна насупленых броў яе вочы ўсё роўна бліскучэлі шчаслівай гордасцю і здаволеннем, ёй падабалася, што дзеці любяць Адама.

Барковіч раптам зрабіў урачысты выгляд і агаласіў:

— Сёння заняткі скончаны. Гайда па хатах!

Але гэта ўжо выйшла звыш меры, і настаўніца ўсур'ёз раззлавалася. Яна так строга крыкнула на сваіх вучняў і такі страшэнны погляд кінула на Барковіча, што яму нічога больш не выпадала рабіць, як толькі віпавата стуліцца і разам з вучнямі рэтыравацца на заднюю лаўку. Для адпаўлення і замацавання свайго аўтарытэту настаўніца колькі хвілін яшчэ мучыла вучняў, але такі, парэшце, пусціла, і яны з падвойнай энергіяй узнялі ранейшы гармідар.

Клас спусцеў. У раптоўнай цішы мякка расталі адгалоскі дзіцячага смеху і крыку. З-за вокан плылі ўжо смутныя вячэрнія цені — яны ўлівалі ў пакой асаблівую нейкую, цягуча-дрымотную прытульнасць.

Настаўніца папарадчыла на стале вучнёўскія сшыткі і села ля акна, пусціўшы некуды ў чорнае поле свой цяжкі, змораны погляд. Барковіч пільна ўглядаўся ў яе твар, сачыў за топкімі, ледзь прыкметнымі зменамі, якія рабіў у ім наплываючы змрок. Ён ніколі не бачыў у яе такога глыбока сур'ёзнага твару, такога панурага, сумпага і нават стараватага. Пачынала здавацца, што гэта не яна, што гэта нехта другі. І гэты другі то выдаваў некім абсалютна чужым, незнаёмым, то неадрыўна блізкім і родным, роднейшай за маці, радней за сястру.

Барковіча пацяшала гэта свавольная гульня фантазіі,

і ён наўмысля не хацеў парушаць маўклівай цішы, якая глуха лунала ў пакоі. Яго спакойнаму назіранню, аднак, перашкодзіла пястрымная гарачая хваля пяшчоты, якая раптам узнялася ў яго нутры, якая з непераможнай сілай пацягнула яго да гэтае смутнае задуменнае дзяўчыны. Як і зазвычай, пачуццё яго вылілася ў шчырае і троху недарэчнае парыванне. Ён падышоў да дзяўчыны, стаў перад ёй на калені, абняў яе стан і з гуллівай усмешкай зазірнуў у яе глыбокія вочы.

— Таццяна! Нам павінна быць добра... Сапраўды...

І з нейкім па-дзяцінаму радасным смехам ён схаваў свой твар у яе на каленях.

Дзяўчына чамусьці ўздыхнула і пачала пяшчотна гладзіць яго валасы.

5

Гэта было тымі днямі, калі над Палессем — над бяскрайнім прасторам пажоўклых лясоў, над чорнымі лапінамі застылых балот, над спахмурнелымі, сіне-халоднымі рэчкамі, над счарнелым чаротам і жорсткім аголеным лазняком, над пустымі пясковымі грудамі, над убогімі хаткамі палешукоў, над жоўтымі, бурымі шэрагамі тлустых восеньскіх азяродаў,— над усім гэтым адвечна дзікім панурым царствам высокімі стройнымі ключамі ляцелі гусі.

Ляцелі гусі, спяшаліся. У гонкім іх лёце, у клапатлівым, надрыўна радасным клёкаце іх адчуваўся магутны разгон стыхійных імкненняў, вечных, як свет, непераможных, як жыццёвая сіла.

Куды? Чаго? Дзе канец, дзе мяжа гэтага лёту? Дзе той дзівосны зачараваны край, поўны сонца і радасці, поўны невядомага хараства, куды цягне іх гарачае, неспакойнае сэрца?

І ці ёсць ён наогул дзе-небудзь, гэты нябачаны край? Хто даляціць да яго, хто яго ўбачыць?

Усё роўна!.. Наперад! Далей! Больш разгону, больш сілы! Перад вачмі ж такі раздольны прастор, такая шырокая, свежая воля, такая прывабная, вострая невядомасць! Хай будзе, што будзе! Толькі — наперад, далей, далей...

Ляцелі гусі... Гонкія, плаўнакрылыя. За гусямі ляцеў чалавек — лёгкімі думкамі, шчымлівымі парываннямі, ляцеў у дзівосны нябачаны край, шукаў сонца і радасць, шукаў невядомага шчасця.

Хто ўбачыць тоїі краї? Хто пазнае радасць тую і шчасце?

Ой, ляцелі гусі...

. . . . . .

Барковіч з Таццянай упершыню сёлста пачулі гуссіі, як варочаліся з свае звычайнае нядзельнае шраходкі па бясконцай палеской грэблі. Барковіч адразу знайшоў у высокім небе жывы рухавы трохкутнік і парыўчата схапіў за руку сваю спадарожніцу.

— Вунь яны! Вунь яны!.. Бачыш?

Потым узняў угару свае рукі, быццам вітаючы далёкіх вандроўцаў, і закрычаў, як непрытомны:

— Го-го-го!..

Колькі хвілін ён так і стаяў, нібы застыгнуўшы ў сваім напружаным парыванні, з горача распаленымі вачмі, з хмельнай усмешкай на твары. Ён увесь прасякнуўся дзікамагутным імкненнем, ён гатоў быў, здаецца, кінуць усё, сарвацца з зямлі і паляцець туды, за гэтым жывым мякказвонным трохкутнікам — у свет, у прасторы.

Таццяна стаяла поплеч, глядзела на яго (ён быў цяпер надзвычайна прыгожы) і з непрыемнасцю адчувала, што ён зусім забыўся цяпер на яе, што гэта раптоўнае захапленне вымела з сэрца яго ўсе звычайныя пачуцці, як вымела з галавы яго ўсе звычайныя думкі. Нешта падобнае да зайздрасці шавальнулася ў ёй, і яна з рэзкай настойлівасцю пацягнула яго за руку:

— Ну, пойдзем ужо.

Барковіч з патугай адарваў свой погляд ад далёкага, ледзьве прыкметнага ў небе трохкутніка і моўчкі пайшоў па дарозе. На твары ў яго яшчэ плавала радасна-светлая задуменнасць.

Яны падышлі да хутара, на якім кватараваў Барковіч. Ля варот стаяў гаспадарскі сын — хлапчук гадоў у шаснаццаць,— ён пільным чаканнем углядаўся ім насустрэчу. Барковіч адразу сцяміў, што ёсць нейкая навіна, і прыспяшыў ход.

— Што, Апанас?

— Вам тэлеграма прыйшла. Там, у хаце, ляжыць на стале.

Таццяна сказала, што пачакае, і Барковіч знік у варотах. Праз хвіліну ён выйшаў назад, трымаючы ў нязграбна выстаўленай наперад руцэ шэры тэлеграфны бланк. Ён

у замяшанні глядзеў па паперку і ўсміхаўся нейкай невыразнай усмешкай: ні то вінаватай, ні то дабрадушна-нагадлівай.

Таццяна дрыжачымі пальцамі разгарнула паперку і прачытала:

«Стася памірае. Прыязджай.
Сяргей».

Барковіч дапытліва зірнуў у яе шэрыя вочы, але яна схавала сваё сапраўднае пачуццё пад маскай хмурай турботнасці.

— Калі будзе цягнік? Толькі заўтра... Заўтра а дзесятай гадзіне. Рапей няма. Мы пойдзем да мяне... Табе не трэба цяпер быць аднаму.

Барковіч ахвотна згадзіўся. З кожнай хвілінай ён усё жывей і жывей адчуваў нейкі лёгкі, задорна ўзняты настрой, нейкую беспрычынную рызыку, расхадовасць. У кожнага чалавека бываюць такія хвіліны, калі, выбіты з каляіны якім-небудзь надзвычайным выпадкам, ён з балючай слодыччу парывае ўсе абыклыя маральныя сувязі і становіць сябе нібы вонках ад усяго жыццёвага поступу. Тады ўжо бывае не роспач, а вострае, хваравітае адчуванне асабістае волі, шырокіх асабістых магчымасцей. Тады чалавек можа зрабіць самы незвычайны і недарэчны ўчынак.

Ужо звечарэла, і яны, прыйшоўшы ў школу, адразу запалілі святло. На маленькай канапцы ля грубкі быў іх аблюбёны куточак. Таццяна заняла сваё месца і сядзела моўчкі, не спускаючы з твару сур'ёзнага, турботнага выразу.

Барковіч прыслухваўся, як расце ў ім тое лёгкаўзнятае пачуццё, што занялося пасля тэлеграмы. Ужо цяжка было стрымаць гэтае пачуццё, яно патрабавала нейкага выйсця, штурхала на нейкі гарэзны ўчынак. Ён узяў абедзвюма рукамі Таццяніну галаву, абярнуў да сябе яе хмуры, насуплены твар і, востра зазіраючы ў вочы, сказаў ёй:

— Чаму ты не радуешся, Таццяна? Ты можаш радавацца, ты павінна... Будзь сама сабой... Гэта лепш, што яна памрэ... Ты ведаеш...

Яна густа пачырванела, але не адказала нічога. Толькі нецярпліва вырвала з яго рук сваю галаву ды балюча, да крыві, прыкусіла губу.

Ён загадкава ўсміхнуўся і, памаўчаўшы хвіліну, зазначыў:

— Я, Таццяна, нікуды не паеду...

Яна рэзка абярнулася да яго і зірнула проста ў твар яму доўгім усдлівым поглядам. У шэрых неяатуральна бліскучых вачах яе Барковіч убачыў цэлы віхор розных супярэчлівых пачуццяў: там халодная злосць мяшалася з палкаю радасцю, там балючы дакор пераплятаўся з глыбокай, шчырай удзячнасцю. Яна ледзь чутна прашаптала:

— Нашто так... не трэба... Едзь туды... заўтра ўранні...

Барковіч паўтарыў тое, што некалі сказаў быў Сяргею:

— Паміраць лягчэй, чымся быць прысутным пры смерці. Надзвычайна нудны абавязак... і ліпші...

Яна здрыганулася — ні то ад спалоху, ні то ад агіды.

— Ты хочаш, каб яна памерла.

— Я кахаю цябе... Ты таксама жджэш яе смерці.

Таццяна зноў упяла ў яго свой напружаны погляд. Цяпер было ў ім поўна цяжкога неўразумення і страху. Так звычайна глядзіш на невядомага чалавека, якога першы раз сустрэнеш дзе-небудзь у дзікім, бязлюдным кутку. Што ён хавае пад сваім абліччам? Ці не чакае ён толькі зручнага моманту, каб цябе загубіць?

А Барковіч спакойна ўсміхаецца шырокай, ветлай усмешкай. Яго ясныя вочы так цёпла, так мякка ахінаюць сваім пяшчотным святлом, так прыемна лашчаць, саграюць. Яго вочы гавораць без слоў, што ён сапраўды кахае, што яму можна верыць.

На Таццяніным твары страх і неўразуменне аддаюць месца цёплай прыязнасці — яна бярэ сваімі маленькімі ручкамі вялізную Барковічаву лапу, гладзіць яе і пачынае даверліва ўсміхацца. Вочы яе раптам робяцца волкімі і бліскучымі, з іх адна за адной капаюць буйныя слёзы. Яна не хаваецца з імі, нават не выцірае вачэй — слёзы цякуць, а яна ўсміхаецца і з даверлівай ласкай глядзіць на Барковіча. Барковіч раптам кідае сваю спакойную нерухомасць, прыцягвае да сябе дзяўчыну і горача цалуе яе мокры, абліты слязьмі твар. Яна хліпае, як дзіцёнак, і жаліцца:

— Ты і мяне так... потым... калі захварэю...

Ён суцяшае яе:

— Што ты, Таццяна? Ты такая здаровая... Мы з табоій будзем заўсёды разам.

Яна сударгава прыціскаецца да яго і шэпча ў гарачым забыцці, у непрытомнасці:

— Не едзь... Нікуды не едзь... Я не пушчу... Ты будзеш са мной... Хай сабе, хай памірае... я не люблю яе...

Барковіч слухае і сам сабе ціха ўсміхаецца:

«Якія бязлітасныя гэтыя самкі!»

6

Пайшлі потым марудныя чорныя дні, скрозь якія так нудна цягнуўся бясконцы ланцуг неадчэпна турботных думак і разважанняў. Гэтыя дні выпілі ў Таццяны многа жыццёвае сілы — яны глыбока ўціснулі і абвялі хваравітай сіняю яе шэрыя вочы, яны паклалі на вусны ёй рэзкую пячатку затоеных мук, яны разлілі па твары яе нездаровую бледнасць.

Страшная жудасная невядомасць... Перад ёй стаіш, як перад грозным судом, з халодным жахам перабіраючы чорную чараду сваіх мімавольных грахоў. Яна сама родзіць іх, гэтая таемная невядомасць. Яна з ліхамысным падступствам выклікае нядобрыя думкі, летуценні, яна зманліва раскрывае прасторы для злачыннае радасці. А потым гняце суровым дакорам, узнімае ў душы балючае мітусенне, ад якога няма куды дзецца, ад якога нялюбым робіцца ўсё жыццё, увесь свет...

З горада няма ніякае весткі. Няўжо яшчэ цягнецца тое страшнае марудлівае згасанне? Няўжо яшчэ не прыйшоў канец? Яна хоча гэтага канца, яна чакае яго з палкай нецярплівай надзеяй. Дрэнна гэта, дзіка і жорстка. Яна вераадае, не хоча сябе падманваць, яна прызнаецца перад сабой у сваіх злачынных думках і пачуццях.

«Будзь сама сабой...»

А Барковіч цэлымі днямі цягаецца са сваёй стрэльбай. Балазе яму, ён знаходзіць добрае сабе заспакаенне. Кожны вечар ён прыходзіць свежы, вясёлы, з дабрадушнай усмешкай, з яснымі, як у дзіцяці, вачмі, Таццяна сустракае яго бледная, устурбаваная. Яна кожны раз з трывогай чакае ад яго жаданае весткі. А ён ставіць у кут сваю стрэльбу, сядае перад ясна палаючай грубкай, шырока раскідае грамоздныя свае чабаты і, паціраючы рукі, апавядае пра ўсякія дробныя здарэнні, якія трапіліся на паляванні. Часта прыносіць ён зайца або ліса — кладзе каля сваіх ног і ў часе гутаркі раз-пораз нагінаецца, каб з замілаваннем нагладзіць роўную пушыстую поўсць.

Таццяна спачатку дасадліва моршчыцца і нервова кусае вусны. Але Барковічаў роўны спакой пераходзіць па-

малу і на яе — яна забываецца на сваю трывогу, на свае мукі і канчаткова знаходзіць сабе заспакаенне ў шырокіх і цёплых абдымках Барковіча.

Так цягнулася, мабыць, дзён дзесяць. А потым здарылася нешта зусім нечаканае, зусім непрадбачанае,— найшлі такія падзеі, якія за тыдзень перавярнулі ўсё дагары нагамі.

Неяк раз шэрай гадзінай Барковіч, вяртаючыся з палявання, зайшоў к сабе на хутар. Звычайна ён прыходзіў дахаты толькі позна ўначы, але цяпер быццам нешта падказала яму, што трэба абавязкова зайсціся. І як толькі ўвайшоў у хату,— па стрыманай цішыні, па таемнаму шушканню малых, па салідна-разважлівай постаці гаспадара ён адразу ўцяміў, што ёсць нешта новае. Змрок не даў быў спачатку разгледзець маленькага чалавечка, які сядзеў супраць гаспадара. А чалавечак, як толькі ўбачыў яго на парозе, схапіўся з лаўкі і кінуўся яму насустрач.

— Адам! Стася здарова... Зусім здарова... Чуеш, Адам?

Сяргей у нейкай бурнай экзальтацыі схапіў аберуч Барковіча і пачаў яго тармасіць.

— Гэта цуда, Адам. Гэта вялікае цуда. Разумееш ты, га? Разумееш?

Барковіч спакойна адарваў ад сябе яго рукі і прайшоў далей у хату.

— Скажы, як гэта... было...

Сяргей мітусіўся, бегаў па хаце, махаў рукамі.

— Тады, як я адбіў табе тэлеграму... яна памірала тады... а ты не прыехаў... У тую ноч змянілася ўсё... Рэзкі пералом... Дактары страшэнна здзіўлены... ніколі гэткага не было... Гэта — цуда, Адам, гэта — цуда... Я наўмысля табе не пісаў... Спачатку я сам не верыў... не мог паверыць... А потым я рашыў, што лепш, калі будзе нечаканая радасць. Яна відочна з кожным днём здаравее. Яна ўжо ходзіць... есць усё чыста, тэмпература роўная... Каб ты бачыў, Адам,— яна амаль што такая, як і раней... сапраўды...

Барковіч з метадычнай павольнасцю здзеў з пляча стрэльбу і павесіў яе на сцяну. Потым распусціў паляўнічую торбу і дастаў з яе прыгожага маладога ліса.

— Глядзі, што за цацка... Сумысля цалкам прывалок... Хараство якое, га?

Сяргей няўцямна тыркануў пальцам у звера.

— Заяц...

— Які табе заяц! Ліс...

І Барковіч аж зайшоўся ад пястрымна бурнага рога-

ту. Удостач адсмяяўпыся, ён раптам пацягнуў Сяргея з хаты.

— Паходзім давай. Пагаворым.

Яны падаліся пад вёску. Сяргей бесперастанку гаварыў ира Стасю, ира яе дзівоснае выздараўленне. Барковіч маўчаў. Барковіч адчуваў сябе так, нібы нечакана трапіў у пастку. Здавалася, што нейкі фізічны цяжар наваліўся на яго і тупа прыціскае да долу, не дае зварухнуцца, не дае распрастаць, развіпуць дужага цела. І чамусьці гэта прыкрае адчуванне зусім не злучалася з асобай Стасі. Ён не радаваўся дужа таму, што яна засталася жыць, але і не злаваў на яе. Ён прывык усе нягоды, якія б яго ні спасцігалі, разглядаць у агульным плане, як чарговую сутычку з жыццём, як чарговы наступ усіх тых варожых сіл, з якімі яму прыходзіцца весці змаганне. Стася толькі зброя ў руках гэтых сіл, Стася не вінавата.

І Барковіч раптам пачынае з мяккай ласкай распытваць пра Стасю, цікавіцца самымі нязначнымі драбніцамі, злучанымі з яе цудоўным выздараўленнем. Сяргею гэта дужа падабаецца, ён укладае ў апавяданне ўсю шчырасць свае істоты, ён увесь прасвятляецца і зазірае ў вочы Барковічу з асабліва глыбокай палкай удзячнасцю.

Адылі Барковіч больш пытае, чым слухае. У яго — сваё. Скутыя раптоўным цяжарам сілы яго пачынаюць настойна бурліць, уздымацца шумлівымі хвалямі, рыхтаваць нейкі адпор, нейкі ўдар па варожых сілах. Ён адчувае магутны прыліў эпергіі, ён гатоў ужо ў бой і шукае толькі першай ахвяры.

Першай ахвярай быў, вядома, Сяргей. Барковіч перапыніў яго ў момант самага шчырага захаплення, калі ён з бязмернай пяшчотай апісваў кожны рух, кожнае слова «здаровай» Стасі. Барковіч выбраў самае балючае месца — ён сказаў з наўмысна падкрэсленым грубым цынізмам:

— Цяпер ты можаш нагнаць тое, чаго не меў быў раней. Помніш «прызнанні над свежай магілай»? Ха-ха...

Сяргей раптам звяў, панура схіліў галаву.

— Нашто ты крыўдзіш мяне, Адам?

— Ты сам сябе крыўдзіш. Не трэба быць сантыментальным.

Далей, да самае вёскі, яны ішлі моўчкі. Каля школы Барковіч спыніўся.

— Зойдзем да настаўніцы.

Сяргею ўсё роўна было, куды ісці. Ён пайшоў да настаўніцы.

Тацяна сядзела на падлозе і распальвала сваю грубку. Яна паспешна ўстала ім насустрэчу, пачала прасіць прабачэння за непарадак у хаце. Барковіч прывітаўся і паказаў на таварыша:

— Гэта Сяргей.

— Я так і думала. Я адразу пазнала вас, сапраўды. Мне Адам пра вас гаварыў.

І яна з гасціннай ветласцю завіпулася каля Сяргея. Барковіч узяўся распальваць грубку. Перабіраючы трэскі, ён прабурчэў безуважным топам:

— Жонка мая паздаравела, скора прыедзе сюды.

Наконт прыезду ён проста выдумаў, але выйшла так, што трапіў у самы лад. Сяргей адразу ўсхапіўся:

— Так, Адам, я зусім забыўся на гэта. Яна казала, што як толькі збярэ троху сілы, дык адразу прыедзе сюды. Мабыць, ужо скора...

Барковіч неўзаметку зірнуў на Тацяну. Быў адзін момант, калі ёй, відаць, не ў змогу было хаваць сваё хваляванне, і яна адвярнулася, нібы шукаючы печага на кніжнай паліцы. Але зараз жа аўладала сабой і нават, каб паказаць сваю цвёрдасць, доўгі час гаварыла выключна пра Стасю. Між іншага, яна зазначыла з едкім паціскам:

— Адам зусім быў расчараваўся. Ён ніяк не чакаў, каб яго жонка паздаравела...

Барковіч здзіўлена зірнуў на яе, і яна гэта адчула, але паўмысля адвярнулася, каб не сустрэцца з ім поглядам. Барковічу ясна стала, што яна на яго злуецца.

Увесь той вечар Тацяна гутарыла выключна з Сяргеем. Яна ўдавала сябе вясёлай, бязрупатнай, многа смяялася, жартавала. Гэты вымушаны, ненатуральны настрой потым сапраўды захапіў яе — яна нібы забылася, махнула рукой на ўсе непрыемпасці, якія зазнала ў апошнія дні, і цалкам аддалася гэтай мінутнай вясёласці. Яе настрой знайшоў шчыры адгалосак у Сяргея. Ён быў сягоння надзіва спрытны ў гаворцы, апавядаў многа пра гарадское жыццё, жартаваў, смяяўся сам і досыць удала смяшыў Тацяну. Некалькі раз Тацяна паміж смеху і жартаў пільна ўгледалася ў яго, старанна вывучаючы яго знадворны выгляд. Ёй упадабаліся яго белыя сукрыстыя валасы, і яна папрасіла дазволу пацерабіць іх — з гэтага выйшла ў іх цэлая забава.

Барковіч сядзеў у сваім кутку і моўчкі сачыў за імі

Яму было цесна тут, яго ўстурбаваная энергія патрабавала нейкага выйсця — яму хацелася ўстаць і пайсці кудысьці-небудзь, каб хоць у бязмэтным руху адкрыць вытоку для сваіх сіл. Але ён не мог кінуць Тацяны — яму ў гэты момант да болю патрэбна была яе прысутнасць.

Гэта было нейкае дзіўнае, незвычайна-прыкрае пачуццё, зусім непадобнае да тої прагнай патрэбы ў жаночай блізкасці, якая звычайна прыцягвала яго да Тацяны. Ён не чуў цяпер гэтае блізкасці. Ён спрабаваў абудзіць у сабе звычайную ласку, пяшчотнасць, але заставаўся халодны. Быццам лягла паміж іх нейкая глухая пустэча і ў ёй тупа абрываліся ніці яго пачуцця. Ад гэтага ўзнімалася ў сэрцы едкая злосць і расло ўпартае непераможнае жаданне заставацца тут, каля яе, і настойна чакаць, што будзе далей.

Яны пайшлі ад настаўніцы зусім ужо позняй парой. Яна выпраўляла іх з шумнай клапатлівасцю і прасіла заходзіць яшчэ. Барковіч, развітваючыся, затрымаў яе руку і з цвёрдай дапытлівасцю зірнуў ёй у твар, але яна сярдзіта насупілася і рашуча ўнікала ад яго погляду. Гэта выйшла ў яе троху камічна, Барковіч не вытрымаў — і засмяяўся. У гэты момант яму надзвычайна пацешнай і любай здалася яна — з сваёй напружанай стараннасцю быць сярдзітай, з сваёй беспрасветнай суровасцю. Хваля гарачай пяшчоты затапіла нутро яго — яму захацелася прыцягнуць яе да сябе, моцна-моцна абняць і цалаваць — зараз жа, тут, пры Сяргею. Яна, мусіць, адчула гэты настрой, бо раптам уздрыгануласа, вырвала сваю руку і бліснула на яго кароткім поглядам, поўным настойнае просьбы ці, можа, перасцярогі.

Барковіч пайшоў ад Тацяны ў добрым гуморы.

Сяргей, як выйшлі, адразу спытаўся:

— Гэта твая каханка?

Барковіч, хвіліну змаўчаўшы, адказаў запытаннем:

— А ці варта яе кахаць? Як па-твойму?..

І са спакойнай усмешкай слухаў, як Сяргеї хваліў Тацяну.

— Мне яна ўпадабалася. Яна такая ласкавая, ветлая... І вясёлая. З ёй надзвычайна прыемна гутарыць. Я нават не заўважыў, як праляцеў гэты вечар...

Барковіч, смеючыся, перапыпіў яго:

— Ты глядзі, і ў яе не закахайся...

Ён наўмысля сказаў «і ў яе», каб падражніць Сяргея. І ён добра ведаў, што Сяргей, раптам змоўкнуўшы пасля

гэтых слоў, думае цяпер пра Стасю. Ён рашыў выкрыць Сяргеевы думкі.

— Стася прыгажэй за яе, але прасцей. У тае пачуццё заўсёды роўнае і нязменнае, а ў гэтае нават цяжка вызначыць часам, ці яна кахае цябе, ці ненавідзіць. Мабыць, яна і сама не ведае...

Сяргей зазначыў, нібы раптам успомніўшы:

— Праўда... Я заўважыў... яна сёння была да цябе такая... халодная...

— Як лёд...

І Барковіч засмяяўся. Больш яны не гаварылі аб гэтым.

Рэшту дарогі Барковіч апавядаў Сяргею пра Палессе, пра дзікае, поўнае нягод і жорсткай красы жыццё беларусаў-палешукоў. Сяргей задаваў наіўныя, чыста дзіцячыя запытанні.

У гэты вечар яны былі адзін аднаму шчырыя прыяцелі.

8

А назаўтрага ўранні, прачнуўшыся гадзіне а дзевятай, Сяргей заўважыў, што ў хаце няма ўжо ні Барковіча, ні яго стрэльбы. Апанас, гаспадарскі сын, расказваў, што Барковіч устаў яшчэ досвіта і, нічога не сказаўшы нікому, падаўся некуды ў лес.

Гэта было зусім неспадзявана. Сяргей дужа дрэнна сябе адчуваў сярод незнаёмай сялянскай сям'і. Далікатная абыходлівасць гаспадароў здавалася яму залішне перавяліканай і наганяла на яго прыкрае замяшанне. Яму цяжка было сядзець у хаце, і ён цэлы дзень бадзяўся па ваколіцах хутара, зазіраючы ў хату толькі затым, каб дазнацца, ці вярнуўся Барковіч.

Барковіча не было да самага вечара. Тады Сяргей рашыў пайсці да настаўніцы.

Таццяна сустрэла яго без асаблівага здзіўлення, быццам загадзя ведала, што ён прыйдзе і што прыйдзе адзін. Калі Сяргей пажаліўся ёй на Барковіча, яна з усмешкай яму адказала:

— Ці ж вы не ведаеце гэтага лесуна? У яго вечна такія фокусы...

Сяргей адразу, як толькі ўвайшоў у прытульны Таццяніп пакойчык, як толькі ўбачыў яе ласкавы вясёлы твар, яе шэрыя ўсмешліва-ветлыя вочы,— адразу пачуў сябе лёгка і вольна, быццам прыйшоў да старога добрага свай-

го таварыша. Зноў, як і ўчора, заняласа ў іх жвавая гутарка, зноў яны дружна смяяліся, жартавалі. Яны селі ў тоі чароўны цёплы куточак, дзе зазвычаі сядзеў з ёю Барковіч, і Сяргею здалося, што ён сядзеў тут многа-многа разоў, што ўсё тут такое знаёмае яму, такое блізкае.

Таццяна абыходзілася з ім трохі паблажліва, як старэйшая з малодшым — ён адчуваў гэта, але зусім не абражаўся. Гэта было нават прыемна яму, бо ўлівала ў іхныя адносіны асаблівую мяккасць і цеплату.

— Раскажыце што-небудзь пра Стасю.

Яна папрасіла так проста і непрыкметна, што Сяргей зусім не здзівіўся з гэтага раптоўнага яе жадання. Ён заўсёды рад быў гаварыць пра Стасю і быў шчыра ўпэўнены, што кожнаму прыемна пра яе слухаць. Цяпер ён гаварыў такім тонам, быццам спрачаўся з некім, абараняў яе ад нечых нявідных нападаў, упарта адстойваў яе добрыя якасці. Ён так захапіўся, што зусім не сачыў за Таццяніным тварам і не заўважыў, як на ім адзначыўся быў цень глыбокае роспачы, як потым з балючай патугай перамагла яна гэтае пачуццё і глядзела на яго, на Сяргея, з несхаваным жалем, з ласкавым матчыным спачуваннем.

Сяргей змоўк і задумаўся. У яго сініх вачах застыла сумная летуценнасць. Таццяна моўчкі паклала сваю руку на яго сукрыстыя валасы і пяшчотна перабірала іх. Ён спачатку нібы не чуў гэтае ціхае ласкі, а потым, схамянуўшыся, схапіў яе руку і пачаў цалаваць.

Яна чамусьці прыкусіла губу, і ў вачах у яе заблішчэлі слёзы.

У гэты момант з сянец пачуўся бязладны грукат. Гэта прыйшоў Барковіч. Ён увайшоў у пакой, даў «добры вечар», усміхнуўся, заўважыўшы, што занята яго звычайнае месца, сеў зводдаль і застыў у немым маўчанні.

Сёння выйшла так, як і тады. Барковіч моўчкі сядзеў, а яны вялі ўдваіх вясёлую жвавую гутарку. Раз-пораз яны кідалі адзін на аднаго кароткія выразлівыя погляды, і калі вочы іх сустракаліся, яны гарэзліва ўсміхаліся адзін аднаму, як тыя дзеці, што напракудзяць чым-небудзь, адылі, не выкрытыя застануцца без пакарання.

Паміж іх было ўжо пешта падобнае да супольнае тайны.

На развітанні Таццяна зноў, пасунціўшыся, старанна ўпікала Барковічавых вачэй, яму зноў смешна было ад гэтага і люба было глядзець на яе, і зноў узнялася была ў ім гарачая хваля пяшчоты.

З таго часу так і пайшло. Барковіч на цэлы дзень знікаў у палескіх нетрах, а Сяргей, апанаваны чорнай нудотай, бадзяўся па ваколіцах хутара. Як толькі асядала на зямлю шэрая гадзіна, Сяргей, поўны радаснай нецярплівасці, бег да Тацяны — у яе прытульным куточку так чароўна звіваліся хвіліны сяброўскай гутаркі, перамешанай з ціхай пяшчотнай ласкай.

Гадзіне а дзевятай прыходзіў Барковіч. Ён моўчкі сядзеў да канца вечара і, выходзячы ад Тацяны, нязменна ўсміхаўся дабрадушна-загадкавай усмешкай.

. . . . . .

Гэтай парой над Палессем яшчэ ляцелі гонкія плаўнакрылыя гусі.

. . . . . .

Сяргею доўга не ўдавалася стала пагаварыць з Барковічам. Іхнія выпадковыя гутаркі ніколі не выходзілі за межы малазначных драбніц, роўна нецікавых ні адному, ні другому. Ці толькі Сяргей памыкаўся закрануць якую-небудзь жыццёва вострую тэму, Барковіч ураз абрываў размову або рэзка пераводзіў яе на іншы прадмет. Сяргею гэта давала вялікую непрыемнасць. Яму цяжка было пасіць у сабе нявыказаныя думкі — ён да гэтага не прызвычаіўся. Праўда, большую частку думак сваіх і пачуццяў ён выліваў у шчырых гутарках з Тацянай, але было і такое, аб чым яму цяжка было з ёй гаварыць. І ён з упартай цярплівасцю чакаў, калі, нарэшце, можна будзе выказаць усё Барковічу.

Гэта здарылася дзён праз пяць пасля яго прыезду. Позным вечарам яны вярталіся ад настаўніцы. У Сяргея, як і звычайна пасля сустрэчы з Тацянай, застаўся ўнутры лёгкі хмель радаснага захаплення. Густая волкая цемра, праз якую яны ішлі, спрыяла яго самаўглыблёнасці — ён моўчкі прыслухваўся да прыемнага свайго пачуцця і шырока, п'янавата ўсміхаўся — балазе ніхто не бачыць. І вось раптам Барковіч ні з таго ні з сяго пытаецца:

— Ты, Сяргей, чакаеш Стасю?

Ён здрыгануўся ад неспадзяванасці і не ведаў, што адказаць.

— Чаму ты пытаеш пра гэта?

Барковіч спакойна растлумачыў:

— Я бачу тваё новае захапленне, і ў мяне з'яўляецца трывога за Стасю. Яна можа згубіць свайго апошняга вернага прыхільніка.

— Чаму «апошняга»?

Барковіч не адказаў. Сяргей падумаў, што цяпер якраз надышла пара для шчырай размовы, і рашыў пачаць.

— Слухай, Адам, я даўно ўжо хацеў сказаць табе... я цябе не разумею... Мне здаецца,— ты зусім не рады, што Стася паздаравела, што скора прыедзе да цябе, будзе зноў, як даўней... Няўжо гэта праўда?.. Няўжо ты сапраўды больш яе не кахаеш?..

— А ты?

Сяргей замяшаўся.

— Я... ты, Адам, ведаеш... Я яе зусім асабліва любіў і люблю... не так, як ты... Я табе не замінаю... Я яе буду заўсёды любіць... заўсёды...

— Ты дужа смешны...

Сяргей зразумеў гэтыя словы, як выказ недавер'я да яго, і захваляваўся.

— Так, Адам, я гэта шчыра кажу... Я разумею, што так пядобра... Людзі многа чаго гавораць... Наогул неяк... бязладна ўсё... Я разумею... Я многа думаў аб гэтым. Мы нешта зробім... Ты не ведаеш, я ж гэта наўмысля хаджу да Тацяны... Яна мне адразу надзвычайна ўпадабалася. У ёй ёсць нешта такое, што ўвесь час цягне мяне да яе — я гатоў цэлыя суткі сядзець з ёй, сапраўды... Яна разумная і добрая. У ёй так многа ласкі, сімпатыі... Слухай, Адам, усё можа быць... Магчыма, што я...

— Магчыма, што ты з ёй ажэнішся?

— Можа, я пакахаю яе... так, як звычайна... як ты...

Ён сам спалохаўся гэтага свайго прызнання і змоўк. Барковіч запытаў безуважным тонам, скрозь які, аднак, прабівалася шільна схаваная насцярожанасць:

— Ты з ёй аб гэтым не гаварыў?

Сяргей зусім засаромеўся.

— Я не ведаю.... Ды не, не гаварыў... Але мы з ёй... наогул... мне здаецца, што яна да мяне добра адносіцца...

На гэтым скончылася іхняя гутарка. Яны падышлі да хутара, моўчкі ўвайшлі ў хату і моўчкі паклаліся спаць. Назаўтрага Барковіч зусім не прыйшоў да Тацяны.

9

Заўтра прыедзе Стася. З самага таго моманту, як учора надвечар прынеслі тэлеграму і Сяргей першы за ўсіх яе прачытаў, яго ні на хвіліну не пакідаў вясёлы радаснаўзняты настрой. Ён быў зусім шчаслівы. Ён не толькі рад

быў, што скора сустрэне Стасю: ён чакаў ад прыезду яе нечага большага, нечага асаблівага. У яго выпасла дзіўная ўпэўненасць у тым, што прыедзе Стася — і будзе ўсё добра. Будзе добра і ёй, і Барковічу, і ўсім чыста. Ён учора гаварыў аб гэтым Тацяне, і яна згаджалася — яна таксама з нецярплівасцю чакае Стасінага прыезду.

Адно непакоіць Сяргея — гэта незразумела дзікі настрой Барковіча. На яго тэлеграма зрабіла, мусіць, дрэннае ўражанне. Ён, праўда, спачатку толькі ўсміхнуўся і прабурчэў, нібы сам да сябе:

— Ну што ж, гэта добра...

Але потым спахмурнеў, усцервіўся печага, пачаў кідацца, як загнаны звер. То пойдзе куды-небудзь, то зноў вернецца ў хату, ходзіць ад сцяны да сцяны, не гаворыць ні з кім, ні на кога не звяртае ўвагі.

Сёння зранку пайшоў са стрэльбай. Мабыць, паходзіць, дык заспакоіцца. А заўтра выяспіцца ўсё, усё чысценька.

І Сяргей цалком аддаецца свайму бязрупатна-радаснаму пачуццю.

Барковіч вярнуўся рана — толькі пачало цямнець. Ён кінуў на лаўку свае прылады, падышоў да Сяргея і сказаў з выразным націскам:

— Я сёння пайду да Тацяны.

Сяргей зразумеў.

— Добра, я застануся дома.

І Барковіч адразу пайшоў.

У Тацяны агню яшчэ не было. Яна сядзела ў сваім куточку, ахінутая густым валакном змроку. Ён адразу заўважыў яе, як увайшоў у пакой. Ён моўчкі падышоў да яе, схіліўся перад ёй — вялікі, грамоздны — і з парыўчатай палкасцю пачаў цалаваць яе рукі. Яна слаба адпіхала яго ад сябе.

— Пастой... Я запалю лямпу.

І яна ўстала, падышла да стала. Яна чамусьці дужа доўга шукала запалак, хоць яны некалькі разоў бразгалі ў яе пад рукой. Нарэшце знайшла, запаліла святло. Барковіч толькі цяпер заўважыў, што стаіць на каленях перад канапай. Ён устаў, падышоў да Тацяны, зазірнуў ёй глыбока ў вочы.

— Я ведаю, Тацяна, за што ты злуеш на мяне. Ты злуеш за тое, што не памерла Стася.

Тацяна спалохана адшаспулася ад яго.

— Досыць, Адам. Я больш не магу... Ты мучыш мяне...

— Я кахаю цябе — ты гэта ведаеш... Заўтра прыедзе Стася... Нам трэба нешта рабіць...

— Не-не, нічога не трэба... Я не хачу, я нязгодна...

— Ты баішся?

Таццяна з цвёрдай рашучасцю ўхапілася за гэтае слова:

— Так, так, Адам, я баюся... Я баюся Стасі... Мне здаецца, што гэта яна не памерла... вярнулася, каб толькі нас разлучыць... Я ведаю, што гэта глупства, але ўсё роўна... мне не будзе спакою...

Барковіч абняў яе сваёй дужай рукой.

— Ты будзеш са мной, Таццяна... заўсёды... Я буду цябе бараніць... Мы можам паехаць куды-небудзь, знікнуць ад іх, ад усіх...

— З табой... заўсёды... Нашто ты гэта гаворыш? Ты сам не верыш гэтаму... Ты ж усё роўна кінеш. Такі ты чалавек... Я і цябе баюся... больш, можа, чымся Стасі...

У Барковіча ў вачах пыхнуў едкі агеньчык.

— Што гэта: практычнасць ці сантыментальнасць? На ўсё жыццё, значыць? Ха-ха!..

Таццяна сурова насупіла бровы.

— Кінуць лягчэй, чымся быць пакінутым.

— Гэта, ведаеш, дужа падобна да Сяргея...

Таццяна яшчэ больш насупілася.

— Ты здзекваешся над Сяргеем... Ты — мацней шы... А ён добры, лепшы за цябе. Я веру яму ва ўсім.

— А мне не верыш, бо кахаеш мяне. Каго кахаюць, таму ніколі не вераць.

— Ай, не ведаю я...

На яе твары адзначыўся след путранога болю. Яна адышлася да акна і, адсунуўшы фіранку, пачала глядзець у чорную засланку цемры. Барковіч застаўся на месцы. Хвіліна працякла ў нервова-напятым маўчанні. Потым Барковіч загаварыў глухім, зніжаным голасам:

— Што ж... значыць — усё... канец... Што ж... хай сабе...

Ён памаўчаў, быццам мяркуючы, што яшчэ трэба сказаць, і запытаўся:

— Ты, мусіць, захочаш, каб я з табой больш не сустракаўся?

Яна з нервовай паспешнасцю абярнулася да яго.

— Так, Адам. Больш не трэба... Ты нічым тут не звязаны... Едзь адсюль... Мне будзе лепш... Я хачу добра цябе ўспамінаць, і ты не павінен мучыць мяне... Едзь куды-небудзь... я дужа цябе прашу...

Барковіч пагадліва кіўнуў галавой.

— Добра, паеду. Бывай!

Ён хацеў на гэтым і скончыць усё, хацеў ужо завярнуцца і ісці, аж яна раптам падышла да яго, паклала на плечы яму свае рукі і ўпілася ў яго твар глыбокім балючым поглядам.

— Бывай, Адам!

І ў нейкім раптоўным захапленні, у п'яным экстазе пачала яго цалаваць.

— Бывай!.. Бывай!.. Любы!..

Барковіч пачуў на твары ў сябе гарачую вільгаць: яна плакала. Ён моцна прытуліў яе да сябе і зашаптаў:

— Ты любіш мяне... Таццяна, ты любіш... Нашто так рабіць?..

Яна быццам і не чула гэтых слоў. Яна яшчэ раз паглядзела ў твар яму сваім распаленым поглядам і раптам супакоілася.

— Ну, ідзі... Пачакай, захіні сваю куртку — на дварэ ўжо сцюдзёна. Дай, я. Вот так. Во... Які ты нядбалы! Як дзіцяпё... Ну, ідзі...

Яна вывела яго на вуліцу і стаяла на ганку, пакуль не заглухлі ў цемры яго марудныя важкія крокі.

Дзіўнае адчуванне было цяпер у Барковіча. Нейкі тлумны туман атуліў яго свядомасць, і ў гэтым тумане бясформеннымі абрыўкамі мітусіліся асобныя словы і вобразы, бязладна вырваныя з таго, што адбылося там, у Таццяны. Жывей за ўсё адчуваліся Таццяніны пацалункі, якія нібы прыліплі да твару палкімі язводнымі плямамі. Іншай хвілінай здавалася, што яна і цяпер цалуе яго, і затуманеная свядомасць настойна дамагалася развязаць тупое, назойлівае пытанне:

«Нашто гэта яна? Што абазначаюць гэтыя дзіўныя пацалункі?»

Потым памалу туман развеяўся, і раптам, нібы вострым нажом, рэзнуў па сэрцы бязмерна пякучы жаль. Перад ім адкрылася ў востраі, амаль што фізічна адчувальнай канкрэтнасці блізкая магчымасць шчасця, магчымасць глыбокіх салодкіх уцех, якая была, безумоўна, была да гэтай апошняй сустрэчы.

«Няўжо — канец? Няўжо ўсё тое, што засталося там, за некалькі крокаў назад, што адчуваецца такім блізкім, патрэбным,— няўжо яно навек адарвалася? А можа, гэта памылка? Можа, яна чакае яго? Можа, хоча, каб ён вярнуўся?

Не! Яна развіталася назаўсёды. Яна не чакае. Цяпер

ужо позпа. Жыццё супраць яго, перамаглі варожыя сілы. Скруцілі шчытным калючым вязьмом, не даюць вольна дыхнуць, здзекваюцца, святкуюць сваю паганую перамогу.

Пачакайце! Ён яшчэ не здаўся, яшчэ будзе змаганне. Ён яшчэ возьме сваё!»

І Барковіч, апашаваны раптоўным прылівам шалёнае злосці, сударгава сціскае свае кулакі, скрыгае зубамі і ўпіваецца ў цемру драпежным раз'юшаным поглядам, быццам гатовы кінуцца на нейкага нявіднага ворага.

Раптам ён успамінае Сяргея, і нядобрая ўсмешка крывіць яго дрыжачыя вусны. Ён спыняецца сярод дарогі, з хвіліну аб нечым мяркуе і рашуча заварочвае назад, на вёску.

У Тацяны ў акне свеціцца ціхі прыветны агеньчык. Калі праходзіць міма Барковіч, агеньчык на момант ловіць яго ў сваё жаўтлява-празрыстае ўлонне,— мусіць, затым, каб падзівіцца на яго злосны, дэманічна скрыўлены твар.

Барковіч заїшоўся да Лўтуха, першага сябра свайго па паляванні.

— Дай мне на заўтрашні дзень свае стрэльбы.

— Во... А твая што?

— Мы пойдзем удвух, з таварышам...

— А-а...

Аўтух нешта памыкаецца расказаць, але Барковіч не слухае. Ён забірае стрэльбу і паспешна ідзе да сябе, на хутар.

Сяргей яшчэ не спіць. Ён сядзіць за сталом, узлёгшыся тварам на далоні, і шчыра аб нечым думае. Барковіч стараецца ўзяць дабрадушны, вясёлы тон.

— Бабы казалі, што ў Чорным маху аселі гусі. Пойдзем з табоїй заўтра ўранні. Я ўзяў табе стрэльбу.

Сяргей узпімае на яго свае паіўныя, ясныя вочы.

— Я ж не ўмею страляць.

— Гэта зусім проста. Во так...

І Барковіч пачынае на скоры поспех тлумачыць яму, як трэба абыходзіцца са стрэльбаї. Сяргея надзвычайна цікавіць гэта механіка, і ён ужо шчыра радуецца, што Барковіч надумаў узяць яго на паляванпе.

Яны зараз жа кладуцца спаць, каб заўтра яшчэ досвіта быць на нагах.

Густы каламутны змрок, патрывожаны першым, яшчэ ледзьве-ледзьве прыметным святлом зарання, санліва варушыўся ў мякка нагрэтым занач гняздзе і доўга не хацеў пакідаць яго — доўга не хацеў падбіраць сваіх чорных, раскіданых на глухім закуцці космаў. Млявы, распараны сном, ён дыхаў цеплаватай вільгаццю, і ў гэтым цягучым дыханні насіўся пах мокрай кары і заляжалага лісця.

З неба на зямлю асядала густая ліпкая парасць...

Спачатку, як выйшлі, Сяргей зусім не бачыў дарогі. Ён чуў наперадзе ў сябе аднамерна важкія крокі Барковіча і дробна семяніў у той бок, спяшаючыся, каб не астацца. Ісці было дрэнна, часта трапляла пад ногі то слізкая лужына, то пень або карчавешка. Дужа замінала стрэльба — ён ніяк не мог прыладзіцца, каб яна добра трымалася, і кожную хвіліну прыходзілася яе папраўляць.

Адылі Сяргею зусім было весела і прыемна.

Пачало днець. Ужо можна было агледзець наперадзе постаць Барковіча, толькі выдавала яна нейкай дзіўнай, недарэчнай: то вырасце раптам вялізная-вялізная, то збярэцца ў маленькі чорны камочак, то зусім знікне, сальецца з цемрай, а потым вылучыцца цёмнай бясформенай масай, зусім непадобнай да чалавека.

Барковіч увесь час упарта маўчыць. Сяргею страшэнна хочацца гаварыць, і ён раз-пораз пытаецца аб чым-небудзь у свайго спадарожніка, але той або адказвае адным словам, або проста адмоўчваецца. Ён нейкі дзіўны сягоння. Нават голас у яго нібы змяніўся — грубейшы стаў і сурова стрыманы. А тут яшчэ змрок гэты, цені розныя таемныя на баках. Сяргею пачынае залазіць у нутро міма-вольная жудасць.

Ага! Нарэшце ўжо сапраўды павіднела. Вырастаюць дрэвы наўкола, вылазяць кудлатыя карчы. Пад нагамі відаць ужо жоўты дыван апалага лісту. І постаць Барковіча зрабілася зусім выразная: ён у звычайнай куртцы сваёй, у высокіх ботах, замест пояса — патранташ. У яго чамусьці падняты каўнер, і гэта надае ўсяму яго выгляду нейкую чэрствасць, замкнёнасць: звычайна ён ходзіць зусім расхрыстаны. Нашто ён паставіў каўнер? Сягоння ж ані-пі не холадна.

Вось і зусім ужо відна. Дзень заняўся сляпы, слізготны. Можа, гэта добра для паляванння? А можа, дрэнна?

Сяргей пытаецца ў Барковіча, але той маўчыць. Мусіць, задумаўся моцна. У яго сёння зусім няўдалы настрой.

Яны ўсё ідуць ды ідуць. Ішлі па глухім балоцвеным лесе, потым перайшлі праз сухую выспу, падаліся ўсцяж на канаве, зноў устроміліся ў дзікі непраходны лес. У Сяргея, нязвыклага да хады, ужо млеюць ногі і страшэнна ломіць плячо, на якім ён нясе сваю стрэльбу.

Дзе ж тыя гусі?

Перад імі раптам адкрываецца шырокая чыстая паляна, абкружаная суцэльнай сцяной высокага лесу. Барковіч спыняецца і абарачваецца да Сяргея.

— Вось тут... Давай адпачнём троху...

Ён абапіраецца плячмі аб ствол вялізнага дуба і глядзіць некуды ўбок, у цёмны лясны гушчар. Ён высвістваe нейкую песню — мабыць, затым, каб перамагчы таемна-хітрую ўсмешку, якая во-во гатова ўсплысці на яго твар.

Аб чым ён думае?

Сяргей з радасным палягчэннем здымае з пляча стрэльбу і шукае месца, дзе б паставіць яе. Барковіч раптам спыняе яго.

— Ты не забыўся, як трэба страляць? Пакажы...

Сяргей спраўна праробляе ўсе патрэбныя маніпуляцыі. Барковіч здаволена ўсміхаецца. Потым ён падыходзіць бліжэй да Сяргея і раптам прымае сур'ёзны, амаль што жорсткі выгляд.

— Во што... Нам трэба з табой пагутарыць... стала... раз назаўсёды.

Тон яго слоў такі незвычайны, такі напружна-цвёрды, што Сяргей мімаволі бляднее і ў вачах у яго пыхае раптоўны спалох.

— Аб чым ты хочаш гутарыць?

Барковіч падыходзіць яшчэ бліжэй, узлягаецца на сваю стрэльбу і ўпінае ў Сяргея жудасна нерухомы погляд.

— Слухай... Колькі часу, як мы спазналіся?

— Даўно ўжо... Год пяць.

— Так. Пяць год. Мы адразу былі здружыліся. Помніш? Гэта дужа цікава... У нас былі моманты, калі мы не маглі жыць адзін без аднаго. Мы часам спрачаліся, лаяліся, крыўдзілі адзін аднаго, а потым шукалі выпадку, каб зноў сустрэцца. Не маглі абысціся без гэтай сустрэчы... Праўда? Ну, вось... Мы пяць год былі самымі блізкімі, самымі шчырымі прыяцелямі...

Ён змоўк, нібы правяраючы ў думках, ці тое сказаў, што трэба было сказаць, або шукаючы слоў для далейшага.

Сяргей з поўнай шчырасцю пацвердзіў:

— Я заўсёды лічыў цябе за лепшага свайго сябра.

Барковіч не звярнуў ніякай увагі на яго словы.

— Вось так... разумееш?.. А ўсё-ткі мы з табой ворагі адзін аднаму. Найлюцейшыя ворагі, якія толькі могуць быць...

— Адам! Што ты гаворыш?

— Найлюцейшыя ворагі... Фатальныя ворагі... Мы ўвайшлі адзін к аднаму ў жыццё, каб папсаваць яго... Так увесь час і было...

Ён змоўк, нібы адпаўляючы ў памяці драбніцы мінулага.

— Вось з Стасяй... Ты мне псаваў увесь час... страшэнна псаваў... агідна... А я табе... ха-ха!.. ты сам казаў, што нічога не меў... ха-ха!.. нічога не меў...

І ён дзіка зарагатаў. Потым ураз неяк сціх і надблізіў да Сяргея свой скрыўлены злоснай грымасай твар.

— Па праўдзе сказаць, ты паскудненькую ролю там іграў. Зусім такую, ведаеш, нікчэмненькую, туалетную... Ты ж, небарака, нічога не меў... Ха-ха!.. Які недалужны!..

Сяргей яшчэ больш пабялеў, і вочы яго востра заблішчэлі — ні то ад слёз, ні то ад зацятае злосці.

— Адам! Ты мяне абражаеш!..

— Ха-ха! Абражаю? Я думаў, што ты зусім няздольны абразіцца... Слухай далей... Вось з Тацянай... Ты не дужы сам для сябе знайсці што-небудзь у жыцці. Ты, як слімак, падпаўзеш да чужога і рад, што знайшоў, дзе прыслініцца. І просты жаль да цябе, перамяшаны з агідай, ты гатоў прыняць за каханне! Ха-ха!.. Цябе кахаць! Такога скліznёпка?

З Сяргеем рабілася нешта надзвычайнае. Яго збялелы твар раптам наліўся крывёй, вочы загарэліся дзікім вар'яцкім агнём,— ён увесь напружыўся і гатоў быў кінуцца з кіпцямі на Барковіча. Ён не мог гаварыць, у яго выходзіў толькі здушаны шэпт.

— Ты... якое права... Я — чалавек!.. Я — чалавек...

Барковіч зусім блізка — твар у твар — прыхіліўся да яго.

— Ты — паскуднік... Я ненавіджу цябе...

З хвіліну яны стаялі так адзін супраць аднаго — люты я ворагі, гатовыя кожную хвіліну кінуцца ў смяротную бойку. Потым здарылася нешта зусім дзікае і агіднае: Барковіч плюнуў у твар Сяргею і, крута завярнуўшыся, пайшоў на паляну.

Гульня была надзвычайна рызыкоўная, і Барковіч,

ідучы роўнымі, нібы зусім спакойнымі крокамі па паляне, з фізічнай яснасцю адчуваў, як па спіне ў яго марознай хваляй перабягаюць мурашкі. Нейкую балюча-вострую звярыную асалоду давала яму гэтае смяротна-напружанае чаканне.

Усё, што адбылося далей, заняло не больш, як хвіліну, але тая хвіліна ўвязала ў сябе цэлы віхор самых бурлівых перажыванняў.

Быў адзін момант, калі Барковічу здалося, быццам нешта з тупой сілай штурханула яго ў плечы, і ў галаве яго малашкай бліснула думка, што гэта Сяргей дагнаў яго і ўдарыў прыкладам. Але зараз жа загрымеў стрэл, і за ім — балюча-балюча запякло ў правым плячы.

Цяпер ён ведаў, што трэба рабіць. Са звярынай круткасцю ён абярнуўся назад і абыклым рухам сарваў з пляча зброю.

Сяргей стаяў на ўзлессі — белы як снег,— і з нерашучай патугаі падымаў стрэльбу, ладзячыся да другога стрэлу.

І раптам — ні з таго ні з сяго — Барковіч зайшоўся ад самага звычайнага, самага вясёлага, гуллівага рогату.

— Бэкасіннік... ха-ха! Бэкасіннік... Шрот такі ў цябе... ха-ха!.. Я забыўся... На дробных птушак... ха-ха!.. Бэкасіннікам у чалавека... у чалавека... ха-ха-ха!..

Сяргей з тупой пяўцямпасцю апусціў стрэльбу. Барковіч рашучым махам ускінуў сваю па плячо і, усё яшчэ смеючыся, прайшоў міма Сяргея і ўглыбіўся ў лес.

— Адам! — пачуўся ззаду слабы, надарваны голас.

Ён прыбавіў ходу.

— Адам! — данеслася зусім здалёку — ціха і жаласна.

І ўсё змоўкла.

Барковіч усё глыбеў і глыбей удаваўся ў цёмны гушчар, і чым далей ён ішоў, тым спакайнеў рабіўся яго твар, і ўсмешка, з якой ён не разлучаўся з самага таго трагікамічнага моманту, усё больш і больш набывала дабрадушна-лагодны характар.

Глыбокая застылая ціхасць палескае пушчы, хмельны пах волкай зямлі і спрадвечнага жыццёвага праху, ціхі, малельна-пакорлівы шэпт пажоўклых лістоў і самота — поўная, бязмежная самота, салодкая да ап'янення, да забыцця...

Як добра яму тут! Які цудоўны спакой ахінае істоту яго, як расце, развівасцца яго вольны, непакорлівы дух, надламаны жыццёваі нягодаі. І як далёка засталася ўся тая нягода — з жорсткаі барацьбоі, з трывогай, з дробным дакучлівым мітусеннем.

Ён адчувае сябе пераможнікам. Ён сам не ведае, у чым гэта перамога, але ў душы ў яго — урачыстасць, на сэрцы — спакойная, чыстая радасць. З наўмысна навостранай чуласцю ён прыслухваецца да свае раны, і яму чамусьці прыемна, соладка адчуваць, як пякуча садніць ілячо, як сцякае па целу ліпучая цёплая кроў.

— Бэкасіннік...

І ён зусім наіўна, па-дзіцячаму ўсміхаецца.

Лес перасякае чорная паламаная грэбля. Гэта — дарога на станцыю. Ён спыняецца, пільна азірасцца наўкола і ідзе далей па дарозе. Яму дужа прыемна, што дарога пустая, што нікога няма насустрэчу.

Але вось наперадзе, ад завароту, паказаўся конь. Недалужна калупаецца па гразкаі грэблі, ледзьве цягне за сабой карахвашку.

Пэўна, нехта едзе са станцыі.

Раптам Барковічавы мазгі праразае вострая здагадка. Ён, як злодзей, кідаецца ў бок ад дарогі і прытойваецца за вялізным камялём старавечнага дуба.

— Так, гэта яна... Гэта — Стася.

Яна праязджае зусім блізка каля яго, і ён спакойна, уважліва яе разглядае.

Яна сапраўды паздаравела... Яшчэ відаць на твары сляды цяжкой хваробы, але ўжо шчокі красуюцца свежаі чырванню і ў вачах гарыць вясёлы, зусім здаровы агеньчык. Яна амаль што такая, як і раней.

Яна думае аб нечым вясёлым, прыемным. Нават не можа стрымаць мімавольнае ўсмешкі, якая пастойна лезе на твар ёй і гарэзліва трывожыць яе тонкія прыгожыя вуспы. Пэўна, малюе ў думках радасную карціну блізкаі сустрэчы...

Ха-ха! Каб яна ведала, што ён стаіць тут, на некалькі крокаў, схаваўшыся ад яе, як злодзеі!

Карахвашка, нязграбна клыпаючы па карабатаі грэблі, знікае за заваротам. Барковіч чакае яшчэ хвіліны са дзве, потым вылазіць з свае засады і, сцеражліва азіраючыся, выходзіць на дарогу. На твары ў яго хітра-здаволеная міна. Ён ашукаў і тут. Ён усіх ашукае, пачакаіце толькі! Ён не здасца — о, не! Хаі цяпер там разбіраюцца, хаі!

Радасць яго пераходзіць магчымыя межы. Яе ўжо ня-можна стрымаць, яна павінна выліцца неяк з яго да краю перапоўненай істоты. Ён яшчэ раз азіраецца на бакі і, нарэшце, дае сабе волю. Магутны раскатны рогат разлягаецца па бязлюднай пушчы і на хвіліну поўніць яе мітуслівым жыццём. Потым ён у адзін момант супімаецца і стаіць, сударгава застылы ў рэзка напружанай нерухомасці.

Так. Яго вострае вуха не зманіць. Ён выразна чуе гэтыя далёкія гукі, ціхія і меладычныя, як хлюпанне нявіднай крынічкі. Ён упінае свой распалены радасцю погляд у шэрае неба і бачыць (а можа, гэта здаецца яму?), як плаўна супецца там жывы рухавы трохкутнік.

Гусі... Апошнія сёлета гусі. Руняцца, каб не застацца, каб не спазніцца ў тої зачараваны край. Яны яшчэ вераць, яшчэ спадзяюцца. У іхняй зазыўнай песні так многа імкнення, так многа надрыўнае радасці.

Ляціце, любыя! Ляціце, родныя! Яшчэ не позна. Ніколі не позна...

Шукайце сонца! Шукайце шчасця!..

Барковіч, як і тады, калі бачыў быў першых гусей, у п'яным захапленні ўзнімае ўгару свае рукі і крычыць услед далёкім вандроўцам:

— Го-го-го-го!..

. . . . . .

На станцыі стаяў некуды поезд. Барковіч падышоў да касы, дастаў свой бумажнік, вытрас усё, што ў ім знайшлося, і папрасіў касіра, каб ён на ўсе грошы даў яму праязны білет.

15 Зак. 2059

ХВІЛІНА

Старшыня правяркома ціхім ад зморы і нервовага напружання голасам выклікаў чарговага кандыдата:

— Кастроў Мікола!

Да стала падышоў сярэдняга веку мужчына з ахайнай чарнявай бародкай, з вострымі ўсмешлівымі вачмі з чмарай радзімай над левым брывом.

Старшыня паволі ўзняў ад паперы марудны погляд і зірнуў на Міколу Кастрова. Урачыста-спакойны твар яго застыў у раптоўным акамяненні, вочы зайстрыліся рэзкім сталёвым агнём і — завыў, застагнаў па заўголлю раз'юшаны вецер, шумархнуў па стрэхах саломай і клок яе — мокрае, цвілае — нахабна кінуў пад ногі, як глумлівы паскудны падарунак. У гэтую ноч усё было чорнае, чужое, варожае — таму і вецер, чулася, быў іхны, не свой, і прыляцеў ён сюды з бяздоннае цемры (з мокрых сцюдзёных палёў) не іначай затым, каб сваім лютым шалам ускалапуць, узбучыць мора злавеснай трывогі, застойна звеслае над сялом.

Камісар адчыніў фортку і выйшаў на вуліцу.

Скрозь лямант ветру гукі страляніны прабіваліся глуха і няпэўна. Не згадаць было, ці далёка-далёка аднеслася крывавая мяжа, ці мо вось тут блізка, пад самым сялом, здрадліва прытулілася чорная небяспека.

Па вуліцах ужо віхравала трывожная сумятня. Стаялі абозы, гатовыя да адступленія,— нецярпліва порскалі коні, дакучна рыпалі, сморгаючыся па месцы, вазы, мокра пляскаліся ў цемры, у ветры азызлыя галасы абозпікаў. З жвавым пярэклікам прабеглі паўз плот тэлефаністы — прапішчэла жаласна і працавіта шпулька, на якую намотваліся правады. Недзе далёка (а мо і блізка) нехта з трагічнай настойпасцю некага клікаў.

Толькі што ў штабе атрымалі загад з дывізіі — адступіць. Штаб палка ўжо цалком звінуўся і чакаў трэцяе ро-

ты, якая ішла ў рэзерв,— разам з ёй мела адыходзіць штабная каманда.

Камісар дайшоў амаль што да краю сяла і нарэшце пачуў паміж узвываў ветру далёкі (а мо і блізкі зусім?) перабор хлопкіх уцісклівых крокаў. І адразу ж, над самым вухам, выбухнулі парваныя галасы.

Ён спыніўся.

— Камандзір трэцяе роты!

— Слухаю, таварыш камісар!.. Рота... стой!..

Нешта бязладна целяпнулася ў цемры і змоўкла. Дымнай плямай вызначылася непамерна вялікая постаць камандзіра роты.

— Ну, што?

— Дазвольце далажыць, таварыш камісар. Згодна загаду, з'явіўся да штаба палка. Белыя наступаюць і неўзабаве павінны быць тут.

— Як рота?

Камандзір адказаў з жорсткай нялюдскай сур'ёзнасцю (на вачах у смерці родзіцца гэта сур'ёзнасць):

— Пяцьдзесят сем чалавек пакінулі строй... Рэшта — змардаваныя да краю. Але ў прыгодзе рота яшчэ здолее паказаць сваю баявітасць.

— Добра. Штаб палка на тым канцы вёскі. Скажэце таварышу камандзіру, каб чакалі мяне за сялом.

— Слухаю!

Камісар вярнуўся назад, на сярэдзіну сяла, і ўвайшоў у хату з зырка асветленымі вокнамі.

Тут усё было напагатове. Сакратар ў ноўным страі сядзеў на скрыні сакрэтных папер і з хаплівай паспешнасцю (быццам не ўправіцца) курыў сваю люльку. Ля парога стаяў веставы — з вінтоўкаю за плячыма.

А на стале, пад старадаўнай вісучай лямпай яшчэ ў бяспечным спакоі ляжала разгорнутая карта ваенных дзеянняў, і на ёй самотна стыла забытая шклянка гарбаты.

Камісар загадаў:

— Таварыш сакратар! Зараз мы выступаем. З усім сваім барахлом ідзіце да начальніка штаба...

Потым — вестаўому:

— Вы паедзеце разам з ім і, як усё там будзе гатова, прыскачаце да мяне.

— Слухаю...

Камісар астаўся адзін. Колькі хвілін задуменна сігаў па пакоі, потым, нібы ўспомніўшы што, схаяпнуўся і падышоў да стала. На карце шпількамі адзначана была лінія

фронту. Камісар сеў за стол, машынальна выпіў сцюдзёную гарбату (бо замінала) і ўдаўся ў розгляды стратэгічных планаў.

На дварэ варожы вецер завінаўся штораз з большай лютасцю і нахабствам. Ён гадзюкай віўся навокал хаты, у бяссільнай злосці грыз мокрыя вуглы, драў на страсе салому і выў, як падбіты сабака.

А ў хаце стаяла зусім лагодная, зусім далёкая ад вайны, ад завірухі ціша.

Вецер прынёс і ўціхнуў у хату глухое зазыўнае іржанне. Гэта конь — верны таварыш — настойна клікаў свайго гаспадара.

Камісар не пачуў. Сядзеў — нерухомы, акамянелы, цалкам углыбіўшыся ў свае думкі. І толькі раптоўная цішыня за акном (на момант адляцеў некуды ці мо змоўк, знясілены, вецер) абудзіла яго.

Ён прыслухаўся. У гэтым неспадзяваным зацішшы не чуваць было абыклых гукаў паходнага мятушэння. Мабыць, штаб цалкам ужо выбраўся за сяло.

— Чаму ж няма вестаўога?

І нібы ў адказ яму раптам выбіўся за сцяной конскі тупат. (Не адзін конь, а некалькі — мабыць, нехта прыехаў яшчэ з вестаўым.)

Загрукатала ў сенцах. Камісар з чаканнем глядзеў на дзверы. І дзверы расчыніліся — ураз, адным рэзкім парыўчатым махам. І ў напята расчыненых дзвярах (таксама ўраз, адным махам) выраслі тры вінтоўкі і тры ў чужой форме салдаты. Вінтоўкі з дзікай выразнасцю глядзелі ў яго чорнымі рулямі.

— Рукі ўгору!..

Камісар хапянуўся быў за кабуру, але суняўся (што ён можа зрабіць?). І рук не падняў — сядзеў у той паставе, у якой заспелі яго.

Потым — штурхаючы, тузаючы — павялі яго ў штаб.

— Камісара спаймалі!

І рагаталі, і здзекаваліся з яго, хто толькі хацеў.

Далажылі камандзіру, і да яго выйшаў афіцэр — голены, белы, з вострымі ўсмешлівымі вачмі, з чмарай радзімкай над левым брывом. Афіцэр падступіў да яго блізка-блізка і з топкай усмешкай (колькі было ў ёй атруты!) кінуў у твар яму:

— Падлюга! Балышавіцкая погань! Свіння!..

Камісар ведаў, што будзе, і хацеў, каб было скарэй.

Таму ён з маўклівай спакойнасцю плюнуў у вострыя ўсмешлівыя афіцэравы вочы.

Афіцэр — ашалелы, дзікі — выхапіў з кабуры наган. Але не страляў. Ён біў яго перш ручкай нагана, а потым кінуў наган і, як звер, уцупіўся ў яго кіпцюрамі.

Камісара не стралялі адразу. Колькі гадзін давялося яму прасядзець з іншымі палоннымі ў цёмным халодным свірне. Там упацёмку па голасе пазнаў яго веставы і расказаў, як злавілі яго, калі ён ехаў далажыць свайму камісару, што ўсё гатова да адыходу.

А пад ранне перайшлі ў наступленне чырвоныя, адбілі тое сяло — прайшла доўгая, як вечнасць хвіліна. Яна мулкім ражном захрасла ў пакоі, да болю напнула людскія пачуцці, скруціла іх у адно палкае, пясцерпнае чаканне. На задніх лавах пачала падымацца публіка. Па ўсім пакоі пайшоў перабойнымі хвалямі нервовы напружаны шопат.

Тады Мікола Кастроў моўчкі завярпуўся і пайшоў ад стала, панура схіліўшыся над цяжарам свайго маўклівага прыгавору.

ПРА ДЗЕДА АЛЬПІНА

Пакуль старшыня сельсавета чытаў пастанову, дзед Альпін звонку трымаўся спакойна і важна. Яго буйны мясёны твар быў скамянеўшы, у строгаї пахмурасці быццам стаяў ён пры нейкай урачыстай адправе. І толькі тады, як, скончыўшы чытанне, зірнуў на яго старшыня шырока і ўсмешліва (ну, што скажаш на гэта, мілы дзядок?), твар у яго сударгава смаргануўся, часта заміргалі павекі і ўсёй сваёй карабатаї фігурай памкнуўся ён да гэтага несусветнага злосніка. Адылі стрэў у старшынёвых вачах вельмі выразны агоньчык і ўраз суняўся.

(У пастанове было: за злачынны продаж жывёлы, за сістэматычную агітацыю супроць калгаснага будаўніцтва, за няправільны, ашуканскі разлік з парабкамі ды іншае — адабраць у кулака такога-та ўвесь жывы і мёртвы інвентар, а таксама спагнаць з яго трыста рублёў грашыма.)

Дзед Альпін, згубіўшы сваю станавітасць, беспарадна азірнуўся навокал (паразышліся ўсе чыста, адзін ён ды ўнук Амелька ў дварэ) і зачаў бажыцца, зачаў хрысціцца.

— Як свят бог... Каб я так дыхаў... Бярыце ўсё, бярыце коні, каровы... Вашая ўлада, вашая сіла... Грошай няма... ані капеечкі... Як свят бог...

І хапліва, разгублена махаў рукою ў той бок, дзе ў змрочным брудным кутку вісела чарада закапцелых багоў. А калі старшыня следам за ягонымі рухамі перавёў вочы і пільна ўгледзеўся ў боскі прытулак, дзедава рука дзергануласа і спынілася на паўдарозе. З падазронай паспешлівасцю дзед пачаў торкаць рукамі ў хатнія рэчы.

— Нічога няма, таварышы родныя... нічым-чагепечка... Гэта ж — смецце... гэта ж — ламаччо... Каб што прадаць, дык — анічогачка...

Старшыня сельсавета выпес з хаты таемную хітраватую ўсмешку на твары — дзед заўважыў яе і закалаціўся як асінавы ліст. Ці толькі сціхлі ў аддаленасці крокі ліхіх нечаканых гасцеї, ён зашчапіў на крук дзверы, з

трывожнай апаскаі зірнуў у акно і сцеражліва, на цыпках падышоў да абразоў. Куца перахрысціўся і трыятлівымі рукамі дастаў з заплечча ў святога Міколы шэры пыляны скрутак.

Пяцёхгадовы Амелька ўшершыню бачыў такога дзіўнага дзеда. Зашыўшыся ў глухі куточак, ён палахліва сачыў за дзедавымі рухамі і страшэнна дзівіўся, чаму так калоціцца дзед, калі ў хаце добра напалена і горача, як у лазні. А калі ўбачыў у дзеда ў руках шэры пыляны скрутак, ён і сам затросся ад пясцернай дзіцячай цікавасці і прагавіта ўпіўся вочкамі ў таемны прадмет. Ледзьве дачакаўшыся, пакуль выйшаў дзед з хаты і пакуль ляпнулі за ім надворныя дзверы, ён спрытным мышаняткам цмыгнуў у сенцы і прыліп да шчэлкі, праз якую відаць было, што дзеецца на двары.

Ён бачыў, як з шалёнай паспешнасцю кідаўся дзед па двары, нікаў па ўсіх кутках, па ўсіх закавулках і ўсё прыціскаў да грудзей шэры таемны скрутак. Нарэшце ён спыніўся ля клеці, прыгнуўся долу і колькі хвілін поркаўся ў падмурку. Калі ж устаў і, боязна азірнуўшыся, павольным крокам падаўся да хатніх дзвярэй, рукі ў яго былі ўжо пустыя і млява, як пасля натужнай работы, целяпаліся па баках.

Амелька страпянуўся, маланкай скочыў у хату і зноў зашыўся ў свой глухі куточак.

* * *

Дзед Альпін увайшоў у хату спакойны і важны. Пад сівымі вусамі ў яго тулялася хітрая ўсмешка, а праз густыя павіслыя бровы прасяваліся агеньчыкі едкай зларадпасці.

Ён падышоў да акна і стаў перад ім нерухома — утаропіў у снегавую бялосць застылы погляд. У вачах тады згаслі агеньчыкі, сталі вочы цяжкія і плыткія (мабыць, успамінаў дзед даўнейшае, жалкаваў аб багацці, раскошы, аб моцным багатырскім жыцці). У гэты момант смаргануў посам са свайго кутка Амелька, і дзед здрыгануўся ад гэтага гуку, як ад раптоўнага ўдару. Але ўбачыў унука (быў забыўся зусім, што той у хаце), паклікаў яго да сябе і стаў лашчыць малога, рыпець старым караватым голасам:

— Чуў, Амелька, што злыдні казалі... Забяруць усё чыста... Жылі, набывалі, стараліся... на табе... спажывай... Дрэнна, галубок, ой, як дрэнна...

Галубок тупаў, круціўся і відочна цэліў даць лататы ад дзедавай ласкі. Нешта карцела яму, нешта рупіла — вочы ў яго бегалі, як мурашкі, і гарэлі агнём вострае нецярплівасці. Выбраўшы зручную хвіліну, ён спрытна вылузнуўся з дзедавых лоняў, мімаходзь ухапіў кажушок з шапкай і кумільгам пакаціўся за дзверы.

* * *

Дзедаў спакой цягнуўся нядоўга. Прашуравалі за акном нечыя важкія крокі, і ён здрыгануўся, як злоўлены злодзей, і, палахліва настаражыўшыся, чакаў, што во-во нехта ўвойдзе, нехта пратне яго навылёт страшным праніклівым поглядам і ўбачыць усё і аб усім дазнаецца.

Потым зазвінелі на вуліцы дзіцячыя галасы, уляцелі ў хату і шчамялямі закруціліся над яго галавой — дакучна, назолліва. Сярод іх вылучаўся тонкі галасёнак унука Амелькі і чамусьці асабліва яго пепакоіў. Нейкі час дзед падазрона прыслухваўся да дзіцячага клуму (аб чым яны там стрыкочуць?), але не разабраў нічагутка і не ўрымсціў — схапіў шапку ды ў незразумелай трывозе выбег на вуліцу.

Дзед Альпін убачыў там во што.

Ля варот таўклася цэлая купа дзяцьвішча. Абшарпаныя хлапчаняты крычалі, тузаліся, коўзаліся нагамі ў расцярушаным снезе і рвалі з рук адзін у аднаго шэры пыляны скрутак. Дзе-хто трымаў у руках жоўтыя бліскучыя кружэлачкі, некалькі гэткіх кружэлачак рассыпаны былі навакол і дзіўпа, нязвыкла гарэлі агнёвымі кроплямі на халоднай бялосці снега.

Дзед Альпін стаў страшны. Мясёны твар яго пабраўся грубымі пукатымі складкамі, і сівое валоссе ўзнялося дзіка натапыранай шчэццю. З крывавым агнём у вачах, з драпежна выцягнутымі рукамі кінуўся ёп на дзяцей.

З самага путра ў яго вырваўся жудасны нечалавечы рык.

Дзеці ўзнялі шалёны лямант, шумархнуліся хто куды, і ля варот астаўся стаяць адзін Амелька. Ён нязграбна трымаў у адной руцэ развязаны шэры мяшок, а другую, з жоўтай кружэлачкай, працягваў насустрэчу дзеду і віпавата ўсміхаўся.

— Цацачкі... Жоўтыя цацачкі...

Дзед з разгону рынуўся долу, у расцярушаны снег, накрыўшы сваім карчаватым тулавам рассыпанае золата.

Аднак, падаючы, ён не забыўся ўхапіцца за крысо Амелькавага кажушка і моцна трымаў яго сударгава сашчэмленымі пальцамі. Колькі секунд ён так і ляжаў, раздвоены гневам і сквапнасцю. Адылі гнеў перамог: адарваўшыся ад золата, дзед зверам кінуўся на Амельку (на збянтэжанага, асалапелага) і касцянымі кручам-рукамі ўцупіўся ў шыю дзіцяці.

Смяротнае хрыпенне ўнука перамяшалася з звярыным дзедавым рыкам. А тады — ударыў раптам, як гром, як страшэнны выбух, спакойны і цвёрды голас:

— Кінь, дзед... Не руш...

Дзедавы кручча-рукі самі па сабе разышліся — ён выпусціў унука і ўжо з крыкам бязмежнае роспачы паваліўся зноў на сваё золата.

* * *

Дзед Альпін поўзаў раскірэкай па снегу і недалужна грабаў дрыжачымі рукамі. Унук Амелька, лежачы тварам угору, ціха плакаў ад болю ды крыўды і з глыбокім неўразуменнем глядзеў у шэрае неба. А над дзедам стаяў старшыня сельсавета, варушыў мыском чаравіка жоўтыя кружэлачкі ў снезе, моўчкі ківаў галавой і ўсміхаўся.

ПАРАСЯ

Галоўны герой гэтага апавядання — Марына Карпава Перагуд, грамадзянка вёскі Парэнджы, сябра калгаса «Сцяг Перамогі» — мела ў жыцці сваім мала выдатнага, калі не лічыць трох здарэнняў, якія, мабыць, у нейкай меры вылучаюць яе з агульнае грамады жанчын памянёнае вёскі.

Першае здарэнне напаткала Марыну, калі яна была яшчэ Марынка і нават не ўмела хадзіць: тады ёй, пакінутай без дагляду бабылькаю-маткай, рабая суседава свіння пажавала была мезіны пальчык. Яго потым старанна лячылі ўсімі выпрабаванымі сродкамі: прыкладалі павучыннe, курылі портам, прысыпалі чырваточынай, чыстай зямелькай. А скончыў лячэнне мясцовы лекар, адняўшы мезіны пальчык разам з выразпа азначанаю гапгрэнай.

Марынка не помніла гэтага выпадку, але ў яе на доўгі час асталося было інстынктыўнае пачуццё страху і недавер'я да мілых, з выгляду такіх дабрадушных і ласкавых дзюшак. Гэтае пачуццё знікла толькі тады, як пастуціла Марына (ужо Марына, а не Марынка) на службу да добрага, заможнага, усімі паважанага гаспадара Язэпа Шпулькі. А як пачаў жыць з ёй (праўда, што не па закону, але сумленна і з любасцю) Шпулькаў сын, у яе нават з'явілася да дзюшак цёплая гаспадарская прыязпасць, і яна ўжо з чыста сваяцкай ласкаі чухала іх тлустыя цяжкія бакі.

На гэтым этапе спасцігнула Марыну другое выдатпае ў яе жыцці здарэнне: Шпулька з сынам парэшце дапалі таго патрэбнага закону і — прагпалі Марыну.

Ідучы ў свет, Марына доўга плакала горкімі слязьмі, а пасля кінула плакаць, сашчаміла зубы, сказала:

— Свінні!

І шчыльней захінула ў палу прыжытае з Шпулькавым сынам дзіця.

Што да трэцяга здарэння, дык яно можа прытраніцца ў жыцці кожнай жанчыны, якая ў балючай журбе прагне якога-небудзь, хоць малепькага, хоць скупога зусім спацяшэння. Адным словам — апрача бялявага Сымонкі, у Марыны з'явілася яшчэ чарнявая Манька.

Вось тут і ўсё выдатнае ў мінулым жыцці Марыны Карпавай Перагуд, грамадзянкі вёскі Парэнджы, сябра калгаса «Сцяг Перамогі».

Бадай штодня ўранні, калі ўсе насельнікі свінчага царства, чакаючы першае порцыі паранкі, узнімалі дружны вясёлы скогат (ніхто так усмак не паскаголіць, як здаровая галодная свіння),— у гэтую пару, зазвычай, ідучы на працу, заходзіў сюды старшыня калгаса Нічыпар Крук. Марына Карпава Перагуд сустракала яго прыблізна з такім пачуццём, з якім спраўны камандзір батальёна сустракае ў даручанай яму часці камандзіра палка. Яна прымала заклапочана-строгі выгляд, яшчэ вышэй і ямчэй падтыкала саматканую спадніцу і з памагачымі сваімі гаварыла ціха, але з адпаведным націскам.

Старшыня Нічыпар Крук лічыў калгасны свінушнік за аснову далейшага росквіту ўсяе калгаснае гаспадаркі — Марына адчувала гэта, была гэтым надзвычайна здаволена і гатова была пемаведама што зрабіць, абы спраўдзіць ускладзенае на яе грамадскае давер'е.

Свінні, не перастаючы скаголіць, праводзілі іх пачцівымі, але разам з тым і хітраватымі позіркамі. Іншыя цяжка ўзнімаліся на ногі, іншыя ўскаквалі перадам на дзверы свайго катушка, высувалі ў шчэлачку рыла і вішчэлі з асаблівай, нават ліслівай троху, стараннасцю.

Падыходзячы да канца свінушніка, Нічыпар Крук сунімаў ход і гаварыў расцяжліва, з летуценнай усмешкай:

— Ану-тку, як наш эксперыментальны?

І яны колькі хвілін стаялі перад маленькім катушком, дзе мітусіўся, як срэбная плотачка ў чыстай вадзе, маленькі, беленькі, кірпаценькі парсючок: яго гадавалі па асаблівай методзе, вынайдзенай мясцовым аграномам.

Памацаўшы на развітанне мокры парсючкоў пятачок, Нічыпар Крук, здаволены, выходзіў з свінушніка. Мары-

на праводзіла яго, пасля зноў варочалася да свайго аблюбеніца і, занядбаўшы ўсю сваю камандзірскую строгасць, доўга глядзела на яго з цёплым матчынскім замілаваннем.

А то дык залучаў у калгасны свінушнік сярэдняга веку ўдавец, жыхар тэй жа вёскі Парэнджы Хомачка Гэрцык. Ён спачатку чмыхаў троху сваімі тоненькімі, падхутраванымі рудымі вусікамі, носам, адылі зухавата запальваў папяросу (папяросу, не іначай!) і падыходзіў да Марыны абсалютна як кавалер.

Хомачку Марына сустракала з большай інтымнасцю. Яна выпускала з катуха якога-небудзь найбольш спакойнага вепрука, клала яго на бок і пяшчотна гладзіла яго ружовы жывот, какетліва ўнікаючы Хомачкавага погляду. Хомачка з жывым апетытам узіраўся ў пышныя кумпякі вепрука і з гэткім жа апетытам пераводзіў позірк на яшчэ досыць свежую фігуру Марыны. Пад левым вусікам у яго трымцела вясёленькая ўсмешачка, ён неўзаметку — гусачком — падступаў да Марыны і асцярожна, нібы баяўся, каб не апячыся, лэпаў яе па баку.

Марына адпіхала яго локцем без асаблівае злосці.

Бялявы Сымонка часам цікавіўся:

— Мамка! Гэта нашы дзюшкі?

— Нашыя, дзеткі, калгасныя.

— Усіхныя?

— Усіхныя, дзеткі.

Ён на момант задумляўся.

— І дзядзькавага Сцёпкі?

— І дзядзькавага Сцёпкі.

— І Волькі дзядзькавае?

— І Волькі.

— І Петрыка Грышчанкавых?

— І Петрыка.

— І Аўгена Дразда?

— І Аўгена.

Сымонка зноў задумляўся і потым пытаўся ўжо з відавочным сумненнем:

— І спірміцтальны ўсіхны?

— Усіхны.

Тут Сымонка ўжо задумляўся глыбей і думаў датуль,

пакуль не знаходзіў формулу азначэння своеасаблівае блізкасці да «спірміітальнага»:

— А толькі я намагаю табе даглядаць яго. Праўда, мамка?

— Праўда, сынок, праўда, любы...

І бялявы Сымонка канчаў гутарку агульнай заўвагай:

— Я люблю дзюшак. Дзюшкі добрыя...

Марына пагадліва ўсміхалася і неўзаметку кідала погляд на сваю левую куксу.

Папраўдзе, гэтая кукса ўжо ані-пі не засмучае Марыну. Яна нават дае ёй нейкае дзівоснае заспакаенне.

Так глядзіць на лёгкую драпінку на сваім целе чалавек, які выбавіўся з смяротнае небяспекі.

Ну, ці ж гэта старая жанчына — у трыццаць пяць год? Іншая каторая, дайце рады, яшчэ такога палу запаліць, што і дзяўчына таго не дакажа!

А чым дрэнны, скажам, хоць і пажылы троху, але зусім дзябёлы яшчэ ўдавец Хомачка Гэрцык?

Марына нікому не кажа пра гэта, але ў тую часіну, як прыходзіць да яе Хомачка Гэрцык і як потым ён ласым вокам азірае яе круглявую фігуру, яна адчувае ўсё-ткі хоць мо і не зусім бурную (дзе там!), але досыць вострую і салодкую бабскую непакойнасць. І нават, шчыра сказаўшы, яна сама чакае, калі ён, нарэшце, падкрадзецца да яе і раптам праявіць сваю асцярожную мужчынскую ласку.

Дый што там? Дзеці дарослыя, а ў яго і зусім не асталося нічога ад першае жонкі. Адным словам — у вольную часам гадзіну, адышоўшыся ад абыдзенпага тлуму, чаму не падумаць цішком пра, можа, і дурную, але ж зусім бязавадную ўцеху!

Так вось і падышло. Як прыйшоў быў неяк пад вечар да Марыны Хомачка Гэрцык ды яшчэ з сваім сябруком Арсепам Даўгім, ды яшчэ абое вясёлыя, пад невялічкай чаркай — Марына сэрцам пачула, што гэта ўжо нібы тыя даўпеійшыя заручыны,— і радасна здрыгапулася.

...Але ж трапіцца часам такое ў жыцці, што во-во ўжо, здаецца, звяжаш, скруціш каляныя пруткія галіны, аж раптам — трах? — парвалася лычка, і паляцелі куды каторая...

Мужчыны паставілі на стол паўлітра. Тады Марына схапянулася, што не мае чаго закусіць, і хацела ўжо бегчы куды пазычаць, але Хомачка суняў яе велічна-шырокім жэстам, разам з тым управіўшыся ёмка падмігнуць Арсену.

— Наша гарэлка, дык і наша закуска. Мы самі сабе гаспадары! Праз дзесяць хвілін я буду тут.

І ён выйшаў. Услед яму Арсен (змова была ў іх, няйначай!) паслаў вельмі загадкавы сказ:

— І жораў нізка, і стрэльба блізка...

Ды хітра-хітра ўсміхнуўся.

Марына была ўжо занепакоілася, адылі ўсміхнулася сама сабе (можа, жарт які надумалі?) і завяла з гасцём вясёлую гутарку.

І вось, папраўдзе, праз дзесяць хвілін, не болей, гонкім махам расчыняюцца дзверы, уваходзіць вясёлы, давольны сваёй удачай Хомачка і ўрачыста, як рыцар перад сваёй дамаі, кладзе перад Марынай яшчэ цёпленькага зусім парася.

Вось тут акурат і парвалася лычка...

У гэтым беленькім сыценькім парасяці, якое шырока, нібы смеючыся, шчэрыла белыя малочныя зубкі, Марына пазнала свайго аблюбенца, свайго пестуна — «эксперыментальнага» парсючка.

Яна аслупянела. Усё, што было ў жыцці ў яе: і гордая здаволенасць працы, і адказнасць перад калектывам, і радасць новага бязгорнага існавання,— усё яно неяк несвядома злучылася, было для яе ў гэтым маленькім парасяці. І ёй здалося цяпер, што, забіўшы парася, Хомачка хацеў адабраць у яе ўсё тое, чым урасла яна — бабылка, бяздомніца — у людскую працоўную грамаду.

Яна шукала слоў, каб неяк выказаць сваё пачуццё, і знайшла толькі адно, Сымопкава:

— Гэта — усіхнае... усіхнае...

Хомачка бязглузда пілаваў п'янаватымі вачмі і, фігурна водзячы рукой у паветры, тлумачыў:

— Гэта жарт, Марына Карпаўна, просты жарт... Я адкуплю, канечна... Я заўтра сваё прынясу... Безумоўна... Мы самі сабе гаспадары, Марына Карпаўна...

Тады Марына Карпаўна падышла да яго — страшная ў сваёй раптоўнай злосці, і з сакавітаі выразнасцю адчыкрыжыла:

— Свіння!

І нават не трэба было кідаць ёй адпаведнага позірку ў качарэжнік, каб Хомачка і так зразумеў, што яго жаніхоўскі візіт скончаны.

Ну, ці ж гэта старая жанчына — у трыццаць пяць год? Іншая каторая, дайце рады, яшчэ такога палу запаліць, што і дзяўчына таго не дакажа!

...Але ад тої пары сярэдняга веку ўдавец Хомачка Гэрцык у калгасны свінушнік не патыкаўся.

ПАЧАТАК ШЧАСЦЯ

1

І вось пайшла Галенка на рэчку плацце праць.

Ішла Галенка паволі, зважна, ёмка наспрунжыніўшы стан пад цяжарам каромысла. Гэты цяжар дзівосным чынам надаваў ёй лёгкасці і радаспага спакою: яна хоць трошачку, хоць адным куточкам свайго сэрца чула сябе праўдзіваю жонкаю і гаспадыняю. Каромысел быў лёгкі, але Галенцы ён без меры цяжкі, бо яна хацела гэтага.

На рэчцы плаваў, куляўся густымі камлыгамі халодны белы туман. Быў ён нечаканы і недарэчны ў агульнай яснасці надвячорка, і таму здавалася, што ўвесь гэты восеньскі холад, усю гэту сцюжу прынёс ён, стары ды такі гарэзны туман. І вада сцюдзёная — аж пячэцца — таму, што плыве з-пад яго ледзяной барады.

Галенка, яшчэ не здымаючы з плеч каромысла, ступіла босай нагой у празрыстую плынь і ўраз адхапілася, здрыганулушыся ўсім целам. Тады, нібы раздражненая гэтым калючым дотыкам сцюдзёнай вады, рашуча скінула з плеч бялізну, падаткнула высока спадніцу і, шумна шчубоўкаючы нагамі, увайшла да кален у раку.

Звонкі размашысты гук праніка канчаткова разбадзёрыў Галенку, узнёс яе ў нейкай, але дужа вострай радасці. І біла яна ім, як сілы хапала, гонка напружваючы ўсё сваё маладое, дужае цела, радая, што пастойны голас яе працы разлягаецца ва ўсе бакі, на ўсю ваколіцу. Пранік, вядомая рэч, разумеў і падзяляў Галенчын настрой, і выбіваў ён сваімі ёмкімі ўдарамі, безумоўна, тое, чым жыла Галенка і што павінен быў ведаць цэлы свет.

— Гэй, чуеце, людзі, вы, недарэкі!.. У Галенкі ёсць добры, прыгожы, разумны малады муж, а Галенка — спраўная, працавітая жонка і гаспадыня!.. Пэўна, што так! Бачыце, як яна спрытна завіхаецца каля плацця, як стараецца, каб дагадзіць свайму любаму мужыку!..

Раптам Галенка супынілася, і пранік недалужна звіс у яе ў руцэ. Па беразе, над яе бок, гнала карову яе матка.

Галепка спалохалася, убачыўшы матку, і зараз жа засаромелася свайго мімавольнага страху. Гэта ж, напраўдзе, сорам — баяцца сустрэчы з маткаі!

Хмуры дзень запляміў Галеччын настрой.

— Дачушка! Каб не застудзілася ты, маё дзетухна. Гэткі холад!

— Дармо, мамка, я не баюся...

Матка глядзіць на дачку з балючаі спагадаі, і дачцэ баліць ад гэтага, і з доччынаі любасцю да маткі сплятаецца дрэнная ўпартая злосць.

«Што яна да мяне мае?»

Матка пераводзіць погляд на Галеччына плаццё — тоі самы ціхі спагадлівы погляд. У вадзе наскудпаі шмоткаі боўтаецца сарочка — на сарочцы памiж рубцоў ды лапікаў — вялізная незашытая дзірка. Мо яе ўжо і зашыць, дык рады не дасі?

Матка ўздыхае.

— Ах-ха-ха!.. Калі тое жыццё настане? Абнасіліся, абшарпаліся... Дзетухна маё любае...

І пагпала далей карову, з старэчаі павольнасцю махаючы даўгім рабраватым дубцом.

Галенка глядзіць ёй услед, занядбаўшы работу, твар у яе спахмурнеў і вочы наліліся слязьмі. Свежы ветрык прыляцеў з пагаслых даляў і зняцейкі хапіў яе за голыя мокрыя ногі. Яна закусіла губу і, праглынуўшы слёзы, нагура схілілася над дзіраваі сарочкаі.

На раку асядаў ужо непрытульны халодны змрок.

2

Л чый жа лён над балотам?
Заросшы ён увесь травою,
Увесь травою-лебядою,
Макрыцаю, павіліцаю...

На гарэ за рэчкаю, за кудлатым густым хмызняком, калгасныя дзеўкі палолі лён. Гэта было ўлетку, у чэрвені месяцы. На жаўтлява-зялёным празрыстым фоне маладога лёну буйнымі сінімі зоркамі красавалі васількі.

...Ці ёсць што прыгажэйшае ад гэтага мяккага, бязмежнага лірычнага злучэння фарбаў: сіпія-сіпія васількі ў кволым жаўтлява-зялёным лёне?

(Васількі трэба, полячы, рваць, бо гэта благое зелле.)

Галенка тады палола лён з калгаспымі дзеўкамі. Калгас іхпі бадаі што цалкам пераішоў на тэхнічныя куль-

туры — у самы прыпар поліва не хапала працоўных рук, дык наймалі.

Працаваць гуртам было весела, а калі дзеўкі вясёлыя, дык яны знойдуць хто якую прычэпку, абы шчыра і гучна на ўсё поле рагатаць, вішчэць, выкрыкваць раптоўныя з путра нестраможным імпэтам прыпеўкі.

Ой, як слаўна, як радасна працавалася тады Галепцы!

Апаўдні залучыў быў да іх старшыня і яшчэ з ім адзін — высокі, чорны, з каротка надстрыжанымі смешнымі вусікамі. Яны раптам вылезлі на іх з хмызняку, і крайняя ад кустоў дзяўчына ў наўмысным спалоху адшаснулася ўбок.

— Авой, цыган! Яй-богу, цыган!..

Дзеўкі ўзнялі несусветны вэрхал.

— Цыган! Цыган!

А суседка Галепчына штурхнула яе над бок і шапарнула на вуха:

— Прыгожы, па яго ліха!

І Галенцы прыкра было чамусьці, што дзеўкі смяюцца з гэтага прыгожага мужчыны. Яна дасадліва зморшчыла лоб і сярдзітым вокам узіралася ў незнаёмага чалавека.

А «цыган» — нібыта што — спакойна падышоў да дзявочае гурмы і запытаў неспадзявана ціхім, прыветлівым голасам:

— Ну, як, дзяўчаткі, працуецца, га? Чысты лён які, ай-я-я! Тут жа й палоць няма чаго!..

Дзеўкі накінуліся на яго дружнай навалай.

— А ты паспрабуй, дык пазнаеш, ці ёсць што, ці няма чаго.

«Цыган» завёўся з дзяўчатамі ў жартаўлівую звадку, а Галенка стаяла ўбаку і са злосці кусала вусны: па-першае, чаго яны чэпяцца да яго асою, а па-другое, ці ж яму вочы павырвала, што ён і зірку не кіне на яе, калі яна — хоць у каго папытай — найпрыгажэйшая дзеўка з цэлае вёскі!

Тым часам старшыня калгаса трохи ўрачыста, як так і належыць у гэтых выпадках, зарэкамендаваў чорнага прыгожага мужчыну:

— Гэта, дзяўчаткі, новы старшыня калгасу. На маё месца... Бо я выязджаю ў раён...

Дзяўчаты пацішэлі і ўзіраліся ўжо ў «цыгана» з пэўнай цікавасцю.

Старшыня калгаса дадаў:

— Таварыш Доба.

І таварыш Доба, троху замяўшыся, дасадліва махнуў на яго:

— Бінэ! Бінэ!..

З гэтага дазналіся ўсе, што новы старшыня калгаса так, папраўдзе, хоць мо і не цыган, але ўсё роўна «не наскі».

На адыходзе Доба звярнуў увагу і на Галенку. Праходзячы паўз яе, ён супяўся і апёк яе вельмі выразлівым зіркам чорных вачэй.

— Замарылася?

— Дзе там! На гэтым не зморышся... Ды яшчэ ў гэткай талацэ... Весела!

І яна какетлівай усмешкай падкрэсліла гэтае «весела».

— Даўно ў калгасе?

— Яшчэ не... Пакуль што не ў калгасе...

І Галенка раптам пачырванела.

Упершыню адчула яна прыкры балючы сорам за тое, што яна дасюль яшчэ не ў калгасе. І сама сабе дзівавала: ці ж яна адна толькі гэткая? Ці мала хто яшчэ па паасобку застаўся?

Каб зацяць свой дзіўны незразумелы сорам, яна крыкнула звонка да таварышак:

— Дзеўкі! Чаго пасталі! Старшыня новы злуецца!

Доба глядзеў на яе з спагадлівай ласкай.

— Трэба, дзяўчына, у калгас паступаць. У калгасе лепш... Весялей...

І, мнагазначна ўсміхнуўшыся на развітанне, знік у кустах, пакінуўшы Галенку разгубленую, збянтэжаную і злосную.

...Ці думала тады Галенка, што праз якіх тыдні са два гэты чорны прыгожы мужчына будзе ёй проста Касцюком, а не дык і зусім Касцючком, што гэтыя смяшныя падстрыжаныя вусікі будуць поўзаць, як жукі, па яе распаленым твары і так соладка яго ласкатаць?

3

Ён прыходзіў позна ўвечары ў іхні маленькі прытульны садок і чакаў яе пад павіслым веццем старой яблыні.

Ён заўсёды прыходзіў ушчэнт змардаваны бясконцымі турботамі калгаснага дня і з глыбокаю асалодаї адпачываў, паклаўшы ёй на калені сваю калматую галаву.

Яна, працятая повай незазпанай дасюль пяшчотнасцю, церабіла жорсткія яго валасы і чакала ад яго нейкіх нечувана салодкіх слоў. Ён доўга моўчкі ляжаў, упяўшы шырока расплюшчаныя вочы ў зорнае неба, а тады раптам азываўся:

— Галенка! Колькі гэта чатыры разы па трыццаць сем?

Галенка вылічыла, шэпчучы лічбы, як старанная вучаніца.

— Здаецца, што будзе сто сорак восем.

— Бінэ! За чатыры дні мы скончым палоць. Галенка! А якое заўтра будзе надвор'е?

Галенка ўважна ўзіралася ў чыстае зорнае неба і ўжо з відавочным падступствам запэўняла:

— Не іначай, як будзе дождж.

Ён дасадліва торгаў галавой.

— Што, дождж? Драку! Нам не трэба дажджу!

Касцюк Доба ад свае роднае мовы, якою, мабыць, не гаварыў ён праз дзесяць ці болей год, пакінуў сабе гэтыя два словы: «бінэ» і «драку» і трымаўся іх з пязменнай упартасцю. Першае азначала «добра», а другое — «чорт».

Неяк раз тлумачыў Доба Галенцы:

— Я не цыган, я малдаванін. Мая краіна далёка адсюль на поўдзень. Там цёпла, расце вінаград, пшаніца, кукуруза. У нас многа вінаграду, кожны селянін сабе робіць некалькі бочак віна і п'е праз цэлы год, як ваду.

Галенцы больш да ўпадобы Касцюковы апавяданні пра дзівосную яго бацькаўшчыну, чымся нудныя разлікі працадзён, і яна з дзяцінай пазойлівасцю распытвае, як у іх там жывуць, якія ў іх там хаты, ці прыгожыя ў іх дзяўчаты і ва што яны апранаюцца, ці бываюць у іх ігрышчы, як яны жэняцца, ці гуляюць вяселлі. Асабліва моцнае ўражанне зрабіла было на яе Касцюкова апавяданне пра дзікі звычай, які дзе-нідзе яшчэ захаваўся ў іхняй краіне — выкрадаць сабе ў жонкі дзяўчыну. Галенка страшэнна ўпадабала гэты звычай і з таемнай зайздрасцю ўяўляла сабе, як было б добра, каб Касцюк украў яе ад бацькоў.

— Ці доўга ехаць да твае бацькаўшчыны?

— Да мае бацькаўшчыны цяпер не даедзеш: яна асталася за мяжой, над румынамі. Таму я і бадзяюся вось па свеце.

Ён на хвіліну задумваўся і раптам крычаў у зусім незразумелай Галенцы злосці:

— Драку! У мяне няма бацькаўшчыны! Мне ўсюды — бацькаўшчына!

Траплялася, што і засыпалі яны так: яна — прыхінуўшыся плячамі да старой каржакаватай яблыні, ён — паклаўшы галаву на яе цёплыя мяккія калені. А як зачынала зараць, прачыналіся рантам абое і глядзелі адно на адно з радасным здзіўленнем, нібы ўпершыню пазнавалі ся. Тады Галешка моцна прыціскала да сябе яго калматую галаву, быццам хацела затрымаць яго, адарваць ад гэтых вечных нялюбых турбот, што цалкам паглыналі істоту яго, не пакідаючы ў ёй жаднага месца для яе, для Галенкі.

І чаго яму гэтак старацца? Бач ты, старшыня калгаса, асэсар вялікі!..

4

Як аставаліся бацька з маткаю сам-насам, старая пачынала бубнець у качарэжшіку:

— Авоїі, нахаба! Знайшла сабе набрыдзь — цыгана паганага. Няма й людскага хлопца... Скруціць, збаламуціць, а тады — шукай ветру ў полі!.. Галеча дзіравая...

Бацька — мужык хітры, спрактыкаваны — трымаўся троху ігнакшае думкі.

— Ат! Хай пагуляе па маладых гадах. Хто гэта не гуляў пад сваю пару? А тым часам — чалавек не абыякі, начальства ўсё-такі... Мала што можа прытрапіцца цяперашнім светам... Дурпая ты, Тэкля!

Апошні аргумент гаварыўся тонам катэгарычным, Тэкля змаўкала, здзіўленая глыбокаї праніклівасцю свайго мужыка.

Галенка пра гэтыя гутаркі нічога не ведала, дый гэта мала яе абыходзіла. Яе турбавала іншае: яна чула, што з кожным днём, з кожпай гадзінаї ёй усё цяжэй і цяжэй робіцца жыць у родпаї сям'і. Пачалося гэта ад тае першае гутаркі з чорным прыгожым мужчынам, ад яе дзіўнага незразумелага сораму. Злосць, у якой пакіпуў быў яе Доба на лёне, трывала ў ёй тады праз цэлы дзень, а як прыйшла яна ўвечары дахаты, гэтая злосць, вядомая рэч, вылілася на старую матку.

— Ну, як, дачушка, рабілася там, у калгасе?

Дачушка ашчэрылася, як тхор.

— Лепей, чым тут, на гэтаї багатырскаї гаспадарцы.

Старая пакорна ўздыхнула.

— Як жывём ужо дык жывём. Хлеба кавалак ёсць, а ў кулакі яшчэ, дзякуй богу, не залічылі!..

Злосць Галепчыпа, адпак, не згасала, а яшчэ больш разгаралася.

— Як нелюдзь якая, усё роўна. Чысты сорам! Усе людзі смяюцца. Тодаркавы пайшлі, Міхалёнкі даўно ўжо ў калгасе, Матруніны падалі заяву...

Бацька слухаў усё гэта і маўчаў. Толькі як селі вячэраць, буркнуў нібы сам сабе:

— Можа б, ужо ў калгасе і павячэрала, ахвотніца наша?

Гэта быў ужо кульмінацыйны пункт. Галепка схапілася з лаўкі і хоць страшэнна хацела есці, усё роўна пабегла ў клець, дзе стаяў яе ложак, і паклалася спаць не вячэраўшы. Там убілася тварам у падушку і доўга плакала — троху з крыўды, а больш з нясцерпнага голаду.

Ад тае пары абрыдла Галенцы і родная хата, і родная гаспадарка, і далёкія самотныя палеткі, на якіх у беспрасветнай нудоце прапаўзла сёлета ёй зазвычаі вясёлая, як свята, жніўная пара.

Не спявала Галепка ядрапа-звонкіх жніўных песень, не віла вянкоў з сініх-сініх, як неба, васількоў. Прыходзіла дамоў знясілепая, змардаваная, быццам за траіх рабіла, а сапраўды, дык і таго не нажынала, што нажне іншая няўздольная баба. Прыйшоўшы дахаты, сядзела, насупіўшыся, як сава,— не крані, барані божа! — і адно чакала, каб хутчэй павячэраць ды ісці ў клець, а з клеці — у сад пад прытульнае вецце яблынькі.

Маці ўздыхала і бубніла сабе ў качарэжніку.

— Авой, цыганюга праклятый! Звёў дзеўку пашчэнт. Што гэта будзе? Што гэта будзе?

Адылі ў бязмежнай матчынай пакоры схілялася перад жорсткаю неабходнасцю і давала новы, больш лагодны кірупак сваёй буркатні:

— Ну, якая гэта дзеўка, крый божа! Не папрала сабе, не наткала. Няма з чым у людзі пайсці. Божухна-баюхна...

І, яшчэ раз глыбока ўздыхнуўшы, шаптала ледзь чутна:

— Дзетухна маё любае...

5

Здарылася гэта, як дажыналі ярыпу. І так яно выйшла раптоўна ды проста, што Галепка ніяк не магла ахамяпуцца і ніяк не магла ладу дайсці, ці гэта дужа ўжо скора насцела, ці, наадварот, цягнулася немаведама колькі, змардаваўшы яе, небараку, доўгім, прагным чаканнем.

Адным словам, Галенка выйшла замуж за старшыню калгаса, за «цыгана» Касцюка Добу.

Грэла тады паціху добрае, ласкавае восеньскае сонца, плавалі ў паветры срабрыстыя ніці павуціны, мяккія, кволыя, бяссільна адданыя свайму падзявольнаму лёту, а з-пад лесу патыхаў на Галенку лёгкі ветрык, прыносячы волкі пах грыбоў і згаслага вогнішча.

За гоняў трое ад Галенкі шырокім радном ласкалася ў сонцы спелая калгасная ярына. Там неўгамонным гудам гудзелі жняяркі і жвавай мурашкавай плоймай мітусіліся людзі. Галенка раз-пораз узіралася туды і, здавалася ёй, распазнавала сярод людзей знаёмую высокую фігуру. Агорнутая цяжкім смуткам, яна млява схілялася над сваёй самотнай постаццю і нехаця, ледзь не плачучы, скубла ўбогае збожжа. Адылі кінула зусім, выпрастала патруджаную сярэдзіну і, гледзячы туды, да тае жвавае грамады, завяла журботную, слязьмі прасычаную песню.

Мабыць, пазнаў яе песню Касцюк, бо, ідучы з поля — мог бы пайсці пацянькі, далёка абмінуўшы яе,— а то пайшоў узлессем, проста на яе паласу.

Галенка ў інстынктыўным парыванні схапілася за серп і ўдалася ў шчырую заўзятую працу. Яна і ў той бок не глядзела, адкуль ёп павінеп быў зараз прыйсці, яна ўдавала, што зусім яго не заўважыла.

Ёп падышоў і стаяў моўчкі. Глядзеў на яе, усміхаўся і высвістваў нейкі смешны птушыны напеў. Галенка, не кідаючы жаць, запытала:

— Што ты моўчкі стаіш, Касцюк? Скажы што-небудзь хаця...

— Дзень добры, Галенка! Як ты маешся?

Галенка выпрасталася, перакідаючы цераз руку пажатую жменю, і абліла яго светлай, сарамліва-какетлівай усмешкай.

— Дзякую. Замарылася, сярэдзіну ломіць, во...

І яна, нібы паказваючы, як у яе ломіць сярэдзіну, зрабіла рух, які спакусліва падкрэсліў пругкую стройнасць яе маладога цела.

— А ў пашых жней сярэдзіна не баліць. Нашы жнеі лепшыя...

— Дзіва, што лешпыя ў вас! На дрэпных вы і зірнуць не хочаце.

І яна зноў схілілася над сваёй постаццю. Доба падышоў і сеў перад ёй у няжаты авёс.

— Куды ты, мядзведзь!

— Дармо, Галенка, трэба ж мне на цябе паглядзець. Калі ты кончыш сваё жніво? Мы ўжо сёння дажнём, далібог...

Галенка смутным зіркам акінула сваю паласу.

— Ат, абрыдла мне ўсё... Адна ды адна... Мамка слабая, няможна ёй жаць...

— Чаму ты ў калгас не ідзеш?

Галенка раптам узлавалася.

— Як жа я ў калгас, калі бацькі не йдуць? Што я з імі зраблю?

— Не хочуць — не трэба. Ідзі адна.

Галенка толькі ўздыхнула і зноў узялася за серп. Як дажалася да Касцюка, ён схапіў яе за руку і ёмка пасадзіў да сябе ў авёс. Галенка піснула, адылі прыгарнулася да яго з відавочнай ахвотай. Ён абняў яе і загаварыў сцішаным ад узрушэння голасам:

— Помніш, Галенка, як у нас жэняцца, га? Вось так схопяць дзяўчыну ў бярэмя дый ходу... га? Ці хацела б, Галенка, каб я цябе ўкраў? Пойдзеш са мной у калгас, і бацькі нам не трэба будуць... І сярэдзіна не будзе балець. Ну, як, згодна?

Галенка зірнула на яго шырока расплюшчанымі вачмі, з якіх плыло цэлае мора розных пачуццяў: там была і радасць, і недавер'е, і страх, і падзея, і каханне, і смутак, і яшчэ немаведама што.

— Ты, Касцючок... ты хочаш, каб замуж?.. я?.. за цябе?..

Касцюк засмяяўся і папоўз ёй па шчацэ ласкатлівымі сваімі вусікамі, дабіраючыся да вуспаў.

— Ты, Касцючок... гэта сур'ёзна?

І яна нават адхіліла яго ад сябе, каб прасцей і глыбей зазірнуць яму ў вочы.

— Ну, што ты, Галенка! Пэўна, што сур'ёзна. Ну, бішэ?

Далей былі ўжо пацалункі і іншыя выяўленні няшчотнасці, якія бываюць зазвычай у каханкаў, паміж якіх аб усім дамоўлена.

Такія былі заручыны ў Галенкі і ў старшыні калгаса Касцюка Добы.

6

Перад Галенкай паўстала пышная перспектыва раптоўнага шчасця. Па-першае, яна вызваліцца ад бацькоў, па-другое, яна будзе калгаспіца, а па-трэцяе... па-трэцяе,

у яе ж будзе ўсё-такі нейкая свая, хоць маленькая зусім, хоць зусім малюпасенькая, гаспадарка. Яна будзе — жонка і гаспадыня...

У Добы ў вялікім і надзіва непрытульным пакоі стаяў саматужны ложак на козлах, стол з нейкае фанернае скрыні, на стале — грудок кніжак, пад сталом, замест ложак, невялічкі куфэрак і на сцяне вісеў нажоўклы партрэт правадыра. Доба ўвёў Галенку ў свае апартаменты троху замяшаны і ад парога зрабіў хоць і шырокі, але не зусім упэўнены жэст.

— Вось і ўся мая гаспадарка. Зусім, як на паходзе. Бачыш, Галенка?

Чаму ж яна не бачыць? Бачыць, добра бачыць. Але яна не гаруе: не такая яна ўрадзілася. Абы было за што рукі зацяць. А рукі зацяць будзе за што — няпраўда!

У той самы дзень яна пайшла да бацькоў і прывалакла адтуль парсючка, дзвюх курак ды неўніка. Адылі гэты жывы інвентар не пайшоў на добры лад: парсючок назаўтрага збег, вярнуўшыся на сваю бацькаўшчыну, а адважны певень, падаўшыся ў рамантычную авантуру, перайшоў сам і перавёў сваіх курак на сумежны двор, дзе мясціўся калгасны птушатнік. Там яны ўсе добраахвотна абагуліліся.

Касцюк Доба катэгарычна забараніў Галенцы ані ісці да бацькоў па ўцекача, ані спаганяць птаства з калгаснае іпстанцыі. Гэта была першая пляма ў наўкорна-чыстых адносінах паміж маладымі.

Стала Галенцы тады пуста ў жыцці. Хадзіла яна штодня на калгасныя работы: там, у грамадзе дзяўчат, яе таварышак, за дружнай, калектыўпай працай было ёй весела і спакойна. Але досыць было ёй успомніць пра пусты свой пакой, пра двор, на якім з нахабна-задаволеным выглядам гуляе чужая жыўнасць, нібы паўмысля напамінаючы ёй пра яе ўбоства, і ў сэрцы яе пачынаў тачыць ліхі атрутны чарвяк, і вясёлы настрой яе ападаў, як лёгкая пена на гарачай вадзе.

А пайгорш было, што ёй не даводзілася нават гатаваць у хаце, бо харчаваліся япы ў новапабудаванай калгаснай сталоўцы. Не мела Галенка як дагадзіць свайму Касцючку, паказаць яму сваю шчырасць і адданасць. Не мела сна, як сустрэць яго, змардаванага, у цёплай, прытульнай хаце з гарачай капустай у печы, з пульхнымі смачнымі ладкамі. І не меў ён, Касцючок, як перакапацца, што ягопая Галенка — дармо, што зусім маладзенькая! — а добра па-

трапіць папеч і ладак, і бліпоў, і пірагоў нават, абы было з чаго.

Усё ідзе без яе, нібы і не жонка яна, не гаспадыня!

І пачула сябе Галепка лішняй у хаце.

— Нашто я яму? Ці я дагледжу яго, ці я накармлю яго, напаю?.. От, проста як дармаедка якая...

Вярнуўшыся з працы, Галепка бясконца споўдалася па хаце, перастаўляла з месца на месца рэчы, перасцілала ложак, перацірала стол, вокны — рабіла ўсё гэта механічна, бадай, несвядома, як аўтамат. Сядзела перад акном і доўга глядзела ў акно, чакаючы Касцюка. А Касцюк прыходзіў позна ўночы, апанаваны плоймай турбот, якія ёй, Галенцы, былі чужыя і нават варожыя.

Часам прыходзіла матка і канцом раструйвала даччына сэрца. Сядзела на ўслончыку, падпірала рукой бараду і ўздыхала.

— Палудпуеце, дзеткі, у сталоўцы?

— Ага, мамка! Там добра кормяць, і клопату ніякага. Сеў — табе і пададуць і прыбяруць.

— Так, так, дзеткі. Пэўна, што так... Дык ходзіш рабіць у калгас?

— Хаджу, мамка.

— Ці плоцяць жа табе хаця там?

— Чаму ж не? Яшчэ, праўда, не плацілі, але потым адразу, як падрахуюць усё.

— Так, так, дзетухна...

Старая ўздыхае і крытычпым вокам азірае пакой, супімаючыся на ўбогай, пашарпанай адзежы маладых.

— Даюць жа вам у калгасе крампіпу якую, ці што?

Галенцы ўжо няўсцерп. Яна балюча кусае губы, адылі гаворыць бадзёра, жвава, пераказваючы Касцюковы словы:

— А вось збяром лён, пашлём яго на фабрыку, там з яго палатпа паткуць і прышлюць нам назад. Мы ім лён, а яны нам мануфактуру.

Матка пакорна ківае галавой і зноў бярэцца ўздыхаць, і ад гэтых яе спагадлівых уздыханняў у дачкі крывёй абліваецца сэрца. А ідзе старая з адведзін усё-такі нібы заспакоеная (не жаліцца дачка, значыць, здаволена) і толькі, ідучы, бурчыць сабе пад нос, няўцямна ківаючы галавой:

— Хто іх разбярэць, цяперашнім светам, дзе ёй каторай добра, а дзе дрэнна...

І вось прыйшла Галенка з рэчкі дахаты. Ад бадзёрага, лёгкага настрою, з якім ішла яна плацце праць, не асталося і следу. Яна ішла назад пахмурая, вялая, і каромысел ужо сапраўды быў цяжкі, аж подалужна гнулася над ім яе пругкая постаць.

Зямлю агарнуў жорсткі сцюдзёны змрок. Ад рэчкі гнаўся за Галенкай сіберны вецер, хапаў яе за голыя ногі, агортваў іх мокрым падалом спадніцы, і Галенка калацілася ўся, як у трасцы.

Прыйшоўшы дахаты і сяк-так, па скоры поспех паразвесіўшы на гары бялізну, Галенка ўвайшла змораная, скалелая ў свой пусты, непрытульны пакой. На парозе вецер задуў газоўку, і яна не паліла яе. Села пад акно і застыла ў тупым сузіранні густой, непраглядпай цемры.

У хаце таксама сцюдзёна. Трэба прапаліць грубку, але Галенцы не змога ўстаць, страпянуцца з свайго панурага здранцвення.

Сумна-сумна... Каб хоць скарэй прыйшоў Касцюк! Але дзе там, прыйдзе, можа, апоўначы. Пакуль набегаецца там са сваімі справамі.

У Галенчыным сэрцы памалу расце крыўда на Касцюка разам з пякучым жалем да сябе.

Нашто яна яму? Што ён ад яе мае, чым яна цікава яму? Каб кахаў, дык бы, пэўна, прыходзіў раней, а то... Брэша, не кахае, ані не кахае!..

Галенцы хочацца плакаць і хочацца жаліцца камунебудзь. Увачыу ўстае старая маці — глядзіць на яе з любасцю і спагадай. Добрая, даражэнькая мамка! А яна, дурная, злуе толькі на яе, не любіць яе. Дурная, папраўдзе, дурпая!.. Мамка лепшая за Касцюка.

Але вось нехта ляпнуў у сенцах клямкаю, і сэрца ў Галенкі радаспа страпянулася.

Ён, пэўна, ён!

Касцюк уваішоў і запытаў здзіўленым голасам:

— Галенка, ты тут?

— Тут, Касцючок!

— Чаму ты сядзіш у цемры? Чаму не паліш святла?

— Ат. Што я буду рабіць?

І ў гэтых словах мімаволі вылівасцца Галенчына крыўда і нездавальненне. Але Касцюк не заўважае гэтага. Ён запальвае лямпу і раскладвае па стале цэлы пак папер.

У Галепкі пахаладзела на сэрцы: ён зноў цэлую поч

будзе працаваць, забыўшыся на яе і на ўсё на свеце, і калі, унарадкаваўшы свае паперы, Касцюк сядае каля яе і ласкава яе абнімае, яна пяшчотна туліцца да яго і шэпча:

— Касцючок! Давай лякам спаць сёння. Зараз... Добра? Я так скалела на рацэ...

Ён цалуе яе і мякка, але разам з тым катэгарычна, адказвае:

— Не, Галепачка, не... Заўтра пасяджэнне праўлення, і мне абавязкова трэба скончыць гадавы план. Заўтра будзем абмяркоўваць. Каб ты ведала, Галенка, што ў нас за планы? Ай-яй-я! Мы з нашага калгасу зробім гаспадарку, што ўсе здзівуюцца. Не гаспадарка, а камбінат! Разумееш?

Дзіва, што яна разумее.

— Зноў усю ноч будзеш сядзець?

— Ды не, гадзіну якую. Ты кладзіся, Галенка, спі... Бінэ?

— Бінэ, бінэ...

І Галепка, троху насупіўшыся, ідзе рыхтаваць халодную самотную пасцелю.

8

Ужо далёка за ноўнач.

Старшыня калгаса Касцюк Доба сядзіць над гадавымі планамі калгаснае гаспадаркі. У яго вочы чырвоныя ад зморы і бяссоння, калматыя валасы пазвісалі на лоб бязладнымі пасмамі, а на пальцах ды на барадзе красуюцца барвістыя плямы ад чарніла. Ён не чуе ані валасоў на лобе, ані плям чарнільных на барадзе. Ён бачыць іншае...

...Суцэльнымі бязмежнымі масівамі калышацца зялёнае мора высокага чыстага лёну. І там, на гарэ, і над балотам, і абапал ракі — скрозь адно мяккае празрыстае зеляніва.

...Вось яно пачынае жаўцець, выспяваць, вось яно ўжо абярнулася ў цёмна-масядзовую поўсць, па якой поўзаюць дзівосныя машыны. Ён яшчэ не бачыў ніколі гэтых машын, толькі чуў пра іх, і яны ўяўляюцца яму нечым падобным да тараканаў:

...А там убаку гоніць у неба клубы густога чмарага дыму лёназавод, дзе драцяністае цыбалле лёну абарачаецца ў шаўкова-мяккі бялюткі кужаль, у вялізныя пакі гэтага цудоўнага кужалю, якія бясконцай чарадой коцяцца з брамы завода і жвава, куляючыся, як гарэзныя дзеці, бягуць на абшару карыны, каб вярнуцца назад даўжэзнымі пасмамі тонкага далікатнага палатна.

...У калгасе свята... Усе чыстыя, прыбраныя, апрануты ў тое цудоўнае палатно, што выйшла з іхніх зялёных палеткаў, з іхняе дружнае калектыўнае працы. Усе — сытыя, здаволеныя. Граюць, пяюць, весяляцца. І спаміж усіх найвесялейшая ды найпрыгажэйшая, не йначай, як яго Галенка. Яна бясконца радая і шчаслівая. Яна не паракае на яго, на Касцюка, што не кладзецца разам з ёй спаць (быццам ён не рад быў бы гэта зрабіць), яна гаварыцца ім, бо ведае, што гэтаму ўсіхняму святу і ён хоць на каліва спрычыніўся.

...А далей... далей...

Але ж усё гэта некалі будзе, а пакуль што на стале ляжаць няскончаныя планы, якія заўтра, канечна, трэба абмеркаваць на праўленні і зараз жа даць ім далейшы ход.

Найгорш гэтыя лічбы! Яны такія неслухмяныя, такія ўпартыя — ніяк не саўладаць з імі неспрактыкаванаму ў гэтай справе Касцюковаму розуму. Скачуць у галаве, як блохі, а хоць сплятаюцца ў неразвязна заблытаныя клубкі!

— Сем на сем будзе...

Зусім атлуміўся.

— Колькі будзе сем на сем?..

У галаве такая пустэча. Мусіць, таму, што не спаў.

— Колькі ж гэта сем па сем? Сем на сем... Сем на сем... будзе...

І ў самае вуха яму ўлятае цёплы, ласкавы шэпт:

— Сорак дзевяць... Касцючок, сорак дзевяць.

І шыю яго аплятаюць гарачыя рукі, абдаючы яго салодкім пахам здаровага цела.

— Галенка! Ці ты не спіш?

— Я зусім не спала яшчэ, Касцючок. Я скрозь глядзела, як ты працуеш. Як ты змарыўся, любы! А які ты вясёлы быў, аж смяяўся сам сабе...

І, тулячыся да яго, пясмела просіць, нібы саромячыся свае просьбы.

— Пакажы мне, Касцючок, што ў цябе тут. Я ж нішто менная...

Касцюку толькі гэтага і трэба. Ён бярэ яе да сябе на калені, і яны разам пачынаюць разглядаць план калгаса.

— Во... бачыш, Галенка? Тут ты палола лён... тады, помніш? Вось тут — рэчка... тут — лес... тут во... во тут... памятаеш?.. як ты жала...

І Касцюк слова за словам пачынае раскрываць перад Галенкай свае вялікія смелыя планы. Ён ажывіўся, сон

ад яго адляцеў немаведама куды, вочы гараць жвавым агнём. Нават лічбы і тыя сталі слухмяныя — строяцца ўраз у зладныя калоны, гатовыя да паслуг.

Галецка слухае яго, зацяўшы дух. Ягоны запал памалу зараджае і яе, яна перажывае разам з ім цудоўнае запаленне, і ёй радаспа, лёгка на душы. У яе родзіцца прагнае жаданне дапамагчы яму. Хоць трошачку, хоць у чым у маленькім. Каб ён ведаў, каб чуў, што яна таксама цікавіцца, што гэта ёй не чужое.

Ляцяць хвіліны, як быстрыя іскры. Паволі, але стапоўка сунецца наперад глухая шчытная ноч. Сон-небарака капчаткова вылецеў з хаты.

— ...а тут, Галецка, будзе добрая шаша, якая злучыць пас з чыгуначнай станцыяй. Тут будзе вялікі сад... І тут таксама... Тут мы паставім новую школу...

І, абмаляваўшы жывымі яспымі фарбамі карціну недалёкае будучыні калгаса, Касцюк Доба заключае ўсё шырокім жэстам пераможцы:

— Дык вось, Галенка, якая будзе пашая гаспадарка... Бінэ?

Галенка глядзіць на яго вялікімі зачараванымі вачмі і ціха шэпча за ім апошпія словы:

— ...якая... пашая... гаспадарка...

І раптам — немаведама з чаго — абшчаніла Галенка сваіго Касцючка за шыю, моцпа прыціспулася да ягопых грудзей і голасна на ўсю хату заплакала.

Адылі слёзы былі лёгкія, небалючыя, бо гэта быў пачатак праўдзівага Галенчынага шчасця.

ПЕТРЫК І ПЯТРУСЬ

1

За Петрусёвым дваром адразу пачынаецца вялікі калгасны сад, і малому Петрыку досыць узлезці ў сваёй пуні на сена і падпаўзці да шырокае — з цэлае акно — дзіркі ў старым дашчаным франтоне, каб перад самым сваім носам убачыць крамяныя чырванашчокія апорты. Петрык — з яго спрытам і адвагаю — мог бы, вядомая рэч, давесці свае назіранні да пэўнага лагічнага выніку — гэта зпачыць, пачаніць за франтон вяроўку і спусціцца па ёй у самыя лоні спакусы, але ў яго ёсць дзве прычыны, каб гэта не рабіць: па-першае, хоць тут і глухі куточак саду, а тым часам — ці ж можна верыць гэтаму крывому Піліпу, зловіць, дык мала не будзе: па-другое ж, Петрыкаў бацька, адпаасобнік Пятрусь, колькі раз намякаў яму:

— Глядзі, сукін сын, толькі паткніся куды ў калгаспае — зрэжу па горкае яблыка.

Таму Петрык у вымушанай добрасумленпасці адмяжкоўваецца аднымі назіраннямі.

А за апортам блішчыць, аж свіціцца, пышны белы паліў, а за налівам — фарсістыя дулі, а праваруч — позпыя і праз гэта яшчэ саладзейшыя карабкоўкі, а леваруч — пуцінкі (папэўна, ужо досыць мяккія — есці можна), а там яшчэ і яшчэ...

Часам Петрык — проста дзеля пацехі — займаецца такімі разрахункамі: пералічае перш за ўсё, колькі ёсць у садзе дрэў, што латвей зрабіць яму, седзячы на высокай сцяпе сянніцы, потым лічыць, колькі грудоў (у яго «груд» — пэўпая дакладпая мера), колькі грудоў будзе з кожпае яблыні, далей «бярэ на вучот» усіх калгаспікаў і, парэшце, выводзіць, па колькі грудоў яблыкаў і дуль прыпадзе на кожнага. А дайшоўшы канчатковага выніку, ён сціскае зубы ад злосці і цэдзіць скрозь іх чутае недзе ад старэйшых:

— Ато ж дурпы, крый божа... І чаго ён яшчэ чакае?

Гэта так пра бацьку, што не пішацца ў калгас.

Неяк па канцы лета, седзячы па сваім пазорным пункце, Петрык згледзеў у калгасным садзе незвычайнае ажыўленне. Цэлая плойма дзяцей і некалькі чалавек дарослых, раптам урынуўшыся ў сад, з тлумам і сумятнёй завінуліся каля дрэў. Паміж чырванашчокіх апортаў, празрыста-жоўтых антонавак, халодна-бліскучых цітавак выраслі скурчаныя ад натугі фігуры Сцёпак, Сёмак, Яськаў, Міхаськаў і іншых Петрыкавых равеснікаў.

У Петрыка ёкнула сэрца: ён зразумеў, што гэта ўзялі-ся калаціць сад, што зараз ужо знікне з ягоных вачэй усё гэтае харaство, якое — што б там ні было,— а ўсё-ткі грэла ў яго ў сэрцы нейкую дзіўную безгрунтоўную надзею.

Петрык увесь абярнуўся ў зірк. Ён не толькі сачыў за кожным рухам сваіх таварышаў — ён перажываў гэтыя рухі, адчуваў іх у сваім целе, і кожная няўдача, кожны няёмкі выкрут узпімаў у ім пагардлівае абурэнне.

— Авой, няўмекі, авой, нязграбы! Гэта ж каб я, дык бы вунь на тую галінку ўзглабаўся, ухапіўся за той вунь сучок, нагой адпіхнуў тую галінку — эх, каб гэта мне туды...

І пякучая злосць па бацьку сціскае Петрыкава знябелае сэрца, і ўжо не чутае ад старэйшых, а сваё — дзіцячае, горкае зрываецца з вуснаў:

— Дурны, дурны, вось і ўсё... Хай сабе... Усё роўна дурны, дурны...

У гэты час пад пуню лёгкім трушком, трымаючы ў руках напагатове штапёнкі, падскочыў найбліжэйшы Петрыкаў прыяцель Янка. Петрыкава злосць адразу абярнулася на няпчаснага Янку, і ён — толькі той пачаў асталёўваць — свіснуў так тонка й прарэзліва, як адзін толькі ён умеў свіспуць з цэлае вёскі. Янка крыкнуў і памкнуўся быў бегчы, але прыстоіў і, пільна ўзіраючыся ў чорную дзірку франтопа, нясмела запытаў:

— Петрык! Гэта ты?

Петрык вытыркнуў галаву і забалбатаў па-індычаму:

— Был-был-был-был...

Але тут у галаве яго мільгнула раптоўна думка, і ён змяніў тактыку.

— Здароў, Янка! Дармо, можна сабе й тут, усё роўна... Яблыкі калоціце?

Янка дзеля ўсякага выпадку зашпіліў усё-ткі штапёнкі і адказаў трохy недаверлівым тонам:

— Сам бачыш, чаго ж пытацца...

— Многа будзе яблык?

— Ого!

Петрык падміргнуў.

— А што, каб гэта я да вас туды, га? Што ты думаеш, Янка?

— Няможна, ты ж не калгасны...

Адпак яго сухі безапеляцыйны тон не спыніў Петрыка. З момант падумаўшы, ён прапанаваў:

— Л я мог бы табе нават свой зламаны ножык даць — паўляза яшчэ цэлае. А хоць сікаўку — цераз вуліцу дастае.

Янка, пачуўшы выгодны гешэфт, затрымаўся.

— Чакай, я зараз...

І, скочыўшы за рог, ён праз хвіліну вярнуўся адтуль з гатовай прапазіцыяй.

— І ножык, і сікаўку?

Петрык у знак згоды махнуў безпадзейна рукой (ат, прападзі яно ўсё).

У Янкі ўжо быў гатовы план.

— Я скажу, што ты за нашу Насту. Адно каб працаваў добра, чуеш? Глядзі ты мне... Ты — сюды?

— Па вяроўцы...

І праз хвіліну Петрык апынуўся ў тым заказаным раі, што праз усё лета дражніў яго палкай пясцерпкаі спакусай.

Гэта было як у сне. Ён заблытаўся сярод плоймы дзяцей, і ніхто не зважаў на яго, ніхто не гнаў яго з чароўнага раю, ніхто не крычаў, што ён чужы, што гэты сад не яго. Навакол — і на дрэвах, і на зямлі, і, здавалася, у паветры ззялі сваёй бліскучай свежасцю барвістыя плады. Ён мог іх есці, колькі хацеў, ён мог каштаваць на чарзе ўсе так даскапала вывучаныя ім здалёк гатункі. Ён нават мог, пакаштаваўшы, кінуць недаедзепае, калі не да смаку — так і рабілі іншыя,— але ён ўсё-ткі не важыўся: хоць каторае і не зусім падабаецца, а з'есць да канца, да самых зярпятак.

А як шчыра, як самааддапа ён працаваў! Ён узлазіў па самыя верхавінкі, пераскакваў, як вавёрка, з галінкі па галінку. Ад яго не ўцякаў піводзін яблык, піводпая дулька. Нават стары, крывы на адно вока, стораж Піліп колькі раз пахваліў яго пезвычайпы спрыт, пе ведаючы, мабыць, што хваліць чужога тут зусім, які злосным хітрыкамі пралез сюды, аднаасобніка.

Потым збіралі яблыкі, зносілі ў места. Выраслалі пышныя пераліўчастыя грудy, ад якіх ішоў зусім новы — густы, мядовы пах. Петрыку грудy здаліся значна большымі, чым ён дасюль уяўляў, і ён ужо меркаваў, што, мабыць, не прыйдзецца кожнаму па столькі грудоў, па сколькі ён быў прызначыў. Ён з нецярплівасцю чакаў, пакуль нарэшце пачнуць шчаслівыя калгаспікі дзяліць накалочаныя яблыкі.

Адпак не дзялілі зусім — ні яблыкаў, ні дуль. Прыехалі на конях калгаспікі і пачалі перавозіць яблыкі ў агульны калгасны свіран.

Гэта Петрыку дужа ўпадабалася. Ён, праўду сказаць, чакаў тэй дзяльбы з захаваным страхам. Па-першае, маглі б яго тады выкрыць і, зрабіўшы яму страшнае жорсткае запытанне — а ты чаго тут? — выгнаць з чароўнага раю. А па-другое, каму ж прыемна глядзець, як іншыя грабаюць такое неверагоднае багацце, а самому тым часам стаяць убаку ды разам з абрыдзелым раптам яблыкам давіцца горкімі слязьмі?

Шчаслівы Петрык цяпер адчуваў сябе цалкам роўным з усімі і нават прадэманстраваў гэта тым, што ўрачыста пад'ехаў на калгасным кані аж да самых варот саду.

Вярнуўся Петрык дахаты, як ужо клаліся спаць, і злосны Пятрусь сустрэў яго ласкавым запытаннем:

— Пагуляў трошку, сынок?

Што вешчавала Петрыку самыя горшыя непрыемнасці.

І праўда, не ўправіўся ён яшчэ і зманіць, што «нечага ў школу ўсіх вучняў збіралі»; як у Петрусёвых руках з'явілася дзяга, і зараз жа пачалася экзекуцыя.

Петрык плакаў так проста, дзеля прылікі, чыста з дзіцячай традыцыі. Ніколі яшчэ з такім лёгкім сэрцам не зносіў ён свае «непрыемнасці», як сёння. Ці дзіва? Ён жа меў сабе гэтулькі пацяшэнняў. Па-першае — было за што, па-другое — усё роўна ў калгасным садзе ён ужо пабыў — хоць як бі, дык гэтага не вернеш, а па-трэцяе — каб бацька ведаў «усё», дык бы не гэтак біў. О, каб ён ведаў!

Як і заўсёды, пасля «непрыемнасці» Петрык у знак пратэсту падлез пад лаўку і, як заўсёды, хліпаў там доўга і жаласна, але ў гэты самы час з спакойным сэрцам і глыбокаю асалодаю бачыў перад вачмі вялізныя пераліўчаста-бліскучыя грудy яблыкаў, такіх яблыкаў, якіх «ён» (у падобных выпадках Петрык заўсёды звaў бацьку «ёнам») — якіх ён, можа, ніколі і ў вочы не бачыў.

У Петруся сэрца было адходлівае. Як Петрык добра ўжо надакучыў яму сваім хлібашнем, ён звярнуўся да яго з нядбайнай паблажлівасцю:

— Ну, сціхні ўжо, дурань... Нешта дам табе зараз...

І Петрык, убачыўшы, што бацька і сапраўды пайшоў у сенцы, сціх адразу і пастаражыўся.

— Што ён дасць?

Бацька прынёс яму вялізны чырванашчокі апорт.

Петрык аслупянеў. Ён адразу пазнаў яго, гэты цудоўны яблык. Такія маглі быць толькі там, у калгаспым садзе!

Ён парыўчата схапіў з бацькавых рук яблык, паспешна абгледзеў яго з усіх бакоў, ёмка скрывіўшыся, упусціў у яго свае вострыя зубы і звонка сербануў набеглы сок.

— Тос!

І малому Петрыку стала раптам крыўдна. Яго чароўная таямніца адразу страціла палавіну свае прывабнасці, і ўспамін пра бацькаў ушчупак паўстаў перад ім ужо куды ў гарчэйшым выглядзе.

Ён схаваў яблык у кішэню з цвёрдым намерам выкінуць яго вон.

2

Назаўтра Петрык быў ужо хітрэйшы. Ён вярнуўся з саду куды раней, чымся ўчора, і скрозь, да самай пачы, стараўся так рабіць, каб зарэкамендаваць сябе перад бацькам з найлепшага боку. Пятрусь быў ім цалкам здавольны і даў яму зноў яшчэ большы і яшчэ чырванейшы яблык. Петрык — хітрук — прыкінуўся, што дужа рады.

А была ў яго, выходзіць, свая асаблівая захаваная мэта...

Сёння былі занятыя калгасныя коні, і груды пакалочаных яблыкаў асталіся напач у садзе. А дзеля таго, што іх было многа і ляжалі яны ў розных канцах саду, а стораж Піліп быў адзін ды яшчэ і з адным вокам,— выклікалі былі хлопцаў-ахвотнікаў начаваць гэтую ноч у садзе, памагаць дзеду Піліпу вартаваць яблыкі. Ясная рэч, што ахвотнікаў знайшлося досыць і што найахвотнейшы з усіх ахвотнікаў быў Петрык, хоць не меў ніякага дачынення ні да калгаса, ні да калгасных яблыкаў.

І вось як падышла пара класціся спаць, Петрык, мякка падлабуніўшыся да бацькі, напрасіўся, каб яго пусцілі

сёння спаць на сена (у хаце горача, а ноч такая цёплая-цёплая, як нагрэтая). Расчулены сынавай ласкай і слухмянасцю, бацька згадзіўся, і Петрык, горда выступаючы з хаты, неўзамстку захапіў з сабой вяроўку.

Было весялей яшчэ, як на начлезе. Хлопцы расклалі сярод саду агонь, бегалі вакол яго, скакалі, як чарцяняты, крычалі, пелі і бяскоцца хрускалі яблыкі. У дрыготным, наклычаным, перамяшаным з цемраю святле яблыкі былі зусім іпакшыя — цёмныя, кашлатыя, таемныя. Дзеці знайшлі сабе гульню: паказвалі здалёку яблык — адгадай, які? — і тады правяралі пры агні з заўзятасцю азардоўных гульцоў. Прабавалі таксама яблыкі пячы, адылі пераканаліся, што сырыя смачнейшыя.

Раз-пораз хлопцы па чыёй-небудзь раптоўнай звонкай камандзе разбягаліся ў розныя бакі на чарговы вартаўнічы абход, але кожны лічыў, каб трымацца бліжэй да суседа, і, знячэўку стыкнуўшыся ў цемры, сударгава хапаліся адзін за аднаго і калаціліся ад страху.

Ужо добра па поўначы дзеці змарыліся і паціхлі. Тады вылез з свае саламянае будкі дзед Піліп — аспалы, пахмуры, як мядзведзь,— падышоў да агню і, смачна кректануўшы спрасонку, закурыў піпку.

— Ну, цяпер ідзіце ўжо спаць — я буду сцерагчы. Марш у будку... Ну?

Спаць у дзедавай будцы — гэта ж не абы-што якое. Не чакаючы далейшых запросін, хлопцы шмаргануліся як адзін у той бок, дзе стаяла гэтае знатнае памяшканне, і з піскам, енкам затаўкліся ў дзвярах.

Петрыку ўлезці ў будку неяк не ручыла, і ён, працяўшыся глыбокай пагардай да шчаслівейшых таварышаў, падумаў:

«Эх, вартаўнікі! Навартуюць, тухнучы ў будцы... Сама такіх у сад пускаць абібокаў...»

І ён, набраўшыся адпаведнай важнасці, узапшуў на сябе сваю начлежную «пару» і, перамагаючы страх, адышоўся крокаў за дваццаць ад будкі, дзе і лёг пад вялізным кустом агрэсту.

Петрыку не спалася: ён глядзеў на зоркі і летуцоў. Ён думаў пра тое, якімі спосабамі латвей абярэгчы сад ад зладзеяў. Можна, вядома, абгарадзіць высачэзным плотам і папаторкаць угары цвікоў. Гэта занадта проста, дый дзе ты цвікоў гэтулькі набярэшся. Можна таксама выкапаць з гэтага боку глыбокую канаву і ў яе вады наліць, а хоць нашабіць ражэшня, як, казалі, на ваўкоў робяць. А найле-

пей, дык гэта ўзяць даўгую пітку, абвесці яе вакол усяго саду, а канцы — у будку ды да званка. Як паткнецца каторы, званок — дзын — і гатова... А так — дзе ты яго пачуеш.

Адылі Петрык пачуў і без званка. Зусім блізка ад яго нехта зашамацеў, і зараз жа Петрык пачуў выразны гук перасыпаных яблык.

Сэрца ў яго зайшлося ад страху. Першая думка ў яго была — ці добра схаваўшыся ён пад кустом, ці не тырчаць дужа далёка ягоныя ногі. Але зараз жа ён зморкаваў, што баяцца яму няма чаго, што ён заўсёды, калі трэба, умяе віцца закрычаць, а пакуль усё спакойна, ён можа нават пацікаваць, хто гэта там шамаціць.

Злодзей быў, пэўна, зусім дурны, бо да кучы, з якой награбаў ён яблыкі, даляталі водблескі агню і асвятлялі ўсю яго постаць. Петрык зусім асмялеў і падпоўз бліжэй. Прыгледзеўшыся добра, ён пазнаў дзеда Піліпа і з уласцівай яму паслужнасцю хацеў ужо быў аказацца і памагчы старому парадкаваць яблыкі. Але тут ён згледзеў у руках у старога мяшок, і гэта яго затрымала.

Дзед спакойна насыпаў мяшок як панесці, старанна завязаў хахол і, устаўшы з зямлі, паспрабаваў, ці цяжка. Тут Петрык удругае мала не здрадзіў сябе, бо яму страшэнна захацелася падбегчы да дзеда і падсобіць на плечы. Але ён ізноў стрымаўся. З нечакапым спрытам і сілаю дзед Піліп усхапіў на плечы мяшок і, нізка сагнуўшыся, пацягнуўся садам.

Петрык, апрача таго, што палахлівы, быў яшчэ без меры цікавы, а таму — хоць бы й хацеў, ён не здолеў бы ўжо ўтрымацца, каб не падгледзець, куды дзед панёс яблыкі.

Абагнуўшы цяпьком асветленае кола, дзед Піліп завярнуў пад тоі бок, дзе была іхпая, Петрусёвых, сяліба. Гэта яшчэ больш заінтрыгавала Петрыка і разам з тым падало яму большаі адвагі: усё-ткі бліжэй да хаты.

Вось чорнаі расплыўчатаі плямаі выросла перад вачмі іхпая пуня — Петрыкаў назорны пункт. Тут дзед троху збочыў і падаўся туды, дзе высокі шчыкет адгароджваў калгаспы сад ад іхпага гароду. Праішоўшы крокаў з дваццаць пад самым шчыкетам, дзед раптам суняўся і асцярожна спусціў на дол сваю ношку. З хвіліну ён стаяў перухома, прыслухоўваючыся, потым ціха гукнуў:

— Пятрусь, дзе ты там?

І зараз жа шпаркімі паспешнымі крокамі падаўся ў глыб саду. На тым месцы, дзе стаяла яго грамоздкая фігура, Петрык убачыў цёмна-шэрую пляму выбранага ў шчыкеце прахопу.

Ён зразумеў усё. Доўга не разважаючы, ён — пібы хто яго падштурхнуў — кінуўся да мяшка і ўцупіўся ў яго сваімі слабенькімі, дрыжачымі ад страху і яшчэ ад неякага няяснага, але дужа моцнага пачуцця, рукамі.

З таго боку за мяшок узяліся даўгія бацькавы рукі. Петрык напяў усе сілы і, трымаючы мяшок, прапішчэў:

— Татка! Гэта — калгасныя...

Бацькавы рукі адарваліся ад мяшка, як апечаныя, але зараз жа ўзяліся за яго нанова. Здушаны злосцю голас прасіпеў з-за шчыкета:

— Петрык, сукін сын, што ты тут робіш?

Замест адказу Петрык прапішчэў зноў сваё:

— Гэта — калгасныя... Татка...

І ён як мага трымаўся за мяшок. Пятрусь толькі цяпер зразумеў, што гэта ён трымае мяшок, і, рвучы мяшок да сябе, сыкнуў з бязмернай лютасцю:

— Пусці, шчанё... Пусці, табе кажу...

Петрык цягнуўся ўслед за мяшком...

— Не пушчу... Гэта — калгасныя...

Раптам ён пачуў, што на тым месцы, дзе расце ў яго левае вуха, загарэўся пясцерпна-пякучы агонь. Ён добра не ўцяміў яшчэ, што гэта значыць, як агонь гэты ўпіўся яму ў самае нутро і апаліў яго вострай нястрымнай злосцю. Забыўшыся на ўсё на свеце, амаль непрытомны, ён закрычаў на ўсё горла — дзікім прарэзлівым крыкам, які жудасна парацяў глухую цішыню соннага саду:

— Зло-о-дзей...

Пятрусь выпусціў з рук і мяшок, і сына, і яны абое каршнём адкаціліся ў сад.

Ля будкі ўзняўся страшэнны амбарас. Спалашоныя раптоўным крыкам хлопцы паўскаквалі з месц і, асалапелыя, кідаліся ўва ўсе бакі, не ведаючы, што рабіць. Нарэшце нехта даўміўся — схапіў галавешку і пабег з ёй у той бок, адкуль прыляцеў жудасны крык. Следам за ім падаліся іншыя.

Петрык з хвіліну ляжаў нерухома, прыціснуты мяшком, і, ашаломлены, амаль не разумеў, што гэта сталася. Потым пачуў тлумныя дзіцячыя галасы, якія шпарка набліжаліся да яго, і агнёвы страх страсянуў яго. У сударгавых

патугах выкараскаўся ён з-пад мяшка і кінуўся ўбок, не ведаючы — куды, не ведаючы — чаго.

Праз колькі хвіліи яго знайшлі нездалёк ад мяшка: ратуючыся ад свайго дзікага страху, ён убіўся галавёнкай у пеўкі шчытны калючы куст, а ўсё яго дрыжачае тулава й ногі ляжалі адкрытыя на траве. Яго падпялі і павялі да агню, хорам распытваючы, што з ім здарылася.

Петрык не адказваў на запытанні — адно хліпаў і ўсё лапатаў, як ненрытомны:

— Я не пайду дахаты... Я баюся... Я не хочу... Я не пайду... не пайду...

З левага вуха ў яго сачылася густая і зусім чорная ў змроку кроў....

НАВЕЛА ПРА КАХАННЕ

Кожны раз, як глядзела яна так на Уладзіка —халодна, адчужана, нібы разглядаючы нейкую незнаёмую і не надта прыемную рэч,— у яго з бурнай настойлівасцю ўздымаліся мары аб невядомым геройстве. Сціснуўшы зубы ад злосці, ён у думках пагражаў ёй:

— Чакай, я табе яшчэ пакажу! Ты яшчэ пазнаеш мяне...

Ён ішоў потым да свайго старавата га, але заўсёды спраўнага, люботна дагледжанага «Фардзона» і доўга глядзеў на яго — халодна, адчужана, так, як глядзела тое нялюбае гапарыстае дзеўчанё. З пагардлівым дакорам ён гаварыў свайму вернаму другу:

— Эх ты, стары чорт! Ну, што я зраблю на табе, ты толькі падумай... Каб быў ты хаця самалётам, або караблём дальняга плавання, або стратастатам, або парашутам нарэшце... О, я б ураз навучыў тады, каго трэба, якімі вачамі на мяне глядзець!

У яго, як у пакрыўджанага дзіцяці, усе мары канчаліся трагічна. Зрабіўшы вялікі геройскі ўчынак, ён неадменна цярпеў аварыю і паміраў пад агульныя слёзы і жалобнае спачуванне ўсяго народа. Тады яна, гэтая нікчэмная задавака, ірвала на сабе валасы з гора і роспачы, з позняга каяння, што парой не ацаніла ўсіх захаваных якасцей гэтага маладога і прыгожага (пэўна, што прыгожага!) хлопца, лепшага трактарыста-ўдарніка.

А часам Уладзіку ўсё-ткі здавалася, што Вера кахае яго, добра, моцна кахае, што яна проста хавасцца, хітруха, за гэтым сваім чужаватым поглядам. Бо чаго ж бы інпачай прыходзіла яна так часта да яго ў гараж? І чаго б з'яўлялася яна акурат тады, як у гаражы, апроч яго, нікога няма? І чаго б распытвала яна яго пра ўсякую дробязь, каб праз колькі хвілін забыцца і зноў папытаць тое самае?

Уладзік ахвотна гаварыў з ёй пра свайго старога друга, ахвотна паказваў яго выпрабаваны механізм, тлумачыў

прынцыпы яго работы. Гаворачы, ён злёгку пагладжваў ясна начышчаныя часткі машыны і рабіў гэта з такой чулай пяшчотнасцю, якой, напэўна, не дачакалася б ад яго нават самая прыгожая дзяўчына, не кажучы ўжо пра гэтае малое кучаравае стварэнне.

Калі ж кучаравае стварэнне, захопленае, пэўна, яго размовай, само нясмела працягвала руку да машыны і калі гэтая зусім тандэтная ручка чамусьці чаплялася за трывалую, цвёрдую руку трактарыста, Уладзік рантам спыняў сваё тлумачэнне, узнімаў на Веру адважны погляд і раскрываў рот, каб сказаць ёй нешта абсалютна не звязанае з механізмам трактара.

І вось тут якраз натыкаўся ён, небарака, на халодны, адчужаны погляд, які, здавалася, настарожана вывучаў, ці ёсць у ім, у Уладзіку, сапраўды што-небудзь вартае асаблівае ўвагі.

Тады Уладзік сціскаў зубы ад злосці і пагражаў у думках:

— Чакай, я табе яшчэ пакажу! Ты яшчэ пазнаеш мяне!..

* * *

Канчаліся канікулы, і Вера выязджала ў горад на заняткі. Дзень яе ад'езду прыпадаў на выхадны дзень трактарыстаў, і Уладзік чакаў яго амаль што спакойна: ён быў упэўнены, што ўправіцца ў гэты дзень пагаварыць з Верай і сказаць ёй нарэшце сваё рашучае слова. Ён нават сумысля ўхіліўся ў апошнія дні ад сустрэчы з ёй, каб больш важнай і значнай зрабіць развітальную гутарку.

Напярэдадні выходнага, позна ўвечары, калі зморыны Уладзік паклаўся ўжо спаць і ў салодкім тумане першай дрымоты плёў недарэчна яскравыя ўзоры заўтрашняй размовы з Верай,— да яго прыйшоў брыгадзір і сказаў, што на загаду праўлення выхадны дзень пераносіцца і што заўтра раннім золкам Уладзік павінен на цэлы дзень выехаць у поле.

Як выйшаў брыгадзір, Уладзік доўга яшчэ сядзеў на ложку, амаль не дабіраючы сэнсу гэтага неспадзяванага загаду, потым, сам не ведаючы чаго, пачаў паспешна апранацца. Апрануўшыся, выйшаў на вуліцу і без усякае пэўнае мэты пайшоў у той бок, дзе жыла Вера.

Чорныя вокны Верынае хаты гляпулі на Уладзіка холадна і адчужана, як часам глядзелі на яго чорныя Ве-

рыны вочы, і ён вярнуўся з яшчэ вастрэйшым пачуццём адзіноты. Дамоў ён не паішоў, бо ведаў, што ўсё роўна не ўдасца заснуць — ён пабудзіў брыгадзіра і выдумаў яму, што ў яго не зусім спраўны матор, што трэба загадзя аглядзець яго. Узяўшы ключы, ён паішоў адзін у гараж і там поркаўся да самага рання, выліваючы ў шчырыя клопаты над машынай усю напружаную сілу свайго нявыказанага кахання і свае крыўды.

А раніцою, зухавата праязджаючы праз вёску, Уладзік яшчэ раз глядзеў на Верыны вокны — яны былі нібыта весялейшыя трохі, але ўсё роўна чужыя. Сэрца ў яго балюча запыла, калі за акном — так, прынамсі, здалося яму — цёпла мільганула была нейкая белая пляма.

* * *

Уладзіку адвялі ўчастак на плоскім узвышшы, якое адным сваім берагам зрывалася ў круты і глыбокі яр. Праз участак ішла дарога. І яр і дарога заміналі ў рабоце, не давалі як след разгарнуцца, і гэта Уладзіку падабалася. Чым цяжэй было працаваць, тым лягчэй было на душы. Часамі Уладзіку нават здавалася, што яму весела, і ён спрабаваў сам сабе ўсміхнуцца.

Апаўдні яму дужа захацелася есці, і ён агледзеўся, што не ўзяў з сабой нават кавалка хлеба. Каб заглушыць яшчэ і голад, ён узмацніў тэмпы работы да магчымае крайнасці. І толькі раз-пораз зусім несвядома кідаў погляд на дарогу над вёску: ці не дагадаецца хто паднесці ўсё-такі чаго-небудзь перакусіць.

Праз гадзіны паўтары на дарозе паказалася жаночая постаць. Яна была надзвычай знаёмая, гэтая невялічкая зграбная постаць, але Уладзік толькі на зусім блізкай адлегласці пазнаў ці, праўдзівей, паверыў, што гэта Вера: ён ніяк не мог чакаць яе тут.

Яна прыйшла развітацца... Як гэта несправядліва і як прыемна! Але дарма яна думае, што ён хоць адным словам, хоць адным мігам пакажа ёй сваю радасць! Ён нават не спыніць машыну. Не, машыну ён — хай сабе — спыніць, але зусім не затым, каб пачакаць яе. Яму проста трэба сёе-тое паправіць. Ён нават не выключыць матор, ён толькі на адну хвіліну саскочыць на зямлю.

— Дзень добры, Уладзік!

Уладзік з тугой марудлівасцю падымае галаву, нібы яму проста нязмога адарвацца ад працы, і глядзіць на Веру, злёгку прыжмурыўшы вока,— строга і дзелавіта.

— Добры дзень!

І зноў нахіляецца да машыны, хаваючы ад Веры свой твар і сваё хваляванне. І з затоеным сэрцам чакае, што скажа яна далей.

Але Вера маўчыць. Вера не хоча сказаць больш ніводнага слова. Мабыць, стаіць і чакае, каб ён першы завёў гаворку. Дармо, хай сабе пачакае.

Чамусьці дужа назойліва пыхкае трактар. За гэтым трактарам можна і не дачуць якога, не надта голасна сказанага, слова.

Уладзік спрабуе цішком, неўзаметку зірнуць на Веру і бачыць яе ўжо крокаў за дзесяць ці за пятнаццаць. Яна пайшла далей па дарозе — памалу сабе, спакойненька, нібы зусім не да яго ішла, нібы проста так, мімаходзь, прывіталася з ім.

О, пялюбае стварэнне! Яна ўжо не вернецца — гэта ясна,— яна ўжо не азірнецца нават!

Уладзік момант стаіць аслупянелы, потым, зусім разгубіўшыся, інстынктыўна парываецца ўперад, і рука яго, цвёрдая рука трактарыста, неўзаметку чапляе здрадліва слухмяны рычаг.

Далей было жудасна незразумелае, страшнае...

Нешта раптам ірванула яго за нагу з такой сілай, што ён, як сноп, перакуліўся на дол. І — боль... Вялізны нераможны боль, які ўзнік, здаецца, не там, у раструшчанай колам назе, а недзе глыбока ўсярэдзіне, у самым сэрцы, і, шалёна разросшыся, узлёг на яго чорным бязлітасным гнётам.

У змятушаных, пераблытаных думках чамусьці мільганула зусім непатрэбнае:

— Не крычаць... Толькі каб не крычаць...

І ён, сударгава сціснуўшы зубы, задушыў у сабе гатовы вырвацца енк.

Потым свядомасцю заўладаў абыклы і, як здавалася цяпер, бясконцы, вечны гук трактара. Ён плыў над галавой, над агнёва балючым целам незамутнёна-спакойнай патокай. І ён паволі цішэў, аддаляўся.

Ён аддаляўся...

Працяты раптам трывогаі, Уладзік узняў галаву і зірнуў у той бок, адкуль ляцелі знаёмыя гукі.

Трактар, падрыгваючы, няроўна, але ўпарта ішоў туды, дзе поле зрывалася крутым і глыбокім ярам.

Забыўшы на ўсё, Уладзік ірвануўся на ногі і, апаломлены пясцерпным болем, паваліўся назад на зямлю.

Трактар ішоў па пэўную гібель.

«Трэба на адпой пазе... скакаць...»

Уладзік устаў на здаровую нагу, скочыў некалькі раз і зачапіўся за раллю, рынуўся долу.

Тады ён рашыў паўзці.

Ён цягнуў за сабой пакалечаную нагу як грамоздны, амаль непасільны цяжар. Нага балюча скародзіла на ралі, і здавалася, што яна набірае на сябе цэлыя пласты вільготнай тлустай зямлі, што яна расце, вырастае ў вялізную неўваротную камлыгу.

Уладзік ужо не трымаецца больш — слёзы наплываюць яму на вочы, пякучыя даўкія слёзы роспачы, і ён, плачучы, гукае сваіго свавольнага друга:

— Чакай ты... чакай...

Трактару асталося да абрыву ўсяго некалькі крокаў.

Уладзік напінае астатнія сілы. Галава ў яго пачынае туманіцца, момантамі ён зусім забываецца, дзе ён, што з ім такое, чаму ён мусіць праз гэты нялюдскі боль і напружанне імкнуцца некуды наперад, неадступна некага даганяць. Хворая нага разраслася, здаецца, у цэлую гару — ён не нагу ўжо цягне за сабой, а ўсё гэта поле, усю гэту чорную, прасычаную кроўю раллю.

— Чакай жа ты... Ну, чакай...

Адлегласць да трактара ўсё змяншаецца, яшчэ некалькі крокаў, некалькі секунд нялюдскага напружання — і ён ратуе машыну.

Дзікі прарэзлівы крык, які адпекуль здалёк даляцеў да Уладзіка, скалануў яго новым прылівам сударгавага парывання. Ён не зразумеў, чый гэта крык, адкуль ён сюды прыляцеў — ён успрыняў яго, як сігнал да апошняга адчайнага напружання сіл, якое павінна вырашыць усё. І калі трактар ужо ўзышоў пярэднімі коламі на самы край абрыву, калі ясна Уладзіку стала, што яму не дапаўзці, не перамагчы гэтых астатніх крокаў, ён ізноў, запядбаўшы боль, узняўся з зямлі, абапёрся з усіх сіл на здаровую нагу і, рыпуўшыся ўперад, павіс грудзьмі на сядзенні трактара.

Рука яго — ужо зусім цяжкая, неслухмяная — вяла намацала добра знаёмы рычаг.

Трактар пярэднімі коламі ўгруз у мяккі бераг абрыву і стаў так, нахіліўшыся ўніз, нібы ён затым і ішоў толькі, каб паглядзець, што там ёсць, на дне гэтага крутога, глыбокага яра.

Перад тым як канчаткова страціць прытомнасць, Ула-

дзік убачыў у цяжкіх зыбучых хвалях тумана чорныя вочы, шырока раскрытыя, палітыя полымем дзікага жаху.

* * *

І вось ён, канец...

Белыя сцены пакоя распасціраюць наўкола празрыстую, бязмежна спакойную пустату. Няма на чым суняць вока, няма за што зачапіць млявую думку.

Усё назойліва белае, усё пустое. Белы ложак, белыя прасцірадлы на ім, белая тумбачка побач з ложкам. Не іначай,— з белага зроблен той падазроны скрутак на канцы нагі, што роўненькай горкай уздымаецца над прасцірадлам.

Уся белая ўваходзіць у палату сястра. Падыходзячы да Уладзіка, яна ўсміхаецца дужа ласкава і трошачку вінавата — так заўсёды падыходзяць да няшчаснага калекі добрыя чулыя людзі.

Яна сядае пры ложку і мякка загаварвае з Уладзікам. Яна гаворыць пра нейкае геройства, пра яго, Уладзікаў, геройскі ўчынак. Ён, бач, пакалечаны, ледзьве жывы, увесь сыходзячы крывю, кінуўся ратаваць трактар, грамадскую ўласнасць. І ён ратаваў яго, самаадданa рызыкуючы сваім жыццём.

Уладзік дасадліва крывіцца. Ён упэўнены, што сястра гаворыць усё гэта, каб заспакоіць яго, каб пагадзіць яго з тым, што адбылося. Няма чаго казаць, знайшлі героя!

Зноў расчыняюцца дзверы ў палату, і ўваходзіць яшчэ адна ў белым, мабыць, другая сястра. Яна таксама ідзе да ягонага ложка. Першая чамусьці борздзенька ўстае і ў лёгкім замяшанні выходзіць з пакоя. Уладзік з вострым здзіўленнем, з неймавернасцю глядзіць на гэту другую, на малое кучаравае стварэнне.

Ён злосна настарожваецца. Хай толькі падыдзе, хаяй паглядзіць на яго так, як тады... Ён крыкне ёй проста ў твар:

— Гэта праз цябе! Гэта ты вінавата!

Вера ціха падыходзіць да ложка і з простай, спакойнай ласкай, з матчынскай ласкаї папраўляе падушку. Калі яе зусім тандэтная ручка дакранаецца да яго шчакі, яму робіцца раптам лёгка і прыемна. Але ён яшчэ не здаецца, ён з суроваю дапытлівасцю ўзіраецца ў яе чорныя вочы, шукаючы ў іх хоць малюсенькай дробачкі халоднага, чужога, пяшчырага. І бачыць у іх такое яснае, такое

глыбокае святло пяшчоты і ласкі, ад якога ўраз растае ў ім увесь лёд варожае недаверлівасці.

Тады — пераможаны, расчулены, ён пераводзіць сумны погляд на ложак, туды, дзе роўненькай горкай узды-маецца белае прасцірадла.

Вера не дае глядзець туды — яна паварочвае да сябе яго твар і з радаснай дзелавітасцю тлумачыць яму:

— Я ўжо аб усім гаварыла... Як ты паправішся, мы паедзем у горад, і там зробяць так, што павят ніякага знаку не будзе... Сто працэнтаў працаздольнасці...

Уладзік моўчкі ўсміхаецца — яго больш за ўсё пацяшае гэтае смешнае нечаканае «мы».

— І наогул мы астанёмся ў горадзе. Цябе пасылаюць на вучобу, гэта вырашана канчаткова. Будзем разам жыць, вучыцца, працаваць...

Уладзік выразна чуе, як празрыстая пустата, што была распасцёршыся навокал яго, цудоўна напаўняецца зусім рэальным і надзвычай прыгожым зместам. Падбадзёрапы гэтым адчуваннем, ён узнімае на Веру адважны погляд і раскрывае рот, каб сказаць нарэшце тое, чаго ніяк не патрапіў сказаць дагэтуль.

Але Вера раптам нахіляецца да яго твару і закрывае рот яму ціхім доўгім пацалункам...

Яна ізноў — гэтае нялюбае дзеўчынё — не дала яму сказаць рашучага слова. Але Уладзік ужо не злуецца, бо ён і сам бачыць, што гэта слова цяпер зусім непатрэбнае.

КАМЕНТАРЫІ

У ГЛЫБІНЯХ КАНТЫНЕНТА «МАЛОЙ ПРОЗЫ»

Свой шлях у літаратуру Міхась Зарэцкі пачынаў з «малой прозы» і на працягу ўсёй творчай дзейнасці ахвотна звяртаўся да гэтай ёмістай жанравай формы. Што ж уяўляе сабой «малая проза» М. Зарэцкага з пункту гледжання зместу, стылёвай адметнасці? Яе тэматычны аспект даволі шырокі і разнастайны. У сферу пісьменніцкай увагі траплялі перш за ўсё надзеі рэвалюцыйнай рэчаіснасці, жыццё працоўнага чалавека на пераломе гісторыі, класавыя сутыкненні, драматызм барацьбы новага і старога, духоўны рост чалавека, спазнаўшага радасць перамогі над неспрыяльнымі абставінамі і над самім сабой.

У даследчых працах, прысвечаных М. Зарэцкаму, справядліва падкрэсліваецца, што ўжо раннія творы пісьменніка атрымалі высокую ацэнку з боку крытыкі і былі надзвычай прыхільна сустрэты чытачом. М. Зарэцкі адразу стаў адным з найболей папулярных беларускіх пісьменнікаў. Пагаджаючыся з гэтым сцвярджэннем, трэба, аднак, сказаць, што крытычная літаратура, прысвечаная М. Зарэцкаму як майстру-апавядальніку, увогуле небагатая. Здзіўляцца гэтаму, мабыць, не варта. Сярод крытыкаў і сярод гісторыкаў літаратуры стала ўжо кепскай традыцыяй нават у крытыка-біяграфічных нарысах асноўную ўвагу аддаваць творам буйной жанравай формы — аповесці, паэме, п'есе, раману. Апавяданні ж, вершы, нарысы найчасцей разглядаюцца выбарачна або ў агульным плане. Даследчыкі рэдка аналізуюць змест асобнага твора, іх цікавяць пераважна дамінуючыя тэндэнцыі, агульныя тэматычныя кірункі, стылёвыя плыні і г. д. Безумоўна, такі падыход таксама правамерны: «лініі» і «плыні» павінны вывучацца, асабліва ў тэарэтычных, абагульняючага тыпу працах, але гэта не адмяняе неабходнасці аналізаваць змест, вобразную структуру, ідэйны пафас твораў малой жанравай формы. Як паказвае літаратуразнаўчая практыка, пярэдка мастацкая адметнасць, своеасаблівасць такіх твораў цалкам раствараецца ў развагах пра агульныя тэндэнцыі і заканамернасці. Тэндэнцыі даследчык выявіць, але пры гэтым знікае мастацтва, яго спецыфіка. Знікае самабытны, непаўторны твар пісьменніка, тое, чым ён адрозніваецца ад іншых. Выдаткі падобнай метадалогіі, думаецца, павінны быць зжыты.

Даследчыкамі творчасці М. Зарэцкага зусім беспадстаўна абмінуты шэраг яго ранніх твораў, якія ў мастацкіх адносінах яшчэ недаскапалыя, але якія даюць магчымасць паўней раскрыць кірунак пошукаў гэтае пары, убачыць цяжкасці, перашкоды, што паўставалі перад маладым празаікам. А цяжкасці сапраўды мелі месца. Так, напрыклад, у апавяданнях «Цішка Бабыль» (1922), «Як гэта часам трапляецца», «З пашых дзён», «Поччу» (усе — 1923) багата траных жыццёвых назіранняў, падобных праўдзівых сцэн, сітуацый, хоць усё гэта яшчэ не зліта ў мастацкую цэласнасць, у сюжэтна-вобразнае адзінства. Вось змест апавядан-

ня «Як гэта часам трапляецца». Стомлены цяжкай працай селянін Якуб не прымкнуў на замок кабылу, якую пусціў на пожню. Жонка ўгаворвае свайго ўпартага гаспадара, але ўсё дарэмна. Калі ж кабылу сапраўды ўкралі, селянін з адчаю забівае да смерці жонку, быццам яна і паклікала бяду. Прыказчык Саўка («З нашых дзён») паддаўся на ўгаворы вясковага багацея, падналіў сялянскі кааператыў, загадзя вынесшы адтуль тавар. Потым ён прызнаецца ў злачынстве. Ягор Доўгі («Ноччу») па дарозе з млына праз уласную сквапнасць, зайздрасць забівае маладога селяніна Мікіту, але злачынства раскрываецца.

У прыгаданых творах жыццёвы матэрыял эстэтычна яшчэ слаба асэнсаваны. Перад намі цікавае, займальнае здарэнне, узятае з вясковай рэчаіснасці. Характары дзеючых асоб тут глыбока не раскрыты, матывы ўчынкаў псіхалагічна не вытлумачаны. Аднак і ў гэтых творах ужо выявіліся некаторыя рысы непаўторнага аблічча Зарэцкага, перш за ўсё — увага да простага чалавека, да яго ўнутранага жыцця, шчырасць пісьменніцкай інтанацыі, імкненне будаваць твор на вострых, драматычных калізіях.

Апавяданне «Ноччу» прэтэндуе на псіхалагічную глыбіню. Падрабязна ўзнаўляюцца душэўны стан, перажыванні станоўчага героя, ягонае прадчуванне бяды. Але і тут матывы ўчынкаў Ягора таксама глыбока не вытлумачаны. Атрымліваецца, што ён зрабіў злачынства проста таму, што дрэннай натуры чалавек.

Цікавую заяўку на стварэнне тыпу вясковага жыхара, які адарваўся ад земляробчай працы, зрабіў М. Зарэцкі ў апавяданні «Цішка Бабыль». Калі пачалася рэвалюцыя, узначаліў шавец Бабыль пракудзішскіх беднякоў, якія перш за ўсё мясцовага багацея Рамана арыштавалі: «Але Раман хоць і спалохаўся, а не здаваўся адразу. Пачаў лаяцца, пагражаць, мандата вымагаць. Вось яму тады і паказалі мандат: скруцілі ды пасадзілі ў халодную хату» [1]. Праўда, выпусцілі хутка, але ўжо ад імя камбеда, па чале якога стаў Цішка, пачалі маёмасць Раманаву парадкаваць, засекі падчышчаць. Вырашыў было Цішка камуну сарганізаваць, калектыўную апрацоўку зямлі наладзіць, ды ўбачыў, што не падтрымаюць яго сяляне: «Дужа хочацца кожнаму з іх мець своіі асобны кавалачак. Вякамі ўзгадавалася ў іх гэтае жаданне». Давялося Цішку і самому ўзяць невялічкі надзел. Тут і пачаліся галоўныя цяжкасці. Калісьці вучыў шавец вяскоўцаў, як «араць трэба і як зямлю ўгнаіць», а калі сам узяўся, дык не заладзілася ў яго гаспадарка. «І Цішка біўся, як рыба аб лёд, клаў усе свае сілы, а ўсё не было ладу. Глядзіць ён на другіх мужчын і сам аж зайздрое: гэтак спрытна і лёгка ў іх выходзіць» [2]. Кінуў Цішка земляробчую працу, вярнуўся да шавецтва. Па-ранейшаму стаіць на чале вясковай улады, дапамагае сялянам. А калі хто запытае, чаму не паляпшае свой дабрабыт і па-ранейшаму жыве ў старой хаціне, усміхнецца Бабыль і скажа: «У пралетарыя няма баць-каўшчыны».

Перад намі, як бачым, своеасаблівы канспект будучага вялікага твора. Пісьменнік як бы робіць паасобныя накіды, дае характарыстыку свайму герою, намячае пэўныя сюжэтныя калізіі, выяўляе рысы сацыяльнай псіхалогіі сяляцтва. Глядзіце, як да-

---

[1] Сав. Бел., 1922, 22 лістап.

[2] Тамсама.

кладна вызначаны паводзіны беднякоў, што арыштавалі мясцовага багацея. А як трапна раскрываецца псіхалагічны настрой Цішкі, калі ён атрымаў уласны надзел зямлі, пяўдалыя яго спробы стаць гаспадаром. Але ўсё гэта толькі паасобныя фрагменты, не спалучаныя ў адзінства. Ды і твор пазбаўлены выразнай мастацкай ідэі, абагульняючай думкі. Ён расцягнуты, апісальны, у ім пераважае інфармацыйнасць.

Мы звяртаем увагу на прыгаданыя тут апавяданні не з той мэтай, каб падкрэсліць думку, што ў ранні перыяд з-пад пяра М. Зарэцкага з'яўляліся і недасканалыя творы. Справа не ва ўзроўні мастацкай дасканаласці, бо гаворка ідзе пра маладога пісьменніка. Тым болей што ў гэты ж час Зарэцкім напісаны і змястоўныя, па-мастацку моцныя апавяданні, накшталт «У Саўках», «У віры жыцця», «Чаплюк», «Мар'я». Прычына нашай увагі да ранніх твораў іншая. Даследчыкі ў пераважнай большасці лічаць, што М. Зарэцкі пачынаў свой шлях у літаратуру як рамантык, паступова вызваляючыся ад рамантычнай паэтыкі і выпрацоўваючы стыль рэалістычнага пісьма. «Мастацкая індывідуальнасць М. Зарэцкага, які пачынаў як рамантык-маладняковец, а затым упэўнена ступіў на пазіцыі рэалістычнага адлюстравання жыцця, складвалася ў працэсе пяспынных ідэйна-стылёвых пошукаў»,— сцвярджае А. Майсеенка [1]. Дык вось названыя вышэй раннія апавяданні, тыя ж «Цішка Бабыль», «Як гэта часам трапляецца», «З пашых дзён», «Ноччу», а таксама іншыя творы, пра якія размова ўперадзе, сведчаць аб адваротным. А імення аб тым, што пачынаў М. Зарэцкі з рэалістычных твораў, толькі рэалізм гэты быў, як мы бачылі, пакуль што пясталы, бытавы, блізкі да патуралістычнага ўспаўлення канкрэтыкі.

Бытавая плынь жыцця яшчэ перамагала абагульняючую думку маладога пісьменніка, звязвала яго пястрымную творчую фантазію. Думаецца, што да рамантычных форм адлюстравання М. Зарэцкі звярнуўся, апрача ўсяго іншага, і як да паратунку ад пагрозы патуралістычнага апісальніцтва, ад пагрозы эмпірыкі, фактаграфічнасці, выразпая пячатка якой ляжыць па разгледжаных вышэй творах. Відаць, пісьменнік бачыў недахопы першых уласных празаічных спроб і шукаў сродкаў іх пераадолення.

Аб інтэнсіўнасці гэтага пошуку якраз і сведчыць той факт, што адначасова з творамі тыпу «Як гэта часам трапляецца», «З нашых дзён», «Ноччу» М. Зарэцкі піша апавяданні, у якіх больш выразна праявілася абагульняючая аўтарская думка, умение асэнсоўваць канкрэтныя з'явы і факты рэчаіснасці, ствараць чалавечыя характары. Да ліку такіх твораў можна смела аднесці «У Саўках» (1922), «У віры жыцця», «Чаплюк», «Мар'я» (усе — 1923).

Так, абуджэнне чалавечага ў чалавеку, радасць яднання з людзьмі, перамога добрых пачаткаў душы над злымі складаюць унутраны змест апавядання «У Саўках». Пяцёра вясковых хлопцаў не хочуць ісці ў войска. Яны схаваліся ад улады ля Саўкоў, «дзе далёка-далёка, на колькі вёрст цягнуцца бяздонныя прорвы-равы», спадзеючыся адсядзецца ў глухамані. Спярша добра было, але паступова ўсё змяпілася да горшага: «З вёскі пайшлі малады. Некаму стала прыходзіць. Зусім забылася па іх вёска. Го-

---

[1] Майсеенка А. Творчасць Міхася Зарэцкага.— Мн., 1978.— С. 4.

лад пачаўся. І ўсё цяжэй на дупы рабілася»[1]. І запрапаваў хтосьці з дэзерціраў запяцца рабаўніцтвам. Адпак не здолеў пераступіць мяжу паміж дабром і злом адзін з хлопцаў па прозвішчы Смоўж, пайшоў насупраць волі і жадання астатніх. Не са страху перад магчымым пакараннем, а таму што не прыняла душа вясковага працаўніка злачынства. «Жыць па-воўчаму ў лесе абрыдла. Дый без работы мутарна неяк. Так захацелася жыць, як усе, акунуцца ў жыццё з галавой» (6). Сарваў Смоўж першую задуманую аперацыю — абрабаваць валаснога, які будзе з горада везці грошы. «У горад... у войска... Няхай будзе, што будзе. Турма дык турма. Абы да людзей, абы жыць так, як людзі, а не туляцца, што воўк, па лясах...»,— з такім рашучым настроем уступае хлопец у новае жыццё.

Апавяданне «У Саўках» яскрава пацвердзіла думку аб тым, што поспех чакаў пісьменніка там, дзе ён, абапіраючыся на жыццёвую рэальнасць, не капіраваў, а пераўтвараў яе па законах прыгожага. І сапраўды, пісьменнік пазбегнуў тут натуралістычнай апісальнасці, нагрувашчвання фактаў. Аўтарская думка раскрыта пераканальна. І не шляхам голай дэкларацыі, а мастацкімі сродкамі. Сюжэтнае дзеянне разгортваецца натуральна, нязмушана. Чытач успрымае героя як жывога чалавека.

У некаторых ранніх творах М. Зарэцкага адсутнічае выразна акрэслены сюжэт, мала дынамізму, мала сюжэтнага дзеяння. Тым не менш вызначальныя рысы характару герояў раскрываюцца даволі пераканальна. Творы гэтыя, напрыклад, апавяданне «Чаплюк», сагрэты цёплым аўтарскім пачуццём, прасякнуты турботай пра чалавека, яго лёс, яго заўтрашні дзень.

Служыў у войску пісарам чырвонаармеец Чаплюк. Уласна толькі ў арміі і навучыўся добра пісаць: «Проста ад станка з завода пайшоў ён бараніць Саветы» (27). І быў у хлопца выдатны талент артыста. «Ён табе і тэатр, і балет, і опера, калі хочаш. А то проста скорчыць такую міну, што ўсе аж кладуцца» (28). Ніколі не адчайваўся малады пісар, умеў падбадзёрыць, узняць дух стомленых цяжкімі пераходамі байцоў. А калі надышла пара дэмабілізацыі, аказалася, што няма куды ехаць пісару-сіраце. І хоць на людзях радаваўся ён ад'езду, але ў душы быў разгублены, баяўся. «Паедзе, можа, на гора, на бядоту толькі затым, што яму пасля выказанай радасці неяк сорамна ўжо заставацца» (31). Тады падумаліся яго сябры дапамагчы адзінокаму хлопцу. Са згоды начальства, якое адгукнулася на просьбу чырвонаармейцаў, было даслана Чаплюку распараджэнне, паводле якога «ўсе сакратары ячэек на нявызначаны час затрымліваюцца ў войску» (32), у тым ліку і Чаплюк. І адразу заспакоіўся малады баец, вярнуўся да свайго звычайнага, пармальнага стану. Дабрыня, спагада, здольнасць чырвонаармейцаў зразумець чужое гора зрабілі вялікую справу — умацавалі веру чалавека ў жыццё, у людзей, прынеслі яму радасць.

Гэтая ж гуманістычная ідэя прапізвае і апавяданне «Мар'я», у якім раскрываецца цяжкі лёс жанчыны, абставінамі жыцця вымушанай выйсці замуж за багатага, але нялюбага. Давялося Мар'і цярпець бясконцыя папіканні і прыдзіркі гарбуна Ягора. Але сустрэўся ёй малады Ляксандра, што служыў нестраявым у арміі.

---

[1] Зарэцкі М. Пачатак шчасця. Выбраныя апавяданні.— Мн., 1975.— С. 6. Далей спасылкі на гэта выданне — у тэксце.

Пакахала яго Мар'я, ды не змагла кінуць мужа, бо пашмат маладзейшы за яе Ляксандра, не хоча псаваць яму жыццё жанчына, ведае, што ўсё ў яго наперадзе. З пачуццём горычы, але і з удзячнасцю развітваецца яна з Ляксандрам, які адкрыў ёй новы свет сваімі адносінамі: «Стаяла і глядзела на яго, праводзячы ўпартым, напружаным поглядам, быццам хацела як наймацней захаваць яго вобраз у сваёй душы. І ў гэтым яе поглядзе адбівалася непамерная, адчайная туга, туга чалавека, ад каторага адрываюць усё роднае, блізкае, дарагое» (57).

І ў шэрагу іншых твораў ранняга перыяду М. Зарэцкі праявіў не толькі вострую назіральнасць, уменне ўглядацца ў хуткаплынны бег часу, але і здольнасць бачыць тыя супярэчнасці, якія нараджала новая, паслярэвалюцыйная эпоха. Апавяданне «У віры жыцця», думаецца, невыпадкова дало назву першаму зборніку. У аснове яго сюжэта — востры сацыяльны канфлікт паміж працоўным чалавекам і ўладай у асобе мясцовага начальства. Апошняя вельмі хутка пачынала засвойваць псіхалогію дарэвалюцыйнай адміністрацыі, ігнаруючы інтарэсы народа. Герой апавядання, былы франтавік Міхалка, не жадае змірыцца з тым, што вясковыя кіраўнікі — старшыня сельскага Савета, «здаровы мужык з грубым драўляным тварам — толькі вочы хітра, пудліва бегаюць» і пісар, «яшчэ маладзенькі, жвавы і прапырлівы, што лісічка — у фрэнчыку, галіфэ, з партфелем — камісар, дый годзе...» (12) — чыняць здзек з бедных і бяспраўных. Яны знайшлі магчымым у карыслівых мэтах нарэзаць мясцоваму пану пожню лугу, але адмовілі былому салдату-інваліду ў яго просьбе. «Па вашаму дзелу рэзалюцыя не можа быць... Лугі падзелены... ясцесцвенна, і прычытаюччая за арэнду сума з удзельнікаў узыскана... Значыцца, рэзультату не прадвідзіцца» (15),— вось якой тарабарскай, нечалавечай мовай спрабуе пісар абгрунтаваць парушэнне закону. «У губерні нічога не зробяць — у Маскву паеду, да самога Леніна дайду, а свайго даб'юся,— гаворыць Міхалка.— Мне не тое ў галаве, што там пожні на які воз не далі — гэта глупства... Але час ужо іхнюю хеўру разагнаць.— Не, але да чаго дайшло? Засселі, закупілі воласць, робяць, што хочуць, ды яшчэ смяюцца з нашага брата» (10).

Вясковы праўдашукальнік не змог давесці справу да канца. Страх выкрыцця штурхае мясцовых кіраўнікоў на новае злачынства: Міхалка быў забіты. Апавяданне М. Зарэцкага пазбаўлена таннага аптымізму. Хоць ініцыятары забойства і іх хаўруснікі з воласці былі арыштаваны, але з гэтага не вынікала, што на іх месца не з'явяцца новыя прыстасаванцы. Малады пісьменнік усведамляў, якім цяжкім будзе шлях да ўсталявання сацыяльнай справядлівасці.

Сталая арыентацыя на з'явы вясковага, сялянскага жыцця была ўласціва многім маладым беларускім пісьменнікам 20-х гадоў. Характэрная яна і для М. Зарэцкага. Аднак абсягі яго творчых інтарэсаў з самага пачатку былі даволі шырокімі, разнастайнымі. Гэтаму спрыяў і жыццёвы вопыт, набыты маладым пісьменнікам за час працяглай службы ў Чырвонай Арміі. І сапраўды, у апавяданнях пісьменнік часта звяртаўся да новых, мала распрацаваных тагачаснай беларускай літаратурай пластоў сацыяльнай рэчаіснасці і праяў духоўнага жыцця чалавека, у прыватнасці, да адлюстравання лёсу прадстаўнікоў таго класа, каго рэвалюцыя пазбавіла ранейшых прывілеяў, лёсу «былых»,

«учарашніх». Найболей цікавае адлюстраванне гэта тэма знайшла ў апавяданнях «Ворагі» (1923), «Адна партыя ў шашкі» (1924), «Кветка пажоўклая» (1926), «Двое Жвіроўскіх» (1926) і інш.

Мастацкі ўзровень гэтых твораў, глыбіня аўтарскага асвятлення праблемы, безумоўна, розныя. Ды і наўрад ці правамерна патрабаваць, каб з-пад пяра маладога пісьменніка выходзілі толькі дасканалыя рэчы. Тым не менш амаль усе апавяданні М. Зарэцкага, звернутыя да тэмы лёсу «былых», прасякнуты гуманістычным пачуццём спачування да ахвяраў рэвалюцыі. На гэтую кантоўную якасць творчасці М. Зарэцкага і даваенная крытыка, асабліва ў 30-я гады, і даследчыкі другой паловы 50—70-х гадоў не маглі акцэнтаваць увагу, засцерагаючыся папрокаў у падтрымцы абстрактнага гуманізму, у пазакласавым падыходзе да мастацтва. Сёння ж мы маем магчымасць, не баючыся надуманых папрокаў, па-сапраўднаму ацаніць пазіцыю М. Зарэцкага і аддаць яму належнае як мастаку-гуманісту і грамадзяніну. У яго творах няма спрошчана-дэфармаванага погляду на ўчарашніх эксплуататараў, няма закліку да распальвання нянавісці і татальнага вышчэння былых ворагаў. У наш час гэтыя апавяданні набываюць, нарэшце, сваё сапраўднае жыццё.

Пры разглядзе такіх, напрыклад, апавяданняў, як «Ворагі», аспоўная ўвага звычайна звярталася на галоўнага героя, на праблему ўзаемаадносін грамадскага і асабістага. Аўтарскую пазіцыю даследчыкі ацэньвалі, зыходзячы з характарыстыкі гэтага героя. Але не менш важна бачыць і тое, што вобразы «былых» адыгрываюць тут зусім не службовую, не другарадную ролю. Так, псіхалагічны стан, роздум і перажыванні, далейшы лёс Ніны Купрыянавай, дачкі былога памешчыка, цікавяць пісьменніка таксама, як і ўнутраны свет старшыні павятовай ЧК Паўла Гуторскага. І гэта вельмі важны момант. Гуторскаму давялося арыштаваць Купрыянава за дапамогу бандытам, на чале якіх стаяў жорсткі, бязлітасны атаман Заруба. І дачку памешчыка Гуторскі спярша ўспрымае варожа, бачыць у яе абліччы «класавага ворага», хоць у юнацтве шчыра захапляўся прыгажосцю гэтай дзяўчыны.

Але здарылася так, што Гуторскі пакахаў Ніну. Яна ж не змагла адказаць узаемнасцю на ягоныя пачуцці. Не змагла таму, што любіць атамана Зарубу, нават дзіця ад яго чакае. І хоць у імя выратавання бацькі Ніна добраахвотна выдала чэкістам свайго каханка, яна псіхалагічна засталася ў мінулым, не знайшла душэўных сіл пераламіць сябе, стаць іншай. «Ладу не можа быць, мы — розныя людзі. У мяне адны нахілы, а ў вас — другія, у мяне адна ўрода, у вас — другая... Я не магу перавярнуцца, стаць падобнай да вас, таксама, як вы...» (93),— заяўляе Ніна Гуторскаму, калі той запрапанаваў ёй выходзіць за яго замуж.

Ужо сама па сабе пастаноўка ў пачатку 20-х гадоў такой ідэалагічна вострай тэмы, як адносіны да прадстаўнікоў старога свету мела выключна вялікае грамадскае значэнне, бо асвятлялася тэма з выразна гуманістычных пазіцый. І гэта мы павінны сёння ацаніць на вялікім рахунку. Пісьменнік глыбока спачуваў прадстаўнікам буржуазнай інтэлігенцыі, якіх рэвалюцыя кінула ў вір грамадзянскай вайны. Вядома, станоўчыя героі твораў не збіраюцца амніставаць усіх «былых» без разбору (атаман Заруба, памешчык Купрыянаў), але невінаватых ахвяраў рэвалюцыйнай навальніцы шчыра шкадуюць. Невыпадкова сялянскія

дзеці цягнуцца да т. зв. вышэйшага, папскага свету, да тых агульначалавечых каштоўпасцей, якія ён, гэты свет, утрымліваў, да гарадскої культуры, адукаванасці. Яны і самі не могуць разабрацца, чаму так прыцягвае іх тая несяляпская прыгажосць, якую ўвасабляюць учарашнія паненкі. Заканамернымі ў гэтых адносінах былі разважанні Гуторскага: «Ну што ж там! Любоў мае сваё асабістае права. Любоў не разбірае: ці вораг, ці прыяцель... яна бачыць толькі жанчыну, толькі яе жаночае харaство... І хіба не можа пралетарый любіць буржуйку? Хіба яму можа хто ці што забараніць гэта? Хіба на каханне можна, як і на ўсё, глядзець выключна з класавага погляду? Прэч забабоны!..» (81).

Вядома, Гуторскі быў і застаўся сынам свайго часу. Побач з рэвалюцыйнай мэтанакіраванасцю, жаданнем аддаць усе сілы барацьбе за савецкую ўладу, старшыня ЧК нёс у сваёй свядомасці, у сваім характары і пэўную класавую абмежаванасць. Ён не змог адкінуць забабонаў, спужаўся праяўленай смеласці духу, унутранай свабоды, уласных палымяных пачуццяў да Ніны, а калі тая не адказала ўзаемнасцю, дык паспрабаваў вытлумачыць тое, што з ім надарылася, ледзь не сацыяльнай хваробай. «Усю ноч ён тады прадумаў. Раскалупаў сваё нутро, рабіў пільны абгляд самога сябе. І тады ён зразумеў, што захварэў, што трэба лячыцца, пакуль не позна. Ён яспа вызначыў сваю хваробу, знайшоў яе карані, яе прычыну. Ён адарваўся ад народа, адышоў ад яго. Патраціў звязак з яго жыватворнай глебай. Яшчэ момант — і парвуцца астатнія карані, якія яшчэ засталіся, якія яшчэ хаця слаба, але прывязваюць да працоўнай глебы, падаюць яшчэ жыццёвыя сілы» (95). Калі гэтыя сілы парвуцца, тады яго, Гуторскага, чакае доля Ніны, «доля пажоўклых, адарваных ад дрэва лістоў». Разважанні героя народжаны, бясспрэчна, яго разгубленасцю перад уласным пачуццём, перад свабодай сваёй думкі і свабодай выбару. Замацаваць гэтую свабоду герой маладога пісьменніка,— а належыць апавяданне да самых ранніх, яно датуецца 1922 годам,— яшчэ не мог.

Тое, што Гуторскі ў разгубленасці — як магчымасць — параўноўвае сваю долю з рэальнай доляй Ніны, гаворыць не ў яго карысць. Паглядзіце, з якім разуменнем аб'ектыўных абставін часу і з якой дабрынёй, сардэчнасцю і пачуццём самаахвярнасці развітваецца Ніна: «Дый што вы, Павел Мікалаевіч! У вас жыццё наперадзе — ноўнае, цэлае, незламанае. У вас ёсць чым і дзеля чаго жыць... для вас ёсць месца, пачэснае месца ў жыцці... А я... я ўжо нябожчыца... Жывая нябожчыца... Паспрабую яшчэ маткай быць, можа, тут знайду сабе месца, можа, здаволюся хоць на часінку... А калі не... тады...» (94).

Але не будзем дужа дакараць і Гуторскага, бо, нягледзячы на свой рэвалюцыйны максімалізм, з якім ён падыходзіць да ацэнкі ўласных паводзін, у душы ў яго шмат дабрыні і чалавечнасці. Вось як чула зрэагаваў старшыня ЧК на горкія, несправядлівыя выказванні Ніны адносна сваёй будучыні: «Гуторскі слухаў яе, абураны глыбокім жалем. Гэты жаль ахапіў усяго яго, зліў у сабе ўсе пачуцці... Каб ён мог, каб ён умеў ратаваць яе, нагадзіць яе з жорсткім жыццём! Гэтую любую, дарагую яму дзяўчыну!» (94). Вось такая здольнасць героя да супераджывання сведчыць, што працэс яго духоўнага станаўлення яшчэ не завяршыўся, і пазней герой здолее многае зразумець у жыцці.

Тэма «ворагаў» знайшла свой арыгінальны працяг у апавя-

данні «Адна партыя ў шашкі». Камандзір чырвонаармейскага атрада Аспач, захапіўшы ў сутычцы з бандытамі іхняга кіраўніка, прапанаваў яму згуляць партыю ў шашкі. Не здолеў камандзір выйграць. І ён забіў пераможцу. «Аспач стаяў перухома. Не ведаў ён сам, пашто забіў пана, за што. Дый не думаў пра гэта. Нешта падказала з путра, што трэба так, што павінен забіць, што вораг гэты кроўны, упарты — узяў і забіў» [1].

Нельга пагадзіцца з меркаваннямі тых даследчыкаў, хто адносіць апавяданне М. Зарэцкага да твораў, дзе «складаны жыццёвы тып у літаратуры часта падмяняўся спрошчанай схемай...», і хто лічыць, што «характар героя тут толькі намячаецца», а ўчынак «слаба матываваны, псеракапаўчы» [2].

Пісьменнік не апраўдвае ўчынены чырвонаармейскім камандзірам самасуд, ён толькі спрабуе вытлумачыць, чаму Аспач зрабіў менавіта так, чаму паддаўся ўнутранаму імпульсу. Матывы паводзін Аспача — у няпавісці бяспраўных да крыўдзіцеляў. Але аўтара апавядання не задаволіла ўласпая лаканічпая капстатацыя, і ён тут жа выказаў здзіўленне пакопт маўклівай пасіўнасці сведак гэтага ўчынку: *«І дзіўна,* што ні ў кога не мігнула ў гэты жудасны момант думка асуджэння. *Быццам усе згодны былі* з Асначом, *быццам кожны разважаў* сваім простым нямудрым розумам.

— Яму трэ было гэтак зрабіць...» (курс. наш.— *М. М.*).

Няхай і няма тут рашучага асуджэння самасуду, але аўтарская ацэнка выразная і педвухсэнсавая: пан быў палонным, і забіў яго камандзір не ў адкрытым баі, не ў роўнай сутычцы. І з боку прысутных там не было падтрымкі: пісьменнік гаворыць, што гэта толькі здавалася, «быццам усе згодны» з самаўпраўствам камандзіра. Маўклівыя паводзіны відавочцаў гэтага «жудаснага моманту» — тая ж праява сацыяльнай пасіўпасці ўчарашніх бяспраўных, іх гатоўпасць пакорліва падпарадкоўвацца волі начальства. Пасіўнасць, але не згода, не маральная падтрымка і адабрэнне!

Аўтарскія спачуванні да ахвяры самасуду выказаны і ўскосна. Пісьменнік аддае належнае пану, які не прыніжаецца, не хітрыць, не спрабуе выратаваць жыццё свядомым пройгрышам. Пан добра ўсведамляў, чым пагражала яму перамога над камандзірам, але не паступіўся сваім гопарам, чалавечай годнасцю. Выйгрыш у Аспача партыі стаў фактычна дэманстрацыяй інтэлектуальнай перавагі адпаго героя над другім. І пісьменнік не баіцца сказаць пра гэта. Безумоўна, перавага тлумачылася сацыяльным фактарам, тымі прывілеяванымі ўмовамі, у якіх пан меў магчымасць жыць і карыстацца дасягненнямі чалавечай культуры. Мы памятаем, што Аспач спачатку звярнуўся да чырвонаармейцаў, але ніхто з іх не ўмеў гуляць, і тады ён уступіў у паядынак з панам. Паядынак сумленна выйграў пан. У пераможапага інстынкт класавай пяпавісці аказаўся мацнейшым за высакародства і літасць. І аўтар апавядання, з выключнай праўдзівасцю ўзнавіўшы трагічны выпадак часоў грамадзянскай вайны, выразна раскрыў сваю гуманістычную пазіцыю.

Ідэя спачування чалавеку, які з пэўных прычын не здолеў

---

[1] Полымя, 1924, № 4.— С. 61.

[2] Майсеенка А. Творчасць Міхася Зарэцкага.— Мн., 1978.— С. 11.

уваіскі ў новае жыццё, заняць у ім сваё месца, лякыць і ў аснове апавядання «Кветка пажоўклая». Да разгляду гэтага надзвычай чытабельнага твора з займальнай інтрыгай, тым болей пра няпчаснае кахапне, ахвотна звяртаюцца даследчыкі, але трактуюць яго, на жаль, неглыбока, павярхоўна. Проста дзіву даешся ляпоце думкі некаторых аўтараў. «Адмовіўшыся ад свайго «я» і расчараваўшыся ў грамадскай працы, гераіня апавядання Марына Гарнова страціла адчуванне глебы пад нагамі, жыццёвую апору. Па ўласным прызнанні, ёй «няма чым жыць». Але ў творы ўсё ж не разблытаны клубок супярэчнасцей. Праблема самаахвярнага служэння людзям і асабістага шчасця, пастаўленая ў апавяданні, засталася нявырашанай» [1].

Пагадзіцеся, тут цяжка разабрацца, што да чаго. Аўтар канстатуе, што гераіня адмовілася ад свайго «я», расчаравалася ў грамадскай працы, а таму і гіне. Але чаму яна адмовілася ад «я» і ў чым гэта адмаўленне канкрэтна праявілася, у якіх формах? Адкуль ішла расчараванасць, чым яна выклікана? На гэтыя пытанні даследчык не адказвае. Паводле яго логікі, навошта доўга гаварыць пра твор, калі ў ім не вырашана пастаўленая праблема аб суадносінах паміж самаахвярным служэннем грамадству і асабістым шчасцем. Адно пэўна ў разважаннях аўтара: адмаўляцца ад свайго «я» — шкодна. Але ж зводзіць сэнс твора да сцвярджэння такой банальнай сентэнцыі наконт уласнага «я» наіўна, калі не горш.

Дзе вытокі гэтай відочнай невыразнасці адносін даследчыкаў да твора, іх жадання ўхіліцца ад пэўнай ацэнкі выяўленай маральнай пазіцыі пісьменніка? На наш погляд,— у боязі або няўменні заглыбіцца ў змест апавядання і ўбачыць тое, што там ёсць. А змест «Кветкі пажоўклай» глыбокі. Дачка памешчыка Марына Гарнова ў юнацтве паспрабавала парваць са сваім класам, са сваім асяроддзем. І яе спроба здзейснілася. Спярша Марына была эсэркай, а потым яна верай і праўдай служыла савецкай уладзе, «працавала ў надзвычайнай камісіі, займала важную пасаду, добра працавала, была вядома ўсім тутэйшым «контрам» як спрытная чэкістка з пільным вокам і сталёвай цвёрдасцю» (205). У сваёй працы Гарнова, не заўважыўшы гэтага, перайшла мяжу дапушчальнага. Яна стала ахвярай ідэі рэвалюцыйнай бязлітаснасці, жорсткасці, забылася пра міласэрнасць і парушыла маральныя прынцыпы жыцця, і жыццё ёй адпомсціла. Пачалося гэта парушэнне не тады, калі яна па заклікі бацькоў вярнуцца дадому адказала лістом: «Не лічыце мяне вашай дачкой». І зрабіла гэта лёгка, з усмешкай, «гэта была пібы забава маленькая» (220). Не, усё пачалося з таго, калі Марына не працягнула рукі брату, які прасіў паратунку, бо яму пагражаў арышт, і які прысягаў, што, калі сястра дапаможа ўцячы за мяжу, ён не будзе болей выступаць супраць савецкай улады, займацца варожай дзейнасцю. На гэты крык душы спалоханага чалавека «спрытная чэкістка з сталёвай цвёрдасцю» не адгукнулася. Не адгукнулася таму, што бязлітасная барацьба вытруціла з яе душы дабрыню і міласэрнасць. Яна ўласнаручна падпісала смяротны прысуд брату.

Аддамо належнае шчырасці Гарновай. Яна адкрыта прызналася, што *магла дапамагчы, магла даць паратунак*, але не зра-

---

[1] Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. Т. 1.— Мн., 1964.— С. 46.

біла гэтага, бо перад ёй быў родны брат: «А ў той час нікога я не лічыла такімі ворагамі, як сваю радню...» (220). Пасля таго як прысуд быў выкананы, Гарпова атрымала ад бацькі жахлівага зместу «пісульку»: «З гэтага часу будзь ты праклята. Няхай табе жыццё будзе горкай доляй. Бацькава праклянце спасцігне цябе на тваім ганебным шляху» (218).

Гарпова не здолела вынесці цяжару не бацькавага праклёну, а цяжару ўласнага сумлення. Яна ўнутрана зламалася, страціла цікавасць да жыцця, сум, пустата і страх насяліліся ў яе душы. «Алесь, любы мой... Я табе ўсё... усё чыста скажу аб сабе... Мне ўночы дужа страшна бывае. Нейкі смяртэльны сналох надыходзіць... Крычаць тады хочацца, зваць каго, каб прыйшлі, каб быў хто са мной» (221).

Перад намі — сапраўдная трагедыя чалавека, які фактычна прызнаецца ў непапраўных памылках. У выпадку з братам Гарпова давяла ідэю класавай нянавісці да абсурду, і гэта схільнасць да бяздумнага дзеяння дорага ёй каштавала. Моцная воляй, загартаваная ў барацьбе Марына спрабуе яшчэ чапляцца за жыццё. Між іншым, ніхто з даследчыкаў не звярнуў увагу на такую нематэрыяльную, сімвалічную дэталь: гераіня ўладкоўваецца на працу ў дзіцячы дом, спадзеючыся, што блізкасць да бязвінных дзіцячых душ дапаможа ёй забыцца пра трагізм мінулага, знайсці сябе. Спадзявалася былая чэкістка знайсці душэўнае заспакаенне ў каханні. Але дарэмна: для кахання таксама патрэбна і дабрыня, і здольнасць да суперажывання, і міласэрнасць, чаго ў душы Гарповай не засталося. Жанчына, якая культывавала сілу, «сталёвую цвёрдасць», і сродак развітання з жыццём выбрала адпаведны — яна гіне пад коламі цягніка, гэтага сімвалу сталёвай, машынізаванай сілы, што нястрымна імчыць наперад.

У фінале героі твора Булаповіч, прапанову якога выйсці за яго замуж Марына рашуча адхіліла (тут дакладнае паўтарэнне сітуацыі з апавядання «Ворагі»), у чымсьці нават як бы апраўдвае яе смерць: «А мо так лепей? Для яго лепей, бо разарвала тыя ліпучыя путы, павучынне тое атрутнае, што хмелем спавівала яго волю, што цягнула ў прыгожую, але грузную, дрыгвяную багну» (237). Мы зрабілі б, адпак, вялікую памылку, калі б вось гэтыя кароткія рэплікі, як і разважанні Гуторскага з «Ворагаў», уздумалі цалкам атаясаміць з поглядам пісьменніка. Гуторскі і Булаповіч вымушаны прымірыцца з тым, што здарылася насуперак іхняму асабістаму жаданню. Але гэтым яны не адмаўляюцца ад сваіх ранейшых пачуццяў. Яны не закрэсліваюць, можа, лепшых старонак свайго жыцця. Маральны ўрок, які далі Паўлу Гуторскаму і Алесю Булаповічу Ніна Купрыянава і Марына Гарпова, не быў дарэмны. За яго гераіні М. Зарэцкага заплацілі дарагой цаной, нават цаной уласнага жыцця.

Апавяданні М. Зарэцкага, звернутыя да тэмы «ворагаў»,— гэта выдатнае дасягненне беларускай літаратуры 20-х гадоў, моцнай сваім глыбокім гуманістычным пафасам абароны чалавека, пафасам сцвярджэння дабрыні і літасці да нераможаных. Радасна ўсведамляць, што творы гэтыя неяжылі свой час і сёння павінны разглядацца як бясспрэчны духоўны набытак нацыянальнай культуры беларускага народа.

Маральна-этычная праблематыка ў «малой прозе» М. Зарэцкага не вычэрпвалася, вядома, тэмай «былых», «учарашніх». Зусім відавочна, што супярэчнасці лёсу людзей, якія не змаглі ўвайсці

ў новае жыццё, свой пачатак бралі ў часы рэвалюцыі, грамадзянскай вайны. Падзеі, хоць і недалёкага мінулага, станавіліся ўжо гісторыяй. Зарэцкага ж як мастака не магла не прыцягваць і сучасная яму рэчаіснасць, жыццё і праца людзей, побач з якімі ён жыў, клопаты і турботы якіх добра ведаў. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчаць апавяданні «Бель» (1924), «На маладое» (1924), «Дзіўная» (1925), «Пра маіго прыяцеля» (1925), «Смерць» (1926), «Паэма пра чорныя вочы» (1927), «Максімаліст» (1928), «Ой, ляцелі гусі...» (1929) і інш.

Між іншым, пра гэтыя творы ахвотней пісала і сучаснай М. Зарэцкаму літаратурная крытыка, і даследчыкі 60—70-х гадоў. Ахвотней таму, што іх тэма была не ў такой ступені небяспечнай, як тэма «былых». Вядома, не сама па сабе тэма адштурхоўвала крытыкаў, насцярожвала іх, а выяўленая ў творах ідэя спачування ахвярам рэвалюцыі. Гэта ідэя не ўпісвалася ў грамадска-палітычную атмасферу ні 30-х, ні 40—50-х гадоў, тым болей што з дня арышту і да рэабілітацыі творы М. Зарэцкага і яго імя ў станоўчым плане публічна не называліся. Што датычыць 60—70-х гадоў, дык і ў гэты час жупел пазакласавага падыходу, жупел абстрактнага гуманізму перашкаджаў даследчыкам гаварыць на поўны голас пра тэму «былых» і яе асвятленне М. Зарэцкім.

Больш пільная ўвага з боку крытыкі і навуковай думкі да твораў на сучасную М. Зарэцкаму тэму зусім не азначае, што ўсе яны прааналізаваны глыбока, грунтоўна. Тут назіраецца такая з'ява: у адных выпадках ацэнка завышана, у другіх — беспадстаўна заніжана. Праўда, дзеля справядлівасці скажам, што ёсць і выключэнні: некаторыя творы разгледжаны непрадузята, аб'ектыўна. Гэта датычыць, напрыклад, апавяданняў «Смерць» (1926), «Радасць» (1926), «На чыгунцы» (1926). У апавяданні «Смерць»,— зазначае Л. Голубева,— М. Зарэцкі «спрабуе знайсці адказ на адвечнае пытанне — у чым сэнс жыцця чалавечага. Прычым, гэтае пытанне ў яго сацыяльна завострана: гутарка ідзе пра чалавека, які прысвяціў сваё жыццё барацьбе за шчасце народнае і раптам разгубіўся перад пагрозай смерці» [1].

І меркаванні пра недахопы некаторых твораў таксама трэба прызнаць слушнымі. Адзначана, напрыклад, што ў апавяданнях «Гануля», «Бацькаў сын», «Як Настулька камсамолкай зрабілася», «Ліпа» «яшчэ няма глыбокага пранікнення ў псіхалогію герояў, ва ўнутраны свет чалавека, тут няма яшчэ сапраўднага мастацкага паказу народнага жыцця, абуджанага рэвалюцыяй» [2].

У той жа час, як ужо адзначана, мастацкія вартасці паасобных твораў яўна перабольшаны. Характэрны прыклад — апавяданне «На маладое». У гэтым творы, ніша адзін з даследчыкаў, «расказана трагічная гісторыя «забаронепага» кахання замужняй жанчыны Марылі і маладога хлопца Васількa. Жорстка папомсціўся за гэта Ахрэм, які лічыў жонку сваёй уласнасцю. Трагічна-сумныя апошнія сцэны апавядання. Але ў цэлым яно гучыць аптымістычна. Аўтар рашуча сцвярджае свабоду чалавечага пачуцця, якое навінна прыносіць не пакуты людзям, а акрыляць іх, надаваць ім сілы і прыгажосці» [3].

---

[1] Беларуская савецкая проза: Апавяданне і нарыс.— С. 33.
[2] Гісторыя беларускай савецкай літаратуры.— С. 463.
[3] Тамсама.— С. 466.

Прыведзеныя разважанні самі па сабе слушныя, бясспрэчныя, але яны не зусім тут да месца. Патэтыкай, узвышаным стылем даследчык фактычна замаскаваў недахопы, уласцівыя апавяданню,— дыдактычнасць, адкрытую павучальнасць. У азарце выкрыцця посьбіта ўласпіцкаі маралі, якім з'яўляецца селянін Ахрэм, даследчык не заўважыў, што апавяданню бракуе высокаі духоўнасці, а героі пададзены спрошчана, адпаплапава. Сюжэтнае дзеянне разгортваецца хоць і інтрыгуюча, але ў традыцыях звычайнаі белетрыстыкі. Займальнасць не забяспечана тут глыбокім псіхалагічным, чалавеказнаўчым зместам. У творы нямала запутаных апісанняў любоўных сустрэч, начных часін, якія праводзілі закаханыя ў «чароўнаі ап'яняючаі злучнасці». Моцна песціў блакітнавокі прыгажун Васілёк «дрыжачае ў чароўнаі знямозе, слухмянае цела» Марылькі, пакуль яе стомлены цяжкоі працаі муж спаў ці пасвіў конеі. Знешняе аблічча і паводзіны Ахрэма, пададзеныя праз успрыманне неаб'ектыўнаі асобы, якоі тут з'яўляецца Марылька, загадзя настройваюць чытача супраць Ахрэма. А такі падыход не адпавядае патрабаванням рэалістычнага мастацтва: «Яшчэ і Васілька не было, яшчэ не ўглядалася Марылька ў яго блакітныя вочы, яшчэ зазірала яна часам з таемным чаканнем ў шэрыя слізкія вочы Ахрэма, а ўжо ў сэрцы, у целе маладым, жадаючым вострага, палкага, расла несвядомая агіда. Прыкрымі сталі нязграбныя, недалужныя ласкі мужыка, прыкрымі затым, што распальвалі яны нутро агнём, агортвалі дзіўным смаглым жаданнем, а не здавальнялі» (157). Наўрад ці можна сказаць, што тут мы маем справу з канфліктам духоўнага і бездухоўнага. Калі цёмны, абмежаваны Ахрэм не прэтэндуе на духоўную сталасць, дык да гэтага ўзроўню не дацягваецца і тэмпераментная Марылька. На жаль, гэты вось прынцыповы момант даследчыкі не заўважылі.

Заканчваецца апавяданне ў тоі жа белетрыстычна-асветніцкай тапальнасці. Даведзены да роспачы адкрытай здрадай жонкі Ахрэм спярша спрабуе яе біць, а потым перад непазбежным развадам звяртаецца за дапамогай да знахаркі. «Ха-ха-ха-ха! — неяводам звяртаецца за дапамогай да знахаркі. «Ха-ха-ха-ха! — неякім страшэнным, нечалавечым свістам засмялася Гаўрыліха і покім страшэнным, нечалавечым свістам засмялася Гаўрыліха і потым, запыхаўшыся, доўга парывіста дыхала, напаўняючы хату цяжкімі, густымі, быццам апухшымі зыкамі» (171). І пачаў Ахрэм неўпрыметку паіць Марылю знахарскім зеллем, але аказалася яно смяртэльным. Цемната, забабоннасць, пяздольнасць узняцца да сапраўднага разумення чалавечага шчасця, свабоды — вось што асуджае М. Зарэцкі. Бясспрэчна, канфлікт твора народжаны сацыяльнай рэачаіснасцю, але асветніцкая скіраванасць твора пэўным чынам паўплывала на яго мастацкі ўзровень, што засталося незаўважаным у даследчых працах.

Увогуле кідаецца ў вочы, што пры разглядзе «малой прозы» М. Зарэцкага даследчыкі менеі патрабавальна ставіліся да тых твораў, дзе ўсё выглядае знешне прыстойна, але мала сапраўднага адкрыцця, наватарскага падыходу, нечаканага павароту ў трактоўцы тэмы, як тое было ў апавяданнях пра «былых», пра «кветак пакоўклых». І, паадварот, запіжаюцца вартасці апавяданняў, аўтарская думка ў якіх не ляжыць па паверхні, не сфармулявана ў выглядзе пэўнаі маральнаі максімы ці этычнага пастулату, як гэта, скажам, мае месца ў апавяданнях «Бель» (1924), «Дзіўная» (1925). І калі погляды на першае з іх у апошні час прыкметна змяніліся, дык «Дзіўная» па-ранейшаму застаец-

да да канца не прачытаным творам. «Ды, уласна кажучы, і аўтар выразна не выказвае сваіх адносін да трагічнай сітуацыі»,— гаварыў адзін з даследчыкаў, маючы на ўвазе апавяданне «Боль». Думаецца, тут бліжэй да ісціны аўтар пазнейшай працы А. Майсеенка: «З трагічнай развязкі твора відаць, што М. Зарэцкі асуджаў «левыя» погляды на сям'ю» [1].

Што ж датычыць апавядання «Дзіўная», то даўняя характарыстыка твора фактычна застаецца ранейшай: «...Супрацьпастаўленне грамадскага абавязку і асабістага жыцця чалавека набывае яшчэ больш рэзкую абвостранасць і невырашальную праблематычнасць» у апавяданні «Дзіўная» [2]. Паводле логікі даследчыка, прымітыўным выказваннем гераіні твора Шумавай — «нам трэба тварыць новых людзей, людзей калектыву, у якіх няма матак, бацькоў, у якіх бацькі — усё чалавецтва»— быццам бы «нічога не супрацьпастаўлена» [3].

І аўтар гэтых радкоў у прадмове да перакладу на рускую мову кнігі «Пачатак шчасця» некрытычна паўтарыў памылковыя вывады сваіх папярэднікаў, хоць, можа, і ў мякчэйшай форме: «Натуральна, што ў шэрагу момантаў М. Зарэцкі калі не падзяляў памылковыя ўяўленні сваіх герояў, дык не змог як мастак даць ім належную ацэнку з пункту гледжання марксісцка-ленінскай этыкі» (4—5). А рэакцыя Блонскага на разважанні Шумавай накопт неабходнасці разбурэння традыцыйных сямейных адносін як нібыта архаічных і шкодных была расцэнена намі наступным чынам: «Несумненна, тут праявілася і нявопытнасць маладога пісьменніка, і складанасць часу, у які ён жыў» (5).

Што М. Зарэцкі быў яшчэ зусім малады пісьменнік,— яму тады ішоў дваццаць шосты год,— і што першае паслякастрычніцкае дзесяцігоддзе складаны, супярэчлівы перыяд,— не выклікаюць сумнення, але сёння з падобным несур'ёзным вывадам адносна аўтарскай пазіцыі нельга пагадзіцца. Вывад узнік у выніку павярхоўнага падыходу да твора, у якім аўтарская думка сапраўды не фармулюецца так акрэслена, аголена, як у апавяданні «На маладое». Яна схавана ўглыбіню. Чытачу дадзена магчымасць самастойна параўнаць розныя, нават несумяшчальныя погляды на вострыя маральна-этычныя праблемы часу. Сваімі творамі М. Зарэцкі ўцягваў шырокую грамадскаць у актыўнае духоўнае жыццё, нсад'емнай адзнакай якога з'яўляецца свабоднае абмеркаванне наспелых пытанняў часу. Дзіўная складваецца сітуацыя! Мастак-гуманіст актыўна спрыяў усталяванню дэмакратычных форм жыцця, а перадавая крытыка і навуковая думка праз многія дзесяцігоддзі ставяць яму ў віну, чаму ён не даваў у сваіх творах адназначных рэкамендацый і рашэнняў, як быццам мастацкі твор — гэта інструкцыя або пастаўленне аб правілах паводзін.

Вядома, у перыя паслярэвалюцыйныя гады ў асяроддзі інтэлігенцыі распаўсюджваліся розныя роду ляванскія, нігілістычныя, ультрарэвалюцыйныя тэорыі сям'і, шлюбу, свабоднага кахання, розныя погляды на выхаванне дзяцей і г. д. Пацвердзіць ці абвергнуць іх магла толькі грамадская практыка, вопыт жы-

---

[1] Майсеенка А. Творчасць Міхася Зарэцкага.— С. 17.
[2] Гісторыя беларускай савецкай літаратуры.— С. 466—467.
[3] Тамсама.— С. 467.

вой рэчаіснасці, а не дэкрэты і прадпісанні, тым болей — з боку майстроў мастацкага слова. Вось чаму М. Зарэцкі не навязваў чытачу гатовых вывадаў, а клікаў яго да самастойных разваг і роздуму. Што ж датычыць сваёй уласнай пазіцыі, дык яна пісьменнікам выяўлена вельмі пэўна, акрэслена, толькі ў своеасаблівай, уласцівай мастацтву форме — праз эмацыянальную ацэнку паводзін героя, праз трапную мастацкую дэталь, праз падтэкст. Хіба не раскрываюцца аўтарскія адносіны да Шумавай з яе лявацкімі замашкамі ўжо ў першых радках твора, калі камандзіравая на працу сярод жанчын уваходзіць у пакой старшыні выканкома, «не папытаўшыся» дазволу, уваходзіць «рэзкім крокам», «бесцырымонна» кідаючы партфель. І першая рэакцыя старшыні: «Блопскаму не падабалася. Падакучылі гэткія. Мітусяцца, лаюцца, быццам хочуць здзівіць» (189). А вось псіхалагічна дакладныя, трапныя ацэнкі Блопскага падчас яго другой гутаркі з Шумавай. Хоць апошняя і старалася паводзіць сябе «зусім не так, як учора», але праніклівы, назіральны старшыня заўважыў: «Здавалася, што пад гэтым сухім, троху мітынговым топам ёсць нешта схаванае, палахліва затоенае. Адчуваўся нейкі ледзь прыкметны фальш у гэтых цвёрдых, энергічных словах аб вызваленні жанчыны, аб змаганні з іржавымі путамі сям'і, аб рэвалюцыі быту і г. д. А часам Блонскі выяўна чуў у яе голасе мімалётныя ноткі пяпэўнасці, нейкага сумнага неўразумення. Гэтыя ноткі чамусьці выклікалі сімпатыю да яе, спачуванне» (191).

Ці ж патрэбна яшчэ нейкае дадатковае пацвярджанне аўтарскіх адносін да гераіні? Тут выяўлена ўся сутнасць яе зусім нескладанай, неглыбокай натуры. Шумава сама зрабіла сябе ахвярай антыгуманнай ідэі неабходнасці адмаўлення ад бацькоўскіх пачуццяў у імя сцвярджэння быццам бы новых форм жыцця. «...сказала, што не трэба матцы дзяцей сваіх гадаваць, што зло ў гэтым нейкае ёсць. Прапанавала: адбіраць ад матак іхніх дзяцей і дамы выхавання наладжваць. Каб матка не знала сына свайго, а сын маткі, каб агульныя, усіхныя дзеці былі» (193).

Адназначная ацэнка небяспечнай тэорыі была дадзена вуснамі тых, каму тэорыя адрасавана: «Проці гэтага жанчыны-маткі агнём загарэліся. Казалі, жорстка гэта і крыўдна». Аднак з настойлівасцю нафіта Шумава прыкладвае ўсе свае сціплыя ўнутраныя сілы, каб заставацца паслядоўнай, каб ад слоў перайсці да справы. Але глыбокага, цвёрдага перакананне, якое б ішло знутры, а не звонку, ішло ад жыцця, а не ад адцягненай тэорыі, у Шумавай няма. Адсюль і ледзь прыкметны фальш у яе размовах, і пяўпэўненасць, і знарочыстая дэманстрацыя, бравіраванне, мітынговыя інтанацыі. Паводле сваёй прыроднай існасці Шумава чалавек неблагі, нават сардэчны, мяккі. Але, як і Ніна Купрыянава, як і Марына Гарнова, хоць і не належыць яна да «былых», Шумава бяздумна ўзяла на ўзбраенне намыленую маральнаэтычную канцэпцыю і стала кіравацца ёй у практычным, паўсядзённым жыцці. І гэта не магло не прывесці яе да краху. М. Зарэцкі паказвае, што яго гераіня штосьці спрабуе даказаць самой сабе, таму ж Блопскаму, сцвердзіць жыццёвасць уласнай філасофіі, але па сутнасці яна застаецца глыбока пяшчасным чалавекам, бо падавіць у сваім сэрцы пачуцці мацярынскай прывязанасці ёй не ўдалося. Псіхалагічны стан Шумавай у час сустрэчы з маленькім сынам, якога яна аддала ў дзіцячы дом і пра якога намагаецца забыць,— лепшы таму доказ. Вось чаму напрокі да-

следчыкаў у адрас М. Зарэцкага паконт неакрэсленасці ягонай мастакоўскай маральнай пазіцыі цалкам беспадстаўныя.

З ліку твораў, якія не атрымалі заслужанай ацэнкі, хацелася б таксама назваць і апавяданне «Максімаліст» (1928), адно з бясспрэчна лепшых у літаратурнай спадчыне М. Зарэцкага. Апавяданне вызначаецца сваім мастацкім узроўнем, артыстызмам, культурай пісьма, навізной тэмы, тонкасцю ў падыходзе да яе вырашэння. Пісьменнік убачыў параджэнне ў савецкім грамадстве новай, сацыяльна небяспечнай з'явы, складванне псіхалагічна новага тыпу. Прыходзіцца толькі здзіўляцца, як гэта адзін з даследчыкаў умудрыўся знайсці ў «Ракавых жаронцах» і «Максімалісце» паўтарэнне «ранейшых матываў», ды яшчэ і «не самых плённых» [1], у той час, калі мы павінны гаварыць пра сапраўднае наватарства пісьменніка, пра яго творчую смеласць. Істотна тое, што героямі твора М. Зарэцкага аказваюцца дзеці, г. зн. тыя, хто толькі распачынаюць сваё жыццё. Піянер Вовачка Пенкін, пагледзячы па свой дзіцячы ўзрост, выявіў багатыя здольнасці ўсур'ёз пераймаць паводзіны і рысы характару, псіхалогію чыноўніка, рысы дэмагога, прыстасаванца. У атрадзе быў яшчэ адзін піянер, якому Вовачка прыдумаў мянушку — Максімаліст. Гэта гучнае слова Вовачка вычытаў у «Слоўніку палітычных тэрмінаў», які зусім нядаўна трапіўся яму ў рукі. Мянушка вельмі спадабалася ўсім піянерам, хоць посьбітам яе стаў добры па натуры хлопчык, сумленны, шчыры, для якога вельмі натуральным было, каб слова не разыходзілася са справай.

Пісьменнік праявіў глыбокае сацыяльнае пачуццё, паказаўшы, што юныя грамадзяне часта падтрымлівалі Пенкіна, а не Максімаліста. Ды як можна не стаць на бок Вовачкі, калі ён — «самы старэйшы і самы разумны ў атрадзе — ён самы важны ў атрадзе, ён зусім як дарослы. Вовачка нават умее рабіць на сваім белазорым твары асаблівую нейкую спагадліва-насцярожаную ўсмешку, якраз такую, якую ён бачыў у адпаго з важных палітычных правадыроў. Гэтай усмешкай Вовачка і тушыць заўсёды Максаў агонь» (274). І ўсё ж жыццё, гэты мудры настаўнік, падносла юпым піянерам сур'ёзны маральны ўрок. Максімаліст не пагадзіўся з калектыўным рашэннем і ўзяў на сябе адказнасць за лёс маленькай сіраты Алёнкі з цыганскага табару. Максімаліст не адступаўся, хоць яго «лаялі, з яго смяяліся». Ён паабяцаў Алёнцы дапамогу і не стрымаць слова не мог. І дабіўся свайго. Смелым, нечаканым учынкам ён прымусіў дзейнічаць нават «самага адказнага таварыша ў горадзе», «самага адказнага сакратара». І калі гэты «самы адказны», каб і піянеры пераканаліся, што ён сапраўды вялікі начальнік, загадаў даставіць няўрымслівага, настойлівага Максімаліста на службовай машыне прама ў піянерскі лагер, дык ці не першы раз не атрымалася ў Пенкіна партрэтная правадырская ўсмешка, а «выйшла ўсмешка простая і нават трошачкі віпаватая». Так сумленны хлопчык па мянушцы Максімаліст атрымаў сваю першую маральную перамогу — перамогу дабрыні, спагадлівасці над чэрствасцю, абыякавасцю, пітo маскіраваліся напышлівым, рэвалюцыйным словам.

У спадчыне Зарэцкага-празаіка ёсць яшчэ некаторыя творы, якім асабліва не пашанцавала ў крытыцы і якія патрабуюць перагляду. Публічная рэабілітацыя гэтых твораў вымагаецца перш

---

[1] Гісторыя беларускай савецкай літаратуры.— С. 476.

за ўсё іх глыбокай мастацкай змястоўпасцю, якая, на жаль, засталася нераскрытай, нявыяўленай: у даследчых працах і на сённяшні дзень яны ідуць пад рубрыкай калі не цалкам заганных, дык ідэйна непрымальных, у лепшым выпадку — цьмяных, невыразных наводле аўтарскай пазіцыі. Гэтая несправядлівая ацэнка народжана дагматызмам крытыкі мінулых гадоў, няздольнасцю даследчыкаў спасцігаць сэнс складанага, праблемнага твора, у якім няма ні звыклай ілюстрацыйнасці, ні адкрытага маралізатарства.

Да такіх вось няпростых твораў адносіцца апавяданне, а па сутнасці — аповесць «Ой, ляцелі гусі...» (1929). Дамо слова даследчыку, у працы якога з асаблівай паўнатой выказана негатыўная ацэнка твора: у апавяданні «прыкметны адыход пісьменніка ад творчых здабыткаў, дасягнутых у рамане «Сцежкі-дарожкі». Тут Зарэцкі зрабіў крок назад да тых ранніх твораў, дзе назіралася недастаткова акрэсленая паглыбленне ў псіхалогію чалавека-індывідуаліста. У творы абстрактна супрацьпастаўлены біялагічнае і грамадскае ў чалавеку. Герой апавядання Адам Барковіч плюе на ўсе маральныя прынцыпы грамадства. У ім бунтуе моцная натура, нейкая біялагічная сіла, якая адчувае сябе вольнай толькі сярод дрымучага лесу. Барковіч — закопчаны эгаіст, які жыве толькі для сябе. Ні любоў, ні дружба, ні дакоры сумлення, ні які-небудзь абавязак перад другім чалавекам — нішто не кранае душы гэтага закаранелага індывідуаліста. Біялагічнае, звярынае перамагае ў ім самыя элементарныя пачуцці прыстойнасці, самыя звычайныя чалавечыя пабуджэнні» [1]. Перад намі — тыповы прыклад павярхоўнага чытання, калі даследчык ідзе не ад асобаснага непасрэднага ўспрымання твора, а ад пэўнай, загадзя вызначанай устаноўкі.

Прысуд, вынесены твору ў акадэмічным выданні, пачаў вандраваць з адной даследчай працы ў другую. Вось што напісана ў калектыўнай манаграфіі «Беларуская савецкая проза»: «Але часцей за ўсё звярыны, эгаістычны пачатак у душы чалавека, псіхалогія індывідуаліста трактуюцца пісьменнікам як адвечныя і пазменныя якасці чалавечай натуры. Такім з'яўляецца Барковіч у апавяданні «Ой, ляцелі гусі...». Пісьменнік не паведамляе радаслоўнай свайго героя, не спасылаецца на тое, што жыццё прымусіла яго быць пошлым, жорсткім і бессардэчным. Не, проста Барковіч, як тыя дзікія гусі з магутным разгонам стыхійных імкненняў, вечных, як свет, непераможных, як жыццёвая сіла, любіць свабоду, шырокі прасцяг, шукае сонца і радасці, шукае невядома шчасця і ў сваіх эгаістычных парываннях не лічыцца ні з чым. Ён радуецца і раскаціста рагоча, што ўдалося ашукаць жонку, потым каханку, што давёў сваімі здзекамі да роспачы вернага сябра Сяргея» [2].

Тут, як і ў папярэднім выпадку, аналіз твора адсутнічае, ён заменены эмацыянальнай дэкларацыяй, маралізатарскімі сентэнцыямі, бяздоказным асуджэннем героя, што ўвогуле недапушчальна ў працы навуковага тыпу. Падсудны пазбаўлены права на абарону.

Што ж ў сапраўднасці ўяўляе сабой апавяданне? Адам Барковіч кахаў Стасю, яна стала яго жонкай. Пакахаў яе і лепшы

---

[1] Гісторыя беларускай савецкай літаратуры.— С. 477.
[2] Беларуская савецкая проза: Нарыс.— С. 39.

сябра Адама Сяргей, якому здавалася, што ягонае платанічнае захапленне не пакрыўдзіць Адама, не будзе ў шкоду яго сямейнаму шчасцю: «Я яе зусім асабліва любіў і люблю... Не так, як ты... Я яе буду заўсёды любіць... заўсёды» (342). Па ўсім відаць, і Стася меркавала, што такая сітуацыя — прымальная, што яна, Стася, заслугоўвае таго, каб адзін быў з ёю, а другі — каля яе. Але ў Стасі не хапіла здольнасці хоць раз паглядзець на ўсё гэта вачыма Адама, які невыпадкова носіць імя першага чалавека на зямлі. Ці задавальняла існуючае становішча Адама? Не. Не задавальняла, бо прысутнасць трэцяга — незалежна ад таго, ён гэта, ці яна — у каханні, калі яно сапраўднае, выключана. Гэта ведае Адам, але чамусьці не ведае ці знарок не хоча ведаць Стася. І ў гэтым — асноўная прычына маральна-этычнага канфлікту паміж героямі. І Адам разлюбіў жонку, хоць і не сказаў ёй пра гэта. У час сваіх вандровак па Палессі ён знаёміцца з маладой настаўніцай Таццянай. Мы дакладна не ведаем, пры якіх абставінах яны пазнаёміліся і калі паміж імі ўзнікла блізкасць. Ва ўсякім разе не ў час хваробы жонкі, а раней. Гэта вынікае з паводзін Адама: вучні Таццяніна класа паспелі ўжо палюбіць Адама, бо пры яго з'яўленні дружна просяць, каб ён павёў іх у лес.

Каля ложка цяжка хворай Стасі Барковіч паводзіць сябе, здавалася б, і сапраўды зусім непрыстойна: спяшаецца хутчэй пайсці з бальніцы, а затым і ўвогуле едзе да Таццяны, паведамляе ёй пра жончыну хваробу. Таццяна толькі на словах за тое, каб Адам хутчэй наведаў хворую, але ў душы рада, што ён застаецца тут. Такія паводзіны Таццяны выклікаюць у Барковіча рэзкія, негатыўныя ацэнкі: «Якая бязлітаснасць у гэтых самак! Яна ж надзвычайна рада, што дзеля яе мужык кінуў сваю паміраючую жонку» (327). Атрымаўшы тэлеграму ад Сяргея пра магчыма бліскую смерць Стасі, Барковіч тым не менш застаецца на хутары. Неўзабаве Сяргей прыязджае да Адама, каб наведаміць нечаканую навіну — Стася ачуняла і хутка будзе тут. Калі пра цудоўнае ўваскрашэнне даведваецца Таццяна, яна адразу ж ірве адносіны з Адамам. Каб сцішыць уласны боль і дапячы Адаму (як быццам ён вінаваты, што Стася не памерла!), Таццяна падоўгу гутарыць з Сяргеем. Апошні нават ўявіў сабе, што настаўніца ўпадабала яго, і ён, магчыма, на ёй хутка ажэніцца. З ранейшай размовы былых сяброў выпікала: Сяргей ведаў, што Адам кахае Таццяну. Відаць, дарэмна ён забыўся пра нядаўнюю гутарку з Адамам:

«— Сяргей! Ці думаў ты калі-небудзь, што ў нас усё гэта можа нядобра скончыцца... га?

Сяргей вінавата замітусіўся.

— Як гэта скончыцца?.. Я не разумею... Я зычу табе дабра, Адам, я нічога не маю супраць цябе...

— Ну, добра, пойдзем» (323—324).

Сяргей не захацеў прыслухацца да папярэджання Адама. Развязка канфлікту была неміпучай: у час паляванння пакрыўджаны Адамам Сяргей страляе ў яго. Лёгка паранены Адам не адказвае на стрэл, пагардліва абмінае зусім разгубленага Сяргея, садзіцца на бліжэйшы цягнік і едзе ў свет.

Як відаць нават з кароткага пераказу гэтага вялікага памерамі твора, погляд даследчыкаў на героя не адпавядае сапраўднасці. Асаблівасць дадзенага апавядання, як і некаторых іншых, у тым, што сапраўдныя матывы паводзін герояў не ляжаць на

паверхні, пра іх адкрыта не гаворыць і пісьменнік. А самі героі, перш за ўсё Барковіч, старанна хаваюць свае пачуцці. Іх жыццёвае крэда, сутнасць характару і матывы ўчынкаў раскрываюцца толькі ў экстрэмальных сітуацыях, накшталт сутычкі на паляванні. Вось гэтай структурнай, мастацкай адметнасці апавядання, як выніку ўзрошчага пісьменніцкага майстэрства, не ўбачылі даследчыкі. Куды лягчэй аказалася вытлумачыць усё фактарамі ідэалагічнага парадку, светапоглядным, ідэйным зрывам пісьменніка, які, маўляў, зрабіў крок назад ад ужо дасягнутага, аддаў перавагу біялагічнаму перад сацыяльным, апаэтызаваў маральна разбэшчанага, эгаістычнага, сацыяльна небяспечнага тыпа, што выклікае вакол сябе ўсё высакароднае, сее зло і нянавісць.

Падобнага роду недарэчныя абвінавачванні ў адрас М. Зарэцкага былі нормай у канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў. Калі ж яны з'явіліся на старонках друку ў 60-я, дык гэта вымагала вытлумачэння. Сапраўды, паводле якой логікі пісьменнік раптам закрэслівае ўсю сваю рапсійшую творчасць, свае бясспрэчныя здабыткі і выступае ў ролі прапагандыста амаральнасці і асацыяльнасці? Павінна ж існаваць нейкая ўнутраная заканамернасць творчага развіцця, сацыяльная, псіхалагічная дэтэрмінаванасць! Нельга ж творчы працэс зводзіць да хаосу! Крытыкі не здолелі заглыбіцца ў змест апавядання, спасцігнуць логіку мастацкай думкі аўтара. Яны не зразумелі, што Барковіч любіў Стасю, але той мадэлі ўзаемаадносін, які яна прапаноўвала — адзін з ёй, другі каля яе, ён не прымае і прыняць ні пры якіх абставінах не можа, не здраджваючы свайму ўяўленню пра чалавечую годнасць. І да настаўніцы Барковіч кінуўся, шукаючы паратунку ад душэўных перажыванняў, якіх нікому не хацеў паказваць. Такі яго характар. Можа, іх адносіны і склаліся б, бо Таццяна пакахала Адама, але з'яўленне Сяргея, яго меркаванні пра магчымую жаніцьбу на Таццяне, а таксама і яе паводзіны робіць іх саюз немагчымым, бо гэта было б паўтарэннем ранейшага, ад чаго Адам збег. Чаму «ранейшае» так абурала Адама? Паслухаем яго размову з Сяргеем.

«— А ўсё-ткі мы з табой ворагі адзін аднаму. Найлюцейшыя ворагі, якія толькі могуць быць...

— Адам! Што ты гаворыш?

— Найлюцейшыя ворагі... Фатальныя ворагі... Мы ўвайшлі адзін к аднаму ў жыццё, каб псаваць яго... Так увесь час і было...

Ён змоўк, пібы аднаўляючы ў памяці драбніцы мінулага.

— Вось з Стасяй... Ты мне псаваў увесь час... страшэнна псаваў... агідна... А я табе... ха-ха! ты сам казаў, што нічога не меў... ха-ха!.. нічога не меў...

І ён дзіка зарагатаў. Потым ураз неяк сціх і падблізіў да Сяргея свой скрыўлены злоснай грымасай твар.

— Па праўдзе сказаць, ты паскудненькую ролю там іграў. Зусім такую, ведаеш, нікчэмненькую, туалетную... Ты ж, небарака, нічога не меў... Ха-ха! Які недалужны!..

Сяргей яшчэ больш пабялеў, і вочы яго востра заблішчэлі — ні то ад слёз, ні то ад зацятае злосці.

— Адам! Ты мяне абражаеш!..

— Ха-ха! Абражаю? Я думаў, што ты зусім пяздольны абразіцца... Слухай далей... Вось з Таццянай... Ты не дужы сам для сябе знайсці што-небудзь у жыцці. Ты, як слімак, падпаўзаеш да чужога і рад, што знайшоў, дзе прысланіцца. І просты жаль да

цябе, перамешаны з агідай, ты гатоў прыняць за кахаппе!» (349—350).

Гэта размова і заканчваецца стрэлам Сяргея ў спіну Барковіча.

З прыгаданай тут сцэны зноў жа бачна, як рашуча пярэчыць вобраз галоўнага героя тым грубым, спрошчаным схемам, якія накладваліся на яго крытыкаў. Выносіць прысуд Барковічу як амаральнаму тыпу толькі на падставе яго адносін да хворай жонкі нельга. Трэба зразумець, чаму ён так робіць. Барковіч не пакінуў Стасю адну ў цяжкую для яе хвіліну, як можа здацца па першы погляд: з Стасяй застасецца той, хто яе кахае і каму яна выказвала прыязпасць. Паколькі ў Барковіча няма болей рапсійных пачуццяў да жонкі, ён не хоча фальшывіць, не хоча прыкідвацца клапатлівым і ўважлівым. Вось у чым разгадка яго т. зв. амаральных, бесчалавечных паводзін. Прыгадаем яшчэ сцэну ў бальніцы. «...Стася... пачала гаварыць пра Сяргея.— Ён часта прыходзіць да мяпе і сядзіць тут доўга-доўга, пакуль не выганіць доктар...

Яна робіць патугу гарэзліва, як ранеи, усміхнуцца, але выходзіць толькі хваравітая грымаса. Барковічу зразумела: яна пачула яго настрой, яго холад і таму памянула Сяргея. Так рабіла яна даўней — і даўней дасягала свайго...» (317). Як бачна, выкарыстоўваць паклопніка для псіхалагічнага ўздзеяння па Адама было для Стасі ў маральных адносінах з'явай нармальнай. Але гэтую норму не мог прыняць Адам. Ранеи ён, відаць, вымушаны быў цярпець, пагаджацца, але паступова ўсё змянілася.

Тым, хто ўспрымаў Барковіча закончаным эгаістам, пягодпікам, Сяргей уяўляўся, трэба думаць, станоўчым героем, антыподам Адама. Але як вытлумачыць тое, што гэты непраціўленец, талстовец, які жыў ледзь не дзеля шчасця Стасі і Адама, робіць злачынны замах на жыццё апошняга? Вядома, слухаць Адамаў выкрывальны выпад Сяргею непрыемна, бо, парэшце, Адам сказаў яму ўсю праўду ў вочы, пазваўшы былога сябра прыліпалам, які няпрошаным госцем умешваўся ў чужое жыццё, адыгрываў там «паскуднепькую ролю... Нікчэмненькую, туалетную». Адам мог бы, зрэшты, забыць мінулае. Але ж Сяргей, як бачым, гатовы зноў выконваць сваю ранейшую ролю ў новым трохкутніку. Вось гэта выяўленая гатоўнасць Сяргея да паўтарэння таго, што ўжо было калісьці, і выклікала абурэнне Адама і яго прысуд: «Ты — паскуднік... Я ненавіджу цябе». Стрэлам у спіну Сяргей сам выкрывае сябе, уласную існасць. Паказальна, што Адам на стрэл не адказвае стрэлам, хоць і мог гэта зрабіць на праву самаабароны. Ён не бярэцца за стрэльбу, бо не зброяй, а пагардай змагаецца з былым сябрам.

У апавяданні «Ой, ляцелі гусі...» М. Зарэцкі раскрывае жыццёвую драму чалавека, які бароніць сваю асабістую годнасць ад людзей карыслівых, абмежаваных, з дробнымі памкненнямі. Тое, што Барковіч пакідае і Стасю, і Таццяну, і Сяргея і кіруецца ў шырокі свет — гэта выяўленне яго веры ў праўду жыцця, у тых людзей, якіх ён яшчэ пэўна сустрэне.

Разглядаючы змест апавядання, можна дапусціць, што М. Зарэцкі аддаваў даніну вядомай тэорыі разумнага эгаізму. Адпак тэорыя эгаізму тут ні пры чым. Куды болей плённым аказваецца гаворка пра ўплыў рамантычных традыцый. Паводле эстэтыкі рамантызму асоба чалавека сама з'яўляецца творцай уласнага

лёсу. Унутраная слабасць чалавека — вынік яе асабістага бязволля, згубнай схільнасці перакладваць віну на знешнія абставіны, на іншых. Герой-рамантык заўжды абапіраўся на канцэпцыю неабходнасці пяспынпай барацьбы асобы супраць усіх перашкод. Трэба змагацца, ісці наперад, увесь час быць у дарозе, у палёце. Палёт дзікіх гусей — не аналогія перавагі ў чалавеку біялагічнага над сацыяльным. Пісьменнік сцвярджае гэтым вобразам пяспынны рух, пераадоленне цяжкасцей. «Гусі... Апошнія сёлета гусі. Рупяцца, каб не застацца, каб не спазніцца ў тоі зачараваны край. Яны яшчэ вераць, яшчэ спадзяваюцца. У іхняй зазыўнаі песні так многа імкнення, так многа надрыўнае радасці. Ляціце, любыя! Ляціце, родныя! Яшчэ не позна. Ніколі не позна. Шукайце сонца! Шукайце шчасця!..» (352).

Барковіч быў упэўнены, што і яму таксама не позна шукаць і знайсці шчасце.

З нашых разважанняў зусім не вынікае, што М. Зарэцкі імкнуўся намаляваць у асобе Барковіча нейкага ідэальнага рамантычнага героя. Не, аўтар апавядання ствараў мастацкі твор, а не займаўся маралізатарствам. Яго Барковіч — жывая чалавечая асоба са сваімі моцнымі і слабымі бакамі. Так, у характары Барковіча нямала недахопаў. Ён зпарок бравіруе ўласнай сілай, незалежнасцю, хоча паказаць перавагу перад іншымі. Але навошта яму гэта дэманстрацыя? Каб схаваць сваю ранімасць. Яго знарочыстая пагарда да мяккіх, кволых, сентыментальных ідзе і ад упутранай мяккасці, ад жадання пераадолець, зжыць гэты, як яму здаецца, прыкры недахоп характару. Так, калі Барковіч не адважыўся адкрыта прызнацца Стасі, што разлюбіў яе, дык гэта ішло, вядома ж, ад яго слабасці, а не моцы. Не заўсёды, відаць, справядлівы быў Адам і ў адносінах да Сяргея. Зноў жа таму, што бесхрыбетнасць, адсутнасць волі лічыў вынікам уласнай віны чалавека.

Зрэшты, не будзем забываць пра тое, што сапраўдны мастацкі твор — гэта не дыдактычны трактат, а роздум мастака над складанасцямі і супярэчнасцямі духоўнага жыцця чалавека, яго пошукамі шляхоў да ісціны. Міхась Зарэцкі спадзяваўся, што ў асобе сваіх чытачоў ён знойдзе надзейных адпадумцаў.

Яшчэ адзін твор М. Зарэцкага, які, на нашу думку, сёння таксама патрабуе перагляду,— гэта лірыка-рамантычнае апавяданне пад назвай «Паэма пра чорныя вочы». У гісторыка-літаратурных працах яно, як правіла, падрабязна не аналізуецца, відаць, з той прычыны, што ў М. Зарэцкага былі і іншыя творы, блізкія сваім гераіка-ўзвышаным пафасам да «Паэмы...». Але ў цытаванай ужо прадмове да кнігі «Пачатак шчасця», выдадзенай у перакладзе на рускую мову, аўтар гэтых радкоў спецыяльна вылучыў «Паэму пра чорныя вочы» як адзін з лепшых рамантычных твораў, дзе «аўтарскае непрыманне філасофіі прагматызму выяўлена праз сцвярджэнне духоўнай прыгажосці чалавека»... Ці так гэта на самоі справе?

Герой апавядання шмат гадоў шукаў дзяўчыну-байца, з якоі разам ваяваў на франтах грамадзянскаі вайны, шукаў, «каб скончыць недапетую песню... дзівосна яскравае дружбы» (267). А калі ўдалося, нарэшце, знайсці, дык ён убачыў не ўвасабленне сваёй колішняй рамантычнаі мары, узгадаванаі гераічным часам, а штосьці іншае, далёкае ад прыгожых уяўленняў мінулага. Былога камісара засмуціла, збянтэжыла атмасфера дабрабыту,

утульнасці, што панавала ў «ружовым пакоі з мяккай капанай, з дывanамі на сценах» (267). Л галоўнае, не знайшоў камісар ранейшага агню ў чорных, калісьці такіх прыгожых вачах дзяўчыны. І ён паабяцаў сабе «ў сумятлівым моры жыцця», «сярод блытаніны драбніц, у віры гарачай будзённічыны, у брудным пыле вугалля, цэменту і вапны, у шаломным грукаце дзён» працягваць пошукі свайго ідэалу. «Я найду. Я знайду... дармо ты смяешся... Не смейся! Смех твой агідны мне, прыкры» (272).

На першы погляд, змест апавядання не спараджае пякіх сумненняў адносна яго пафасу, не выклікае розпага ўспрымання ідэйнай скіраванасці. Здавалася б, яны пэўныя, адназначныя. Што тут пераасэнсоўваць?

І ўсё ж мушу сказаць, што мая ранейшая ацэнка твора патрабуе істотных паправак, бо яна з'явілася вынікам павярхоўнай інтэрпрэтацыі, вынікам вузкага, спрошчанага падыходу, калі пазіцыя героя атаясамліваецца з пазіцыяй аўтара. Гэта загапная методыка была ўласціва многім літаратуразнаўцам папярэдніх дзесяцігоддзяў. Яна па-сапраўднаму не ўлічвала прыроды мастацтва, псіхалогіі творчасці, спецыфікі мастацкага вобразу з яго неадназначнасцю і невычарпальнасцю. Вывады даследчыкаў нярэдка грунтаваліся не на ўсебаковым аналізе зместу твора, а на выбарачным разглядзе патрэбных мясцін.

Сапраўды, ці такой ужо бясспрэчнай з'яўляецца пазіцыя героя апавядання? Ці такая ўжо прымальная ў этычным плане яго жыццёвая філасофія? Вось як былы камісар ацэньвае дні сваёй маладосці. Гэта быў час, «калі гарэла святая нянавісць і морам лілася пякучая кроў» (268). І пра гэты час, паводле перакона́ння камісара, нашчадкі ўдзельнікаў грамадзянскай вайны «складуць шмат прыгожых легенд». Камісару здаецца, што гэта кровапраліцце павінна натхняць «блакітнавокіх упукаў» на гераічныя справы. Але ж ён чамусьці не дапускае думкі, што праз сем гадоў успрыманне мінулага павінна было змяніцца, і патрабаваць, каб усе баявыя таварышы жылі рапейшымі ўяўленнямі, не зусім правамерна. Можа, і адносіны да пралітай крыві і да нянавісці, нават калі яна здавалася толькі «святой», з далечы гадоў маглі аказацца не такімі ўжо апалагетычна-ўзвышанымі?

Былога камісара непрыемна ўразіў дабрабыт у кватэры дзяўчыны-таварыша. «У гэтым ружовым пакоі з мяккаі капанаі, з дывanамі на сценах мне чамусьці цяжка, няёмка. Я не ведаю, як з табой гаварыць, я адчуваю, што ты шкадуеш мяне, мне страшна за нашу песню, за нашу дружбу. Чаму не сустрэліся мы дзе-небудзь на ветраных берагах сцюдзёнай Дзвіны, чаму я не ў чаравіках дзіравых з абмоткамі, чаму ты не ў тоўстаі салдацкай шынелі, якая сціпла хавае твае дзяводкія формы, у якой ты мне — дарагі, любы таварыш!» (267).

Бясспрэчна, захоўваць лепшыя ідэалы мінулага, даражыць імі, думаць пра лёс Рэвалюцыі патрэбна. Але ж у імя чаго ішла барацьба, у імя якіх каштоўнасцей пралілося мора крыві? Хіба дабрабыт людскі не быў адной з мэт змагання? Калі ўдзельнік грамадзянскай вайны застаўся назаўжды ў атмасферы таго далёкага часу, дык ці апраўдана яго жаданне, каб абыякавым стаўленнем да звычайнага, паўсядзённага жыцця кіраваліся ўсе астатнія? Дзіравыя чаравікі з абмоткамі маглі заставацца ідэалам былога камісара, але ці гуманна вымагаць, каб і тоўсты салдацкі шынель таксама быў нязменным ідэалам дзяўчыны? Камісар

прад'яўляе шмат прэтэнзій маральнага парадку свайму баявому таварышу-дзяўчыне. Але ўспомнім пра іх узаемаадносіны часоў вайны. Калі дзяўчыну параніла і яе выносілі з бою, у камісара не знайшлося добрага, ласкавага, спагадлівага слова. Параненая накутавала ад болю. Яна чакала такога слова. І не дачакалася. «Але я не каюся, не шкадую. Я рабіў па закону барацьбы. Помніш? Я сказаў толькі два словы:

— Адыравіць у шпіталь» (271).

Што ж, не станем патрабаваць ад камісара немагчымага — ва ўмовах бою такога слова ён не абавязаны быў гаварыць. Але ж чаму ён тагачаснымі меркамі вымярае людзей праз сем гадоў? Хіба нельга дапусціць, што мелавіта адсутнасць чалавечнага, спагадлівага слова, якое камісар не прамовіў, і прадвызначылі цяперашнія адносіны дзяўчыны і паводзіны да яго. Можа, мае надставы дзяўчына глядзець на камісара са шкадаваннем? Бо гэтага, няхай і са спазненнем на сем гадоў, слова яна не пачула і пры нечаканай сустрэчы. А не пачула таму, што як чалавек, як жывая істота яна камісара мала цікавіла і тады, і зараз. Фактычна ён і сам у гэтым прызнаецца: «Ага... Я разумею... Я цяпер зразумеў. Я шукаў не цябе... Не, ты мне не трэба. У сумятні пярэстай жыцця я шукаў сталёва свежай шыры, я шукаў непазбыўнай рамантыкі» (271). Нават калі мы выраз героя «я шукаў не цябе» дапоўнім — у яго ж карысць — словам «сённяшнюю», усё роўна вывад акажацца даволі пэўны: успаміны аб днях, у якія «гарэла святая нянавісць і морам лілася кіпучая кроў», аказаліся для героя даражэйшымі, болей патрэбнымі, чым канкрэтная чалавечая асоба са сваім унутраным жыццём, клопатамі, турботамі, уяўленнямі. Даволі лёгка развітваецца ён з дзяўчынай, каб на-рапейшаму шукаць рамантычную мару-ўспаміп. Чаму ж не пацікавіўся былы камісар, як жыла дзяўчына гэтыя доўгія гады, чаму не ўступіў з ёй у спрэчку, не выслухаў яе аргументаў? А можа, тое, што ён убачыў — было не перамогай побыту над высокай духоўнасцю, а сапраўдным жыццём у яго няспынным руху і абнаўленні. Апавяданне дае падставы разумець яго змест і так. І ў гэтым няма нічога дзіўнага, бо Зарэцкі-пісьменнік не ілюстраваў у творах нейкі загадзя вызначаны, маральна-этычны ці палітычны тэзіс, а ставіў жыццёвую праблему, даследаваў яе, заклікаў чытача быць саўдзельнікам разважанняў над складанымі, непаўторнымі чалавечымі лёсамі, над чалавечым жыццём.

Мы разгледзелі тут, вядома, не ўсе творы М. Зарэцкага, якія належаць да «малой прозы». Па-за аналізам засталіся і некаторыя раннія апавяданні («Адкушіўся», 1923), і пазнейшыя па часе напісання, напрыклад, «Пра майго прыяцеля» (1925), «У велікодную ноч» (1925), «Ракавыя жаронцы» (1928), «Хвіліна» (1930), «Пра дзеда Альпіна» (1930), «Парася» (1931). Тлумачыцца гэта тым, што яны ў чымсьці падобныя да ўжо разгледжаных,— падобныя тэмай, асобнымі матывамі, героем, падыходам да вырашэння праблемы. Вядома, кожнае апавяданне заслугоўвае асобнай гаворкі, але недахоп месца прымушае ўстрымацца ад гэтага. Таксама можна было б падрабязней закрануць і лірыка-рамантычныя імпрэсіі М. Зарэцкага, своеасаблівыя вершы ў прозе — «Пела вясна» (1925), «Камсамолка» (1925), «Шэсты восені» (1928). Але гэтыя лірычныя мініяцюры ахвотна цытуюцца ў даследчых працах, дзе ім звычайна надаюць куды большае значэнне, чым яны маюць на самай справе. А вытлумачваецца ўсё вельмі прос-

та: у лірычных замалёўках шукаюць пацвярджэння сваіх поглядаў тыя даследчыкі, хто лічыць, што М. Зарэцкі ў сваім развіцці ішоў ад рамантызму да рэалізму, пераадольваў, зжываў рамантычныя спосабы пазнання рэчаіснасці. Як мы ўжо бачылі, гэты тэзіс не пацвярджаецца аб'ектыўным аналізам творчасці пісьменніка. Зарэцкі ўвесь час заставаўся мастаком рамантычнага светаўспрымання, але гэта не перашкаджала яму бачыць рэальныя супярэчнасці жыцця і імкнуцца да іх глыбокага адлюстравання.

Калі ж мець на ўвазе абмінутыя ўвагай апавяданні канца 20-х — пачатку 30-х гадоў, дык, па-першае, у гэты вельмі неспрыяльны, цяжкі перыяд М. Зарэцкі працаваў галоўным чынам над творамі буйных жанравых форм — над аповесцю, парысамі, п'есамі, рамапамі — і да «малой прозы» звяртаўся рэдка. А па-другое, у гэтых пешматлікіх творах ужо значна мепш мастацкай павізны, праблемнасці, смелага вырашэння тэмы, што мела месца ў ранейшыя гады. Яно і зразумела: раз'юшаныя нападкі пагромшчыкаў ад літаратуры пакінулі след на творчасці пісьменніка. Гэты момант абавязкова трэба ўлічваць, каб нашы ўяўленні аб ідэйна-творчым развіцці пісьменніка былі аб'ектыўнымі. Несправядліва і несумленна віну палітычных дзялкоў і паслухмянай ім крытыкі змрочных часоў сталінізму і яжоўшчыны перакладаць на пісьменніка, рабіць вывад, нібыта ён, таленавіты мастак. па ўласпай волі пачаў абыякава ставіцца да творчай дзейнасці, пісаць педаскапалыя творы. Не, усё было іначай, куды прасцей і куды трагічнсй!

Так, напрыклад, апавяданні «Хвіліна», «Пра дзеда Альпіна» не маюць глыбокай сэпсавай напоўненасці. Па змесце яны блізкія многім тагачаспым так званым творам на тэму выкрыцця шпіенаў, шкоднікаў, дыверсантаў. Старшыня правяркома («Хвіліна») пазнае ў адным з кандыдатаў на праверку былога белагвардзейскага афіцэра, які ў свой час жорстка здзекаваўся з яго, старшыні, былога камісара, трапіўшага ў палон да белых. «Тады Мікола Кастроў моўчкі завярнуўся і пайшоў ад стала, панура схіліўшыся пад цяжарам свайго маўклівага прыгавору» [1]. Вось і ўсё мастацкае даследаванне рэчаіснасці і духоўнай дзейнасці чалавека! Зразумела, што гэта была даніна патрабаванням дагматычнай крытыкі, якая пільна сачыла за ідэалагічным зместам творчасці пісьменнікаў і пры першым жа адхіленні ад «лініі» выпраўляла крэн. Выпраўляла прыёмамі і сродкамі, запазычанымі з арсенала работнікаў карных органаў.

Адзнака белетрыстычнай павярхоўнасці ляжыць і на апавяданні «Пачатак шчасця», у якім падаецца сутыкненне паміж палітычна адсталымі бацькамі і іх дачкой, прадавой Галенкай. Галенка пакахала цыгана, які стаў старшынёй калгаса, а бацькі заставаліся на ўласпай гаспадарцы. Антымістычны, бадзёры фінал твора не дае па-мастацку пераканальнага малюнка маючага быць шчасця герояў. Шчасце толькі дэкларуецца. Крыўдна, што менавіта гэты твор, які сваім мастацкім узроўнем значна ўступае многім іншым апавяданням М. Зарэцкага, быў узяты ў якасці назвы кнігі выбраных твораў!

Заслугоўвала больш падрабязнага, дэталёвага разгляду і пытанне аб жанрава-стылёвых асаблівасцях «малой прозы» М. Зарэцкага, аб адметнасці псіхаапалізу, кампазіцыйнай будове, аб

[1] Чырвопая Беларусь, 1930,— № 15. С. 3.

мове, выяўленчых сродках, суадносінах лірычнага і эпічнага, рамантычнага і эпічнага пачаткаў у апавяданнях. М. Зарэцкі настойліва шукаў найбольш мэтазгодных форм мастацкага ўвасаблення жыццёвага матэрыялу, яго эстэтычнай арганізацыі. Пра гэта сведчаць такія, напрыклад, творы, як «42 дакументы», які складаецца з тэксту пратаколаў, лістоў, загадаў, тэлеграм, пастаноў, распараджэнняў, адносін, лістовак, газетных допісаў і г. д. Гэта быў арыгінальны, смелы крок маладога празаіка, які пасур'ёзнаму клапаціўся пра чытэльнасць сваіх твораў, пра іх даступнасць шырокім масам. І трэба прызнаць, што ў гэтым кірунку М. Зарэцкі зрабіў шмат. Майстэрствам пабудовы востраканфліктнага твора з дынамічным сюжэтам, з займальнымі сітуацыямі і калізіямі, з яскравым, тэмпераментным, дзейсным героем пісьменнік актыўна пераадольваў уласцівыя тагачаснай беларускай прозе хранікальную апісальнасць, этнаграфізм і бытавізм. Ён выхоўваў эстэтычны густ чытача, прышчэпліваў яму любоў да друкаванага слова.

Чытаючы апавяданні М. Зарэцкага, нельга не заўважыць, што многія з іх з поўным правам можна лічыць аповесцямі — «Ворагі», «Бель», «На маладое», «Кветка пажоўклая», «Ой, ляцелі гусі...». Узяты ў аснову гэтых твораў матэрыял актыўна рассоўваў жанравыя рамкі апавядання, вымагаючы болей змястоўных форм свайго ўвасаблення.

Праца над апавяданнямі стала адпачасова і сур'ёзнай школай падрыхтоўкі пісьменніка да напісання буйных твораў. Але са сказанага не вынікае, што апавяданні быццам бы трэба разглядаць пераважна як крыніцу маючых быць аповесцяў і раманаў, як эксперыментальны цэх, дзе вядзецца загатоўка наступных твораў, распрацоўваюцца паасобныя сюжэтныя лініі і г. д. На такі погляд нярэдка збіваюцца даследчыкі, сталы прадмет вывучэння якіх — вялікі эпас, раман.

Калі мець на ўвазе не паасобныя творы, а ўсё напісанае М. Зарэцкім у жанры апавядання, дык бясспрэчным будзе агульны вывад аб тым, што іх аўтар унёс значны ўклад у беларускую літаратуру, прыкметна пасунуў наперад пацыянальную прозу, узбагаціў яе тэматыку, вобразны лад, выяўленчыя магчымасці. Апавяданні М. Зарэцкага — адна з найболей цікавых і змястоўных старонак беларускага прыгожага пісьменства.

МІХАСЬ МУШЫНСКІ

У першы том Збору твораў Міхася Зарэцкага ўваходзяць апавяданні 1922—1935 гг.

Апрача твораў, што друкаваліся ў прыжыццёвых кнігах празаіка і былі ўключаны ў зборнік «Пачатак пачасця» (1975), у дадзены том упершыню ўваходзяць апавяданні, якія публікаваліся толькі ў рэспубліканскіх і раённых перыядычных выданнях.

Творы падаюцца ў храналагічным парадку. Крыніцай асноўнага тэксту з'яўляюцца тэксты наступных перыядычных выданняў: газ. «Савецкая Беларусь», часоп. «Полымя рэвалюцыі», «Чырвоная Беларусь», «Беларусь калгаспая», «Аршанскі маладняк»; прыжыццёвых зборнікаў:

1. Пела вясна: Апавяданні.— Мн.: Выд. ЦБ «Маладняка», 1925.— 43 с.

2. Пад сонцам: Апавяданні.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1926.— 101 с.

3. На чыгунцы: Апавяданні.— Мн.: Белдзяржвыд, 1928.— 267 с.

4. У віры жыцця: Апавяданні.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1929.— 223 с. (3-е выданне).

5. Ракавыя жаронцы: Апавяданні і п'есы.— Мн.: Белдзяржвыд, 1930.— 260 с., а таксама кнігі «Дэкламатар», IV, Мн., 1928.

Паколькі архіў М. Зарэцкага не захаваўся і даты напісання твораў невядомы, апавяданні датуюцца годам першай публікацыі, што ў каментарыях да кожнага асобнага твора не адзначаецца.

У выпадках, калі крыніцу першай публікацыі ўстанавіць не ўдалося, указваецца першы зборнік, у якім гэта апавяданне было апублікавана.

Пры падрыхтоўцы да друку тэксты апавяданняў былі зверапы па прыжыццёвых друкаваных крыніцах. Зверка дала магчымасць выправіць у асноўным тэксце недакладнасці і памылкі друку.

АПАВЯДАННІ

Цішка Бабыль (с. 22)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1922, 19, 22 лістап.
Апрача зборніка, апавяданне друкавалася ў газ. «Камуніст», 1926, 15, 17 верас.

У Саўках (с. 29)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1922, 29 снеж.

У віры жыцця (с. 34)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1923, 14, 16, 17 студз.

Чаплюк (с. 50)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1923, 15 лют. з падзагалоўкам «Малюнкі з вайсковага жыцця».

Спакуса (с. 56)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1923, 24 лют.

Мар'я (с. 63)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь. 1923, 25 лют., 3 сакав.

Як гэта часам трапляецца (с. 80)

Друкуецца па газ. «Савецкая Беларусь», 1923, 8 сакав., дзе ўпершыню апублікавана з падзагалоўкам «Маленькае здарэнне».

Ноччу (с. 84)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1923, 29—31 сакав., 1 крас.

З нашых дзён (с. 98)

Друкуецца па газ. «Савецкая Беларусь», 1923, 14, 15 крас., дзе ўпершыню апублікавана.

Адкупіўся (с. 107)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1923, 13, 17 мая пад назвай «Белы здзек» з падзагалоўкам «З жыцця Заходняй Беларусі».

Ворагі (с. 117)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».
Упершыню — Савецкая Беларусь, 1923, 19—24, 26—28 чэрв.

Бацькаў сын (с. 153)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».
Упершыню — Беларускі піянер, 1924, № 1.

Пры жыцці аўтара апавяданне ўвайшло ў зб. «Пела вясна», у кнігі: «Кастрычнік у школе». Мн., 1927; «Рытмы Перамогі». Мн., 1931; 11 ліп. Мн., 1933; «Кастрычнік». Мн., 1933; друкавалася ў газ. «Камуніст», 1926, 20 чэрв.; выйшла асобным выданнем — Бацькаў сын: Апавяданне.— Мн.: Дзяржвыд БССР, 1932.— 16 с.

Гануля (с. 158)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».

Упершыню — Савецкая Беларусь, 1924, 21, 22 сакав.

Апавяданне ўваходзіла ў кн. «Кастрычнік у школе». Мн., 1927.

Адна партыя ў шашкі (с. 164)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Полымя, 1924, № 4.

Бель (с. 170)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».

Упершыню — Савецкая Беларусь, 1924, 4—8, 10, 12, 13, 15, 17, 19 чэрв.

На маладое (с. 208)

Друкуецца па зб. «У віры жыцця».

Упершыню — Савецкая Беларусь, 1924, 23—26, 28, 30 кастр., 1, 2, 5 лістап.

Урыўкі з апавядання друкаваліся ў часоп. «Беларуская работніца і сялянка», 1928. № 1, 2, 3; «Калгасніца і сялянка», 1928, № 1.

Камсамолка (с. 238)

Друкуецца па часоп. «Маладняк», 1925, № 6, дзе аўтарам пазначаны жанр твора: апавяданне-імпрэсія.

Упершыню — Соха и молот, 1925, 12 лют.

Пры жыцці пісьменніка апавяданне ўваходзіла ў кн. «Камсамолія», Мн., 1927; «Дэкламатар», IV, 1928.

Дзіўная (с. 239)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Савецкая Беларусь, 1925, 18, 19, 21, 22 лют.

Апрача гэтага, апавяданне ўваходзіла ў зб. «Пад сонцам» (1926).

Пра майго прыяцеля (с. 251)

Друкуецца па часоп. «Аршанскі маладняк», 1925, № 2, дзе ўпершыню апублікавана.

У велікодную ноч (с. 256)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Савецкая Беларусь, 1925, 18 крас.

Апрача гэтага, апавяданне ўваходзіла ў зб. «Пела вясна».

Як Настулька камсамолкай зрабілася (с. 260)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Маладняк, 1925, № 7.

Пры жыцці аўтара апавяданне ўваходзіла ў зб. «Пела вясна; у кн. «Камсамолія»; «Моладзь — за новы быт». Мн., 1929; друкавалася ў газ. «Камуніст», 1926, 25, 27 чэрв.; «Чырвоная змена», 1926, 23, 25, 29 ліп.

42 дакументы (с. 268)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Маладняк, 1925, № 9 пад назвай «42» (Схема літаратурнае ілюстрацыі) з падзагалоўкам «Апавяданне ў форме літаратурнага пратакола».

Апрача гэтага, апавяданне ўваходзіла ў зб. «42 дакументы і Двое Жвіроўскіх» — Мн.: Выд. ЦБ «Маладняка», 1926.— 68 с.

Пела вясна (с. 287)

Друкуецца па зб. «Пела вясна», дзе ўпершыню апублікавана.

На чыгунцы (с. 289)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Маладняк, 1926, № 9.

Двое Жвіроўскіх (с. 305)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Маладняк, 1926, № 12.

Апавяданне ўваходзіла ў зб. «42 дакументы і Двое Жвіроўскіх».

Кветка пажоўклая (с. 321)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — зб. «Пад сонцам».

Радасць (с. 357)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — зб. «Пад сонцам».

Смерць (с. 373)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — зб. «Пад сонцам».

Ліпа (с. 389)

Друкуецца па зб. «На чыгунцы».

Упершыню — Савецкая Беларусь, 1927, 13 лістап.

Паэма пра чорныя вочы (с. 396)

Друкуецца па зб. «Ракавыя жаронцы».

У перакладзе на рускую мову апавяданне ўвайшло ў кп. «Прасторы». Мн., 1927.

Датуецца годам апублікавання перакладу.

Ракавыя жаронцы (с. 401)

Друкуецца па зб. «Ракавыя жаронцы».

Упершыню — Літ. дадатак да газ. «Савецкая Беларусь», 1928, № 14.

Максімаліст (с. 405)

Друкуецца па зб. «Ракавыя жаронцы».

Упершыню — Літ. дадатак да газ. «Савецкая Беларусь», 1928, № 16.

Шэпты восені (с. 413)

Друкуецца па кп. «Дэкламатар», IV, 1928, дзе ўпершыню апублікавана.

Ой, ляцелі гусі... (с. 414)

Друкуецца па зб. «Ракавыя жаронцы».

Упершыню — Полымя, 1929, № 3.

Хвіліна (с. 450)

Друкуецца па часоп. «Чырвоная Беларусь», 1930, № 15, дзе ўпершыню апублікавана.

Пра дзеда Альпіна (с. 454)

Друкуецца па часоп. «Чырвоная Беларусь», 1930, № 18, дзе ўпершыню апублікавана.

Парася (с. 458)

Друкуецца па часоп. «Чырвоная Беларусь», 1931, № 2, дзе ўпершыню апублікавана.

Пачатак шчасця (с. 464)

Друкуецца па часоп. «Беларусь калгасная», 1932, № 2, дзе ўпершыню апублікавана.

Петрык і Пятрусь (с. 479)

Друкуецца па часоп. «Чырвоная Беларусь», 1932, № 2, дзе ўпершыню апублікавана.

Навела пра каханне (с. 488)

Друкуецца па часоп. «Полымя рэвалюцыі», 1935, № 10, дзе ўпершыню апублікавана.

ТАМАРА СТРОЕВА

ЗМЕСТ

Ад рэдакцыі ——— 5
М. Мушынскі. Сумленны і мужны талент ——— 6

АПАВЯДАННІ

Цішка Бабыль ——— 22
У Саўках ——— 29
У віры жыцця ——— 34
Чаплюк ——— 50
Спакуса ——— 56
Мар'я ——— 63
Як гэта часам трапляецца ——— 80
Ноччу ——— 84
З нашых дзён ——— 98
Адкупіўся ——— 107
Ворагі ——— 117
Бацькаў сын ——— 153
Гануля ——— 158
Адна партыя ў шашкі ——— 164
Бель ——— 170
На маладое ——— 208
Камсамолка ——— 238
Дзіўная ——— 239
Пра майго прыяцеля ——— 251
У велікодную ноч ——— 256
Як Настулька камсамолкай зрабілася ——— 260
42 дакументы ——— 268
Пела вясна ——— 288
На чыгунцы ——— 289
Двое Жвіроўскіх ——— 305
Кветка пажоўклая ——— 321
Радасць ——— 357
Смерць ——— 373
Ліпа ——— 389

Паэма пра чорныя вочы ——— 395
Ракавыя жаропцы ——— 401
Максімаліст ——— 405
Шэпты восені ——— 413
Ой, ляцелі гусі... ——— 414
Хвіліна ——— 450
Пра дзеда Альпіна ——— 454
Парася ——— 458
Пачатак шчасця ——— 464
Петрык і Пятрусь ——— 479
Навела пра каханне ——— 488
Камептарыі ——— 495

Зарэцкі М.
З-35 Збор твораў. У 4 т. Т. 1. Апавяданні/Прадм. М. Мушынскага.— Мн.: Маст. літ., 1989.— 526 с., [1]л. партр.
ISBN 5-340-00297-7.
Зарецкий М. Собрание сочинений. Т. 1.

Першы том Збору твораў вядомага беларускага пісьменніка, аднаго з зачынальнікаў беларускай савецкай літаратуры Міхася Зарэцкага (1901—1941), склалі апавяданні розных год.

ББК 84Бел7

З $\frac{4702120201-154}{М\ 302(03)-89}$ 92—89

Литературно-художественное издание

ЗАРЕЦКИЙ МИХАСЬ
(Косенков Михаил Ефимович)

СОБРАНИЕ СОЧИНЕНИЙ
В ЧЕТЫРЕХ ТОМАХ

Том первый

Рассказы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

ЗАРЭЦКІ МІХАСЬ
(Касянкоў Міхаіл Яўхімавіч)

ЗБОР ТВОРАЎ
У ЧАТЫРОХ ТАМАХ

Том першы

Апавяданні

Рэдактар Н. І. Семашкевіч
Мастацкае афармленне Л. Я. Прагіна
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава
Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал
Карэктары Л. Т. Калюжная, Л. М. Маслоўская

ІБ № 3129

Здадзена ў набор 08.12.88. Падп. да друку 12.07.89. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 27,72+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 27,83. Ул.-выд. арк. 29,65. Тыраж 5000 экз. Зак. 2059. Цана 2 р. 70 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.